ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ
АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

КАРЭЛІЦКІ РАЙВЫКАНКАМ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ НАВУКОВА-АСВЕТНЫ ЦЭНТР
ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ
ПРЫ МІНІСТЭРСТВЕ АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ПОЛЬСКІ ІНСТЫТУТ У МІНСКУ

ФЕДЭРАЦЫЯ ІНСТЫТУТАЎ
ЦЭНТРАЛЬНА-УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ

БЕЛАРУСІКА
ALBARUTHENICA
11

Mickiewicz.

АДАМ МІЦКЕВІЧ
І НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ КУЛЬТУРЫ

Матэрыялы
Міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Мінск, 7–11 верасня 1998 г.)

Мінск
«Беларускі кнігазбор»
1998

УДК 882.6.09
ББК 83.3(4 Беи) 6
А 28

Рэдакцыйная калегія
кандыдат гістарычных навук
Юрый Бохан,
Наталля Давыдзенка
(рэдактар),
акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,
доктар гістарычных навук
Міхаіл Касцюк,
член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,
доктар філалагічных навук
Алег Лойка,
доктар філалагічных навук
Адам Мальдзіс
(галоўны рэдактар),
дырэктар Польскага інстытута ў Мінску
Томаш Нягодзіш

Рэдкалегія выказвае падзяку
Польскаму інстытуту ў Мінску,
князю мсціслаўскаму і заслаўскаму
Анджэю Цеханавецкаму (Лондан)
за дапамогу ў выданні матэрыялаў канферэнцыі

Серыя заснавана ў 1993 годзе

ISBN 985–6318–36–X

© Калектыў аўтараў, 1998

ПРЫВІТАННЕ
ЎДЗЕЛЬНІКАМ КАНФЕРЭНЦЫІ МІНІСТРА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ВАСІЛЯ СТРАЖАВА

Шаноўныя госці,
паважаныя ўдзельнікі Міжнароднай навуковай канферэнцыі!

Вітаю вас на беларускай зямлі, на радзіме геніяльнага паэта Адама Міцкевіча, 200-годдзе з дня нараджэння якога адзначае сусветная грамадскасць!

У Беларусі юбілей вялікага паэта і асветніка мы адзначаем з асаблівай пашанай і гонарам. Тут Адам Міцкевіч нарадзіўся, тут, каля старажытнага Навагрудка, узмужнеў талент слаўнага прадстаўніка славянскай і сусветнай літаратуры.

Постаць Адама Міцкевіча, яго неперaўзыдзеная творчасць, жыццё падзвіжніка і асветніка сталі адным з самых вялікіх здабыткаў сусветнай, у тым ліку і беларускай, культуры, невычэрпнай крыніцай духоўнасці беларускага народа.

Высокая мастацкая каштоўнасць твораў Адама Міцкевіча стала магутным падмуркам для стварэння беларускай нацыянальнай літаратуры, фарміравання талентаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча і іншых выдатных сыноў беларускага народа.

Адам Міцкевіч пакінуў для нашчадкаў не толькі свае выдатныя творы, але і павучальны прыклад патрыятычнага служэння Радзіме, што стварае самога чалавека і сваёй прыгажосцю аздабляе жыццё кожнай асобы. За сваю Айчыну, за яе свабоду Адам Міцкевіч змагаўся сваёй творчасцю і быў гатовы змагацца са зброяй у руках.

Геній Адама Міцкевіча заключаецца ў тым, што ён спалучыў жыццё зямное з Божай зоркай высокай паэзіі, тым самым узвялічваючы чалавека, праслаўляючы беларускі, польскі і літоўскі народы, аб'яднаныя раней у адзінай дзяржаве.

Я вітаю ўдзельнікаў канферэнцыі ад імя Урада Рэспублікі Беларусь, які ў сваіх намаганнях па развіццю нацыянальнай культуры асаблівую ўвагу надае засваенню маладым пакаленнем сваёй каштоўнай гістарычнай спадчыны. У гэтым агульным працэсе гуманізацыі грамадства, маральна-эстэтычнага выхавання асобы свабодалюбівыя ідэі Адама Міцкевіча набываюць сучаснае гучанне.

Вялікі класік сусветнай літаратуры прарочыў міралюбства, братэрства паміж суседнімі народамі. Гэта аксіёма яднання з асаблівым пранікненнем павінна быць асэнсавана ў наш складаны час, каб у агульнай сям'і розных народаў узняцца на новы ўзровень цывілізацыі.

А. С. Пушкін пісаў пра А. Міцкевіча:

Он говорил о временах грядущих,
Когда народы, распри позабыв,
В великую семью соединяться.

Шаноўныя калегі! Вялікаму Адаму Міцкевічу — 200 гадоў. Зорка яго таленту на небасхіле новай эпохі разгараецца ўсё ярчэй і ярчэй, і яна будзе асвятляць шлях нашым народам у XXI стагоддзе. Гэта свет гуманізму, дабра, справядлівасці, уладарнасці чалавека, яго розуму.

Вітаю вас з гадавінай нараджэння Адама Міцкевіча, класіка сусветнай літаратуры, прадстаўніка беларускай і польскай культур. Жадаю поспехаў канферэнцыі!



ПЛЕНАРНЫЯ ДАКЛАДЫ



Завоссе, верагоднае месца нараджэння Адама Міцкевіча.
З літаграфіі М. Фаянса паводле малюнка Н. Орды

Алег Лойка *(Мінск)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ І БЕЛАРУСЬ

Гаварыць пра Адама Міцкевіча і Беларусь — гэта перадусім гаварыць пра Міцкевіча і яго Радзіму, бо Беларусь — месца нараджэння Міцкевіча, Навагрудчына — зямля, на якой ён рос, гадаваўся. І першая вучоба — у навагрудскіх дамініканцаў — была на зямлі беларускай, і адзін з еўрапейскіх раманаў XIX ст. пачаўся над беларускай, а не палеска-ўкраінскай Свіцязю, першалюбімаю ў Міцкевіча стала менавіта непаўторная прырода Навагрудчыны з яе пагоркамі і жытнёвымі схіламі, так натхнёна апетымі паэтам у паэме “Пан Тадэвуш”. Адным словам, Беларусь — радзіма Міцкевіча. Так мы гаворым напрыканцы XX ст., і мы не памыляемся, не абеларушваем, а проста сцвярджаем яго прыналежнасць Беларусі ўвогуле, беларускаму народу, беларускай культуры, літаратуры, гісторыі Беларусі.

Прыналежнасць генія — гэта прыналежнасць усяму свету, гісторыі ўсяго чалавецтва, сусветнай літаратуры. Але яна заўсёды пачынаецца з прыналежнасці прыватнаму. Адам Міцкевіч у гісторыю еўрапейскай літаратуры ўпісваў сваё імя перадусім як вялікі польскі паэт. І ніколькі ягонага ўкладу ў польскую літаратуру не змяншала тое, што ён нарадзіўся не ў Кароннай Польшчы, а на “крэсах”. Крэсавае вязалася з каронным, і карона караля польскай паэзіі ад гэтага толькі важчэла, дзівоснела. Што карона тая не з аднаго металу літая, тое цалкам усведамляў сам Міцкевіч:

Litwo! Ojczyzno moja…

І гэтым парушалася адзінства першаснай, польскай прыналежнасці паэта. Закідаў у ліцвінскім рэгіяналізме яшчэ пры жыцці сам паэт зазнаў дастаткова. А пасля яго трагічнай гібелі як жа многія намагаліся прыўменшыць, зацьміць усё тое ў генетычных вытоках, у жыццёвым прататыпе вялікай мастацкай спадчыны паэта, у пафасе ягонай творчасці, што ішло ад крэсавага, ад рэгіянальнага! Але час працаваў не на каронныя амбіцыі, як перакрэсліў ён і нарматыўныя, кан’юнктурныя трактоўкі савецкага і пэнэраўскага міцкевічазнаўства.

Было ж, што Беларусь прызнавалася не больш як тэрыторыя, на якой нарадзіўся А. Міцкевіч, на якой разгарнулася дзейнасць філаматаў і філарэтаў, на якой прайшлі яны шлях ад Асветніцтва да рамантызму, на якой былі першай хваляй польскага шляхецкага руху XIX ст. Праўда, фетышызацыя ў савецкім літаратуразнаўстве фальклору давала шырокую дарогу даследаванню вобразаў і матываў з вуснай творчасці беларусаў — як яны

пераламляліся ў рамантызме Міцкевіча перыяду “Балад і рамансаў”, “Дзядоў”, а таксама ў паэме “Пан Тадэвуш”. Ды то была не больш як палова сказанага А. Міцкевічам, і пры гэтым духоўнасць паэта не бачылася ў поўні яе залежнасці ад народнага падглеб’я, ад аўтахтонна-беларускага субстрата, ад Беларусі. І калі на Беларусь дэмакратычныя ідэі Вялікай французскай рэвалюцыі, еўрапейскага Асветніцтва і рамантызму наплывалі, то мясцовае, аўтахтоннае ўбіралася будучымі філаматамі і філарэтамі, як гаворыцца, з малаком маці, з першым удыхам паветра.

Жыццёвыя повязі Адама Міцкевіча з Беларуссю сапраўды шматлучныя, але каб гэта ўбачыць, зразумець, перш за ўсё трэба разумець ліцвінізм Міцкевіча, не блытаць яго з літуанізмам, летувізмам, жмудзінскасцю. Так, зусім нядаўна на радыёхвалях маскоўскага “Маяка” прагучала фраза аб А. Міцкевічу — вялікім паэце польскім і літоўскім… А беларускім? Думаецца, ужо і таму мы павінны гаварыць, пісаць, дакладваць і лікбезава, гэта значыць, ліквідуючы непісьменнасць і ў сябе, і за мяжой, тлумачачы перадусім ліцвінізм А. Міцкевіча. Сказаць, што продкі сённяшніх беларусаў, якія жывуць на Навагрудчыне, Лідчыне, Слонімшчыне, Міншчыне, Піншчыне, у XVII–XIX стст. называліся ліцвінамі і што яшчэ да рэвалюцыі Мінск наш называўся Літоўскім, Бярэсце — Брэст-Літоўскім, сказаць гэта — яшчэ далёка не патлумачыць феномен міцкевічаўскага ліцвінізму, увогуле ліцвінізму Беларусі XIX ст. Дык возьмем “вілку” паміж двума Францішкамі — Скарынам і Багушэвічам, між старабеларушчынай і новай беларускай літаратурай. Менавіта ў гэтым прамежку былі А. Міцкевіч і тое, што цяпер стала Беларуссю, а паэтызавалася Міцкевічам як Літва. XVII–XVIII ст. — час апалячвання старабеларускай шляхты, час асталявання яе як ліцвінаў. Ды ў Вялікім Княстве Літоўскім чалавек любога стану быў ліцвінам. Не стала пасля падзелаў Рэчы Паспалітай Вялікага Княства Літоўскага, ліцвінамі ў XIX ст. былі ліцвіны, каб напрыканцы XIX, на працягу XX ст. стаць беларусамі. Так складвалася гістарычна, так сама гісторыя збытала паняцці і словы, сэнс і значэнні. Не адкруціш таго, што здарылася, але рэальна зразумець, што здарылася, — гэта зусім няцяжка, як няцяжка ў гістарычнай перспектыве ўбачыць, чым рэальна была ліцвінскасць А. Міцкевіча, ліцвінізм герояў міцкевічаўскага “Пана Тадэвуша”.

Ліцвінізм Адама Міцкевіча непасрэдна ўпісваецца ў гісторыю Беларусі, у гісторыю беларускай літаратуры. Ліцвінізм — гістарычная фаза беларускасці ў Беларусі, мутацыя беларускасці пад уплывам апалячвання, ступень развіцця беларускасці ў яе спецыфічнай незвычайнасці. З гісторыі Беларусі, беларускага народа ліцвінізм не выпадае, ліцвінізм ёсць кроўная гісторыя Беларусі — складаная гісторыя.

Ад ліцвіна Адама Міцкевіча ў 30–40-х гг. XIX ст. у крэсавай польскай літаратуры — поруч з украінскай рамантычнай школай — склалася бела-

руская рамантычная школа. Каб прадстаўнікі апошняй былі родам з Навагрудчыны ці Лідчыны, то гэтая школа была б ліцвінскай, але яны былі з Віцебшчыны, Полаччыны, якія на той час ужо значыліся пад найменнем "Белай Русі", то сталася менавіта беларускай рамантычнай школай. Навідавоку таксама, як шмат прататыпнага зачэрпнуў Міцкевіч з аналаў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Адносіны паэта да гістарычнай Літвы, да яе прарадзімы — Чорнай Русі — мы сёння ўспрымаем так жа, як адносіны і да гістарычнай Беларусі, разумеючы іх канструктыўнае значэнне для ўсяго таго, што на гістарычную тэму ў А. Міцкевіча напісана.

У цэлым беларускі субстрат клаўся ў духоўнасць і творчасць Адама Міцкевіча арганічна і трывала, прычым ён "падпіраў" паэта на розных узроўнях — светапоглядных, сюжэтабудаўнічых, канкрэтна-побытавых, моўным. Так, не толькі беларусізмамі напоўнены лексічны склад паэмы "Пан Тадэвуш", але і сінтаксіс яе ўзалежніваўся не ў адным месцы ад сінтаксісу беларускіх дыялектаў. Са старажытнага абраду памінання продкаў, што захаваўся да XIX ст. роўна ў літоўцаў, як і беларусаў, пайшла ў А. Міцкевіча задума паэмы "Дзяды". Шэраг яго балад віленска-ковенскага перыяду — на сюжэтах, што прыйшлі да яго з вядомых беларускіх паданняў, легенд, казак, народных песень ("Свіцязь", "Рыбка", "Тукай"). Маецца пэўная крэўнасць, залежнасць захапленняў паэта містыцызмам ад адпаведных пластоў менавіта і беларускага фальклору, і самы вялікі ўплыў на яго набожнасць аказалі рэлігійныя матывы фальклору.

Менавіта ад ўсяго фальклору як спадчыны сярэдневякоўя залежаў А. Міцкевіч, і толькі бачачы паўнату гэтай сувязі, можна зразумець усе перыпетыі яго жыцця і творчасці, яго рамантызм, яго народнасць, яго перапады з рэвалюцыйнасці ў містыцызм. І тут мы ўспомнім, што фетышызацыя ў савецкі час была звязана з прызнаннем фальклору толькі працоўнага народа і яго "цвярозай" мудрасці, а хрысціянска-рэлігійны, сярэднявечна-містычныя матывы ў ім лічыліся ненароднымі, чартаўшчынай. І яшчэ ўспомнім, што Максім Горкі ў сваёй гісторыі літаратуры рамантызм як літаратурны напрамак распалавініў на рэвалюцыйны і рэакцыйны, першы ўздымаючы на шчыт, другі перакрэсліваючы зноў жа як д'ябальшчыну. А што было рабіць даследчыку, калі асоба яго даследавання то ў стане рэвалюцыянераў, то ў стане візіянераў? Менавіта так і было ў выпадку з Міцкевічам: як шляхецкі рэвалюцыянер ён узвышаўся, як адэпт містыка Андрэя Тавянскага ці замоўчваўся, ці бачыўся прапашчым. Ды і ў адным, і ў другім стане быў адзін і той жа чалавек, адно і тое ж намаганне дзеля адзінай мэты — звяржэння царызму. Хто-небудзь можа і сёння падумаць, што гэта не вельмі добра, звязваючы імя А. Міцкевіча з Беларуссю, гаварыць аб уплыве на яго менавіта набожнасці беларуска-каталіцкай і містыцызму, якога хапала ў беларускім фальклоры. Дарэчы, і Андрэй Тавянскі — смаргонскі шляхцюк,

быў ён ці не быў агентам Бенкендорфа, а што канцэнтратам смаргонскага містыцызму быў, гэта факт. А калі смаргонскай чартаўшчыны, то і ў цэлым беларускай чартаўшчыны. Зерне падала не на камень. Бо гэта яшчэ задоўга да сустрэчы з Тавянскім А. Міцкевіч выдаў асобным томам свае "Сказы і заўвагі" — двухрадкоўі — зрыфмаваны канспект твораў нямецкіх містыкаў Якаба Бёма (1575–1624), Яна Шэфлера (1624–1677) і француза Людвіка Клаўдыуша дэ Сент-Марціна (1743–1803). У дадзеным выпадку ў душы ліцвіна А. Міцкевіча перасякаліся асветніцтва, энцыклапедызм і сярэдневяковы містыцызм. І ўсё гэта мела карані як заходнееўрапейскія, так і ўсходнеславянскія.

Савецкае міцкевічазнаўства ў свой час цалкам абыходзіла і рэлігійную лірыку польскага паэта, і яго містычна-маралістычныя "Сказы і заўвагі", у той час калі А. Міцкевіч быў вялікім паэтам як рэлігійным (вершы "Размова вячэрняя", "Розум і вера" — абодва 1833 г.; "Да Марыі Лампіцкай у дзень прыняцця святой камуніі" — 1830 г.), так і ў сваёй падлегласці містыцызму. Усё гэта былі праявы духоўнасці паэта, выражэнне спрадвечных уплываў на польскі народ і беларускую шляхту каталіцызму, духоўнасці, якая не ў малой ступені ўзносіла Міцкевіча на п'едэстал народнага прарока, вешчуна. І можа, не так рэвалюцыйны ці шляхецкі дэмакратызм паэта рабіў яго прарокам народа, правадыром яго нацыянальна-вызваленчага руху, як вось гэтая саўдзельнасць генія А. Міцкевіча з рэлігіяй, з сярэдневяковай ідэальна-містычнай філасофіяй. Дакладней кажучы, свецкі рамантызм, патрыятызм, грамадзянская заангажаванасць аўтара "Оды да маладосці", такіх яго вершаў, як "Да маці-полькі" (1830), "Рэдут Ардона", "Начлег", "Смерць палкоўніка" (1832), пафас і высокая артыстычнасць як балад, рамансаў, так і паэм, баек, сатырычных твораў рабілі А. Міцкевіча ўсенародным геніем. Але ўсенароднасць яго была куды шырэй яго свецкасці, бо была менавіта ўсенароднай і рэлігійна-філасофскай змястоўнасцю і сярэдневякова-містычнай змястоўнасцю. Такім чынам, у сваёй народнасці, польскай усенароднасці як вяшчун, як прарок польскага нацыянальна-вызваленчага руху А. Міцкевіч вельмі і вельмі быў залежны ад Беларусі, ад агульнага яе духоўнага клімату ў пачатку XIX ст.

Асобна скажам пра адносіны А. Міцкевіча да беларускай мовы. Беларускую мову ён ведаў, памятаў яе праз усё жыццё. Нездарма ж песню "Ой, ды цераз двор цяцера ляцела…" з яго вуснаў у Парыжы чулі яго землякі. Нездарма і Ян Чачот на прыезд А. Міцкевіча з Коўна пісаў яму свой вершык па-беларуску:

Едзе міленькі Адам,
Гладзеце — а онь, а онь,
Ды ён харашэнькі сам,
Пад ім вараненькі конь.

Дэмакратычны філамацкі культ беларускай мовы быў А. Міцкевічу дадушы! Але свае адносіны да беларускае мовы, як і да фальклору беларусаў, да нашай гісторыі А. Міцкевіч вельмі красамоўна засведчыў ў сваіх лекцыях у Калеж дэ Франс, сцвярджаючы: "…на беларускай мове, якую называюць русінскай, альбо літоўска-русінскай… гаворыць каля дзесяці мільёнаў чалавек; гэта самая багатая і самая чыстая гаворка, яна ўзнікла даўно і цудоўна распрацавана. У перыяд незалежнасці Літвы вялікія князі карысталіся ёю для сваёй дыпламатычнай перапіскі". Іншым разам у тых жа лекцыях А. Міцкевіч падкрэсліваў: "…сяляне Пінскай, часткова Мінскай і Гродзенскай губерняў захавалі найбольшую колькасць агульнаславянскіх рысаў. У іх казках і песнях ёсць усё. Пісьмовых помнікаў у іх мала, толькі Літоўскі статут напісаны іх мовай, самай гарманічнай і з усіх славянскіх моваў найменш зменены".

Асобна яшчэ скажам і аб ролі Адама Міцкевіча як каталізатара развіцця новай беларускай літаратуры. Аб беларускасці як асобнай нацыянальнай ідэі ні філаматы, ні сам А. Міцкевіч, вядома, не чулі, але каталізатарамі яе былі. Для А. Міцкевіча ўзнікненне польскамоўнай беларускай рамантычнай школы, пра якую ўжо гаварылася, было, вядома, справай узбочнай, справай не з яго ўласнай ініцыятывы, бо ішло як аб'ектыўны працяг штуршкоў, імпульсаў, спараджаючы польскамоўную літаратуру беларускай тэматыкі, сюжэтаў, песенна-народных формаў. Ды галоўнае, што з плеяды польскамоўных пісьменнікаў Беларусі XIX ст. вылучыліся першапачынальнікі ўласна беларускай літаратуры. З крэсавых, маргінальных польскіх паэтаў вылоньваліся паслядоўнікі А. Міцкевіча, каб стаць на чале новай беларускай літаратуры. Паслядоўнікі разумелі загалоўную бацькоўскую ролю А. Міцкевіча для сябе, і адразу ж, як, напрыклад, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, узяліся за пераклад на беларускую мову буйнейшага твора А. Міцкевіча — паэмы "Пан Тадэвуш" (1859). Дарэчы, гэта быў другі пераклад паэмы на іншыя мовы. Беларусь, такім чынам, адна сярод першых вітала А. Міцкевіча перакладам. Быў перарыў, праўда, у гэтым вітанні, бо пасля паўстання 1863 г. да рэвалюцыі 1905 г. як па ўсёй Расіі, так і на Беларусі творчасць А. Міцкевіча была забаронена. Не вельмі віталася ўсё польскае і ў савецкай Беларусі 20–30-х гг. Справы зрушыліся ў пасляваенны час, калі выйшлі аднатомнікі Адама Міцкевіча ў 1955, 1969 гг. Ды якая б палітычная непагадзь не лютавала над Беларуссю, яна, можна сказаць, увесь час дастойна ганаравала геній А. Міцкевіча. І тут з удзячнасцю трэба ўспомніць, па-першае, двух перакладчыкаў паэмы "Пан Тадэвуш": вязня польскай турмы Браніслава Тарашкевіча 30-х г. і вязня бальшавіцкага ГУЛАГа ў Казахстане 50-х г. — Пятра Бітэля. Знакам невычэрпнасці любові Беларусі да паэмы "Пан Тадэвуш" стаў і пяты пераклад яе Язэпам Семяжонам.

Адам Міцкевіч і Беларусь сёння — у 200-я ўгодкі з дня нараджэння

вялікага паэта, напрыканцы XX ст. — гэта сітуацыя адмысловая. Адмысловая найперш таму, што 80–90-я гг. XX ст. пераістотнілі ў Беларусі ўзаемасувязь XIX і XX ст. Гэтае пераістотненне адбылося ў звязку з намаганнямі перакладчыкаў (К. Цвіркі, У. Мархеля, М. Хаустовіча і інш.). Іх праца ішла пад знакам разумення XIX ст. у Беларусі як полілінгвістычнага — у працяг полілінгвізму літаратуры XVI ст. І цяпер, калі мы маем беларускія пераклады польскамоўных твораў Беларусі XIX ст., то пісьменнікаў і паэтаў — Яна Баршчэўскага, Яна Чачота — мы ўжо не называем польска-беларускімі, а называем іх беларуска-польскімі пісьменнікамі, прыналежнымі найперш Беларусі.

У гэтай сітуацыі — пры поўным перакладзе мастацкай спадчыны А. Міцкевіча на беларускую мову, ён, вядома, не стане беларуска-польскім паэтам, як не стане ім і Уладзіслаў Сыракомля: маштабы, памеры таленту, іх гістарычная роля ў дзеях Польшчы, польскага народа далёка не тыя, чым у літаратараў Беларусі XIX ст., што складалі так званую беларускую школу ў польскім рамантызме! Тым не менш, у гэтай новай сітуацыі прыналежнасць А. Міцкевіча Беларусі відавочна стала агромнісцей, і яна будзе станавіцца ўсё агромнісцей, чым бліжэй будзе прыход нашай Беларусі да Беларусі, да самой сябе.

Функцыянальная роля А. Міцкевіча ў гэтым працэсе безумоўная, вялікая. Настальгія паэта па Літве — сваёй Айчыне — не памерла. Літва стала Беларуссю, найменне прадмета настальгіі змянілася, але жыве сама настальгія, жыве дух Міцкевіча, і ён як бы прымушае Беларусь быць Беларуссю. Пад ліцвінскія саламяныя стрэхі прагнуў А. Міцкевіч трапіць сваім натхнёным словам. Ліцвінскіх саламяных стрэх няма сёння ў радзімым краі паэта. Пад беларускія стрэхі ён сёння прыходзіць у сваім радзімым краі. Вялікі сын Польшчы ідзе, вяртаецца сёння ў нашу Беларусь, каб стаць вялікім сынам і Беларусі.

Ежы Клачоўскі *(Люблін, Польшча)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ — НАШЧАДАК КУЛЬТУРЫ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ МНОГІХ НАРОДАЎ

I

Трэба спачатку прыгадаць адну рэч, якая, здавалася б, сёння зусім рэальная, але часта на практыцы — раней і сёння — лёгка забываецца. Назва даклада заключае ў сабе менавіта гэтае згадванне, якое вельмі патрэбна для разумення Міцкевіча як чалавека і як творцы. Разумення даследчыкамі рознай спецыялізацыі, а таксама звычайнымі людзьмі, шырокімі масамі насель-

ніцтва краін той часткі Еўропы, з якімі вялікі Адам быў асабліва моцна звязаны. Гісторыя, вопыт Рэчы Паспалітай былі для яго фундаментальнай каштоўнасцю, асновай для фарміравання на новых дэмакратычных прынцыпах адносін у Еўропе паміж краінамі і народамі кантынента. ЮНЕСКО — арганізацыя ААН па пытаннях навукі, адукацыі і культуры, уносячы знамянальную дату 200-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча ў спіс найважнейшых дат у культурнай гісторыі чалавецтва для ўвекавечання ва ўсім свеце ў 1998 г. яго памяці, вылучае сёння нашага Вешчуна і Настаўніка як аднаго з патронаў развіцця праграмы цывілізацыі свету XXI ст. Свабода, дэмакратыя, павага годнасці чалавека — асноўныя каштоўнасці гэтай праграмы, актуальнай для ўсіх кантынентаў свету. Яны інтэгральна таксама заключаюцца ў бачанні свету, якому вялікі Адам палка і самааддана служыў да апошніх дзён свайго жыцця.

Даследуючы тэму Рэчы Паспалітай і яе бачанне А. Міцкевічам, мы павінны памятаць пра дыстанцыю, якая аддзяляе нас ад тых часоў, часта вельмі аддаленых ад сённяшніх адносін, часам такіх цяжкіх для зразумення, асабліва для людзей, менш знаёмых з гісторыяй. Сацыяльная саслоўнасць перыяду двухсотгадовай даўнасці, месца шляхты з яе прывілеямі і грамадскай пазіцыяй — гэта, між іншым, з'явы для людзей перыяду закладвання, па крайняй меры, "эгалітарнай дэмакратыі" зусім не бясспрэчныя. Як жа лёгка памыліцца і аднабакова іх інтэрпрэтаваць, не ўлічваючы ўвесь кантэкст. Назва Польшча, якая ўжывалася паўсюдна ў міцкевічаўскія часы як назва Рэчы Паспалітай, таксама павінна быць узята ў шырокіх рамках шматэтнічнай дзяржавы, што аб'ядноўвала ў Кароне і Вялікім Княстве Літоўскім людзей рознага паходжання. На першы план тут выступае шляхецкі "палітычны народ", грамадзяне з пэўнымі прававымі і палітычнымі паўнамоцтвамі, члены некалькіх дзесяткаў сеймікаў з далёка сягаючым самакіраваннем, з якіх складалася Рэч Паспалітая.

У другой палове XIX і першых дзесяцігоддзях XX ст. з ранейшай супольнасці Рэчы Паспалітай паўсталі чатыры ці нават пяць народаў з выразна выражаным этнасам: польскі, літоўскі, беларускі, украінскі, а таксама ў значнай ступені яўрэйскі, бо ранейшыя землі Рэчы Паспалітай да іх падзелу з'яўляліся аж да драматычнага перыяду Другой сусветнай вайны месцам вялікай канцэнтрацыі яўрэйскага насельніцтва з моцным сіянісцкім рухам, накіраваным на ўтварэнне ўласнай дзяржавы ў Ізраілі [1]. З чатырох

[1] Хачу тут спаслацца на падрыхтаваную да друку "Гісторыю Цэнтральнай і Усходняй Еўропы" пад рэдакцыяй Е.Клачоўскага, якая выйдзе ў свет у 1999 г. адначасова на дзвюх мовах: на французскай у Парыжы ў выдавецтве PUF (збор Nouvelle Clio), а таксама на польскай у Любліне. Нацыянальны рух у XIX ст. апісваецца там Даніелем Бавуа ў параўнальным аспекце на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай і Марыяй Элізабет Дукро — на тэрыторыі Габсбургскай манархіі.

народаў-нашчадкаў польскі народ быў найбольш прывілеяваны. Гэта зразумела, бо атаясамліванне сябе з былой Рэччу Паспалітай было вельмі моцным, нягледзячы на розную мяшчанска-сялянскую крытыку "панскага мінулага". Але выразнай таксама была тэндэнцыя да трактавання "новай Польшчы" як адзінага, па сутнасці, нашчадка "першай Рэчы Паспалітай", яе "паланізацыя" амаль ад пачатку польска-літоўскай уніі ва ўспрыманні і ментальнасці людзей ці ў адукацыйных праграмах. Сёння ўсё лепш і паўней бачым дзяржаву да падзелаў, польска-літоўскую федэрацыю, якая паволі ўмацоўвалася аж да вялікай справы Чатырохгадовага сейма ў 1791 г., які дапоўніў і менавіта ўзмацніў федэратыўны характар так званага саюза "абодвух народаў". "Ліцвіны", грамадзяне Вялікага Княства Літоўскага і "каронцы" Каралеўства Польскага вельмі яшчэ доўга, у тым ліку на працягу XIX ст., самі сябе называлі і былі называныя "палякамі" ў сэнсе атаясамлівання сябе з федэратыўнай дзяржавай, якая яшчэ жыла ў іх памяці, у шматлікіх установах, правах, звычаях, заўважальных на кожным кроку памятных рэчах, помніках, ва ўсім грамадска-культурным краявідзе [2].

Сучасная гістарыяграфія апошніх дзесяцігоддзяў у сваіх прагрэсіўных, глыбока гуманістычных пачынаннях, накіраваных на ўсебаковае, шматаспектнае бачанне і разуменне людзей, чалавечых грамадстваў і іх культур, вельмі спрыяе новаму ўспрыманню былой Рэчы Паспалітай і яе грамадзян. У цэнтры нашай увагі ў час даследавання сёння знаходзяцца людзі і іх культуры, а не дзяржава, як гэта было раней. Таталітарызмы XX ст. у сваіх самых розных формах праяўлення (фашызм, нацызм, камунізм) выразна абагаўлялі "сваю дзяржаву" як найвышэйшую форму грамадскага жыцця, пры гэтым кампрамітуючы, спадзяёмся, надоўга, усю перспектыву бачання мінулага праз прызму імперскіх дзяржаўных інтарэсаў. Палітычная філасофія Еўрапейскага Саюза сёння кіруецца прынцыпамі дапамогі, блізкімі да антыподу імперска-абсалютысцкай філасофіі, якая набывае ў апошнія стагоддзі ў Еўропе ўсё большае значэнне [3]. У той жа час "імперскія" гістарыяграфіі (расійская, пруская і габсбургская) на працягу некалькіх пакаленняў спрабавалі дыскрэдытаваць вобраз Рэчы Паспалітай як фарміравання, па сутнасці, няздольнага да жыцця [4]. Сёння ў новай гуманістычнай гістарыяграфіі ў цэнтры ўвагі знаходзіцца не моц дзяржавы, а людзі, іх правы, умовы жыцця, культуры ў самым шырокім сэнсе гэтага слова. Параўнальнае бачанне з'яў і цеснае міжнароднае і міжканфесійнае супрацоўніцтва становяцца асноўнай штодзённай практыкай гісторыкаў, робячы іх незалежнымі ад

[2] Bardach J. O dawnej i niedawnej Litwie. Poznań, 1988 і асабліва ў раздзеле "O świadomości narodowej Polaków na Litwie i Białorusi w XIX–XX wieku". S. 191–246, там жа літаратура.

[3] Параўн. уводзіны: Millon-Delsol C. Zasada pomocniczości. Kraków, 1995; Subsydiarność / Red. D. Milczarek. Warszawa, 1970.

[4] Serejski M. H. Europa a rozbiory Polski. Warszawa, 1970.

рознага роду націскаў улад ці меркаванняў, традыцыйна небяспечных для даследчыкаў. У посткамуністычных краінах атрыманне ў спадчыну характэрнага нацыянал-камунізму ў яго розных гістарыяграфічных праяўленнях патрабуе спецыяльнай увагі і сур'ёзнага крытычнага аналізу, неабходнага для аўтэнтычнай мадэрнізацыі нашай дысцыпліны [5].

ЮНЕСКО ў апошнія гады сфармулявала праграму фарміравання асноў цывілізацыі свету, адобраную ўсімі яго дзяржавамі. Адным з істотных пунктаў гэтай праграмы з'яўляецца супрацоўніцтва даследчыкаў над новым успрыняццем гісторыі, якое, па магчымасці, не з'яўляецца аднабаковым, і, што самае важнае, не дае аргументаў для напружання ці нават вайны [6]. У "пабудаванні міру ў чалавечым розуме", што з'яўляецца асноўнай мэтай ЮНЕСКО, гісторыя павінна іграць асаблівую ролю. У духу супрацоўніцтва вядзецца актыўная праца двухбаковых камісій па падручніках, у тым ліку і па цікавай для нас праблеме, — беларуска-польская, літоўска-польская і ўкраінска-польская камісіі дасягнулі ў апошнія гады надзвычай істотных вынікаў. Але цяпер становіцца больш важным наступны этап, а менавіта рэгіянальнае супрацоўніцтва шэрагу суседніх дзяржаў над агульнай гісторыяй такога шматдзяржаўнага абшару. З гэтай мэтай восенню 1997 г. была склікана пад апекай Генеральнага дырэктара ЮНЕСКО праф. Ф. Маёра, сумесная камісія ЮНЕСКО і Міжнароднага камітэта гістарычных навук (Commision International des Sciences Historiques — CISH) для падтрымкі такога роду супрацоўніцтва [7].

Гісторыкі Беларусі, Літвы, Украіны і Польшчы распачалі ў 1990 г. інтэнсіўнае супрацоўніцтва над новым разуменнем гісторыі сваіх краін і агульнай спадчыны Рэчы Паспалітай [8]. Вынікі аказаліся, дазвольце мне выказаць такое перакананне, важнымі і шматабяцаючымі ў перспектыве; хутка чатыры сінтэтычныя даследаванні будуць крытычна абмеркаваны ў нашай краіне і суседніх дзяржавах. Гэтыя працы мы расцэньваем як частку агульнай працы, прысвечанай усёй Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і яе месцу ў гісторыі Еўропы, якое па-ранейшаму з'яўляецца адкрытым і па-рознаму тракта-

[5] Параўн.: Historiografia krajów Europy Środkowo-Wschodniej / Red. J. Kłoczowski, P. Kras. Lublin, 1997 (Polska, Czechosłowacja, Węgry, Rumunia, była Jugosławia, Bułgaria — ze wstępem J. Kłoczowskiego).

[6] Kłoczowski J. Les historiens et la culture de la paix // Comité International des Sciences Historiques: Bulletin d'Information 23. Paris, 1996. P. 151–155 / Выступленне на пленарным пасяджэнні Сусветнага з'езду гісторыкаў у Монрэалі ў 1995 г.

[7] Пад старшынствам Е.Клачоўскага як асабістага прадстаўніка Генеральнага дырэктара ЮНЕСКО і з удзелам Генеральнага сакратара CISH Ф. Бедарыда.

[8] Зыходным пунктам стаў памятны з'езд у Рыме ў 1990 г. беларускіх, літоўскіх, польскіх і ўкраінскіх гісторыкаў: Bielarus, Lithuania, Poland, Ukraine: The Foudantions of Historical and Cultural Traditions in East Central Europe / Red. J. Kłoczowski i inni. Lublin; Rzym, 1994. Друкуецца том бюлетэня створанай у выніку рымскай ініцыятывы Федэрацыі інстытутаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы, у якім будзе паказана інтэнсіўнае супрацоўніцтва ў 90-я гг.

ваным [9]. Восенню 1998 г. вынікі супрацоўніцтва будуць прадстаўлены на спецыяльнай сесіі ЮНЕСКО і CISH у Дамбровіцы каля Любліна, гэта стане адпраўным пунктам ля наступных сесій, прысвечаных новай праграме на розных кантынентах, а ў перспектыве — сусветнага з'езду CISH у Осла летам 2000 г.

А. Міцкевіч і яго творчасць дасканала ўпісваюцца ў такую сучасную перспектыву даследаванняў. Наша так добра прадуманая канферэнцыя несумненна зробіць значны ўклад у сусветную гістарыяграфію.

II

Неабходнасць новых даследаванняў і новага ўспрымання Рэчы Паспалітай у еўрапейскай перспектыве XXI ст. становіцца ўсё больш выразнай. У перыяд інтэграцыйных працэсаў на нашым кантыненце федэратыўны вопыт польска-літоўскай дзяржавы, існаванне якой было выключна доўгім і трывалым, заслугоўвае асаблівай памяці і аналізу. Суіснаванне пад уладай агульнай дынастыі Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага ў 1385/6–1569 гг. прывяло да глыбокіх рэформаў, якія падрыхтавалі глебу для заключэння ў 1569 г. Люблінскай уніі як кампрамісу, што здзіўляе сваёй трываласцю. Федэратыўныя прынцыпы яе, нягледзячы на разнастайныя цяжкасці і напружанні, ніколі, па сутнасці, не падвяргаліся сумненню знутры [10]. Вялікі рэфарматарскі сейм у 1791 г. яшчэ больш яе ўмацаваў насуперак моцным цэнтралізацыйным тэндэнцыям, такой моцнай у Княстве была свядомасць сваёй своеасаблівасці пры адначасовым такім жа моцным усведамленні сваёй еднасці з Каронай [11]. Найбольшы крызіс у гісторыі федэрацыі звязваецца з няўдачай у XVII ст. яе ператварэння ў федэрацыю "трох палітычных народаў", а менавіта стварэння, побач з Каронай і Вялікім Княствам Літоўскім, Вялікага Рускага Княства з цэнтрам у Кіеве (Украіна) [12].

У Вялікім Княстве Літоўскім інтэграцыя палітычнай эліты літоўскага і рускага (беларускага) этнічнага паходжання была важнай з'явай, працяглай і зусім нялёгкай, але сваімі вынікамі, як аб гэтым сведчыць многае, выніковай; у XVI ст. мы можам гаварыць ужо з усёй адказнасцю аб поўнай інтэграцыі і дзяржаўнай свядомасці "палітычнага народа" Вялікага Княства. Добрым экзаменам для гэтай інтэграцыі стала працяглая вайна з Расіяй і захоп краіны, пачынаючы з 1655 г., якія выклікаў вялікае супрацьстаянне і

[9] Kłoczowski J. Europa Środkowo-Wschodnia w historiografii krajów regionu. Lublin, 1993 (тое ж самае ў англійскай і французскай версіях).

[10] Unia Lubelska i tradycje integracyjne w Europie Środkowo-Wschodniej (XVI–XX wiek) / Pod red. J. Kłoczowskiego i P. Krasa. Lublin, 1999.

[11] Bardach J. Konstytucja 3 Maja a Unia polsko-litewska // Przegląd Historyczny. 1991. Z. 4. Unia Lubelska.

[12] Unia Lubelska (шэраг тэкстаў); Sulima-Kamiński A. Republic vs Autocracy Poland-Lithuania and Russia. Cambridge Mass., 1993 (па праблеме Русі-Украіны на працягу XVII ст.).

абарону Вялікага Княства не толькі з боку шляхты, але і шырокіх народных мас (мяшчан, сялян). Адрознасць лёсаў Беларусі і Украіны таго перыяду праяўляецца выразна.

Еўрапейскай картай Рэчы Паспалітай з'яўляецца сіла і значэнне грамадзянскай супольнасці, арыгінальнасць — гэта проста неабходна падкрэсліць — шляхецкай эгалітарнай дэмакратыі з яе ладам, правамі чалавека, самакіраваннем і г. д. Шляхта надзвычай рознага паходжання, рознай рэлігіі, мовы, сацыяльнага становішча нарадзіла вялікае грамадства — каля мільёна людзей разам з сем'ямі, дыферэнцыяванае, але адначасова незвычайна моцна інтэграванае вакол каштоўнасцей, з якімі кожны член грамадства цалкам сябе атаясамліваў [13]. Мы маем тут справу з выключна цікавым, не толькі ў маштабе Еўропы, раздзелам гісторыі свабоды і дэмакратыі, якія абапіраюцца на правы асобы. Моцныя і слабыя бакі гэтага раздзелу варта занава ўспомніць і разгледзець у шырокай параўнальнай перспектыве, у перспектыве грамадскай гісторыі Еўропы, якая па-ранейшаму з'яўляецца сур'ёзным пастулатам і праграмай даследаванняў. Зразумела, што поўнае даследаванне Рэчы Паспалітай павінна ахапіць усе слаі грамадства, улічваючы асабліва занядбаныя аспекты ў галіне даследаванняў апошніх дзесяцігоддзяў, як, напрыклад, самакіраванне ў гарадскіх і сельскіх супольнасцях, што мелі свае правы, яўрэйскія супольнасці і г. д.

Адным з першых вялікіх крокаў шляхецкага грамадства Рэчы Паспалітай — дзяржавы, якая ўзнікла у 1569 г., стала прыняцце канстытуцыі аб рэлігійнай свабодзе ў 1573 г., якую падтрымалі амаль усе сеймікі велізарнай тады Рэчы Паспалітай. У гэтай падтрымцы з боку грамадства, якая адначасова сведчыла пра вялікую палітычную сталасць "палітычнага народа" на стадыі фарміравання, заключаецца таксама выключнасць такой з'явы, як талерантнасць XVI ст. у маштабе ўсяго хрысціянства розных веравызнанняў! [14]

Коратка неабходна нагадаць пра яшчэ адну перспектыву параўнальных даследаванняў, цесна звязаных са шляхтай Рэчы Паспалітай. Гаворка ідзе пра феномен шляхты ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і яго значэнне ў такіх краінах, як Венгрыя, Чэхія да пачатку XVII ст., але таксама крыху ў іншым маштабе — Інфлянты, Малдавія ці, напрыклад, казацкія старэйшыны з другой паловы XVII ст., мэты якіх надзвычай выразна скіраваны на стварэнне праслойкі паводле ўзору Рэчы Паспалітай. Украінскі гісторык

---

[13] Сціслы ўступ: Kłoczowski J. Les traditions de citoyenneté en Pologne et dans la République polono-lituano-ruthéne // Histoire des idées politiques de l'Europe Centrale / Red. C. Delsol i M. Masłowski. Paris, 1998. S. 229–237; Bardach J., Sydruk W. Społeczeństwo polskie i jego reprezentacja 1493–1993. Warszawa, 1995.

[14] Salmonowicz S. Konfederacja Warszawska 1573. Warszawa, 1985; Korolko M., Tazbir J. Konfederacja Warszawska 1573 roku, wielka karta polskiej tolerancji. Warszawa, 1980.

О. Субтэльны вылучыў гіпотэзу, якая заслугоўвае сур'ёзнай дыскусіі, пра паражэнне ўсёй гэтай шляхты перш за ўсё ў працяглых войнах на пачатку XVIII ст. Было гэта ў яго разуменні паражэнне пэўнай грамадскай мадэлі, характэрнай для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, у яе канфрантацыі з абсалютысцкімі сістэмамі суседзяў [15].

III

А. Міцкевіч нарадзіўся ўжо пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, вобраз якой вельмі моцна ўтрымліваўся не толькі ў памяці насельніцтва, але і многіх установах, правах, ва ўсім грамадска-культурным краявідзе краіны. Вялікае Княства Літоўскае аж да 20-х гг. XIX ст. знаходзілася ў лепшай сітуацыі ў параўнанні з землямі, акупаванымі Прусіяй ці Аўстрыяй. На малой радзіме паэта, у Навагрудку, гэта было відавочным, а пазней у Вільні, Адам апынуўся ў найбольш жыватворным у тыя гады польскім інтэлектуальна-універсітэцкім асяроддзі. Зварот да краіны дзяцінства і юнацтва будзе на працягу ўсёй творчасці Міцкевіча нязвыкла актыўным. Была гэта несумненна Літва — у маштабе Вялікага Княства — частка вялікай дзяржаўнай федэрацыі Польшчы; не было ніякіх супярэчнасцей у такім адначасовым называнні сябе ліцвінам і палякам. Заўважаў і з вялікай сімпатыяй успрымаў супольнасць насельніцтва Вялікага Княства "люд", які размаўляў таксама "па-руску", ці "па-літоўску". Неяк параўноўваючы ў сваіх лекцыях у Парыжы тры "дыялекты" рускай мовы, на першае месца і вельмі рашуча Міцкевіч паставіў менавіта мову, якая выкарыстоўвалася ў Вялікім Княстве. "Заходні, — гаварыў ён, — самы багаты, самы чысты, быў некалі мовай двара і канцылярыі вялікіх князёў Літвы, быў выдатна распрацаваны…" [16]. Ён здолеў усведаміць сябе славянінам, а агульнаславянскія культурныя сувязі былі яму асабліва блізкія.

Паэт меў грунтоўную інтэлектуальную падрыхтоўку, у тым ліку заходнюю, можна сказаць, лацінскую, і ўсё гэта ў дасканалым гуманітарна-універсітэцкім афармленні на найлепшым еўрапейскім узроўні. Міцкевіч — сапраўдны еўрапеец. Пакінуўшы родную краіну, ён выдатна ўпісаўся ў асяроддзе як заходніх інтэлектуалаў, так і расійскіх, дарэчы, у той час надзвычай "заходніх" пры ўсіх выразных адрозненнях паміж прыхільнікамі Захаду і расійскай своеасаблівасці.

Пасля паражэння паўстання 1830–1831 гг. Міцкевіч апынуўся ў эміграцыі, сярод эліты Рэчы Паспалітай, якая знайшла канчатковы прытулак

[15] Subtelny O. Domination of Eastern Europe Native Nobilities and foreign Absolutism 1500–1715. Kingston; Montreal, 1986.

[16] Пра выданне парыжскіх лекцый на французскай мове і польскіх перакладах гл.: Walicki A. Literatura słowiańska // Literatura polska: Przewodnik Encyklopedyczny. Warszawa, 1986. T. 1. S. 589–590; Mickiewicz A. Dzieła prozą / Wydał T. Pini. Nowogródek, 1933 T. 4–5; Mickiewicz A. Literatura słowiańska // Mickiewicz A. Dzieła / Wyd. narodowe. Warszawa, 1952–1953. T. 8–11. Цыт. па выд.: Mickiewicz A. Dzieła prozą. T. 4. S. 220.

пераважна ў Францыі. Парыж надоўга стаў палітычным і культурным цэнтрам Польшчы, а справа "вялікай эміграцыі", як яе пазней называлі, павінна была потым выконваць нечувана важную ролю ў жыцці і культуры палякаў, а ўскосна і ў гісторыі паволі ўзнікаючых ва ўлонні Рэчы Паспалітай нацыянальных культур [17].

Паўстанне 1830–1831 гг. канчаткова перакрэсліла надзею, якая раней, здавалася, была даволі рэальнай, — на адбудову Рэчы Паспалітай разам з Расіяй. Пры ўсіх падзелах ва ўлоннні "вялікай эміграцыі" генеральная лінія інтэлектуальных падыходаў і творчасці выразна выдзялялася. Падзяляў яе таксама Міцкевіч. Гэта была крытыка сучаснай сітуацыі з дамінаваннем "Святога саюза" дзяржаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, асабліва вострая ў адносінах да царскай Расіі, а затым настальгія і ідэалізацыя нацыянальнага мінулага Рэчы Паспалітай, якая нярэдка сягала далёка ў мінулае, у праславянскі перыяд, які, як правіла, высока ацэньваўся. Адначасова надзвычай важным было бачанне будучага, у прынцыпе аптымістычнае, якое звязвала перамогу Польшчы з перамогай свабоды ў Еўропе і пабудовай новага еўрапейскага ладу на руінах дэспатычных рэжымаў. Славутыя паэты і філосафы стваралі ў час палкіх спрэчак тэорыі-утопіі, нацыянальныя міфы, якія давалі надзею і падтрымлівалі калісьці "польскі народ", што ўвесь час успрымаўся як "народ Рэчы Паспалітай" — аж да ўзроўню "Хрыста народаў", які церпіць дзеля свайго збавення і збавення ўсіх людзей.

1832–1834 гг. сталі, як вядома, кульмінацыйным момантам у паэтычнай творчасці Міцкевіча, даючы яму званне нацыянальнага Вешчуна, а адначасова ў значнай ступені і Вешчуна ідэі свабоды ў Еўропе [18]. "Кнігі польскага народа" і "Кнігі польскага пілігрымства", хутка перакладзеныя на шматлікія мовы, прынеслі яму славу апостала свабоды. Прызначэннем Польшчы, пад якой будзем разумець Рэч Паспалітую, з'яўляецца захаванне веры і свабоды для ўсіх людзей. III частка "Дзядоў" абагульняе ў нейкай ступені віленскі вопыт, удзельнікам якога быў Міцкевіч, як прыклад злачыннага дэспатызму і з'яўляецца адначасова відам маніфеста барацьбы свабоды з дэспатызмам. "Пан Тадэвуш", які мае зусім іншы характар, паволі таксама становіцца нацыянальнай паэмай выключнага ўзроўню не толькі для будучых пакаленняў палякаў. Добра акрэсліў гэтую выключнасць Станіслаў Ворцаль, яшчэ прадстаўнік пакалення "вялікай эміграцыі", яе крайне левага крыла: гэта "надмагільны камень, пакладзены рукой генія на

[17] Кароткія ўводзіны ў праблематыку польскай думкі ў першай палове XIX ст. у кн.: Jedlicki J. Narodowość a cywilizacja // Uniwersalizm i swoistość kultury polskiej / Red. J. Kłoczowski. Lublin, 1990. T. 2. S. 7–34; Walicki A. Uniwersalizm i narodowość w polskiej myśli filozoficznej i koncepcjach mesjanistycznych epoki Romantyzmu (po roku 1831). S. 35–60.

[18] Пра асобныя творы параўн. уступную інфармацыю ў кн.: Literatura polska: Przewodnik Encyklopedyczny. Warszawa, 1985–1986. T. 1–2.

нашу старую Польшчу”. Але ў той жа час гучанне паэмы з’яўляецца аптымістычным, выказвае веру ў атрыманне незалежнасці і падтрымку сялян як паўнапраўных грамадзян новай Польшчы.

IV

За гісторыю Польшчы — Рэчы Паспалітай — Міцкевіч узяўся з усёй самаадданасцю ў пазнейшы перыяд свайго выгнання. Лекцыі па славянскай літаратуры ў Калеж дэ Франс у 1840–1844 гг. складаюць тут аснову. Іх аўтар часта выходзіць за межы параўнання саміх літаратур, выкладае свой погляд на гісторыю і культуру славянскіх краін з Польшчай і Расіяй на чале.

У цікавай для нас галіне трэба было б засяродзіцца на тым бачанні польска-літоўскай Рэчы Паспалітай, якой Міцкевіч быў непасрэдным нашчадкам. Выходным пунктам была тут, вядома ж, польска-літоўская унія. “Гэтая з’ява была найважнейшай, станоўчай у гісторыі поўначы…” — казаў А. Міцкевіч, асабліва падкрэсліваючы ролю Ягелонаў у давядзенні справы да канца. “На працягу ўсяго панавання Ягелонаў пастаянныя іх намаганні, скіраваныя на дасягненне сваёй мэты, здолелі нарэшце спалучыць два народы. Здаецца, гэта адзіны ў гісторыі прыклад абсалютнага зліцця двух плямёнаў без праліцця адзінай кроплі крыві…” Такім чынам, — падкрэсліваў ён, — “славянская унія, — так характэрна яе ён акрэсліваў! — існуе да сённяшняга дня” [19].

Ідэалізаваны вобраз Польшчы — Рэчы Паспалітай — у перыяд яе росквіту, у XVI–XVII стст., які малюе Міцкевіч, з’яўляецца, з аднаго боку, выражэннем глыбокай прывязанасці, настальгіі, з другога — указаннем асноўных каштоўнасцей, да якіх павінна звяртацца будучае грамадства. Менавіта таму традыцыі і вопыт Рэчы Паспалітай з’яўляюцца для яго такімі важнымі. Для выяўлення вобраза ён асабліва акцэнтуе ўвагу на адрозненнях паміж расійскімі і польскімі традыцыямі. Расія — гэта волат, які вырас з Вялікага Княства Маскоўскага. “Сродкі, мэты, планы, сіла гэтай магутнасці — усё гэта сабрана ў духу вялікіх людзей, што заступаюць на трон гэтай дзяржавы, якую мы назвалі фінска-рускай… Дух пануючага ўладыкі — ва ўсім. У духу яго пружына і мэта ўсіх пачынанняў. Усе яму служаць. Служба — гэта дэвіз Расіі. Хто не на царскай службе, той лічыцца нявольнікам, ён нішто ў дзяржаве” [20].

Польшча з’яўляецца абсалютнай супрацьлегласцю такой сітуацыі. Там рашаюць не вялікія адзінкі, а супольнасць грамадзян. “Ядром Польскай дзяржавы з’яўляецца з’езд, сход, сеймікі. Уся гісторыя Польшчы складаецца з пастаноў разнастайных з’ездаў… Для ўсёй Рэчы Паспалітай… ма-

[19] Пра ягелонскі перыяд лекцыя 14–26 сакавіка 1841 г. Гл.: Mickiewicz A. Dzieła prozą. T. 4. S. 98 i nast.

[20] Тамсама. Т. 5. С. 103.

ральным вогнішчам з’яўляецца вялікі ўсеагульны з’езд, або сейм…” [21]. Але сейм гэты не мае правоў і не кіруе дзяржавай, чым і адрозніваецца ад іншых сходаў такога тыпу. Збіраецца толькі, — падкрэслівае паэт, — каб вырашыць якую-небудзь праблему і выказаць меркаванне аб яе слушнасці”.

Самым важным у краіне з’яўляецца пазіцыя саміх грамадзян, вольных людзей, якія добраахвотна і з поўным перакананнем ў мэтазгоднасці справы бяруцца за яе рэалізацыю. Само паняцце грамадзянства, грамадзянскіх правоў як асаблівай каштоўнасці мае тут асноўнае значэнне. “Паводле польскіх паняццяў, — цытую Міцкевіча, — асоба, уваходзячы ў якасці неаддзельнай часткі ў склад палітычнай супольнасці, не губляе сваіх элементарных правоў, яна можа заўсёды выйсці з гэтай супольнасці. Такая свабода сягае самай далёкай мэты. У час розных палітычных меркаванняў адзінка можа адмовіцца ад асабістай свабоды, але мае таксама права патрабаваць гэтай вольнасці для сябе. Гэта вядзе за сабой пастаяннае ахвяраванне свабодай, падобнае да таго ахвяравання, якога патрабуе рэлігія ад сумлення чалавека. Грамадзянін падпарадкоўваецца грамадству не таму, што ён быў унесены ў яго спісы сваімі продкамі, а таму, што ён сам гэтае грамадства ўспрымае як самае справядлівае, самае прыгожае і самае лепшае. Асоба захоўвае права не толькі пакінуць гэтае грамадства, але нават затрымаць яго ў руху, калі бачыць, што яно саступае на памылковы шлях і не выконвае сваёй місіі” [22].

Гэтая доўгая цытата дазваляе лепш зразумець думку Міцкевіча, вагу свабоды, якая сягае “да самай далёкай мяжы”. Нідзе ў свеце, — сцвярджае ён з перакананнем, — не было аналагічнага прыкладу забеспячэння такой свабоды асобы”. Бо яе грамадзяне добраахвотна ішлі на вайну, плацілі падаткі, нават выносілі прысуды. Публічная, грамадзянская думка іграла тут велізарную, рашаючую ролю, як і рэлігійная санкцыя, без якой “нельга зразумець польскую гісторыю”. Установы Рэчы Паспалітай ў такім разуменні мелі, перш за ўсё, адукацыйныя мэты; “іх мэтай было развіваць чалавечы дух, пастаянна яго падтрымліваць на ўздыме, прымушаць яго з кожным разам усё вастрэй адчуваць сваю годнасць, усё лепш разумець свае абавязкі” [23]. Разумныя грамадзяне ўмелі прымаць самыя разнастайныя рашэнні, якія служылі агульнай карысці. Напрыклад, сейм, які аднойчы прызнаваў вета, іншы раз ператвараўся ў канфедэрацыйны сейм, дзе ў час тайнага га-

---

[21] Ідэал Рэчы Паспалітай — Польшчы прадставіў Міцкевіч у лекцыі 25–27 чэрвеня 1843 г. Тамсама. Т. 5. С. 102 і наст. Mickiewicz A. Dzieła. T. 11. S. 184–197.

[22] Лекцыя 5 ад 7 студзеня 1842 г. Гл.: Mickiewicz A. Dzieła prozą. T. 4. S. 208; Mickiewicz A. Dzieła. T. 10. S. 63–64.

[23] Усе цытаты ў дадзеным абзацы ўзяты з лекцыі, прачытанай 27 чэрвеня 1843 г. Гл.: Mickiewicz A. Dzieła prozą. T. 5. S. 105.

ласавання вырашала большасць галасоў. А ў перыяд безуладдзя ўмелі нават увесці дыктатуру, паколькі адсутнічаў кароль, які "быў гарантыяй свабоды" [24].

Міцкевіч разумеў, што стварае ідэалізаваны вобраз Рэчы Паспалітай. "Мы намалявалі тут, — гаварыў ён з кафедры Калеж дэ Франс, — ідэал стану Польшчы, але яму было далёка да таго, каб Польшча яго рэалізавала". Драматызм яе ў тым, што яна была адзінокай, бо іншыя краіны, уся Еўропа выбралі іншы шлях. "Уся Еўропа, — сцвярджаў ён з горыччу, — ідучы ў матэрыялізм, схаластыку, фармалізм, метафізіку, не магла зразумець такога жыцця, прысутнага паўсюдна, выступаючага па-рознаму, і абвясціла яго хаосам; Еўропа выступіла супраць Польшчы…" [25]

Вельмі крытычна глядзіць Міцкевіч як даследчык свабоды амаль на ўсю эвалюцыю Еўропы XVIII ст. Яго крытыка ахоплівае і ўсю дзейнасць Пятра Вялікага, і Французскую рэвалюцыю, і Канстытуцыю 3 Мая ў Рэчы Паспалітай. Расія з Пятром на чале канчаткова адступае ад былога "славянскага духу", які цаніў чалавека і яго свабоду, умацоўвае рэжым прымусу, бюракратыі, паліцэйскіх даносаў [26]. У Рэчы Паспалітай перамагла "спакуса ўжывання"; "польская шляхта, якая пераўтварыла Польшчу ў час панавання Саксонцаў… у паўсюдны і бесперапынны кірмаш, аддалася весялосці і самым аптымістычным спадзяванням, якія не мелі пад сабой падставы… Шляхта сама, замыкаючыся ў Рэчы Паспалітай, хацела забараніць уступленне ў яе ўсім, хто не меў шляхецкіх кляйнотаў, мела намер застацца кастай і тым самым паклала канец свайму існаванню" [27].

Памылкай Вялікага сейма 1788–1792 гг., — на думку Міцкевіча, — заключалася ў парушэнні "фундаментальных правоў Рэчы Паспалітай", такіх, напрыклад, як выбар караля ці liberum veto, якія, будзем памятаць, з'яўляліся ў "ідэале Польшчы" асноўнай каштоўнасцю. Толькі адно палажэнне у Канстытуцыі 3 Мая 1791 г. паходзіла з уласных традыцый, а іменна "думка прывядзення да роўнасці ўсіх членаў Рэчы Паспалітай… Згодна з дакладным падлікам, за пяцьдзесят гадоў усе палякі сталі б шляхтай, г. зн. усе члены Рэчы Паспалітай мелі б аднолькавыя правы і прывілегіі" [28].

---

[24] Mickiewicz A. Dzieła prozą. T. 4. S. 105.

[25] Тамсама.

[26] Ацэнка Пятра I і яго перыяду кіравання дадзена ў лекцыі 7 ад 18 студзеня 1842 г. Гл.: Тамсама С. 213 і наст. Распачатая яшчэ ў сярэдзіне XVII ст., на думку Міцкевіча, тайнае следства і тайная канцылярыя, пашыраныя Пятром I і тайнай паліцыяй, мелі драматычныя наступствы для насельніцтва; з часам тайныя расследаванні поўнасцю выцеснілі адкрытыя працэсы і незалежныя суды. "Такім чынам, славянскія звычаі і ўяўленні знікалі ўсё ў большай ступені".

[27] Гл.: Mickiewicz A. Dzieła prozą. T. 5. S. 106.

[28] Ацэнка польскіх рэформ і Вялікага сейма дадзена ў лекцыі 17 ад 15 сакавіка 1842 г. Гл.: Тамсама. Т. 4. С. 253–254.

VI

Ідэалізацыя Рэчы Паспалітай, яе залатога веку ў А. Міцкевіча зусім не насіла характару кансерватыўнай утопіі, уласцівай таму перыяду, напрыклад, расійскім славянафілам. Падобна і ідэалізацыя старажытных славян, іх свабодных грамадаў, "чалавечнасці", якая была агульнай як для нашага паэта, так і гісторыкаў і славянафілаў іншых краін, мела ў Міцкевіча іншае канчатковае гучанне. Бо ў яго вельмі ж ужо моцным быў элемент надзеі на лепшае заўтра, так заўважальны ў творчасці, як і ў чарговых акцыях, рэалізаваных ім да апошніх дзён жыцця з самым вялікім перакананнем і прысвячэннем сябе справе. Гэта была, як і ў многіх іншых людзей "вялікай эміграцыі", хутчэй утопія тысячагоддзя, характэрная для хіліястаў-міленарыстаў, якія верылі ў новую эпоху "царавання Хрыста" на свеце [29]. Вялікая дарога Рэчы Паспалітай павінна была тут стаць новай дарогай для Еўропы і свету, напоўненых дэмакратыяй, свабодай, братэрствам, мірам.

Але тут павінен з'явіцца, і гэта мой асноўны тэзіс, "новы дух", які прыдасць рашаючы імпульс для стварэння "новага свету". Тут Міцкевіч да канца верыць у славян, бо гэта ж "рэлігійны, просты, добры і моцны… род". Братэрства славян і ліквідацыя старых спрэчак тут проста неабходныя. "Трэба, каб у тым духу чэхі, палякі і рускія пабачылі, што з'яўляюцца братамі" [30]. Калыскай новага духу — адносна гэтага Міцкевіч не сумняваецца — будзе, аднак, Рэч Паспалітая.

"Гэтая калыска не можа быць дзе-небудзь у іншым месцы, — заяўляе ён ў канцы трэцяга года сваіх лекцый, — чым сярод людзей [вядома ж, Рэчы Паспалітай. — *Е. К.*], якія сярод славянскіх народаў цярпелі найбольш, найбліжэй да Еўропы знаходзіліся, найбольш у Еўропы запазычвалі і найбольш Еўропе служылі. У кожным з гэтых момантаў першынство належыць польскаму народу. На такі прывілей ён заслужыў не дзякуючы сваім гераічным учынкам, а доўгімі і страшнымі пакутамі […] Мінулі […] часы, калі народы казалі: кожны ў сябе, кожны для сябе. Ад чаго ж залежаў бы прагрэс народаў, калі б яны не імкнуліся да збудавання рэлігійнага, палітычнага і сацыяльнага адзінства ?.. " [31]

Co oznacza powiedzenie: "wlazłem w ballady"? Jest to wyraźny skręt od klasycyzmu ku romantyzmowi. A taki skręt nie byłby możliwy bez bodźca, którym dla poety stała się znajomość z utworami Schillera, Goethego, Waltera Scotta, przede wszystkim zaś z ich balladami. Prawie jednocześnie poeta zapoznał się z najwybitniejszym przedstawicielem angielskiego romantyzmu Georgiem Gordonem Byronem. Otóż w liście do Józefa Jeżowskiego z dn. 8/20 maja 1820 r. poeta pisze, że pieśni przybyłych swymi łodziami do Kowna niemieckich żeglarzy przypominają mu śpiewy korsarzy Byrona. W pisanej na przełomie lat 1821–1822 przedmowie do pierwszego tomu "Poezyj" pt. "O poezji romantycznej" imię Byrona znajduje się wśród cytowanych i wymienianych autorów. A w liście do Franciszka Malewskiego z dn. 23 stycznia/4 lutego 1822 r. Mickiewicz wyraził swój pogląd na angielskiego barda w następujący sposób: "Po germanomanii nastąpiła brytanomania; cisnąłem się z dykcjonarzem w ręku przez Szekspira, jak bogacz ewangeliczny do nieba przez uszko od igiełki. Za to teraz Bajron idzie daleko łatwiej i już bardzo znacznie postąpiłem. *Dżaura* zapewne wytłumaczę. Wszakże ten może największy poeta nie wypędzi z kieszeni Szyllera; odkrycie w nowej edycyjce kilku nie czytanych poezji długo nie dało mi wrócić do angielszczyzny".

W przeciwieństwie do klasycystycznych twórców, a szczególnie epigonów tego kierunku, owi autorzy otworzyli przed Mickiewiczem przede wszystkim nowe horyzonty w przedstawianiu duszy i uczuć ludzkich, przedstawili przykłady osobowości, które wyróżniały się wśród tłumu swoimi nieokieznanymi namiętnościami i niezwykłą wrażliwością, co powodowało szczególnie dotkliwe ich konflikty ze społeczeństwem.

Lektury wileńskie i kowieńskie — Schiller, Goethe, Gottfried August Bürger ("Leonora"), Wasyl Żukowski ("Ludmiła") uczyli młodego poetę również tajemnic formy — zachęcały do ballad. A Byron posłużył przykładem tworzenia romantycznego eposu. Naśladując "Korsarza", Larę", "Narzeczoną z Abydos" angielskiego poety oraz inne utwory tegoż gatunku, Mickiewicz stał się prekursorem popularnej w literaturze polskiej i charakterystycznej dla romantyzmu powieści poetyckiej. Pierworodne dziecię tego gatunku — to "Grażyna", nazwana przez samego poetę mianem "powieści litewskiej". W 1825 r. w ślady Mickiewicza poszedł jeden w przedstawicieli tak zwanej ukraińskiej szkoły ro-

mantycznej, Antoni Malczewski ze swym poematem "Marja. Powieść ukraińska". Najbardziej bajronicznym utworem Mickiewicza jest ogłoszony drukiem w 1828 r. w Rosji poemat "Konrad Wallenrod".

Do stworzenia romantycznych obrazów w "Grażynie" i "Konradzie Wallenrodzie" materiału dostarczyło piśmiennictwo historyczne, przedstawiające w udokumentowany sposób przeszłość etnosu poety. Tymczasem w balladach zostało wykorzystane doświadczenie tegoż etnosu zakodowane w twórczości ludowej językiem mitologii. Twórczość ludowa posłużyła również jako materiał w powstałych w okresie wileńsko-kowieńskim "Dziadach" części II i IV. To był debiut polskiego dramatu romantycznego. W tym utworze poeta w sposób nowatorski połączył fantastyczne wizje ludowe ze swymi osobistymi przeżyciami. Toteż dotykamy tu trzeciego źródła romantyzmu poety — to jego osobisty świat intelektualny i emocjonalny. Do wyrażenia tego świata niezbędna była taka forma poetycka, której nie mogła dostarczyć literatura tworzona w oparciu o zasady klasycyzmu.

Są w "Konradzie Wallenrodzie" piękne strofy:

> Biada, mówił, niewiastom, jeśli kochają szaleńców,
> Których oko wybiegać lubi za wioski granice,
> Których myśli jak dymy wiecznie nad dach ulatują;
> Których sercu nie może szczęście domowe wystarczyć.

Czy potrafilibyśmy sobie wyobrazić drogę twórczą Mickiewicza, gdyby fatalistyczna miłość do Maryli nie uczyniła z poety takiego szaleńca? Nie należy wątpić, że napisałby i stworzył by nawet genialne dzieła, ale nie czytalibyśmy zapewne II ani IV części "Dziadów", ani "Grażyny", ani może "Konrada Wallenroda". Mickiewicz z czasem zapewne przyłączyłby się do romantyzmu, ale ta żywiołowa miłość niezwykle szybko sprawiła, że poeta wyrzekł się właściwych klasycyzmowi "chorejów" i "jambów", przestał zamęczać się z powodu niepowodzenia "Kartofli" i "Demostenesa" i zaczął poszukiwać bardziej owocnych dróg, które wskazywał romantyzm.

Przekład Alicji Rybałko

Януш Адрованж-Пянёнжак *(Варшава)*

ГОД МІЦКЕВІЧА Ў ПОЛЬШЧЫ І Ў СВЕЦЕ

Мне хацелася б найперш падзякаваць арганізатарам канферэнцыі за запрашэнне — каб я пазнаёміў Вас са справамі, якія датычацца 200-й гадавіны з дня нараджэння Адама Міцкевіча, з усім тым, што ўжо зроблена і што будзе яшчэ рабіцца ў юбілейным годзе.

Спачатку трэба нагадаць, што ўжо ў 1993 г., або за пяць гадоў да юбілею, у Варшаве быў створаны Агульнапольскі міцкевічаўскі камітэт. Узна-

чаліў яго праф. Чэслаў Згажэльскі, вядомы міцкевічазнавец, якога з Вільняй і Навагрудчынай звязваюць месца нараджэння, вучоба і дзейнасць у час акупацыі — ён аўтар выдатнай апрацоўкі вершаў Паэта ў навуковым выданні Збору твораў Міцкевіча, несумненна самы вялікі міцкевічаўскі аўтарытэт пасля смерці праф. Конрада Гурскага. У гэты камітэт былі запрошаны, перш за ўсё, вучоныя-паланісты, якія займаюцца жыццём і творчасцю Міцкевіча, як польскія, так і замежныя, а таксама публіцысты і мастакі, сярод якіх — Чэслаў Мілаш, Карл Дэдэціус, прафесары Даніель Бавуа, Санта Грачыёці і іншыя замежныя славутасці.

Тры гады таму назва камітэта была зменена на: Камітэт па святкаванню 200-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча. Прафесар Згажэльскі стаў яго ганаровым старшынёй, а дзеючым старшынёй быў выбраны аўтар дадзенага выступлення. Не так даўно Камітэт панёс вялікую страту — у жніўні 1996 г. памёр прафесар Згажэльскі, не стала таксама такіх членаў Камітэта, як прафесар Рышард Казімеж Ляванскі, прэзідэнт Accademia Polacca Adamo Mickiewicz у Балоніі, прафесар Міхал Віткоўскі з Познанскага універсітэта імя Адама Міцкевіча і Артур Мендзыжэцкі, прэзідэнт Польскага ПЭН-клуба. Памерла таксама Анна Каўпуж з Вільні.

Наш Камітэт дзейнічае пры Інстытуце літаратурных даследаванняў Польскай акадэміі навук, а ўстановамі, якія вядуць асноўную працу, з'яўляюцца Літаратурнае таварыства імя Адама Міцкевіча і Літаратурны музей імя Адама Міцкевіча ў Варшаве. Задачай Камітэта з'яўляецца падрыхтоўка, садзейнічанне і нагляд за мерапрыемствамі, прысвечанымі 200-й гадавіне з дня нараджэння Вешчуна. Праграма дзейнасці Камітэта складаецца з чатырох накірункаў: выдавецкага, навуковых сесій, выставак і конкурсаў, а таксама іншых ініцыятыў.

Першы, і, бадай, найважнейшы накірунак — гэта выдавецкая дзейнасць, і перш за ўсё, гэта выданне твораў Міцкевіча. З нагоды 200-годдзя вядзецца работа над запланаваным на працяглы перыяд навуковым выданнем Твораў А. Міцкевіча ў 27 тамах пад рэдакцыяй праф. Зофіі Стафаноўскай і др., Марыі Прусак. Выданне будзе ўпершыню змяшчаць навукова апрацаваныя творы французскага перыяду ў арыгінале. Пры падрыхтоўцы парыжскіх публічных лекцый будуць улічаны неапублікаваныя раней фрагменты, якія захоўваюцца ў копіях стэнаграм. Крытычны апарат ахопіць усе варыянты тэкстаў Міцкевіча. Над гэтым выданнем ужо вядзецца работа, якая ў значнай меры фінансуецца Камітэтам навуковых даследаванняў.

Другой, досыць хутка ажыццёўленай ініцыятывай (выдадзена ўжо 6 тамоў), з'яўляецца навукова-папулярнае выданне Твораў у выдавецтве "Чытэльнік" пад грыфам Літаратурнага таварыства імя Адама Міцкевіча (навуковыя рэдактары прафесар Чэслаў Згажэльскі і Збігнеў Ежы Новак, якія ўжо памерлі, а таксама Зофія Стафаноўска і Марыя Прусак). Падставай для вы-

дання паслужыў Збор твораў, выдадзены ў 1955 г., — так званае Юбілейнае выданне (неабходна заўважыць, што з таго часу, на працягу ўсіх гэтых 40 гадоў, не з'явілася ніводнага шматтомнага выдання твораў Міцкевіча), выпраўленае, дапоўненае, у пераважнай частцы падрыхтаванае нанава літаратуразнаўцамі акадэмічных колаў і Інстытута літаратурных даследаванняў ПАН. Выданне складаецца з 17 тамоў; будзем спадзявацца, што апошнія з іх з'явяцца ў юбілейным годзе.

Наступнай важнай справай з'яўляецца выданне рукапісаў Міцкевіча ў фотаздымках. Да найбольш пільных задач (з прычын як навуковых, так і стану гэтых рукапісаў) належыць апублікаванне:

• "Вершаў Адама Міцкевіча ў рукапісах", ч. 2 у апрацоўцы Чэслава Згажэльскага. Дадзены том ужо падрыхтаваны, ляжыць у Асалінэуме і чакае датацыі, якую Камітэту абяцаў міністр культуры і мастацтва. Менавіта гэтым выдавецтвам быў апублікаваны ў 1973 г. першы том — "Рукапісы вершаў у фотакопіях".

• Неабходна ў такім жа выглядзе, як мага хутчэй, выдаць "Дзяды", частку III — чарнавік і чыставік з бібліятэкі ў Курніку. Устаноўлена, што абодва рукапісы блякнуць і становяцца невыразнымі. На выданне мы атрымалі датацыі.

• Аналагічная сітуацыя склалася і з рукапісам "Гяура", а таксама з прозай Міцкевіча, між іншым, з захаванымі рукапісамі артыкулаў. Неабходна таксама выдаць фотакопіі рукапісу "Першыя стагоддзі гісторыі Польшчы", знойдзенага ў Балонні.

Асобнай праблемай з'яўляецца "Хроніка жыцця і творчасці Адама Міцкевіча". Гэта, мяркуючы па ўжо існуючых тамах, — фундаментальная праца ў выглядзе календара, аднак больш дакладная, чым іншыя, і не толькі польскія, выданні такога тыпу. Нягледзячы на розныя катаклізмы, захавалася вялікая колькасць біяграфічных дакументаў, паколькі сучаснікі разумелі, што Міцкевіч — вялікі польскі паэт і што важнай з'яўляецца кожная звязаная з ім драбніца. Выданне, ініцыятарам і кіраўніком якога, пачынаючы з першага тома, апублікаванага ў 1957 г., быў прафесар Станіслаў Пігань, налічвае ўжо сем тамоў. Зусім нядаўна з'явіўся том, які ахоплівае 1834–1840 гг., аўтарам якога з'яўляецца Марыя Дэрналовіч. Сабраны нябожчыкам прафесарам Сямёнам Ландай у Ленінградзе матэрыял, што датычыць перыяду 1824–1829 гг., г. зн. перыяду расійскага, патрабуе навуковага рэдагавання. Том, які ахоплівае перыяд 1829–1832 гг., рыхтуе доктар Януш Рушкоўскі з Познаньскага універсітэта імя Адама Міцкевіча. Ён знаходзіцца на этапе збору матэрыялаў. Не хапае сродкаў на даследаванне перыяду знаходжання Міцкевіча ў Рыме і Неапалі, а таксама на выданне гэтага тома.

Наступнай выдавецкай задачай з'яўляюцца лісты Адама Міцкевіча, якія рыхтуе для навуковага і навукова-папулярнага выдання калектыў пад кіраў-

ніцтвам доктара Марыі Дэрналовіч. Ужо праверaны і апісаны айчынныя рукапісы. Дадатковых даследаванняў і фінансавых сродкаў патрабуе праца над тэкстамі, якія знаходзяцца ў Польскай бібліятэцы і Музеі Міцкевіча ў Парыжы. Неабходна адзначыць, што кожны год прыносіць тут новыя знаходкі, пераважна гэта невялікія лісты паэта, а таксама лісты да яго.

У названым кантэксце ўзнікае праблема лістоў, адрасаваных Адаму Міцкевічу. Вырашэнне праблемы поўнага выдання карэспандэнцыі, скіраванай да Паэта, якую бярэцца апрацаваць доктар Эльжбета Яворска, лічу вельмі патрэбным. Ёсць у гэтым частка волі самога Міцкевіча, які перад ад'ездам у Турцыю ў 1855 г. перагледзеў свой архіў, частку лістоў спаліў, а тыя, якія пакінуў (а іх было больш за 800) павінны былі служыць нашчадкам. Сёння яны знаходзяцца ў Музеі А. Міцкевіча ў Парыжы. Да іх далучаны некалькі дзесяткаў лістоў, знойдзеных пазней і няблага захаваных у копіях у іншых калекцыях, а таксама вялікая колькасць лістоў філаматаў (сёння яны знаходзяцца ў калекцыях бібліятэкі Люблінскага каталіцкага універсітэта і Літаратурнага музея ў Варшаве).

Найбольшую колькасць лістоў, скіраваных да Паэта, апублікаваў у розных выданнях яго сын Уладзіслаў, аднак там многа недакладнасцей і прапускаў. Некалькі соцень аўтараў лістоў прадстаўляюць розныя асяроддзі: ад віленскіх філаматаў, расійскіх літаратараў, прадстаўнікоў парыжскага асяроддзя да еўрапейскіх палітыкаў перыяду 1848–1855 гг. Дадзеная карэспандэнцыя ахоплівае перыяд у 40 гадоў. Аўтары ў сваіх лістах апісваюць асабістыя справы, закранаюць праблемы паэзіі, палітыкі і г. д., а з іх вырысоўваецца вобраз эпохі, і ўсе яны яшчэ больш цікавыя таму, што адрасаваны такой знакамітай асобе.

Іншыя выдавецкія ініцыятывы пералічу коратка: міцкевічаўская аб'ектыўная і суб'ектыўная бібліяграфія рыхтуецца да выдання ў выглядзе асобнага тома — так званага "Новага Корбута", г. зн. бібліяграфіі польскай літаратуры. Вядзецца работа па рэканструкцыі следства і суда над філаматамі з апублікаваннем дакументаў, між іншым, нідзе яшчэ не друкаваных, турэмных запісак (грыпсаў) філаматаў, а таксама іх карэспандэнцыі ў ссылцы (заканчэнне распачатага ў 1973 г. выдання архіва філаматаў "У ссылцы"). Пытанне аб успрыняцці Міцкевіча асвятляе кніжка Доры Кацнельсон з Драгобыча, якая змяшчае судовыя дакументы з расійскіх і галіцкіх архіваў, што служаць доказам рэпрэсій за чытанне Міцкевіча. Яна патрабуе старанага рэдагавання.

У сектары літаратуры рамантызму Інстытута літаратурных даследаванняў вядзецца падрыхтоўчая работа па ўкладанню "Энцыклапедыі Міцкевіча" пад рэдакцыяй праф. Яраслава Марэка Рымкевіча. На гэта атрыманы грант ад Камітэта навуковых даследаванняў. У Міцкевічаўскі год плануецца ўзнавіць навуковыя працы пра Адама Міцкевіча, у тым ліку, напрыклад,

Віктара Вайнтраўба, Юліуша Кляйнера, Вацлава Баровага. Актуалізаваць каталог рукапісаў паэта абяцае Польская бібліятэка ў Парыжы.

Затым скажу некалькі слоў *pro domo mea*, або аб выданнях Літаратурнага музея імя Адама Міцкевіча ў Варшаве. Каталог рукапісаў нашага музея, том першы, пад назвай "Польская літаратура XIX ст. і Міцкевічыяна" ўжо надрукаваны. У плане — каталог пастаяннай выстаўкі, прысвечанай Міцкевічу (пра саму выстаўку скажу некалькі пазней). Плануем таксама выдаць інфарматар-даведнік і каталог міцкевічаўскіх памятных рэчаў, якія знаходзяцца ў Польшчы, Літве, Беларусі і Расіі. Ведаю, што такі ж том з дакументацыяй памятных рэчаў, якія сёння застаюцца ў Заходняй Еўропе і Турцыі, мае намер падрыхтаваць Польская бібліятэка ў Парыжы. Будзе выдадзены (матэрыял у асноўным ужо сабраны) міцкевічаўскі том "Блокблакнота Літаратурнага музея" № 12, дзе будуць апублікаваны, між іншым, два невядомыя лісты Міцкевіча, а таксама ў рамках цыкла "Выявы польскіх пісьменнікаў" — першы сшытак пад назвай "Адам Міцкевіч" з пералікам усіх выяў Паэта, якія знаходзяцца ў музеі, з даўніх гадоў і да сённяшняга дня.

Нарэшце — новыя пераклады. Імкнемся дапамагчы ў выданні новага расійскага перакладу "Пана Тадэвуша", ажыццёўленага знакамітым перакладчыкам Святаславам Свяцкім з Пецярбурга, а таксама параўнаўчага тлумачэння "Крымскіх санетаў" прафесара Пятра Маршэсані.

Асноўнай урачыстасцю, прымеркаванай да 200-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча, будзе Міжнародная навуковая канферэнцыя пад назвай "Адам Міцкевіч: Традыцыя і наватарства", якая адбудзецца ў кастрычніку 1998 г. у Варшаве і Познані з выездамі ў міцкевічаўскія мясціны Вялікапольшчы. Арганізатарамі яе будуць Інстытут літаратурных даследаванняў ПАН і Познаньскі універсітэт імя Адама Міцкевіча.

Ягелонскі універсітэт арганізаваў у другім квартале 1998 г. дзве сесіі. Адна — пад назвай "Пан Тадэвуш" і яго ўплыў на польскую літаратуру". Другая была прысвечана мове твораў Міцкевіча і мове ўсходняга пагранічча. Познаньскі універсітэт імя Адама Міцкевіча наладзіў студэнцкую сесію, прысвечаную Міцкевічу, а Міжнародную канферэнцыю "Вільня і зямля міцкевічаўскай памяці" — філіял Варшаўскага універсітэта ў Беластоку. У лістападзе 1998 г. адбудзецца міцкевічаўская канферэнцыя ў Інстытуце мастацтва ПАН. З'езд славістаў у Кракаве таксама быў часткова прысвечаны міцкевічаўскай тэматыцы.

А цяпер пра замежныя сесіі. Несумненна, цэнтральнай тут стане Міжнародны калоквіум "Міцкевіч – Францыя – Еўропа" ў парыжскім College de France, які павінен адбыцца ў лістападзе 1998 г., а арганізатарамі, акрамя College de France, будуць Польская бібліятэка, Гістарычна-літаратурнае таварыства ў Парыжы і, вядома, надзвычай дынамічны Камітэт па святкаван-

ню 200-годдзя з дня нараджэння паэта ў Францыі. На сесіі вядучымі будуць тры тэмы: 1) Міцкевіч і Францыя; 2) Міцкевіч і Цэнтральна-Усходняя Еўропа; 3) Міцкевіч і Еўропа. Плануецца, што яе будзе адкрываць прэзідэнт Францыі Жак Шырак. Міцкевічаўская канферэнцыя, арганізатарам якой стаў праф. Рольф Фегут, адбылася ў Фрыбургскім універсітэце ў Швейцарыі. Сябра Аляксандра Пушкіна ўшанаваў канферэнцыяй Маскоўскі універсітэт. Сесія, прысвечаная Міцкевічу, прайшла таксама на факультэце славістыкі ў Стакгольмскім універсітэце — яе арганізавала доктар Эва Тэадаровіч-Гельман. Ведаю таксама аб праекце Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Літва — малая радзіма Міцкевіча", якая запланавана ў Вільні на верасень 1998 г. А прафесар Самуель Фішман, міцкевічазнаўца, які працуе ў Indiana University ў Злучаных Штатах Амерыкі, мяркуе арганізаваць міцкевічаўскую сесію ранняй вясной 1999 г. і выдаць юбілейную кнігу, якая з'явіцца вынікам дадзенай сесіі.

Нечаканасцю для нас сталі міцкевічаўскія форумы ў Дамаску, Тбілісі, Вашынгтоне і Арэнбургу. На апошнім многа гаварылася пра сябра паэта, ураджэнца Беларусі Тамаша Зана.

Мяркую, што важным акцэнтам юбілею стануць выстаўкі. Літаратурны музей імя Адама Міцкевіча ў Варшаве цяпер стварае сталую экспазіцыю на працяглы перыяд (апошняя была зроблена ў 1983 г.), да якой рыхтуемся ўжо некалькі гадоў. Біяграфія Паэта і яго творчасць будуць там разглядацца як незвычайная ілюстрацыя тэндэнцый эпохі. Інтэгральнай мэтай экспазіцыі стане выкарыстанне прыёмаў, якія раскрыюць гістарычны, культурны і традыцыйны кантэкст рамантызму ў Еўропе. Мовай выстаўкі стане "музейнае эсэ", дакументаванае і ўпрыгожанае экспанатамі, цытатамі і сцэнаграфічнымі элементамі, што дазволіць забяспечыць захаванне традыцыйнага характару і спецыфікі выставак Літаратурнага музея. Асноўным матэрыялам з'явяцца экспанаты, прынцыпова размежаваныя на дзве групы: міцкевічаўскія, або арыгінальныя, памятныя рэчы, партрэты, выданні, рукапісы (апошнія, безумоўна, у знакамітых копіях), а таксама тыя, што датычаць эпохі.

Акрамя пастаяннай Літаратурны музей падрыхтаваў яшчэ тры міцкевічаўскія выстаўкі. Першая з іх — гэта выстаўка планшэтнага тыпу, прызначаная для інстытутаў польскай культуры за мяжой, культурных цэнтраў у Польшчы, а таксама літаратурных музеяў, якія ёю зацікавяцца. Наступная выстаўка — экспазіцыя, якая падрыхтавана сумесна Дзяржаўным музеем А. Пушкіна ў Маскве (біяграфічным — не "імя Пушкіна", а нацыянальнай галерэяй) і Літаратурным музеем пад назвай "Міцкевіч – Пушкін. Два погляды". Трэба прыгадаць, што наступны год — год 200-годдзя Аляксандра Пушкіна. Самай цяжкай справай для нашых калегаў і партнёраў аказалася зразуменне таго, што могуць быць розныя погляды на Пушкіна, але пасля

шматлікіх дыскусій мы прыйшлі да кансенсуса. Выстаўка экспанавалася сёлета як у Варшаве (сакавік–красавік), так і ў Маскве (май–ліпень). Трэцяя выстаўка — гэта "Міцкевіч – Шылер", адкрытая ў будынку Штатсархіва ў Людвігсбургу сумесна з Schiller-Nationalmuseum.

Вельмі важным момантам у юбілейных урачыстасцях стала адкрыццё дома-музея на беларускай зямлі, у Завоссі, дзе, я ў гэтым пераканаўны, усё ж нарадзіўся паэт. 8 верасня мне пашчасціла ўдзельнічаць у яго адкрыцці. Музей гісторыі беларускай літартуры ў Мінску правёў там вялікую работу. Адноўлены свіронак, а дом пастаўлены на фундаменце спаленага ў 1915 г. міцкевічаўскага памесця, якое шмат разоў перабудоўвалася. Падпісана ўмова паміж Літаратурным музеем у Мінску і Літаратурным музеем у Варшаве аб сумеснай падрыхтоўцы для Завосся пастаяннай музейнай экспазіцыі.

Паколькі пра Завоссе як пра месца нараджэння Адама Міцкевіча ў беларускім друку ўзніклі спрэчкі, дазволю сабе на гэтай праблеме спыніцца падрабязней. У адрозненне ад пані Лілії Усенка з Навагрудка, я на сто працэнтаў упэўнены, што так званае калдычаўскае Завоссе каля Баранавічаў, гэта значыць, тое, дзе цяпер адбудавана сядзіба Міцкевічаў-Стыпулкоўскіх, з'яўляецца менавіта тым Завоссем, дзе, паводле сына паэта Уладзіслава, а таксама брата Аляксандра Міцкевіча, нарадзіўся аўтар "Пана Тадэвуша". Пра гэта сведчаць не толькі традыцыя дзевятнаццатага стагоддзя, тапаграфічныя апісанні і малюнкі (да прыкладу, Эдварда Паўловіча з 1843 г. ці нават зменена ўжо сядзібы, намаляванай Напалеонам Ордам 40 год пазней), але і сабраныя праз Уладзіслава Міцкевіча і захаваныя ў Польскай бібліятэцы ў Парыжы копіі архіўных дакументаў, галоўным чынам гродзенскіх (а назбіралася іх каля 150), што датычацца менавіта гэтага, а не іншага Завосся. Усе ўказаныя дакументы, а таксама карты генерала Хшаноўскага (яны служылі паўстанцам 1863 г.) і рускія "штабаўкі", якія таксама захоўваюцца ў Польскай бібліятэцы ў Парыжы, выключаюць версію пра іншае Завоссе.

Менавіта калдычаўскае Завоссе наведаў Уладзіслаў Міцкевіч праз шэсць гадоў пасля смерці бацькі, у красавіку 1862 г., калі яшчэ жыў брат паэта, Аляксандр, які, дарэчы, імкнуўся вярнуць Завоссе. Да таго ж, жылі яшчэ многія сябры і равеснікі Адама, якім тады было каля шасцідзесяці год, а таму добра ўсё памяталі, былі добра паінфармаваныя. У Навагрудку сына паэта вітаў не хто іншы, як менавіта Эдвард Паўловіч, пра што згадвае Уладзіслаў у 2 томе сваіх "Успамінаў". І далей ён піша: "З Навагрудка я зрабіў толькі экскурсію ў Завоссе, маленькую мясціну, дзе нарадзіўся мой бацька і якую расійскі ўрад канфіскаваў". Было гэта калдычаўскае Завоссе, і тут сумненняў не можа быць ніякіх. Аўтэнтычны свіран, цяпер адбудаваны, у якім хлопцы Мікалая Міцкевіча праводзілі канікулы, стаяў на тым жа месцы да 1915 г. і быў знішчаны разам з рэшткамі дома ў час ваенных дзеянняў. Пасля вяртання з ссылкі ў тым свірне начаваў Тамаш Зан, які так

пра тое ўспамінаў: “Падрыхтавалі мне жытло ў лямусе з трыма ваконцамі, на якіх рукой Адася, нашага Вешчуна, выразаны надпісы, бо там ён жыў, будучы дзіцём і прыязджаючы вучнем на канікулы ў Завоссе з Навагрудка”. Было гэта ў 1841 г.

Аднак вернемся да юбілею. У Беларусі дзейнічае Дзяржаўны камітэт па ўшанаванню 200-годдзя з дня нараджэння паэта, а таксама Камітэт памяці Адама Міцкевіча пры Саюзе палякаў. Створаны пры апошнім “Усветны фонд Міцкевіча” сваім прыярытэтам лічыць аднаўленне гістарычнага Шляху Міцкевіча: акрамя Завосся туды ўваходзяць гістарычны цэнтр Навагрудка, паркава-палацавыя ансамблі ў Туганавічах, Шчорсах, Бальценіках. У складзе Шляху Міцкевіча — таксама запаведнік у раёне возера Свіцязь, ваколіцы возера Літоўка, вёска Карчова, дзе знаходзіцца вядомы Камень філарэтаў, а таксама касцельныя могілкі ў Беняконях са склепам Марыі Путкамер з Верашчакаў. Камітэт арганізуе Міцкевічаўскія спатканні на Свіцязі. Яны адбываліся ўжо два разы: у 1992 г. з нагоды завяршэння рэстаўрацыі і адкрыцця Музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку, а таксама ў 1994 г.

У Літве ў 1993 г. была створана ўстаноўчая група Грамадскага арганізацыйнага камітэта па святкаванню 200-годдзя з дня нараджэння Паэта. У 1997 г. быў створаны Дзяржаўны камітэт, у склад якога запрасілі і аўтара дадзенага выступлення. Стараннямі Фонда польскай культуры імя Юзафа Монтвілы была адкрыта памятная дошка на літоўскай і польскай мовах перад уваходам у Базыліянскія муры, а ў мінулам годзе — таксама дзвюхмоўная, але ўжо на літоўскай і польскай мовах, а не на рускай і літоўскай, на доме, у якім Міцкевіч рэдагаваў “Гражыну”, дзе сёння месціцца, на жаль па-ранейшаму занядбаны, Музей Адама Міцкевіча, які з’яўляецца філіялам Музея Віленскага універсітэта. У абодвух выпадках тэксты на гэтых дошках былі ўзгоднены з нашым музеем.

Да юбілею А. Міцкевіча рыхтуецца таксама Санкт-Пецярбург. Польскае гістарычнае таварыства арганізавала там у 1994 г. Дні Міцкевіча з нагоды 170-годдзя прыезду Міцкевіча ў Расію. У 1997 г. быў створаны Расійска-польскі юбілейны камітэт.

Некалькі слоў пра іншыя ініцыятывы, звязаныя з юбілеем. Наш Камітэт па святкаванню 200-годдзя з дня нараджэння Міцкевіча разам з Інстытутам літаратурных даследаванняў абвясціў конкурс на лепшую дыпломную (магістэрскую) працу, мэта якога — актывізацыя даследаванняў творчасці Паэта, а таксама выданне ў форме публікацый найбольш цікавых пазнавальных і метадалагічных дасягненняў самага маладога пакалення даследчыкаў і аматараў Міцкевіча. На конкурс можна прадстаўляць работы, тэматыка якіх звязана з творчасцю аўтара “Пана Тадэвуша”, а праблематыка датычыць біяграфічных, тэксталагічных, стылістычных пытанняў успры-

няцця Паэта, гісторыі літаратурных даследаванняў яго творчасці. Вынікі конкурсу будуць падведзены 31 снежня 1998 г. Тыя ж самыя арганізатары разам з Міністэрствам нацыянальнай адукацыі і Галоўным камітэтам алімпіяды па польскай мове і літаратуры абвясцілі таксама міцкевічаўскі конкурс для сярэдніх школ.

Мы ведаем беларускі Міцкевічаўскі шлях. Падобны турыстычны шлях арганізоўваюць жыхары Вялікапольшчы. Яны знаходзяцца ў больш выгаднай сітуацыі, бо большасць памесцяў і палацаў, у якіх гасцяваў паэт, захаваліся і ў многіх з іх знаходзяцца міцкевічаўскія пакоі, у чым я нядаўна меў магчымасць пераканацца асабіста.

Мы ведаем таксама аб ініцыятывах кінематаграфістаў. Закончана праца над тэлевізійным фільмам, які складаецца з чатырох серый, кожная па гадзіне, з удзелам вядомых паланістаў, міцкевічазнаўцаў. Зроблены здымкі памятных рэчаў і месцаў, звязаных з Паэтам у Польшчы і за мяжой. Анджэй Вайда робіць свой фільм "Пан Тадэвуш". У свой час я атрымаў ад яго сцэнарый, які падаўся мне надзвычай цікавым. Спадзяюся, што свой намер ён ажыццявіць.

Напэўна, на свеце будзе шмат міцкевічаўскіх ініцыятыў, пра некаторыя з іх мы нават не ведаем. Але з таго, пра што ўжо ведаем, вынікае, што 200-годдзе з дня нараджэння Паэта дасць вялікі навуковы і папулярызатарскі плён, які засведчыць жывое ўспрыняцце творчасці Адама Міцкевіча.

Леанід Лыч *(Мінск)*

ІДЭЯ СЛАВЯНСКАГА ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ Ў ПАРЫЖСКІХ ЛЕКЦЫЯХ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Усіх вялікіх людзей вызначаюць бязмежная любоў і глыбокая павага да свайго народа, яго гісторыі, культуры і мовы. Калі па якіх-небудзь прычынах такім людзям даводзілася адрывацца ад радзімы, жыць не ў адпаведнасці з яе нацыянальна-духоўнымі традыцыямі — гэта ўспрымалася як страшэнная трагедыя. Усе вялікія людзі са шчырай любоўю ставяцца да гістарычнай спадчыны, культурных каштоўнасцей і іншых народаў. Таму, жывучы на іх зямлі, яны ніколі не адчуваюць тут сябе чужынцамі.

Бясконца любіў сваё і шанаваў чужое слынны сын нашай зямлі, таленавіты польскі паэт беларускага паходжання Адам Міцкевіч. У яго было нямала, прычым вельмі справядлівых і абгрунтаваных, прэтэнзій да дзяржаўных улад блізкага яму па культуры і мове народа — рускага. Паэт, мо як ніхто іншы, перажываў, што гэтыя ўлады разам з імператарамі Прусіі і Аўстрыі пазбавілі польскі, беларускі і літоўскі народы іх сумеснай дзяржа-

вы — Рэчы Паспалітай. Гэтая злачынная акцыя прычыніла вельмі вялікую шкоду славянскай супольнасці ў цэлым, бо скараціла і без таго вельмі мізэрны лік славянскіх народаў, якіх можна было аднесці да катэгорыі дзяржаўных. Са стратай такога статуса над палякамі павісла пагроза анямечвання, над беларусамі — русіфікацыі. Калі ж згодна з рашэнняні Венскага кангрэса 1814–1815 гг. Расіі была перададзена ўсходняя частка Варшаўскага княства, т. зв. Каралеўства Польскага, неўзабаве і сюды прыйшла без пытання русіфікацыя. Яе пагрозлівых для польскага народа наступстваў не мог не разумець навучэнец навагрудскай дамініканскай школы А. Міцкевіч, якому на той час ішоў ужо семнаццаты год. Яшчэ мацней хвалявалі яго наступствы палітыкі царызму на роднай Навагрудчыне ў перыяд вучобы ў Віленскім універсітэце (скончыў яго ў 1819 г.). Жаданне быць як мага больш карысным свайму народу ў час яго суровых выпрабаванняў прывяло А. Міцкевіча да ўдзелу ў арганізацыі і актыўнай, самаахвярнай працы ў тайных таварыствах патрыятычна настроенай моладзі — філаматаў і філарэтаў. Царызм не мог дараваць такога нікому, у т. л. і паэту з Навагрудчыны. Жыць цяпер яму давялося па-за дарагой і любай бацькаўшчынай: у Пецярбургу, Маскве, Адэсе. Не прымаючы ні розумам, ні сэрцам рэакцыйнага сацыяльна-палітычнага рэжыму Расійскай імперыі, ён, аднак, ішоў на самае цеснае збліжэнне з перадавымі, прагрэсіўнымі прадстаўнікамі рускага народа. Асабліва цёплыя і сяброўскія адносіны завязваліся з дзекабрыстамі Кандратам Рылеевым, Аляксандрам Бястужавым, Аляксандрам Адоеўскім. Ужо ў тым маладым узросце А. Міцкевіч умеў ненавідзець царскія ўлады за іх крайне несправядлівую палітыку ў дачыненні да сваіх жа, славянскіх народаў — польскага, украінскага і беларускага і адначасова любіць, паважаць рускі народ і не ў малой ступені толькі таму, што разам з ім належаў да адной этнічнай супольнасці — славянскай. Сваю любоў да гэтай супольнасці ён з усёй паўнатой пастараўся раскрыць у курсе лекцый па славянскіх літаратурах, якія чытаў на працягу 1840–1844 гг. у Калеж дэ Франс у Парыжы.

Дзевятнаццатаму стагоддзю, як вядома, было наканавана стаць стагоддзем магутнага руху славян за сваё нацыянальнае вызваленне, што вельмі пасадзейнічала папулярызацыі іх сярод еўрапейскіх народаў. Многае хацеў зрабіць дзеля гэтага, апынуўшыся ў эміграцыі, і Адам Міцкевіч. У якасці сродка для дасягнення такой мэты ім вельмі прафесійна было выкарыстана чытанне перад студэнцкай аўдыторыяй лекцый па славянскіх літаратурах. Веданнем іх асабліва не вызначаўся тагачасны чытач Заходняй Еўропы, у т. л. і студэнцкая моладзь.

У адрозненне ад іншых інтэлектуальных прадстаўнікоў славянскага свету А. Міцкевіч не ставіў задачы паказваць яго ў лекцыях толькі ў адных ружовых фарбах, бо такіх прыкладаў не давала само жыццё. Еўропа пера-

поўнілася польскімі і беларускімі эмігрантамі, якія вымушаны былі ратавацца на чужыне ад праследавання за ўдзел у нацыянальна-вызваленчым паўстанні 1830–1831 гг.

Неабходна адзначыць, што ў той час вельмі шмат было блытанага і неадназначнага ў поглядах на нацыянальна-вызваленчыя рухі славянскіх народаў. Усе ці амаль усе прагрэсіўныя дзеячы давалі станоўчую ацэнку толькі такому руху палякаў, бо ён быў накіраваны супраць жандарскага рэжыму імперскай Расіі і ў выпадку перамогі забяспечваў бы ім вольнае, самастойнае нацыянальна-дзяржаўнае развіццё. А вось рух паўднёвых славян за сваё нацыянальнае вызваленне з-пад улады Турцыі нават сам Карл Маркс лічыў рэакцыйным, бо такі рух мог прывесці гэтыя народы да волі не інакш, як толькі з дапамогай дэспатычнай Расіі. Складанасць, напружанасць славянскіх узаемаадносін нельга было не ўлічваць, раскрываючы той ці іншы аспект жыцця гэтай этнічнай супольнасці Еўропы. Таму ўжо ў першай лекцыі перад парыжскімі студэнтамі А. Міцкевіч заявіў: “Я заўсёды неадступна думаў пра прычыны нашых [славянскіх. — *Л. Л.*] разладаў і пра тое, як дасягнуць у будучым нашага аб’яднання”. Пад апошнім ні ў якім разе нельга разумець якую-небудзь палітычна-дзяржаўную форму. Як сапраўдны прыхільнік дружбы славянскіх народаў, высокаэрудзіраваны чалавек, Міцкевіч не мог не прадбачыць, што любая форма дзяржаўнага аб’яднання іх, асабліва калі ў тых ці іншых краінах, як, напрыклад, у Расіі, пануюць дэспатычныя рэжымы, не створыць належных умоў для росквіту нацыянальных культур, наадварот, можа стаць прычынай сцірання, страты іх адметнасцей, весці да асіміляцыі. У дадзеным выпадку пад аб’яднаннем хутчэй за ўсё трэба разумець забеспячэнне сумеснага ўдзелу славян у вырашэнні агульных для іх задач, у т. л. нацыянальна-вызваленчага парадку, паколькі абсалютная большасць гэтых народаў знаходзілася пад уладай чужых краін. На думку А. Міцкевіча, зусім заканамерныя імкненні да паглыблення саюза славянскіх народаў ні ў якім выпадку не павінны скіроўвацца да адрыву іх ад астатняга свету, бо яны “заўжды мелі цягу і да гэтай пары маюць цягу да Захаду”. Як гэта паспрыяла, да прыкладу, духоўнаму развіццю Бепарусі, асабліва ў час яе знаходжання ў складзе палітычна незалежнай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага, мы цяпер вельмі добра ведаем.

У сваіх лекцыях А. Міцкевіч пастараўся даць як мага больш праўдзівага матэрыялу пра рускі народ і яго культуру. І гэта справядліва, бо ён з’яўляўся самым шматлікім з славян і, што немалаважна, — быў у сваёй краіне народам дзяржаўным, дзе такім правам не карысталіся ўсе астатнія славянскія народы (беларусы, палякі, украінцы), хаця і пражывалі на сваіх этнічных тэрыторыях. Такі неаднолькавы дзяржаўна-палітычны статус славян Расіі не мог не быць прычынай напружаных адносін, канфліктаў паміж імі.

Як ніхто іншы з палякаў, А. Міцкевіч выдатна разумеў, якую велізарную бяду прычынілі яго народу падзелы Рэчы Паспалітай, у чым імперская Расія адыгрывала галоўную ролю. У лекцыі ад 7 чэрвеня 1842 г. ён сцвярджаў, што “палякі пакутавалі ад рускага ўрадавага прыгнёту больш за іншых…”. Безумоўна, пакутавалі нямала, але ўсё-такі мелі намнога лепшыя магчымасці для забеспячэння сваіх нацыянальна-культурных запатрабаванняў, чым беларусы.

Як вялікі і шчыры патрыёт сваёй бацькаўшчыны А. Міцкевіч вельмі перажываў, што над ёю ўсталявана расійскае, прускае і аўстрыйскае панаванне. Верыў, што вызваліцца з-пад яго могуць толькі мужныя, адданыя нацыянальнай ідэі людзі. Таму яму не падабалася, што таленавіты польскі паэт Францішак Карпінскі ў адным з вершаў раіў “сваім суайчыннікам маліць Расію аб міласэрнасці”. На думку Міцкевіча, такія пачуцці “чужыя польскаму нацыянальнаму характару”. Затое не шкадаваў ён пахвальных слоў, калі пісаў пра другога тагачаснага польскага паэта, Юліяна Нямцэвіча, называючы яго нацыянальным: “Ён быў перш за ўсё палякам, і толькі палякам. У сваіх творах ён бачыў зброю для барацьбы з ворагамі Польшчы… ён заўсёды бачыў перад сабой адну мэту, заўсёды быў натхнёны адной любоўю — любоўю да айчыны, і адной нянавісцю да ворагаў; ён упарта абараняў справу радзімы і ўпарта нападаў на ўсіх яе праціўнікаў — палітычных, ідэйных і літаратурных.

…Большая частка яго твораў будзе жыць да тае пары, пакуль будзе працягвацца барацьба паміж Польшчай і яе суседзямі”. У адрозненне ад свайго сучасніка Ф. Карпінскага, Ю. Нямцэвіч застаўся “верным жывой нацыянальнай ідэі і разам з ёй пакінуў родную зямлю”.

Разам з тым А. Міцкевіч сям-там не падзяляў рэзкасці і прамалінейнасці ў поглядах і выказваннях Ю. Нямцэвіча і, магчыма, без дастатковых падстаў. Датычылася гэта, на мой погляд, і стаўлення Ю. Нямцэвіча да рэлігійнага фактару, пра што А. Міцкевічам сказана наступнае: “Здавалася, ён гатовы быў прыняць любую рэлігію, толькі б яна была накіравана супраць Расіі, Аўстрыі і Прусіі, да такой ступені нянавісць асляпляла яго. Паколькі ён бачыў, што Аўстрыя, вораг Польшчы, вызнавала каталіцкую рэлігію, Нямцэвіч на працягу доўгага часу варожа ставіўся да каталіцызму, хаця гэта і была рэлігія яго продкаў”. Бясспрэчна, каталіцызм ніяк не мог падабацца Ю. Нямцэвічу за тое, што ён дапамагаў уладзе Аўстрыйскай імперыі прыгнятаць польскае насельніцтва на захопленай тэрыторыі. Наданне ў такой сітуацыі прэстыжнасці нацыянальнаму фактару перад канфесійным ніяк нельга разглядаць як грэх перад Богам. Хрысціянскую веру, як вядома, падзялілі на дзве канфесіі і падштурхнулі іх яшчэ і да дзяржаўна-палітычнай дзейнасці не пасланнікі Бога на зямлі, а звычайныя людзі, толькі надзеленыя царкоўнымі арганізацыямі высокай духоўнай уладай. І калі прак-

тычныя дзеянні такіх духоўных улад, у дадзеным выпадку тых, што належаць да каталіцкай царквы, супярэчаць нацыянальнаму інтарэсу, іх ніяк нельга падтрымліваць. Нядобразычлівае стаўленне Ю. Нямцэвіча да каталіцкай веры, не выключана, тлумачыцца яшчэ і тым, што на сваіх далёкіх продкаў мог ён глядзець як на праваслаўных, паколькі яны былі выхадцамі з Берасцейшчыны, дзе здаўна шырокае распаўсюджанне атрымаў не заходні (лацінскі), а ўсходні (візантыйскі) абрад.

Дзе б толькі ні жыў, чым бы толькі ні займаўся А. Міцкевіч, яго вельмі абуралі, штурхалі да самага рэзкага пратэсту несправадлівыя адносіны расійскага царызму да польскага народа. Для выкрыцця, крытыкі гэтай несправядлівасці ён не шкадаваў слоў, трапных выразаў і ў сваіх лекцыях аб славянскіх літаратурах. З яго вуснаў студэнты чулі і такое: “Скрозь імперскі рускі арол сутыкаецца на сваім шляху з польскім арлом; за рускім “ура”, як непазбежнае рэха, чуецца ваенны кліч палякаў”. Спадзявацца ў такіх умовах на мір, дружбу паміж двума славянскімі народамі аніяк не даводзілася. І гэта ніколькі не суцяшала найлепшага сына славянскага свету. Не суцяшала яно і сам славянскі свет, бо ўсялякага роду непаразуменні ўнутры яго імкнуліся выкарыстаць урады неславянскіх краін.

Для А. Міцкевіча, як і большасці яго сучаснікаў з ліку славянскіх вучоных і літаратараў, не з’яўлялася сакрэтам, што акурат адсутнасць належнага міру і згоды паміж славянамі дазволіла французскаму імператару Напалеону Банапарту велізарныя масы гэтых блізкароднасных народаў уключыць у братазабойчую вайну. Пра гэтыя падзеі чытаем у польскага паэта наступнае: “Амаль усе славянскія народы былі ўцягнуты ў гэтую барацьбу. Калі ж яны змагаліся за чужую ім справу, калі выступалі ўжо не пад сваімі сцягамі, дык, як выказаўся адзін з нашых паэтаў, пазнавалі адзін аднаго толькі па моцы ўдараў. Гэта барацьба, якую рускі паэт — князь Вяземскі — назваў бясконцай Фіваідай…” (з міфалагічнага падання старажытных грэкаў аб братазабойчых войнах паміж сынамі Эдыпа Фіўскага).

Не падаваў А. Міцкевіч студэнтам у ружовым святле і падзеі, звязаныя з падрыхтоўкай і самім ходам паўстання дзекабрыстаў у 1825 г. У іх дзеяннях ён бачыў нямала чаго ілжывага і няшчырага як з боку адных, так і другіх. “Палякі прысылалі сваіх прадстаўнікоў да рускіх, але яны падманвалі адзін аднаго. У сваім коле палякі прызнаваліся, што імкнуцца толькі выклікаць хваляванні ў Расіі, з тым каб выкарыстаць іх у сваіх мэтах, а там няхай рускія самі як хочуць выблытваюцца са становішча. Рускія ў сваю чаргу ў інтымных размовах не адмаўлялі, што хаця яны і абяцалі палякам незалежнасць, пасля звяржэння дынастыі яны зробяць усё пасільнае, каб утрымаць Польшчу ў сваіх руках. Абодва бакі ўводзілі адзін аднаго ў зман, і таму справа была асуджана на няўдачу”. Аднак нягледзячы на такую няшчырасць у руска-польскіх дачыненнях, А. Міцкевіч усё ж гаварыў пра паў-

станне дзекабрыстаў як пра спробу “палепшыць становішча славянскіх народаў”. Для палякаў, магчыма, гэта і так, бо ў адпаведнасці з “Рускай Праўдай” Паўла Пестэля ім меркавалася даць дзяржаўную незалежнасць. Затое яе ніхто не збіраўся дараваць украінцам ці беларусам, бо не толькі афіцыйныя ўлады царскай Расіі, але і многія яе вучоныя імперскага толку не прызнавалі іх самабытнымі, лічылі тэрытарыяльнымі адгалінаваннямі рускага народа.

У той час, як А. Міцкевічу даводзілася чытаць лекцыі ў Парыжы, на яго радзіме палітыка русіфікацыі паспела шмат у чым падарваць, аслабіць асновы польскай культуры і мовы. Асімілятары вельмі ўжо стараліся абмежаваць ужыванне апошняй у такіх сферах, як навука і вышэйшая адукацыя. У 1832 г. з-за актыўнага ўдзелу студэнтаў Віленскага універсітэта ў нацыянальна-вызваленчым паўстанні надоўга спыняе сваю дзейнасць гэта надзвычай палулярная на той час вышэйшая навучальная ўстанова, у якой быў вельмі моцны польскі дух. Абмяркоўваліся планы, як працерабіць шлях для рускай мовы і літаратуры нават у вышэйшыя навучальныя ўстановы самой этнічнай тэрыторыі Польшчы. Нібыта з мэтай папярэдзіць такую негатыўную з’яву, А. Міцкевіч даводзіў студэнтам, што “амаль усе заходнееўрапейскія мовы развіліся ў выніку напружанай разумовай дзейнасці”. Адсюль само сабой вынікала: калі пад такую дзейнасць царызму ўдасца падвесці рускую культуру і мову, у польскага слова не будзе аніякіх перспектыў для развіцця. Больш таго, узнікне зусім рэальная пагроза яго знікнення, як гэта ўжо не раз назіралася ў сусветнай практыцы.

Не маючы магчымасці ў сябе на радзіме выказаць законныя прэтэнзіі да рускага ўрада і блізкіх яму інтэлігентаў адносна іх несправядлівага стаўлення да польскага пытання, А. Міцкевіч, як толькі мог, стараўся прыцягнуць увагу да яго еўрапейскай грамадскасці, у тым ліку і студэнцтва. Гісторыя ж абавязвала Расію быць вельмі паважлівай да духоўнай спадчыны падпарадкаваных ёй славянскіх народаў, якія ў свой час адыгралі проста выключную ролю ў яе культурным развіцці. Самі рускія, нагадвае паэт, называлі першыя дзесяцігоддзі XVII ст. у гісторыі сваёй культуры “польскім перыядам”. Я ж лічу, што яго было б больш правільна называць украінска-польска-беларускім, бо ў тыя гады ў Маскоўскай дзяржаве на ніве культуры працавала таксама нямала ўкраінцаў і беларусаў. З ліку апошніх найперш назавём выдатнага педагога, пісьменніка і публіцыста Сімяона Полацкага (з 1664 па 1680 г. жыў у Маскве), літаратара, перакладчыка і выдаўца Ілью Капіевіча, які склаў, пераклаў і выдаў для Расіі некалькі дзесяткаў назваў падручнікаў і кніг, кампазітара Восіпа Казлоўскага — аўтара святочнага паланеза “Гром победы раздавайся”, які стаў дзяржаўным гімнам Расіі.

Не у сябе дома, а на чужыне сказаў А. Міцкевіч, што думаў, і пра культурна-моўнае развіццё Літвы, якую ён не раз называў сваёй радзімай. Бу-

дучы добра дасведчаным, якую шкодную палітыку праводзіць царскі ўрад на беларускіх землях, і не падзяляючы яе, наш зямляк усяляк імкнуўся праз свае лекцыі прыцягнуць увагу да гэтага пытання і еўрапейскай грамадскасці, найперш студэнцтва. Даўшы даволі высокую ацэнку ўкраінскай мове, хаця і палічыў, што яна не "настолькі развітая, каб стаць мовай літаратурнай", ён затым пераходзіць да характарыстыкі мовы краіны, у якой нарадзіўся і якую любіў, як родную маці. З яго вуснаў студэнтам удалося пачуць наступнае: "На беларускай мове [дарэчы, большасць тагачасных рускіх вучоных называла яе толькі "дыялектам" рускай. — *Л. Л.*], якую называюць русінскай, або літоўска-русінскай… гаворыць каля дзесяці мільёнаў чалавек; гэта самы багаты і самы чысты дыялект, ён узнік даўно і выдатна распрацаваны. У перыяд незалежнасці Літвы вялікія князі карысталіся ім для сваёй дыпламатычнай перапіскі". Паводле А. Міцкевіча, у тагачаснай мове вялікаросаў не было "надзвычайнай прастаты" беларускай мовы".

Справядліва крытыкуючы царызм і афіцыйных поглядаў вучоных за іх непрызнанне правоў польскага, украінскага і беларускага народаў на незалежнае дзяржаўнае і самабытнае нацыянальна-культурнае жыццё, А. Міцкевіч нідзе адмоўна не выказаўся пра рускую культуру, якую заўсёды паважаў і высока ставіў. За час лекцый у Парыжы ён паспеў вельмі многае сказаць дапытлівай студэнцкай моладзі пра ўсіх найбольш таленавітых празаікаў і паэтаў Расіі. Паэму А. Пушкіна "Яўгеній Анегін" ён назваў творам, "які будзе заўсёды чытацца з задавальненнем ва ўсіх славянскіх краінах і які назаўжды застанецца помнікам сваёй эпохі". На такую высокую ацэнку паэтычнага дару геніяльнага рускага паэта ніколькі не паўплывала яго крайне варожае стаўленне да ўдзельнікаў нацыянальна-вызваленчага паўстання 1830–1831 гг. у Польшчы, Літве і Заходняй Беларусі. У лісце да рускага паэта і крытыка князя Пятра Вяземскага А. Пушкін выклаў наступным чынам сваю пазіцыю: удзельнікаў паўстання "трэба задушыць, і наша марудлівасць выклікае пакуту". Калі да А. Пушкіна дайшла вестка пра разгром паўстанцаў, ён на гэтую радасную для яго падзею адгукнуўся такімі суперпатрыятычнымі словамі: "Победа! Сердцу сладкий час! Россия! Встань и возвращайся! Греми восторгов общий глас!.. "

А. Міцкевіч лічыў зусім заканамерным, што ў культурным развіцці славянскіх народаў не можа быць такога, каб усе яны ў адначассе знаходзіліся на адным і тым жа высокім узроўні, хаця і жадаў кожнаму з іх сапраўднага прагрэсу. Быў час, пісаў ён, што "Чэхія выперадзіла ўсе славянскія народы, Польшча ішла па яе слядах у XVI стагоддзі і дала нават дзеячаў, якія перасягнулі чэхаў, Расія ад часу свайго абуджэння брала верх над польскай паэзіяй. У Дзяржавіна і Карамзіна было больш моцы, чым у палякаў".

Прызнаючы несумненныя дасягненні славянскіх народаў у галіне мастацкай літаратуры, А. Міцкевіч усё ж лічыў, што яны ідуць па слядах Еў-

ропы. Але час не стаіць на месцы, і разам з гэтым не застаецца нязменным становішча тых ці іншых літаратур. “Цяпер, — заяўляў паэт, — надышоў момант, калі славянскія народы закліканы праявіць сваю самастойнасць, раскрыць свае ўласныя багацці, паказаць штосьці новае…” Бясспрэчна, усяго гэтага не маглі ў той час паказаць не толькі беларусы і ўкраінцы, але нават і самі палякі, бо яны не былі вольнымі народамі на сваёй зямлі, асабліва два першыя з іх. А не будучы вольным, не толькі не разаўеш, а нават і не захаваеш роднай культуры і мовы, знікнеш разам з імі з твару зямлі.

З прычыны таго, што славяне жылі ў далёка не аднолькавых эканамічных і сацыяльна-палітычных умовах і да таго ж некаторыя з іх нацыянальна прыгняталіся не толькі ўрадамі неславянскіх, але і славянскіх краін (беларусы, палякі і ўкраінцы ў Расіі), А. Міцкевіч перасцерагаў асабліва не захапляцца высвятленнем пытання, каму з славян належыць першае, вядучае месца ў культурным развіцці іх супольнасці, бо пры любой, нават самай нязначнай недакладнасці гэта можа прывесці да ўскладнення адносін паміж імі. Зусім не на карысць славянскаму адзінству ішлі спрэчкі аб тым, чыёй мове трэба аддаць прыярытэт, якая з іх з’яўляецца найбольш старажытнай. Таму гэтага аніяк не мог абысці і А. Міцкевіч у парыжскіх лекцыях. Ён стаяў на пазіцыях, што ні ў якім выпадку нельга аддаваць перавагу той ці іншай мове толькі з-за таго, што яна больш за іншыя распаўсюджана ў славянскім свеце. Сцвярджаў і такое, што “колькасць тых, якія размаўляюць на той ці іншай мове, не можа служыць доказам яе старажытнасці”. Такія погляды нашага земляка не давалі каму-небудзь незаслужана прыніжаць адны і ўзносіць іншыя славянскія мовы. Тут А. Міцкевіч цалкам разышоўся са сваім калегам па пяру А. Пушкіным, які пісаў, што руская мова “як матэрыя славеснасці мае бясспрэчную перавагу перад усімі еўрапейскімі”. Няцяжка ўявіць, як пасля азнаямлення з такімі словамі любімага паэта магло мяняцца ў горшы бок стаўленне польскай, украінскай і беларускай моладзі да сваёй роднай мовы. Але тут не выключана і рэакцыя адваротнага плана: пераацэнка сваёй і недаацэнка рускай моваў, што толькі шкодзіла б умацаванню дружбы славянскіх народаў Расіі.

З лекцый А. Міцкевіча студэнты даведваліся, як часам непаважліва ставіліся да сваіх культур прадстаўнікі найбольш заможных і адукаваных пластоў славянскіх народаў. Пераканаўча паказаў ён гэта на прыкладзе чэхаў: “Мяркуючы паводле знешніх прыкмет, чэхі амаль страцілі свой славянскі характар. Пасля знішчэння ўсіх літаратурных помнікаў і ўсіх кніг адукаваныя класы Чэхіі сталі забывацца нават на сваю родную мову.

Чэшская арыстакратыя з-за нянавісці да гусітаў, якія выступілі адначасова і супраць каталіцкай царквы, і супраць прывілеяў дваранства, анямечылася, запазычыла нямецкія норавы і звычаі і захавала толькі свае прозвішчы як адзінае сведчанне славянскага паходжання. Буржуазія брала пры-

клад з дваранства; яна пайшла яшчэ далей у нянавісці да ўсяго славянскага, адмовіўшыся нават ад сваіх прозвішчаў; чэшскія гарады запаланілі немцы. Знішчэнне кніг і помнікаў працягвалася. Адзін фанатык езуіт, між іншым чалавек сумленны, нехта Коняш, які дзейнічаў у канцы XVII ст., хваліўся тым, што ён асабіста знішчыў звыш шасцідзесяці тысяч славянскіх кніг. Толькі народ захаваў свае нацыянальныя рысы, мову і традыцыі".

Пасля характарыстыкі нечуванай здрады нацыянальным інтарэсам з боку элітарнай часткі чэшскага народа было б вельмі лагічным А. Міцкевічу прывесці факты зусім процілеглага парадку, спаслаўшыся на свой народ, бо яго арыстакратычныя і найбольш адукаваныя саслоўі нават у самых экстрэмальных умовах не пераставалі быць носьбітамі ўласнай духоўнай спадчыны, заўсёды высока цанілі волю, самаахвярна змагаліся за дзяржаўную незалежнасць. Больш свабодалюбнага і рэвалюцыйнага за палякаў народа не было ў Расіі. Шкада, што беларуская эліта вельмі рэдка брала прыклад са сваіх суседзяў і ў самыя адказныя і цяжкія гады гісторыі перакідвалася з-за пэўнай сацыяльнай выгоды то на бок палякаў, то на бок рускіх.

Як і сёння, у часы Адама Міцкевіча таксама многія з таленавітых людзей у сілу розных прычын працавалі на карысць культур іншых народаў, пераважна тых, што ў сваіх краінах адносіліся да ліку дзяржаўных. Такім, як вядома, тады не з'яўляліся ні палякі, ні ўкраінцы, ні беларусы, гэта прычына, што многія з іх вымушаны былі працаваць на духоўнай ніве рускага народа, абядняючы сваю ўласную. Міцкевіч выдатна разумеў шкоду такой практыкі, таму імкнуўся любымі сродкамі паказаць, як у такіх выпадках дзейнічала этнічна свядомая частка творчай інтэлігенцыі іншых народаў, у прыватнасці чэшскага, які сваім рашучым змаганнем у канцы XVIII – пачатку XIX ст. за нацыянальнае адраджэнне многіх здіўляў у Еўропе. "Чэшскія вучоныя, — гаварыў паэт у сваёй лекцыі 27 снежня 1842 г., — … уяўляюць сабой новы тып людзей навукі", нагадваюць "айцоў царквы сваёй самаадданасцю, адданыя сваёй нацыі, як гэтыя святыя сваёй веры", не "думаюць пра тое, каб гандляваць плёнам сваіх навуковых прац. Калі б яны толькі захацелі пісаць па-нямецку ці па-французску, яны маглі б здабыць славу за межамі сваёй краіны, але яны лічаць за лепшае працаваць для сваіх суайчыннікаў".

Уражвае мноства літаратурных крыніц, якія выкарыстоўваў А. Міцкевіч пры падрыхтоўцы да лекцый. Заўважаецца, што ён высока цаніў і любіў цытаваць выказванні даследчыкаў неславянскага паходжання. Сярод іх сустракаліся і такія, што давалі вельмі карысныя парады, як не дапусціць культурна-моўнай асіміляцыі славянскіх народаў. У лекцыі, прачытанай 12 сакавіка 1841 г., ёсць спасылка на аднаго з нямецкіх вучоных (на жаль, не называецца прозвішча), які, наведаўшы Чарнагорыю, прыйшоў да высновы, "што славяне павінны асцерагацца любых чужаземных уплываў", рэка-

мендуе ім “шукаць у сваёй рэлігіі і нацыянальных абрадах пачаткі сваёй будучай цывілізацыі”, не “ўвозіць з-за мяжы настаўнікаў, каб навучацца ў іх навукам і мастацтву, якія калі-нікалі могуць аказацца небяспечнымі”. Гэтаму аўтару належыць і такая слушная на ўсе часы і для ўсіх народаў думка: “…для таго каб падняць сваю магутнасць на вышэйшую ступень, народ павінен спраўляцца сам з усімі сваімі справамі”. Гэтымі словамі нямецкага вучонага А. Міцкевіч павучаў свой народ, як яму выжыць, захаваць сябе ў шматэтнічнай Расійскай імперыі, палітыка якой усё больш набывала антынацыянальны, асіміляцыйны характар. Такой горкай несправядлівасці не мог вытрываць слынны сын славянскай супольнасці. Ён шчыра жадаў і ўсяляк садзейнічаў таму, каб па шляху духоўнага прагрэсу ішлі ўсе народы гэтай супольнасці, не ведаючы, што такое культурна-моўная асіміляцыя. Выпадзенне са славянскай сям’і хоць аднаго з народаў успрымалася ім як найвялікшая трагедыя. А яна ўвесь час вісела і вісіць над славянскімі народамі і найперш над беларускім, які практычна ад часу забароны ў 1696 г. уладамі Рэчы Паспалітай ужываць яго родную мову ў службовым справаводстве і аж да нашых дзён так і не змог забяспечыць ёй фактычна статуса дзяржаўнай. Знікае беларуская мова яшчэ і таму, што яна, практычна, не абслугоўвае навучальна-выхаваўчы працэс гарадскіх агульнаадукацыйных школ, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў, навуку, элітарныя пласты культуры (за выключэннем двух-трох драматычных тэатраў), адыгрывае пабочную ролю ў выдавецкай справе, сродках масавай інфармацыі. Уяўляю, які гнеўны пратэст выклікаў бы ў А. Міцкевіча такі перадсмяротны стан адной з самых старажытных літаратурных славянскіх моваў — беларускай. Сваім аўтарытэтам ён, напэўна, усяляк стараўся б прымусіць ратаваць яе не толькі інтэлігенцыю, але і дзяржаўных дзеячаў, паколькі, як сведчыць сусветны вопыт, менавіта ў руках гэтых прэстыжных катэгорый людзей знаходзіцца лёс кожнага народа.

А. Міцкевіч ужо даўно пакінуў нас, але у памяці нашай навекі застаўся яскравы прыклад яго адданага і шчырага служэння святой ідэі славянскага адзінства і братэрства. Нічым мы так не ўславім памяць пра нашага слыннага земляка, як вяртаннем яго любай айчыны Літвы-Беларусі да ледзь не поўнасцю страчаных нацыянальных асноў, узвядзеннем гэтак дарагой яму беларускай мовы на дзяржаўны п’едэстал. Сённяшняя Беларусь — не ідэал Адама Міцкевіча, бо з-за карэннага размыву нацыянальнага грунту культуры і адукацыі, амаль поўнага вываду роднай мовы карэннага насельніцтва з грамадскага жыцця яна ўжо не ўяўляе сабой чагосьці самабытнага, адметнага ў славянскай супольнасці народаў.



АДАМ МІЦКЕВІЧ У ГІСТОРЫІ І СУЧАСНАСЦІ



Навагрудак. Сядзіба Адама Міцкевіча.
Рэпрадукцыя паштоўкі 30-х гадоў са збораў Цэнтра імя Ф. Скарыны

Павел Лойка, Уладзімір Сосна *(Мінск)*

ЭПОХА МІЦКЕВІЧА
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

Агульнавядома, якое важнае значэнне мае для фарміравання любога творцы і накірунку яго творчасці тое, што дзеецца на Радзіме і якім з'яўляецца яго сацыяльна-саслоўнае асяроддзе. Грамадска-палітычным зместам эпохі жыцця Адама Міцкевіча сталася змена дзяржаўнай прыналежнасці беларускіх зямель і барацьба, што вялася вакол гэтага прынцыпова важнага для шляхты, да асяроддзя якой належаў паэт, пытання. У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795) паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй некалі магутная дзяржава, адна з буйнейшых у Еўропе, перастала існаваць. Тэрыторыі Літвы і Беларусі апынуліся ў рамках іншага дзяржаўнага ўтварэння — Расійскай імперыі, якая праводзіла тут цэнтралісцкую аб'яднальную палітыку, ставячы канчатковай мэтай іх зліццё з расійскімі рэгіёнамі.

Ліквідацыя дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай у цэлым і Вялікага Княства Літоўскага ў прыватнасці, ідэі Французскай рэвалюцыі канца XVIII ст., падзеі вайны 1812 г. аказалі вялікі ўплыў на развіццё грамадскай думкі Беларусі. Шляхецкая інтэлігенцыя, вучнёўская моладзь аб'ядноўваліся ў гурткі і таварыствы для выпрацоўкі і дасягнення сваіх сацыяльных і нацыянальных ідэалаў. Яны былі ідэйна і часта арганізацыйна звязаны з грамадскім рухам у Польшчы, кантактавалі з перадавымі людзьмі Расіі дзеля барацьбы супраць агульнага ворага — царскага самаўладства.

Першай тайнай арганізацыяй у Літве і Беларусі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай стала Віленская асацыяцыя 1796–1797 гг., якая мела адгалінаванні ў Мінску, Брэсце, Кобрыне, Ашмянах. Асноўнай яе мэтай з'яўлялася аднаўленне ранейшай дзяржавы на аснове Канстытуцыі 3 мая 1791 г., прытым вялікія спадзяванні ўскладваліся на дапамогу Францыі. За кароткі час свайго існавання, да раскрыцця царскімі ўладамі, асацыяцыя хоць і не паспела набраць сілу, але набыла папулярнасць сярод шляхты.

Моцнае браджэнне ў шляхецкім асяроддзі, якое па-мастацку глыбока раскрыта ў паэме "Пан Тадэвуш", выклікалі расійска-французскія адносіны напярэдадні і ў час вайны 1812 г. У лістападзе 1806 г. французскія войскі занялі "прускую" частку Польшчы, дзе было створана так званае Варшаўскае княства. За падзеямі, якія там адбываліся, уважліва сачыла вышэйшае саслоўе заходніх губерняў Расійскай імперыі. Многія землеўласнікі рушылі

праз граніцу, разлічваючы на атрыманне дзяржаўных пасад. Узмацніўся прыток у польскія войскі шляхецкай моладзі з Беларусі і Літвы.

Занепакоены гэтым царскі ўрад выдаў шэраг указаў аб узяцці ў секвестр маёнткаў тых асоб, якія самавольна выехалі за мяжу. Расійскі імператар Аляксандр I разлічваў аслабіць сярод памешчыкаў заходніх губерняў уплыў французскага імператара Напалеона, палітычнымі контрмерамі ў "польскім пытанні". Ён заявіў аб сваім жаданні аднавіць пад эгідай Расіі Вялікае Княства Літоўскае. Па даручэнні імператара ў 1811 г. князі М. Агінскі, К. Любецкі і граф Л. Плятэр склалі праект "Палажэння аб праўленні аўтаномным Вялікім княствам Літоўскім", якое павінна было ахапіць усе тыя тэрыторыі, што дасталіся Расіі ад былой Рэчы Паспалітай у 1772–1807 гг. (паводле Тыльзіцкага міру 1807 г. паміж Францыяй і Расіяй да другой з іх адышла Беласточчына). У процівагу канстытуцыі Варшаўскага княства прапаноўвалася таксама паступовае, на працягу дзесяці гадоў, асабістае вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці. Аднак ажыццяўленне праекта зацягвалася: кансерватыўна-нацыяналістычныя сілы ў вышэйшым расійскім кіраўніцтве бачылі ў ім спробу расчлянення і аслаблення імперыі.

12 чэрвеня 1812 г. армія Напалеона пераправілася праз Нёман у раёне Коўна і ўварвалася ў межы Расійскай імперыі. "Вялікая армія" мела на пагранічы амаль трохразовую колькасную перавагу над расійскімі войскамі. Яна складалася з прадстаўнікоў многіх падпарадкаваных Францыі народаў Еўропы. З імі таксама ішлі палкі, сфарміраваныя з перайшоўшай на бок Напалеона шляхты з Літвы і Беларусі. Толькі князь Дамінік Радзівіл сваім коштам выставіў трохтысячны ўласны полк, які ўжо 16 чэрвеня першым урачыста ўступіў у Вільню.

Амаль уся Беларусь, апрача паўднёвых паветаў, кантралявалася французскім ваенным камандаваннем. Напалеон тут знайшоў нямала прыхільнікаў сярод тых шляхціцаў, якія шчыра паверылі ў яго абяцанні адрадзіць былую дзяржаўнасць і таму сустракалі французскія войскі як вызваліцеляў ад расійскіх захопнікаў. 1 ліпеня 1812 г. у Вільні была створана Часовая камісія ўрада Вялікага Княства Літоўскага на чале з мясцовым памешчыкам Станіславам Солтанам, дзейнасць якой пашыралася на Віленскую, Гродзенскую, Мінскую губерні і Беластоцкую вобласць. Для Віцебскай і Магілёўскай губерняў было вызначана асобнае прафранцузскае праўленне. Ад гэтых марыянетачных урадаў патрабавалася перш за ўсё забяспечваць усім неабходным і нават папаўняць рэкрутамі "Вялікую армію", што расчароўвала шляхту ў адносінах да Напалеона. Частка яе працягвала арыентавацца на Аляксандра I.

У кастрычніку 1812 г. расійская армія вымусіла Напалеона пакінуць Маскву і адступаць па смаленскай дарозе. Адначасова перайшлі ў наступленне расійскія войскі на поўначы і поўдні Беларусі. Тут адбыўся канчат-

ковы разгром французскай арміі. Нягледзячы на тое, што і пасля вайны характэрная для Аляксандра I дэмагагічная палітыка заляцанняў да шляхты працягвалася (гэта выявілася ў стварэнні Царства Польскага), тым не менш ідэя вяртання ў якой бы там ні было форме ранейшай дзяржаўнасці на беларускія землі афіцыйна была пахавана. Ужо ў студзені 1813 г., калі расійскія войскі перанеслі ваенныя дзеянні за межы сваёй дзяржавы, Аляксандр I у пісьме да Адама Чартарыйскага недвусэнсоўна заявіў: "Не забывайте, что Литва, Подолия и Волынь до сих пор считают себя провинциями русскими, и никакая логика в мире не убедит Россию, чтобы они могли быть не под владычеством Государя России, а под каким-либо иным" [1]. Заставалася спадзявацца толькі на ўласныя сілы.

Тым часам барацьба з царызмам нарастала. У 1817 г. па ініцыятыве студэнтаў Віленскага універсітэта — Адама Міцкевіча, Тамаша Зана, Яна Чачота — было створана Таварыства філаматаў (аматараў навук), якое мела аддзяленні (філіялы) у Свіслацкай гімназіі, Полацкім піярскім вучылішчы і іншых навучальных установах. Яны прапагандавалі сярод навучэнцаў і насельніцтва ідэі роўнасці і свабоды. У Беларусі жылі і дзейнічалі ў складзе раскватараваных тут расійскіх войскаў многія дзекабрысты — М. Мураўёў, А. Бястужаў (Марлінскі), К. Ігельстром, С. Трусаў і інш. У 1823 г. быў распрацаваны так званы бабруйскі план паўстання: арышт цара і яго світы ў час агляду войскаў у Бабруйскай крэпасці, але з-за непадрыхтаванасці і рознагалоссяў у кіраўніцтве дзекабрысцкімі арганізацыямі ён не быў ажыццёўлены. 24 снежня 1825 г. Таварыства "Ваенныя сябры" сарвала цырымонію прысягі на вернасць Мікалаю I у Асобным Літоўскім корпусе, размешчаным на Беласточчыне. У лютым 1826 г. дзекабрысты Палтаўскага палка спрабавалі захапіць Бабруйскую крэпасць. Тым не менш, гэтыя першыя рэвалюцыянеры хоць і спачувалі сялянам, але не лічылі іх рэальнай сілай і не абапіраліся на іх у сваёй дзейнасці. У сярэдзіне 20-х гг. тайныя таварыствы на Беларусі былі разгромлены. Многіх удзельнікаў арыштавалі і саслалі ў аддаленныя губерні. Выйшла забарона на навучанне жыхароў Літвы і Беларусі ў замежных універсітэтах і ў Польшчы, у чыноўнікаў бралася падпіска аб няўдзеле ў тайных арганізацыях. Аднак поўнасцю спыніць грамадска-палітычны рух царскі ўрад не мог.

У лістападзе 1830 г. у Варшаве пачалося шляхецкае паўстанне, кіраўнікі якога ставілі галоўнай мэтай аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Вясной 1831 г. у руках паўстаўшых аказалася Літва і шэраг паветаў Заходняй Беларусі. Паўстанне развівалася тут у многім стыхійна, хоць і існаваў Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт. Сяляне і мяшчане мабілізоўваліся

[1] Мемуары князя Адама Чарторижского и его переписка с императором Александром I. М., 1913. Т. 2. С. 281.

ў атрады пераважна пад прымусам і не былі зацікаўлены, каб ваяваць без вырашэння сваіх сацыяльных праблем. У той час царскія ўлады абяцалі ім вызваленне ад паноў-паўстанцаў. Кульмінацыяй падзей стала бітва за Вільню 19 чэрвеня 1831 г., у якой аб'яднаныя паўстанцкія сілы краю разам з прысланым на дапамогу польскім корпусам не змаглі перамагчы царскія войскі. Летам 1831 г. асобныя выступленні адзначаліся ў паўднёвых паветах Беларусі, але ў цэлым паўстанне на беларускіх землях пайшло на спад і ў жніўні было задушана. Многія яго ўдзельнікі былі аддадзены пад суд. У шляхціцаў канфіскоўваліся маёнткі, асоб недваранскага паходжання аддавалі ў салдаты ці ссылалі ў Сібір.

Урад разумеў, што адных рэпрэсій мала. Таму пасля 1830 г. быў распрацаваны канкрэтны план поўнага зліцця забраных ад Рэчы Паспалітай зямель з усёй тэрыторыяй Расіі пад сцягам праваслаўя і адзінай рускай народнасці. Важнейшым мерапрыемствам у гэтым кірунку было ўвядзенне ўказам ад 1 студзеня 1831 г. расійскага заканадаўства і адмена 25 чэрвеня 1840 г. дзеяння Статута Вялікага Княства Літоўскага ў беларускіх губернях [2]. З 1831 па 1848 г. у якасці дарадчага органа пры цары функцыянаваў асобы Камітэт па справах заходніх губерняў, якому Мікалай I даручыў "войти в соображение мер, кои приняты быть могут, дабы губернии, от Польши присоединенные, приведены были к тому порядку, какой по управлению в других российских губерниях существует" [3].

Цэлы комплекс мерапрыемстваў ажыццяўляўся для папярэджання магчымых шляхецкіх выступленняў, сярод якіх галоўнае месца займаў так званы "разбор" шляхты. Гэтая працэдура ўяўляла сабой праверку дакументаў аб дваранскім паходжанні і перавод на яе аснове часткі шляхты ў падатковае саслоўе: у аднадворцы — у сельскай мясцовасці і ў грамадзян — у гарадах. Ужо на пачатку 40-х гг. аднадворцамі ў пяці беларускіх губернях лічыліся больш за 20 тыс. душ мужчынскага полу [4]. Дваранскага звання пазбаўляліся дробныя, беспамесныя шляхціцы, якіх царскі ўрад зліваў у далейшым з масай сялянства.

Дзеля русіфікацыі краю заахвочваўся пераезд у Беларусь рускіх чыноўнікаў і абмяжоўваўся доступ мясцовых ураджэнцаў да заняцця дзяржаўных пасад. Рабіліся спробы насаджэння рускага дваранскага землеўладання, перасялення праваслаўных сялян і інш.

Уніфікатарская дзейнасць Заходняга камітэта хоць і мела вынікі, але не магла хутка ліквідаваць вызваленчыя настроі. Шляхецкія рэвалюцыянеры са свайго боку таксама ўлічылі ўрокі паўстання. Іх рух, асабліва ў 40-я гг.,

[2] Полное собрание законов Российской империи. 2 собр. Т. 6. № 4233; Т. 15. № 13591.

[3] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу, ф. 1266, воп. 1, спр. 8. арк. 5.

[4] Вешняков В. Исторический обзор разных названий государственных крестьян // Журнал Министерства государственных имуществ. 1857. № 12. С. 73, 78.

дэмакратызаваўся і радыкалізаваўся, набываў антыпрыгонніцкі характар. У ім удзельнічала ўсё больш прадстаўнікоў разначыннай інтэлігенцыі, якая імкнулася павесці за сабой сялянскія масы. У беларускай і польскамоўнай "краёвай" літаратуры з'яўляюцца антыцарскія агітацыйныя творы, праводзіцца ідэя аб'яднання сялянства з перадавой шляхтай дзеля паляпшэння яго долі. У гэтым плане зразумела жаданне А. Міцкевіча, каб яго творы чыталіся і пад сялянскімі стрэхамі.

Шляхецкая паўстанцкая эміграцыя, што асела пераважна ў Францыі, першапачаткова не губляла надзей на ўзнаўленне ваенных дзеянняў і засылала ў Беларусь сваіх эмісараў. Сярод іх быў ураджэнец Слонімшчыны Міхал Валовіч, які ў сакавіку 1833 г. тайна вярнуўся на радзіму, сфарміраваў, у асноўным з сялян уласнай вёскі, невялікі атрад і ажыццяўляў партызанскія дзеянні ў слонімска-навагрудскай акрузе. Мэтай сваёй барацьбы ён лічыў вызваленне сялян і абвяшчэнне Беларусі і Літвы дэмакратычнай рэспублікай. Аднак ужо ў маі "экспедыцыя Валовіча" была ліквідавана ўладамі.

Студэнт Медыка-хірургічнай акадэміі, ураджэнец Піншчыны Франц Савіч заснаваў у 1836 г. у Вільні Дэмакратычнае таварыства, члены якога прапагандавалі ідэі дружбы народаў у барацьбе супраць самадзяржаўя, стаялі за вызваленне сялян і надзяленне іх зямлёй. "Ліцвін, валынец, падайце ж мне рукі… Царам — на згубу, панам — для навукі", — заклікаў Савіч у сваім вершы "Дзе ж тое шчасце падзелася?.. " [5] Праз тры гады ўдзельнікі таварыства былі арыштаваны.

У 1846–1849 гг. у Вільні, Мінску, Гродне, Лідзе, Ашмянах і іншых гарадах існавала тайная арганізацыя "Саюз свабодных братоў", якая налічвала каля 200 членаў. Вялася прапаганда сярод салдат і афіцэраў мінскага гарнізона, выраблялася зброя. На развіццё грамадскага руху мелі вялікі ўплыў палітычныя падзеі, перш за ўсё рэвалюцыі 1848–1849 гг. у Заходняй Еўропе, і толькі прысутнасць вялікай колькасці царскіх войскаў прадухіляла на беларускіх землях масавыя выступленні.

Беларуская нацыянальна-дзяржаўная ідэя ў грамадскім руху канца XVIII – першай паловы XIX ст. яшчэ не аформілася, але калі дзекабрысты наогул ігнаравалі нацыянальныя правы беларускага і іншых народаў Расійскай імперыі, то ўдзельнікі гурткоў і арганізацый, створаных на мясцовай, хоць і моцна спаланізаванай, глебе, праяўлялі так званы "літоўскі сепаратызм", любілі родны край, што пры збліжэнні іх з беларускай сялянскай масай стварала неабходныя перадумовы для фарміравання такой ідэі і выдзялення яе як самастойнай у недалёкай будучыні.

Беларускія моўныя, фальклорныя, сюжэтныя ўплывы, якія яскрава выступаюць у творчасці А. Міцкевіча, давалі яшчэ пры жыцці паэта падставы

[5] Беларуская літаратура XIX ст.: Хрэстаматыя. Мн., 1988. 2 выд. С. 68–69.

для папрокаў ад уласна польскіх чытачоў, накшталт аднога з Варшавы: “Вы для Літвы, а не для Кароны пішаце […] менш дбаеце пра тое, ці будуць вас у Варшаве разумець, абы ў Вільні ды Літве вас разумелі […]” [6]. Пад Літвой, якую паэт называе сваёй Радзімай, паводле даследчыка той эпохі М. Улашчыка, у гістарычным сэнсе разумелася тэрыторыя ўсяго былога Вялікага Княства Літоўскага, але часцей і ў больш вузкім значэнні — Віленская і Гродзенская губерні. Віцебская і Магілёўская губерні тады называліся беларускімі. Велізарная Мінская губерня, што знаходзілася паміж імі, у XIX ст. адносілася то да Літвы, то да Беларусі і толькі Навагрудскі павет, перададзены ў 1843 г. з Гродзенскай губерні ў Мінскую, называўся заўжды літоўскім [7]. Знамянальна, што менавіта гэты павет з яго цэнтрам — былой сталіцай Беларуска-Літоўскай дзяржавы XIII ст. — з’яўляўся малой радзімай паэта. Літва, як паняцце славянскае ці, прынамсі, і славянскае, выступае і ў паэтычных сучаснікаў Міцкевіча. Дастаткова прыгадаць, як А. Пушкін у вершы “Паклёпнікам Расіі” разважае пра бунт Літвы як спрэчку славян між сабою ці М. Лермантаў у паэме “Ліцвінка” вуснамі гордай паланянкі выказвае сум па рацэ Віліі, а не Нярысе — этнічна літоўскай назве гэтай ракі.

Гістарычныя карані ліцвінскага патрыятызму, якія сягалі да часоў Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (дарэчы, паняцце Жмудзь, ці лацінізаванае — Самагіція, ужывалася і ў сярэдзіне XIX ст. у адносінах да паветаў Ковенскай губерні), добра сфармуляваны ў запісцы яшчэ аднаго знакамітага грамадскага і культурнага дзеяча — Міхала Клеафаса Агінскага, пададзенай Аляксандру I 15 мая 1811 г.: “Частка Польшчы, далучаная да Расійскай імперыі, складала калісьці асобнае самастойнае ўладанне — Літву, яшчэ перад актам уніі Літоўскага княства з каралеўствам Польскім. Жыхары яго спрадвеку адрозніваліся ваяўнічым духам, клапаціліся пра свае правы і былі верныя сваім манархам, адзначаліся мужнасцю і любоўю да бацькаўшчыны. Гордыя сваім паходжаннем, ліцвіны, нягледзячы на аб’яднанне сваёй правінцыі з Польшчай, захавалі свае звычаі, свой цывільны кодэкс, мясцовае кіраванне, сваё войска, вярхоўны суд, міністраў, дзяржаўных саноўнікаў і нават сейм, які збіраўся па чарзе ў Варшаве і Гродна. Усе гэтыя прывілеі былі такімі дарагімі для літоўцаў, што, нягледзячы на ўсялякія намаганні і красамоўныя перакананні шматлікіх дзяржаўных дзеячаў, немагчыма было схіліць літоўцаў да адмовы ад сваіх прывілеяў” [8].

А вось яшчэ ў адной, відавочна небесстароннай, запісцы — “неизвестного литовца”, пададзенай неўзабаве пасля паўстання 1863 г. у III Ад-

---

[6] Цыт. па кн.: Рагойша В. Праблема бікультурнасці ў гісторыі беларуска-польскіх узаемаадносінаў // Беларусіка. Мн., 1994. Кн. 3. С. 325.

[7] Улащик Н.Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965. С. 5–6.

[8] Адраджэнне: Гістарычны альманах. Мн., 1995. Вып. 1. С. 207.

дзяленне Імператарскай канцылярыі, аб тагачасных праявах ліцвінскасці сцвярджаецца наступнае: “Напрасно думают, что между поляками Царства и литовцами, или лушче поляками в России — существует любовь и братство. Нисколько! Их соединяет только политическая идея, но в душе гнездится вековая, глубокая вражда, с особенною силою всегда проявлявшаяся преимущественно в Варшаве. Поляки высокомерны, и испокон века при каждом случае стараются с наглостью высказывать свое превосходство, что, разумеется, возбуждает досаду и негодование в литовцах. Последние никогда не забывают, что и Собесский, и Костюшко, и Мицкевич, и многие другие, коими гордится Польша, были не поляки, но руские или литовцы. Кто изучил этнографию обоих народов, тот ясно видит, как велика между ними разница в характере, способностях и вообще во внутреннем настроении. Здесь-то именно и надобно искать источник этой домашней вражды, этих бесчисленных партий в среде эмиграции, во всех революционных корпорациях, среди самого мятежа” [9].

Як слушна заключае С. Кузняева, менавіта ў першай палове XIX ст. у свядомасці шляхты беларускіх зямель, што называла сябе “ліцвінскай”, пачалі адбывацца велізарныя па сваёй значнасці зрухі, якія леглі ў аснову працэсу, які мы сёння называем пачаткам беларускага нацыянальнага адраджэння. Шляхта мясцовага паходжання вывучала гісторыю роднага краю, народную культуру, да якіх пачала ставіцца як да ўласных каранёў і здабыткаў [10]. Адам Міцкевіч, дададзім ад сябе, упісваецца ў гэты працэс. Усведамленне грамадска-палітычнай сітуацыі ў Беларусі, падвойнай свядомасці шляхты: польскай у шырокім сэнсе, як прадстаўнікоў усёй шляхецкай супольнасці былой Рэчы Паспалітай, і ліцвінскай, як самабытнай яе часткі — ВКЛ, дае ключ да разумення сучаснікамі творчасці яе найталенавіцейшага прадстаўніка.

Станіслаў Быліна *(Варшава)*

“ДЗЯДЫ” АДАМА МІЦКЕВІЧА І БАЛТА-СЛАВЯНСКІЯ ВЕРАВАННІ

Даследчык старажытных вераванняў і традыцыйных культур, звяртаючыся да другой часткі “Дзядоў” Адама Міцкевіча, прысвечанай, як вядома, народнаму памінальнаму абраду на беларускай зямлі, павінен памятаць пра тое, што ён мае тут справу з крыніцай, не зусім звычайнай у яго лабараторыі, а менавіта з літаратурным творам эпохі рамантызму. Адсюль вынікае

[9] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі ў Маскве, ф. 109, воп. 2, спр. 707, арк. 65–66.

[10] Кузняева С. Праблемы беларуска-рускага культурнага ўзаемадзеяння першай паловы XIX ст. // Кантакты і дыялогі. 1996. № 5. С. 13.

яўная асцярожнасць у пошуках драбніц рэальных вераванняў, заключаных у дадзеным творы [1] і іх супастаўленні з літаратурнай выдумкай. Натуральна гэта датычылася б таксама фармулявання вывадаў на тэму дасведчанасці паэта ў асаблівасцях паказанага ім абраду, крыніц яго інфармацыі і г. д. Неігнаруючы гэтага апошняга ходу разважанняў, дарэчы, не раз разгляданага ў даследаваннях, пакінем яго, аднак, па-за кругам нашых інтарэсаў. Адзначым толькі, што для даследчыка традыцыйнай культуры характэрным заваяваннем з'яўляюцца хутчэй архаічныя вераванні і рытуалы, чым этнаграфічная рэчаіснасць абраду дзядоў у міцкевічаўскія часы. Літаратурны твор, які тут разглядаецца, можа быць для яго крыніцай роздумаў на тэму каранёў і ранейшых персанажаў народнага памінальнага абраду.

Разглядаючы традыцыйныя вераванні славян, звязаныя з памерлымі, Аляксандр Гейштар заўважыў, што "дзяды, якім Міцкевіч надаў рысы манументальнасці, — гэта паэтычны сінтэз літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх вераванняў і звычаяў, праўдзівы ў многіх дэталях, аднак пазбаўлены аўтэнтычнай мадэлі выклікання душ" [2]. Пагаджаючыся ў прынцыпе з такім заключэннем, мяркую, што згаданы тут аўтэнтызм адносіцца, хутчэй, да агульных сувязей паміж жывымі і памерлымі, чым да дэтальнага зместу, заключанага ў міцкевічаўскім бачанні дзядоў.

Матывы існавання душы пасля смерці чалавека пры адначасовым сціранні мяжы паміж ёю і целам належаць да элементаў старажытных уяўленняў, атрыманых у спадчыну балта-славянскай веруючай супольнасцю. Архаічны генезіс маюць таксама асноўныя ўяўленні, якія датычацца адносін паміж жывымі і памерлымі. Гэта як дапамога памерлых, што вяртаюцца на зямлю (і такім чынам праяўляюць сваю прыхільнасць), так і засцярога ад іх, асабліва ад некаторых іх катэгорый, небяспечных для жывых. Апускаю тут з вядомых прычын усю багацейшую праблематыку пахавальнага рытуалу, які ўплывае на будучы лёс памерлага.

Рукапісныя рускія крыніцы, якія адносяцца да перыяду ранняга сярэдневякоўя, пакінулі сведчанні аб чалавечых стараннях, звязаных з адпаведным прыёмам тагасветных прышэльцаў: памерлых членаў роду і сям'і, ці дзядоў, на апеку якіх разлічвалі. Асабліва верылі ў іх істотны ўплыў на прыродныя з'явы, на ўраджай і тым самым на часовае жыццё чалавека на зямлі. У згаданых тэкстах рэлігійнай літаратуры, якія асуджаюць "перажыткі язычніцтва", знаёмімся з рытуальнай ежай і напоямі, даведваемся пра агонь, які раскладалі, каб змерзлыя душы маглі пагрэцца [3]. Але з'яўлення "дрэнных"

[1] Mickiewicz A. Utwory dramatyczne. Dziady: Poema. Cz. 2 // Mickiewicz A. Dzieła. Warszawa, 1958. T. 3. S. 13–37. Далей старонкі гэтага выдання ўказаны ў тэксце.

[2] Gieysztor A. Mitologia Słowian. Warszawa, 1982. S. 219.

[3] Адпаведныя тексты апублікаваны ў падборы крыніц: Mansikka V. J. Die Religion der Ostslaven. Quellen. Helsinki, 1922. B. 1. S. 162, 174, 183, 184, 205, 257.

памерлых, страхотных прывідаў, людзі баяліся. Гэта для іх, як заўважыў Барыс Рыбакоў, падрыхтоўваліся лазні, месца нячыстае [4]. Фальклор сведчыць пра трываласць гэтага страху, а таксама традыцыйных старанняў, што аберагалі ад дрэнных духаў, якіх называлі заложнымі [5].

У значна пазнейшым тэксце, які быў створаны ў праваслаўнай царкве (закон Стаглавага сабора 1551 г.), мы знаходзім істотнае для нашых разважанняў рытуальнае закліканне душ памерлых: "А в великий четверток порану солому палят и кличут мертвых" [6]. Гэты рытуал мае багатую дакументацыю ў фальклоры ўсходнеславянскіх зямель і вядомы таксама ліцвінам і латышам. На Беларусі заклікалі, запрашалі памерлыя душы на частаванне каля магіл у дзень Радуніцы (Радаўніцы), напрыклад: "Святыя радзіцелі, хадзіце к нам хлеба-солі кушаць" [7]. На вялікарускіх землях рытуальныя словы да стомленых доўгай дарогай, галодных і змерзлых прышэльцаў з таго свету вымаўляліся на парозе хаты: "Вы устали, родные, покушайте же чего-нибудь" [8].

Рытуальныя дзеянні, пра якія гаварылася вышэй, выконваліся ў пэўныя дні традыцыйнага абрадавага календара. Святы з народнага календара з часам знайшлі сваё пастаяннае месца ў хрысціянскім літургічным календары. З памерлымі быў звязаны доўгі цыкл вясенніх "задушных" абрадаў, якія паўтараліся час ад часу пры нераўнамернай інтэнсіўнасці вераванняў і рытуалаў. Старую метрыку, напрыклад, мела названне чацвёртай, "смяротнай", нядзелі Вялікага паста, якая абазначала зварот да тых, хто пакінуў гэты свет [9]. Першая вясенняя кульмінацыя адкрыцця свету памерлых да свету жывых наступала напярэдадні вясенняга раўнадзенства. У хрысціянскі перыяд яна прыходзілася на дні Вялікага тыдня напярэдадні Вялікадня, а калі быць больш дакладным, то ў Вялікі чацвер [10]. Менавіта на гэты перыяд старыя рускія крыніцы пераносяць пералічаныя раней абрады. Ва ўсходніх славян захаваліся старыя назвы гэтага дня: Вялікдзень мёртвых, Наўскі Вялікдзень (гэта значыць дзень, прысвечаны навам — духам памерлых) [11], якія з'яўляюцца такімі ж яркімі, як і апісанні рытуалаў і абрадаў. Яны сведчаць пра адзін з найважнейшых тэрмінаў рытуальнай канфранта-

---

[4] Рыбаков Б. А. Язычество древней Руси. М., 1987. С. 463, 515.

[5] Зеленин Д. К. Очерки русской мифологии. Вып. 1. СПб., 1916.

[6] Mansikka V. J. Die Religion der Ostslaven. B. I. S. 257.

[7] Соколова В. К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. М., 1979. С. 122.

[8] Соболев А. И. Загробный мир по древнерусским представлениям. Сергиев Посад, 1913. С. 158.

[9] Gieysztor A. Mitologia Słowian. S. 204.

[10] Успенский Б.А. Филологические разыскания в области славянских древностей. М., 1982. Доп. 9.

[11] Гл.: Radenkovic L. Semiotyka słowiańskich obrzędów wielkoczwartkowych // Studia Semiotyczne. 1982. N 12. S. 102.

цыі паміж светам жывых і памерлых. Агульнаславянскі тэрмін гэтага свята добра захаваўся ў народнай традыцыі розных народаў. На польскіх землях яшчэ зусім нядаўна спявалі:

Wielki Czwartek, w Wielki Piątek
Cierpiał Chrystus za nas smętek
Pietrze, Pietrze weź te klucze
Idź do Raju wypuść dusze. [12]

Прадаўжэнне апісаных абрадаў да канца велікоднага перыяду праяўлялася ў святе Радуніцы, этымалагічна, напэўна, звязанай з родам, памерлымі продкамі [13]; дарэчы, першапачаткова яна адзначалася менавіта ў Вялікі чацвер. Тады на магілах блізкіх заклікалі памерлых, запрашаючы іх на прыгатаваны пачастунак. Бліжэй да Сёмухі пачыналася Троіцкая субота, абрады якой таксама выконваліся на могілках і асуджаліся Стаглавым саборам; моцны плач і галашэнні, якія раптоўна змяняліся выступленнем музыкаў-скамарохаў, пераходзілі ў рытуальную весялосць, скокі, спевы і плясканне ў далоні [14]. Працяглы цыкл вясенніх спатканняў з памерлымі заканчваўся самай кароткай ноччу, і таму асаблівай была ноч Купалы-Сабуткі, надзвычай багатая на знакі варажбы і рытуалы (таксама з эсхаталагічным зместам) [15].

Асеннія традыцыйныя абрады ў гонар памерлых пакінулі значна слабейшыя сляды як у рукапісных крыніцах, так і ў фальклоры, што, аднак, не дае нам права іх абмінуць. Адна з польскіх крыніц XV ст. дакументуе нейкае рытуальнае частаванне ў гонар памерлых, якое сяляне рыхтавалі ў першай палове кастрычніка [16]. У традыцыях балтыйскіх народаў асеннія памінкі з рытуалам, вельмі падобным да таго, які выконвалі ўсходнія славяне, занялі пачэснае месца ў абрадавым календары. Жэрард Лабуда ўспамінае іх у сваіх разважаннях пра кашубскую міфалогію: “У Латвіі ў кастрычніку ў вызначаны дзень у хаце выстаўляецца разнастайная ежа, а гаспадар дома, патрымліваючы агонь у печы, заклікае пайменна сваіх памерлых продкаў, каб прыйшлі і пачаставаліся” [17]. У Літве восень таксама лічы-

[12] Renik K. O kontaktach ze zmarłymi — ludowe wyobrażenia // Polska Sztuka Ludowa. 1986. T. 40. Nr 1–2. S. 32.

[13] Рыбаков Б. А. Язычество древней Руси. С. 117.

[14] Mansikka V. J. Die Religion der Ostslaven. B. I. S. 257. Гл. па дадзенай тэме: Łowmiański H. Religia Słowian i jej upadek (VI–XII w.). Warszawa, 1979. S. 146.

[15] Виноградова Л. Н., Толстая С. М. Мотив “уничтожения проводов нечистой силы” в восточнославянском купальском обряде // Исследования в области балто-славянской духовной культуры: Погребальный обряд. М., 1990. С. 99–118.

[16] Fijałek J. Ciziojan polski z 1471 r. a wiadomości o ciziojanach wogóle i w Polsce // Prace Filologiczne. 1927. Nr. 12. S. 447.

[17] Łabuda G. Mitologia i demonologia w słownictwie, w bajkach, baśniach i legendach kaszubskich // Materiały Ogólnopolskiej Sesji Naukowej pt. “Świat bajek, baśni i legend kaszubskich”, 7–8. VI. 1976. Wejherowo, 1979. S. 21.

лася асаблівым часам ахвярапрынашэнняў памерлым, асабліва было багатым на эсхаталагічныя тэксты свята ўраджаю.

Дзень памінання ўсіх верных памерлых (2 лістапада), які паступова ўводзіўся ў літургію заходняга касцёла ў сярэднія вякі, вельмі доўга, асабліва на польскіх землях, заставаўся па-за рамкамі народных вераванняў і абрадаў [18]. Аднясенне Міцкевічам дзядоў менавіта да гэтага дня было звязана з яго ўласнай канцэпцыяй свята, аб чым у нас яшчэ будзе магчымасць сказаць некалькі слоў. Спробе звязаць абрад дзядоў з касцельным асеннім памінаннем памерлых запярэчыў знаўца польскай рамантычнай літаратуры Станіслаў Пігань. Ён у катэгарычнай форме вызначыў месца дзядоў у традыцыйным абрадавым календары: “Не можа падвяргацца сумненню тое, што Радаўніца — гэта абрад, які Міцкевіч бачыў у маладосці і які ўзяў за зыходную базу для сваёй паэмы. Але яна ў тыя часы адзначалася калектыўна, на могілках. Толькі ў ёй удзельнічаў ксёндз. Гэта менавіта так” [19]. Мяркуючы па форме і змесце абраду, прадстаўленага ў “Дзядах”, яны могуць адносіцца, на думку Піганя [20], толькі да беларускай вясенняй Радаўніцы і да аналагічных з ёю валынскіх “провадаў”, якія адзначаліся ў перыяд, блізкі да першай нядзелі пасля Вялікадня. Упэўненасць названага даследчыка маглі бы праверыць толькі этнаграфічныя даследаванні. Мы ж з некаторай упэўненасцю можам падтрымаць толькі перанос дзядоў у вясенні абрадавы цыкл. Пігань прымусіў нас задумацца над характарам абраду, што выконваецца ў творы Міцкевіча вясковай грамадой на могілках. Ён адзначыў таксама, што асеннія памінальныя абрады практыкаваліся пераважна ў таварыстве сваёй сям’і і ў хаце (ці на тэрыторыі сядзібы), а не на адкрытай прасторы [21]. Дарэчы, гэта адпавядае зместу старажытных крыніц. Звяртаючыся да гэтых разважанняў, можна звярнуць увагу на неадпаведнасць традыцыі Радаўніцы, прысвечанай перш за ўсё душам памерлых блізкіх сваякоў, паэтычнаму бачанню дзядоў, паводле якога чакаецца прыход душ “чужых” (у сэнсе сваяцтва) людзей і, акрамя гэтага, з рознымі правінамі.

Міцкевіч увёў у абрад дзядоў заўважальную ўжо на першы погляд вялікую колькасць хрысціянскіх паняццяў, вераванняў і ўяўленняў. Зрабіў гэта свядома, сцвярджаючы ў прадмове да другой часткі драмы: “Дзяды нашы — нешта асаблівае, бо язычніцкія абрады перамяшаліся з уяўленнямі хрысціянскай рэлігіі” [22]. Карыстаючыся сённяшняй тэрміналогіяй, можна сцвяр-

[18] Гл.: Wiesiołowski J. Kultura i obyczaje kręgu wiejskiego // Kultura Polski Średniowiecznej XIV–XV w. Warszawa, 1997. S. 155.

[19] Pigoń S. Wołyńskie przewody — wiosenne święto zmarłych // Pigoń S. Drzewiej i wczoraj: Wśród zagadnień kultury i literatury. Kraków, 1966. S. 61–75.

[20] Тамсама. С. 65.

[21] Тамсама. С. 63 і наст.

[22] Mickiewicz A. Utwory dramatyczne. Dziady. S. 11.

джаць, што паэт у вераваннях заўважаў з'яву сінкрэтызму, асабліва характэрную для народных культур. Іншая справа — расстаноўка пэўных істотных акцэнтаў, якія выразна "хрысціянізуюць" дадзены абрад. У творы Міцкевіча стары Гусляр у сваіх заклінаннях шмат разоў звяртаецца да Святой Тройцы, як, напрыклад, у час выгнання вельмі дакучлівых душ:

Teraz z Bogiem idźcie sobie.
A kto prośby nie posłucha
W imię Ojca, Syna, Ducha,
Widzicie Pański krzyż?
(S. 120–123)

У "Дзядах" мы знаходзім хрысціянскае разуменне грэху і грэшнікаў розных відаў. Частка душ, што прыходзяць на зямлю, пакутуе за свае прыжыццёвыя ўчынкі, якія не адпавядалі хрысціянскай этыцы, напрыклад, адсутнасць міласэрнасці да блізкіх, асабліва да падначаленых і людзей ніжэйшых саслоўяў. Апусцім тут, безумоўна, змест, звязаны з літаратурнай традыцыяй эпохі рамантызму, са своеасаблівай этыкай рамантычнага кахання і г. д. Паслугоўваючыся хрысціянскімі паняццямі пры вызначэнні месцаў пасмяротнага знаходжання душ, Міцкевіч добра адчуваў прыблізнасць лакалізацыі такой прасторы ў сусвеце, характэрнай для народных культур. Душы тыя часткова знаходзяцца на зямлі, часткова ў нябеснай прасторы. Яны прыбываюць у месца абраду з невядомых напрамкаў. Узгадаем занатаванае на рускіх землях красамоўнае азначэнне "неведомая страна", якое адносіцца да замагільнага свету [23]. Акцэнт няўпэўненасці, выразны ў народных эсхаталагічных уяўленнях, пацвярджаюць рускія пахавальныя галашэнні [24], тэксты якіх добра захоўваюць архаічныя матывы. Адначасова ў разглядаемым творы матывы пакут, звязаных з ачышчэннем, звязваюцца, відавочна (хоць і непаслядоўна), з зямнымі месцамі.

Згаданыя ў "Дзядах" фізічныя пакуты душ, якія ачышчаюцца, характэрныя для ўяўленняў хоць і даўніх, але звязаных з папулярнай эсхаталогіяй заходняга хрысціянства. Іх пералічвае Гусляр, гаворачы:

Czyśćcowe duszeczki!
W jakiejkolwiek świata stronie
Czyli która w smole płonie
Czyli marznie na dnie rzeczki,
Czyli dla dotkliwszej kary
W surowym wszczepiona drewnie
Gdy ją w piecu gryzą żary
I piszczy i płacze rzewnie.
(S. 13–20)

[23] Гл.: Bylina S. Problemy słowiańskiego świata zmarłych: Kategorie przestrzeni i czasu // Światowit. 1995. Nr. 40. S. 11 і наст.

[24] Велецкая Н. Н. Языческая символика славянских архаических ритуалов. М., 1978. С. 22.

Пад зямлёй размяшчаецца пекла, адкуль, як меркавалі ўдзельнікі абраду, прыбыў прасіць прабачэння злы пан.

Wszak to zapada podłoga
I blade widmo powstaje.
(S. 525–526)

Нарэшце чытаем і пра рай, куды трапяць душы пасля ачышчэння ад грахоў, дзякуючы пакутам. Але "рай" у "Дзядах" можа абазначаць таксама месца, пазбаўленае як пакут, так і асалоды, своеасаблівую "чакальню" да неба. Цяжка супрацьстаяць сцвярджэнню, што Міцкевіч добра адчуваў некаторыя вельмі старыя вандроўныя матывы хрысціянскай эсхаталогіі.

Стары Гусляр, які вядзе ў творы Міцкевіча памінальны абрад ад імя вясковай грамады, ахвяруе памерлым як рытуальную ежу і напоі, так і рэлігійныя сродкі дапамогі душам у ачышчэнні: імшу, малітвы, міласціну. Пералічаныя формы падтрымкі маюць на мэце змену лёсу душ памерлых людзей, якую разумелі ў хрысціянскіх катэгорыях: аблягчэнне пакут ачышчэння або атрыманне збаўлення. Дарэчы, адзначым таксама, што традыцыйную ежу, якую прапаноўвае Гусляр душам для частавання, ні адна з душ не хоча паспрабаваць. Душы памерлых, запрошаныя ў ходзе абраду, захоўваюць увогуле свой зямны выгляд (толькі жорсткі пан мае знешнія рысы праклятага з пекла, згодна з папулярным уяўленнем), ім характэрны зямныя адчуванні (рэакцыя на боль, голад і г. д.). Такі напалову фізічны і матэрыяльны характар тагасветных душ можна прыпісаць як архаічным вераванням, так і традыцыйнаму касцельнаму павучанню, які ставіць мэту шляхам вобразнага ўяўлення пра пасмяротны лёс чалавечай душы ўздзейнічаць на вернікаў. Адзначым пры гэтым, што цэнтральнае месца абраду дзядоў у інтэрпрэтацыі паэта пераносіцца ўнутр могільнікавай капліцы, якая ўяўляе сабой асвечаную прастору хрысціянскай літургіі, у той час калі могілкі, хоць таксама асвечаныя, заўсёды заставаліся адначасова пад уладай ночы і істот, якія належаць да свету старых народных вераванняў.

Некалькі разоў мы закраналі той слой дзядоў, які Міцкевіч назваў прыналежным да "язычніцкіх абрадаў". А потым адзначыў, "што звычай частавання памерлых, здаецца, можа быць агульным для ўсіх язычніцкіх народаў", а таксама, што народ ведаў свае, нехрысціянскія спосабы прынясення аблягчэння душам, якія знаходзяцца ў чысцы [25]. Ведаў славуты аўтар "Дзядоў" пра рытуальную ежу, якую часткова (пірагі, малако) называюць старыя рускія крыніцы. У паэтычным уяўленні згубіўся надзвычай важны матыў народнай абрадавасці, якім была ежа, спажываная на могілках членамі сям'і [26].

[25] Mickiewicz A. Utwory dramatyczne. Dziady. S. 11.
[26] Гл.: Moszyński K. Kultura ludowa Słowian. Warszawa, 1967. T. 2. Cz. I. S. 255.

Акрамя рытуальнага частавання памерлых несумненна аўтэнтычным атрыбутам традыцыі быў агонь. Аднак яго роля ў міцкевічаўскім бачанні дзядоў не зусім зразумелая; здаецца, што ён выконвае толькі сігнальную функцыю для збірання памерлых душ, а не крыніцу цяпла для змерзлых прышэльцаў. Агонь у традыцыйных памінальных абрадах выконваў заўсёды важную ролю, а саграванне змерзлых памерлых з'яўляецца матывам, які паслядоўна паўтараецца ў крыніцах розных перыядаў. Ён прысутнічаў у традыцыйнай абрадавасці ўсіх славян: ведалі яго раннія рускія крыніцы, гавораць пра яго крыніцы, якія адносяцца да заходнеславянскіх зямель. У польскім зборніку казанняў канца XV ст. чытаем, напрыклад, пра рытуальнае распальванне агню ў Вялікі тыдзень перад Вялікаднем, "каб успомніць пра душы блізкіх", пры адначасовым перакананні, што "душы да гэтага агню прыходзяць і грэюцца" [27]. Ва ўсходніх славян водгукам даўніх вераванняў з'яўляецца азначэнне, звязанае з раскладваннем такога агню, — "греть покойников" альбо "греть ножки покойникам" [28].

Такіх матываў таксама як і шмат іншых, што адносяцца да народных памінальных абрадаў, мы не знаходзім у "Дзядах". Згодна таксама з тым, што гаварылася мной на пачатку, не бачу мэтазгоднасці пільных пошукаў падобных адсутнасцей ці непаслядоўнасцей у разглядаемым творы. Неабходна прызнаць, што такі аналіз можа спакушаць сваёй цікавасцю даследчыка вераванняў, але вынікі тут ніколі не будуць мець сувязі з катэгорыяй вартасцей манументальнага твора Міцкевіча. "Дзяды" ж стварылі сваю аўтаномную рэчаіснасць, якая сапраўды блізкая да рэчаіснасці архаічных вераванняў і міфаў, як і да этнаграфічнай рэчаіснасці абраду, што выконваецца ў пэўны час і на пэўнай тэрыторыі. Рэчаіснасць гэтая не паддавалася метадам даследавання, якія прымяняюцца ў адносінах да "звычайных" гістарычных крыніц.

Пераклад з польскай мовы Галіны Жалубоўскай

Міхаіл Касцюк *(Мінск)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ ЯК ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ ДЗЕЯЧ

Сярод знакамітых беларускіх, рускіх, польскіх літаратараў XIX ст., якія аказалі значны ўплыў на грамадства не толькі сваёй выдатнай літаратурнай творчасцю, але і грамадска-палітычнай дзейнасцю, адно з першых месц

[27] Дадзеная нататка, запазычана з казання, размножана Міхалам з Яноўца і апублікавана ў кн.: Belcarzowa E: Głosy polskie w łacińskich kazaniach średniowiecznych. Wrocław, 1987. Cz. I. S. 57.

[28] Толстой Н. И. Язычество древних славян: Очерки истории культуры славян. М., 1996. С. 154.

належыць Адаму Міцкевічу. Ён — адзін з тых выдатных прадстаўнікоў славянскай, еўрапейскай і сусветнай літаратур, на мастацкія творы якіх моцнае ўздзеянне аказала не толькі само жыццё, але і іх захады, каб зрабіць гэтае жыццё лепшым.

Такое імкненне дасягалася шляхам актыўнага ўдзелу не толькі ў грамадскіх, але і палітычных справах. Яны заўсёды займалі важнае месца ў жыцці Адама Міцкевіча. Без іх асвятлення нельга аб'ёмна асэнсаваць асобу паэта, зразумець уплыў яго творчасці на грамадска-палітычную дзейнасць і наадварот.

Прыняўшы з юнацкіх гадоў удзел у асветніцкім і дэмакратычным руху, а затым не будучы абыякавым да нацыянальна-вызваленчай барацьбы, А. Міцкевіч праз усё жыццё пранёс такую выдатную рысу свайго характару, як нераўнадушша да грамадска-палітычных спраў, няўрымслівасць і нават апантанасць у такой сваёй дзейнасці. Гэты напрамак яго жыцця выразна распадаецца на некалькі этапаў: віленска-ковенскі, да якога далучаецца высылка ў цэнтральныя рэгіёны Расіі, затым другі этап, які звязаны з працяглай, да канца жыцця, эміграцыяй у краінах Заходняй, Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропы.

Атрымаўшы гуманітарную адукацыю на гісторыка-філалагічным факультэце Віленскага універсітэта, А. Міцкевіч ведаў асноўныя заканамернасці развіцця грамадства, як і тое, што яго эвалюцыя нярэдка залежыць ад канкрэтных людзей, якія займаюць актыўную пазіцыю. Кіруючыся менавіта такім падыходам, ён з юнацкіх гадоў пачаў прымаць дзейсны ўдзел ў грамадскім жыцці Віленскага універсітэта. Важнай падзеяй на гэтым шляху стала заснаванне ў канцы 1817 г. Адамам Міцкевічам разам з Тамашом Занам, Юзафам Яжоўскім, Францішкам Малеўскім, Янам Чачотам, Ануфрыем Петрашкевічам студэнцкага Таварыства філаматаў — сяброў навук. Як адзначаў пазней вядомы ўдзельнік гэтай арганізацыі Ігнат Дамейка, Адам Міцкевіч з'яўляўся "душою таварыства" [1]. Разам з Тамашом Занам ён напісаў статут арганізацыі [2].

Таварыства філаматаў ўяўляла сабой тайную студэнцкую арганізацыю. Яго першапачатковай задачай з'яўлялася самаадукацыя, рэферыраванне літаратуры і інш. Аднак праз пэўны час усё большае месца стала займаць падрыхтоўка членаў таварыства да грамадскай дзейнасці, якая разумелася як імкненне да "грамадскага дабрабыту". Такі напрамак фарміраваўся пад уздзеяннем перадавых прафесараў Віленскага універсітэта, у першую чаргу Іаахіма Лялевеля.

Погляды Адама Міцкевіча, як і іншых удзельнікаў Таварыства філаматаў, развіваліся ў напрамку асуджэння сацыяльнай несправядлівасці. Аднак

[1] Domejko I. Filareci i filomaci. Poznań, 1872. S. 11.

[2] Ольшанский П. Декабристы и польское национально-освободительное движение. М., 1959. С. 166.

яно не вылілася ў канкрэтную праграму, а абмежавалася спачуваннем працоўнаму люду, спагадлівай ацэнкай яго высакародных якасцей, павышанай цікавасцю да народнага быту, фальклорнай творчасці і г. д.

Ідэі асветніцтва ў Таварыстве філаматаў даволі цесна перапляталіся з нацыянальна-вызваленчымі тэндэнцыямі. Свае погляды і імкненні члены таварыства мелі намер ажыццяўляць не толькі ў студэнцкія гады, але і на працягу ўсяго жыцця. Нават у статуце таварыства прадугледжвалася, што яго члены застаюцца сябрамі арганізацыі назаўсёды. Гэта было даказана многімі, у тым ліку, а, магчыма, у першую чаргу, Адамам Міцкевічам.

Невыпадковым з'яўлялася імкненне філаматаў садзейнічаць "па меры магчымасці ўсеагульнай асвеце". Такім шляхам яны мелі намер рыхтаваць грамадства да змагання за вызваленне Бацькаўшчыны ад царскага самаўладства. Пра гэта сведчыць, у прыватнасці, адзін з напрамкаў у дзейнасці таварыства, у межах якога вывучаліся розныя спосабы кіравання грамадствам і шляхі да яго дэмакратызацыі.

Адам Міцкевіч з'яўляўся адным з найбольш актыўных членаў арганізацыі і нават распрацоўшчыкам тактычных захадаў. Па яго ініцыятыве ў 1819 г. было ўтворана першае адгалінаванне Таварыства філаматаў, якое атрымала назву "Саюза сяброў". На працягу толькі аднаго года ў гэтую арганізацыю ўступілі 30 студэнтаў Віленскага універсітэта. Адам Міцкевіч напісаў статут "Саюза сяброў". Згодна з ім указаная арганізацыя павінна была ўзначальвацца членам Таварыства філаматаў і рыхтаваць для яго папаўненне. Вопыт утварэння адгалінаванняў Таварыства філаматаў практыкаваўся і ў больш позні час. У 1820 г. быў утвораны новы саюз — прамяністых.

Аднак найбольш значнай арганізацыяй з'яўлялася Таварыства філарэтаў, гэта значыць дабрадзеяў, якое дзейнічала ў 1820–1823 гг. Яно было створана філаматамі пасля таго, як тагачасны рэктар Віленскага універсітэта Сымон Малеўскі вымушаны быў распусціць Таварыства філаматаў. Накіраванасць новай арганізацыі вызначалася даволі яскравай нацыянальна-вызваленчай афарбоўкай. Кіраўнікамі арганізацыі, а сярод іх быў і Міцкевіч, які ў гэты час ужо настаўнічаў на Ковеншчыне, рабіліся захады, каб устанавіць кантакты з рускімі дваранскімі рэвалюцыянерамі.

Звяртаюць на сябе ўвагу паважлівыя адносіны Адама Міцкевіча да нацыянальна-дзяржаўнага вызначэння народаў. Як ён засведчыў пазней, чытаючы курс лекцый аб славянскіх літаратурах у Парыжы ў 1842 г., польскія паэты "не падзялялі ілюзій палітыкаў" адносна аднаўлення ў будучым усходніх межаў Польшчы [3]. Зразумела, што ў першую чаргу тут мелася на ўвазе нацыянальна-дзяржаўнае вызначэнне беларускага народа.

[3] Мицкевич А. Собр. соч.: В 5 т. М., 1954. Т. 4. С. 373–374.

Хаця арганізацыя філарэтаў была больш заканспіравана, аднак царскія ўлады яе раскрылі. Усяго было арыштавана не меней 160 чалавек, сярод якіх пераважалі выхадцы з беларускіх зямель. Аб гэтым сведчыць факт, што са 135 чалавек, якіх дапытала ўрадавая камісія пад кіраўніцтвам сенатара Мікалая Навасільцава, 133 былі з Віленскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай губерняў і Беласточчыны.

Дзейнасць Таварыстваў філаматаў і філарэтаў, у якіх Адам Міцкевіч адыграў важную кіруючую ролю, не без падстаў расцэньваецца некаторымі даследчыкамі, у прыватнасці Кастусём Цвіркам як самая першая хваля беларускага нацыянальнага адраджэння [4]. Аб гэтым сведчыць тая ўвага, што надавалася членамі таварыстваў народнай культуры, побыту, фальклору. У зборы і апрацоўцы народнай спадчыны члены таварыства зрабілі надзвычай шмат. Яны шырока выкарыстоўвалі гэтае багацце ў сваёй паэтычнай творчасці.

Звяртае на сябе ўвагу той факт, што стварэнне і дзейнасць Таварыстваў філаматаў і філарэтаў, а таксама іх адгалінаванняў супала па часе з такімі ж арганізацыямі дзекабрыстаў у Расіі. Хаця члены таварыстваў, што дзейнічалі ў Віленскім універсітэце, у тым ліку А. Міцкевіч, не ставілі перад сабой такіх радыкальных мэтаў, скіраваных на звяржэнне існуючага ў Расійскай імперыі манархічнага ладу, як дзекабрысты, аднак першыя з іх усё бліжэй падыходзілі да задач нацыянальнага вызвалення. У сувязі з гэтым нельга не адзначыць іх кантакты з рускімі дваранскімі рэвалюцыянерамі. У прыватнасці, Міхал Рукевіч, з'яўляючыся адным з актыўных дзеячаў Таварыстваў філаматаў і філарэтаў, быў сярод арганізатараў дзекабрысцкага "Саюза ваенных сяброў" у Літоўскім корпусе.

Што датычыць Адама Міцкевіча, то будучы высланым у цэнтральныя рэгіёны Расіі, ён прыбыў у канцы 1824 г. у Пецярбург, дзе пазнаёміўся з некаторымі дзеячамі руху дзекабрыстаў. Ад іх было ім атрымана нават даручэнне рабіць практычныя захады па збліжэнню прадстаўнікоў дзекабрыстаў з радыкальна настроенымі дзеячамі Беларусі, Польшчы, Літвы. Дзеля рэалізацыі гэтай справы ён прымаў удзел у кантактах, якія меліся паміж удзельнікамі Паўднёвага таварыства дзекабрыстаў і Польскага патрыятычнага таварыства.

Ужо будучы ў Маскве, Адам Міцкевіч даведаўся аб узброеным выступленні ў сталіцы 25 снежня 1825 г. і паражэнні паўстання дзекабрыстаў. Такі зыход ён цяжка перажываў.

Увайшоўшы ў маскоўскае літаратурнае асяроддзе і стаўшы частым госцем славутага літаратурнага салона княгіні-паэтэсы З. Валконскай, ён пазнаёміўся і зблізіўся з выдатнымі дзеячамі рускай літаратуры, у тым ліку з

[4] Філаматы і філарэты. Мн., 1998. С. 16, 21.

Аляксандрам Пушкіным. Дзякуючы падтрымцы і хадайніцтву сваіх рускіх калегаў і сяброў ён змог атрымаць дазвол і выехаць у пачатку 1829 г. за мяжу. Пачаўся новы этап яго жыцця ў краінах Еўропы, які характарызаваўся не толькі плённай літаратурнай працай, асабліва ў першыя гады эміграцыі, але і актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасцю.

Уважліва сачыў А. Міцкевіч за ходам паўстання 1830–1831 гг. у Польшчы і Заходняй Беларусі. Ён балюча перажываў яго паражэнне, адгукнуўся на яго выдатнымі творамі аб паўстанцах — "Рэдут Ардона" і "Смерць палкоўніка". Апошні верш, як вядома, прысвечаны гераіні паўстання Эміліі Плятэр. Яго творы гэтага часу вызначаюцца верай у канчатковы поспех вызваленчай барацьбы супраць царскага рэжыму. Гэта асабліва яскрава гучыць у найбольш значных творах паэта — паэме "Дзяды" (III частка) і ў "энцыклапедыі жыцця ліцвінаў" — "шляхецкай гісторыі" "Пан Тадэвуш".

Аб коле інтарэсаў А. Міцкевіча ў гэты час сведчыць і той факт, што ён распачынаў працу над стварэннем "Гісторыі Польшчы". Жывую цікавасць выклікалі ў яго нядаўнія, канца XVIII ст., падзеі ў родным краі. Аб гэтым сведчыць яго праца над гістарычнымі драмамі "Барскія канфедэраты" і "Якуб Ясінскі".

Аднак у 40-х гг. паэт перажыў цяжкі крызіс, які быў звязаны з тым, што ён трапіў пад уплыў містыка А. Тавянскага, зацікавіўся ідэямі месіянізму. Гэта адмоўна адбілася на яго літаратурнай творчасці.

З надзеяй былі сустрэты А. Міцкевічам рэвалюцыйныя падзеі 1848 г. у Еўропе. Характэрна, што менавіта ў гэты час ён пераходзіць да асабліва актыўных дзеянняў, скіраваных на дапамогу барацьбітам з рэакцыйнымі рэжымамі. Калі рэвалюцыя ахапіла Італію, А. Міцкевіч заняўся арганізацыяй польскага рэспубліканскага легіёна. Гэтае фарміраванне мужна змагалася ў складзе вызваленчай арміі Гарыбальдзі супраць прыгнёту польскага, італьянскага і іншых народаў — кіруючымі коламі Аўстрыйскай імперыі.

Выдатна разумеючы, якую сілу мае даходліва напісанае друкаванае слова, А. Міцкевіч у гэты час пачаў рэдагаваць у Парыжы штодзённую палітычную газету "Трыбуна народаў". Газета выходзіла ў 1849 г. на французскай мове і з'яўлялася міжнародным органам рэвалюцыйнага напрамку. У ёй паэт надрукаваў шмат сваіх яскравых публіцыстычных артыкулаў. У адным з іх прагучала пагроза ў адрас Луі Банапарта: "Хто, узнесены народам, забудзе, на якіх умовах яму падаравана ўлада, будзе расцэнены народам як здраднік, і даравання яму не будзе".

Характэрна, што ў сувязі з паражэннем рэвалюцыі 1848–1849 гг. А. Міцкевіч не згубіў веры ў лепшую будучыню. Аб гэтым сведчаць яго словы гэтага часу: "Трыумф зла не канчатковы, і ўсё добрае, што засталося ў душах нашых, дачакаецца адраджэння".

Яшчэ больш актыўнай стала грамадска-палітычная пазіцыя А. Міцкевіча ў час руска-турэцкай вайны, якая пачалася ў 1853 г. Зыходзячы з вопыту паспяховых ваенных дзеянняў польскага рэспубліканскага легіёна супраць арміі Аўстрыйскай імперыі, польскай эміграцыяй было вырашана стварыць ваенную адзінку, якая ваявала б на баку праціўнікаў Расіі — Турцыі, Францыі, Англіі. Адам Міцкевіч актыўна ўключыўся ў арганізацыю такога воінскага фарміравання. З гэтай мэтай французскае Міністэрства асветы накіравала яго ў Турцыю. Разам з іншымі польскімі дзеячамі ён актыўна працаваў над стварэннем гэтага легіёна, але настойваў, каб той дзейнічаў самастойна, а не пад замежным камандаваннем. Разам з гэтым А. Міцкевіч рабіў захады па арганізацыі яўрэйскага легіёна. Пры гэтым ён зыходзіў з таго, што барацьба найперш павінна весціся з расійскім абсалютызмам.

У час такой энергічнай дзейнасці А. Міцкевіч нечакана памёр у Канстанцінопалі: па афіцыйнай версіі — ад халеры, але існавала меркаванне, што ён быў атручаны. Так закончыўся жыццёвы шлях не толькі сусветна прызнанага паэта, але і вядомага грамадска-палітычнага дзеяча.

З сказанага бачна грамадска-палітычная эвалюцыя Адама Міцкевіча: ад актыўнай пазіцыі ў дзейнасці Таварыстваў філаматаў і філарэтаў, іх адгалінаванняў, ад узаемаразумення і непасрэдных кантактаў з дзекабрыстамі да арганізацыі ўзброенай барацьбы з аўстра-венгерскім, а затым і расійскім манархічнымі рэжымамі. Гэта была патрыятычная пазіцыя, якая плённа спалучалася з яго выдатнай літаратурнай творчасцю, што мела рамантычную накіраванасць. Такім ён і застаецца ў памяці беларускага, польскага, рускага, іншых народаў — выдатным паэтам, патрыётам, грамадзянінам.

Andrzej Wierzbicki *(Warszawa)*

ADAMA MICKIEWICZA KONCEPCJA DZIEJÓW POLSKI

W myśli historycznej pierwszej połowy XIX wieku rywalizowały ze sobą liczne i nierzadko wręcz krańcowo zróżnicowane ujęcia dziejów Polski, ale tylko dwa z nich występowały najwyraziściej, wyznaczając główne szlaki konceptualizacji naszych dziejów ojczystych. Historycy historiografii nadawali im różne nazwy, najczęściej jednak nawiązujące do przeciwstawnych kierunków politycznych, a mianowicie do monarchizmu i republikanizmu. Rzecz znamienna, że tak jedną, jak i drugą koncepcję rozwijano głównie na emigracji, tam bowiem przebywali zarówno najwybitniejszy polski historyk ówczesnej doby — "republikanin" Joachim Lelewel, jak i najgłośniejsi dziejopisowie związani z monarchicznym stronnictwem księcia Adama Czartoryskiego — Karol Boromeusz Hoffman i Karol Sienkiewicz. Na emigracji pozostawał też Mickiewicz..

Koncepcję Mickiewiczowską postaram się scharakteryzować wyodrębniając jako jej części konstytutywne następujące elementy: 1 — ideę słowiańskości dziejów Polski, 2 — powstanie państwa polskiego, 3 — Polskę Piastowską, 4 — jagiellońskie apogeum dziejów Rzeczypospolitej, 5 — kryzys czasów pojagiellońskich, 6 — rosyjsko-litewską paralelę oraz 7 — kryzys i upadek Rzeczypospolitej [1].

1. Słowiańskość

Można powiedzieć, że w ujęciu Mickiewicza całokształt dziejów Polski naznaczony był cechą słowiańskości. Od prapoczątków aż do współczesności, a biorąc pod uwagę najgłębszy plan historiozoficzny również i w przyszłości [2] czynnikiem najważniejszym, choć nie zawsze uwidaczniającym się z jednakową wyrazistością, pozostawała słowiańskość dziejów Polski.

Po wielokroć już podkreślano, że Mickiewicz idealizował Słowian, widząc w nich lud łagodny, uczciwy, pracowity, mający w swej naturze pierwiastki demokratyczne ("gminowładne"), lud cieszący się życiem i wyrażający to głównie w pieśni i tańcu. Ten zestaw cnót mniej lub bardziej świadomie przypisywał Słowianom za J. G. Herderem niemały zastęp tych, którzy wierzyli, że już wkrótce nadejdzie era słowiańskiego przewodnictwa w dziejach ludzkości. Wiadomo, że w owym zastępie Mickiewicz odgrywał rolę pierwszoplanową, a jednak jego wiara w słowiańską przyszłość nie była bynajmniej tożsama z bezkrytyczną idealizacją słowiańskiej przeszłości. W pierwotnych dziejach Słowian dostrzegał wiele cech ujemnych, w tym nikłość dorobku cywilizacyjno-kulturowego oraz organiczny wręcz brak zdolności państwotwórczych. Sami z siebie Słowianie nie mogli, jego zdaniem, stworzyć własnego państwa i w efekcie zrobili to za nich inni.

2. Powstanie państwa polskiego (najazd, monarchia, chrześcijaństwo)

W ujęciu Mickiewiczowskim państwo polskie, podobnie jak sąsiednie państwa słowiańskie, powstało w wyniku najazdu. Na Wschodzie przybyszami z

---

[1] Historyczne aspiracje Mickiewicza uwidoczniły się m. in. w nieukończonym dziele *Pierwsze wieki historii polskiej*, którego pierwodruk ukazał się pośmiertnie w przekładzie na francuski (*Les premieres siĉcles de l'histoire de Pologne*, Paris 1868) oraz w kilku drobniejszych pismach ogłoszonych również dopiero po śmierci poety. W całości zostały one opublikowane w: A. Mickiewicz, Dzieła, t. VII, Warszawa 1950. Dla rekonstrukcji Mickiewiczowskiej koncepcji obejmującej całokształt dziejów Polski podstawowe znaczenie mają jednak prelekcje wygłoszone w College de France. Zob. M. Wierzbicka, *Lelewel a Mickiewicz, Problem trwałości romantycznych koncepcji dziejów Polski* (w:) *Joachim Lelewel. Człowiek i dzieło. W 200-lecie urodzin. Materiały z ogólnopolskiej sesji naukowej. Żagań 12–14 IX 1986.* Pod redakcją K. Bartkiewicza, Zielona Góra 1988, s. 233–234.

[2] Zob. A. Walicki, *Filozofia a mesjanizm. Studia z dziejów filozofii i myśli społeczno-religijnej romantyzmu polskiego*, Warszawa 1970, s. 46–59; tenże, *Adama Mickiewicza prelekcje paryskie* [w:] *Polska myśl filozoficzna i społeczna*, t. I pod red. A. Walickiego, Warszawa 1973, s. 216–272. Z. Stefanowska, *Legenda słowiańska w prelekcjach paryskich* [w:] tejże, *Próba zdrowego rozumu*, Warszawa 1976, s. 152 i n. Ostatnio: J. Ruszkowski, *Adam Mickiewicz i ostatnia krucjata. Studium romantycznego millenaryzmu*, Wrocław 1996, s. 157–158. A. Sepkowski, *Utopie polskiego romantyzmu. Światopogląd a działanie*, Piotrków Trybunalski 1997, s. 175–176 i n.

zewnątrz mieli być normańscy Waregowie, natomiast w samej Polsce i na południe od niej — przybyłe z Kaukazu plemiona Lechów i Czechów. Owe dwa rozbieżne kierunki, z których przyszli z jednej strony Rusowie, z drugiej zaś Czechowie i Lechowie nie wykluczały w ujęciu Mickiewicza plemiennego powinowactwa. Zarówno bowiem Rusowie (Waregowie), jak i Lechowie i Czechowie wywodzić się mieli od indoeuropejskich Azów [3], z tym iż Rusowie wcześniej jakoby opuścili ziemie ojczyste udając się w stronę Skandynawii, natomiast Lechowie i Czechowie — nieco później, przy czym pierwszym kierunkiem ich ekspansji miał być Kaukaz. W ten sposób dawne przekazy mówiące o "braterstwie" Lecha, Czecha i Rusa miały być oparte na historycznej rzeczywistości.

Najeźdźcy w bardzo krótkim czasie zeslawizowali się, przyjmując język i obyczaje miejscowe, z tym że o ile w Polsce i Czechach dość szybko władza przeszła w ręce autochtonicznych, słowiańskich dynastii, to na Rusi przez cały czas pozostawała ona w rękach Waregów. W tym upatrywał Mickiewicz jedną z przyczyn odmiennego biegu dziejów w słowiańszczyźnie wschodniej i zachodniej.

W ujęciu Mickiewicza doniosłym czynnikiem panstwotwórczym była monarchia. Dawni Słowianie rządzili się gminowładnie, nie mieli ani hierarchii, ani władzy królewskiej, a to skazywało ich na słabość polityczną. Monarchia, w tym jeśli chodzi o Polskę — monarchia piastowska, odegrała więc rolę jednoznacznie pozytywną. Nie oznaczało to wszakże, iż zawsze i po wsze czasy linia monarchiczna wyznaczać miała prawidłowy bieg (kierunek) polskiego procesu dziejowego. Do sprawy tej wypadnie jeszcze powrócić w innym miejscu.

Państwotwórze impulsy, jakie dały Polsce plemiona lechickich najeźdźców, oraz monarchiczna forma władzy uległy potężnemu wzmocnieniu z chwilą przyjęcia chrześcijaństwa, co odbyło się bez większych przeszkód ze względu na to, że dotychczasowa religia Słowian miała być monoteistyczna i zakładająca nieśmiertelność duszy. Był to trzeci element konstytuujący państwo i społeczeństwo polskie, element wprowadzający je na drogę cywilizacyjnego rozwoju w obrębie ludów Zachodu. Natomiast fakt, że Ruś przyjęła chrześcijaństwo wschodnie, miał pogłębić odmienności dróg historycznego rozwoju. "Królestwa Polski i Czech — pisał Mickiewicz — tudzież wielkie państwo Ruso-Waregów zaczynają kroczyć odmiennymi drogami politycznymi, przyjąwszy innego ducha, jedne z Zachodu, z Rzymu, drugie ze Wschodu, z Carogrodu" [4].

---

[3] Początkowo Mickiewicz mówił o ludności pochodzenia "indogermańskiego", ostatecznie jednak poszedł za tymi, którzy używali określenia: "ludność indoeuropejska". Zob. A. Mickiewicz, *Dzieła,* t. 8, Warszawa 1952 s. 56. W dalszych przypisach odwołujących się do Narodowego Wydania Dzieł Adama Mickiewicza zastosowany został zapis skrócony, według schematu: WN (Wydanie Narodowe), t. (tom)… , s (strona)…

[4] Ibidem, s. 339.

3. Cienie i blaski Polski Piastowskiej

Mickiewicz ambiwalentnie oceniał wczesnopiastowskie dzieje Polski, w których odnajdywał zarówno wydarzenia ogromnie ważne, wręcz przełomowe dla pomyślności polskiego państwa, jak i zjawiska destrukcyjne, zapowiadające późniejszą słabość. Do pierwszych z nich zaliczał pielgrzymkę Ottona III do Gniezna i związane z nią cesarskie gesty i koncesje [5], do drugich — swego rodzaju ospałość religijną władców, duchownych, a także prostego ludu polskiego. Jego zdaniem Polacy nie potrafili pójść wskazaną przez św. Wojciecha drogą pozyskiwania dla wiary chrześcijańskiej nowych ludów. Nie chcieli brać udziału w krucjatach [6]. Było to uchybienie narodowemu posłannictwu i w efekcie źródło wielu późniejszych nieszczęść [7].

Testament Krzywoustego, władcy — jak utrzymywał Mickiewicz — "wielkiego", zapoczątkował okres rozbicia państwa, kiedy to ze szczególną wyrazistością uwidoczniły się destrukcyjne spory i walki między "zazdrosnymi" książętami. Skąd zatem przekonanie o wielkości tego władcy?

W wykładach prowadzonych w College de France Mickiewicz sformułował dość zaskakującą tezę, a mianowicie, że niezależnie od wszystkich mankamentów związanych z decentralizacją władzy "podział Polski na kilka księstw zabezpieczył jej przyszłość" [8]. W wyniku decentralizacji powiększył się zastęp osób czynnych w życiu politycznym, stan rycerski począł wyraźniej utożsamiać się z państwem, wręcz uważać je za swoją własność, i to właśnie miało ocalić Polskę, odbudować ją i stworzyć później jej cywilizacyjną potęgę. Wydaje się, że takiej apologii okresu rozbicia dzielnicowego nie dał przed Mickiewiczem nikt, aczkolwiek pewnych niewielkich inspiracji doszukać się tu można w koncepcji lelewelowskiej. Z pewnością niezbyt koheretne są wypowiedziane jednym tchem tezy o "okrutnych i zgubnych dla kraju walkach", które wzniecił testament Krzywoustego, i o tym, że tenże testament zabezpieczył przyszłość państwa, ocalił je i pchnął na drogę niezwykłej świetności. Pamiętajmy jednak, że profesor College de France nie przestawał być poetą, a poetów koherencja nie obowiązuje. Warto również pamiętać, że antynomiczna dialektyka była jednym z symptomów owych czasów.

4. Jagiellońskie apogeum

Rzeczpospolita sięgnęła szczytu swej potęgi pod Jagiellonami, toteż Mickiewicz nie omieszkał podkreślić, że rządy ich wyodrębniły w dziejach Polski

[5] WN, t. 8, s. 144.

[6] Zob. J. Ruszkowski, op. cit., s. 127–128, 178 i n., gdzie autor m. in. podkreśla, że według Mickiewicza "Polska w średniowieczu nie spełniła swojej misji (niewzięcie udziału w krucjatach było czymś w rodzaju grzechu pierworodnego), została za to ukarana, i dopiero w przyszłości, w wyniku mozolnej pracy duchowej, zajmie należne jej pierwsze miejsce wśród narodów świata.".

[7] WN, t. 8 , s. 142.

[8] Ibidem, s. 296.

całą epokę przypadającą na wiek XV i XVI. Wyjątkowość tej epoki polegała na jagiellońskiej umiejętności łagodzenia konfliktów i zatargów, dzięki czemu udało się zjednoczyć dwa narody. "Jest to pono jedyny w dziejach przykład — pisał Mickiewicz — zupełnego połączenia się dwóch szczepów, które nie kosztowało ani kropli krwi" [9].

W ujęciu Mickiewicza wielkość epoki jagiellońskiej nie oznaczała jednak, że był to okres całkowitej szczęśliwości, a wywodzący się z tej dynastii królowie rządzili nie popełniając żadnych błędów. Nie oznaczała też, że wewnątrz Polski nie zrodziły się zjawiska, które w późniejszych czasach przyniosły jak najgorsze owoce.

Właściwie to jeszcze za panowania ostatniego z Jagiellonów zaszedł w Polsce "wielki przewrót", polegajacy na gwałtownym rozroście potęgi szlacheckiej i osłabieniu prestiżu króla [10]. Na domiar złego krzewienie się reformacji pogłębiało chaos wewnątrz kraju. Według Mickiewicza były to niekorzystne objawy zanikania w Polsce jedności religijnej i moralnej.

5. Kryzys czasów pojagiellońskich

Wprowadzenie w Rzeczypospolitej po śmierci Zygmunta Augusta zasady elekcji oceniał Mickiewicz bardzo krytycznie. Stymulować ona miała ruch "pchający Polskę ku "gminowładztwu szlacheckiemu" (republikańskiej demokracji), a tę właśnie formę ustrojową oceniał jak najgorzej.

W ogólnie negatywnym osądzie epoki pojagiellońskiej Mickiewicz zgadzał się z Lelewelem. Taka konstatacja nie może jednak przesłonić istotnych rozbieżności między profesorem College de France a jego dawnym, wileńskim nauczycielem uniwersyteckim. Pierwszy bowiem źródeł kryzysu Rzeczypospolitej doszukiwał się w pasywności i tolerancji, z jaką Polacy traktowali szkodzące krajowi wyznania reformowane, w związku z czym realizacja uchwał soboru trydenckiego i sprowadzenie jezuitów stanowiły dlań wręcz rację stanu polskiego państwa. Drugi natomiast odwracał ten tok myślenia — sobór trydencki i zakon jezuitów były dlań czynnikami, które zachwiały tolerancyjną istotą polskiego ducha narodowego i tym samym wprowadziły Rzeczpospolitą na zgubną, "cudzoziemską" drogę. W ten sposób objawiły się dwie całkowicie odmienne interpretacje "pojagiellońskich" dziejów Polski. Obie oceniały te czasy ujemnie, ale każda w oparciu o inne ich rozeznanie i inne wartości.

Pora jednak na kolejne "ale". Bo przecież w aksjologiach Mickiewicza i Lelewela, i to odnoszonych do tak kardynalnych kwestii, jakimi były elekcja viritim i charakter władzy wybieralnej w Polsce, dałoby się dostrzec również wiele wspólnego. Okazywało się bowiem, że Mickiewicz uznawał za wielce prawdopodobną tezę, iż "prawidłowy" rozwój życia politycznego w Polsce prowadził

[9] WN, t. 8, s. 329.
[10] Ibidem, t. 9, s. 71–72.

ku “formie rzeczypospolitej rządzonej przez dożywotnich naczelników” [11], a właśnie owa zasada wybieralnego “naczelnictwa” była wielokrotnie wynoszona na piedestał przez Lelewela, z którego nawet kpiono dobrotliwie, że w królu polskim widział wręcz prezydenta. Mickiewicz bynajmniej nie potępiał idei powszechnych, obywatelskich wyborów, twierdził jedynie, że jeżeli wiodła ona państwo polskie do kryzysu to dlatego, że została wprowadzona bez odpowiedniego przygotowania “moralnego” obywateli Rzeczypospolitej oraz bez uprzedniego zharmonizowania jej z innymi urządzeniami ustrojowymi państwa. Zło miało leżeć jedynie w tym, że zasadę wybieralności wprowadzono w Polsce przedwcześnie.

6. Paralela rosyjsko-litewska

W Mickiewiczowską koncepcję dziejów Polski zawartą w prelekcjach paryskich szczególnie wyraziście włączone zostały dwa układy odniesień, a mianowicie dzieje Rosji i Litwy.

Oto Rosja. Jej słowiański komponent etniczny i kulturowy zostaje w toku dziejów jakgdyby przytłumiony, a właściwie zatracony. Wypadnie w tym miejscu przypomnieć, że zdaniem Mickiewicza w waregsko-normańskim państwie założonym przez Rusów władza nigdy nie przeszła w ręce Słowian, podczas gdy Czechowie i Lechowie bardzo szybko zostali jej pozbawieni na rzecz autochtonicznych, słowiańskich dynastii. Tu właśnie spoczywały korzenie owego dualizmu w rozwoju historycznym Rosji z jednej, a Czech i Polski z drugiej strony. Lecz nie tylko Waregowie stanowić mieli o charakterze i kierunku dziejów Rosji — państwa wyrosłego z despotyzmu i gruntującego swą potęgę na wszystkim tym, co było zaprzeczeniem wolności. Drugim elementem deslawizacji byli Mongołowie, którzy podporządkowawszy sobie plemiona ruskie narzucili im swój styl rządzenia i sposób myślenia.

Jeżeli Waregowie mieli zachwiać słowiańską duszę Rosji wnosząc w nią masę złych pierwiastków, w tym upodobanie do mordu i zdrady [12], to Mongołowie — będący według Mickiewicza plemieniem fińskim o czaszkach mających “osobliwą budowę hamującą rozwój rozumu” [13] — dodali do tego porcję niezwykłego despotyzmu i okrucieństwa. Lecz to jeszcze nie wszystko. W dalszym toku dziejów Rosja oddana została na pastwę jedynowładnych carów, zmierzających świadomie “do wykorzenienia żywiołu słowiańskiego” [14]. Najwyraziściej uwidoczniło się to za rządów Iwana Groźnego, naznaczonych falami nieopisywalnych okrucieństw i morderstw. Na koniec Romanowowie doprowadzili do tego, że pozostały już tylko “resztki tradycji słowiańskich” [15].

[11] WN, t. 9, s. 190.
[12] Ibidem, t. 8, s. 94.
[13] Ibidem, t. 10, s.221.
[14] Ibidem, s. 62.
[15] Ibidem, s. 63.

Taki właśnie nadany przez Waregów, a później zintensyfikowany przez Mongołów i kontynuowany przez samowładnych rosyjskich carów kierunek deslawizacji Rosji sprawił, że jej droga dziejowa była krańcowo przeciwstawna do polskiej, po prostu "Polska — jak pisał Mickiewicz — była uosobieniem idei przeciwnej Rosji" [16]. Diagnoza Mickiewicza co do Rosjan nie brzmiała jednak w pełni pesymistycznie. Dostrzegał bowiem, że naród ten ma szansę reslawizacji, a w swej postępowej, antycarskiej części poczynił już po temu niemałe kroki, czego przykładem miało być powstanie dekabrystów.

Zapatrywania Mickiewicza zbiegały się w tym wypadku ze stanowiskiem zajętym przez Lelewela, który nazywając Rosję po podbojach tatarskich "odrostkiem wykrzywionym słowiańszczyzny" wyłączył ostatecznie jej dzieje z ogólnych dziejów słowiańskich. Moskwa (Rosja) stanowiła dlań twór gatunkowo odmienny od pradawnej Rusi, mający jednak w swej genezie etnicznej zatraconą później słowiańskość. Lelewel widział w tym szansę dla reslawizacji rosyjskiego ludu w przyszłości [17].

Zatracona słowiańskość oznaczała w historii Rosji despotyzm, okrucieństwo, niewolę i wyjaśniała agresywność tego państwa w stosunku do sąsiadów. Charakterystyczne, że całkiem przeciwnie biegły w ujęciu Mickiewicza dzieje Litwy. Początkowo jej niesłowiański lud, organizacja państwa, a także agresywność i umiejętności podbijania innych plemion miały stawiać potomków Mendoga bliżej Niemców i Normanów. Lecz oto po zajęciu ziem ruskich Litwini jęli według określenia Mickiewicza "tonąć" w swym podboju, a utonąwszy stali się się, tak jak wcześniej Czechowie i Lechowie, po prostu Słowianami. Przejęli najpierw język ruski, a potem poczęli ulegać wpływom języka polskiego [18]. Jedność Rzeczypospolitej Obojga Narodów realizowała się nie tylko w jedności form państwowych, ale również w jedności ducha jej mieszkańców. Wspólnota ducha była przy tym po stokroć ważniejsza od etnicznego pochodzenia.

Podsumujmy: przeprowadzona w wykładach paryskich paralela historyczna Polski i Rosji pokazywała proces oddalania się od siebie obu państw i narodów, natomiast paralela Polski oraz Wielkiego Księstwa Litewskiego — proces wzajemnego zbliżania się i zlania w jedną polityczną i duchową całość, za jaką profesor College de France uważał Rzeczpospolitą Obojga Narodów. W tej "rzeczy" mieściły się plemiona polskie, ruskie i litewskie, mieścili się Żydzi, Tatarzy i Ormianie. Była to "rzecz" ludzi równych. Rosjan również, pod warunkiem, że zrzucą oni z siebie ciężar despotyzmu, a tym samym powrócą do przytłumionej w toku dziejów słowiańskości.

[16] WN, t. 10, s. 223.

[17] L. Lelewel, *Dzieje Litwy i Rusi aż do unii z Polską w Lublinie 1569 zawartej* [w:] tegoż *Dzieła*, t. X, Warszawa 1969, s. 125.

[18] WN, t. 9, s. 5–7.

7. Przyczyny upadku (Słabość wewnętrzna i "mongolizm")

Do przyczyn upadku Rzeczypospolitej zaliczał Mickiewicz jej słabość wewnętrzną spowodowaną urządzeniami ustrojowymi oraz upadkiem ducha i cnót obywatelskich. Ogromną uwagę zwracał jednak również na zmianę klimatu politycznego, jaka nastąpiła w Europie po pokoju westfalskim.

Wówczas to Zachód, wprawdzie "nieśmiało", ale dość wyraźnie, jął ulegać od dawna kierującej poczynaniami moskiewskiego gabinetu idei mongolskiej, przejawiającej się pod postacią despotycznego pomiatania ludźmi i narodami, pod postacią kultu materii oraz destrukcji dawniej uświęconych wartości. Europa odwróciła się od Polski, której funkcja "chrześcijańskiego przedmurza" stała się już jakgdyby anachronizmem [19]. Życzliwość jej zyskała natomiast Rosja — wraz z całym systemem samowładztwa i wzniesioną na nim potęgą. Europa, a słowo to odnosił Mickiewicz do państw Zachodu, ulegała ponadto różnego rodzaju złudzeniom biorąc za dobrą monetę "cywilizacyjne" mistyfikacje rosyjskie, ale to już inna sprawa. Najważniejsze pozostaje owo zbliżenie systemów wartości, jakie zachodzić miało między samowładną Rosją a absolutystyczną Europą. Odtąd "zapomniana" Polska wraz ze swą chrześcijańską rzetelnością" jawi się politykom europejskim jako "osobliwość" tylko i "staroświecki przesąd".

Mamy już zatem nie tylko zmongolizowaną Rosję, ale i w dużym stopniu Europę. Tak rozumiana mongolizacja to oczywiście zjawisko nie etniczne, nie genetyczne, lecz świadomościowe, to po prostu "duch materializmu", kult siły władzy i pieniądza [20] — to "epidemia moralna" [21]. Fala "mongolizmu" miała nawet porywać koryfeuszy ówczesnej myśli filozoficznej, czego przykładem był dla Mickiewicza, zadomowiony na dworze rosyjskim i znakomicie rozumiejący się z z absolutnie oświeconą Katarzyną II, Voltaire. Dochodzi do sytuacji, w której "cały pochód polityczny i filozoficzny Europy jest wręcz przeciwny politycznemu i religijnemu pochodowi Polski" [22]. I oto ta właśnie odmienność kierunków rozwoju, a w jej efekcie całkowite osamotnienienie, stanowić miały jeden z najdonioślejszych "zewnętrznych" czynników słabnięcia Rzeczypospolitej. Polskę nadwerężały jej zasady i wierność dawnym ideałom.

• • •

Pora na podsumowanie.

Koncepcji Mickiewiczowskiej nie da się jednoznacznie przypisać żadnemu z dwóch głównych kierunków interpretacyjnych występujących w polskiej historiografii, ani monarchicznemu, ani republikańskiemu. Od modelowego republikanizmu odróżniała ją wysoka ocena władzy królewskiej, stanowiącej jed-

[19] WN, t. 9, s. 220–221.
[20] Ibidem, s. 221.
[21] Ibidem, t. 10, s. 145.
[22] Ibidem, t. 9, s. 225.

noznacznie pozytywny czynnik rozwoju państw słowiańskich, a w tym Polski. Natomiast od wzorcowego monarchizmu oddalały ją wyraźne sympatie dla statusu króla-naczelnika, władcy bynajmniej nie dziedzicznego, lecz elekcyjnego, a także w żadnym wypadku nie absolutystycznego. Oddalała ją supozycja, że mimo wszystkich korzyści, które dawała monarchia, prawidłowym dla Polski kierunkiem dziejowym był republikanizm, i w końcu oddalało ją przekonanie, że Słowianie w swych początkowych dziejach rządzili się republikańsko (gminowładnie). Warto bowiem w tym miejscu przypomnieć, że z kręgów najbliżej związanych ze stronnictwem Czartoryskiego wyszła teza, jakoby dla Słowian "rodzimy" był monarchizm, a nie republikanizm. Według Karola Sienkiewicza to właśnie republikanizm był w dziejach Polski "obcym" nalotem, który rozplenił się zwłaszcza pod wpływem renesansowej fascynacji antykiem. Jak więc widać w dobie romantyzmu zarówno kierunek republikański, jak i monarchiczny ceniły sobie wielce historyczne argumenty mające przemawiać za ich rodzimymi, słowiańsko-polskimi źródłami. Fakt, iż w żadnym z tych nurtów nie mieści się w pełni ujęcie Mickiewiczowskie, świadczy niewątpliwie o jego oryginalności, zarazem jednak potwierdza tezę, że dychotomiczny podział na monarchiczne i republikańskie koncepcje historii Polski ma ograniczoną przydatność dla badaczy dziejów myśli historycznej i politycznej [23].

Wydaje się, że w wypadku Mickiewicza znacznie większą przydatność okazuje inna dychotomia, w odwołaniu do której usiłujemy określać główne kierunki, jakie zarysowały się w interpretacjach dziejów Polski, a mianowicie kierunek okcydentalistyczny i kierunek oryginalistyczny, by użyć nienajzręczniej zapewne brzmiących określeń. Ten pierwszy za wzorzec prawidłowego rozwoju uznawał dla Polski typ państwa zachodnioeuropejskiego, ten drugi, negując wszelkie ponadindywidualne wzorce zewnętrzne, traktował rodzimość, a szerzej mówiąc oryginalność, jako pożądaną cechę rozwojową każdego z narodów i w odstępstwach od tej cechy doszukiwał się źródeł kryzysów, załamań i anomalii dziejowych. To ostatnie stanowisko, którego spektakularnym przykładem jest koncepcja Lelewelowska, było wyrazem romantycznego multilinearyzmu, głoszącego, że każdy naród ma swą odrębną, indywidualną linię historycznego rozwoju. W odniesieniu do tak rozumianej zasady wielokierunkowości dziejów narodowych ujęcie Mickiewiczowskie wyłamywało się w kilku elementach, które dałyby się sprowadzić do jednej tezy generalnej, a mianowicie, że poprzez chrześcijaństwo (1) i monarchię (2) Polska znalazła się w rodzinie narodów zachodnioeuropejskich (3), a wszystko to były zjawiska nad wyraz korzystne dla jej rozwoju (4). Na pozór była to formuła całkowicie okcydentalistyczna, w istocie jednak koncepcji Mickiewiczowskiej ton nadawała rodzimość, a nie zachodniość.

[23] Por. M. Wierzbicka, op. cit. s. 241, gdzie Autorka w ogóle wyraziła przekonanie, że "indywidualność Mickiewicza nie mieści się w doktrynach czy kierunkach myśli historycznej".

Bo przecież chrześcijaństwo przyszło wprawdzie z zewnątrz, z Zachodu, lecz natrafiło u Słowian na religię wyznającą rodzime dogmaty jednego Boga i nieśmiertelności duszy oraz na postawę szczególnie otwartą na chrześcijańskie wartości. Również monarchizm Mickiewicza nie był aż tak monarchiczny, jak mogłoby się to wydawać choćby po jego apologii dynastii jagiellońskiej i dezaprobacie dla ograniczającej władzę króla szlachty. Wszak za bardzo prawdopodobną uznawał Mickiewicz tezę, że prawidłową dla Polski linią rozwoju było dążenie do ustroju republikańskiego, opartego na wybieralności naczelnika, a to przecież nie co innego, tylko "prezydencka" teza Lelewela. Jest zresztą rzeczą znamienną, że wybitni znawcy problemu Stanisław Pigoń, Maria Janion, Maria Żmigrodzka expressis verbis mówią nie o monarchizmie, tylko o republikanizmie Mickiewicza [24]. A zatem i w tym wypadku Mickiewicz nie chciał jakgdyby sprawić uszczerbku romantycznemu idolowi rodzimości.

Pozostaje kwestia ostatnia, a mianowicie członkostwo w rodzinie narodów zachodnioeuropejskich. W ujęciu Mickiewicza "przynależność do rodziny" nie oznaczała bynajmniej konieczności przechodzenia tych samych faz i podążania w tym samym kierunku rozwojowym co inni "krewni". Multilinearyzm obowiązywał bowiem nawet wewnątrz określonej wspólnoty kulturowo-cywilizacyjnej, nie mówiąc już o wspólnotach politycznych. Dominantą Mickiewiczowskiej koncepcji dziejów ojczystych jest więc oryginalność. Ramy dla owej oryginalności wyznacza jednak zachodnioeuropejskość, rozumiana jako określony **typ** kulturowo-cywilizacyjny. Czy była to kolejna romantyczna antynomia? Raczej nie. Była to po prostu koncepcja Reczypospolitej wolnych i równych narodów.

Юрый Бохан *(Мінск)*

ГІСТАРЫЧНЫЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Гістарычная тэматыка ўвесь час вабіла А. Міцкевіча, які неаднаразова выкарыстоўваў матывы "ліцвінскай" і польскай гісторыі ў сваіх неўміручых творах. Сярод сюжэтаў, адлюстраваных у творчасці славутага песняра, важнае месца займаюць падзеі, звязаныя храналагічна з раннім "літоўскім" перыядам і Вялікім Княствам Літоўскім у тыя часы, калі гэтая дзяржава не стала яшчэ суб'ектам ліцвінска-польскай лучнасці — Рэчы Паспалітай абодвух народаў. Менавіта гэты адрэзак часу выступае ў творчасці Міцкевіча як найбольш легендарны, звязаны з найвялікшай славай ліцвінскага народа, што адзначаецца самім паэтам, у прыватнасці, у прадмове да першага выдання

[24] M. Janion, M. Żmigrodzka, *Romantyzm i historia*, Warszawa 1978, s. 160.

паэмы “Конрад Валенрод”. І ў гэтым няма нічога дзіўнага, бо тыя часы былі перыядам росквіту велічы Вялікага Княства Літоўскага, якая, разам з двухсэнсоўнасцю выкарыстаных Міцкевічам крыніц, а таксама не такім свежым успрыманнем рэчаіснасці, як у дачыненні падзей часоў Рэчы Паспалітай або пачатку XIX ст., давала славутаму сыну Навагрудчыны мажлівасць асэнсоўваць яе праз прызму міфалагізацыі, што ці не з найбольшай сілай выявілася ў творах “Свіцязь”, “Свіцязянка”, “Конрад Валенрод”, “Жывіля”, “Мешка, князь навагрудскі”. Дарэчы, у апошнім са згаданых твораў аўтар для дасягнення патэтычнага гучання не пазбягае выразных гістарычных паралеляў, паколькі апісаныя тут падзеі ўвогуле больш нагадваюць не старонкі ліцвінскай гісторыі, а сітуацыю ў Маскоўскай дзяржаве таго ж часу (XIV ст.), што ўзмацняецца ўвядзеннем у змест рэальнай гістарычнай асобы — хана Мамая. А калі прыняць пад увагу гістарычныя лёсы будучай Расіі, а менавіта пашырэнне яе тэрыторыі на ўсход, у тым ліку і за кошт татара-мангольскіх ордаў, магутнасць якіх была падарвана ў выніку ўнутраных супярэчнасцей, то развязка гэтага твора набывае даволі акрэсленае гучанне.

Вядома ж, А. Міцкевіч быў далёкі ад дакладнага пераказу гістарычных крыніц і таму падыходзіць да ягонай творчасці выключна з гістарычнымі меркамі не выпадае. Аднак несумненна таксама, што ён, выкарыстоўваючы сюжэты ліцвінскай мінуўшчыны для стварэння найбольш яркіх мастацкіх вобразаў, закліканых абудзіць у чытача гераічна-патрыятычныя пачуцці, надзвычай надзённыя ва ўмовах першай паловы XIX ст., быў добра знаёмы з уласна гістарычнымі крыніцамі. Дастаткова згадаць яго працу над стварэннем вобраза вялікага магістра Тэўтонскага ордэна Конрада Валенрода, які з’яўляецца зборным персанажам — прататыпам яго былі некалькі асоб, апісаных у старадаўніх дакументах. Незвычайная гістарычная дасведчанасць А. Міцкевіча, асабліва ва ўмовах, калі ён жыў і тварыў, праявілася як у веданні асобных дэталей, так і ў арыентаваны ў агульных тэндэнцыях і нават у некаторых даўніх ацэнках канкрэтных асоб. У якасці прыкладу можна прывесці паэму “Гражына”, дзе даецца, як уяўляецца, вельмі трапны зрэз ліцвінскай гісторыі канца XIV – першай паловы XV ст., калі Вялікае Княства раздзіралася міжусобіцамі, выкліканымі як палітычнымі, так і дынастычнымі прычынамі. Не можа не выклікаць здзіўлення і характарыстыка Вітаўтавага двара як бліскучага, пышнага, што ў гэтым сэнсе не саступаў дварам іншых вядомых еўрапейскіх манархаў і нават пераўзыходзіў іх. Такую ацэнку прыдворнай атмасферы Вялікага Княства Літоўскага часоў Вітаўта можна знайсці ў рэальных крыніцах, у прыватнасці, у данясеннях крыжацкіх шпіёнаў, што знаходзіліся пры асобе гэтага гаспадара. Прыцягвае ўвагу таксама панегірык Вітаўту, які, хаця і ўкладзены ў вусны яго нядобразычліўца Літавора, гучыць ва унісон агульнай ацэнцы аўтараў XV–XVI стст., пачынаючы ад Яна Длугаша. Асабліва нагадвае апісанне магут-

насці гэтага вялікага князя ў “Гражыне” радкі, прысвечаныя яму М. Гусоўскім у “Песні пра зубра”. Дарэчы, калі зайшла гаворка пра Длугаша, то можна было б згадаць яшчэ адзін момант, адлюстраваны ў яго хроніцы — гэта перагаворы Ягайлы з Вітаўтам аб атрыманні апошнім каралеўскай кароны, калі палякі, імкнучыся адгаварыць занадта, на іх думку, самастойнага князя ад яго намераў, характарызуюць Вялікае Княства Літоўскае як бедны і пустэльны край. Не выключана, што гэтае месца з Длугаша Міцкевіч ведаў, а можа, нават і запазычыў, уклаўшы ў трохі перафразаванай форме ў вусны Літавора, які называе бедным краем, варажскімі балотамі Русь.

Чытаючы творы А. Міцкевіча, не зусім лёгка зразумець сэнс, які ён укладае ў кожным канкрэтным выпадку ў паняцце “ліцвіны”. Ужо згаданая прадмова да “Конрада Валенрода” сведчыць, што яго разуменне характару Вялікага Княства Літоўскага ў нечым набліжалася да таго, якое пераважна прынята ў сучаснай беларускай навуцы, дзе характар гэтай дзяржавы вызначаецца як беларуска-літоўскі (літоўска-беларускі), прынамсі, значнасць ролі славянскіх зямель тут ён бачыць вельмі выразна. Не выключана, што акцэнтаванне паэтам ўвагі на менавіта літоўскай, балцкай спецыфіцы дзяржавы, а дакладней, на персанажах літоўскага паходжання, не ў апошнюю чаргу сталася вынікам імкнення да пэўнай міфатворчасці, так блізкай Міцкевічавай паэзіі. Можна дадаць, што падобная міфатворчасць заўважаецца і ў дэталях яго твораў. Варта згадаць хаця б характарыстыку крыжакоў, што на старонках “Гражыны” выступаюць як несакрушальныя волаты, асілкі ў непрабівальных з ног да галавы даспехах і на аграмадных конях, якім звычайная людская сіла супрацьстаяць не ў стане. Падобная ж трактоўка тэўтонаў перакачавала ў творы Г. Сянкевіча і нават у навуковую літаратуру і толькі адносна нядаўна польскія зброязнаўцы рызыкнулі абвергнуць міф аб грандыёзнай розніцы ва ўзбраенні крыжакоў і прадстаўнікоў Ягелонскай кааліцыі.

І, нарэшце, нельга не спыніцца на агульным пафасе Міцкевічавых твораў ліцвінскага цыклу, якія прасякнуты патрыятычным духам, прычым носьбітамі гэтага духу, патрактаванага амаль у сучасным разуменні гэтага паняцця, з’яўляюцца ў Міцкевіча прадстаўнікі той далёкай эпохі. Так, у “Гражыне” яны з найбольшай сілай увасоблены ў постаці Рымвіда, які асуджае міжусобіцу і тых князёў, што раздзіраюць Бацькаўшчыну, карыстаючыся пры гэтым паслугамі спрадвечных ворагаў Вялікага Княства — крыжакоў. Прычым у супрацьвагу апошнім Рымвід яўна сімпатызуе палякам. Яшчэ больш канкрэтныя абвінавачванні гучаць у “Конрадзе Валенродзе”, дзе яны адрасуюцца Вітаўту, які ў той час перайшоў на бок Ордэна і характарызуецца як здрайца. Блізкі па свайму гучанню пафас і “Жывілі”.

Як гэта не парадаксальна, але падобная пазіцыя Міцкевіча, абумоўленая яго поглядамі як польскага патрыёта першай паловы XIX ст. (яны, да-

рэчы, прасочваюцца і ў такіх, здавалася б, пазбаўленых палітычнай афарбоўкі творах, як “Тры Будрысы”, дзе тры ліцвіны, якія былі пасланыя бацькам у розныя краі па здабычу і вярнуліся ўсе як адзін з маладымі нявестамі-полькамі, мусяць сімвалізаваць непазбежнасць лучнасці Літвы і Польшчы), знаходзіць пэўныя адгалоскі ў сучаснай беларускай гістарычнай навуцы. Тут гісторыя Вялікага Княства Літоўскага часам разглядаецца, так бы мовіць, праз прызму гістарычнай наканаванасці. У адпаведнасці з ёй вылучаецца нібы адна лінія гістарычнага развіцця, усе ж іншыя вектары, не скіраваныя ў той самы бок, выступаюць як рэгрэсіўныя. У адпаведнасці з гэтым даецца трактоўка канкрэтных гістарычных асоб, успрыманне дзейнасці якіх не заўсёды пазбаўлена ацэнак з пункту гледжання сённяшніх рэалій. Тым самым свядома ці несвядома ставіцца ў пэўнай ступені знак роўнасці паміж ментальнасцю сучаснага чалавека і ўяўленнямі прадстаўніка сярэднявяковага грамадства, светаўспрыманне якога фарміравалася з улікам наяўнасці значнай колькасці традыцыйна існуючых саслоўных, рэлігійных, культурных, этнічных і іншых перагародак.

Аднак натуральна, што патрыятызм у канцы XIV – першай палове XV ст. успрымаўся зусім не так, як ў найноўшы час, і ў сувязі з гэтым Літавор, а тым больш Вітаўт, які ішоў на супрацоўніцтва з крыжакамі дзеля ўмацавання сваёй улады, былі ніяк не меншымі патрыётамі, чым Рымвід — фігура зусім не тыповая для сярэдневякоўя. Бо і для Міцкевічавага Літавора, і для рэальна існаваўшага Вітаўта змаганне за Радзіму было цесна звязана з барацьбой за свае спадчынныя феадальныя правы, што, у прынцыпе, не ішло ўразрэз з агульнай псіхалогіяй тагачаснага грамадства. Больш таго, як сведчаць крыніцы, якраз Вітаўт карыстаўся найбольшай падтрымкай ліцвінаў і русінаў нават у часы знаходжання на баку Ордэна, хаўрусам з якім не грэбавалі ў розныя часы ні Ягайла, ні Андрэй Альгердавіч Полацкі, ні Свідрыгайла, якія хацелі дамагчыся ўласных выгад і адначасова з’яўляліся прадстаўнікамі інтарэсаў розных груп тагачаснага грамадства. А між тым некаторыя з гэтых асоб увайшлі ў гісторыю, маючы сталую рэпутацыю зацятых змагароў з крыжацкай агрэсіяй. Урэшце, паўстае пытанне, ці існавала ў Вялікім Княстве Літоўскім ў часы, апісаныя Міцкевічам, нейкая адзіная знешнепалітычная арыентацыя, духам якой прасякнуты яго творы ліцвінскага цыкла? У цэлым напэўна так, бо ўжо была заключана Крэўская унія і неўзабаве рыцарства Вялікага Княства Літоўскага сумесна з рыцарствам польскім выступіла супраць крыжакоў пад Грунвальдам. Аднак наканаванасць цеснага палітычнага саюзу з Польскай Каронай яшчэ не паспела замацавацца ў людской свядомасці, доўгі час яшчэ краіну раздзіралі супярэчнасці, цяпер ужо звязаныя з імкненнем літоўска-беларускага гаспадарства да больш мягкіх формаў гэтага саюза. Сімвалічна, што ў ходзе вырашэння гэтай задачы рабіліся спробы знайсці саюзнікаў як на захадзе,

так і на ўсходзе, пачынаючы ад рускіх княстваў і канчаючы крыжакамі, што выразна дэманструе зменлівасць знешнепалітычных сімпатый у залежнасці ад абставін.

Падабенства пазіцыі Міцкевіча і сучасных айчынных гісторыкаў ў ацэнцы падзей нашай даўняй гісторыі тлумачыцца, як падаецца, падабенствам існуючай тады і цяпер грамадскай думкі, якая патрабавала і патрабуе гераізацыі мінулага і надання яму высокага патрыятычнага пафасу. Нездарма ў розныя часы да гістарычнай навукі прад'яўляліся высокія патрабаванні грамадзянскага характару. Аднак у сілу сваёй спецыфікі гісторыя не можа і не павінна абстрагавацца ад фактаў, нават дзеля дасягнення самых высокіх мэтаў. Яна можа толькі даць матэрыял для творчага пераасэнсавання мастакамі і паэтамі, якія сілай свайго таленту надаюць яму асаблівае гучанне, здольнае закрануць самыя патаемныя струны чалавечага сэрца. А. Міцкевіч зрабіў гэта з найвышэйшым майстэрствам. І гэта адна з прычын, па якіх неўміручыя творы геніяльнага сына беларускага, літоўскага і польскага народаў не трацяць сваёй актуальнасці і ў нашыя дні.

Войцех Фалкоўскі *(Варшава)*

ЧАС, СВАБОДА І ГІСТОРЫЯ Ў МІЦКЕВІЧА

Нашы разважанні пра час і гісторыю ў творчасці Адама Міцкевіча распачнём з фрагмента тэкста, які ўзнік у 1832 г. і змешчаны ў "Кнігах польскага народа".

"І. Свабода ў Еўропе пашыралася паволі, але бесперапынна і прыстойна, ад каралёў Свабода ішла да вялікіх паноў, а тыя, будучы вольнымі, распаўсюджвалі Свабоду па гарадах, і хутка яна павінна была быць перанесена на народ, усё хрысціянства павінна было стаць вольным, а ўсе хрысціяне, як браты, роўнымі паміж сабой".

Гэтыя словы былі напісаны ў Парыжы ў перыяд пасля Лістападаўскага паўстання, калі ў Францыю пачалі прыбываць чарговыя хвалі эмігрантаў. Лёгка сабе ўявіць смутак і журбу, якія панавалі сярод удзельнікаў паўстання. Пытанні пра сэнс нядаўняй барацьбы перапляталіся з разважаннямі на тэму будучыні краіны і іх саміх. Дыскусіі аб стратэгіі паўстання вяліся разам з дэбатамі аб становішчы народа і грамадства, аб сітуацыі, у якой яны знаходзіліся напярэдадні ўздыму, і тых жыватворчых сілах, якія давалі магчымасць усё гэта перажыць. У такой сітуацыі роздум над паняццем свабоды як адным з асноўных атрыбутаў асобы і ўсяго народа былі натуральнымі і чаканымі. Бо гэта была гаворка пра стан чалавека і яго адказнасць перад грамадствам, аб этычных абавязках і штодзённых учын-

ках, аб заканамернасцях, якія стварае бягучы момант, і аб традыцыях, атрыманых у спадчыну ад продкаў, якія і фарміруюць нацыянальную свядомасць. Такім чынам, паняцце свабоды станавілася адным са складнікаў больш шырокай канцэпцыі, якая ахоплівала гісторыю народа і механізмы гэтай гісторыі.

У такім бачанні мінулага свабода з'яўляецца каштоўнасцю, да якой імкнуцца паволі і ўпарта, праз вякі, а асноўныя працэсы грамадскага развіцця заключаюцца ў паступовым і паслядоўным пашырэнні сферы свабод. Гэта з'яўляецца, такім чынам, натуральнай мэтай імкненняў кожнага народа, якая вызначае этычныя прынцыпы паводзін асобы і акрэслівае рамкі публічнай дзейнасці цэлых грамадстваў. Гэта — таксама паказчык узроўню цывілізацыі народаў, крытэрый месца сярод культур, на якім у гістарычным працэсе знаходзіцца племя ці народ. Менавіта так разумеў свой заклік да паўстанцкай барацьбы Стэфан Гарчыньскі, які пісаў яшчэ раней, у час ваеннай кампаніі:

Barbarzyńcy z przekleństwa konają wyrazem;
My z rozkoszą za wolność umierajmy razem…

Царскія войскі, якія ішлі на Варшаву, параўноўваліся з варварскімі ордамі, якія неслі не толькі няволю, але і цывілізацыйную адсталасць. Існуючая свабода давала маральную перавагу і ўказвала на дыстанцыю, якая раздзяляла народ, абараняючы яе ад варвараў, якія былі пазбаўлены такой каштоўнай вартасці. Гэтае перакананне было паўсюдным і ўваходзіла ў каноны светапогляду польскай і еўрапейскай інтэлігенцыі той эпохі.

Весткі пра абарону Варшавы ў верасні 1831 г., якія прывёз у Парыж Стэфан Гарчыньскі, паслужылі Міцкевічу пэўным штуршком да напісання аднаго з найбольш моцна ўздзейных на слухача верша "Рэдут Ардона". Тут мы бачым не толькі апісанне гераічнай бітвы на подступах да сталіцы, мужнасць абаронцаў, але таксама выразную метафару — барацьбу волі з няволяй, варварства з цывілізацыяй, гонару з подласцю.

Bóg wyrzekł słowo stań się, Bóg i zgiń wyrzecze
Kiedy od ludzi wiara i wolność uciecze,
Kiedy ziemię despotyzm i duma szalona
Obleją…

Катэгорыя свабоды была, такім чынам, адной з асноўных рыс, характэрных для роздумаў над сучаснасцю; тады, калі адбывалася трагедыя паўстання; калі распачаліся эмігранцкія пакуты; у час гарачых дыскусій аб сітуацыі, у якой апынуўся народ, і пра яго будучы лёс, а таксама сярод абвінавачванняў, спрэчак і ўспамінаў пра бітвы і кампаніі пад Грахоўскай Альшынкай, Лукоўскім Сточкам, Астралэнкай. Гэта было разважанне пра Сённяшні Час.

Якімі ж былі ў той перыяд рамкі мінулага часу ў творах Паэта? Дзе пралягала мяжа паміж сучаснасцю і недалёкімі ўспамінамі? Як мы адрозніваем praesens ад imperfectum, так паспрабуем адзначыць важныя для цэлага пакалення імпульсы, што зыходзілі з недалёкага мінулага. Гэта былі падзеі, якія павінны былі памятаць з ранняга дзяцінства ці з аповедаў бацькоў — перыяд напалеонаўскай эпапеі, двух апошніх раздзелаў, Таргавіцкай здрады і паўстання Касцюшкі. Рэмінісцэнцыі тых падзей павінны былі пастаянна прысутнічаць у размовах і ўспамінах, у тым ліку ў найбольш асабістых, пры накрэсліванні палітычных планаў і ў час падрыхтоўкі дзеянняў лакальнага маштабу. Героі гэтых падзей увайшлі ў пантэон нацыянальнай славы і ў сямейныя пераказы нацыянальнай гісторыі і традыцыі. Сведкі таго перыяду выходзяць на сцэну ў творах, прысвечаных драматычным падзеям паўстання, як сапраўдныя ўдзельнікі, каб падкрэсліць драматызм сітуацыі і паказаць пераемнасць пакаленняў. Апісанне гераічных змаганняў, сведкамі якіх яны былі, набывала, такім чынам, гераічную афарбоўку і знаходзіла месца ў доўгім спісе народнай славы.

У агульнай роспачы каля ложа паміраючага палкоўніка, дачкі графа Эміліі Плятэр, сярод стральцоў знаходзіліся “старыя салдаты Касцюшкі”. Плач агарнуў усіх, таксама і тых, хто ўдзельнічаў у бітвах без малога сорак гадоў таму назад. Сцэна развітання з жыццём дзяўчыны-камандзіра ў вершы “Смерць палкоўніка” прадстаўляла, такім чынам, не толькі тры розныя пакаленні патрыётаў, якія прымалі ўдзел у барацьбе за незалежнасць, але сведчыла аб пераемнасці традыцыі барацьбы за свабоду. Самыя маладыя паўстанцы — равеснікі дзяўчыны-палкоўніка, — становяцца на калені побач з ветэранамі з-пад Зяленцаў, Рацлавіцаў і Мацяёвіцаў, якія ў гэты момант павінны былі мець узрост амаль пенсійны. Такім чынам, бягучыя падзеі становяцца ў нейкай ступені працягам слаўнага мінулага і ўпісваюцца ў доўгі шэраг дзеянняў і патрыятычных пачынанняў.

Гістарычная перспектыва яшчэ больш падаўжаецца шляхам увядзення ў апісанне асобы гетмана Стэфана Чарнецкага. Паміраючы, Эмілія Плятэр патрабуе, як і вялікі папярэднік, што жыў два стагоддзі назад, каб прынеслі яе баявы рыштунак і прывялі каня. Тым самым яна звяртаецца да старой сармацкай традыцыі, якая патрабавала пры развітанні з воінам акаляць яго цела ўсім рыцарскім рыштункам.

У намаляванай тут карціне падзей, што адбываюцца ў жамойцкай пушчы ў час Лістападаўскага паўстання, цесна пераплятаюцца традыцыі незалежнасці як апошніх гадоў Рэчы Паспалітай, так і сармацкага імкнення да волі і гонару ў перыяд Шведскага патопу. Пры ўсім часавым бязмежжы і зменах, якія адбыліся ў перыяд паміж другой паловай XVII ст. і на пераломе XVIII і XIX стст., гэта, аднак, у культуралагічным сэнсе ўсё яшчэ адна і тая ж эпоха. Спасылкі нават на такія далёкія ў часе прыклады з’яўляюцца

натуральнымі і не перашкаджаюць ствараць адзінае, узаемадапаўняльнае цэлае. А працягненне часавай перспектывы дазваляе стварыць галерэю герояў, расцягнутую на пяць-шэсць пакаленняў, і паказаць, як дзяды і прадзеды служылі ўзорам для сваіх нашчадкаў.

Аднак, перш за ўсё, пунктам адліку ў мінулым становяцца падзеі не вельмі адлеглага перыяду, гістарычнага imperfectum, якія разгортваліся на пераломе стагоддзяў. Кароткі дапаможнік па гісторыі Польшчы мы знаходзім ужо ва ўступе да "Пана Тадэвуша". Калі паніч вяртаецца ў Сапліцова, абягае пусты двор, ён знаходзіць старую мэблю ў пакоях і серыю гістарычных карцін на сценах: "Tu Kościuszko w czamarce krakowskiej, z oczyma podniesionymi w niebo, miecz oburącz trzyma; […] Dalej w polskiej szacie siedzi Rejtan żałośny po wolności stracie, […] Dalej Jasiński, młodzian piękny i posępny, obok Korsak, towarzysz jego nieodstępny, stoją na szańcach Pragi, na stosach Moskali, siekąc wrogów, a Praga już się wkoło pali".

Усе ўказаныя падзеі былі яшчэ свежымі ў памяці амаль усіх літаратурных герояў паэмы Міцкевіча. Для іх гэта былі падзеі або з іх уласнага жыцця, або з жыцця іх сваякоў, сяброў ці знаёмых. Сам Тадэвуш атрымаў імя ў гонар Начальніка паўстання. Прысяга Касцюшкі адбылася ў сакавіку 1794 г., крывавае заняцце Прагі [варшаўскай. — *Рэд.*] — у лістападзе таго ж года, а Гродзенскі сейм, які зацвердзіў трэці падзел Рэчы Паспалітай, адбыўся годам пазней — у лістападзе 1795 г. Ад падзей, якія разгортваюцца ў паэме, героя аддзяляе нейкіх 16–17 гадоў. Аднак у дадзеным выпадку паказ такой гістарычнай перспектывы дастатковы, каб увесці нас у свет шляхецкага грамадства, пакаленні якога пражывалі ў адным і тым жа месцы і акружэнні. Зварот да гістарычных падзей перыяду напярэдадні падзелаў краіны перакідвае, аднак, мост паміж рэчаіснасцю 1811 г. на тэрыторыі, захопленай Расійскай імперыяй, і часамі былой Рэчы Паспалітай.

Свет Сапліцова, засценка Дабжынскіх, замка Гарэшкаў — гэта стабільны свет, які кансервуе ранейшыя паводзіны, захоўвае старыя звычаі і множыць колішнія ўзоры. Нягледзячы на завірухі ў Еўропе, Французскую рэвалюцыю, напалеонаўскія войны, Канстытуцыю 3 Мая, адрачэнне ад трона караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага і знікненне Рэчы Паспалітай з карты кантынента, свет гэты заставаўся ўсё такім жа. Кожнае, нават невялікае змяненне было там цэлым здарэннем, пра якое апавядалася гадамі, з пастаяннымі каментарыямі, з нязменным здзіўленнем і смехам, і кожны раз па-новаму. Так, як гэта было з панам Падчашым, які адзін з першых у Літве, у Ашмянскім павеце, паводзіў сябе па-французску, ездзіў на двуколцы — дрындулыцы, якая называлася таксама "карыюлькай", і вазіў з сабой двух сабак і кучара-немца ў панчохах і чаравіках з сярэбранымі спражкамі. Усе падрабязнасці ўбрання і паводзін гэтага дзівака, а іх было шмат, распавядаліся Падкаморым як забаўляльны і павучальны анекдот з часоў яго

ранняга дзяцінства, ці, як можна меркаваць, з паловы 60-х гг. XVIII ст. Бо гэта таксама было нязвыкла і кантраставала з павольным і спакойным цячэннем жыцця мясцовага насельніцтва. Менавіта так яно запомнілася, ажывіла штодзённую манатоннасць і набыло каляровую афарбоўку ў выглядзе кароткага апавядання. Мараль выяўлялася ў супрацьпастаўленні старой, перадаванай з пакалення ў пакаленне шляхецкай традыцыі і новымі цячэннямі і модай, прывезенымі здалёк.

Свет Сапліцова існаваў і па-ранейшаму належаў да старой і вядомай пакаленням культуры польскай шляхты. Рэаліі, прадстаўленыя на пераломе стагоддзяў, былі не вельмі аддаленымі ў сваёй аснове ад стану стогадовай даўніны. А таму "Takie były zabawy, spory w one lata śród cichej wsi litewskiej, kiedy reszta świata we łzach i krwi tonęła". Таму зварот да даўно мінулых падзей 1794–1795 гг. і каментарыі аўтара на самым пачатку эпапеі з галіны вялікай палітыкі былі пачынаннем, скіраваным на ўключэнне малога сапліцоўскага акружэння у ход лёсавызначальных для цэлай краіны падзей. Гэта стварала гістарычны кантэкст, які звязваў мясцовае грамадства з падзеямі агульнанацыянальнага характару, асноўным паказчыкам якіх была барацьба за захаванне суверэнітэту і незалежнасці.

Своеасаблівым завяршэннем кароткай гістарычнай перспектывы з'яўляецца апошняя кніга паэмы, дзе апісаны час, калі ў Сапліцове кватаравалі польскія легіянеры, якія ўваходзілі ў склад арміі Напалеона. Невялікі двор на нейкі момант апынуўся ў цэнтры самых важных падзей. Вялікая гісторыя дасягнула засценка, сцягваючы пражкай развагі пра гісторыю народа, распачатыя ў першых абзацах паэмы. Старая традыцыя польскай шляхты згадвалася з надзеяй у час банкету ў замку Гарэшкаў, у самым пачатку аповеду пра сапліцоўскі свет:

Jest sława, a więc będzie i Rzeczpospolita!
Zawżdy z wawrzynów drzewo wolności wykwita.

Дапаўненнем і своеасаблівым падсумаваннем гэтых слоў Падкаморага стаў банкет, апісаны ў XII кнізе, на якім ганаровымі гасцямі былі польскія генералы Дамброўскі, Князевіч, Пац і Малахоўскі. Усе яны ўвайшлі ў нацыянальны пантэон. Словы арбітра ў спрэчцы графа і суддзі, а таксама галоўнага госця першага банкету паэт эфектна заканчвае спатканнем у канцы твора. Такім чынам, вялікая гісторыя, якая адбывалася ў 1812 г., звязвалася непасрэдна і натуральна з версіяй айчыннай гісторыі, якая захоўвалася ў памяці і традыцыях гаспадароў Сапліцова.

Як салдацкі абед у сапліцоўскім двары ўяўляе сабой кампазіцыйны зварот да вячэры ў замку, так і гістарычныя сцэны, узноўленыя канцэртам Янкеля, з'яўляюцца літаратурным завяршэннем гістарычнага выкладу ў вобразах, прадстаўленага на першых старонках паэмы. Ва ўступе была згадана

Канстытуцыя 3 Мая і нацыянальная згода вакол яе пастаноў, затым Таргавіцкая канфедэрацыя, бітва на Празе і штурм Суворава, а таксама трэці падзел дзяржавы, каб завяршыць выкананым на ўздыме апафеозам легіёнаў і ідэі ўваскрэшання Рэчы Паспалітай. Падзеі з недалёкага мінулага звязваюцца ў адно цэлае з перыядам больш даўнім таксама, як і лакальныя падзеі ў мясцовай правінцыі гарманічна ўпісаны ў гісторыю краіны і Еўропы.

Іншай падзеяй з крыху больш даўняга мінулага, згаданай у аповедзе, была Канфедэрацыя, якая была створана ў 1768 г., існавала да першага падзелу ў 1772 г. і ўвайшла ў канон польскіх нацыянальных міфаў. Удзел у ёй гарантаваў шляхецтва да канца жыцця. Для пакалення філарэтаў, як і для пакалення іх бацькоў, што знаходзіліся побач з Касцюшкам, а пазней поплеч з генералам Дамброўскім, яна была часткай старых патрыятычных традыцый, якія сягалі на некалькі дзесяткаў гадоў назад і разглядалі службу Рэчы Паспалітай неабходным элементам шляхецкай культуры. У такім разуменні ўзорным сарматам быў толькі той шляхціц, які перш за ўсё аддаваў перавагу службе на карысць інтарэсаў дзяржавы і народа.

Эпоха, якая пачынаецца ў грамадскім мысленні са змовы ў Бары, сягала ў далёкае мінулае, ажно да паловы XVII ст. Пра гэта сведчаць успаміны, якія з'яўляюцца ў некалькіх месцах, пра шведскія войны. Прыгожы сервіз, выкарыстаны для прыёму легіянераў, быў заказаны ў Венецыі Мікалаем Радзівілам Сіроткай, але ў час Патопу перайшоў у шляхецкія рукі. Стары дом Мацея Дабжынскага, збудаваны як двор, прыйшоў у заняпад. Пра ранейшую яго прыгажосць нагадвала толькі архітэктура, абарончыя збудаванні фальварка, а таксама старыя гарматы, снарад, які дзейнічаў ў час войнаў са шведамі. Гады Патопу сталі выразным пунктам у грамадскай памяці, які адназначна асацыіраваўся з абаронай айчыны і выкананнем патрыятычнага абавязку. Адначасова яны азначалі пачатак сармацкай эпохі, такі адлеглы, што ён атаясамліваўся з яе росквітам і лёгка ўспрымаўся як узор для пераймання. Гэтая падзея належала да аднаго і таго ж гістарычнага перыяду, таму была лёгка зразумелай і адначасова такой даўняй, амаль легендарнай.

У творчасці Міцкевіча таксама існаваў даўно мінулы час, час рэчаіснасці, вельмі адрознай ад існуючых узораў і жывой памяці, што ўспрымалася амаль як легенда. Гэта былі часы значна далейшыя, чым сягалі ўспаміны і ўяўленні Мацькаў Дабжынскіх, Сапліцаў і барскіх канфедэратаў, часы самай глыбокай гісторыі, сапраўдны plusquamperfectum.

Дэвізам паэта пры напісанні твораў на гістарычную тэму, дзеянне ў якіх адбываецца ў самым аддаленым часе, былі словы Шылера: "Што ажывае ў песні, гіне ў рэчаіснасці". Менавіта таму "Конрад Валенрод", аповесць з літоўскай і прускай гісторыі, нягледзячы на тое, што ўзнік у выніку вывучэння эпохі, нясе аддаленае пасланне часоў сярэднявякоўя. Гэта твор пра

нацыянальныя інтарэсы, пра патрыятызм і самаадданасць айчыне. Атаясамліванне з народам, мовай дзяцінства, звычаямі роднага дома, верай продкаў разумеецца тут паводле катэгорый XIX ст. Такога разумення не існавала ў XIV ст., у якім разгортвалася дзеянне твора. Аднак яно дазваляе аўтару сканструяваць зразумелае і адназначнае пасланне да чытача. Яно ўтрымлівае заклік да ратавання айчыны і яе культуры ад мяча захопнікаў, які адразу асацыіраваўся чытачом з царскім бізуном.

Апісанне падзей, так аддалённых у часе, вынікала, на першы погляд, з жадання аўтара пазбегнуць праследаванняў царскай цэнзуры, але пры гэтым яно давала магчымасць свабодна мадэляваць вобразы герояў і разгортваць дзеянні так, каб пасланне пра вольнасць было зразумелым, а дырэктывы да дзеянняў нібы вынікалі самі. Нягледзячы на маральныя ваганні, звязаныя з асобай Валенрода, які дзеля вернасці свайму народу здрадзіў сябрам, кінуў падначаленых і ў значнай ступені адрокся сам ад сябе, загад дзейнічаць па патрыятычных матывах быў сфармуляваны вельмі моцна. Ёсць, акрамя гэтага, яшчэ адна прычына, з-за якой гістарычныя раманы граюць важную ролю. Яны паказваюць самую далёкую гістарычную перспектыву для патрыятычных паводзін пры абароне свабоды. Творчасць Міцкевіча, па-першае, падоўжвае час існавання гэтай традыцыі ад канца XVIII ст., да моманту Вялікага сейма, затым знаходзім прыклады і намёкі на эпоху вялікай сармацкай культуры, якія пераносяць нас часам далёка ў глыб XVII ст. Нарэшце папулярнай з'яўляецца таксама рэчаіснасць сярэдневякоўя. Бо гэта ж перыяд амаль усяго гістарычнага існавання народа і дзяржавы. Цэнтральным паняццем для іх усіх становіцца свабода. І так, як было сцверджана ў першай цытаце, свабода пашыраецца паволі. Яна паслядоўна ахоплівае чарговыя сацыяльныя групы, а затым наступныя краіны і дзяржавы. Свабода неабходна ў кожную эпоху. Яна — натуральная неабходнасць чалавека і народа.

Пераклад з польскай мовы Галіны Жалубоўскай

Сяргей Рыбчонак *(Мінск)*

РАДАВОД СТЫПУЛКОЎСКІХ ГЕРБА ДЗЯХ

Род Стыпулкоўскіх цікавы для гісторыі Беларусі прынамсі па дзвюх прычынах. Па-першае, з імі параднілася цётка Адама Міцкевіча, г. зн. ёсць адгалінаванне радавода паэта па жаночай лініі, а па-другое, Стыпулкоўскія на пачатку XIX ст. валодалі фальваркам Завоссе, дзе па некаторых меркаваннях нарадзіўся і правёў дзіцячыя гады наш славуты зямляк, г. зн. павінны былі мець пэўныя, дакументальна зафіксаваныя адносіны з сям'ёй паэта.

Для стварэння радавода былі выкарыстаны вывады, атрыманыя Стыпулкоўскімі 31 снежня 1798 г. ад віленскага і 17 лютага 1828 г. ад гродзенскага дваранскіх дэпутацкіх сходаў, персанальная справа аб дваранстве роду, што захавалася ў НГА Беларусі, і некаторыя іншыя архіўныя і ўжо публікаваныя матэрыялы.

Паходжанне прозвішча Стыпулкоўскі, хаця на Беларусі часцей ужываўся варыянт Стыпалкоўскі, звязана, відавочна, з назвай аднайменнага населенага месца Стыпулкі (таксама Стыпулкі Шведскія, Шымонскія і Гежмінскія), што знаходзяцца зараз на тэрыторыі Польшчы. Апроч таго, Стыпулкоўскія валодалі яшчэ маёнткамі Ляснёва і Боркі, што знаходзіліся ў тым жа Браньскім пав. Бельскай зямлі Падляшскага ваяв. У Навагрудскі пав. перасяліўся Валенцій Грыгор'евіч С., звязаўшы на доўгі час лёс сваіх дзяцей з Беларуссю. Род С. карыстаўся ўласным гербам, што атрымаў таксама назву Дзях (ад назвы адпаведнага ўжыванага родам прыдомка) і што падцвярджаецца, галоўным чынам, сведчаннем ураднікаў і абывацелей Браньскага пав. за 1773 г. Апісанне герба згодна з малюнкам, зробленым у час вываду 31 снежня 1798 г., наступнае: колер поля шчыта невядомы, у шчыце залаты паўмесяц рагамі ўгору, у сярэдзіне якога залатое кола з шасцю пракладамі, над колам залатая шасціканцовая зорка, у кляйноце — тры такіх жа зоркі лікам 1:2.

1 калена

Тамаш (1), пакінуў пяцёра сыноў (2, 3, 4, 5, 6).

2 калена

Францішак (2), служыў у войску.

Пётр (3), пакінуў аднаго сына (7).

Марцін (4), пакінуў аднаго сына (8).

Балтазар (5), пакінуў аднаго сына (9).

Марцін ? (6), служыў у войску.

3 калена

Валенцій (7).

Грыгорый (8), жонка Марыянна Унароўская, пакінуў чатырох сыноў (10, 11, 12, 13) і двух дачок (14, 15).

Юзаф (9).

4 калена

Станіслаў (10), жонка Сакалоўна.

Валенцій (11), служыў у пані Тызенгаўзавай, жонкі старосты дыяменцкага, яшчэ быў жывы ў 1800 г. і памёр да 1803 г., жонка Разалія, пакінуў трох сыноў (16, 17, 18) і чатырох дачок (19, 20, 21, 22).

Валенцій 17 кастрычніка 1769 г. набыў ад Станіслава Райкевіча, ротмістра навагрудскага, фальварак Белая за 3500 зл. пол., у якім згодна з па-

дымным тарыфам 1777 г. налічваўся 1 дым. Таксама Валенцій разам з сынамі Вінцэнтам і Ігнаціем атрымаў вывад ад віленскага дваранскага дэпутацкага сходу 31 снежня 1798 г. (11 студзеня 1799 г.).

Сымон (12), жонка Пяркоўская.

Юзаф (13), жонка Маноўская.

N (14), у шлюбе з Трушкалаўскім.

N (15), у першым шлюбе Хоінская, у другім Крапіўніцкая.

Сымон і Юзаф бралі 20 снежня 1773 г. для брата Валенція, пакрыўджанага некаторымі асобамі, тэстаманіяльны запіс ад ўраднікаў і абывацелей Браньскага пав. Бельскай зямлі Падляшскага ваяв. аб прыналежнасці да шляхецкага стану.

5 калена

Вінцэнт Леан (16), нарадзіўся каля 1763 г., каморнік навагрудскі па крэдэнсу падкаморага таго ж ваяводства Адама Вайніловіча ад 1 мая 1788 г., пазней быў засядацелем ці асэсарам Навагрудскага ніжэйшага земскага суда, служачы там, дарэчы, спраўджаў на месцы правільнасць звестак, пададзеных М. Міцкевічам у дадатковай рэвізскай казцы па закладному фальварку Завоссе ў 1800 г., дзедзіч пасля бацькі і па ўступным запісу ад брата фальварка Белая (з 1803), яго жонка Барбара з Міцкевічаў, прынамсі, у лістападзе 1797 г. дакладна, памёр 15 мая 1813 г. у Завоссі, меў двух сыноў (28, 29) і шасцёра дачок (23, 24, 25, 26, 27, 30).

Апроч таго, Вінцэнт 19 сакавіка 1808 г. набыў ад Міхаіла, сына Пятра Паўла Яновіча, ротмістра навагрудскага, фальварак Завоссе за 7000 зл. пол., прычым палова фальварка знаходзілася ў закладным валоданні Міцкевічаў, таму згодна з запісам Вінцэнт заплаціў толькі частку сумы (за другую палову) за вылікам грошай, неабходных для выкупа Міцкевічавай часткі з закладу і на ўплату доўга з працэнтамі, і, прыняўшы ўсе мажлівыя прэтэнзіі ў будучым на сябе, стаўся юрыдычна адзіным уладальнікам фальварка. У 1806–1810 гг. Вінцэнт служыў упраўляючым Мышскага графства і пражываў з сям'ёй у Мышы, дзе нарадзіліся абодва яго сыны.

Як адзначаў вядомы даследчык жыцця і творчасці паэта В. Каратынскі, што грунтоўна апрацаваў фамільныя архівы Міцкевічаў і Стыпулкоўскіх, Вінцэнт у канцы 1798 – пачатку 1799 г. пры магчымасці дапамагаў брату жонкі з харчаваннем — дастаўляў у Навагрудак свініну і інш. прадукты, і грашыма, якія М. Міцкевіч пазычаў, каб заплаціць за старую і наняць новую кватэру. Гэта, між іншым, не перашкаджала Стыпулкоўскім па-сваяцку судзіцца з Міцкевічамі. Так, 4 снежня 1798 г. Валенцій з сынамі Вінцэнтам і Ігнаціем выклікалі ў суд земскі навагрудскі Базыля, Адама і Мікалая Міцкевічаў і Барбару з Міцкевічаў Стыпулкоўскую наконт спадчыны па памерлым Юзафу Міцкевічу.

Ян (17), нарадзіўся каля 1771 г., памёр 14 снежня 1789 г. у Белай, беспатомны (?).

Ігнацій (18), нарадзіўся каля 1778 г., харужы войска польскага, прадаў 18 сакавіка 1803 г. сваю долю спадчыны ў фальварку Белая брату Вінцэнту за 1500 зл. пол., пра яго нашчадкаў невядома.

Антаніна (19), у шлюбе за Паўлам Галаўнём, у ваколіцы Скураты.

Анастасся, ці *Ганна* (20), у шлюбе за Дамінікам Давідоўскім, з ваколіцы Завоссе (заключаны 22 лютага 1789 г. у Ствалавіцкім касцёле), уладальнікі маёнтка Дарэў або Заблоцце з 1796 г., які набылі ад Шэлкінга і Вярыгаў за 3000 зл.

Кацярына (21), у шлюбе за Антоніем Паге(у)рскім (заключаны 17 кастрычніка 1792 г. у Ствалавіцкім касцёле), аканомам меляховіцкім.

Вікторыя (22), у шлюбе за Станіславам Парафіяновічам (заключаны 20 лютага 1803 г. ці 20 лістапада 1804 г. у Ствалавіцкім касцёле).

6 калена

Роза (23), нарадзілася каля 1798 г., памерла 13 лютага 1810 г. у Мышы.

Тэкля (24), "каханая Тэклюня", як называў яе паэт, служыла пакаёвай пані пры Марылі Верашчака, сяброўка паэта і адданая пасрэдніца паміж ім і Марыляй, мела прыгожы голас, бо нярэдка ў туганавіцкія сустрэчы "пасля вячэры … з Занам спявала". Памерла каля 1822 г.

Карнелія (25), нарадзілася ў Белай, хрышчана 11 верасня 1801 г. у Ствалавіцкім касцёле, узяла шлюб з Міхаілам Сасноўскім (заключаны 29 лютага 1818 г. у Ствалавіцкім касцёле), іх першая дачка — Марцыяна Разета, што нарадзілася 10 снежня, хрышчана 17 снежня 1818 г. у тым жа касцёле. Паэт у лісце да Францішка Міцкевіча ад 22 студзеня 1847 г. пісаў, што аж заплакаў, атрымаўшы вестачку з Завосся — "Гаспадарыць там Карнелька з дзецьмі і відаць, што жыве досыць даўно". Карнелія разам з сястрой Серафінай былі апошнімі ўладальнікамі Завосся, бо каля 1853 г. яно перайшло ў казну. Тады сёстры перасяліліся ў Белую, дзе іх колькі разоў адведаў Аляксандр Міцкевіч і інш. У 1860 г. Карнелія была ўжо ўдавой, памерла да 1883 г.

Юзэфа (26), нарадзілася 20 сакавіка 1803 у Белай, хрышчана 22 сакавіка ў Ствалавіцкім касцёле, падавала прашэнне ў гродзенскі дваранскі дэпутацкі сход аб выдачы дакументаў на дваранства, патрэбнае для брата Мікалая Францішка (20 студзеня 1833 г.), гаспадарыла ў Завоссі ў 1830-х гг., відавочна, не была ў шлюбе. Як засведчыў Аляксандр Міцкевіч у лісце да Францішка Міцкевіча 1860 г., Юзэфа ездзіла з адвакатам Дамброўскім у 1839 г. на Валынь па спадчыну памерлага брата Мікалая Францішка, дзе захварэла на сухоты й хутка сама памерла.

Валянціна Юдзіта (27), нарадзілася ў Белай 1 сакавіка 1805 г., хрышчана 2 сакавіка ў Ствалавіцкім касцёле, ці была ў шлюбе і калі памерла, пакуль невядома.

Люцыян Ксаверый (28), хрышчаны 20 лістапада 1806 г. у Навамышскім касцёле, у 1829 г. звяртаўся да ўладаў па пасведчанне аб належнасці да дваранскага стану, неабходнае для атрымання акадэмічнай ступені ў Віленскім універсітэце. У час Студзеньскага паўстання 1830–1831 гг. быў жаўнерам 13 Уланскага палка, пасля падаўлення паўстання выехаў у Прусію, дзе атрымаў тэрмін на крапасных работах. Быў дэпартаваны з транспартам вязняў у Амерыку, але асеў у французскім Гаўры і завязаў кантакты з Адамам Міцкевічам, што знаходзіўся тады ў Парыжы. Паэт дапамагаў сваяку грашыма і парадамі — "тым часам вучы наколькі магчыма мову…". Неўзабаве Люцыян перабраўся да паэта ў Парыж, дзе па парадзе апошняга пачаў вучыцца рамяслу: "…хаця б і не ўжываў яго для заробку, мог бы вучыць іншых і сам мець забаву". З 1836 г. ён ужо працаваў дрэварытнікам на фабрыцы. Яго шлюб з Жазефінай Ракі ў 1839 г. паэт пракаментаваў так — "боязна мне, што твая жонка француженка і з горада. Але, падобна, мае бацькоў, што вельмі вялікае дабро". У 1848 г. Люцыян прымкнуў да італьянскага легіёна, што фарміраваў Адам Міцкевіч на дапамогу Дж. Гарыбальдзі, але 15 красавіка 1849 г. у Туры па невядомых прычынах скончыў жыццё самагубствам. З нашчадкаў пакінуў аднаго сына (31).

Мікалай Францішак (29), нарадзіўся 6 снежня 1808, хрышчаны ў Навамышскім касцёле 20 снежня, пасля заканчэння Віленскай акадэміі служыў павятовым урачом у Бірскім пав. Арэнбургскай губ., пазней жыў на Валыні ў якасці медыка Сангушкаў, памёр у 1839 г., звестак пра яго нашчадкаў не знойдзена.

Люцыян Ксаверый і Мікалай Францішак валодалі спадчыннымі фальваркамі Белая і Завоссе (5 рэвізскіх душ, у т. л. 2 муж. і 3 жан. на 1828 г.), што відаць з пасведчання, выдадзенага ім навагрудскім маршалкам Юзафам Верашчакам 4 верасня 1826 г. Люцыян ад сябе і брата 7 лютага 1828 г. падаваў прашэнне ў гродзенскі дваранскі дэпутацкі сход, які 17 лютага таго ж года далучыў іх да дваранскага роду Стыпулкоўскіх з аднясеннем да 1-й часткі радаслоўнай кнігі. Аднак Дэпартамент герольдыі Правячага Сената ўказам ад 24 красавіка 1836 г. не зацвердзіў гэтае рашэнне па наступных прычынах: 1) не даказалі, што маёнтак Белая — дваранскі, г. зн. з прыгоннымі сялянамі, і 2) прадставілі метрыкі, не завераныя духоўнай кансісторыяй.

Серафіна (30), нарадзілася 26 красавіка 1811 г. у Завоссі, хрышчана 27 красавіка ў Ствалавіцкім касцёле, у 1-м шлюбе за Ігнаціем Скуратовічам, у 2-м — Ласоўская, прычым з-за другога, як адзначалі некаторыя біёграфы Міцкевіча, "нядобрага" мужа выраклася спадчыннага Завосся. Вядомы інвентар маёнтка Завоссе, складзены ў 1846 г., дзе яго ўладальніцай пазначана Серафіна Скуратовічава, прычым, як указана ў дакуменце, "гаспадарыць сама". Ад першага шлюбу мела сыноў Люцыяна і Юзафа, з якіх Люцыян быў уладальнікам спадчыннага маёнтка Белая, а Юзаф — маёнтка

Скробаў на Навагрудчыне. Люцыян праславіўся тым, што захаваў люстэрка (“лямусік”), якое нібыта было ў Завоссі яшчэ ў часы маленства Адама, пра што пісаў у 1897 А. Ельскаму, аднак далейшы лёс люстэрка, на жаль, невядомы. Серафіне паэт падараваў апраўлены ў слановую косць альбом з уласнымі вершамі. У 1869 г. Серафіна была ўжо ўдавой па другім мужу, памерла пасля 1898 г., калі з ёй яшчэ гаварыў Б. Крашэўскі.

7 калена

Генрык (31), яшчэ пражываў у Парыжы каля 1900 г., дастаўляючы пэўныя клопаты сям’і Міцкевічаў, галоўным чынам, з-за сваёй жонкі, што кампраметавала шляхетнае прозвішча. Гэтыя хваляванні падзяляў сын паэта Уладзіслаў Міцкевіч, які, падобна сваёй маці, што не прыняла Жазефіну, неаднаразова сцішаў неўраўнаважанага сваяка, звестак пра яго нашчадкаў не захавалася.

Як бачым, паходжанне роду Стыпулкоўскіх звязана з Падляшскім ваяв. Гэта была дробная мясцовая шляхта, з якой Валенці Стыпулкоўскі, зарабіўшы на службе ў Барбары Юдыцкай, жонкі Казіміра Тызенгаўза, старосты дыяменцкага, грошай, набыў фальварак Белая ў Ствалавіцкай парафіі Навагрудскага ваяв. Яго сын Вінцэнт узяў за жонку Барбару з Міцкевічаў, родную сястру бацькі паэта Мікалая (сакавік-кастрычнік 1797 г.), атрымаўшы за ёй у пасаг пэўныя правы на тую частку фальварка Завоссе, што Міцкевічы мелі ў закладзе ад Яновічаў, а ў 1808 г. набыў згаданы фальварак цалкам. Дзякуючы дочкам Вінцэнта — Карнеліі, Юзэфе і Серафіне, што гаспадарылі ў Завоссі ў 1-й палове XIX ст., мы сёння дакладна ведаем месца, дзе, магчыма, нарадзіўся і правёў маленства Адам Міцкевіч, а таксама пэўныя падрабязнасці, што тычацца яго жыцця і гісторыі Завосся. З сыноў Вінцэнта найбольш вядомы Люцыян Ксаверый, што прыняў удзел у вызваленчым паўстанні 1830–1831 гг., а пазней і ў заходнееўрапейскім рэвалюцыйна-дэмакратычным руху сярэдзіны XIX ст. І, здаецца, нягледзячы на згасанне роду Стыпулкоўскіх па мужчынскай лініі, фактычныя матэрыялы аб іх павінны заняць належнае месца ў нашай гісторыі.

Эугения Кухарска *(Лович, Польша)*

АДАМ МИЦКЕВИЧ И ЦЕНЗУРА НИКОЛАЯ I

Адам Мицкевич прибыл в Россию в ноябре 1824 г. как политический ссыльный и сразу был принят русской литературной средой. Его творчество вызвало живой интерес, особенно после выхода в печати (на польском языке) “Крымских сонетов” (М., 1826) и “Конрада Валленрода” (СПб., 1828), принесших славу поэту не только в России и Польше, но и в других

странах. О значении поэзии Мицкевича для славянского мира высказывался в 1829 г. Иван Киреевский, видевший в ней факт сближения не только между славянскими, но и европейскими литературами: “Мицкевич — писал Киреевский, — сосредоточив в себе дух своего народа, первый дал польской поэзии право иметь свой голос среди умственных депутатов Европы и вместе с тем дал ей возможность действовать и на нашу поэзию” [1]. Этот и многие другие положительные отзывы о поэзии польского поэта вызвали огромное количество русских переводов, на что указывают библиографические материалы (около 600 страниц), изданные АН СССР к сотой годовщине со дня смерти Мицкевича [2].

Необычная популярность творчества Мицкевича, а главным образом его патриотическая окрашенность, не могли не привлечь внимания царской цензуры. Если “Крымские сонеты” первоначально не были предметом интереса со стороны комитетов цензуры, то поэма “Конрад Валленрод” вызвала острую реакцию Канцелярии наместника Царства Польского и стала причиной запрещения в России всего творчества Мицкевича. Этот запрет никогда не был формально отменен.

На преследования произведений Мицкевича в России указывали как русские [3] так и польские [4] исследователи наследия поэта. Однако к уже известным опубликованным материалам следует добавить найденные мной в архивах, главным образом в хранившихся там протоколах цензуры периода царствования Николая I.

Материалы, связанные с негативной оценкой “Конрада Валленрода”, высланные из Варшавы в 1829 г. и опубликованные польскими исследователями, указывают на отношение к доносу из канцелярии Новосильцева Первой комиссии, отбросившей суждение об антицарской окраске поэмы, а шеф III Отделения царской полиции Бенкендорф эту резолюцию утвердил, приложив положительный отзыв о Мицкевиче московского генерал-губернатора [5]. На короткий срок “Конрад Валленрод” не подвергся цензурному запрету, его фрагменты, а также полный русский перевод были в России напечатаны.

---

[1] Киреевский И. Обозрение русской словесности 1829 года // Денница. 1830. С. LXXI.

[2] Адам Мицкевич в русской печати 1825–1955: Библиографические материалы. М.; Л., 1957.

[3] Лемке М. Николаевские жандармы и литература 1826–1855. СПб., 1908; Bekkier J. Mickiewicz i carska cenzura // Kwartalnik Instytutu Polsko-Radzieckiego. 1956. Nr 1/14. S. 151–178.

[4] Fiszman S. Z problematyki pobytu Mickiewicza w Rosji // Kwartalnik Instytutu Polsko-Radzieckiego. 1956. Nr 1/14. S. 3–52; Fiszman S. Archiwalia Mickiewiczowskie, Wrocław; Warszawa; Kraków, 1965. S. 100–134; Inglot M. Carska cenzura w latach 1831–1850 wobec arcydzieł literatury polskiej // Ze skarbca kultury. Wrocław; Warszawa; Kraków, 1965. Zesz. 17. S. 100–134.

[5] См.: Bekkier J. Mickiewicz i carska cenzura.

В России также печатались фрагменты II и IV частей “Дзядов”. Однако совершенно неизвестной оставалась изданная после выезда из России III часть поэмы, о которой по случаю издания четвертого и пятого томов поэзии Мицкевича в Париже в январе 1833 г. писал “Московский телеграф” Николая Полевого, близкого знакомого польского поэта. В краткой заметке журнал обращал внимание читателей на четвертый том, ссылаясь на “письмо одного из мицкевичевских друзей из Львова”: “Передо мною полный сборник сочинений Мицкевича, которые составят несколько толстых томов. Более всех должен быть занимателен и важен том IV: он составит новую эпоху славы поэта. До сих пор вы знали произведения Мицкевича-юноши, теперь узнаете произведения мужа — мужа в совершенной зрелости и могуществе гения” [6]. Дальше сообщалось, что Мицкевич напечатал продолжения уже ранее написанных сочинений, что указывало на продолжение поэмы “Дзяды”. Таким образом “Московский телеграф” опередил запрещение цензуры и обратил внимание руских читателей на политическое произведение польского поэта. Царская цензура получила известие о “Дзядах” несколькими месяцами позже. Об отношении к “Дзядам” цензуры писали А. Краусгар [7] и М. Инглот [8]. Дополнением являются найденные мной в архиве в Москве документы, т. е. рапорт наместника из Варшавы, направленный Бенкендорфу: “В Париже вышел IV том сочинений Адама Мицкевича, наполненный оскорбительными дерзостями против Российского Правительства…” Называются отдельные заглавия вступления. Донос Паскевича кончался выводом: “Во всех сих пиесах изверг неблагодарности Мицкевич излил всю адскую желчь из ничтожной души своей и сердца. Низость общего характера народного, ложь и подлые вымыслы, суть достоинства пиес, — они писаны отпущенником — облагодетельствованным! Вместо заслуженной казни, — великодушие даровало ему свободу; чем он платит за оную? Клеветами исступленника!” [9]

В донесении указывается также на слова, обращенные к русским друзьям — Бестужеву и Рылееву, приводится их русский перевод: “Познайте по гласу сему; пока я был в оковах и др. ” [10]. Такой приговор привел к переоценке взгляда на творчество Мицкевича. Однако, что характерно, официальный запрет всего творчества Мицкевича в России относится к 1834 г., когда из канцелярии Паскевича поступил очередной рапорт, повторяющий

---

[6] Смесь. О новых сочинениях Мицкевича // Московский телеграф. 1833, Ч. 49. № 1. Янв. С. 181.

[7] Kraushar A. Z archiwum b. trzeciego wydziału w Petersburgu. Warszawa, 1906.

[8] Inglot M. Carska cenzura w Rosji…

[9] ЦГИАМ, ф. 109, № 2, ед. хр. 108. Письмо наместника Царства Польского. Выдержка из материалов в польском переводе была помещена мной в кн.: Kucharska E. Literatura polska w Rosji w latach 1830–1848. Opole, 1967.

[10] Там же.

мнение Новосильцева о “Конраде Валленроде” с прибавлением, что поэма повлияла на вспышку восстания в Царстве Польском в 1830 г. С этого момента запрещению подвергались не только произведения Мицкевича, но со страниц журналов и газет вычеркивались упоминания о поэте и его творениях. Заграничная цензура запрещала ввозить сборники польских произведений, в которых упоминалось имя Мицкевича. Так, в 1839 г. был запрещен сборник литовских песен, переведенных и изданных ксендзом Юцевичем (Юцявичусом), так как “предисловие к этим песням сочинено в духе предосудительном” [11]. Эта “предосудительность” заключалась в том, что издатель “хвалит труды Бродинского, Ходзьки и Мицкевича по части поэзии — труды, осужденные уже цензурою” [12]. Цензура подчеркивала, что также сами песни, хотя описывают подвиги литовцев в древности, “возбуждают к оружию, против врагов или заключают намеки на угнетение Литвы. Конечно, тут относится дело до крестоносцев, немцев или татар; но весьма легко можно относить их и до наших времен, в каком случае при несовершенно успокоенном брожении умов в польских провинциях они могут производить невыгодное впечатление” [13]. На основании такой аргументации в резолюции цензора указывалось, что сборник “не может быть печатан” и следует “удержать оный при делах” [14]. Имя Мицкевича вычеркивалось из книг немецких [15] и французских [16], которые привозились в Россию частными лицами. Запрещен был сборник произведений польских авторов, потому что в нем выступали “сомнительные места о Мицкевиче, Немцевиче и Лелевеле, которых автор одобряет обучающемуся юношеству как новейших писателей, вероятно потому, что они более прочих возбуждали и поддерживали особенный дух польского патриотизма” [17]. Об отношении цензуры к поэту свидетельствует курьезный факт запрещения нот к переведенному на русский язык стихотворению “Сон” [18].

---

[11] Санкт-петербургский цензурный комитет, 1839, № 33.3. Донесение г. цензора надв. сов. Дукшинского, о рассмотренной им на польском языке рукописи под назв: “Древне-литовские песни”. Пер. кс. Юцевич.

[12] Там же.

[13] Там же.

[14] Там же.

[15] ЦГАЛ, Комитет цензуры иностранной, ф. 779, журн. от 3 августа 1838, № 28; Bilder Conversations Lexicon fur deutsche Volk 1837 und 1838. Причиной запрета было имя Мицкевича. См. Kucharska E. Literatura polska…

[16] ЦГАЛ, Комитет цензуры иностранной, ф. 779, журн. от 1 июля 1839, № 26; Esquisses Litteraires ou précis methodique de Litterature europeene par D. Devi, Paris. Причиной запрещения было указание на творчество Мицкевича. См.: Kucharska E. Literatura polska…

[17] ЦГАЛ, Комитет цензуры иностранной, ф. 779, журн. от 1 февраля 1843, № 6; Nowe wypisy polskie. Gniezno, 1841. T. 2.

[18] ГИАМО (Государственный исторический архив Московского округа), ф. 31, № 3, д. № 14, оп. 1, 1842, 30 января, № 62; Ноты “Сон”, слова Мицкевича, перевод Ландфорта, музыка Толстого.

В 1839 г. главное управление цензуры, получив от цензуры иностранной, управляемой Красовским, резолюцию о запрещении томика поэзии Байрона в переводе Мицкевича, считало уместным “испросить в последствие времени Высочайшего, как поступить впредь с переводами Мицкевича позволительных иностранных сочинений” [19]. Резолюция царя от 27 ноября 1839 г. приводилась в протоколе Главного управления цензуры: “Ежели ни в книгах, ни в примечаниях переводчика ничего худого нет, то препятствия нет. Принять к должному сведению” [20]. Таким образом, разрешение на ввоз переводов Мицкевича в Россию давал сам царь.

Цензура запрещала не только произведения Мицкевича. Знакомство с поэтом и чтение его творений также были использованы для обвинений во время следствий по политическим процессам. Об этом свидетельствуют материалы по делу петрашевцев [21]. Нет ничего удивительного, что после запрещения большинство русских журналов прекратило печатание поэзии Мицкевича и отзывов о его творчестве.

Однако в период запрета не прекращает публикаций поэзии польского поэта “Москвитянин”, издававшийся “официальным” русским историком Михаилом Погодиным [22]. Журнал Погодина в период самых усиленных преследований цензуры в 40-х гг. печатает “Крымские сонеты” в переводах поклонника Мицкевича Николая Берга. Цензура вводилась в заблуждение, так как при этом не указывалось имя Мицкевича, а патриотический смысл заменялся введением слов о Руси или высказывания о Литве и Польше пропускались. Так, в сонете “Могила Потоцкой” слова: “Tam na północ ku Polsce świecą gwiazd gromady” Берг переводит: “Я видел там, от полдня к полуночи” [23]. В сонете “Акерманские степи” строфа Мицкевича: “W takiej ciszy. Tak ucho natężam ciekawie, że słyszałbym głos z Litwy. Jedźmy, nikt nie woła. ” Берг переводит: “В нем слышится знакомый сердцу шепот, Ах! это Русь мне голос подает” [24]. Таких примеров можно привести много. Например, в 1854 г. Берг напечатал русскую версию сонета “К Неману”, начинающегося фразой: “О Волга-матушка, родимая река” [25], которая у Мицкевича звучала: “Niemnie, domowa rzeko moja”.

Преследования цензуры проявились также по отношению к эпопее “Пан Тадеуш”. Данные об отзыве на публикацию произведения найдены мной в

---

[19] ЦГАЛ, Главное управление цензуры, ф. 772, 1839, 17 июля: Poezje lorda Byrona tłumaczone przez Adama Mickiewicza etc. w Paryżu 1835.

[20] Там же.

[21] Лейкина-Свирская В. Дело петрашевцев. М.; Л., 1941. Т. 2.

[22] Kucharska E. Michała Pogodina zainteresowania polskie. Warszawa; Wrocław, 1978.

[23] Берг Н. Могила Потоцкой в Бахчисарае // Москвитянин. 1846. № 3. С. 5.

[24] Берг Н. Акерманские степи // Москвитянин. 1846. № 3. С. 3.

[25] Берг Н. Сонет. О Волга-матушка, родимая река // Москвитянин. 1854. Т. 6. № 24. Кн. 2. С. 198.

рукописном отделе Пушкинского Дома, где хранится рукопись из архива "Русской старины", переписанная рукой С. П. Никольского, сообщающего о запрете в Царстве Польском "Пана Тадеуша". Приводится "секретное письмо Варшавского военного губернатора графа Ф. Нессельроде Е. А. Головину". Нессельроде писал: "Милостивый Государь Евгений Александрович! Директор дипломатической канцелярии князя наместника по приказанию его светлости уведомил меня, что известный польский поэт Мицкевич издал недавно новую возмутительную поэму под названием Пан Падеуш [!] с тою целию, чтобы распространить оную между жителями Царства Польского и Галиции. Сочинение сие переведено лейпцигским доктором Шпациром на немецкий язык, а будет напечатано в Стутгарте книгопродавцом Котта. Как его светлости угодно, чтобы приняты были все меры к воспрепятствованию распространения означенного сочинения, то сделав подлежащее о сем распоряжение по подведомственным мне частям, я почитаю вместе с тем обязанностью сообщить о сем и вашему превосходительству" [26]. В материалах имеется также комментарий о том, что в циркуляре, направленном Головиным военному ведомству, приводится письмо Нессельроде. Повторяется таже ошибка в заглавии — "Пан Падеуш". Дальше Никольский приводит добавочное распоряжение Головина: "…для того, чтобы выше наименнованная поэма, …могущая произвести весьма вредное на умы жителей влияние и возмутить их спокойствие, не проникла в пределы края каким бы то ни было путем, поручаю вам обратить особенное на нее внимание и сделать подведомственным вам властям соответствующие распоряжения. Если бы однако это сочинение оказалось у кого-либо, в книжных магазинах или у частных лиц, то вы не оставите немедленно таковое отобрать и представить мне" [27]. Распоряжение было отправлено военным начальникам, а его следствием был тот факт, что в русской печати не появилось ни одного сообщения об издании эпопеи. Однако русские знакомились с произведением во время поездок на запад Европы, а возвращаясь, нелегально привозили на родину печатавшиеся произведения Мицкевича [28].

Запрет "Пана Тадеуша" в России не помешал Бергу, известному уже переводчику Мицкевича, обойти цензуру и напечатать отрывки эпопеи. В переводах, как и раньше, Берг Литву заменяет "русскими небесами" и "украинскими лесами". Начало "Пана Тадеуша" звучит: "Украйны дорогой дремучие леса! Вас ныне вспомнил я". В "Посмертных записках Николая Васильевича Берга", напечатанных в "Русской старине" [29], а также во вступ-

[26] Пушкинский Дом, ф. 265, оп. 2, № 1670. Архив журнала "Русская старина".

[27] Там же.

[28] Barański Z. Literatura polska w Rosji na przełomie XIX–XX wieku. Wrocław, 1962.

[29] Посмертные записки Николая Васильевича Берга // Русская старина. 1890. № 2. С. 293–319; 1891. № 2. С. 229–279; 1981. № 3. С. 579–600; 1892. № 3. С. 633–652.

лении к полному переводу “Пана Тадеуша” (1875) Берг писал: “Литовские леса “ стали “украинскими лесами”, “облака Литвы” изменились в “родные небеса”. В то время публика так мало знала о Тадеуше, что если б я перевел его всего и издал за свое сочинение — весьма и весьма немногие заметили бы подлог. Цензора тоже ничего не знали. Когда “украинские леса” и “родные небеса” явились в печати — только одни поляки-студенты мне подмигивали и потирали руки… Какая-то малороссийская дама писала к одному из моих знакомых, в Москву: “Поблагодарите Берга за милое стихотворение о наших лесах, но та беда, что у нас *таких лесов нет*”! [30] Следует отметить, что Берг долгие годы работал над переводом “Пана Тадеуша”. Как писал в воспоминаниях, стал он его “настольной книгой”. После названных выше отрывков, напечатанных в “Москвитянине” в 1845 г., только в 1875-ом был опубликован полный перевод “Пана Тадеуша” [31]. Русский прекрасный перевод в начальных строках пропускает обращение к Литве: “Отчизна милая! подобна ты здоровью: тот истинной к тебе исполнится любовью, кто потерял тебя… в страданьях и борьбе, Отчизна милая, я плачу по тебе!” [32]

Наряду с отрывками “Пана Тадеуша”, издаваемый Погодиным “Москвитянин” печатал и фрагменты парижских лекций Мицкевича, которые также были запрещены цензурой [33], однако только после первых публикаций в русских журналах.

Погодин принадлежал к поклонникам Мицкевича. В трудное время николаевской реакции неоднократно публично высказывался о нем с большой симпатией, посещал польского поэта во время своих поездок за границу, а после его смерти написал письмо царю с просьбой помочь вдове и осиротевшим детям Мицкевича [34]. Не случайно предупреждал историка цензор Никита Крылов в записках, найденных мной в Рукописном отделе Российской государственной библиотеки в Москве: “О Мицкевиче, почтеннейший Мих. Петр., думаю, говорить вам как православному русскому профессору небезопасно. Бог знает, что подумают. Вы с ним целый день, может быть, и больше, были прежде знакомы, объясняете выгодно причины его отступничества и т. д. А знаете ли, как Государь рассержен против него и Лелевеля??? Право, страшно… Подумайте. И какой злой демон влечет

---

[30] Берг Н. Как и когда сделан мною перевод “Тадеуша” // Берг Н. Пан Тадеуш, поэма А. Мицкевича. Варшава, 1875. С. XXII.

[31] Берг Н. Пан Тадеуш, поэма А. Мицкевича; фрагменты произведения были опубликованы в “Москвитянине” в 1845 г. (№ 3, с. 16–19).

[32] Берг Н. Пан Тадеуш… С. 4.

[33] ЦГААЛ, ф. 779, оп. 4, д. 28, Журнал цензуры иностранной, № 5, от 5 февраля 1845 г.: Kurs trzyletni.

[34] Барсуков Н. Жизнь и труды М. П. Погодина. СПб., 1900; также: Kucharska E. Michała Pogodina zainteresowania polskie.

вас в Париж к отъявленным полякам! Экая простота!" [35]. Эта записка и следующая были датированы 1841 г., а значит, перед публикацией в "Москвитянине" цикла "Крымских сонетов" и отрывков из "Пана Тадеуша".

Цензура Николая I и после его смерти по-прежнему свирепствовала. Так, в 1861 г. был запрещен номер "Акционера" из-за мотто "Тихо всюду, глухо всюду, Быть тут худу, быть тут худу", указывающего на застой на международном рынке [36]. Цитата была заимствована из II части "Дзядов".

В архиве III Отделения полиции найдена довольно обширная переписка, связанная с планировавшейся в Варшаве лотереей литографий картин, изображающих жену Мицкевича и ее дочерей. Предполагаемая продажа была запрещена [37]. Примеров преследований можно привести значительное число.

Цензурные гонения вызвали у видных представителей русской общественности попытки обойти цензуру и знакомить русских друзей с творчеством очень популярного в России поэта. Непреодолимая сила творений Мицкевича оставалась актуальной вопреки политическим бурям и раздорам. Интерес к поэзии польского певца проявился особенно ярко, когда в 1905 г. отмечалось пятидесятилетие со дня смерти Мицкевича, а цензурное гонение в период революции ослабело.

Мікалай Нікалаеў *(Санкт-Пецярбург, Расія)*

БЕЛАРУСКІ ПЕЦЯРБУРГ І АДАМ МІЦКЕВІЧ

Некалі даўно, калі Санкт-Пецярбург яшчэ называлі Ленінградам, у выдавецтве "Лениздат" выходзіла серыя "Славутыя людзі ў Пецярбургу – Петраградзе – Ленінградзе". Выйшлі кнігі пра паэта і мастака Тараса Шаўчэнку, архітэктара Агюста Монферана, кампазітара Міхаіла Глінку і многіх іншых. З таго часу (недзе з 1978 г.) я збіраю інфармацыю пра беларусаў у горадзе на Няве. Іх было шмат. Многія з іх дасягнулі значных поспехаў, высока падняліся, сталі вядомы, або, як кажуць, "здабылі сабе імя" — на службе, у навуцы, літаратуры, мастацтвах. Але напісаць аб іх цяжка, бо матэрыялаў (асабліва біяграфічных) не асабліва багата, а адной з праяў іх

[35] Записки, найденные в Рукописном отделе Российской государственной библиотеки в Москве цитируются в оригинале и польском переводе в кн.: Kucharska E. Michała Pogodina zainteresowania polskie.

[36] Bekkier J. Mickiewicz i carska cenzura.

[37] Исторический архив в Москве, ф. 111 0, № 209, 12/24 июня 1854, № 384, 30 июня 1854, № 488. О предложении сотрудника редактора журнала варшавского Вацлава Шимановского разыграть в лотерею картину, высланную ему женою Д. С. С. Малевскою в пользу изгнанника Адама Мицкевича.

беларускасці часта было самаадднае служэнне рускай ці польскай ідэі. Сёння, у 1998 г., сярод іншых Беларусь адзначае юбілей палітыка, вучонага і паэта, майго зямляка, Адама Міцкевіча. На канферэнцыі яго памяці дарэчы будзе ўспомніць яго як прадстаўніка "Беларускага Пецярбурга".

Беларусы ў старым Пецярбургу — гэта перш за ўсё тыя выхадцы з Вялікага Княства Літоўскага, якія або стала, або досыць доўга жылі ў паўночнай сталіцы. Вышэйшую адукацыю яны атрымалі, часцей за ўсё, на радзіме, у Віленскім універсітэце, а потым падаліся ў сталіцу імперыі з надзеяй зрабіць кар'еру: нехта як дзяржаўны чыноўнік, нехта як навуковец, нехта як вайсковец.

Адам Міцкевіч тут выключэнне. Ён быў у Пецярбургу двойчы — першы раз прымусова, другі раз перад ад'ездам у эміграцыю, і абодва разы даволі непрацяглы час. Аднак значэнне прабывання А. Міцкевіча ў сталіцы Расійскай імперыі настолькі вялікае, што мы маем права з увагай разгледзець тутэйшы побыт таленавітага навагрудчаніна, а таксама і яго бліжэйшае акружэнне.

24 красавіка 1824 г. прафесар гісторыі віленскага універсітэта Іаахім Лялевель паручыўся за свайго былога студэнта А. Міцкевіча, і той быў вызвалены з турмы (муроў былога базыльянскага кляштара) пасля сямімесячнага зняволення. Выйшаўшы з-пад арышту, малады паэт у ліку 13 былых віленскіх студэнтаў павінен быў ехаць у Пецярбург, каб атрымаць "распределение на службу в далеких от Польши губерниях в званиях, соответственных приобретенным ими способностям". У выніку Адам выбіраў, дзе бавіць час, — ці то на поўдні, у Адэсе і ў Крыме, ці то ў адной з Расійскіх сталіц — Маскве. Пры гэтым не абцяжарваючы сябе штодзённай службай. Такая ўжо на той час была Расійская імперыя — яна высылала палітычна неблаганадзейных з правінцыі ў сталіцы і давала ім хлеб.

7 лістапада 1824 г., на наступны дзень пасля самай вялікай (у папярэдняй і будучай) гісторыі горада паводкі, Міцкевіч прыбыў у Пецярбург. Малюнкі страшнай катастрофы аказалі моцнае ўражанне на паэта: брудныя, занесеныя гразёй вуліцы, раскіданыя вадой дровы, дошкі, перакуленыя фурманкі, пранізлівы халодны вецер з мора, пахаванне 168 патанулых людзей і многіх соцень тапельцаў-коней і кароў. Яшчэ і сёння некаторыя дамы ў старой частцы горада маюць адзнаку аб узроўні вады у час той паводкі: дзве дошкі-меткі (па-руску і па-нямецку) на адным доме ў завулку Грыўцова паказваюць 1 м 55 см вышэй сучаснага тратуара, а фуршток ля Горнага інстытута — 4 м 21 см вышэй ардынара (значыць, вышэй узроўня мора).

Парыж — плён працы чалавечых рук ад веку,
Венецыю стварыла боская рука,
Але напэўна кожны пагадзіцца,
Што Пецярбург пабудавала сатана, —

гэтая варожая для горада міцкевічаўская характарыстыка Пецярбурга была настолькі трапнай, што яе пазней падтрымалі многія рускія літаратары. Фактычна Міцкевіч пачаў плынь негатывізму ў пецярбургскім краязнаўстве: горад, пабудаваны на балоце і на касцях людзей, не можа быць добры. Апошняя кніга з такімі ж высновамі выйшла зусім нядаўна — у 1995 г.

Адаму не падабаўся Пецярбург, але Міцкевіч падабаўся Пецярбургу. Яго клікалі ў розныя дамы, частавалі, прасілі выканаць вершаваныя імправізацыі, запрашалі ў тэатры і рэстараны. Новы, 1825 г., Міцкевіч і яго сябры Малеўскі і Яжоўскі сустракалі ў доме Бястужава на Васільеўскім востраве (7-я лінія, 18). У перапісцы Міцкевіча часта ўспамінаецца дом карэтнага майстра Ёхера на Вялікай мяшчанскай вуліцы, 78 (цяпер вул. Пляханава, 39).

Нітаванне часу і прасторы ў гісторыі часам набывае чароўныя формы. І зараз стаіць дом карэтнага майстра Ёхера, у якім у час першага прыезду ў Пецярбург жыў Адам. Мемарыяльная дошка на ўзроўні другога паверха нагадвае аб гэтым. А дачка вядомага савецкага паэта Усевалада Раждественскага, прафесар Мілена Усеваладаўна Раждественская расказала мне, што карэтны майстар Ёхер прыходзіцца ёй далёкім продкам па мяцярынскай лініі… Сама Мілена Усеваладаўна некалі (у 1960-я гг.) удзельнічала ў археалагічных раскопках старажытнага Навагрудка…

У час другога прыезду А. Міцкевіч жыў у доме № 7 на Кадэцкай (цяпер З'ездаўская) лініі Васільеўскага вострава. Тут яго наведваў Пушкін разам са сваім сардэчным прыяцелем, рэктарам універсітэта Плятнёвым. Ці ўспаміналі ў размовах Навагрудак? — хутчэй за ўсё. Бо Пушкін потым напіша:

И там Мицкевич вдохновенный
Свою Литву воспоминал…

А для Адама Міцкевіча Літва — гэта перш за ўсё Навагрудак і Вільня…

6 снежня 1827 г. Міцкевіч прыехаў з Масквы ў Пецярбург у адпачынак на 28 дзён "па ўласных яго справах". Аднак прабыў ён у сталіцы нашмат больш (ці не да мая). Бываў у розных дамах. Найбольш хіба ў доме купецкай удавы Пенцешавай (Італьянская вул., 15), дзе жыла Марыя Шыманоўская, сяброўка Міцкевіча, маці яго будучай жонкі Цэліны. Праз нейкі час дом перайшоў ва ўласнасць балерыне Аўдоцці Істомінай.

Уплыў Міцкевіча на суайчыннікаў у Пецярбургу быў велізарны і неадназначны. Вылучым сярод землякоў двух, хто займаўся літаратурай. Сябра Адама — Фадзей Булгарын і вораг — Іосіф Сянкоўскі.

Сябра

Тадэвуш Булгарын нарадзіўся 24 чэрвеня 1789 г. у Мінскім павеце, недалёка ад Ушачаў, у сям'і шляхціца. Пасля пераезду ў Санкт-Пецярбург

працаваў як журналіст і пісьменнік. Часта падпісваўся крыптанімам “**Ѳ. Б.**”. У 1825–1859 гг. выдаваў газету “Северная пчела”, у 1822–1828 гг. — часопіс “Северный архив”, у 1825–1839 гг. — “Сын отечества”. Аўтар раманаў “Іван Выжыгін” (1829) і “Пётр Іванавіч Выжыгін” (1831). Як літаратурны крытык Булгарын выступаў супраць Пушкіна, Гогаля, Бялінскага і рэалістычнага накірунку, які назваў у адным з артыкулаў “натуральнай школай”. Сябра Аляксандра Грыбаедава і Адама Міцкевіча. Працавітасць Тадэвуша праявілася ў колькасці таго, што ён напісаў: збор твораў (далёка не поўны, надрукаваны ў Санкт-Пецярбургу ў 1839–1844 гг.) налічвае сем тамоў.

Міцкевіч пісаў Францішку Малеўскаму з Рыма 2 лютага 1830 г.: “…пану Тадэвушу кланяйся. […] Скажы пану Тадэвушу, што яго “Выжыгін” у рускіх дам у вялікай пашане”. Частка расійскіх літаратараў, праўда, не любіла Булгарына ўсёй душой, усім сэрцам… П. Вяземскі выказаў гэта ў эпіграме:

Двойной присягою играя,
Поляк в двойную цель попал:
Он Польшу спас от негодяя
И русских братством запятнал.

Калі ў пачатку другога радка замест няправільна ўжытага “поляк” паставіць, напрыклад, імя Фадей, то атрымаецца зусім не кампліментарны вобраз “беларуса ў Пецярбургу”. Пра Міцкевіча так, як пра яго прыяцеля-суайчынніка, не пісалі, у горшым выпадку імкнуліся маўчаць… Яго вобраз быў трошку іншы.

Вораг

Таленавіты ўсходазнавец, прафесар арабістыкі Іосіф Сянкоўскі быў адзіным прафесарам Санкт-Пецярбургскага універсітэта, які ведаў Усход не па кнігах, а па ўласных уражаннях. Яго лекцыі былі бліскучымі, яго почырк (што вельмі важна для арабіста) — каліграфічны. Яго дзейнасць узмацніла “арыенталізм” у рускай літаратуры. На жаль, заняткі літаратурай (як пісьменніцтвам, так і выдавецтвам) так захапілі Сянкоўскага, што арабістыка ад гэтага траціла: “Сянкоўскі даволі рэдка бывае на лекцыях”, — пісаў Чарнышэўскі свайму саратаўскаму настаўніку, арыенталісту Саблукову, які рэкамендаваў яму паглядзець на славутага вучонага.

Іосіф (Юліян) Іванавіч Сянкоўскі нарадзіўся ў шляхецкай сям’і з Віленскага павета 19(31) сакавіка 1800 г. Закончыў Віленскі універсітэт (1819), пасля чаго падарожнічаў па Усходзе. У 1822–1847 гг. прафесар універсітэта ў Санкт-Пецярбургу; адзін з заснавальнікаў расійскага ўсходазнаўства. Член-карэспандэнт Пецярбургскай АН (1828). У 1834–1947 гг. (намінальна да 1856) рэдактар часопіса “Библиотека для чтения”, у якім друкаваў пад псеўданімам Барон Брамбеус свае аповесці (“усходнія”, свецкія, бытавыя, сатырычныя, навукова-філасофскія). Меў талент, эрудыцыю, лёгкае

пяро. Трымаўся канцэпцыі “чыстага мастацтва”, адмоўна ставіўся да рэалістычнага накірунку ў літаратуры. Памёр у Пецярбургу ў сакавіку 1858 г. збор яго твораў (выйшаў у Пецярбургу ў 1858–1859 гг.) налічвае дзевяць тамоў. Асоба настолькі цікавая і неардынарная, што да сёння аб ім пішуцца даследчыцкія манаграфіі ў розных краінах [1].

Адам Міцкевіч пазнаёміўся з Сянкоўскім у 1824 г., у час свайго першага наведвання Пецярбурга. У лісце да Іаахіма Лялевеля ад 16(28) студзеня 1829 г. з Пецярбурга пісаў: “…Тадэвуш [Фадзей Булгарын, рэдагаваў “Северную пчелу”, у якой друкавалася рэцэнзія Лялевеля на “Историю Государства Российского” Карамзіна] вельмі задаволены абраннем [у члены варшаўскага Таварыства прыяцеляў навук]; раней ён рабіў або пісаў усялякае глупства, а цяпер ён нязменна добразычлівы, таму добра, што яго прынялі. Я размаўляў нядаўна аб працягу рэцэнзіі Карамзіна; здаецца, затрымцы яе дзейсна спрыяў сп. Арыенталіст [Ю. Сянкоўскі], даказваючы, што ў ёй няма сэнсу. З гэтым Арыенталістам, паўтараю, табе не варта падтрымліваць ніякіх пісьмовых зносін, хіба што літаратурныя. Самыя абыякавыя. Тое, што з ім сталася, праўдзівей, тое, што ў ім адкрылася, пераўзышло нават мае меркаванні”. Ці ведаў Міцкевіч, пішучы гэты ліст, што Сянкоўскі быў адным з вучняў прафесара Лялевеля, адным з лепшых вучняў свайго выпуску, на замежнае падарожжа якога ўся Вільна збірала грошы? Можа, ведаў і раўнаваў, зайздросціў? Ці не знайшоў падыходу да земляка, агульнай мовы? Агульнай магла быць беларуская, але адзін з іх лічыўся за польскага, а другі — за рускага пісьменніка… Напэўна, не мог не зачапіць Міцкевіча даклад, які зрабіў “обер-старшыня бунтаў і рэвалюцый Астарот” галоўнаму Сатане ў сатыры Сянкоўскага “Вялікі выхад у Сатаны” (рэакцыя Арыенталіста на паўстанне 1831 г.): “Ніколі яшчэ не здаралася мне так добра падмануць людзей, як у гэтай справе: але, праўду кажучы, ніколі і не трапляўся мне народ такі легкаверны. Я так лоўка падбухторыў іх, закруціў ім галаву, заблытаў усякае разуменне, што яны біліся як вар’яты на працягу некалькіх месяцаў, каналі, гінулі і зараз яшчэ не могуць даць сабе розуму, за што біліся і чаго хацелі…

— Бардзо добжэ! — прамовіў Сатана, які сабаку з’еў на ўсіх мовах”.

Міцкевіч у Польшчу ў час паўстання не паехаў і “як вар’ят” не біўся. Ён не паддаўся на падман Астарота, можа, ён сам ў гэтай справе быў Астаротам?

А. Міцкевіч быў першым вядомым нам навагрудцам, які пазнаёміўся з Пецярбургам. Пазней славутымі пецярбуржцамі сталі шляхціц Антон Мухлінскі з Валеўкі — прафесар турэцкай мовы, першы дэкан усходняга

[1] Каверин В. А. Барон Брамбеус. М., 1966; Pedrotti L. J. J. Sękowski. The genesis of a literary alien. Berkley; Los Angeles, 1965.

факультэта, Барыс Тураеў з Навагрудка, пачынальнік расійскай егіпталогіі, акадэмік, а таксама і сын навагрудскага рабіна Абрам Гаркавы (Гаркаві), які праславіўся і як арабіст, і як гебраіст, складальнік каталога самарыцянскіх рукапісаў Імператарскай Публічнай бібліятэкі. Славутыя шляхціц-паляк, шляхціц-татарын, сірата па рускім чыноўніку, і габрэй. Навагрудцы. Беларусы ў Пецярбургу.

Санкт-Пецярбург А. Міцкевіч за радзіму не лічыў і пакідаў назаўсёды без шкадавання. Напярэдадні ад'езду за мяжу, вечарам 13 мая, ён быў у тэатры… Астатнія з вышэй упямянутых асоб прыедуць у паўночную сталіцу крыху пазней.

Andrzej Nowak *(Kraków, Polska)*

ADAM MICKIEWICZ I WIELKA EMIGRACJA: SPORY O ROSJĘ

[12] Mickiewicz A. Księgi… S. 69, 82–83.
[13] Тамсама. С. 88.
[14] Тамсама. С. 41.
[15] Гл: Пузыревский А. Польско-русская война 1831 г. СПб., 1886. С. 8.
[16] Гл: Mickiewicz A. Księgi… S. 92.
[17] Пузыревский А. Польско-русская война 1831 г. С. 306.

мэты; і не выгнаннік, бо выгнаннікам з'яўляецца чалавек, выгнаны загадам урада, а паляка не выгнаў ягоны ўрад" [18]. Пасля паўстання 1830–1831 гг. шмат яго ўдзельнікаў апынуліся ў вымушанай эміграцыі. З Гродзенскай і Мінскай губерняў, беларускіх паветаў Віленскай губерні, па падліках даследчыцы Н. Міцінай, эмігравала 509 чалавек [19]. Гэта была трэцяя хваля эміграцыі. Першая адбылася пасля паўстання 1794 г., другая — пасля ліквідацыі ВКЛ у 1812 г. [20]

Напісаныя ў рэлігійнай форме "Кнігі…" не маглі абысці пытанняў веравызнання. А. Міцкевіч піша: "І гэтая Кацярына аб'явіла, што бароніць вольнасць веравызнання, або талерантнасць, каб высмеяць вольнасць веравызнання, таму што некалькі мільёнаў вернікаў прымусіла адмовіцца ад веры" [21]. Як вядома, зачэпкай да першага падзелу Рэчы Паспалітай стала рэлігійнае пытанне — дысідэнты патрабавалі ўраўняць у правах католікаў з праваслаўнымі і уніятамі, і Кацярына II стала на абарону праваслаўных.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай расійская імператрыца праз маніфест Крачэтнікава даносіла да сваіх новых падданых аб "совершенной и ничем не ограниченной свободе в публичном отправлении их веры" [22]. Але крывіла душою Кацярына II, бо ўжо ва ўказах ад 22 красавіка 1794 г. і ад 10 студзеня 1795 г. папярэджвала памешчыкаў і святароў (каталіцкіх і уніяцкіх), каб "не асмельваліся рабіць самай нязначнай" перашкоды пры вяртанні уніятаў да праваслаўнай грэчаскай царквы пад страхам крымінальнага злачынства і секвестру маёнткаў [23]. У выніку такой палітыкі толькі пасля першых двух падзелаў Рэчы Паспалітай на беларускіх і ўкраінскіх землях у праваслаўе былі пераведзены каля 1,5 мільёнаў уніятаў і 2603 уніяцкія царквы [24]. У студзені 1839 г. адбыўся Полацкі сабор вышэйшага уніяцкага духавенства на чале з Я. Сямашкам, В. Лужынскім, А. Зубко, а ў лютым 24 кіруючыя духоўныя асобы падпісалі акт "злучэння уніятаў з праваслаўнай царквой". 243 гадам існавання уніі быў пакладзены канец [25].

---

[18] Mickiewicz A. Księgi… S. 45.

[19] Митина Н. П. Социальный состав участников польского восстания 1830–1831 гг. (по спискам эмигрировавших и скрывшихся от репрессий) // Историко-социологические исследования. М., 1970. С. 174–179.

[20] Сяргеева Г. Беларуская дыяспара: Погляд на мінулае і сучаснасць // Голас Радзімы. 1997. № 44. С. 4.

[21] Mickiewicz A. Księgi… S. 35.

[22] Сборник грамот и договоров. СПб., 1882. Стб. 429.

[23] Полное собрание законов Российской империи. СПб., 1830. Т. 23. № 17199.

[24] Таляронак С. Унія і каталіцызм на Беларусі ў 1722–1839 гг. // Літ. і мастацтва. 1992. 8 мая.

[25] Ігнатоўскі У. Гісторыя Беларусі ў XIX – пачатку XX стст. Мн., 1925. С. 83–84.

Zbigniew Wójcik *(Warszawa)*

ADAM MICKIEWICZ — IGNACY DOMEYKO: DZIEJE PRZYJAŹNI

Do najbliższych przyjaciół Adama Mickiewicza w latach 1815–1824 w wileńskim gronie filomacko-filareckim należeli m. in.: Wincenty Budrewicz, Jan Czeczot (uczyli się razem w szkole dominikanów w Nowogródku), Cyprian Daszkiewicz, Ignacy Domeyko, Józef Jeżowski, Józef Kowalewski, Feliks Kółakowski, Teodor Łoziński, Franciszek Malewski, Antoni Edward Odyniec, Onufry Pietraszkiewicz, Jan Sobolewski i Tomasz Zan. Wszyscy fascynowali się poezją, której teorię studiowali w Uniwersytecie Wileńskim. Bodaj tylko Domeyko nie pozostawił żadnego rymowanego utworu. Odyniec dostrzegł jednak na podręczniku *Gramatyka dla szkół narodowych na klasę I* Onufrego Kopczyńskiego następujący jego dwuwiersz:

Z tej książki uczył się Ignacy Domeyko,
A po nim bracia jego kolejką [1].

Znakomite dzieło Kopczyńskiego używał w szkole u pijarów w Szczuczynie, gdzie uczył się w latach 1812–1816, zdradzając już wtedy swe zainteresowania chemią i inżynierią. W Wilnie w 1822 r. uzyskał magisterium z matematyki. Studiował jednak nauki ścisłe i humanistyczne i 21 lutego 1818 r. zdał egzamin z poezji i wymowy. W tym samym dniu przedmiot ten zdawal: Mickiewicz, Jeżowski i Pietraszkiewicz [2]. Później razem uczęszczali na wykłady z historii powszechnej uwielbianego Joachima Lelewela. Domeyko załatwiał nawet u rektora salę na odczyt publiczny wybitnego historyka.

Filomackich i filareckich przyjaciół Mickiewicza łączyło nie tylko zamiłowanie do poezji. Niemal wszyscy byli w jakiś sposób spowinowaceni. Większość z nich wywodziła się bowiem z b. Wielkiego Księstwa Litewskiego (w skrócie Litwy) i ziem ukrainnych Korony. Ci z Litwy nazywali się Litwinami, ale ich językiem domowym był polski. Z mówieniem po żmudzku miał kłopoty nawet Mickiewicz. Prawie wszyscy znali jednak białoruski — język ludu południowo-wschodniej Litwy. Na majówkach Promienistych śpiewano nawet w tym języku wiersz ułożony przez Czeczota na powitanie Mickiewicza. Jakże byli jej treścią przejęci, skoro Domeyko po 50 latach w Chile odtworzył z pamięci jej słowa i utrwalił na piśmie:

Ach stoż my waszeci skażem,
Prostaho sieła dziewczata,
Jakież pieśnieczki związem;
U nas myśl niebahata, u nas myśl niebahata.

[1] A. E. Odyniec, *Listy z podróży*, Opr. M. Toporowski, t. l, Warszawa 1951, s. 540.

[2] Z. Bujakowski, *Z młodości Mickiewicza. Nieznane szczegóły z lat 1815–1825*, Warszawa 1914, s. 15.

Ale jak myślim, jak czujem,
Tak tabie zaśpiewajem,
Tak tabie powinszujem;
Nieszczerości nie znajem, nieszczerości nie znajem.
Budź jak lisiczka zdrawy,
Jak konik wiesieł pry trudzie,
Niech twaje pismo i mowy,
Jak saławiej hołos budzie, jak saławiej hołos budzie [3].

Byli więc Litwinami (geograficznie) oraz Polakami (etnicznie) osadzonymi w białoruskim, jakbyśmy dziś powiedzieli, żywiole. Białorusinów nazywali zawsze "naszym ludem", który serdecznie kochali. Mickiewicz wcześnie miał pełną świadomość złożoności regionalnych problemów geograficzno-etnicznych. W styczniu 1822 r., po inauguracyjnym wykładzie Lelewela zapisał w jednym wierszu:

[…] gdzie się obrócisz, z każdej wydasz stopy,
Żeś znad Niemna, żeś Polak, mieszkaniec Europy [4].

W 1824 r. wyrokiem Komisji Nowosilcowa prawie wszyscy wymienieni filomaci i filareci zostali przymusowo wygnani w głąb Rosji. Władze uniewinniły Odyńca, a Domeyko — sowicie opłacony przez stryjów — został skazany na przymusowy pobyt na wsi w Nowogródzkiem. Mickiewicz pisząc w Dreźnie w 1832 r. *Dziadów* część trzecią utwór swój poświęcił trzem zmarłym na wygnaniu w Rosji przyjaciołom: Daszkiewiczowi, Kołakowskiemu i Sobolewskiemu. Oderwanie od rodzinnej gleby było jednym z czynników, który przyśpieszył ich zgony.

Wśród przyjaciół Mickiewicza Domeyko zajmuje pozycję szczególną. Był bowiem ciotecznym bratem Marii z Wołodkowiczów — Maryli. Przed procesem i po wyroku w 1824 r. odwiedzał ją wielokrotnie w Tuhanowiczach i w Bolciennikach. Mickiewicz zawsze skwapliwie wysłuchiwał informacji o ukochanej, nawet wówczas gdy wyszła za mąż za Wawrzyńca Puttkamera. Wielki romantyk w niespełnionej miłości znajdował inspirację do swej twórczości młodzieńczej.

W 1831 r., gdy Domeyko wraz z oddziałem powstańczym przekroczył granicę pruską i pozostawał w obozach internowanych koło Królewca, Mickiewicz szukał możliwości osobistego kontaktu z przyjacielem. W listach nie ukrywał, że wolałby wrócić na Litwę i informował o wydarzeniach w stronach rodzinnych. Gdy się spotkali w 1832 r. w Dreźnie, nie miał do niego *żalu z decyzji o* emigracji. W dwójkę było im raźniej w Saksonii, a później w Paryżu. Poeta wiedział

[3] Por. H. Mościcki, *Z filareckiego świata. Zbiór wspomnień z lat 1816–1824*, Warszawa 1923, s. 341. Tamże wiersz Czeczota zaczerpnięty z autografu — różny od zapamiętanego przez Domeykę.

[4] A. Mickiewicz, *Dzieła*, Wyd. narodowe, t. l, Opr. J. Kowalski i L. Płoszewski, Warszawa 1950, s. 100.

przecież, że w trudnym okresie zawsze pogodny Domeyko ułatwi mu nie tylko życie codzienne. Nie dziwi nas zatem to, że on był świadkiem na ślubie Mickiewicza oraz ojcem chrzestnym jego córki Marysi.

Ignacy Domeyko, w miarę swych możliwości, wspomagał materialnie Mickiewicza podczas studiów w Wilnie, w czasie zesłania w głębi Rosji oraz na emigracji. Przebywając pod nadzorem policyjnym, zwykle na wiosennych kontraktach w Nowogródku sprzedawał utwory Mickiewicza i zgromadzone pieniądze wysyłał przyjacielowi. Starał się stworzyć mu w miarę normalne warunki, gdy pisał w Dreźnie *Dziadów* część trzecią. Byli razem w Paryżu gdy Poeta pisał *Pana Tadeusza*. "Sejmikowicz" Domeyko nie tylko opiekował się przyjacielem. Jako znawca problemu był konsultantem, kopistą a nawet korektorem. Okresowo Poeta zatrzymał się w mieszkaniu Domeyki. Wspólnie wówczas wypracowali plan wielkiego dzieła, które miało informować Francuzów o geografii i historii ziem polskich od zarania po powstanie listopadowe.

Adam Mickiewicz przygotowywał się do pisania swoich utworów bardzo starannie. Wertował źródła historyczne i wszelką dostępną literaturę przedmiotu. Był nie tylko artystą, ale także historykiem. Dał temu wyraz w 1822 r. ogłaszając wiersz *Do Joachima Lelewela*. W założeniu miał to być utwór przybliżający młodzieży akademickiej nowe widzenie dziejów prezentowane podczas wykładów znakomitego nauczyciela akademickiego. W wykładzie tym historyk odszedł od zwyczaju prezentowania dokonań koronowanych i prowadzonych przez nich wojen, kreśląc wszechstronny obraz epok w dziejach ludzkości. To właśnie o tym młody Poeta pisał w swym wierszu, zarazem usprawiedliwiając się przed Mistrzem ze śmiałości wypowiedzi:

Gdzież jestem, LELEWELU! jaka chęć uniosła
Opiewać morza, których nie tknęły me wiosła?
Poziomy płazik, orlej nabrawszy ochoty
Uczone myśleń twoich naśladować loty!
Wyręczaj mię, bo w polski dziejopisów kole
Wyniosły jesteś! stanąć mający na czole.
Ty, co nie dozwoliłeś tylu księgom kłamać,
Z samego kłamstwa prawdę umiejąc wyłamać.
Znasz lepiej trudne twojej nauki ogromy,
Słodkości jej owoców sam lepiej świadomy, —
Głosem, którym okrzyki i przyklaski wzniecisz,
Powiedz, jak tam zaszedłeś, skąd tak rano świecisz?
Na wierzchy, gdzie parnaska trzyma cię opoka,
Zwabiaj niższych łagodnym twego blaskiem oka [5].

W wielkich swych dramatach Mickiewicz tworzywo historyczne traktował jako element do budowy akcji utworu, świadomie odchodząc od realiów, które stanowiły nawet część jego osobistych przeżyć (np. *Dziady* część trzecia).

[5] A. Mickiewicz, *Dzieła*, s. 115.

Uciekając w krainę fikcji literackiej potrafił jednak stworzyć przekonywujący obraz epoki (np. w *Konradzie Wallenrodzie*). Gdy w 1832 r. dotarł do Paryża emigranci polscy wiedzieli, że w mieście tym jest wybitny historyk — Lelewel, ale popularne opracowanie historii naszego kraju może napisać tylko największy ówczesny poeta — Mickiewicz. W dniach 25 kwietnia i 9 maja 1833 r. myśl ta rozważana była na zebraniu Towarzystwa Literackiego, które zwróciło się do Poety z prośbą o opracowanie najstarszych dziejów historii Polski (do rozbiorów) [6]. Mickiewicz propozycję przyjął. Realizacja dzieła okazała się jednak niezwykle trudną, z uwagi na brak odpowiedniej literatury polskiej i obcej. W latach 1835–1838 dzieło jednak powstawało [7], choć do zgonu Poety nie zostało ukończone. Wiele przyczyn złożyło się na to, że Poeta zniechęcił się do pracy nad tym utworem.

W krążących odpisach i papierach pozostałych po Poecie odnaleziono trzy księgi nieukończonej opowieści, której wydawcy nadali tytuł "Pierwsze wieki historii polskiej". Zachowane podtytuły oddają treść tego opracowania: księga I — *Słowiańszczyzna, od wyjścia z Azji do czasów Lecha, Czecha, Rusa, czyli Ruryka*; księga II — *Królestwo polskie w rodzinie Piasta aż do podziału państwa* (części: *Epoka odpowiadająca dziejom Lechii do Popiela*, *Bolesław Wielki*, *Mieczysław II* (p. 1025), *Kazimierz I*, *Bolesław II śmiały*, *Władysław Herman*, *Bolesław Krzywousty*); księga III (niedokończona): *Polska w podziałach. Rząd panów (1139)* (części: *Władysław II*, *Bolesław IV Kędzierzawy*, *Mieczysław III Stary*, *Kazimierz Sprawiedliwy*). Autor zatem chronologię wydarzeń tradycyjnie podporządkował epokom związanym z panowaniem dynastii. Widocznie takie zapotrzebowanie było wówczas we Francji. Mimo to zarówno Mickiewicz, jak i paryskie Towarzystwo Literackie zamierzali nadać popularnemu dziełu nowe oblicze edytorskie. Zdecydowano, że *Historię polską* poprzedzi atlas ziem polskich, który opracuje — ówczesny student paryskiej École des Mines — Ignacy Domeyko. Miał on sporządzić trzy mapy: sieci wodnej (hydrografia), bogactw mineralnych (geologia) oraz lasów i gleb. Do pracy przygotował się bardzo starannie. Wykorzystał w dużym stopniu swą wiedzę wyniesioną z kraju (poznał z autopsji tereny b. Wielkiego Księstwa Litewskiwgo, ukrainne obszary b. Korony oraz Mazowsze) i najnowsze publikacje, dostępne w bibliotece paryskiej szkoły górniczej.

Atlas sporządzany przez Domeykę miał być dziełem naukowym. Tym samym zamierzano go opublikować jako wydawnictwo samoistne, poprzedzone tekstem wprowadzającym pt. *Essais sur la geologie, hydrogrąphie et les productions naturalles de la Pologne*. Nad dziełem tym przyszły inżynier górniczy pracował

[6] Por. M. Dernałowiczowa, *Od "Dziadów" części trzeciej do "Pana Tadeusza"*, Marzec 1832 – czerwiec 1834, Warszawa 1966, s. 192, 201.

[7] Por. M. Dernałowiczowa, *Paryż, Lozanna. Czerwiec 1843 – październik 1840*, Warszawa 1996, s. 148–149 i inne.

trzy lata. W 1837 r. wydrukowano mapę hydrograficzną [8]. Niebawem Domeyko zakończył opracowanie dwóch pozostałych map, a także napisał (po francusku) tekst wprowadzający. Do końca 1837 r. dzieło zostało przygotowane do druku. Objaśniało fizjografię kraju, od której przecież w dużym stopniu zależała gospodarka obszaru położonego między Dnieprem a Odrą, Morzem Bałtyckim a Morzem Czarnym. Nic więc dziwnego, że Mickiewicz interesował się postępem prac kartograficznych. On też miał opracowanie skierować do druku po wyjeździe w 1838 r. Domeyki do Chile. Jemu autor przekazał prawa własności oraz niezbędną sumę na pokrycie druku [9].

Jak się okazało, pech prześladował nie tylko Mickiewicza *Historię polską*, ale także atlas Domeyki. Pozostawione na druk pieniądze utonęły w kieszeni nieuczciwego rytownika. Domeyko przesyłał niezbędne sumy z Chile, a jego rodzina z Litwy. I te pieniądze się rozpłynęły. Nie pomogły monety nadsyłane z Santiago. Treść map Domeyki włączył do swych opracowań Feliks Wrotnowski i ogłosił w atlasach publikowanych we Francji w połowie XIX w. Rozgoryczony autor pod koniec życia zgromadził rękopisy. Rzecz wtedy była już zdecydowanie zdeaktualizowana. Oddał więc kopie map do Biblioteki Polskiej w Paryżu, a wprowadzający tekst do Biblioteki Akademii Umiejętności w Krakowie. Tam też trafiła robocza wersja mapy geologicznej. Jej inne opracowanie złożył do zbiorów Biblioteki Jagiellońskiej.

Z pewnością przyczyny obiektywne złożyły się na to, że *Historia polska* Mickiewicza i atlas geograficzny ziem polskich Domeyki nie ukazały się za życia autorów. Mickiewicz nie zdołał pokonać trudności autorskich i wydawniczych.

Nieudane przedsięwzięcie edytorskie Mickiewicza i Domeyki to zresztą jedna z nielicznych rys na obrazie zbiorowym dwóch filomatów. Były jednak inne, których przyczyn nie sposób zrozumieć. Oto za namową Poety Domeyko zaraz po przybyciu do La Sereny w Chile napisał piękny szkic pt. *Podróż z Paryża do Chile (od l lutego 1838 do 3 czerwca tegoż roku)*. Rękopis autor przygotował do druku. Wśród paryskich przyjaciół filomatów wzbudził zrozumiałe zainteresowanie. Opracowanie jednak ugrzęzło w papierach Poety i dopiero spadkobiercy skierowali go w 1865 r. do druku do krakowskiego "Czasu" [10].

W korespondencji przyjaciół rozdzielonych oceanem jest luka obejmująca lata 1845–1849. Wcześniejsze Mickiewicza listy są wręcz dramatyczne. Andrzej Towiański przecież przewidywał rychły powrót do kraju i Poeta w to wierzył, usilnie nakłaniając swego druha do natychmiastowego powrotu do Europy. Domeyko był ostrożny. Pozostał w Chile, nie mając zaufania do proroka przybyłego

[8] Mapę tę przedrukowała A. Chałubińska w książce *Ignacy Domeyko i jego wkład do geografii Polski*, Warszawa 1969.

[9] Tamże, s. 193–194.

[10] Tekst przedrukowała Elżbieta Helena Nieciowa w t. 2 Domeyki pamiętnika *Moje podróże* we Wrocławiu w 1963 r.

z Rosji. Mickiewicz obraził się. Po latach przerwy nawiązali z sobą ponowny kontakt korespondencyjny. Nie dostrzegamy w ich listach ciepła, które stanowiło istotny składnik wymiany myśli w latach poprzednich.

Mickiewicz i Domeyko — ludzie sobie bliscy i zarazem dalecy. Przez dziesięciolecia pomagali sobie wzajem. Różnili się nie tylko zakresem wykonywanych prac, ale i charakterami. Poeta do końca życia był wielkim improwizatorem, Domeyko — zwolennikiem pracy organicznej. We wspólnych poczynaniach niejednokrotnie uzupełniali się. Żałować należy, że ich największe dzieło o geografii i historii ziem polskich nie ujrzało światła dziennnego w pierwszej połowie XIX w. Był to bowiem koncepcyjny ewenement w tych czasach. Dokumentował ponadto poczynania Wielkiej Emigracji, która starała się pracami pisarskimi szerzyć wiedzę o zniewolonym kraju.

Мікалай Гайба *(Навагрудак, Беларусь)*

ВОБРАЗ РАДЗІМЫ Ў ПЕРАПІСЦЫ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Адам Міцкевіч пакінуў Навагрудчыну ва ўзросце 24 гадоў. Пакінуў вымушана і, як аказалася, назаўсёды. Спачатку гэта было звязана з яго асабістай драмай — смерцю маці і замужжам каханай дзяўчыны, а пасля — у сувязі з высылкай яго ў цэнтральныя губерні Расіі за ўдзел у Таварыстве філаматаў. Але куды б потым не закінуў яго жыццёвы лёс, душа яго назаўжды засталася сярод людзей і вобразаў "зямлі Навагрудскай — роднага краю". Радзіма давала яму сілы і натхненне як для паэтычнай творчасці, так і грамадскай дзейнасці. "Будзь заўсёды ўпэўнены, — пісаў Міцкевіч брату Францішку ў 1847 г., — што яна [дзейнасць. — *М. Г.*] бярэ пачатак з той глебы, на якой мы гадаваліся ў бацькоўскім доме" [1].

1821 г., калі ўжо не было ў жывых бацькоў, а Марыля Верашчака выйшла замуж, стаў для паэта пераломным ва ўспрыняцці ім сваёй Навагрудчыны. "Я застаўся адзін, — пісаў ён А. Петрашкевічу ў лютым 1821 г. — Ніштo мяне асабліва [з домам. — *М. Г.*] не звязвае. Невялікая дапамога братам, а ва ўсім астатнім я адзін" [2]. "Што для мяне Навагрудак, акрамя успамінаў? — разважае Міцкевіч у лісце да Я. Чачота ад 23 мая 1821 г. — Часта пытаюся ў сябе, дзе ўласна мая радзіма — бо Коўна лічу прытулкам — і не знаходжу адказу. Увогуле, не ведаю, ці ехаць у Навагрудак, і не паехаў бы, каб не браты, з якімі павінен убачыцца. Вільня стала цяпер для нас нейкім агульным домам, але ці надоўга? Ужо паціху разыходзімся. Дой-

[1] Mickiewicz A. Dzieła. Warszawa, 1955. T. 16. S. 110.
[2] Мицкевич А. Собр. соч.: В 5 т. М., 1954. Т. 5. С. 321.
[3] Korespondencja filomatow (1817–1823). Warszawa, 1989. S. 237.

дзе да таго, што ўсе мясціны стануць абыякавымі, усюды будзе мне добра, або — што аднолькава — нідзе не будзе” [3]. А ў лістападзе 1822 г. піша Ф. Малеўскаму, што ўжо “Коўна становіцца для мяне домам, Вільня — месцам, куды еду ў госці, Навагрудак — заграніцай” [4].

Але калі сам А. Міцкевіч апынуўся за граніцай, за межамі роднага краю, толькі тады, бадай што, прыйшло да яго ў поўнай меры разуменне і адчуванне радзімы. Праявілася гэта і ў заклапочанасці лёсам сваіх родных братоў, і ў перажываннях ад тых падзей, што адбываліся ў яго родных краях, і ў яго актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасці, накіраванай на вызваленне Айчыны.

Пад словазлучэннем “вобраз радзімы” я маю на ўвазе Навагрудчыну, “Літву” часоў А. Міцкевіча. Літвой, у больш шырокім сэнсе, называлі да канца XVIII ст. тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Аднак, як гаварыў А. Міцкевіч у сваіх парыжскіх лекцыях у Калеж дэ Франс, “краіна, якая займае вялікую прастору паміж Дняпром, Чорным морам, Бугам і Нёманам… даўно згубіла агульную назву…” [5]. У XIX ст. гэтая тэрыторыя складалася з розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў, што добра разумеў і Адам Міцкевіч. Так, у адным з лістоў з Коўна, запрасіўшы да сябе сяброў, піша, што тут недалёка граніца з Польшчай. А ў лісце да І. Дамейкі ад 7 студзеня 1839 г. паэт паведамляе, што “Янэк [Чачот] вярнуўся на *Беларусь*” [на Лепельшчыну], што “Багдан [Залескі] цяпер у смутку, бо ганенні закранулі яго родных *на Украіне*”; там жа: “…пасылаю табе ліст *з Літвы*, дзе знойдзеш сумную вестку…” (выдзелена ўсюды мной. — *М. Г.)* [6].

Адам Міцкевіч нарадзіўся, кажучы тагачаснай тэрміналогіяй, у Літоўскай губерні Расійскай імперыі. З 1802 г. Літоўская губерня была падзелена на Віленскую і Гродзенскую. Менавіта гэтая тэрыторыя, зыходзячы з вышэйсказанага, была Літвой Міцкевіча, яго радзімай.

Не па сваёй волі апынуўшыся ў Цэнтральнай Расіі, А. Міцкевіч увесь час імкнуўся падтрымліваць кантакты з сябрамі, з роднымі братамі, якія засталіся на радзіме. З Масквы напісаў некалькі лістоў з просьбай дапамагчы ўладкаваць на працу брата Аляксандра, там жа сустрэўся з братам Ежым. Але дзеля вяртання на радзіму ён, як пазней прызнаўся брату Францішку, не спрабаваў зрабіць кар’еру ў Расіі.

Першую надзею на вяртанне даў усім выгнанцам Ануфрый Петрашкевіч. Яму, высланаму ў Маскву, дазволілі на некалькі месяцаў выехаць на беларуска-літоўскія землі. Паведамляючы аб гэтым у лісце да Т. Зана, А. Міцкевіч у захапленні піша: “Ведаеш, дзе будзе Ануфрый? Ён будзе ў

[4] Korespondencja filomatow (1817–1823). S. 280.

[5] Цыт. па кн.: Філаматы і філарэты / Уклад. К. Цвіркі. Мн., 1998. С. 121.

[6] Mickiewicz A. Dzieła. T. 15. S. 248–251.

Навагрудку, будзе ў Бальценіках, будзе ў Мерачы, будзе ў Шчучыне! … Добрае прадвесце” [7].

Аднак А. Міцкевічу ўдалося атрымаць толькі дазвол на выезд за мяжу. Там, пасля доўгіх гадоў расстання, сустрэўся ён ў 1831 г. з братам Францішкам, а пасля і з Ігнатам Дамейкам. Сутыкнуўшыся з цяжкасцямі ў эміграцыі, І. Дамейка і Ф. Міцкевіч выказалі намер вярнуцца на радзіму, на што А. Міцкевіч адказаў І. Дамейку: “Пасля столькіх гадоў вандраванняў я ўжо прызвычаіўся да цыганскага жыцця, аднак разумею, якім цяжкім яно можа быць для навічкоў. Але вярнуцца, бачыць, што там творыцца!” [8] Такую ж думку выказаў Адам і Францішку: “Гора, калі цябе прагоняць з Княства! Я ведаю, як непрыемна прывыкаць да блуканняў, але лепш па Германіі, чым па Сібіры” [9]. Адносна сябе ён у гэты ж час (пачатак 1830-х гг.) сказаў: “Я ніколі не вярнуся пад расійскі ўрад. Ніколі, ніколі не меў такога намеру” [10].

Францішак Міцкевіч застаўся жыць на Пазнаньшчыне, а Адам у жніўні 1832 г. пераехаў у Парыж. Перапіска паміж імі стала для паэта адным з тых сапраўдных задавальненняў, якое дапамагала яму пераадолець цяжкасці жыцця. З братам Аляксандрам сувязь то перапынялася, то аднаўлялася. Аднак з лістоў ад сяброў Адам ведаў, што Аляксандр ажаніўся з дачкой Францішка Тараевіча, што часам бывае ў Навагрудку і наведвае Завоссе, што, выйшаўшы на пенсію, вярнуўся ў Навагрудскі край і купіў там маёнтак. Пра навіны Адам заўжды пісаў Францішку. Пра брата Ежага Адаму паведамілі ў 1836 г., што той “ажаніўся, меў дзяцей і служыць у Чарнаморскім флоце” [11]. Больш дакладна пра яго Адам нічога не ведаў. Ва ўсякім выпадку, у лісце да Францішка ў 1847 г. ён пісаў аб Ежым, што не мае вестак, ці той яшчэ жывы [12] (Ежы памёр у 1839 г.).

Увогуле, пры першай жа магчымасці А. Міцкевіч імкнуўся даведацца пра жыццё на радзіме, непакоіўся, калі адтуль доўга не было ніякіх звестак. Яго ўсё часцей і часцей апаноўвала туга па родных мясцінах і звычайнаму асяроддзю. “Зразумей, што калі я мару пра Літву, — пісаў ён Дамейку, — дык асабліва думаю толькі пра некалькі мясцін і пра некалькі асоб, а да іх я ніколі не змяню сваіх пачуццяў… Калі б я калі-небудзь і вярнуўся ў Літву, дык не захацеў бы завесці ніводнага новага знаёмства і быў бы задаволены сам ведаеш якім вузкім колам” [13]. У лісце да І. Дамейкі з Лазаны (Швейцарыя), дзе А. Міцкевіч выкладаў лацінскую літаратуру ў мясцовым

[7] Мицкевич А. Собр. соч. Т. 5. С. 400.
[8] Тамсама. С. 455.
[9] Тамсама. С. 463.
[10] Mickiewicz A. Dzieła. T. 15. S. 28.
[11] Мицкевич А. Собр. соч. Т. 5. С. 661.
[12] Mickiewicz A. Dzieła. T. 16. S. 110.
[13] Мицкевич А. Собр. соч. Т. 5. С. 77.

універсітэце, ён прызнаўся, што “часта находзіць сум па Літве” і што ўвесь час бачыць “у сне Навагрудак і Туганавічы”. Хаця жыў А. Міцкевіч у Лазане, як сам адзначаў, даволі добра, меў высокааплатную працу, кватэру з відам на Жэнеўскае возера і Альпы, але ўсё ж заўважаў, што яму “мілей нашы літоўскія пейзажы, дзе можна прылегчы і паспаць, чым гэтая ззяючая ў далечыні мішура, якая стамляе вочы”, “нам было б тут добра, калі б мы маглі прывыкнуць да чужой зямлі. Але дарма, мы, як цыганы, усюды госці” [14]. А калі А. Міцкевічу прапанавалі працу прафесара у Калеж дэ Франс, ён ў лісце да брата Францішка заўважыў, што яму, “можа, удасца ўладкавацца прафесарам без натуралізацыі, бо неяк шкада перастаць быць ліцвінам ды і няміла ператварацца ў француза” [15].

Бадай галоўнай духоўнай сувяззю, якая звязвала А. Міцкевіча з родным краем, было адчуванне еднасці са сваімі братамі. “Я часта цешуся, думаючы пра тое, што мы браты, хаця так мала кантактуем, але ўпэўнены адзін у адным… Гэта рэдкая радасць на зямлі — ва ўсякім выпадку, хоць душой быць у згодзе, калі ўжо нічым на зямлі дапамагчы адзін аднаму мы не можам,” — пісаў Адам Францішку ў 1847 г. У гэтым жа лісце ён гаворыць, што яго дзеці цудоўна падобны “з нашай сям’ёю, гэта значыць, са мною і з вамі, маімі братамі. Марыя характарам і нават тварам нагадвае цябе. Уладзь, другі, увесь пайшоў у мяне, усе гэта ў ім заўважаюць. Галенка, трэцяя, выліты Аляксандр, нават бландзінка і такая, як ён, круглая, і гаспадарлівая, і акуратная, а самы малодшы нагадвае мне Антося, якога добра памятаю. І што яшчэ больш дзіўна, чацвёрты па чарзе, Алесь, і па характары і па настроі копія Ежага” [16].

Успаміны пра радзіму, пра родных былі для Адама не толькі настальгічнымі разважаннямі, але вялі яго да актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасці. Ён быў упэўнены, што жыве ў часы вялікай перабудовы еўрапейскага парадку: “Калі прыйдзе бура: праз год ці праз сотню год, для мяне гэтае пытанне не існуе, чую, што яна мусіць прыйсці”, — сцвярджаў А. Міцкевіч. Брату Францішку ў 1844 г. ён напісаў: “Спадзеючыся, што мы яшчэ ўбачымся з табой на зямлі і ў лепшыя часы, і быў бы рады, калі б і ты пранікся верай у тое, што мы яшчэ ўбачым Літву, ужо нашу Літву, а не Маскоўскую. Гэтым я жыву, дзеля гэтага жыву, і дасць Бог, дачакаюся гэтага” [17]. Але вярнуцца ў тагачасную Расію, дзе “нашых сістэматычна прыгнятаюць”, ён не мог. З другога боку, жыццё А. Міцкевіча ў Парыжы было складаным у адносінах і з французамі, і з суайчыннікамі, “якія тут сістэматычна валяюць дурня”. Чаму так сталася? Адказ на гэта можна знайсці зноў жа ў лістах

[14] Мицкевич А. Собр. соч. Т. 5. С. 501.
[15] Mickiewicz A. Dzieła. T. 15. S. 391.
[16] Тамсама. С. 111.
[17] Тамсама. С. 624.

да брата Францішка, якому Адам давяраў свае планы і сумненні, напэўна, больш, чым іншым. У лісце ад 9 мая 1844 г. ён адзначае, што “мог бы з выгодамі пагразнуць у зямным, бо тутэйшае міністэрства дало б мне шмат большую плату і вызваліла б ад службы, каб толькі я згадзіўся перастаць служыць справе. Я мог бы ўжо дорага прадацца. Але гэтае самае сумленне, якое мне не дазволіла шукаць кар’еры ў Расіі, а пасля ў Лазане, не дае мне спыніцца на дарозе” [18]. Гэты ж матыў гучыць і ў пазнейшым лісце да Францішка (студзень 1847 г.): “Мае адносіны з тутэйшым урадам ускладніліся. Мне аказалі шчырую прыязнасць і давалі мноства даброт, каб толькі я стаў чалавекам разважлівым, г. зн. пачаў жыць толькі для сябе самога. Гэтак было са мной раней, у Расіі. Я і там мог заняць бліскучае становішча, калі б адмовіўся ад таго, што нашу ў душы, што рухае мной, насычае мяне і задавальняе. І я па-ранейшаму іду за маёй зоркай і спадзяюся, што заўтра яна будзе больш яркай”. І далей заўважае: “Мне трэба будзе яшчэ шмат зрабіць, і калі Бог прадоўжыць маё жыццё, ты яшчэ не аднойчы, дарагі брат, будзеш, магчыма, здзіўлены маёй дзейнасцю ці трывожыцца за мяне” [19].

І сапраўды, як толькі ў 1848 г. пачаліся масавыя рэвалюцыйныя падзеі, вядомыя пад назвай “вясны народаў”, А. Міцкевіч разгарнуў энергічную дзейнасць. Спачатку стварыў у Італіі легіён з эмігранцкай моладзі для барацьбы з Аўстра-Венгерскай манархіяй, пазней кіраваў Міжнародным рэвалюцыйным трыбуналам і газетай на французскай мове “La tribune des peuples”. Апошнім актам яго палітычнай дзейнасці была арганізацыя эмігранцкіх легіёнаў у Турцыі ў час руска-турэцкай вайны.

За месяц да сваём смерці Адам Міцкевіч пісаў з Канстанцінопаля, што некаторыя мясціны гэтага горада здаліся яму “цалкам падобнымі на вуліцы майго роднага гарадка ў Літве” [20], маючы на ўвазе Навагрудак. Яму ўсё верылася, што з кожным годам яго шлях на радзіму становіцца карацейшым.

Марцэлі Косман *(Познань, Польшча)*

ПРАЎДА І ЛЕГЕНДА ПРА САПЕРНІКА ПАЭТА
ВАЎЖЫНЕЦ ПУТКАМЕР І АДАМ МІЦКЕВІЧ

Колькі страціла б паэзія, каб не было юнацкага суму Міцкевіча аб няўдалым каханні з Марыляй. Вобраз каханай узнікаў з розных нагод — і пры нагодзе няшчасце сэрца прымалася нашчадкамі абсалютна за чыстую манету. Больш таго, у розныя часы шмат даставалася з гэтай нагоды саперні-

[18] Mickiewicz A. Dzieła. T. 15. S. 624.
[19] Тамсама. С. 109–110.
[20] Тамсама. С. 617.

ку, які быццам бы забраў дзяўчыну ў паэта. А паколькі сапернік меў графскі тытул (хоць ім і не карыстаўся), з'явілася басня пра беднага і таленавітага хлопца, багатага пана і тую, якая выбрала багацце, адхіліўшы сапраўднае пачуццё.

Такая версія знаходзіла дасканалую глебу ў пасляваенны перыяд у сувязі з ідэяй класавай барацьбы і яўнымі тэндэнцыямі да мінімізацыі ролі асобы і адначасова ідэалізацыі тых, хто быў прыняты ў новы нацыянальны Пантэон. Міцкевіч меў шчасце трапіць туды. Сапраўдныя даследчыкі былі, аднак, стрыманымі. Прыкладам няхай паслужыць біяграфія, якая шматразова пісалася нанава і якая належыць пяру Мечыслава Яструна ("Міцкевіч"). Яна была прадстаўлена да выдання восенню 1948 г. і можа быць залічана да таго перыяду, калі згаданыя вышэй тэндэнцыі цалкам яшчэ не праявілі сябе.

Заставалася яшчэ адна акалічнасць, што не дазваляла шырэй раскруціць гэтую байку, — хоць гэтая з'ява была выразна акцэнтавана толькі пазней, на новым этапе развіцця польскага гуманізму, вольнага ад вульгарызацыі і спрашчэнняў. Рамантычная душа патрабавала вялікага платанічнага кахання, якое меў не толькі Міцкевіч, пачуцця, аддаленага ад спальні, у якой істота з крыві і касцей хутка нібыта магла пацешыцца ў Коўне. Думаю тут пра прывабную пані Кавальскую, жонку мясцовага медыка.

Што такое, дарэчы, пакуты стваральніка балад і рамансаў у параўнанні з морам чарніл, якія доўгі час выліваў Зігмунд Красінскі у шматлікіх і аб'ёмных лістах да каханай Дэльфіны з Камароў Патоцкай. Вяртаючыся да праблемы, можна коратка сказаць: шчаслівы сапернік паэта нічым не заслужыў непрыязных адносін нашчадкаў, больш таго, ён належыць да цікавых, хоць і не спапулярызаваных постацей у гісторыі Віленшчыны першай паловы XIX ст. З удзячнасцю гаварылі пра яго сучаснікі, не сустракаем таксама негатыўных сведчанняў і аб тым, што ён, паводле пазнейшых чутак, быў багатым арыстакратам, эгаістам, нячулым да шчасця іншых, і без згрызотаў сумлення разбіў цудоўнае будучае закаханых.

Путкамеры належалі да старой інфлянцкай шляхты. Шляхам шлюбаў, а яны заключаліся, наколькі гэта было магчыма, пераважна ў асяроддзі кальвінскіх аднаверцаў, трапілі яны ў ваколіцы Вільні. Ваўжынец (папулярнае імя ў сям'і), з 1709 г. тытулаваны інфлянцкім стольнікам, ажаніўся з Даротай Шрэтэр і меў з ёю чацвёра дзяцей. Адным з найбольш старых помнікаў на евангельска-рэфарматарскіх могілках у былой сталіцы Вялікага Княства Літоўскага была так званая шрэтэраўская капліца.

Ваўжынец Путкамер таксама быў тытулаваны ў 1755 г. паручнікам Караля Ягамосці, а праз сем гадоў — генерал-ад'ютантам. Узяўшы шлюб у Асташыне з Даротай з Цадроўскіх, ахрысціў 7 кастрычніка 1762 г. свайго сына Аляксандра Ежага ў Бальценіках Эйшышскага павета. Аляксандр у

1792–1798 гг. падпісваўся каралеўскім камергерам, аднак да тытулаў ставіўся раўнадушна, гэта відаць, як мы зазначалі раней, з таго, што сваё графскае званне не афішыраваў. Ад шлюбу з Каралінай Стрыенскай (таксама кальвінкай) нарадзілася чацвёра дзяцей: Яцак Багуслаў (у 1792 г.), Ваўжынец Станіслаў (у 1794 г.), Дарота Катарына (у 1797 г.) і Іаанна Канстанцыя (у 1798 г.).

Будучы сапернік Міцкевіча быў, такім чынам, старэйшы ад яго амаль на чатыры гады (дакладней — чатыры гады і чатыры месяцы), што ў час сватаўства да Марылі не мела ніякага значэння, а калі мела, то толькі ў карысць Ваўжынца, якому тады было дваццаць шэсць гадоў, у той час як Міцкевічу толькі дваццаць два.

Будучы "перахопнік Марылі" (так яго назвалі сучаснікі), нарадзіўся 14 жніўня, а ахрышчаны быў 26 таго ж месяца ў Бальценіках, у сядзібе генерала Путкамера. Кальвінісцкай царквы там не было, прыхільнікаў гэтай веры з кожным годам станавілася менш, хоць яна мела выдатнае рэфармацкае мінулае. Сярод гэтых прыхільнікаў пераважалі шляхецкія сем'і, нашчадкі былых пратэстантаў. Толькі на Жмудзі, дзе яна была ўведзена яшчэ ў язычніцкі перыяд у палове XVI ст., сустракалася больш сялянскіх супольнасцей з гэтай верай. Усіх іх аб'ядноўваў Евангелісцка-Рэфарматарскі Сінод у Вільні (вярхоўная ўлада), а арганізацыйныя парафіі ўваходзілі ў склад акруг — адпаведнікаў каталіцкіх дыяцэзій, хоць на практыцы іх хутчэй па памеру можна параўноўваць з дэканатамі [1].

У 1807 г. Путкамер быў аддадзены ў вядомую школу ў Слуцку. Існавала там ужо больш за сто гадоў кальвінская гімназія, у якой тады вучылася каталіцкая моладзь з прычыны высокага ўзроўню навучання. Ён заставаўся пад асабістай апекай рэктара кс. Міхала Ваноўскага. Пасля заканчэння гімназіі ў 1810 г. шаснаццацігадовы юнак накіраваўся ў Імператарскі публічны універсітэт у Вільні, у цэнтр, які пачынаў якраз у гэты момант аказваць уплыў на ўсю былую, фармальна ўжо падзеленую польска-літоўскую Рэч Паспалітую, а фактычна па-ранейшаму існуючую ў свядомасці пакалення, якое жыло да і пасля 1795 г. Запісаўся ён на фізіка-матэматычны факультэт, адзін з чатырох ва універсітэце. Скончыў яго ў 1812 г. са ступенню кандыдата філасофіі [2].

"У тыя часы" малады Путкамер не застаўся ў баку ад вялікіх падзей, ад надзеі вярнуць поўную незалежнасць. Зазначым, што кальвінісцкая школа дала яму значна лепшую падрыхтоўку для атрымання вышэйшай адукацыі і жыцця, чым Адаму, які атрымаў адукацыю ў навагрудскіх даміні-

[1] Kosman M. Litewska Jednota Ewangelicko-Reformowana od poiowy XVII w. do 1939 r. Opole, 1986. S. 58 in.

[2] Nowak Z. J. Puttkamer Wawrzyniec Stanisław Jan (1794–1850) // Polski Słownik Biograficzny. T. 29. S. 475 inn.

канцаў. Трэба, дарэчы, прызнаць, што апошні выхоўваўся ў больш складаных матэрыяльных умовах. Калі вялікая армія французскага імператара ўваходзіла ў Літву, ён быў яшчэ амаль дзіцем (меў трынаццаць з паловай гадоў), і менавіта такім назіраў паўсюдны энтузіязм. Ваўжынец жа быў юнаком, уступаў у дзейснае жыццё — таму завербаваўся як радавы салдат у войска, дайшоў да Масквы, удзельнічаў у пазнейшых бітвах (Будзішын, Лютцэн), аж да бітвы народаў (Лейпцыг), пакуль не трапіў у прускі палон. Належаў тады да палымяных прыхільнікаў "малога капрала". Калі намнога пазней (1840) рэшткі імператара ўрачыста перавозіліся з вострава Святой Алены ў касцёл Інвалідаў у Парыжы, сведкамі гэтай урачыстасці былі, між іншых, польскія эмігранты. Не адзін "напалеончык" з Польшчы ўсёй душой рваўся на берагі Сены, але часцей за ўсё іх мара не збывалася з-за адсутнасці грошай. Па гэтай жа прычыне не выбраўся туды і Путкамер.

Пасля вяртання з напалеонаўскай вайны вёў ён жыццё звычайнага памешчыка, але не замыкаўся ў цесным кругу гаспадарчых спраў, хоць ім і надаваў вялікае значэнне. Меў шырокія інтарэсы: заставаўся ў кантактах з філаматамі і філарэтамі, быў членам віленскага Таварыства шубраўцаў. Праяўляў актыўнасць на розных нівах, а ваеннае паражэнне навучыла яго таму, што трэба сістэматычна працаваць для айчыны іншым чынам.

Быў тады — у пачатку мінулага стагоддзя — перыяд плённага развіцця нацыянальнай культуры; шырока планаваліся даследаванні мінулага Польшчы і папулярызацыя ведаў аб тым перыядзе. У гэты ж час ствараўся новы пантэон, у які побач з ранейшымі постацямі (пераважна ўладарамі, а таксама славутымі вайскоўцамі, такімі, як Займойскі, Чарнецкі, Жулкеўскі, Хадкевіч) увайшлі новыя героі. Побач з грабніцамі манархаў на Вавелі знайшлі сабе месца князь Юзаф і Тадэвуш Касцюшка (вёўся старанны адбор, да прыкладу, кракаўскія ўлады негатыўна ставіліся да такіх праектаў, як пахаванне ў падзямеллях катэдры Яна Генрыка Дамброўскага) — менавіта ў гонар Касцюшкі наш граф арганізаваў у 1819 г., пасля атрымання дазволу ад Аляксандра I, урачыстае жалобнае набажэнства ў Навагрудку, а пры катафалку прачытаў элегію, якую, здаецца, напісаў сам.

Путкамер валодаў пяром не толькі як аўтар сацыяльных праектаў (быў адхілены, як вельмі радыкальны, праект ліквідацыі прыгонніцтва, перш за ўсё ва ўладаннях Евангелісцка-Рэфармацкага Сінода), а пра яго адкрытасць сведчыць той факт, што гарачы кальвініст арганізаваў патрыятычна-рэлігійную цырымонію ў мясцовых дамініканцаў. Кіраваўся розумам: мэтай было аб'яднанне ўсіх палякаў, што схілялі галовы перад Касцюшкам, ні для кога не было таямніцай тое, што пераважная большасць шляхты — католікі, па-другое, дзе ж можна было знайсці такі прадстаўнічы будынак для правядзення ўрачыстасці?!

Будучы павятовы лідскі маршалак не раздумваў, калі выбар сэрца спыніўся не на прадстаўніцы сваёй веры (кальвіністак знайсці было ўсё складаней), а на прыгожай маладой суседцы з каталіцкай сям'і Верашчакаў. Яны жылі ў Туганавічах, ён нядаўна пачаў гаспадарыць у суседнім, атрыманым ад бацькі, Уніхаве. Мы не ведаем ні аднаго сапраўднага канкурэнта на руку Марылі, бо ў такой ролі выступіў вельмі паспешліва, і яго прынялі. Аднак трэба яшчэ адзначыць яго талент, працавітасць і лагодны характар. У гэтым сэнсе ніхто з нядобразычліўцаў не выказаўся крытычна аб ім. Маўчалі таксама і аб тым, што датычылася знешнасці, а несумненна, што фантазія пайшла б далёка, каб існавалі для гэтага хоць бы нязначныя падставы.

У гэты ж час, у 1820 г., на гарызонце з'яўляецца паэт, якога прывабіла ў Туганавічы цікавае асяроддзе (у маладых Верашчакаў часта збіралася моладзь). Казімеж Выка ў "Польскім біяграфічным слоўніку" напісаў коратка: "Узаемнае каханне, галоўнае ў жыцці паэта, не магло закончыцца шлюбам па прычыне рознага маёмаснага і сацыяльнага стану" [3]. Аўтары кніжных біяграфій не былі літасцівыя ў падрабязнасцях, прадстаўляючы рамантычныя адносіны ў больш шырокім і празаічным кантэксце. Цяжэй за ўсё цяпер было б растлумачыць узаемнасць пачуццяў, хоць адмаўляць іх як кароткачасовыя няма падстаў, бо дзяўчына не пратэставала. А версіі пра яе нежаданне ў адносінах да Ваўжынца могуць быць плодам фантазій пазнейшага перыяду і вынікам уплыву легенды Вешчуна на шляхцянку, якая праводзіла жыццё за літоўскай агароджай, у той час як ён знаходзіўся ў Парыжы. На адлегласці жыццё Адама здавалася не толькі цікавым (бо яно такім і было!), але і лёгкім, пазбаўленым клопатаў. У кожным разе цяжка заставацца ў сферы меркаванняў, таму вернемся да канкрэтыкі.

Марылі [4] і Адаму было прыемна бавіць час разам — можам прызнаць хаця б такое. І гэта не было незаўважаным акружэннем. Дастаткова таго, што Ваўжынец і Міцкевіч па-сяброўску зразумелі адзін аднаго. Пасля сур'ёзнай размовы, гаворачы сённяшняй тэрміналогіяй, нечаканы сапернік згадзіўся добраахвотна пакінуць поле бітвы. Было гэта, як запісаў Антоній Эдвард Адынец, у жніўні 1820 г. Дзеянне разгортвалася хутка. Рэакцыя Путкамера была станоўчай і маланкавай, прычым тактоўнай. Усё гэта не спыніла візіты Міцкевіча ў Туганавічы. Дыскусіі за сталом вяліся гарачыя, калі, напрыклад, Тамаш Зан "абразліва бэсціў палякаў". Міцкевіч павінен быў мець нядрэнны настрой, паколькі 16 ці 28 жніўня (розніца вынікае з-за таго, што на захадзе і перад падзелам Рэчы Паспалітай ужываўся грыгарыянскі каляндар, а ў Расіі — юліянскі) пісаў да "Архі-Тамаша" з Туганавіч: "Чакаюць тут цябе Верашчакі, В. Путкамер, усе знаёмыя, і нават в. суддзя [па-

[3] Wyka K. Mickiewicz Adam Bernard // PSB. T. 20. S. 695.

[4] Гл.: Nowak Z. J. Puttkamerowa z Wereszczaków Marianna Ewa (1799–1863) // PSB. T. 29. S. 479–482.

межны навагрудскі Юзаф — *М. К.*] Мітарноўскі, які павінен быў паехаць яшчэ да абеду, спецыяльна застаўся дзеля цябе і ячменных круп". Пад запрашэннем падпісаліся пан Ваўжынец і Юзаф Верашчака.

2 (14) лютага 1821 г. у Туганавічах бралі шлюб Марыя Верашчака і Ваўжынец Путкамер. Няма звестак пра тую падзею, аднак можна дапусціць, што цырымонію вёў каталіцкі ксёндз. Звычайна пры розных веравызнаннях у сям'і сыны павінны былі выхоўвацца ў бацькавай веры, дочкі ж — у матчынай. Пра іх унука ведаем, што насіў таксама імя Ваўжынец і быў актыўным дзеячам "Яднання", ажаніўся з Зоф'яй Кяневічавай у кляштары візітак у Варшаве. Мы ўдзячныя за гэту падрабязнасць іх дачцы Яніне, якая пазней стала Жултоўскай і якая ў пачатку сваіх досыць падрабязных успамінаў, прысвечаных канцу перыяду падзелаў і міжваеннаму перыяду, заўважыла: "На шчасце, я як дзяўчына была выхавана ў каталіцкім касцёле і ахрышчана ксяндзом з таго ж касцёла". Гэта адпавядала практыцы мяшаных шлюбаў. У перыяд нецярпімасці да іншых веравызнанняў часта даходзіла да гвалтоўных сцэн, такіх, напрыклад, як выкраданне дзяцей пратэстантаў (напр., дачкі-кальвіністкі па матцы) набожнымі манахамі і гвалтоўнае іх змяшчэнне ў кляштары. У XIX ст. такія пытанні вырашаліся больш гарманічна, без націску іншых сіл.

Пасля шлюбу адносіны паміж Путкамерамі (яны пражывалі цяпер у Бальценіках) і Міцкевічам былі нават сяброўскімі. Ён, калі знаходзіўся пад уздзеяннем Музы, вяртаўся да ўспамінаў, і тыя набывалі асабліва драматычныя формы, але гэта не перашкаджала шукаць уцехі ў жонкі ковенскага доктара (пра яе мы ўжо ўспаміналі). Марыя ж першыя шлюбныя гады жыла, як манашка. Але ці варта верыць тым звесткам, распаўсюджаным у пазнейшыя гады, калі паэт і ўсё, што было з ім звязана, стаў публічнай уласнасцю…

У Вільні ён сустрэўся некалькі разоў з абодвума (Марылі ў Туганавічах, у час наведвання Міхала Верашчакі, не застаў), з Ваўжынцам нават хацеў… страляцца на дуэлі. Напэўна, гэта было хутчэй плодам буйной фантазіі, чым сапраўдным намерам паэта ў адносінах да былога напалеонаўскага паручніка. У жніўні 1821 г. пані Путкамер і Міцкевіч разам хрысцілі ў парафіяльным касцёле ў Цырыне сына знаёмых Саковічаў.

Ад намеру страляцца Адам адмовіўся па прычыне сардэчнай гасціннасці Ваўжынца, да якога ён паехаў са сваім крывавым намерам. Памятаў таксама пра тое, каб паслаць абодвум у Бальценікі свае творы, а Зан інфармаваў аўтара, які знаходзіўся ў Коўне, у маі 1823 г.: "Ваўжынец так захапляўся другой часткай "Дзядоў", так хваліў, што аж мяне збянтэжыў; я ажно пачырванеў". Апошняя сустрэча мела месца ў кастрычніку 1823 г. у Вільні, куды Путкамеры прыбылі, каб развітацца з ад'язджаючымі ў Арэнбург філаматамі.

Шлюб Путкамераў доўжыўся няпоўных трыццаць гадоў, аж да смерці мужа ў 1850 г. Яны ўвесь гэты час цікавіліся справамі незалежнасці, аб чым сведчылі падзеі Лістападаўскага паўстання і пазнейшая канспірацыя. Блізкімі ім былі звесткі з далёкай Еўропы, асабліва тыя, якія маглі мець дачыненне да мінулага Польшчы. Ваўжынец быў добрым працаўніком. Усе цанілі яго арганізатарскія здольнасці. Іх заўважылі яшчэ ў час напалеонаўскай вайны, калі яму далі складанае заданне, звязанае з забеспячэннем войска. Афіцэрскае званне таксама аб нечым сведчыць. Блізкімі былі яму справы народа, прычым настолькі, што нядобразычліўцы называлі яго "сялянскім маршалкам" — з намёкам на яго тытул маршалка Лідскага павета.

Дбаў Путкамер пра свае не вельмі даходныя ўладанні, калі імі можна назваць уласнасць у Балценіках. Увогуле яго смелыя праекты, як, напрыклад, той, што датычыў вызвалення сялян, разбіваліся аб непрыхільнасць да гэтых ідэй кансерватыўна настроеных землеўласнікаў. Тое ж самае было са спробай адкрыць гарбарню і фабрыку па вытворчасці сукна ці стварэнне ў 1838 г. першага ў Літве прамысловага акцыянернага таварыства з марай пра цукровы завод. Тады не хапіла дастатковай колькасці акцыянераў. Яго можна назваць прапагандыстам перамен у вясковай гаспадарцы, якія вялі да капіталістычных адносін.

Быў ён братняй душой іншаму прыхільніку Напалеона, генералу Дэзідэрыю Хлапоўскаму з Вялікапольшчы, які, бачачы безнадзейнасць узброенай барацьбы (хоць ад яе да канца досыць працяглага свайго жыцця не адмаўляўся), замяніў шаблю на лямех, якім выдатна паслугоўваўся, накіроўваючы таксама энергію на прафесіянальную адукацыю суайчыннікаў. Жыў, аднак, у мясцовасці, чуйнай да перамен, у той час як Путкамеру давялося працаваць у зусім іншых, "крэсовых" (але ўсходніх), умовах.

На штогадовым пасяджэнні Сінода ў Вільні ў ліпені 1823 г. Аляксандр Путкамер прадставіў падрыхтаваны сынам пры ўзгадненні з іншымі кальвінісцкімі кіраўнікамі (Ваўжынец знаходзіўся ў той час у Бальценіках) праект адкрыцця ў Вільні друкарні пад эгідай "Яднання". Разам з запланаванай паперняй яна павінна была служыць развіццю культуры ў Літве, у тым ліку апецы над нацыянальнай мовай у Жмудзі згодна з патрабаваннямі тамтэйшай акругі. Прадстаўлены дакумент складаецца з дзвюх частак: першая датычыць мэты пачынання (сімптаматычным быў там выраз: "Смела сцвярджаю…, што чым больш клас сялян адукаваны, тым у большай ступені ведае ён пра неабходнасць паляпшэння свайго быту і паляпшае яго"), другая датычыцца практычных шляхоў яго рэалізацыі.

Аўтар праекта са звыклай для яго акуратнасцю паклапаціўся пра ўсе падрабязнасці, не абмінуўшы нічога. Але не патрапіў на адпаведны момант: перыяд лібералізму быў амаль у мінулым. Улады распачалі працэс філама-

таў. У 1824 г. зачыняецца адна кальвінская гімназія (у Кейданах), а супраць другой (школы ў Слуцку) высунулі цяжкія абвінавачванні, у сувязі з чым Сінод даручыў "саперніку Адама" ўключыцца менавіта ў гэтую далікатную справу. Путкамеры рэгулярна ўдзельнічалі ў гадавых ліпеньскіх пасяджэннях Сінода. Ваўжынец, "паручнік войск польскіх", кіраваў яго пасяджэннямі ў якасці дырэктара ў 1821, 1822, 1829 гг. У пазнейшы перыяд гэтае месца зойме сын Станіслаў, які, верны памяці свайго бацькі, быў аўтарам яго біяграфіі (1872, 1875, 1878, 1879). Пазней эстафету пяройме цёзка дзеда Ваўжынец — сінадальны дырэктар 1911, 1912 гг.

Міцкевіч, знаходзячыся на выгнанні ў Парыжы, паглынаў ўсе весткі з айчыны. Не быў раўнадушным і да навін з Бальценік, як і да той, якую атрымаў на пачатку 1846 г. — пра тое, што Путкамерава з Верашчакаў, сястра пана Міхала, які пражываў у Плужынах, выдала старэйшую дачку Зоф'ю за нейкага Каліноўскага, інспектара з Вільні. У сваю чаргу да Марылі таксама даходзілі весткі пра тагачасны настрой Майстра. Так, 11 лістапада 1849 г. Тамаш Зан пісаў пасля сустрэчы ў Парыжы, што сябра юнацкіх гадоў стаў халодным, нават "суровым і здольным прынізіць". Дадаваў, што імяніны Адама "святкавалі мы ля Вострай брамы і ў сэрцы".

Прыхільнікі сенсацыі не гублялі магчымасці раздзьмухваць агонь вакол далейшых адносін паміж Міцкевічам і Верашчака. Ад яе імя Антоній Адынец запярэчыў выдумцы "Gazety Polskiej" 1860 г.

Ваўжынец Путкамер закончыў сваё жыццё на 56 годзе, раптоўна, ад кровезліцця. Памёр ён у Вільні 30 студзеня 1850 г. Адынец напісаў пра яго: "Чачот сапраўды гаварыў мне заўсёды, што гэта самы сумленны, самы прыемны чалавек і што ўсе яго ўчынкі, на думку Адама, характарызаваліся выключнай шляхетнасцю, якую сам Адам прызнаваў. Аднак ніколі ён не мог бы з чужых слоў дапусціць, калі б не пазнаёміўся асабіста, што той "перахопнік Марылі" быў сапраўды такі вельмі ідэальны".

Летапісец не сумняваўся. Эдвард Хлапіцкі, які ў той самы 1850 г. пазнаёміўся з Міцкевічам у Парыжы, пасля вяртання ў родныя мясціны наведаў Туганавічы і Бальценікі, дзе жыла Марыля, ужо год як удава. Пасля візіту застаўся вобраз адзінокай старой жанчыны, чужой у сваім акружэнні, якой засталіся толькі усё больш ідылічныя ўспаміны. Яна тады сказала: "Я яго па-ранейшаму бачу такім, якім ён быў раней, маладым, з чорнай чупрынай, з вачамі то блакітнымі, то зялёнымі, то зноў цёмнымі і бліскучымі…"

І тут няма нічога дзіўнага. Вобраз паэта "спыніўся" недзе на 1824 г., калі Міцкевічу было 26 гадоў. З Путкамерам жа яна пражыла доўгае жыццё, аж да яго восені. Не цешылася прыхільнасцю сярод сваіх дзяцей і больш далёкіх нашчадкаў — тут яна была падобная да твораў Адама. Нашчадкі лічылі, што не ўсё было ў парадку ва ўсёй справе. У кожным выпадку яе

культ у адносінах да паэта абражаў памяць любімага ўсімі Ваўжынца. З туганавіцкай тройцы (Anno Domini) 1820 г. была яна, напэўна, постаццю найменш шчасліваю.

Пераклад з польскай мовы Ганны Цішук

Леў Мірачыцкі *(Мінск)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ У СВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Гаварыць пра Міцкевіча —
гэта значыць гаварыць аб харастве,
праўдзе і справядлівасці…

Віктор Гюго

У гісторыі культуры беларускага, літоўскага і польскага народаў ёсць постаці, якія годна сімвалізуюць іх братэрства. Такой велічнай постаццю паўстае перад намі Адам Міцкевіч, вялікі паэт і патрыёт, палымяны барацьбіт за свабоду і шчасце ўсіх народаў.

Міцкевіч дарагі нам як самаадданы і паслядоўны змагар супраць нацыянальнага і сацыяльнага прыгнечання, за шчаслівую будучыню без сварак і войнаў, за роўнасць, самастойнасць і незалежнасць.

На гістарычнай Навагрудчыне, якая зачароўвае маляўнічымі ўзгоркамі і далінамі, ахутанымі сіняватай павалокай, легендамі і паданнямі працавітых людзей, быстрацечным Нёманам, казачнай Свіцяззю, помнікамі сівой мінуўшчыны, напеўнай і мяккай беларускай гаворкай, пачынаўся жыццёвы і творчы шлях паэта. Тут была калыска яго паэтычнага генія. Любы сэрцу край, які па традыцыі называў Літвой, услаўлены ім у неўміручых баладах, санетах і паэмах — жамчужынах паэзіі, што стварылі цэлую эпоху ў гісторыі польскай літаратуры.

На Беларусі А. Міцкевіч здабыў шырокую папулярнасць як вялікі паэт яшчэ пры жыцці. Яскравым сведчаннем гэтаму служыць народны варыянт ананімнай паэмы “Тарас на Парнасе”, дзе яго імя поруч з іншымі славутымі славянскімі літаратарамі вымаўляецца першым:

Народ ўсё быў тут не такоўскі:
Міцкевіч, Пушкін, Каханоўскі
І Гогаль шпарка каля нас
Прайшлі, як павы, на Парнас.

Міцкевіч дарагі нам, бо пісаў і гаварыў аб Беларусі, сваёй роднай старонцы. Гэта вельмі высока ацаніў яго сучаснік — Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (1808–1884), які адным з першых выступіў на ніве новага беларускага прыгожага пісьменства, хаця магчымасці друкавацца на роднай мове яшчэ

не было. Стаўшы беларускім прафесійным літаратарам, ён быў і першым перакладчыкам творчасці свайго вялікага земляка на беларускую мову. Папулярызатар-перакладчык ставіў перад сабою пачэсную задачу, да якой падыходзіў з пачуццём вялікай адказнасці. У сваім слове ад перакладчыка ён пісаў: “Аповесць Адама Міцкевіча пад назвай “Пан Тадэвуш”, якая так выдатна малюе характар, норавы і звычаі нашых літоўскіх гаспадароў у напалеонаўскія часы, ужо цяпер перакладаецца на рускую мову. Чаму б простаму народу, злучанаму сяброўскімі сувязямі з землеўласнікамі, чаму б тая наша засцянковая шляхта, бацькоў якой памёршы прарок намаляваў у такой высакароднай форме, а якая, жывучы дзесьці ў лясным зацішшы і не валодаючы магчымасцямі для асветы, найчасцей выказваецца ў хатнім ужытку народнай гаворкай, — чаму б, кажу, яна не магла азнаёміцца са звычаямі сваіх бацькоў? — Уласна гэтая заўвага натхніла мяне думкай перакласці “Пана Тадэвуша” на беларускую гаворку” [1].

Перакладчыку хацелася заахвоціць беларускага селяніна і бедную тутэйшую шляхту да навукі, каб гэтым самым садзейнічаць адраджэнню народнай культуры. Ён упэўнены, што для духоўнага развіцця ў краі патрэбна ахвярная праца ўсіх колаў грамадства. Таму шукае ў іх падтрымкі. Але з горыччу павінен быў прызнавацца, што яго творы на народным дыялекце, якія маюць на мэце заахвочванне да навучання, “не знайшлі дасюль, апрача некалькіх асоб, прыхільнікаў”. Будучы адданым перадавым ідэям часу, за якія змагаўся Міцкевіч, Дунін-Марцінкевіч верыць, што апранутага ім “у мужыцкую сярмягу” пана Тадэвуша народ прыме як падарунак свайго дудара “з больш гарачым сэрцам” [2].

Аднак выдаць друкаваную кніжку на беларускай гаворцы, якая знаходзілася пад забаронай, у той час не вельмі было проста. Перакладзеныя беларускім пісьменнікам першыя дзве быліцы (часткі) паэмы — “Гаспадарка” і “Замак” на грошы, якія ўдалося сабраць, з дазволу царскай цэнзуры былі надрукаваны ў Вільні ў 1859 г. асобнай кніжкай. Раптам цэнзура спахапілася і пастанавіла надрукаваную лацінкай кнігу на беларускай мове ў свет не выпускаць. Тыраж выдання быў спалены. Цудам ўцалела некалькі экземпляраў кнігі, адзін з якіх захоўваецца ў фондах бібліятэкі Ягелонскага універсітэта ў Кракаве.

Праца Дуніна-Марцінкевіча не прапала дарэмна. Яна знайшла сваіх паслядоўнікаў. Праз некаторы час паэму А. Міцкевіча “Пан Тадэвуш” узяўся перакладаць гісторык і пісьменнік Аляксандр Ельскі (1834–1916). Свой намер ён тлумачыў жаданнем вялікага земляка А. Міцкевіча, які марыў, каб яго кнігі ў роднай старонцы трапілі пад сялянскія стрэхі. У прадмове Ельскі

[1] Дунін-Марцінкевіч В. Творы. Мн., 1984. С. 428.
[2] Тамсама.

зазначаў, што пераклад ім ажыццяўляецца на чэсць беларускай літаратуры, беларускага народа, у гонар "роднай Міцкевічу Беларусі" [3]. Задумана было перакласці ўсю паэму "Пан Тадэвуш" і друкаваць яе часткамі, але пераклаў на беларускую мову толькі першы раздзел, які выдаў асобнай кніжкай у 1892 г. у Львове, даволі значным культурным цэнтры тагачаснай Аўстра-Венгерскай імперыі. Хоць гэты пераклад і не вызначаўся вартасцямі ў мастацкіх адносінах, аднак папулярызацыяй творчасці А. Міцкевіча ён адыграў дадатную ролю ў пашырэнні беларускага друкаванага слова. Імкненне А. Ельскага як перакладчыка, паводле яго азначэння, зводзілася да таго, каб давесці чытачу братэрскасць дзвюх суседніх моваў і народаў — беларускага і польскага, узбудзіць праз сваю мову замілаванне да ахвяраванага ў "беларускай шаце пана Тадэвуша", паэмы, у якой маляўніча ажывае мінулае роднага краю.

Творчасць А. Міцкевіча імкнуліся зрабіць здабыткам беларускай літаратуры ў XIX ст. і іншыя паэты, як, напрыклад, Арцём Вярыга-Дарэўскі (1816–1884). Па сведчанню сучаснікаў, ён пераклаў паэму "Конрад Валенрод", ды так "пекна, што сілай і высокім артыстызмам здзівіў бы самога Міцкевіча" [4]. На вялікі жаль, гэты пераклад так і не быў апублікаваны. Такі лёс напаткаў пераклады твораў Міцкевіча, зробленыя Адамам Гурыновічам (1869–1894) і Альгердам Абуховічам (1840–1898). І ўсё ж, паколькі царскія ўлады адмаўлялі беларускаму народу ў праве на развіццё нацыянальнай культуры і ўсяляк забаранялі беларускае друкаванае слова, дык іх пераклады распаўсюджваліся ў рукапісах і вусна.

Важнай падзеяй, якая спрыяла шырэйшай папулярызацыі жыцця і творчасці А. Міцкевіча на Беларусі ў XIX ст., стаў прыезд у Навагрудак вясною 1861 г. яго старэйшага сына Уладзіслава, які стала жыў ў Парыжы. З гэтай нагоды ў мясцовым гарадскім тэатры быў арганізаваны вечар, прысвечаны сустрэчы дарагога госця і памяці А. Міцкевіча. З прамовай на вечары выступіў выкладчык Навагрудскай гімназіі, вядомы мемуарыст, мастак і краязнаўца Эдвард Баніфацый Паўловіч (1825–1909). Падносячы дарагому госцю букет кветак ад імя прысутных, ён сказаў: "Па роднай зямлі, у старадаўняй сталіцы Літвы, сярод братоў-землякоў, у такой дарагой нам усім калысцы вялікага паэта, прымі, вандроўны брат, прымі, сын, замест бацькі гэты букет шчырых пачуццяў як ушанаванне, што належыць яму ад нас. Вазьмі яго і занясі на далёкую яго магілу. Сціплыя і блеклыя гэтыя кветкі, але пах іх сардэчны" [5]. Затым з кароткай прамовай выступіў тагачасны гаспадар Туганавіч Кастусь Туганоўскі, які адзначыў, што А. Міцкевіч стаў вельмі папулярным на сваёй радзіме, што светлую памяць аб ім свята захоў-

[3] Slavia Orientalis. T. 36. 1987. Nr 3–4. S. 786.

[4] Тамсама.

[5] Тамсама.

ваюць шмат мясцін у яго мілай і дарагой Літве, што тут ён заўжды будзе любімым паэтам. Госцю прамоўца ўручыў альбом з наступным надпісам: “Сыну бессмяротнага Адама — Уладзіславу Міцкевічу. Землякі — навагрудчане. На памяць пра наведванне яго роднай зямлі” [6]. У заключэнне ўрачыстай часткі вечара было наладжана аматарскае прадстаўленне з удзелам чэшскіх музыкантаў. Ставілася п’еса мясцовага аўтара “Ваколічнае”. З’яўленне на сцэне хлопцаў і дзяўчат у народных строях, якія прыгожа выконвалі беларускія песні і танцы, надта расчулілі госця.

У Навагрудку сыну паэта быў аказаны надзвычай цёплы прыём. Усюды, куды б ён ні прыходзіў, каб пазнаёміцца з памятнымі мясцінамі горада, госця сардэчна віталі. Гасцінна сустракалі яго таксама ў Завоссі, Туганавічах, Цырыне, Асташыне, Варончы, над берагамі Свіцязі, у Плужынах і Чамброве.

У родным краі вясною 1861 г. не заціхалі размовы членаў ініцыятыўнага камітэта па ўвекавечванню памяці славутага земляка, які ўзнік у 1858 г. Першачарговай задачай было — паклапаціцца аб пабудове ў Навагрудку помніка на гарадскім пляцы. Аднак паўстанне 1863 г. і рэпрэсіі царскіх улад перашкодзілі ажыццяўленню гэтых высакародных задум. Пазней, дзякуючы старанням дачкі паэта Марыі Гарэцкай, да стагоддзя з дня нараджэння паэта (1898) скульптар Уладзіслаў Сляшчыньскі зрабіў з чорнага шведскага граніту пастамент з бронзавым бюстам А. Міцкевіча. Гэтая памятка з Варшавы была прывезена ў Навагрудак, і мясцовыя жыхары патаемна ад царскіх улад умуравалі яе ў Дамініканскім касцёле св. Міхала, дзе калісьці вянчаліся маладыя Мікалай і Барбара, будучыя бацькі паэта. Знамянальна, што ўсе мерапрыемствы па ўшанаванню памяці А. Міцкевіча згуртоўвалі патрыётаў краю, асабліва з нагоды сотай гадавіны з дня нараджэння. Вось што пісаў Элізе Ажэшка вядомы беларускі паэт-дэмакрат Францішак Багушэвіч (1840–1900) у пісьме ад 18(30) кастрычніка 1897 г.: “У той час, калі справа пра помнік Адаму Міцкевічу ў Варшаве вырашана, у Вільні з’явілася думка ўшанаваць яго памяць і ўстанавіць мемарыяльную табліцу ў касцёле св. Яна… Вядома, размовы пра афіцыйны дазвол на збіранне ахвяраванняў і быць не магло, а табліца з бюстам будзе ўстаноўлена з дазволу касцельных улад, якія далі згоду сваякам паэта. Сэрцы добрых людзей, адданыя вяльможнай пані, напэўна, будуць прыхільныя і да гэтай справы: дык вось асмельваюся з пакорнай просьбай заклікаць знаёмых гродзенцаў, каб яны сабралі хоць бы невялікія ўзносы” [7].

Рэвалюцыйныя падзеі 1905–1907 гг. у Расіі з’явіліся паваротным этапам у гісторыі развіцця нацыянальна-вызваленчага і культурна-грамадскага руху беларускага народа. Яны прабудзілі да небывалай актыўнасці пра-

[6] Slavia Orientalis. T. 36. 1987. Nr 3–4. S. 786.

[7] Багушэвіч Ф. Творы. Мн., 1967. С. 197–198.

цоўныя масы, барацьбы за беларускія школы, кнігу, прэсу і тэатр, што спрыяла росту нацыянальнай і сацыяльнай свядомасці.

Для беларусаў мажлівасць мець сваю перыёдыку, каб выражаць пісьмова думкі на роднай мове, лічылася вялікай справай, бо адкрывала дарогу да шырэйшага праяўлення народных талентаў, актыўнага ўзбагачэння нацыянальнай духоўнасці. Паскаралася далучэнне і да здабыткаў сусветнай культуры. Шмат рабіла ў гэтым накірунку газета "Наша ніва", на старонках якой сістэматычна змяшчаліся пераклады з класічнай і тагачаснай прагрэсіўнай літаратуры іншых народаў. З асаблівай пашанай тут ставіліся да папулярызацыі жыцця і творчасці А. Міцкевіча.

Ушанаванне памяці вялікага паэта супала з часам імкнення беларусаў да самавызначэння сябе як нацыі, барацьбы перадавых сыноў і дачок за самастойны быт у еўрапейскім супольніцтве. З іх асяроддзя паступова вылучаліся рупліўцы, якія бралі прыклад з традыцый філамацкага руху. Так, студэнт Новааляксандраўскага інстытута сельскай гаспадаркі і лесаводства ў Пулавах Аркадзь Смоліч (1891–1938) паслядоўна стаў ажыццяўляць ідэі сваіх папярэднікаў-філаматаў, за якія змагаліся А. Міцкевіч і яго сябры. Іх шчыры паслядоўнік лічыў, што асноўныя перадумовы да новага ладу жыцця яму — аўтару будучай праграмы і ідэолагу беларускай Сацыял-дэмакратычнай партыі бачыліся "не ў дыктатуры пралетарыята, а ў дэмакратычным рэспубліканскім ладзе" [8]. Важнейшымі заваёвамі грамадства, на яго думку, павінны стаць: "…свабода слова, друку, сходаў, сумлення, незачэпнасць асобы". Дэмакратычныя ўмовы, па яго перакананню, "дадуць мажлівасць вызваліцца ад паднявольнае адміністрацыйнае апекі, што дасць магчымасць вольна і шырока развіваць свае прыродныя здольнасці, ухіліць нездаровыя дэмаралізуючыя ўплывы няволі і ўціску" [9]. Такі народ, з упэўненасцю даводзіў аўтар, "будзе выяўляць сваю найвышэйшую творчасць у нацыянальных формах. А значыць, і ўсялюдскі прагрэс, які ёсць творчасцю перадусім, будзе ісці нацыянальнымі шляхамі і прывядзець ніякім чынам не да асіміляцыі народаў, а толькі да вышэйшай формы іх згоднага жыцця" [10].

Грунтуючыся на філамацкіх традыцыях, А. Смоліч паспяхова развіў ідэі пра значэнне нацыянальнай школы і роднай мовы ва ўзгадаванні патрыятызму. Даводзячы гэтую вечную ісціну, ён сцвярджаў, што "асноваю нацыянальнай школы служыць родная мова — адзнака нацыі, яе духоўны твар. Мова збірае ў сабе ўсё, што мае дух нацыі. Няма ў нацыі нічога ні малога, ні вялікага, чаго б мова не ведала. Без мовы не адбываецца творчасць народа. Пакуль жыве мова, датуль жыве і народ, датуль і нацыянальнае выха-

[8] Смоліч А. Геаграфія Беларусі. Мн., 1993. С. 365.
[9] Ліс А. Пасляслоўе // Смоліч А. Геаграфія Беларусі. С. 365–371.
[10] Тамсама.

ванне будзе мець вялікую вагу і значэнне. Адабраць у народа мову — значыць спыніць яго развіццё, паставіць на дарозе культурнай творчасці глухую перагародку; эпоха заняпаду мовы ў жыцці нацыі — гэта эпоха заняпаду жыцця народа, спыненне працы яго розуму: гэта нацыянальная хвароба, самае горшае няшчасце, якое можа здарыцца ў цэлага народа” [11].

У гісторыю беларускай навукі і культуры А. Смоліч увайшоў як вялікі патрыёт Бацькаўшчыны, заслужаны яе працаўнік. Ён быў сярод тых, хто звярнуўся да спадчыны філаматаў і правільна вызначыў ролю і месца нараджэння вялікага песняра. У сваёй кнізе ён пісаў: “На паўдня ад Навагрудка ляжыць праслаўленае Міцкевічам воз. Свіцязь, а недалёка ад воз. Калдычэўскага месца ўрадзін яго — засценак Завоссе. У гэтым глухім закутку радзіўся найвялікшы з паэтаў Беларусі” [12]. Далей аўтар паведамляе, што: “Навагрудская зямля радзіла і выгадавала Адама Міцкевіча. За гэта ён яе праславіў на ўвесь свет, як не праслаўляў ніадзін паэта свае Бацькаўшчыны” [13].

Знаёмства са зборнікам “Адам Міцкевіч і Беларусь”, які падрыхтаваны і выдадзены Навукова-асветным цэнтрам імя Францыска Скарыны, Польскім інстытутам у Мінску і Беларускім фондам культуры ў 1997 г. радуе. Цешаць і матэрыялы, што змяшчаюцца ў рэспубліканскім друку.

Вікторыя Слівоўска *(Варшава)*

ЗАБАРОНЕНЫЯ ЧЫТАННІ

Сёння, калі мы так урачыста святкуем міцкевічаўскі юбілей, калі творчасць паэта цвёрда ўвайшла ў школьныя праграмы, калі яго драмы не сыходзяць са сцэн не толькі ў Польшчы, а спадчына творцы і шляхі яго жыцця сталі аб’ектам шматлікіх даследаванняў як на радзіме, так і за мяжой, цяжка сабе ўявіць, што толькі паўтара стагоддзя аддзяляе нас ад таго перыяду, калі яны праследаваліся, “забароненыя для чытання”, а за іх захоўванне і распаўсюджванне пагражалі самыя страшныя пакаранні.

Паражэнне Лістападаўскага паўстання, пазбаўленне палякаў нават сурагату ўласнай дзяржаўнасці, якім з’яўлялася Царства Польскае, укараненне над Віслай паскевічаўскай сістэмы і яшчэ больш суровых правілаў на ўскраінах былой Рэчы Паспалітай, — усё гэта выклікала невядомую раней з’яву патаемных чытанняў, хаджэння па руках, асабліва сярод маладых людзей, “забароненай літаратуры”, як друкаваных твораў, перш за ўсё эміга-

[11] Ліс А. Пасляслоўе // Смоліч А. Геаграфія Беларусі. С. 367.
[12] Тамсама. С. 251.
[13] Тамсама. С. 252.

цыйных, так і незвычайна багатай колькасцю і якасцю рукапіснай літаратуры. Барацьбу з памяццю пра нацыянальнае мінулае захопніцкія ўлады вялі з паступаючым нарастаннем, што супрацьпастаўлялася ўсялякім тайным і паўстанцкім рухам. Дарэчы, гэта былі ўзаемазвязаныя з'явы: тайныя гурткі і арганізацыі заўсёды займаліся дастаўкай, чытаннем, перапісваннем забароненай літаратуры. У сваю чаргу менавіта такая літаратура была тым магнітам, які масава прыцягваў моладзь у тайныя гурткі і таварыствы, аб чым дружна сведчаць як паказанні, дадзеныя следчым камісіям, так і ўспаміны.

Побач з помнікамі менавіта следча-судовыя матэрыялы з'яўляюцца істотнай крыніцай ведаў пра такую літаратуру: кожны раз у час вобыскаў знаходзілі "рэчавыя доказы" ў выглядзе кніг, сшыткаў з перапісанымі творамі, а ў напісаных уласнай рукой паказаннях прыводзіліся назвы перадаваных з рук у рукі "разбойніцкіх кніг", як іх часта называлі самі абвінавачаныя ў "чытацкіх злачынствах" (трапнае вызначэнне Марыі Яніён) [1]. Вядома, тое, што трапіла ў рукі "інквізітараў", было толькі вяршыняй айсберга. Аб гэтым пераканаўча сведчаць захаваныя ў розных аддзелах рукапісаў і архівах сшыткі паненак з прыстойных сем'яў, вучнёўскія сшыткі, у якіх знаходзім цэлыя падборкі пераважна паэтычных твораў, часта ў недакладнай версіі, розных варыянтах. Яшчэ Дора Кацнельсон [2] спрабавала сабраць рукапісную "міцкевічыяну", таму што сярод найбольш чытаных і нястомна перапісваных аўтараў Адам Міцкевіч несумненна амаль на працягу ўсяго XIX ст. трымаў пальму першынства, не гаворачы ўжо пра міжпаўстанцкі перыяд.

У другой чвэрці XIX ст. Міцкевіч лічыўся нядобранадзейным аўтарам і на тэрыторыях, забраных аўстрыйцамі, пра што часта забываюць, маючы перад вачыма перш за ўсё перыяд галіцкай аўтаноміі. Сярод 22 так званых "тайных выданняў Асалінэум" (за іх выданне ў Львове пасля працэсу, які доўжыўся ў 1834–1837, дырэктар Канстанцін Слатвіньскі, а таксама друкары былі абвінавачаны ў "дзяржаўнай здрадзе"), ажно тры выйшлі з-пад яго пяра: "Рэдут Ардона", "Да маці-полькі", а таксама "Кнігі польскага народа і польскага пілігрымства" [3]. Апошнія былі прызнаны аўстрыйскімі ўладамі творам "найбольш небяспечным" [4].

Да ліку "забароненых" таксама вельмі хутка далучылі творы, якія былі выдадзены з дазволу цэнзуры ў Пецярбургу, з "Конрадам Валенродам" на

---

[1] Janion M. Literatura i spisek // Stowarzyszenie Ludu Polskiego w Królestwie Polskim: Gustaw Ehrenberg i "świętokrzyżcy". Wrocław, 1978. S. 77–100.

[2] Сабраны Д.Кацнельсон велізарны матэрыял па-ранейшаму чакае апрацоўкі і выдання.

[3] Гл.: Wisłocki W. T. Tajne druki Zakładu Ossolińskich: W stulecie procesu o zdradę stanu. Lwów, 1935. S. 38–45.

[4] Тамсама. С. 39–40; параўн.: Sala M. Geschichte des polnischen Aufstandes vom Jahre 1846. Wien, 1867. S. 60; Borys W. Wyprawa J. Zaliwskiego i polskie organizacje spiskowe w Galicji w latach 1832–1835 // Społeczeństwo polskie i próby wznowienia walki zbrojnej w 1833 roku. Wrocław, 1984. S. 86.

чале. Забарона датычылася ўжо не толькі некаторых твораў паэта, але і яго імя.

Здзіўляе тое, што паэзія Міцкевіча бераўліва захоўвалася не толькі ў шляхецкіх дварах, знаходзілі яе хітра схаванай сярод кулінарных рэцэптаў, у бібліятэчках, купленых у складчыну, легальных і паўлегальных, у студэнтаў Кіеўскага [5], Маскоўскага [6] і Пецярбургскага [7] універсітэтаў, у вучняў Варшаўскіх юрыдычных курсаў, у дарожных куфрах, выпадкова забытых у гатэлях; яна даходзіла нават у далёкую Сібір, куды яе прывозілі з сабой ссыльныя, нягледзячы на кантроль і забарону, а затым дэкламавалі на агульных вечарынах, пісалі на вершы музыку і спявалі разам з іншымі "баладамі" [8].

Няма патрэбы нагадваць, што сасланыя ў розныя бакі царства філаматы і філарэты добра ведалі паэзію свайго сябра і калегі. Удзельнікі Лістападаўскага паўстання, якія былі ўключаны ў расійскае войска ці высланы на катаргу, насілі ў сваіх салдацкіх ранцах вершы паэта. Пра гэта даведаліся ў час следства па так званай справе "Омскай змовы" (1833–1837): у паперах галоўных абвінавачаных побач з патрыятычнай паэзіяй перыяду паўстання была знойдзена менавіта паэзія Міцкевіча: меў яе, напрыклад, Геранім Гольштайн [9], ведаў яе ксёндз Ян Серацінскі, які са здзіўленнем занатаваў у сваім дзённіку, што "зусім неспадзявана" ў школьнай бібліятэцы ў Омску, дзе ён працаваў настаўнікам (хоць павінен быў адбываць як пакаранне службу радавым) натрапіў на "твор Міцкевіча" [10]. Трэба дадаць, што ў многіх арыштаваных па "Омскай справе" знаходзілі паэзію Міцкевіча, у тым ліку "Оду да маладосці" [11]. І не толькі ў іх.

---

[5] Матэрыялы на дадзеную тэму знаходзяцца ў дакументах аб працэсе студэнтаў — членаў гуртка Уладзіслава Гардона (Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны ў Кіеве, (далей: ЦДГАУ), ф. 470, воп. 1, адз. зах. 28, 29, 31, 32, 58, 63, 64, 105, 108, 173–177, 188 і інш.

[6] Пра гэта пісаў Рамуальд Свяжбеньскі ў уласнаручных паказаннях (гл.: Wiosna Ludów w Królestwie Polskim: Organizacja 1848 roku. Wrocław, 1994. S. 223 і наст.), а таксама ва ўспамінах, напісаных ад трэцяй асобы (Sprzysiężenia pomiędzy rokiem 1839 i 1849 // Бібліятэка імя Асалінскіх у Вроцлаве, рук. 3204). Факт хаджэння сярод польскіх студэнтаў у Пецярбургу "Пана Тадэвуша", "Дзядоў", "Кніг пілігрымства", а таксама "Лекцый па славянскай літаратуры" пацвердзілі і іншыя выпускнікі, супраць якіх была ўзбуджана справа за змоўніцкую дзейнасць у Царстве Польскім.

[7] Гаварыў пра гэта, напр., Вінцэнт Давід, які чытаў творы Міцкевіча ў час вучобы ў Пецярбургу ў 1837 і наступных гадах (гл.: Rewolucyjna konspiracja w Królestwie Polskim w latach 1840–1845. Edward Dembowski. Wrocław, 1981. S. 292–293).

[8] Аўтарам музыкі да балады Міцкевіча "Свіцязянка" быў Адам Грос. Яна знайшлася ў выдадзеным праз шмат гадоў томе "Melodii daurskich" (1883).

[9] Społeczeństwo polskie i próby wznowienia walki zbrojnej w 1833 roku. Wrocław, 1984. S. 124.

[10] Тамсама. С. 552.

[11] Гл.: Janik M. Nieznana relacja o sprawie omskiej // Kwartalnik Historyczny. 1929. T. I. Z. 3. S. 350. У запісной кніжцы арыштаванага па той жа справе Антонія Кшыжаноўскага таксама знойдзена "Ода да маладосці" (гл: Djakow W., Nagajew A. Partyzantka Zaliwskiego i jej pogłosy (1832–1835). Warszawa, 1979. S. 163).

Філаматы і лістападаўскія паўстанцы мелі доступ да легальна выдадзеных твораў паэта. Паўстае пытанне: якім чынам іх здабывалі, калі яны ўжо былі забаронены? Па сведчаннях сучаснікаў, гэта не з'яўлялася вялікай цяжкасцю: яны перавозіліся праз мяжу, праз мытныя кардоны добра схаванымі (тут асаблівую ролю адыгрывалі вонкава легкадумныя дзяўчаты, якія не выклікалі падазрэнняў, і сур'ёзныя жанчыны [12]. Карысталіся таксама паслугамі яўрэяў-кантрабандыстаў. Творы паэта можна было купіць амаль у кожным большым горадзе, у давераных гандляроў кнігамі ў Маскве і Пецярбургу, у Крамянцы, Адэсе і Варшаве. Трэба памятаць, што продаж такога тавару быў вялікай рызыкай, хоць і прыносіў значны даход. Дзейнічалі так званыя перасыльныя пункты, якія ўтрымліваліся з патрыятычных пачуццяў: у Марыямпалі такім пунктам кіраваў ксёндз Кшыштаф Шварміцкі, у будучым ссыльны і шматгадовы пробашч у Іркуцку; у Мысловіцах — мадыстка Антаніна Лісоўская і інш. [13] Прыхільнік П. Сцягеннага Францішак Панточак пераслаў з Вроцлава, дзе нелегальна вывучаў фармацэўтыку, "Кнігі пілігрымства". Нічога ў гэтым не было б надзвычайнага, калі б яго бацька, Сымон Панточак, паважаны аптэкар у Кельцах, гэтыя прывезеныя сынам кантрабандным шляхам кнігі не даваў "чытаць іншым", што яму даказалі ў час следства [14]. Нелегальна ўвезеная літаратура — паэзія, проза, публіцыстыка тайна размнажалася. Адсюль такая вялікая колькасць розных копій, якія мы сёння знаходзім у розных месцах, пачынаючы ад бібліятэк і заканчваючы сямейнымі архівамі. Гэтыя творы вывучалі на памяць, каб потым зноў па памяці перапісваць у сшыткі, ствараючы розныя тэкставыя варыянты.

Якія ж творы Міцкевіча часцей за ўсё капіраваліся і чыталіся? Несумненна, на першым месцы тут была трэцяя частка "Дзядоў" і яе асобныя фрагменты [15]. Але да абавязковых для чытання таксама адносіліся і "Рэдут Ардона", і "Пан Тадэвуш" [16]. Яны хадзілі па ўсіх тайных гуртках увесь час.

---

[12] У Келецкім гуртку Кароля Багдашэўскага такім "перавозам" з Кракава займаліся яго сёстры Людвіка і Эмілія, а таксама цешча аднаго са змоўшчыкаў (гл.: Sliwowska W. Obieg wolnego słowa w zaborze rosyjskim w dobie międzypowstaniowej // Piśmiennictwo — systemy kontroli — obiegi alternatywne. Warszawa, 1992. S. 63–64; там жа гаворыцца пра іншыя пункты кантрабанды забароненай літаратуры).

[13] Гл.: Djakow W. A., Gałkowski Ŕ., Sliwowska W., Zajcew W. M. Uczestnicy ruchów wolnościowych w latach 1832–1855 (Królestwo Polskie): Przewodnik Biograficzny. Wrocław, 1990. S. 271, 437.

[14] Rewolucyjna konspiracja… S. 638.

[15] Ва ўсіх судова-следчых матэрыялах сустракаецца інфармацыя пра чытанне "IV тома твораў Міцкевіча", які змяшчаў менавіта гэтыя творы; гэты том быў знойдзены ў Антонія Валэцкага ў Агранамічным інстытуце ў Варшаве на Марымонце; многія з "святакрыжцаў" успамінаюць пра ўзаемнае выпазычванне гэтага тома (гл.: Stowarzyszenie Ludu Polskiego. S. 294 і інш.).

[16] Фрагменты "Пана Тадэвуша" многія з маладых людзей ведалі на памяць (гл. паказанні В. Давіда: Rewolucyjna konspiracja… S. 297).

Іх ведалі ўдзельнікі экспедыцыі Юзафа Заліўскага ў 1833 г. і "канаршчыкі" — як на Падоллі і Валыні, так і ў Кіеўскім універсітэце, а таксама тыя, каго называлі святакрыжцамі ў Варшаве, іх паслядоўнікі ў 40-х гг. Часам невядома, якія творы чыталі падсудныя. Напрыклад, ураджэнец Беларусі Юліян Бакшанскі, вучань Віленскай гімназіі, быў у 1842 г. абвінавачаны ў чытанні Міцкевіча і распаўсюджванні яго твораў і высланы за гэтае "злачынства" на службу ў Разанскую губерню [17].

У паказаннях Тамаша Мразоўскага, які быў звязаны з кіеўскімі студэнтамі з гуртка Уладзіслава Гардона, што кантактаваў з Таварыствам польскага народа пад кіраўніцтвам Шымана Канарскага, пазнейшага ссыльнага ва Усходнюю Сібір, адкуль яму ўдалося ўцячы, знаходзім рэдкае апісанне сумеснага чытання міцкевічаўскіх шэдэўраў: "У час наведвання тады [Паўла] Багдановіча [студэнта Кіеўскага універсітэта. – *В. С.*], калі мы толькі ўдваіх засталіся на станцыі […], ён спытаў у мяне, ці ведаю я паэму "Дзяды", выдадзеную Міцкевічам, і ці хачу яе прачытаць? Я адказаў, што не ведаю яе і вельмі хацеў бы прачытаць. Тады Багдановіч замкнуў дзверы на ключ і дастаў з ложка "Дзяды", перапісаныя ім уласнаручна, і чытаў мне на працягу некалькіх гадзін, адначасова мы хвалілі некаторыя паэтычныя месцы. А потым, калі я наведваў ужо хворага Багдановіча, ён мне зноў чытаў другі, меншы творык пад назвай "Пілігрымства", г. зн. "Кнігі польскага народа і польскага пілігрымства", якія таксама карысталіся вялікай папулярнасцю" [18]. Такога роду "сеансы" сумесных адкрыццяў Міцкевіча не былі рэдкасцю. Вось як, напрыклад, адбываліся такія сумесныя чытанні ў гуртку Тамаша Вернера ў Варшаве ў першай палове 40-х гг.: "У наступную нядзелю, — паводле слоў Вернера, — каля чацвёртай гадзіны пасля абеду зноў да мяне прыйшлі Гралеўскі з Тамашэўскім [члены тайнага гуртка. — *В. С.*]. Я ім тады чытаў "Імправізацыю" з "Дзядоў" Міцкевіча, але, мяркую, абодва яе не разумелі, хоць хвалілі. У час іх двухразовага знаходжання ў мяне дзверы ўвесь час былі замкнёныя на ключ, нікога ў дом я не ўпускаў і, акрамя іх, дома таксама нікога не было. А апошнім разам, калі служанка раней, каля шостай, вярнулася, я нават спыніў чытанне" [19].

Пра тое, як добра людзі ведалі творчасць паэта, як яе стасоўвалі да ўласных перажыванняў і выпрабаванняў, можа сведчыць, напрыклад, прасякнутыя міцкевічаўскім духам успаміны змоўшчыка-ссыльнага Валяр'яна

---

[17] Гл.: Fajnhauz D. Ruch konspiracyjny na Litwie i Białorusi 1846–1848. Warszawa, 1965. Старонкі паводле паказальніка; Расійскі дзяржаўны архіў у С.-Пецярбургу, ф. 1286, воп. 13, 1851, адз. зах. 620. У 1848 г. Ю. Бакшанскі быў асуджаны на 12 гадоў катаргі, якую адбываў за Байкалам. Загінуў у Студзеньскім паўстанні: быў павешаны 4 красавіка 1863 г. у Свечках (цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл.).

[18] ЦДГАУ у Кіеве, ф. 470, воп. 1, спр. 96, л. с. 14.

[19] Rewolucyjna konspiracja… S. 409.

Станішэўскага, выдадзеныя мізэрным тыражом. Аўтар бясперапынна пералічвае герояў Міцкевіча, пры іх дапамозе характарызуе асоб, якіх апісвае, прытым так, нібы быў перакананы, што названыя постаці з'яўляюцца агульнавядымымі сімваламі, што не патрабуюць каментарыяў. Ён цытуе таксама цэлыя фрагменты, найчасцей, мяркуючы па шматлікіх нязначных адхіленнях ад арыгіналу, па памяці. І як ён успамінае, ужо ў школе чытаў "Конрада Валенрода", "Гражыну", "Дзяды", а таксама санеты і вершы" [20]. Потым Станішэўскі распаўсюджваў гэтыя творы сярод навучэнцаў Фармацэўтычнай школы ў Варшаве, удзельнікаў так званай "аптэкарскай змовы", якія былі затым асуджаны за "чытацкія злачынствы". У цытадэлі, — як піша, — адчуваў сябе падобна як "пустэльніца Альдона", бо, каб захаваць прысутнасць духу, знаходзячыся ў адзіночнай камеры, дэкламаваў па памяці "Конрада Валенрода", санеты, некаторыя фрагменты "Дзядоў". На сценах Варшаўскай крэпасці ён знаходзіў цытаты з твораў Вешчуна, выцарапаныя іншымі вязнямі. Праязджаючы праз Карэлічы, узгадваў "неўміручыя песні "Пана Тадэвуша"; а башкірскія качэўі нагадвалі яму "Акерманскія стэпы" і г. д. [21] Для сучаснага ж чытача некаторыя з такіх сцвярджэнняў трэба было б суправаджаць каментарыем.

У другой палове XIX ст. цэнзурныя забароны крыху змякчыліся, аднак Міцкевіч, нягледзячы на тое, што ў Варшаве яму паставілі помнік і быў выдадзены збор яго твораў, да канца панавання Раманавых заставаўся пісьменнікам дазволеным толькі часткова. Падобна, як у гады ПНР, хоць і быў ён уведзены ў школьную праграму, хоць творчасць яго шырока даследавалася літаратурнымі крытыкамі, калі трапляў на сцэны тэатраў, адразу ж станавіўся прадметам "пільнай увагі", а цэнзары, асабліва ў час спектакля "Дзяды", уважліва прыслухоўваліся, у якіх месцах і як моцна раздаваліся апладысменты… Эпапея "Дзядоў" 1968 г. — гэта ўжо асобная гісторыя, якая мае сваю, досыць шматлікую, літаратуру. У пераломныя гады зноў аказалася, што паэзія Міцкевіча мае сваё "забароненае" адценне, да яе звярталіся і зноў адкрывалі для сябе новы, завуаляваны сэнс, актуальны і адвечны… Пасля ж 1989 г. Марыя Яніён абвясціла "сапраўдны канец эпохі рамантызму" і нармальнае ўспрыняцце спадчыны Адама Міцкевіча. Ці сапраўды гэта так? Не нам, відаць, пра гэта ўжо меркаваць, а нашым нашчадкам.

Пераклад з польскай мовы Ганны Цішук

[20] Staniszewski W. Pamiętniki więźnia stanu i zesłańca. Warszawa, 1994. C. 13.
[21] Тамсама. С. 36, 62, 75, 98, 120, 123, 181, 222, 234.

Вадзім Салееў *(Мінск)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ — ГЛЫБІНЯ І ВЯРШЫНЯ СЛАВЯНСКАГА ЎСПРЫМАННЯ СВЕТУ

У памятны год, год напрыканцы і стагоддзя і тысячагоддзя, у год юбілею вялікага паэта беларускай зямлі, наш неадменны доўг — задумацца пра воблік вялікага мастака і пра той уклад, які ён, безумоўна, унёс у культуру блізкіх, роднасных яму этнасаў, у культуру славянскага суперэтнасу і, у рэшце рэшт, у сусветную культуру.

Біяграфія Міцкевіча — гэта біяграфія летуценніка, пілігрыма, чалавека, які знаходзіцца нібы на перакрыжаванні розных шляхоў, накірункаў быцця чалавека на мяжы. Гэта тычыцца ўсяго: яго паходжання, зямлі, на якой ён нарадзіўся, стану свету, які ён апяваў, яго жыцця ў Францыі і Італіі, нават самой яго смерці ў Канстанцінопалі.

Аб паходжанні паэта зноў ўспыхнулі спрэчкі (нагадаю хаця б артыкул С. Астраўцова "Как поделить Мицкевича" ў "Свободе" за 30 мая 1998 г.; пазней у тым жа выданні — артыкул С. Букчына). Гаворка зноў ідзе аб беларускасці і польскасці вялікага мастака, да якіх спрычыніліся яшчэ і літоўскасць, і нават габрэйства. Колькі народаў адначасова прэтэндуюць на вялікага паэта!

Аднак ёсць спосаб вызначыць дакладныя адносіны да этнасу, прапанаваныя сучаснай навукай. Згодна з палажэннямі сучаснай французскай сацыялогіі, напрыклад, этнічная прыналежнасць чалавека вызначаецца згодна з яго ўласнай самасвядомасцю. Мы б дадалі: згодна з яго менталітэтам… І менавіта ў гэтым "месцы" з Міцкевічам пачынаюцца складанасці. Перш за ўсё гэта чалавек, які, пачынаючы з самых першых сваіх вершаў, зыходзіў з існавання сваёй радзімы, якую з вялікім пачуццём і натхненннем ён услаўляў:

Litwo! Ojczyzno moja!

І гэтае "Litwo" ён пранёс скрозь усё сваё жыццё.

Аднак выявілася, што гэта яшчэ не ўся радзіма паэта. Гэта, гаворачы словамі другога Міцкевіча, Канстанціна (Я. Коласа) — "родны кут", малая радзіма. Але дзякуючы мове і, зноў жа, ментальнасці Міцкевіч здолеў стварыць у сусветным вымярэнні вобраз такога вялікага славянскага этнасу, як польскі, і яго "крэсавыя" адценні, з эстэтычнага боку гледжання, толькі ўзбагачаюць шырокую плынь "польскасці", а праз яе — усяго славянскага свету.

Ды вернемся яшчэ раз да праблемы зямлі, як месца жыцця, месца прабывання чалавека. Прыцягненне зямлі было адкрыта яшчэ старажытнымі. Развіццё гэтай традыцыі, напэўна, ідзе ад Гіпакрата, філосафа і "родапа-

чынальніка” медыцыны, які сцвярджаў, што “месца нараджэння назаўсёды прадвызначае лёс (характар) чалавека”. Палымяныя радкі аб родным месцы, дзе нарадзіўся чалавек і дзе ён быў выхаваны ў Бозе, засталіся ў спадчыну ад Скарыны. Мысліцелі XVII–XIX стст. адзначалі асаблівую значнасць месцазнаходжання чалавека, геаграфічных умоў, клімату ў фарміраванні этнасу, нацыянальнага характару, асаблівых рысаў ментальнасці народаў і асобных людзей. І наш вялікі класік сцвярджае слушнасць такіх думак сваім жыццём, усплёскамі сваёй душы. Прыгадаем толькі “Акерманскія стэпы” і ўскрык паэта:

Że słyszałem głos z Litwy —
Jedźmy! nikt nie woła!

И зов с Литвы… Но в путь! Никто не позовет.
(Пераклад І. Буніна)

Што чуў бы гук з Літвы, — ніхто не кліча, едзем!
(Пераклад М. Танка)

І яшчэ адзін вялікі сведка з іншага, паўночнага боку:

Там пел Мицкевич вдохновенный
И посреди прибрежных скал
Свою Литву воспоминал.
(А. С. Пушкін)

Але зямля ёсць яшчэ, у культуралагічным сэнсе, і носьбіт асаблівай духоўнасці, што будуецца на звычках і традыцыях пакаленняў людзей, якія жылі на ёй. І тут, калі гэта канкрэтна датычыцца творчасці А. Міцкевіча, паўстае праблема праяўлення ў ёй не толькі беларускай ментальнасці (што зразумела і што адбіваецца на ўсім творчым шляху А. Міцкевіча — ад першапачатковых вершаў да эпілога “Пана Тадэвуша”), але і такіх рысаў нацыянальнага характару этнічных літоўцаў (яны, зразумела, таксама жылі ў арэале гродзенска-навагрудскай зямлі і побач з ёю), як упартасць і высакароднасць.

І калі ўсур’ёз задумацца над воблікам Адама Міцкевіча як чалавека і творцы, можна перш за ўсё адзначыць высокую ступень яго творчай энергіі, творчага патэнцыялу. Выкарыстоўваючы “тэхналогію” Л. Гумілёва, можна сцвярджаць, што А. Міцкевіч быў пасіянарыем найвышэйшай пробы. І гэтая, вызначальная, рыса яго характару праявілася ва ўсім: у парывах да вольнасці і свабоды, у каханні і ў рэшце рэшт непасрэдна ў творчасці.

А. Міцкевіч у пэўнай ступені можа прадставіць сабой ідэал, на якім, што ўпарта прапаноўвалі педагогі ў савецкі час, павінна выхоўвацца моладзь. І сапраўды, для сучаснага беларуса ў вобліку А. Міцкевіча ёсць шмат і павучальнага, і востра неабходнага, — менавіта сёння, у момант гістарыч-

нага пераходу, трансфармацыі беларускага грамадства ў грамадства новага тыпу, пабудаванага па законах адкрытасці і дэмакратызму, на арганічных суадносінах паміж грамадска-абшчынным і асобасным пачатках. У сувязі з гэтым нам здаецца неабходным адзначыць тыя дамінантныя структуры новай парадыгмы суадносін свету і чалавека, якія магла б даць настроенасць на Міцкевіча юнакоў, што ўступаюць у жыццё на золку новага тысячагоддзя, і якія маглі б ім сутнасна дапамагчы ў найскладанейшым працэсе будаўніцтва чалавечай індывідуальнасці і самабытнасці.

Зразумела: адрадзіць ідэал шляхетнасці патрэбна. Гэтая праблема ўяўляецца нам надзвычай актуальнай: гаворка ідзе аб адраджэнні ў чалавека на зямлі беларускай на новым узроўні пачуцця ўласнай годнасці, пачуцця, якое арганічна было ўласціва грамадзянінам Вялікага Княства Літоўскага і якое было потым страчана, і страта гэтая замацавалася ў савецкую эпоху.

Між тым у наш час, калі галоўнымі дэтэрмінантамі быцця абвешчаны правы чалавека, зразумела, што без пачуцця ўласнай годнасці немагчыма ні сфарміраваць асобу дэмакратычнага, адкрытага грамадства, ні існаваць чалавеку ў якасці творцы і носьбіта культуры. І Адам Міцкевіч, вялікі грамадскі дзеяч і вялікі мастак, народжаны на беларускай зямлі, уяўляе сабой найлепшы тып адносін да быцця, які малады чалавек павінен браць за ўзор у сваёй дзейнасці.

Разглядаючы постаць Міцкевіча, неабходна адзначыць, што ён уяўляе сабой апантаную, звышдухоўную асобу. Часам мы разважаем аб культуры амаль што надарэмна толькі таму, што ўяўляем яе неяк функцыянальна (або аперацыянальна), забываючыся пра тое, што яна засноўваецца цалкам на субстраце духоўнасці. Апошняе паняцце, як вядома, шматмернае, і сучасная гуманітарная навука толькі пачынае на новым узроўні спасцігаць інтэгральную сутнасць духоўнага пачатку. Але зразумела і іншае: у структуру духоўнасці так ці інакш уваходзіць вера. Гэта характэрна і для нашага часу; у рэтраспектыўным жа ракурсе адназначна відаць, што вераванні той ці іншай зямлі не толькі паказваюць накірунак і шляхі развіцця культуры, але і вызначаюць яе сутнасць, яе асаблівасці. Постаць А. Міцкевіча неабходна нам сёння таму, што яна аднаўляе традыцыі веравызнання, арганічныя для Беларусі. Як вядома, найбольш глыбокім і значным для Беларусі з'яўляецца хрысціянскае веравызнанне — можа, з падсвядомым язычніцкім (паганскім) адчуваннем свету, якое так блізка беларускай ментальнасці.

Міцкевіч увасабляў сабой вышэйшы хрысціянізаваны ідэал адносін чалавека да жыцця (зразумела, што гэты ідэал прадстаўлены ў каталіцкім выглядзе, але і гэта можна трактаваць як аб'ядноўваючы элемент культур на іх "мяжы": беларускай, польскай, літоўскай). Адначасова вялікі паэт быў носьбітам і тонкім інтэрпрэтатарам протабеларускіх народных

уяўленняў, якія ўваходзілі ў глыбіню язычніцкага светапогляду людзей прынёманскага краю, што так цудоўна, так моцна адбілася на яго творчасці.

І, у рэшце рэшт, з пункту гледжання культуры Міцкевіч увасабляў і сцвярджаў у сваёй творчасці вышэйшую планку этнічнасці і мастацкасці.

Прастора невялікага па аб'ёму даследавання не дазваляе паказаць усю эстэтычную вышыню А. Міцкевіча, таму міжволі гаворка ідзе толькі аб яе тэзіснай дэманстрацыі, толькі часткова — аб ягоным вялікім эстэтычным патэнцыяле.

Тэзісна ж мастакоўская геніальнасць вялікага паэта можа мець такі выраз:

1. магутная метафарычнасць, якая ўзнікае на тонкай асацыятыўнай аснове;

2. вытанчаная эстэтыка-мастацкая апрацоўка дэталей, з'яў прыроды і чалавечых адносін;

3. моцны "паэтычны дух і гістарычная праўда", якія ўвасабляюцца з выключна дакладным адчуваннем славянскай ментальнасці.

Першая тэза лёгка падмацоўвацца літаральна кожным творам паэта. Возьмем два розных вобразы: глыбіня балотных беларускіх азёр і акерманскія стэпы. І тут і там — тонкі (блізкае да шапэнаўскага светаадчування) рух пачуцця, які ўвасабляецца праз сістэму параўнанняў у надзвычай яркай і маляўнічай карціне.

Вада іржавая ў тых студнях шкліцца мутна,
З глыбі дыміць смурод удушлівы, атрутны,
І ад яго губляюць дрэвы лісце, колер,
Трухлявыя, з карой падточанай і хворай…
Як ціха! Спынімся! Я журавоў лёт чую,
Якіх бы нават сокал быстры не угледзеў;
І як матыль калыша кветку палявую…

(Пераклад М. Танка)

Здаецца, мастаку падуладна ўсё: і лёт сокала, і жыццё непраходных нетраў беларускай пушчы, і мерны рух пяскоў пустыні. Але Міцкевічу ўдаецца і тое, што часам не здольныя ажыццявіць і буйныя паэты: ён арганічна спалучае маляўнічыя відарысы са станам чалавечай душы і атрымлівае пры гэтым надзвычай моцны эстэтычны канцэнтрат.

Раскрыццё другой тэзы патрабуе не толькі спецыяльнага складанага эстэтычнага (з элементамі фенаменалогіі і сучаснай герменеўтыкі) даследавання, але і параўнальнага аналізу, які можа ўскрыць як пласты эстэтычнага, так і своеасаблівасці творчай манеры. Напрыклад, у "Трох Будрысах" Міцкевіча назіраем узор элегантнасці і вытанчанасці, у параўнанні з "моцнай" шырынёй пушкінскага верша і мяккай пранізлівай прастатой купалаўскага радка.

Bo nad wszystkich ziem branki milsze zaszki kochanki,
Wesolutki, jak mlode koteczki,
Zice bielsze od mleką z czarna rzęsą powieka,
Oczy blyszczą, jak dwie gwiazdeczki…

Нет на свете царицы краше польской девицы.
Весела — что котёнок у печки —
И как роза румяна, а бела, что сметана;
Очи светятся, будто две свечки…

Бо з нявольніц мне толькі
Спадабаліся полькі —
Так панадны мне стан іх дзявочы,
Твар іх бела-ружовы,
Як смоль, чорныя бровы,
Як дзве зоркі, іх свецяцца вочы…

Яшчэ адным доказам вяликасці Міцкевіча як мастака, на наш погляд, з'яўляецца яго здольнасць даць максімальны выраз славянскай душы.

У "Пане Тадэвушы" выкладзена, як вядома, энцыклапедыя жыцця шляхціца Рэчы Паспалітай, дзе карэнная патрыярхальнасць беларускага шляхецкага быцця спалучаецца з выяўленнем польскага нацыянальнага характару ў яго надзвычай дакладнай форме — яго выразе.

Яшчэ больш паказальнымі, на наш погляд, з'яўляюцца "Дзяды", дзе Міцкевіч праяўляе прарочы дар і дзе з максімальнай сілай знаходзіць выраз агульнаславянская (праз, зразумела, польскі трансфер) ментальнасць. Дастаткова ўспомніць знакаміты рэфрэн, які гучыць ў другой частцы вялікай паэмы:

Ciemno wszędzie, głucho wszędzie,
Co to będzie, co to będzie?

У двух радках выказаны канцэнтраваны кантынуум прадчуванняў, перажыванняў, болю паэта за лёс роднай краіны з-за немінучасці новых узрушэнняў. І з біблейскай магутнасцю ў прарочых словах паэта гучыць звон. Гэта зроблена так глыбока па перажыванню, так па-мастацку моцна, што іншаму творцу, што знаходзіцца па-за колам адчуванняў этнічнага масіву, якім "падпітваюцца" пачуцці паэта, прынцыпова немагчыма адэкватна выкласці вышэйшыя духоўныя каштоўнасці. Напрыклад, нядрэннаму сучаснаму расійскаму паэту Леаніду Мартынаву менавіта таму, што ён вельмі аддалены ад пачуццёвай энергетыкі жыхароў прынёманскага краю, так і не ўдалося зрабіць адэкватны пераклад на рускую мову:

Глушь повсюду, тьма ложится,
Что-то будет, что случится?

Як антытэзу тут, здаецца, можна прадставіць пераклад сучаснага беларускага паэта Янкі Сіпакова. Не ўдаючыся ў параўнальны аналіз паэтыч-

ных магчымасцей Л. Мартынава і Я. Сіпакова, адзначым, што апошняму ўдалося наблізіцца да арыгіналу таму, што ментальнасць аўтара яму зразумелая і блізкая.

Цёмна, людзі, страшна, людзі,
Нешта будзе, нешта будзе…

Наогул, калі гаварыць пра пераклад твораў вялікіх паэтаў з эстэтычнага пункту гледжання, перакладчыкі павінны, перш за ўсё, рэальна ўлічваць свой эстэтычны патэнцыял. Іначай адбываецца прафанацыя, і вялікія мастацкія каштоўнасці, створаныя геніяльным паэтам, не дойдуць да чытача ў адэкватным выглядзе, не стануць эстэтычнай з'явай нацыянальнай літаратуры. Сказанае можна было б пацвердзіць і на прыкладзе твораў А. Міцкевіча (у тым ліку сучаснымі перакладамі яго твораў на рускую і беларускую мовы). Па ідэі, геніяльнага паэта павінен прадстаўляць на іншай мове конгеніяльны (або блізкі па маштабу таленту) паэт.

Генію ж падуладна амаль усё. Геній, як сцвярджаў І. Кант, дае законы мастацтву. І прыклад А. Міцкевіча яскрава пацвярджае гэтую ідэю.

Чуйны і трапяткі, як антэна, вялікі славянскі паэт аказваецца здольным даць бліскучае эстэтычнае выражэнне не толькі польскай ментальнасці і польскай манеры эстэтычнага адлюстравання свету, але і ментальнасці, асаблівасцям нацыянальнага характару іншых прадстаўнікоў вялікай славянскай сям'і, іншых народаў. Тут і мужная годнасць літоўшчыны, і пяшчота, пранікнёная прастата беларушчыны, памножаныя на тонкасць і элегантнасць польскасці. Акрамя гэтага, А. Міцкевіч змог часткова ўвасобіць і іншыя, часам супрацьлеглыя беларуска-польска-літоўскаму "памежжу" рысы ментальнасці, якія ўласцівы іншым прадстаўнікам славянскіх народаў. Сярод іх такія розныя якасці, як, скажам, моц і шырыня рускага характару, мудрая быційная прыстасаванасць да жыцця чэхаў, жвавасць, песеннасць і ўчэпістасць украінцаў, імклівасць паўднёвых славян.

Цяжка ўявіць сабе, каб адзін чалавек змог усё гэта, такое рознае (але збежнае недзе ў глыбіні, у старажытным славянскім быцці) прадставіць у сваёй творчасці, сваім разуменні (маюцца на ўвазе лекцыі А. Міцкевіча ў Парыжы). Але геній, як было ўжо сказана вышэй, можа. За кошт сваёй геніяльнасці.

І Адам Міцкевіч сваім жыццём і творчасцю даў наглядны доказ таму, што геній, народжаны на славянскай зямлі, можа збудаваць непарыўны ланцуг сувязі паміж гэтай зямлёй і космасам чалавечага духу. У гэты космас ён унёс, у тонкай эстэтычнай апрацоўцы, і склад думак, уласцівых славянскаму суперэтнасу, і пранізлівую моц непараўнальнага славянскага пачуцця.

Багуміла Касманова *(Познань, Польшча)*

РАЗАМ ЦІ АСОБНА?
МІЦКЕВІЧ У ПОЛЬШЧЫ, ЛІТВЕ І БЕЛАРУСІ

У выдадзенай вроцлаўскім “Дольнаслёнскім” выдавецтвам біяграфіі Вешчуна Яцак Лукасевіч напісаў: “Сёння Міцкевіч не толькі наш, і не толькі таму, што шляхам шматлікіх перакладаў уваходзіць у кровазвароты іншых літаратур. Хочуць яго зрабіць сваім таксама літоўцы, якія ўзносяць помнік таму, хто напісаў: “Літва, мая Айчына!”, беларусы, якія памятаюць, што сям’я яго паходзіць з Беларусі. Яўрэі, якія спасылаюцца на сведчанне суразмоўніка паэта аб яўрэйскім паходжанні яго маці і на словы “з чужой маці”, сказаныя ў “Нябесным адкрыцці кс. Пятра”, а таксама на тое, што ажаніўся ён з асобай, якая і па мужчынскай лініі (Шыманоўская), і па жаночай (Валоўская), паходзіла з яўрэйскіх сем’яў. Ён быў патрыётам Айчыны, якой была Польшча, і сваёй “малой радзімы”, якой была Літва, а адным з прынцыпаў, якім кіраваўся, лічыў брацтва з Ізраілем. Міцкевіча так многа, што хопіць на ўсіх. Тым лепш. Няхай аб’ядноўвае, а не раздзяляе. Ён — польскі нацыянальны паэт…” [1]

Я распачала з цытавання такога экуменічнага меркавання, таму што ён варты, каб яго згадалі ў час юбілею, калі многія, замест таго каб захапляцца прыгажосцю паэзіі аўтара “Пана Тадэвуша”, прадпрымаюць дзеянні [2], якія называюцца раздзіраннем Вешчуна” [3]. А той у перыяд сваёй маладосці нават не мог сабе ўявіць, што будуць выкарыстоўваць з ім нашчадкі, нападаючы на яго паходжанне, мараль, збіраючы “чорныя папкі” на тэму нібыта магчымых яго сувязей з палітычнай паліцыяй розных краін. У сувязі з усім гэтым бляднеюць тыя спрэчкі, якія вяліся вакол яго асобы ў міжваенны перыяд паміж тымі, хто адчуваў сябе суайчыннікамі Міцкевіча, народзенымі калісьці ў агульнай Рэчы Паспалітай, а пасваранымі значна пазней, калі ў другой палове XIX ст. сфарміраваўся літоўскі нацыянальна-культурны рух і ўзніклі сучасныя еўрапейскія нацыі, а сярод іх — польская і літоўская [4]. Таму ён не павінен быў, як Эліза Ажэшка, пісаць: “Мне проста ніколі не прыходзіць ў галаву, што я ліцвінка. Полька, і ўсё тут! Па выпадковаму нараджэнню і абставінах, а можа, і абавязку жыву ў Літве”.

---

[1] Łukasiewicz J. Mickiewicz. Wrocław, 1997. S. 210. ser.: “A to Polska właśnie…”.

[2] Гл.: Mickiewicz zlustrowany // Dziennik Poznański. 1998. 30 stycz. S. 14–16.

[3] Kosman M. Szarpanie jubilata // Humaniora: Fundacja dla Humanistyki. Biuletyn. Poznań, 1998. Nr 8. S. 23–27.

[4] На гэтую тэму гл.: Łossowski P. Po tej i tamtej stronie Niemna: Stosunki polsko-litewskie 1883–1939. Warszawa, 1985. S. 9; Wisner H. Wojna nie wojna: Szkice z przeszłości polsko-litewskiej. Warszawa, 1978. S. 18.

У “Літве”, ці, дакладней, у Гродне… Мы павінны памятаць пра актуальнае ў той час паняцце гістарычнай Літвы, ці Літвы да падзелаў, якая займала значную частку тэрыторыі Беларусі, перш за ўсё заходняй. У той час — гэта значыць у маі 1903 г., калі аўтар аповесці “Над Нёманам” менавіта так пісала гісторыку і літаратурнаму крытыку Аўрэлію Драгашэўскаму [5]. Бо менавіта тады разлад паміж членамі адной сям’і, нашчадкамі Ягайлы і Вітаўта — як сказаў бы Міцкевіч, — быў ужо значным; даходзіла да шматлікіх канфліктаў, між іншым ў межах адных і тых жа парафій. Такі клімат суправаджаў увесь перыяд барацьбы за незалежнасць; да таго ж на працягу ўсяго дваццацігоддзя атмасфера была распалена спрэчкамі аб правах на Вільню, а літоўцы трактавалі Коўна толькі як часовую сталіцу сваёй рэспублікі.

Клімат той пары добра перадаюць фельетоны журналіста Тадэвуша Катэльбаха, які яшчэ да ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж абедзвюма краінамі правёў у Коўне больш трох гадоў як пастаянны карэспандэнт “Gazety Polskiej”. У кастрычніку 1933 г. ён пісаў наступнае: “Калі размаўляеш з літоўцамі, выхаванымі пад рашучым уплывам польскай культуры, кожны паляк з прыемнасцю можа сцвердзіць, што яны не парвалі духоўных сувязей, якія аб’ядноўвалі іх з Польшчай. Нягледзячы на тое, што ў іх сем’ях сёння гучыць выключна літоўская мова, і на тое, што ў адносінах да Польшчы яны часта займалі непрымірымую пазіцыю, а сцены іх дамоў аздабляюць сімвалы літоўска-польскага разрыву, яны адразу ажыўляюцца ў час размовы пра Польшчу, цікавяцца яе палітычным, эканамічным, культурным жыццём.

У доме такіх літоўцаў паляк адчувае сябе ўтульна, бо, у сэнсе культуры, знаходзіцца нібы ў сябе. Урэшце пасля некалькіх хвілін размовы, як правіла, на польскай мове, гэтыя літоўцы прызнаюцца табе з усёй шчырасцю, што маюць культурную роднасць з Польшчай, успамінаючы часы, калі наведвалі Варшаву і асабліва Кракаў”.

Праз паўгода, захапляючыся цудоўным размяшчэннем Коўна, Катэльбах з горыччу заўважыў, што адсюль цягнікі курсіруюць да Кёнігсберга, Берліна ці Рыгі, а прамой сувязі са сталіцай Польшчы няма. І тут жа дадаў, што “ля падножжа гары праходзіць дарога, з якой дастаткова толькі крыху збочыць, каб апынуцца ў вядомай ковенскай даліне Міцкевіча. Колькі разоў я спускаўся з узгорка, каб паблукаць па ёй, столькі разоў узгадваў міцкевічаўскі эпас. На памяць прыходзяць словы: “О год той…” І стоячы ў даліне, залітай вясеннім сонцам, я ўвесь час дэкламаваў: “Ogarnęło Litwinów serca z wiosny słońcem jakieś dziwne przeczucie…”

[5] Orzeszkowa E. Listy zebrane / Oprac. E. Jankowski. Wrocław, 1958. T. 4. S. 126, 162.

Так пісаў карэспандэнт “Gazety Polskiej” праз восем месяцаў пасля свайго прыезду ў сталіцу Літоўскай рэспублікі. З’яўленне яго “на Ковенскім грунце было амаль палітычнай сенсацыяй” [6].

Праз доўгія дзесяцігоддзі — нават яшчэ ў час падзелаў — літоўцы шкадавалі, што так цесна звязаны з іх краінай паэт не пісаў на іх мове [7]. Вяртаючыся да сённяшняй тэматыкі, трэба адзначыць, што быў ён літоўцам гістарычным, якога нельга атаясамліваць з сучасным, этнічным, літоўцам. Пасля атрымання Літвой незалежнасці знайшлі выхад, бо трэба ж было выхоўваць у грамадства перакананне, што тыя гістарычныя тонкасці не маюць асаблівага значэння. Пытанне разгледзім на прыкладзе вядомай ў свой час спрэчкі вакол выбару твораў паэта для школьнай праграмы, які, дарэчы, прыпаў якраз на перыяд абвастрэння літоўска-польскай палемікі аб праве на сумесную культурную спадчыну, у тым ліку аб паходжанні А. Міцкевіча, якога, вядома ж, лічылі ў міжваенным Коўне суайчыннікам менавіта ў сучасным значэнні [8].

Героем дня тады стаў вядомы філолаг Міхал, ці Мікалас, Біржышка (1882–1962), рэктар Ковенскага універсітэта імя Вітаўта Вялікага, які паходзіў з сям’і, заслужанай для культуры сваёй краіны, і які, дарэчы, дзякуючы матцы быў цесна звязаны з польскім асяроддзем. У 1919 г. для школьнага чытання ім былі выдадзены выбраныя творы Вешчуна пад назвай “Iš Adomo Mickeviciaus rastu”, вядома, без тлумачэння маладому чытачу, што гэта пераклады з польскага арыгінала, без уліку такой дробязі, як дастаткова вольная адаптацыя некаторых фрагментаў. Гэтае выданне было паўторана два разы — у 1927 і 1930 г.

Першае выданне прайшло незаўважаным на другім баку “літоўскай сцяны”, якую тады толькі ўводзілі і досыць істотна змянялі, бо Вільня тады пераходзіла з рук у рукі. Дарэчы, яно і не магло выклікаць вялікіх пярэчанняў, бо пераклады суправаджаліся арыгінальнымі тэкстамі, ніхто не сумняваўся ў мове аўтара. Выданне, дарэчы, убачыла свет у Вільні. Што датычыцца другога выдання, ковенскага, прынцыпова зменена, то на яго востра адрэагавалі палякі з універсітэта Стэфана Баторыя, якія ўважліва сачылі за даследаваннямі ковенскіх навукоўцаў і літаратараў на ніве супольнага мінулага. Аўтар артыкула “Міцкевіч дэпаланізаваны па-літоўску. Скандальная кніга пана Біржышкі” закляйміў беззаконнасць, якую дапусцілі

---

[6] Katelbach T. Za litewskim murem. Warszawa, 1938. S. 127.

[7] Напр., у 1859 г. мовазнаўца Андрыс Матас Угянскіс пісаў пра Міцкевіча жмудскаму біскупу Мацею Валанчэўскаму: “Вельмі шкада, што гэты літоўскі Гамер, які сам сябе называў літвінам, не пісаў па-літоўску” (цыт. па: Jackiewicz Mieczysław. Literatura polska na Litwie XVI–XX wieku. Olsztyn, 1993. S. 157).

[8] Падрабязней гл.: Kosmanowa B. Gniewy o Mickiewicza: Na marginesie jednej polemiki // Zeszyty Naukowe Wyższej Szkoły Pedagogicznej w Bydgoszczy. Studia Filologiczne. Zesz. 36. Filologia Polska. Bydgoszcz, 1995. Nr 15. S. 69–82.

перакладчыкі, пазбаўляючы тэксты польскай душы і фальсіфікуючы іх дзеля школьнага ўжытку. Пасля выхаду трэцяга выдання ў гістарычнай сталіцы Літвы спрэчкі закіпелі.

У названым артыкуле чытаем: “Ніводнага разу не знаходзім у перакладах слова “Польшча”… Гэтае замоўчванне польскасці Міцкевіча ёсць нішто іншае, як маніпуляцыя ў палітычных мэтах! Такім жа чынам у Коўне абышліся з “Панам Тадэвушам”. Напрыклад, у эпілогу словы Вешчуна “O Matko Polsko! Ty tak świeżo w grobie złożona” перакладчык замяняе “Мая Айчына!” і г. д. Паўсюдна перакладчык пад пяро Міцкевіча падкладвае чужыя выразы, змяняючы пры гэтым сэнс думкі і волі пісьменніка. З пакалечанага ашмоцця, ацалелага з-пад добра завостранага на ковенскім бруску цэнзарскага нажа, быў сшыты новы, іншы, літоўскі Міцкевіч”.

Іншы аўтар, якому належыць артыкул “Польскасць Міцкевіча пад літоўскай гільяцінай”, сцвярджае адкрыта: “Дадзеная падборка твораў ёсць нішто іншае, як рэдкі дакумент варварства, тупасці і нацыяналістычнай слепаты чалавека навукі”. Заканчвае ж так: “Дзеля палітыкі можна і Вешчуна пакласці пад гільяціну”. А той жа самы М. Біржышка ў 1938 г. ускосна пацвердзіў палітычны характар свайго выдання, сцвярджаючы, што без знаёмства з польскай літаратурай, у тым ліку з творчасцю А. Міцкевіча, немагчыма вывучаць і літоўскую літаратуру [9].

У віленскім асяроддзі імкнуліся адказаць на пытанне: ці ведаў паэт літоўскую мову? Гэтай праблемай заняліся гісторык і этнограф Міхал Брэнштэйн і аўтарытэтны спецыяліст у галіне балтыйскай філалогіі Ян Атрэмбскі. Яны прыйшлі да наступнага вываду: “Міцкевіч часткова ўспрымаў літоўскую мову на слых, але ён яе не ведаў або ведаў вельмі дрэнна. Жмудскай жа гаворкі, на якой яго рукой былі запісаны фрагменты дайнаў [літоўскіх народных песен — *Б. К.*], ён увогуле не ведаў і напэўна нават не чуў” [10].

У Брэнштэйна быў ліст сына паэта, Уладзіслава Міцкевіча, які датычыўся адзінага выпадковага запісу яго бацькі на літоўскай мове. Пасля аналізу гэтага тэксту і навукоўцы прыйшлі да вываду, што ён не з’яўляецца падставай да таго, каб рабіць сур’ёзныя вывады. Галоўным жа з’яўляецца факт, што паэт тварыў на польскай мове, а таксама ніколі не ўжываў формы прозвішча і імя, якія накрэслены сёння на помніку паміж Віленкай і касцельным комплексам бернардзінцаў і св. Ганны — Адомас Міцкевічус.

Бура міжваеннага перыяду вакол паэта мае сёння антыкварнае значэнне, хоць яе водгаласы не зусім замоўклі. Слушна напісала ў 1930 г. гарачая

[9] Jackiewicz M. Literatura polska na Litwie. S. 159.

[10] Вынікі сваіх даследаванняў М. Брэнштэйн і Я. Атрэмбскі апублікавалі ў “Gazecie Porannej” 28 жніўня 1927 г.

патрыётка Канстанцыя Скірмунт, што паэт належыць “тром гістарычна звязаным народам”, спасылаючыся таксама на словы, сказаныя пра яго памерлым у 1938 г. жмудскім біскупам Юзафам Гедройцам: “Літвін па паходжанні і характары, прыхільнік беларускай зямлі, на якой нарадзіўся і чый народ любіў, тытан польскай літаратуры” [11].

Варта ў гэтым месцы працытаваць зварот, які малады паэт скіраваў свайму любімаму прафесару Іаахіму Лялевелю і які сведчыць пра яго шырокія нацыянальныя і наднацыянальныя погляды:

> A tak gdzie się obrócisz, z każdej wydasz stopy,
> Ześ znad Niemna, żeś Polak, mieszkaniec Europy [12].

Перад падарожнікамі з Польшчы, якія накіроўваюцца на цудоўнае возера Свіцязь і ў недалёкі ад яго Навагрудак, паўстае перад вачыма мясцовы музей Вешчуна. Звяртаюцца яны ў памяці да Завосся і Туганавіч, могуць з рознай нагоды сустрэцца ў карцінных галерэях з інфармацыяй пра польскага паэта, сына беларускай зямлі, ці, дададзім, агульнай перад падзеламі дзяржавы — Рэчы Паспалітай. У Беларусі паэт, які апяваў яе мінулае і нацыянальныя звычаі, карыстаўся і па-ранейшаму карыстаецца любоўю. Яго самы значны твор “Пан Тадэвуш” быў перакладзены многімі славутымі паэтамі, сярод якіх пачэснае месца займае Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Яго пераклад, канфіскаваны ў 1859 г. царскай цэнзурай у Вільні, стаў для іншых выдатным прыкладам аб’ектыўнага падыходу да арыгінальнага тэксту літаратурнага твора [13]. А ў прыгранічных Беняконях і недалёкіх ад іх Бальценіках мы знаходзім сляды гераіні яго рамантычнага кахання — Марылі, успетай у юнацкіх строфах паэта.

Пераклад з польскай мовы Івана Лучыц-Федарца

---

[11] Гл.: Jackiewicz M. Literatura polska na Litwie. S. 158.

[12] Mickiewicz A. Dzieła / Red. J. Krzyżanowskiego. Warszawa, 1955. T. I. S. 95. Параўн. трапнае заключэнне М. Яцкевіча (Literatura polska na Litwie. S. 159), а таксама меркаванне сучаснай літоўскай даследчыцы: Pakeriene-Daujotyte V. Adam Mickiewicz w kulturze Litwy XIX w. // Lithuania: Kwartalnik poświęcony problemom Europy środkowo-wschodniej. 1996. Nr 3–4. S. 118–192.

[13] Гл.: Gajkowska C. Marcinkiewicz (Dunin-Marcinkiewicz) Wincenty (1807–1884) // Polski Słownik Biograficzny. T. 19. S. 588.

Stanisław Alexandrowicz *(Toruń, Polska)*

WANDA KUKOWICZ. "DZIENNIK WYCIECZKI PIESZEJ Z WILNA W STRONY MICKIEWICZOWSKIE ODBYTEJ W DNIACH 14–22 lipca 1928 r."

Uwagi wstępne

Przedstawiony niżej tekst, autorstwa mojej ciotki — Wandy Kukowicz (ur. 2.08.1901 r. w Głębocznie, pow. Siebieski — zm. 14.06.1982 r. w Toruniu), stanowi krótki dzienniczek, spisywany między 14 i 22 lipca 1928 r. (z późniejszymi dopiskami) podczas wyprawy pieszej w strony związane z dzieciństwem i młodością Adama Mickiewicza. Oprócz autorki zapisek, podówczas kończącej studia rolnicze na Szkole Głównej Gospodarstwa Wiejskiego w Warszawie, uczestniczyła w wyprawie jej koleżanka Maria Pfaffiusówna, kończąca studia medyczne na Uniwersytecie Stefana Batorego w Wilnie, po zamążpójściu Skibniewska. Tekst zapisek bez tytułu, notowanych ołówkiem, został przez autorkę przepisany po 47 latach, w dniach 14–25 grudnia 1975. Pisany długopisem w zeszycie szkolnym w kratkę, obejmuje 35 kartek zapisanych jednostronnie. Kartka 25 v. bez tekstu zawiera rysunek dworku mickiewiczowskiego w Nowogródku przerysowany z książki: A. Śnieżko "Dworek mickiewiczowski w Nowogródku", (Lida 1939. S. 11). Na odwrocie kartki 34 podane zestawienie dat i trasy dziennych przemarszów. Ostatnia (35) kartka zapisana dwustronnie.

Łącznie w przeciągu ośmiu dni marszu, z jednym dniem odpoczynkuw Nowogródku, turystki przeszły 218 km, tylko na niewielkich odcinkach korzystając z podwiezienia przez napotkanych chłopów. Trasa przebiegała szlakiem: Wilno – Małe Soleczniki – Bieniakonie – Berdowszczyzna – Iwje – Nowogródek – jezioro Świteź – Worończa – Tuhanowicze – Zaosie – Horodyszcze. Drogę wskazywała mapa "sztabówka" (niewątpliwie w skali 1 : 100 000). Niestety nie wiadomo, z pomocy jakich przewodników korzystano. Najpewniej posługiwały się pątniczki przewodnikiem inż. Józefa Żmigrodzkiego "Nowogródek i jego okolice (Nowogródek, 1927). Przy opisie Bieniakoń brak w tym przewodniku wzmianki o grobie Maryli z Wereszczaków Puttkamerowej na cmentarzu w tej parafii. Również dziennik nie odnotowuje jego obejrzenia, zapewne więc autorka o nim nie wiedziała.

Bardzo szczegółowy opis drogi i wyliczenie miejscowości, przez które przechodzono, względnie które mijano, pozwalają jednoznacznie wytyczyć trasę marszu na mapie 1 : 100 000. Możliwe jest również dość precyzyjne umiejscowienie dziesiątków wymienionych, a czasem i bliżej opisanych obiektów. Po upływie 70-ciu lat te liczne, często błahe, informacje mogą być użyteczne dla uściślenia wielu szczegółów topografii, dawnej szaty roślinnej i zabudowy. Interesujący jest też zapis wrażeń odnoszących się do charakteru i uroków kra-

jobrazu, zespołów dworskich lub ich śladów, alej (np. w Tuhanowiczach), czy tylko pojedyńczych drzew (lipy w Zaosiu).

Notatki te, pisane bardzo szczerze dla samej siebie, z pewnością bez zamiarów publikacji, stanowią interesujący materiał do poznania sposobu myślenia i odczuwania ówczesnego wileńskiego środowiska młodych absolwentek studiów, urodzonych ok. 1900 r., których edukacja początkowa i nauka w szkole średniej rozpoczęły się przed 1914 r., a studia przebiegały już w Niepodległej Polsce. Niemałą ich zaletą jest ukazanie zróżnicowanych warunków życia codziennego i różnych typów ludzi i zachowań, odnotowanych z dużym krytycyzmem lecz nie bez poczucia humoru. Stanowią one jakby ciąg migawkowych fotografii chwytających bezpowrotnie minione warunki życia i stosunki społeczne głębokiej prowincji Wileńszczyzny i Nowogródczyzny. Mogą więc zaciekawić nie tyle specjalistów zajmujących się Mickiewiczem i jego epoką, co zainteresowanych pamięcią o Mickiewiczu i wpływem jego twórczości na kolejne pokolenia.

W Dzienniku został skrócony tekst, nie związany z Adamem Mickiewiczem.

V dzień (środa) — 18 VII

Z rana o 5-tej poszłyśmy w dalszą drogę. Umyłyśmy się pod studnią na ulicy, ale nikt nam nie zwrócił uwagi. Pogoda nie zapowiadała się dobrze, niebo było chmurne i był wiatr. Na samym końcu miasteczka [Iwja. — *Red.*] jest kapliczka, chciałyśmy zajść, ale była zamknięta. Szłyśmy przez Pawłowicze, za Pawłowiczami w lesie znalazłam złoć (z rodz. liliaceae) i dużo mieczyków (iridaceae) [s. 22] na łące. Ale droga w ogóle nie była ładna, piaszczysty las sosnowy. Doszłyśmy do Niemna i usiadłyśmy na jego brzegu. Ale nie wydawał się on nam bardzo ładny. Idąc ku niemu czekałyśmy czegoś ładniejszego. Może powodem tego była pochmurna pogoda, która i na duszę człowieka kładzie zawsze cień smutku. Więc i nam było trochę jakoś smętnie. Siedziałyśmy niedługo, bo i zimno dało się odczuć wkrótce. Mimo nas przepłynęli flisacy.

Za Niemnem leśnymi ładnymi drogami szłyśmy mimo Hrapieniewa. W lesie spotkałyśmy zbłąkaną krowę. Cała droga od Niemna do Berdówki była bardzo ładna. Szłyśmy wciąż lasami lub brzegami lasów — "opuszką". Przed Berdówką spotkałyśmy kobietę z małą dziewczynką, która nas zapytała: "otkuda idziecie?". Odpowiedziałyśmy zwykłym sposobem, że do Berdówki. Przed Berdówką usiadłyśmy w lesie dla wypoczynku, a więcej może dlatego, że naprawdę było tam ładnie. Bo zwykle w drodze miałyśmy pecha pod tym względem, gdyż zmęczenie pojawiało się [s. 23] zwykle, gdy byłyśmy w okolicach brzydszych i wtedy chęć wypoczynku była silniejsza niż urok pięknych okolic, ale nie tak silnie żebyśmy aż decydowały się na poszukiwanie ich pomimo zmęczenia.

Za Berdówką był las dość duży, ale brzydki, bo sadzony rzędami równoległymi do drogi. Przed Wsielubiem dopiero zaczął się bardzo ładny las.

We Wsielubiu chciałyśmy spełnić prośbę pani Jacuńskiej i zaszłyśmy do restauracji pana Hollaka, ale nie zastałyśmy go w domu, więc tylko napisałyśmy do niego. List był tej treści (pisała go Maryńcia, a ja podpisałam): "kuzynka moja pani Jacuńska prosiła powiedzieć, by Pan przyjechał, jeżeli pan chce itd." To "kuzynka" nie bardzo mi się podobało, ale podpisałam pomimo to, a list zostawiłyśmy i poszłyśmy dalej do Nowogródka już.

Od Iwia do Wsielubia było 28 km, a od Wsielubia do Nowogródka — 14 km. Okolice od Wsielubia do Nowo — [s. 24] gródka były znowuż bardzo ładne, przeważnie szłyśmy lasami. Od początku najwięcej bałyśmy się drogi z Iwia do Wsielubia, bo według mapy same lasy, żadnego osiedla po drodze itd. Ale poszłyśmy innymi drogami i wcale nie było tak pusto.

Koło godz. 7-mej dochodziłyśmy już do Nowogródka. Już z daleka ujrzałyśmy zza wzgórz górę zamkową i farę. Bardzo ładnie wygląda Nowogródek od strony Peresieków, wspaniały wygląd starego grodu. Z bliska i z innych stron nie jest Nowogródek tak ładny. W Nowogródku zaczęłyśmy poszukiwania p. starosty, bo miałyśmy do niego list od Bohdana, ale się okazało, że p. starosta mieszka gdzieś na wsi, 3 km za Nowogródkiem. Więc musiałyśmy same zatroszczyć się o nocleg. Zaszłyśmy do hotelu, ale było drogo, a poza tym obawiałyśmy się znowu insektów, więc pomimo protestów Maryńci poszłam do izby drużyn harc. w dworku dra Szymanowskiego, ale tam nikogo nie było. Dr Szymanowski, który skądś wracał, zapy — [s. 26] tał mnie, kogo szukam, a gdy mu powiedziałam, poradził zwrócić się do bursy Macierzy Szkolnej. Tak też i zrobiłyśmy i dostałyśmy nocleg w bursie męskiej przy ul. Zamkowej, wprawdzie nie bardzo wygodny, bo tylko łóżka i sienniki, ale nam się i to wydawało bardzo wygodnym. Chociaż w nocy zmarzłyśmy porządnie (szczególnie w drugą noc).

VI dzień (czwartek) — 19 VII 28

Wstałyśmy koło 10-tej, mogłyśmy się umyć porządnie i poszłyśmy do restauracji na ul. Mickiewicza. Spotkanie z Maciejem. Potem zaczęłyśmy zwiedzanie miasta. Więc najpierw byłyśmy na górze Mendoga, a jeszcze przedtem obejrzałyśmy domek Mickiewicza (przy ul. Mickiewicza). Góra Mendoga nie zrobiła na nas wielkiego wrażenia. Potem zwiedziłyśmy farę, widziałyśmy tablicę Rudominy, ale strasznie zniszczona. Następnie ruiny zamku i kopiec Mickiewicza. Ale jakżeż marnie wygląda ten kopiec. [s. 27] Malutki tymczasem, a wobec takiego stanu jak jest, należy się spodziewać, że nigdy większy nie będzie. Wszystko już zarosło trawą i piołunami, wagoniki do przewożenia ziemi leżą wywrócone, nie ma toru, po którym możnaby było przywozić ziemię. Ja sama z przyjemnością przywiozłabym parę wagoników, gdyby to było możliwe, i zrobiłby to każdy zwiedzający, jak również dzieci ze szkół itd. Ale nie jest to zorganizowane i dlatego może długo jeszcze wielkość kopca się nie zwiększy.

Dalej zwiedziłyśmy cerkiew Borysohlebską, dawny kościół przy ul. Bazyliańskiej. Zdaje mi się, że w tej cerkwi przechowywał się dawniej obraz Matki Boskiej z kaplicy zamkowej, o którym Mickiewicz mówił: "Ty co gród zamkowy nowogródzki ochraniasz z jego wiernym ludem". Potem obejrzałyśmy, ale tylko z zewnątrz, cerkiew (dawny kościół franciszkanów) i zwiedziłyśmy kościół [s. 28] Św. Michała — dawniej dominikanów. W tym kościele jest popiersie Mickiewicza, tablica Jodko — Narkiewiczówny, w głównym ołtarzu Św. Michał w srebrnej zbroi i obraz Krzysztofa Chodkiewicza w stroju polskim. Następnie chciałyśmy obejrzeć synagogę, ale nas nie wpuszczono, jak również i meczetu obejrzeć nie mogłyśmy, bo nie było klucza. Na tym zakończyłyśmy zwiedzanie miasta.

Cały ten dzień jednak był pochmurny, nawet po raz pierwszy od wyruszenia z Wilna padał deszcz. Więc wcześnie położyłyśmy się spać, żeby nazajutrz wcześnie wyruszyć nad Świteź. W nocy (właściwie była to godzina 1-sza, ale nam wydawało się, że była to już głucha noc, bo wcześnie się położyłyśmy) posłyszałyśmy nagle straszny hałas, ujrzałyśmy światło w sąsiednim pokoju i w ogóle wszelkie oznaki, po których sądząc można było przypuszczać jakiś napad, najście lub [s. 29] coś podobnego, więc Maryńcia zapaliła kinkiet, a ja w każdej chwili byłam gotowa chwycić "za lwa" [pistolet. — *Red.*], ale wkrótce uspokoiłyśmy się, bo domyśliłyśmy się, że to nasi współlokatorzy, dwaj uczniowie, wrócili na noc do bursy i narobili tyle hałasu. Dzień VI był jedynym dniem, w którym zjadłyśmy obiad (z ogniska).

VII dzień (piątek) — 20 VII

Wstałyśmy rano o 7-mej, zamiast o 4-tej i o 7.30 wyruszyłyśmy przez ul. Piłsudskiego (dawną Walowską) do Świtezi. Droga na razie nie była ciekawa, bo wciąż mijałyśmy robotników pracujących przy budowie szosy na tej drodze, którą szłyśmy. Przed Przyłukami był ładny las. Ale do stacji kolejki wąskotorowej Przyłuki w żaden sposób dojść nie mogłyśmy, chociaż są one na sztabówce. Więc przypuszczamy, że te Przyłuki są tylko w projekcie jeszcze.

Od Nowogródka do Świtezi jest 21 km. Jakieś 5 km przed Świtezią zboczyłyśmy trochę, żeby obejrzeć [s. 30] Czombrów pp. Karpowiczów, który podobno miał być Soplicowem. Podobał mi się dwór biały. "Wśród takich pól przed laty nad brzegiem ruczaju, na pagórku niewielkim, we brzozowym gaju, stał dwór szlachecki z drzewa lecz podmurowany, świeciły się z daleka pobielane ściany". Wszystko się zgadza z opisem, ale sobie dotychczas nie takim jak Czombrów wyobrażałam Soplicowo. Ale teraz już ile razy myślę o Soplicowie, widzę przed oczyma obraz Czombrowa.

Wróciłyśmy tą samą drogą, którą przyszłyśmy do Walówki, tam na końcu wsi stoi cerkiewka mała na górze, właśnie ją odnawiali, więc nie zaglądałyśmy do środka. Do Świtezi już doszłyśmy lasem ładnym i tu wciąż w myślach kręciły

mi się słowa "ktokolwiek będziesz w nowogrodzkiej stronie, do Płużyn ciemnego boru wjechawszy, pomnij zatrzymać konia, byś się przypatrzył jezioru".

Byłyśmy już nad Świtezią koło 4.30 popołudniu. [s. 31] Rzeczy zostawiłyśmy w schronisku, a same wynajęłyśmy łódkę, żeby opłynąć jezioro naokoło. Jezioro jest bardzo ładne, ze wszystkich stron otoczone "ciemnym borem". Dla mnie zresztą nigdy nie ma nic piękniejszego nad jezioro. Pływałyśmy dwie godziny i kąpałyśmy się na przeciwległym brzegu. Jezioro na razie trochę faliste, w środku pod wieczór całkiem się uspokoiło i było "gładkie jak szyba lodu".

W ogóle od Nowogródka rozpoczynając odczuwałam, że to jest ziemia Mickiewicza, na każdym kroku czułam bliskość ducha Mickiewicza, wciąż mi się przypominały jego utwory związane z tą ziemią.

VIII dzień (sobota) — 21 VII

Po przenocowaniu w Schronisku Towarzystwa Krajoznawczego musiałyśmy już ruszać w drogę, ale spotkałyśmy w schronisku takiego podróżnika jak i my, Poznaniaka, który przyszedł z Wilna przez Lidę pieszo ze swoim kolegą i rozstał się z nim w drodze, zostawiając mu mapy. [s. 32] Więc teraz miał go szukać w kierunku Nieśwież — Mir, a sam nie miał pojęcia gdzie to jest, więc pożyczał u nas mapy, żeby się zorientować. Ciekawam, czy znajdzie swego kolegę. Wątpię… Zapomniałam napisać jeszcze, żeśmy się w schronisku wpisały do księgi pamiątkowej w ten sposób :

20.VII.1928 Wanda Kukowiczówna i Maria Pfaffiusówna — przybyły tu pieszo z Wilna.

Więc VIII dnia podróży szłyśmy na razie lasem, potem drogą pagórkowatą, od czasu do czasu leśną, na Kamienny Bród, Soleniki i Rawiny ku Worończy. W Worończy zostawiłyśmy list do Diny, ale same nie zachodziłyśmy. Dwór w Worończy ładny stary drewniany, ale więcej mi się podobał dwór w Czombrowie. Właściciele Worończy, pp. Lubańscy, wydzierżawili swój majątek Żydom.

Do Tuhanowicz szłyśmy lasami. Parę ostatnich kilometrów podwiózł nas wieśniak, młody chłopak jadący do Tuhanowicz po siano. Przed parkiem w Tuhanowiczach [s. 33] jest mały domek leśniczówka. Tu zaszłyśmy, żeby zapytać o pozwolenie zwiedzenia parku. Mały chłopak, 12-letni harcerzyk, zaproponował, że nas oprowadzi, na co naturalnie zgodziłyśmy się.

25 VII 1928 — VIII dzień c. d.

Dziwnie smutne zrobiła na mnie wrażenie wiadomość, że w parku domu nie ma, że nikt teraz tam nie mieszka, wszystko jest zniszczone przez wojnę. Wprost bałam się, że się rozpłaczę. Później, gdy nas chłopak oprowadzał po parku i pokazał najpierw miejsce, gdzie stała murowanka, potem kamień, na którym dawniej był zegar, następnie altanę lipową, w której siadywał Mickiewicz z Marylą, a z której już kilka lip obecnie ubyło, wionęło na mnie również smut-

kiem, ale jednocześnie odczułam obecność w tych miejscach ducha Mickiewicza. A wskutek tego tak nikłymi i nic nie znaczącymi wydały mi się wszystkie przeżycia i uczucia nasze, nawet takie jak miłość. Tu przecież kochał Mickiewicz Marylę. [s. 34] I co z tego pozostało ? Pustka i smutek. Te i temu podobne refleksje mi się nasuwały i było mi strasznie smutno. A na widok stawów (jeden przed parkiem przy leśniczówce, a drugi w parku) przyszło mi na myśl, że tu właśnie odbywały się koncerty żab, które kazały Mickiewiczowi wyrazić przekonanie, że "żadne żaby nie grają tak pięknie, jak polskie". Gdy jest dobrze i lekko na sercu, wszystko wydaje się nam pięknym. Przeszłyśmy się jeszcze aleją grabową, po której chodził niegdyś Mickiewicz z Marylą, dalej aleją kasztanową, potem zaszłyśmy na górkę, na której niegdyś stała kapliczka, a z której pozostały tylko resztki i parę mogił rodziny Tuhanowskich obok.

I to wszystko — to co niegdyś tętniło życiem, obecnie tylko przypomina nam o tym, że wszystko przemija. Na ogół jednak park w Tuhanowiczach i teraz jest porządnie utrzymywany, bo stanowi własność Państwa, podobno ma tam być założona Szkoła Rolnicza. I znów te miejsca będą rozbrzmiewać życiem. Tym nie mniej żal, że to co było już nie wróci.

Z Tuhanowicz poszłyśmy przez Karczew, Drobysze, Skrobowo Dolne, Skrobowo Górne i maj. Skrobowo, następnie przez Wysorek do Zaosia. Doszłyśmy do Zaosia koło godz. 4-tej. Z daleka już z drogi zwróciły naszą uwagę dwa duże drzewa w okolicy Zaosia, ale nie wiedziałyśmy, że to [s. 35] właśnie są lipy, które osłaniały dom, w którym Mickiewicz się urodził. Obecnie niedaleko od tego miejsca stoi pomnik wystawiony Mickiewiczowi przez KOP. Spod pomnika poszłyśmy do tych lip. Z domu, naturalnie, ani śladu nie zostało.

W Zaosiu miałam wciąż wrażenie, że jestem na mogile Mickiewicza i ogarnął mnie cmentarny naprawdę nastrój. Może przyczyniła się do tego i pochmurna pogoda. Toteż, gdyśmy już wracały drogą do Horodyszcza z Zaosia zatrzymałyśmy się na małym cmentarzyku przy drodze, starym i zapuszczonym. Musiałam wprost pozostać chwilę sama zupełnie. Maryńcia się położyła, żeby wypocząć, a ja poszłam na cmentarz i tu byłam sama wśród mogił ze swoim smutkiem i jakąś nieokreśloną tęsknotą.

Tegoż dnia wieczorem doszłyśmy do Horodyszcza i tu przenocowałyśmy u jednego z gospodarzy w izbie szkolnej. Razem przeszłyśmy tego dnia pewno przeszło 45 km.

X dzień. Niedziela — 22 VII 28

Z rana o 6-tej wyjechałyśmy autobusem do Baranowicz. Od Horodyszcza do Baranowicz jest 21 km. Mogłyśmy przejść to piechotą, ale Maryńcia była zmęczona. Zresztą po co? Wszystko, co chciałyśmy, zobaczyłyśmy już. Po półtorej godziny jazdy byłyśmy w Baranowiczach. A ponieważ pociągi nasze (mój do Wilna odchodził o 6.32, a Maryńci do Warszawy o 6.30) odchodziły

dopiero koło 6.30, więc miałyśmy cały dzień przed sobą. Poszłyśmy więc na pole i przy drodze polnej wśród zbóż przesiedziałyśmy cały dzień. [s. 36] Pisałyśmy tu swoje pamiętniki i rozmawiałyśmy po trochu. I tu zrobiło nam się żal, że to już koniec. Bo chociaż w ciągu drogi bywałyśmy nieraz i zmęczone i głodne itd. i może nawet czasem zniechęcone, a jednak przyznać trzeba, że było nam naprawdę dobrze na tej wycieczce, i że warto było nawet trochę się pomęczyć, ażeby zobaczyć to, cośmy widziały i przeżyć to, cośmy przeżyły. "Wśród tych pagórków leśnych, wśród tych łąk zielonych szeroko nad błękitnym Niemnem rozciągnionych. Wśród tych pól malowanych zbożem rozmaitym, wyzłacanych pszenicą, posrebrzanych żytem …"

2 VIII 1928

W roku przyszłym w czasie lata pójdziemy z Anusią Duwel i Maryńcią (jeżeli ona zechce) do Suwalszczyzny. Tam wprawdzie nie ma takich pamiątek jak Tuhanowicze i Zaosie, ale jest tam też pięknie.

25 II 1932

Nie, już drugiej takiej wycieczki jak do Nowogródka nie zrobiłyśmy. Wszystkie następujące wakacje od 1928 r. spędziłam w Bereźnie. [Majątek – siedziba Szkoły Rolniczej, w której Wanda Kukowicz była nauczycielką. — *S. A.*]

1928 [s. 34a]

14 VII — sobota, I dzień. Wilno – M. Soleczniki, 42 km, pow. Wil.–Troc.

15 VII — niedziela, II dzień. M. Soleczniki – Bieniakonie, 14 km, pow. Lidzki.

16 VII — poniedziałek, III dzień. Bieniakonie – Berdowszczyzna, 35 km, pow. Lidzki i Wołożyn.

17 VII — wtorek, IV dzień. Berdowszczyzna – Iwje, 17 km, pow. Wołoż.

18 VII — środa, V dzień. Iwje – Nowogródek, 42 km, pow. Wołoż. i Nowogr.

19 VII — czwartek, VI dzień. Nowogródek.

20 VII — piątek, VII dzień. Nowogródek – Świteź, 21 km.

21 VII — sobota, VIII dzień. Świteź – Worończa – Tuhanowicze – Zaosie – Horodyszcze, 47 km.

22 VII — niedziela, IX dzień. Horodyszcze – Baranowicze, autobusem 21 km.

Razem kilometrów przeszłyśmy: 218.

ДЫСКУСІЯ

Мікола Багадзяж *(Мінск)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ І КАРАЛІНА САБАНСКАЯ

Ці гэта своеасаблівасць мыслення паэтаў, ці іх абаяльнасць, а можа, наканаванне лёсу, аднак факты сведчаць, што на іх шляху заўжды сустракаецца мноства жанчын. Прычым многія з іх становяцца "музамі", дзякуючы якім на белы свет з`яўляюцца цудоўныя вершы.

Сустракаліся такія жанчыны і ў жыцці А. Міцкевіча. Прычым адна з гэтых самых "муз", што натхніла паэта на цэлую серыю вершаў, прынесла яму не толькі радасць, але процьму пакут, а яшчэ і шпіёніла за ім па даручэнню паліцыі. Звалі яе Караліна Сабанская. Праўда, гэтае прозвішча было ў яе не першым і не апошнім. Паходзіла Караліна з роду Ржэвускіх. Прадстаўнікі гэтага сямейства вызначаліся авантурнымі схільнасцямі. Прыгадаем хаця б Эвеліну Ганскую, якая выйшла замуж за славутага французскага пісьменніка Анарэ Бальзака. А бабуля па бацькоўскай лініі страціла галаву на пласе разам з французскім каралём Людовік XVI і яго жонкай. Выхаваннем жа Караліны займалася дачка гэтай самай ахвяры Вялікай французскай рэвалюцыі. Пад яе ўплывам прыгожая дзяўчынка ператварылася ў сапраўдную пачвару. Цётка пераканала выхаванку, што прыгажосць жанчыны толькі тады чагосьці каштуе, калі яе дапаўняюць майстэрствам жыць і лоўкасцю. Навучыла жаночым хітрыкам. Зрабіла пляменніцу беспрынцыпнай, нахабнай і эгаістычнай асобай.

Не дзіва, што пасля такой падрыхтоўкі Сабанская з яе знешнасцю "ўскружыла галаву" не аднаму мужчыне. А яе прыгажосць была агульнапрызнанай. Усюды, дзе яна з'яўлялася, яе лічылі адной з самых бліскучых дам свету. І ўсюды ў яе было мноства прыхільнікаў. Не застаўся абыякавым да яе чараў і А. Міцкевіч. Праўда, лёс распарадзіўся так, што "зазяяла" гэтая чорная зорка не адразу. Напачатку яе яшчэ юнай дзяўчынай выдалі замуж за старэйшага за яе на 30 гадоў графа Ераніма Сабанскага. Муж завёз маладую жонку ў "глыбінку", у маёнтак Балунаўка на Падоллі.

Аднак Караліна нядоўга пражыла там. У хуткім часе яна дамаглася, каб яны перабраліся ў Адэсу, дзе Сабанскі з поспехам заняўся гандлем збожжа. Да гэтага Караліна некалькі разоў выязжала "ў свет" і паспела стаць каханкай генерала І. Віта, які з'яўляўся кіраўніком ваенных паселішчаў на поўдні Расіі. Яму ж "па сумяшчальніцтву" даручана было ўзначальваць мясцовую сакрэтную паліцэйскую службу. Сабанская амаль адразу была

прыцягнута каханкам і да шпіёнскай дзейнасці. Караліна не хавала сваіх інтымных адносін з генералам ні ад мужа, ні ад "свету", а нават бравіравала імі. Праўда, таму-сяму з закаханых у яе казала, што гэты саюз ёй цяжкі, бо генерал жанаты і спадзявацца на тое, што ён развядзецца, не даводзіцца. Аднак парваць з ім яна не рашаецца, бо адным узвышаным каханнем сыты не будзеш.

У сваім палацы ў Адэсе Сабанская, па модзе таго часу, стварыла літаратурны салон, які наведвалі славутасці не толькі з Еўропы — артысты, музыканты, літаратары, але і знатныя асобы з Усходу. Не абышоў яго сваёй увагай і Адам Міцкевіч у час высылкі. Так ужо атрымалася, што ў ліцэі Рышэлье, у якім ён намерваўся ўладкавацца на працу, вакантнага месца не аказалася. Верагодна, улады баяліся, што паэт акажа дрэнны ўплыў на погляды сваіх вучняў. Адам быў зачараваны горадам, у якім апынуўся. Ён цалкам аддаўся салоннаму жыццю. Пазней Міцкевіч аб гэтых часах казаў, што жыў тады "як паша". Бліжэйшыя яго сябры, з якімі ён ліставаўся, нават папракалі яго за тое, што ён адмовіўся ад сваіх палітычных поглядаў і што яго рамантычныя заляцанні не падыходзяць нацыянальнаму паэту і ссыльнаму.

У такім летуценным настроі Адам Міцкевіч наведаў аднойчы салон пані Сабанскай. І амаль адразу закахаўся ў прыгажуню-гаспадыню. Што гэта было — часовая ўспышка пачуцця ці сапраўднае каханне, цяжка сказаць. Даследчыкі не прыйшлі тут да агульнай думкі. Але паэт прысвяціў Сабанскай цэлую нізку вершаў. У іх і захапленне каханай, і палкія прызнанні, і радасць сустрэч, і ўдзячнасць.

А вось ці кахала яго Сабанская? Хутчэй за ўсё — не. Зразумела, ёй было прыемна, што ў яе закахаўся вядомы паэт, які да таго ж быў маладзейшы за яе на пяць гадоў. Якой з бяздушных какетак не спадабаецца, што ёй прысвячаюць вершы, што яе ўслаўляюць і ўзвялічваюць прызнаныя таленты? Да таго ж, гэта аблягчала ёй выкананне даручэння Віта аб слежцы за Міцкевічам.

Як бы там ні было, але Караліна прымусіла Адама Міцкевіча жыць у пекле няпэўнасці. То выказвала гарачыя пачуцці, то адштурхоўвала. Прымушала раўнаваць, абвінавачваць у нявернасці. У роспачы паэт пісаў пра свой боль. І тут жа дараваў ёй.

Спатрэбіўся час, каб паэт, нарэшце, ачуняў ад наслання. Даў клятву, што далей яго вершы будуць камянець пры яе імені.

У сувязі з усёй гісторыяй узнікае пытанне, ці здагадваўся паэт аб тым, што Караліна была шпіёнкай. Без сумнення — не. Ён, праўда, ведаў, што акружэнне яе — і Віт, і арнітолаг А. Важняк, і яшчэ цэлы шэраг знаёмых цесна звязаны з сакрэтнай паліцыяй. А Сабанскую нават не падазраваў. Больш таго, у час больш позніх сустрэч, якія адбываліся ў іх то ў Пецяр-

бургу, то ў Рыме, то ў Парыжы, адносіўся да былой каханай хоць і стрымана, але з павагай. Цікава і тое, што Сабанская ў сваім даносе генералу гэтаксама не прывяла ніводнага прыкладу крамольных паводзін ці выказванняў Міцкевіча. Некаторыя з даследчыкі робяць з гэтага выснову, быццам бы прыгажуня-шпіёнка была ўсё ж закаханая ў паэта. А Міцкевіч хутчэй за ўсё быў падуладны пачуццям.

Анджэй Корын *(Варшава)*

СПАДЧЫНА ПАЭТА — ВЫШЭЙ ПАЛІТЫКІ!

Хачу нагадаць праблему, якая на нашых пасяджэннях закраналася толькі ўскосным чынам, як другарадная.

Вядома, што кожны народ ганарыцца сваімі вялікімі творцамі. Яны з'яўляюцца важным элементам яго гісторыі і нацыянальнай свядомасці. Але таксама відавочна і тое, што творцаў гэтых часта выкарыстоўвалі і працягваюць выкарыстоўваць палітыкі, ідэолагі, а таксама разнастайныя палітычна-грамадскія плыні ў карыслівых мэтах. І ўжо іншая справа — у пазітыўных ці ў негатыўных паводле нашага разумення.

Не магло такое абмінуць і выдатную постаць з пантэона польскіх творцаў. Тым больш што яго асоба давала для гэтага шырокае поле дзейнасці. Адам Міцкевіч на працягу свайго палітычна заангажаванага жыцця выступаў то змоўшчыкам і ссыльным, крытыкам царызму і дэспатычнага ладу ў Расіі, то сябрам расійскіх дзекабрыстаў, прапагандыстам славянскай ідэі, быў нібы зачараваны сілай Расійскай імперыі, а ў перыяд "тавянізму" яго абвінавачвалі нават у царафільстве. З аднаго боку — чалавек глыбока рэлігійны ўпадаў у містыку, кансерватар ў бачанні многіх падзей, пясняр ідэалізаванай сармацкай Рэчы Паспалітай, а з другога — апалагет рэвалюцыі, рэдактар "Трыбуны народаў", які з адабрэннем ўжываў слова "сацыялізм", ерэтык, што прамаўляў вуснамі Конрада. Нельга таксама забываць, што быў ён вялікім паэтам, выхаваным на спадчыне шматнацыянальнай Рэчы Паспалітай, заглыбленым у польскую культуру і польскія дзяржаўныя традыцыі, выхадцам з сям'і беларускага паходжання, лічыў сваёй айчынай Літву. Усё гэта не толькі стварала яго складаную біяграфію, але таксама адлюстроўвалася ў яго творчасці. Адам Міцкевіч заўсёды лічыўся вялікім паэтам, але ў розныя эпохі нечага іншага, апрача універсальных паэтычных каштоўнасцей, шукалі ў яго творах, часта інтэрпрэтуючы іх інакш, а розныя палітычныя сілы імкнуліся яго "прысвоіць", выкарыстаць яго асобу і творчасць. На гэтай канферэнцыі ў дакладах прафесараў Вікторыі Слівоўскай і Яўгеніі Кухарскай выдатна паказана, якое значэн-

не мела яго паэзія для палякаў у перыяд падзелаў дзяржавы і якія парадаксальныя прыёмы ўжывала царская цэнзура, каб гэтую творчасць выкарыстаць у сваіх інтарэсах.

Я хачу звярнуцца да двух прыкладаў з больш позняга часу. Першы адносіцца да 1920 г., перыяду польска-бальшавіцкай вайны. У той час А. Міцкевіч быў адным з сімвалаў Рэчы Паспалітай, на які часта спасылаліся. З другога ж боку, яго разам з Аляксандрам Пушкіным выкарыстоўвалі бальшавікі ў час антыпольскай прапаганды (пра гэта піша ў сваёй кнізе Аляксандра Лейнванд "Мастацтва на службе утопіі: Аб палітычных і прапагандысцкіх функцыях выяўленчага мастацтва ў Савецкай Расіі ў 1917–1922 гадах", выдадзенай ў Варшаве ў 1998 г. С. 152). Прадстаўленне яго як рэвалюцыянера, што варожа адносіўся да "панскай Польшчы" і яе сімвала — белага арла, было сапраўды смелым "злоўжываннем".

Уплыў палітыкі на ўспрыняцце творчасці Міцкевіча быў асабліва заўважальны ў перыяд так званай Народнай Польшчы, у часы панавання ідэалогіі, якая па таталітарнай сутнасці імкнулася ўсё падпарадкаваць і прыстасаваць да сваіх інтарэсаў. У тым ліку, безумоўна ж, значнасць і вялікасць ва ўяўленні народа А. Міцкевіча. У навучанні, публіцыстыцы і літаратурнай крытыцы на першы план вылучаліся яго рэвалюцыйнасць, славянафільства, сувязі з перадавымі прадстаўнікамі рускага народа, дзекабрыстамі, А. Пушкіным), факт насычэння яго творчасці народнымі элементамі (прыгадаем тут працу Стэфана Жулкеўскага "Спрэчка пра Міцкевіча", выдадзеную ў Варшаве ў 1952 г., ці ўступнае слова Баляслава Берута да нацыянальнага выдання твораў А. Міцкевіча, якое выйшла ў Варшаве ў 1951–1955 гг.).

Грамадскасць жа, асабліва інтэлігенцыя, слаі, што былі апазіцыйна настроены ў дачыненні да рэчаіснасці, успрымала творчасць Міцкевіча інакш, па-свойму. Бачыла ў ёй сувязь з веліччу Рэчы Паспалітай, заўважала антырасійскасць, што ў свой час асацыіравалася з антысавецкасцю. Асабліва гэта датычылася драмы "Дзяды". Інсцэніроўка Аляксандра Бардзіні 1955 г. з'явілася свайго роду ферментам, які выклікаў хваляванні, што распачаліся ў 1956 г. А найбольш гучная інсцэніроўка Казімежа Дэймека, знятая, дарэчы, са сцэны, стала непасрэдным стымулам сакавіцкіх падзей 1968 г. Эмоцыі выклікала таксама пастаноўка Конрада Свінарскага, якая ўпісалася ў грамадскія настроі перад парывам 1980 г. Актуальна ўспрымаўся таксама і "Конрад Валенрод". Напрыклад, у палітычны слоўнік было ўключана паняцце "валендарызм", якое, дарэчы, ацэньвалася неадназначна.

Можна заўважыць, што чым большае напружанне і падзел назіраліся ў палітычным жыцці, тым большай была схільнасць да прапагандысцкага выкарыстання асобы і творчасці Адама Міцкевіча. Цяпер, калі адышло ў ня-

быт ідэалагічнае праўленне, ён прадстае перад намі ва ўсёй сваёй складанасці. А калі яго талент і павінен служыць палітыцы, то, хутчэй, як фактар, што аб'ядноўвае народ. Гэта вельмі выразна выявілася на нашай канферэнцыі.

Захар Шыбека *(Мінск)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ І БЕЛАРУСКАЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ ТРАДЫЦЫЯ

Некаторыя ўдзельнікі канферэнцыі імкнуліся паказаць вялікага польскага паэта і беларускім. Але калі ён наш, то што зрабіў для Беларусі? Прыкладаў яго беларускасці, акрамя паходжання, не так ужо і шмат. А доктар Мікалай Нікалаеў нават запытаў, наколькі Адам Міцкевіч шкодны для нас. І беларусіст з Санкт-Пецярбурга ў нейкім сэнсе меў рацыю, бо не ў апошнюю чаргу менавіта талент Міцкевіча далучаў беларусаў-католікаў да польскай нацыі. Пасля прагляду п'есы "Дзяды" каталіцкая моладзь Мінска ў 1917 г. запісвалася ў польскі корпус генерала Ю. Доўбар-Мусніцкага, хоць і не ўсе ўмелі добра размаўляць па-польску.

На жаль, мы не можам назваць А. Міцкевіча беларускім паэтам. Мы страцілі яго. Ён увогуле можа стаць сімвалам нашых страт у XIX ст. Тады мы страцілі амаль ўсё. Можна сказаць, мы страцілі XIX стагоддзе.

Абазначым праз спадчыну А. Міцкевіча, да прыкладу, беларускую культурна-гістарычную традыцыю, якую мы страцілі або так і не набылі ў мінулым стагоддзі. Тады стане зразумелым, што гэтая традыцыя была, можа, нашай важнейшай стратай. Менавіта таму сучасным жыхарам Беларусі не стае пачуцця супольнасці лёсу, гонару за герояў мінулага. Гістарычная свядомасць беларусаў — нізкая.

У Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ) і Рэчы Паспалітай існавалі адна нацыя (шляхецкая), якая ўсюды мела аднолькавае сацыяльна-прававое становішча, і чатыры народы (беларусы, літоўцы, палякі, украінцы), адна шляхецкая элітарная культура і чатыры — народныя (беларуская, літоўская, польская, украінская). Просты люд знаходзіўся па-за рысай паўнапраўнага жыцця. Пры фарміраванні сучасных нацый праз кансалідацыю "вярхоў" і "нізоў" грамадства больш пашчасціла палякам. Яны аб'явілі шляхту і яе культуру польскімі, хоць гэтая шляхта ўзрасла з чатырох народаў, а элітарная культура — на глебе чатырох народных культур. І вось мы зараз імкнемся падзяліць шляхту і высокую культуру былой Рэчы Паспалітай з палякамі, літоўцамі, украінцамі. Імкнемся падзяліць і А. Міцкевіча, які ўзрос на той жа шляхецкай культуры былой Рэчы Паспалітай.

У нас была адзіная дзяржава — Рэч Паспалітая. Пры фарміраванні нацыянальных дзяржаў зноў пашчасціла палякам. Яны аб'явілі гэтую дзяржаву польскай. Літоўцы паспелі "прыватызаваць" ВКЛ, аўтаномную частку Рэчы Паспалітай. Украінцы нібыта задаволіліся Гетманаўшчынай. Беларусам не засталося нічога. Афіцыйная расійска-савецкая навука і асвета выстаўляла Рэч Паспалітую выключна польскай дзяржавай, насаджала ў Беларусі расійскі рэгіяналізм і правінцыялізм. Савецкія навукоўцы па загаду зверху гісторыю беларускай дзяржавы пачыналі з моманту абвяшчэння БССР (1919). І вось мы зараз вядзём спрэчкі: ВКЛ — дзяржава літоўская, беларуская, літоўска-беларуская або беларуска-літоўская…

Зразумець сучасных інтэлектуалаў Беларусі можна. Беларускай нацыі не хапае гісторыка-культурнага падмурка (традыцыі). Адсюль і імкненне "прыватызаваць" славу мінулых стагоддзяў, здабытую агульнымі намаганнямі продкаў не толькі беларусаў, але і суседніх народаў.

Але аб'яўляць цяпер былую высокую шляхецкую культуру Рэчы Паспалітай, некалі магутнае ВКЛ або геній А. Міцквіча, якія сілкаваліся і палякамі, і беларусамі, і літоўцамі, і ўкраінцамі, толькі беларускімі ці толькі польскімі, літоўскімі, украінскімі — проста немагчыма. Чыя ж у такім разе — спытаецеся вы — гэтая спадчына? Ніхто не запярэчыць: яна — спадчына былых жыхароў Рэчы Паспалітай і ВКЛ. Яна не польская, не беларуская, не літоўская, не ўкраінская. Яна — наша. Беларускі народ гэта добра разумеў і спяваў: "*Наш* Касцюшка слаўны быў". Усе мы, нашчадкі былых жыхароў Рэчы Паспалітай, маем права вывучаць гісторыю гэтай дзяржавы, ганарыцца яе героямі і культурнымі здабыткамі. Але толькі не нацыяналізаваць іх у сучасным сэнсе. Нацыяналізацыя данацыянальных з'яў, а гэта значыць мадэрнізацыя гістарычнага працэсу, безумоўна, спрыяе самасцвярджэнню кожнай з нацый, аднак у той жа час шкодзіць, на нашу думку, навуковасці і міжнацыянальнаму ўзаемаразуменню.

Таму беларусы не павінны паўтараць памылак сваіх суседзяў. Гэта суседзі павінны выпраўляць свае памылкі. Іначай праблема сумеснай гісторыка-культурнай спадчыны ўвогуле застанецца невырашальнай. І гэта найбольш праўдападобна.

Так, абвяшчэнне Беларусі ў 1991 г. незалежнай дзяржавай стварыла для суседніх з намі дзяржаў гістарыяграфічныя праблемы. Новай дзяржаве трэба было саступаць месца ў гістарычнай рэтраспектыве. Вопыт супрацоўніцтва гісторыкаў Беларусі, Літвы, Польшчы, Украіны, у тым ліку мой асабісты, сведчыць, што поўнае паразуменне тут немагчыма. Беларускія гісторыкі сутыкаюцца з жорсткай канкурэнцыяй за гістарычнае мінулае, асабліва з Літвой. Новая нацыянальная канцэпцыя гісторыі Беларусі, якая падрыхтавана да друку, дагэтуль не апублікавана. Ніхто не спяшаецца зрабіць

гэта. Не хапае грошай, мужнасці, разумення і добрай волі як у Беларусі, так і за яе межамі.

Адна з прычын у тым, што дагэтуль у Беларусі не ўсе вызначыліся, як адносіцца да Адама Міцкевіча, гэта значыць да нашай страчанай гісторыка-культурнай традыцыі.

…На шляху да сучаснай нацыі ў беларусаў былі вялікія страты, але былі і поспехі. Прыхільнікі дзяржаўна-палітычнай (функцыянальнай) мадэлі нацыі схільны перабольшваць нашыя страты ў мінулым (Рышард Радзік, Астрыд Заам і іншыя даследчыкі заходніх краін); прыхільнікі этна-культурнай (субстанцыянальнай) мадэлі нацыі (пераважна патрыятычна настроеныя беларускія даследчыкі) схільны перабольшваць нашыя мінулыя поспехі: беларуская нацыя як субстанцыя існавала заўсёды, але мела няшчасную долю. У першым выпадку Беларусь бачыцца без Адама Міцкевіча, у другім выпадку — разам з ім.

Для "функцыяналістаў" гісторыя беларусаў — нармальны нацыятворчы працэс, для "субстанцыяналістаў"— бясконцы ланцуг пакут і здзекаў. Але гэта — крайнасці. Насамрэч, у нас няма падстаў выдаваць гвалтоўную дэнацыяналізацыю беларусаў у складзе Расіі (як царскай, так і савецкай) за натуральны сацыя-культурны працэс, за нейкую нармальнасць. Этнацыд, можа, і быў тыповым для "не гістарычных" нацый, але яго нельга лічыць нормай. У той жа час і пастаянныя скаргі на цяжкі лёс толькі ўзмацняюць ушчэрбны вобраз Беларусі — няздольнай да незалежнага жыцця, гістарычнай няўдаліцы, які быў створаны яшчэ ў царскай гістарыяграфіі.

Што тычыцца будучыні нацыі, то збоку яна ацэньваецца ўдзельнікамі канферэнцыі з доляй памяркоўнага аптымізму (Эльжбета Смулкова, Базыль Бялаказовіч), тады як ва ўнутраных самаацэнках прысутнічаюць песімізм і разгубленась уперамешку з надзеяй на нейкі цуд. Але ці трэба асцерагацца дэнацыяналізацыі і чакаць скону беларускай нацыі, калі яна — справа нашых рук, згодна функцыяналістам, а тым больш, калі яна — вечная субстанцыя, выпрабаваная стагоддзямі, згодна субстанцыяналістам?!

…Народжаная незалежная Беларусь стала незапланаваным дзіцяткам Еўропы, якога ніхто не чакаў і якому ніхто асабліва не ўзрадаваўся. Беларусы сталі адзіным народам былой Рэчы Паспалітай, які не без падстаў дагэтуль не "ахрысцілі" сучаснай еўрапейскай нацыяй. Беларусь уяўляецца нейкім выпадковым новатворам. Сучасныя даследчыкі адзначаюць, што беларусы безнадзейна адсталі ў фарміраванні сучаснай нацыі, нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Але як тады магло здарыцца, што беларусы атрымалі дзяржаўную незалежнасць разам з іншымі народамі Цэнтральна-Усходняй Еўропы? Працэс нацыянальнага самасцвярджэння ў Беларусі працягваецца і цяпер — ужо на аснове расійскага правінцыялізму. І адхіленне ад агуль-

наеўрапейскай нормы нацыянальнага кшталтавання не ёсць падстава для аднясення беларускай нацыі да ліку другагатунковых.

І ўсё ж прычыны для такіх поглядаў застаюцца. Слабыя звычайна лемантуюць і даказваюць свае правы. Моцныя проста карыстаюцца дабротамі жыцця. Так і талентам Адама Міцкевіча трэба проста карыстацца. Урэшце, дзяржаўны суверэнітэт, калі ён сапраўды існуе, дае жыхарам Беларусі права і на суверэнітэт духоўны, які не толькі “абясшкоджвае” Адама Міцкевіча, але і робіць яго прысутнасць ў беларускай гісторыка-культурнай традыцыі проста неабходнай.



СПАДЧЫНА АДАМА МІЦКЕВІЧА

ФІЛАЛАГІЧНЫ І КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ АСПЕКТЫ

Навагрудак. Дом, дзе жыў Адам Міцкевіч.
Рэпрадукцыя дарэвалюцыйнай паштоўкі са зборaў Цэнтра імя Ф. Скарыны

Базыль Бялаказовіч *(Варшава – Ольштын)*

БЕЛАРУСКІЯ ЭЛЕМЕНТЫ, МАТЫВЫ І СЮЖЭТЫ Ў ТВОРЧАСЦІ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Дадзены рэферат з'яўляецца пашырэннем і прадаўжэннем разважанняў, выкладзеных у першым раздзеле маёй кніжкі, прысвечанай асобным праблемам фарміравання беларускай нацыянальнай свядомасці [1]. У гэтым працэсе велізарную ролю, якую проста цяжка пераацаніць, адыграла творчасць Адама Міцкевіча, рашучым чынам уплываючы на генезіс, развіццё і форму сучаснай беларускай літаратуры, якая адлюстроўвае і фарміруе нацыянальную свядомасць беларусаў.

Кім жа быў Міцкевіч: палякам, беларусам, літоўцам, паэтам польскім, ці таксама беларускім або літоўскім, які, аднак, пісаў па-польску, апяваў гісторыю, народ і пейзаж Беларусі і Літвы, які звяртаўся, ужываў і пераўтвараў у свае непераўзыдзеныя мастацкія формы польскага паэтычнага слова скарбы мясцовай народнай творчасці.

Богдан Скарадзінскі, які піша пад псеўданімам Казімеж Падляскі, пытаўся: "Ці прыгожая Беларусь? Калі хто любіць пастэльныя, меланхалічныя колеры і краявіды, а таксама зелень і ваду, — то гэта так. Адам Міцкевіч у "Пане Тадэвушу" або "Свіцязянцы" проста моліцца на беларускі пейзаж, хоць называе яго "Літва". Можа, і ён і мы кіраваліся нейкім асаблівым сентыментам. Але ці можам атрымаць эстэтычную асалоду без густу і сентыментаў?" [2]

І тут узнікае праблема паходжання і нацыянальнай прыналежнасці Міцкевіча. Польская журналістка Эва Вільк, якая наведала мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю аўтара "Дзядоў" у Беларусі, успамінае сваю размову пры перасячэнні мяжы на зваротным шляху: "У цягніку, які ехаў у Польшчу, беларускі пагранічнік няспешна разглядваў дакументы: — У Навагрудку былі? — Нягледзячы на тое, што была сярэдзіна ночы, ён быў схільны пагаварыць. — Ну так, былі, гадавіна набліжаецца. Сам прэзідэнт Лукашэнка прыедзе, ідзе вялікая падрыхтоўка. Адам Міцкевіч, вы напэўна ведаеце, наш народны вяшчун… — Ваш? Хутчэй наш. Тут жа тады была Расія, ці не так? — На твары пагранічніка застывае ўсмешка, якую цяжка зразумець. Кпіць, права-

[1] Białokozowicz B. Białoruskie korzenie Adama Mickiewicza: Litografia Józefa Oziębłowskiego "Niewolnik słowiański — Biełorusskij rab" w percepcji Adama Mickiewicza i Aleksandra Hercena // Białokozowicz B. Między Wschodem a Zachodem: Z dziejów formowania się białoruskiej świadomości narodowej. Białystok, 1998. S. 19–43.

[2] Podlaski K. [Skaradziński Bohdan]. Białorusini, Litwini, Ukraińcy. Białystok, 1990. S. 18.

куе ці таксама, як і мноства іншых беларусаў, ліхаманкава спрабуе ўпарадкаваць сваю гістарычную і нацыянальную свядомасць? 200-гадовы юбілей народнага паэта справакаваў там немалое замяшанне” [3].

І сапраўды, “імкненне ўпарадкаваць сваю гістарычную і нацыянальную свядомасць” выклікае ў Беларусі “немалое замяшанне”, нараджаючы мноства дыскусій і палеміку, якія тычацца Міцкевіча. Аб гэтым пісаў Ежы Гашчыньскі ў сваёй карэспандэнцыі з Мінска: “Тыя, хто залічвае Міцкевіча да беларускай літаратуры, матывуюць сваё перакананне тым, што ў сваёй творчасці паэт выкарыстоўваў народныя песні, паданні, не гаворачы ўжо пра месца нараджэння, а таксама ведаў беларускую мову (хоць называў яе літоўскай, бо сённяшняя літоўская тады называлася жмудскай), называў беларускую мову найменш засмечанай сярод іншых славянскіх моваў” [4].

Не бывае дыму без агню. Сакрэт такіх дыскусій, спрэчак і палемікі крыецца ў спадчыне, традыцыях і атрыманні ў спадчыну поліэтнічнасці, розных рэлігій, культур, якія ўтваралі побач з Польскай Каронай Рэч Паспалітую двух народаў ці, як сцвярджаюць некаторыя, чатырох народаў. Гісторык Ежы Клачоўскі, уважлівы і добрасумленны даследчык гісторыі, дырэктар Інстытута Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў Любліне, вышэйназваныя праблемы тлумачыць у сваім глыбокім і сінтэтычным заключэнні так: “Рэч Паспалітая часта ў нашай гістарыяграфіі трактавалася проста як Польшча. На працягу многіх вякоў мы занадта жахліва прысвойвалі сабе гэтую дзяржаву і глядзелі на яе з перспектывы нашых нацыянальных інтарэсаў. Польшча безумоўна была састаўляючай часткай Рэчы Паспалітай, але гэтай Рэччу Паспалітай мы павінны падзяліцца. Мы павінны зразумець, што была яна ў аднолькавай ступені дзяржавай палякаў, літоўцаў, беларусаў, украінцаў. Мы не можам забыць і пра вялікую ролю Германіі, а таксама каралеўскай і княжацкай Прусіі, якая доўгі час была васалам Рэчы Паспалітай, а таксама і пра яўрэяў, якія стварылі на гэтых тэрыторыях сваю унікальную культуру.

Гледзячы на гэтую праблему з еўрапейскай перспектывы, можна сцвярджаць, што былая Рэч Паспалітая была унікальным аб’яднаннем разнастайных элементаў, сплавам культур. У ёй перамяшаліся цывілізацыя Захаду і традыцыі Русі з элементамі культуры балтаў. Толькі гэта ўсё разам і складае Рэч Паспалітую, у якой сёння, праз два вякі пасля яе заняпаду, агульныя карані могуць знайсці палякі, беларусы, літоўцы, украінцы, якія жывуць у асобных дзяржавах” [5].

---

[3] Wilk E. Na własne oczy: Wieszcz Wasz czy Nasz // Polityka. 1998. 12 wrześ.

[4] Haszczyński J. Poeta białoruski czy tylko urodzony na Białorusi: Spór o Wieszcza // Rzeczpospolita. 1998. 18 sierp.

[5] O Unii Lubelskiej i Unii Europejskiej / Z profesorem Jerzym Kłoczowskim rozm. Paweł Wroński // Magazyn Gazety Wyborczej. 1998. 29–30 maja.

Такі пункт погляду з'яўляецца найбольш навукова аб'ектыўным і таму метадалагічна канструктыўным — таксама пры ацэнцы творчасці А. Міцкевіча як агульнай культурнай спадчыны Рэчы Паспалітай двух ці чатырох народаў. Маючы, напэўна, усё гэта на ўвазе, А. Мальдзіс канстатаваў: "Я прасачыў усю творчасць паэта, увесь яго інтэлектуальны і філасофскі шлях і прыйшоў да такой высновы. Перш за ўсё Міцкевіч як паэт быў вялікім патрыётам Навагрудчыны, як філосаф быў патрыётам Вялікага Княства Літоўскага. І як эмігрыйны дзеяч — патрыётам Рэчы Паспалітай. Таму, думаю, ён належыць усім народам Рэчы Паспалітай, ён — і ні ваш, і ні наш" [6].

Первоосновой баллады “Люблю я” некоторые литературоведы (О. Лойко) считают белорусские народные сказки о смелом сыне (записана П. Шейном), девушке, проклятой отцом (записана Е. Романовым), и поверье жителей белорусского местечка Цирин (представленным Л. Подгурским-Околовым). В сказках герои не находят успокоения после смерти, так как их никто не накажет их же грехом. Проклятая отцом девушка страдает, ибо при жизни ненавидела мужчин и не прощала им даже ношения бороды. За это после смерти она превратилась в бородатое привидение. Страдания ее закончились после того, как живой цирюльник сбрил ей бороду.

Мицкевич заявил, что “Люблю я” он создал, чтобы испугать Марылю. Поэт отказался от комического фактора сказки (сюжет о бородатой девушке) и ввел в балладу социальную проблему. Дочь первого пана в деревне (снова Марыля) отказывает огромному количеству женихов, в том числе и бедному Ясю, который умирает от горя. Умирает и сама героиня. Согласно морали народа, она не выполнила своего предназначения: никого не полюбила и не создала семьи, не родила детей. В этом заключается ее грех и наказание за него — вечное страдание. Согласно преданию, после смерти она бродит по земле и просит людей сказать слово, которого она не сказала при жизни своему возлюбленному. В балладе — это короткая фраза “люблю я”, она возвращает покой героине и освобождает лирического героя от страха. Обратим внимание на ироническое толкование сюжетной коллизии Мицкевичем: “Эта баллада, — пишет он, — является толкованием сельской песни, она заключает ошибочное мнение и противоречит науке о чистилище, но мы не посмели ничего изменить, чтобы сохранить характер деревни и позволить узнать суеверия нашего народа” [48].

Небезынтересны баллады “Пани Твардовская” и “Тукай”, в основе которых лежат также белорусские поверья и волшебные сказки. Белорусские исследователи Л. Сагарев, О. Лойко ссылаются на записи Шейна и Романова, в которых представлены белорусские версии сказок о том, что бес сидит на дне чарки и может выйти оттуда, чтобы дурачить людей. Они, по утверждению исследователей [49], послужили источником для создания “Пани Твардовской”.

Что касается “Тукая”, то его первоосновой О. Лойко считает белорусскую версию предания, напечатанного Ольбрихтом Радзивиллом еще в 1635 г., об испанце Мархионе, который, желая стать вечно молодым и по-

[48] Mickiewicz A. Dzieła poetyckie. T. 1. S. 495.

[49] Лойка А. Адам Міцкевіч і беларуская літаратура. С. 58; Сагароў Л. Матывы беларускага фальклору ў “Баладах і рамансах” Адама Міцкевіча // Беларусь. 1955. № 11. С. 14.

лучить бессмертие, приказал себя изрубить на части и на год похоронить в конюшне. Трудно согласиться с этой версией по нескольким причинам.

В "Тукае" Мицкевич, показав реалии белорусской жизни, характеры шляхтичей новогрудских застенков, одновременно ввел сюжетный мотив "Немецких народных книг" о докторе Фаусте, связанный с подписанием договора с Мефистофелем (у славян такого дьявола не было и нет) и омоложением Фауста. Следовательно, Мицкевич был знаком если не с "Немецкими народными книгами", то с первой частью трагедии Гете "Фауст", влияние которой явно ощущается и в "Тукае", и в "Пани Твардовской". Последняя создана на основе сюжетного узла Мефистофеля и Марты, когда дьявол спасается бегством от слишком настойчивой в любви женщины.

Несколько особняком в сборнике стоят баллады на нравственно-бытовые темы — "Возвращение отца" и "Лилии", в которых Мицкевич не отходит от широко известных в белорусском фольклоре источников. Сюжет возвращения отца и его спасения от рук разбойников молитвой детей существует во множествах записей песен и сказок почти без изменений, как и сказки и песни о жестокой жене, убившей мужа, на могиле которого вырастают цветы, кусты роз или деревья, помогающие раскрыть преступление. Мицкевич полностью переносит в баллады сюжеты фольклорных источников, но придает им необыкновенное поэтическое очарование. В обоих случаях поэт придерживается песенного ритма, напевности речи, использует песенные рефрены.

На основе сказанного можно сделать следующие выводы:

• На формирование эстетического сознания А. Мицкевича белорусский фольклор оказал серьезное влияние.

• Отношение поэта к фольклору носило творческий характер и изменялось в течение его жизни.

• Фольклор помогал Мицкевичу в поисках "живой правды" и давал возможность серьезно аргументировать свои идейно-художественные открытия.

• Фольклор не был самоцелью в творчестве поэта. Он прибегал к различным методам и способам его использования: стилизации, переосмыслению, контаминации, новым трактовкам известных сюжетов.

• Мицкевич уважительно относился к нравственным устоям белорусского народа. При использовании фольклорных источников он всегда четко проводил границу между добром и злом и наказывал последнее.

• Фольклор помог Мицкевичу понять красоту и душу белорусского народа, прикоснуться к реалиям его жизни и быта, полюбить его песни, сказки, предания.

• Белорусский фольклор помог Мицкевичу вырасти в великого и оригинального польского поэта, воспевшего свою маленькую родину Новогрудчину, которая стала известна всему миру.

Вера Рыч *(Лондан)*

НЕКАЛЬКІ ДУМАК ПРА “КРЫМСКІЯ САНЕТЫ”

У “Крымскіх санетах” Адам Міцкевіч некалькі разоў гаворыць ад імя “пілігрыма”. У літаратурным кантэксце гэта слова мае некалькі значэнняў:

1) асоба, якая падарожнічае па рэлігійных ці асабістых прычынах, маючы намер вярнуцца дадому, як, напрыклад, пілігрымы ў “Кентэрберыйскіх гісторыях” Чосера;

2) асоба, якая пакідае радзіму дзеля вандроўкі па свеце, на “pelegrinatio”, без ясна акрэсленай мэты — і / ці без намеру або мажлівасці вяртання дадому; гэтак, як, напрыклад, Чальд Гарольд у Байрана ці (у шырокім разуменні) Эней — дзеля “заснавання” новай радзімы недзе на нязнаным і загадкавым Захадзе;

3) сімвалічны падарожнік, які ідзе па дарозе, наканаванай нам усім, — па шляху ад нараджэння да смерці ці (для вернікаў) ад зямнога жыцця да збавення, — гэтак, як пілігрым Норвіда ці Хрысціян і яго спадарожнікі ў “Шляху пілігрыма” Буніяна.

Гэтыя тры канцэпцыі адна адну не выключаюць: пілігрым у сэнсах 1 і 2 можа зазнаць на сваім шляху пэўны значны душафармуючы досвед, — зрэшты, гэты досвед і маецца на ўвазе сярод мэт пілігрымства ў першым значэнні. Ён паўстае таксама літаратурнай неабходнасцю, каб вынікі літаратурнай “пілігрымкі” першага ці другога тыпу не ператварыліся ў простыя нататкі ці, як у Чосера, рамку для народных гісторый, ніяк паміж сабой не звязаных.

У якім сэнсе ўжывае гэтае слова Міцкевіч? Наколькі яго падарожжа ў Крым было “пілігрымкай”? Я тут не кажу пра дакладныя факты, а пра ўнутраную логіку цыкла. І ў гэтым сэнсе тут, падобна, ёсць “пілігрымка” другога тыпу — таго, выдатным прыкладам якога з’яўляецца Чальд Гарольд Байрана.

Па-першае, можна заўважыць, што нягледзячы на пачатак Міцкевічавага падарожжа па сушы, у санеце “Акерманскія стэпы” яно апісваецца з выкарыстаннем “марской” вобразнасці:

> Wpłynąłem na suchego przestwór oceanu…
> Wóz nurza się w zieloność i jak łódka brodzi
> Śród fali łąk szumiących…

У працытаваных радках выказаны падсвядомыя намёкі на згаданую вышэй душафармуючую перапетыю: праходжанне праз ваду з’яўляецца моцным архетыпам і самой смерці і, як у хрышчэнні, смерці старога жыцця і нараджэння новага рытуалам пераходу. Мора сімвалізуе таксама падсвядомасны розум і той боль, які хаваецца ў ім, — канцэпцыя, якая інтуі-

тыўна ўспрымалася паэтамі задоўга да заснавальнікаў псіхіятрыі. І ў іншым санеце, “Марская ціша”, паўстае паралель паміж марскім паліпам,

co śpi na dnie, kiedź niebo się chmurzy
A na ciszę długimi wzwija ramiony

і “гідрай успамінаў”:

Co śpi wpośród złych losów i namiętnej burzy,
A gdy serce spokojne, zatapia w nim szpony.

Адзін з першых даследчыкаў санетаў, Маўрыцы Махнацкі, наступным чынам інтэрпрэтаваў вобраз: “Гэтае параўнанне марской цішыні з уяўным спакоем страснай душы, гэты пераход ад рэальнай з’явы да думкі, ад развагі да натхнення з’яўляюцца дзіўнаватымі, прывіднымі і сапраўды паэтычнымі…” Калі я правільна разумею слова “натхненне”, Махнацкі бачыў у “паліпе” і “гідры памяці” сімвал паэтычнага натхнення, — падобна да вызначэння ў Вордсварта крыніцы паэзіі як “эмоцыі, прыгаданай у спакоі”. Але ці ж гэта меў на ўвазе Міцкевіч? У маім разуменні, працытаваныя радкі кажуць, хутчэй за ўсё, пра боль успамінаў, якія падарожнік можа прыглушыць на час ва ўражаннях і прыгодах, шукаючы жыццёвых бур — як у знакамітым радку Лермантава: “Как будто в буре есть покой…”, — той боль, калі суцішацца буры, вярэдзіць душу зноў.

Насамрэч, у адным з наступных санетаў цыкла, “Байдары”, Міцкевіч звяртаецца да падобнага вобраза — бяссоннага паэта, які сягае ў самае ўлонне мора.

Ці ж гэта не ўзнаўленне таго байранаўскага рамантычнага “пілігрыма”, які шукае ў прыгодах ў час паломніцтва палёгкі ад цяжару ўспамінаў? Калі так, то згаданыя радкі трэба разумець у шчыльнай сувязі з наступным месцам у санеце “Акерманскія стэпы”, дзе ў цішы раптам напружыўся слых паэта — “…słyszałbym głos z Litwy”.

І сапраўды, Махнацкі сам пазней знаходзіць адгалоскі байранаўскага “Чальд Гарольда” ў чацвёртым санеце “Бура”:

Jeden podróżny siedział w milczeniu na stronie
I pomyślił: szczęśliwy, kto siły postrada,
Albo modlić się umie, lub ma z kim się żegnać.

Канцэпцыя паэта менавіта як пілігрыма з’яўляецца ў пятым санеце “Выгляд гор ад стэпаў Казлова”. Гэта першы верш, які быў, што дакладна вядома, напісаны ў Крыме, хаця трэба прыгадаць, што ў чарнавіку паэт пазначыў яго сабе проста як “падарожны”. Санет прымае форму дыялога паміж пілігрымам і мірзой (у выданні Асалінэум апошняе слова патлумачана як “татарскі шляхціц (раней княжацкі тытул”). “Што, — пытаецца пілігрым, — гэта за казачны далягляд нібыта з вежамі?” Пра паходжанне

таго далягляду ён выказвае розныя здагадкі, цудоўныя прычыны, як пра дзею рук Алаха, анёла ці шайтана. Важна зазначыць, што ў першым з тлумачэнняў зноў прысутнічаюць марскія вобразы: Алах, уяўляе ён, “postawił ścianą morze lodu” — падобны вобраз праз дзесяцігоддзі выкарыстаў Іван Франко пры апісанні сцяны страчанага раю ў паэме “Смерць Каіна”, хаця ў сцяною там паўстае ледавік, а не марскі лёд.

Асабліва цікавым з’яўляецца выкарыстанне санетнай формы ў “Выглядзе гор ад стэпаў Казлова”. Як і належыць у санеце, мы знаходзім там істотнае перапыненне думкі ў восьмым радку. У актаве паэт задае пытанні — і трэба было б чакаць, што ў далейшых радках мірза дасць адказы. Але гэтага не адбываецца, той проста кажа: “Tam? Byłem…” — і апісвае сваё ўзыходжанне на гару. Толькі пасля чатырнаццатага радка, г. зн. калі санет мусіў ужо скончыцца, мірза называе тую гару: “То Чатырдаг”, а пілігрым усклікае ў захапленні. Гэтаксама форма верша, падаючы назву гары па-за належнымі межамі санета, павінна падкрэсліць дзіўную і звышнатуральную сутнасць той гары. Сапраўды, пазней мы бачым, што мірза лічыць гару сапраўднай святыняй, звяртаючыся да яе: “O, minarecie świata!.. ”

Мірза часам выступае як пасрэднік паміж пілігрымам і мусульманскім светам. У вершы “Могілкі гарэма” менавіта ён дазваляе (і просіць у Прарока прабачэння за дазвол) пілігрыму пабачыць магілу, дзе спачываюць тыя “эдэнскія ружы”, якія нават і пасля смерці застаюцца “na wieki zatajone niewiernemu oku”.

У іншым месцы цыкла, аднак, любоў мірзы да прыгажосці і велічы крымскай прыроды кантрастуе (праз паралелізм) з глыбокім смуткам пілігрыма.

І тут я хацела б прыгадаць на хвіліну адзін з яскравых момантаў пасля-сталінскай адлігі, калі ў лістападзе 1956 г. “Полымя” надрукавала санет Язэпа Пушчы, пра якога думалі, што ён згінуў у “чыстках” 30-х гг. — і які вярнуўся, нібы з мёртвых. У санеце Пушча паказвае, нібы ён стаіць на камянях Чарнаморскага ўзбярэжжа, чытае ўголас “Крымскія санеты” і раптам бачыць прад сабой Адама Міцкевіча. Чаму Міцкевіча? Вядома ж, па прычыне глыбокай паэтычнай сімпатыі ў эпістамалагічным сэнсе слова — агульнага досведу пакут, пакут выгнанніка, для якога нішто ў чужым краі не можа параўнацца з прыгажосцю роднай зямлі:

> Litwo! piały mi wdzięczniej twe szumiące lasy
> Niż słowiki Bajdaru, Salhiry dziewice;
> I weswlszy deptałem twoje trzęsawice,
> Niż rubinowe morwy, złote ananasy, —

гаворыць міцкевічаўскі пілігрым быццам у адказ на мірзавы пахвалы Чатырдагу. І праз увесь цыкл, праз усе шчодрыя апісанні прыгажосцяў і экзо-

тыкі Крыма, зробленыя ў квацістым стылі высокага рамантызму той нязменны тон тугі — увасоблены ў вобразе пілігрыма — і надае “Крымскім санетам”, прынамсі, для мяне, асаблівую моц і глыбіню.

Пераклад з англійскай мовы Мікалая Пачкаева (Кембрыдж)

Уладзімір Конан *(Мінск)*

ВОБРАЗЫ І МАТЫВЫ ЗЯМНОГА РАЮ Ў ПАЭЗІІ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Класічнае мастацтва, музыка і паэзія ў першую чаргу выяўляюць рай і пекла зямнога жыцця. І гэта зразумела, бо Стваральнік сусвету пасяліў нашых прабацькоў у садзе — раю. Пра гэта засведчыла першая біблейская кніга “Быццё”. Усе тры мадэлі раю — сельскі, гарадскі і нябесны — набылі значэнне архетыпаў для шматлікіх мастацкіх, сацыялагічных (у мроях сацыялістаў-утапістаў) і палітычных (ідэал дасканалага грамадства камуністаў) мадэляў зямнога раю — адкрытых (яны лёгка “прачытваюцца”) і прыкрытых, пераўтвораных у кантэксце спецыфічных мастацкіх значэнняў і сэнсаў.

Вобраз сялянскага раю сярод прыроды, дзе зняты ўсе сацыяльныя і псіхалагічныя супярэчнасці, — скразны матыў рамантычнай плыні новай беларускай літаратуры. У гэтым аспекце яна прадаўжала традыцыю сусветнай культуры — ад антычнасці і Рэнесансу, новаеўрапейскай літаратуры, творчасці англійскага паэта Джона Мільтана (1608–1674), аўтара эпічных паэм на біблейскія сюжэты “Страчаны рай” (1667) і “Вернуты рай” (1671). Але ў адрозненне ад сваіх айчынных і заходнееўрапейскіх папярэднікаў эпохі Сярэдневякоўя, Рэнесансу і Барока, якія рэдка выходзілі за тэматычныя рамкі біблейскіх архетыпаў і сюжэтаў, пачынальнікі новай беларускай літаратуры і яе класікі, застаючыся хрысціянамі, арыентаваліся на свецкую культуру. У іх творчасці біблейскія сюжэты і матывы набылі значэнне сімвалаў і экспрэсіўных выяўленчых сродкаў, пераадолена ранейшае простае цытаванне і запазычанне з Біблii.

Пекла і рай грамадскага жыцця, народа і яго паэта-песняра ў вобразе прарока нацыянальнага адраджэння — скразная тэма новай беларускай літаратуры. В. Дунін-Марцінкевіч (1808–1884) у вершаваным апавяданні “Люцынка, альбо Шведы на Літве” малітоўна звяртаўся да Усявышняга:

Божа наш! Ты шыбануў на зямлю чалавека,
І няшчасця бярэмя і шчасця адвеку
Ты прызначыў яму, выганяючы з раю, —
Як жа ў смутак душы яго любасць да краю

Ты ўліў? І чаму ён ля роднае нівы
Адчувае і вольным сябе і шчаслівым? [1]

(Пераклад з польскай мовы С. Дзяргая)

Першым творцам паэтычнага міфа пра сельска-шляхецкую Навагрудчыну як зямны рай быў польскі па мове, беларускі паводле радаводу і душэўнага складу Адам Міцкевіч (1798–1855). Аналіз ягонай творчасці дазваляе нам пераканацца ў тым, што за райскімі матывамі ў паэзіі хаваецца універсальная тайна духоўнага перажывання быцця ў мастацтве, яе архетыпічныя крыніцы і вобразы, псіхалагічна абумоўленыя памяццю пра дзіцячае ўспрыманне свету наогул, свайго "роднага кута" ў асаблівасці.

Бязгрэшнае дзіця ўспрымае свет як зямны рай, бачыць у ім ідэальна-рэальнае жыццё, свабоднае ад супярэчнасцей, пакуты і смерці. У гэтай жывой паэзіі дзіцячага перажывання ёсць спрадвечная праўда: Бог жа стварыў людскі свет па ўзору ідэальнага сада-раю, гэта засведчыла Біблія. Пасля грэхападзення чалавека прывілегія райскага жыцця, а дакладней, райскага яго ўспрымання, даецца бязгрэшнаму дзіцяці. Але і яму прыходзіцца перажываць несправядлівасць, самоту, варажнечу, дысгармонію, гэта значыць наканавана губляць свой рай, рэагаваць на боль і адсутнасць любові крыўдлівым плачам. У сталым веку кожны з нас перажывае сваё асабістае выгнанне з раю. Але мудры спасцігае вялікую праўду, сказаную Эклезіястам: "Так, не з праху выходзіць гора, і не з зямлі вырастае бяда; але чалавек нараджаецца на пакуты, як іскры, каб узнімацца ўверх" (Іоў 5:7).

Набываючы духоўны вопыт і мудрасць, таленавіты мастак захоўвае ў сабе дзіцячую, "галубіную" душу, свой райскі вобраз свету, ім пераадольвае "вароты пякельныя". У гэтым душэўным і духоўным не-старэнні, у мудрай "інфантыльнасці", верагодна, ёсць таямніца геніяльнасці — мастацкай і проста людской. Ёю шчодра быў адораны А. Міцкевіч. Перажыўшы ў сталыя гады пякельныя мукі выгнання, ён заўсёды вяртаўся ў сваёй паэзіі да навагрудскага раю свайго дзяцінства і юнацтва. У ковенскія настаўніцкія гады ён напісаў санет "Да Нёмана" (1820), дзе ўжо прадчуваецца развітанне з малой радзімай:

Нёман, рака мая! Вечна імклівыя хвалі!
Дзе тое шчасце? Лепшыя нашы намеры?
Шчырасць дзяцінства, поўная радаснай веры?
Узлёт маладосці арліны ў прыгожыя далі?
Ні сяброў, ні Лауры. Замкнёныя дзверы.
Што ж мае слёзы так да мяне прысталі?

(Пераклад Ю. Гаўрука)

У баладзе "Свяцязь" А. Міцкевіч славіў Туганавічы, фальварак сваёй каханай і сяброўкі Марылі Верашчака, і возера Свіцязь — люстэрка райскага Неба, лучнасць нябеснага і зямнога светаў.

[1] Дунін-Марцінкевіч В. Творы. Мн., 1984. С. 301.

Не знаеш, — з-пад ног, можа, гэта шкляная
Ідзе аж да неба дарога
Ці неба шкляное скляпенне схіляе
Табе аж пад самыя ногі! [2]

(Пераклад А. Бялевіча)

“У Туганавічах заўсёды шмат раю”, — пісаў А. Міцкевіч свайму сябру і земляку Яну Чачоту летам 1821 г. [3] У “Крымскіх санетах” (1826) паэт усвядоміў незваротнасць мінуўшчыны, неабходнасць ісці ў будучыню, захаваўшы ў душы рай свайго дзяцінства і юнацтва. Як у тэрцэтах санета “Акерманскія стэпы”:

Як ціха! Спынімся! Я журавоў лёт чую,
Якіх бы нават сокал быстры не угледзеў;
І як матыль калыша кветку палявую,
Як з шорахам вуж прапаўзае недзе.
У гэтай цішыні так чутна ўсё лаўлю я,
Што чуў бы гук з Літвы. — Ніхто не кліча, едзем!

(Пераклад М. Танка)

Паэма “Пан Тадэвуш” (1834) — польскі эпас пра Беларусь (Літву), паэтызацыя сельскага побыту беларускай шляхты, мір і багадаць напярэдадні ваеннай віхуры 1812 г. Творча-мастацкая сублімацыя, пераўтварэнне тугі па радзіме ў яркія мастацкія карціны сельскага раю. Рай на зямлі — і рай у душы паэта, трансфармацыя душэўнай пакуты ў духоўнае перажыванне ўспамінаў дзяцінства і юнацтва. У перакладзе на беларускую мову В. Дунін-Марцінкевіч дакладна перадаў паэтычную думку ўводнай часткі гэтага твора — элегічную медытацыю выгнанніка:

Літва! — родная зямейка! Ты, маўляў, здароўе, —
Той цябе ашанцуе, каму безгалоўе!
Хто жыў калісь на ніўцы тваёй, як у раю,
І вось крывавы роніць слёзкі ў чужым краю!
Цяпер то, як ты красна, я чую, я бачу
І апішу, бо горка ўсцяж па табе плачу! [4]

У экспазіцыі паэмы (раздзел “Гаспадарка”) раем выглядае фальварак Сапліцова, у ім шмат рэалій ад роднага фальварка Завосся, ад Туганавічаў — сялібы Марыі Верашчака, іншых шляхецкіх засценкаў Навагрудчыны. Рэальныя ландшафты адухоўлены артыстычнай паэзіяй, а захаваныя ў памяці падзеі дзяцінства і юнацтва асветлены райскім святлом. Вобразы “літоўскага” (беларускага) раю — скразны матыў твора. У сцэнах палявання на прасторах Налібоцкай пушчы паэт намаляваў карціну яе незакранутай чалавекам сэрцавіны, раю для дзікіх жывёл, названага беларускім словам *матачнік*.

[2] Міцкевіч А. “Зямля навагрудская, краю мой родны…”. Мн., 1968. С. 30, 42.
[3] Цыт. па кн.: Шаблюк В. Двор у Туганавічах. Мн., 1995 [эпіграф].
[4] Дунін-Марцінкевіч В. Творы. С. 429.

Паэтычны шляхецкі эпас “Пан Тадэвуш” [5] — хутчэй класічная ідылія з мноствам пастаральных сцэн, чым драма, у ёй дамінуюць гарманічныя вобразы сельскага побыту беларускай шляхты, якая згубіла сваё былое ваенна-палітычнае значэнне пасля падзелу Рэчы Паспалітай, а ў XX ст. сышла з гістарычнай сцэны. Сварка шляхты Сапліцаў з апошнім нашчадкам графаў Гарэшкаў і “апошні наезд” — тэма не асноўная, хутчэй эпізод, нешта накшталт гумарыстычнага скерца. Драматычны толькі лёс аднаго героя, Яцака Сапліцы — паўстанца, змагара за адраджэнне былой Рэчы Паспалітай. Але і ён раскрываецца не ў дзеях, а скарэй у фінальных споведдах. Тэма шляхецкага паўстання спынена аўтарам “Пана Тадэвуша” на стадыі завязкі канфлікта. Верагодна, А. Міцкевіч не хацеў закончыць свой райскі эпас трагедыяй паражэння герояў, як гэта адбылося з рэальным паўстаннем 1830–1831 гг. Такая развязка разбурыла б цэласнасць паэмы-ідыліі і супярэчыла б эстэтыцы класічнага эпасу. Трактоўка гэтага твора як “эпапеі польскага нацыянальна-вызваленчага руху пачатку XIX ст.” [6] недакладная.

Дарэчы, і цыклічная паэма “Дзяды” — таксама не “Іліяда” вызваленчай вайны былой Рэчы Паспалітай. Не батальныя сцэны, а перажыванне трагедыі лірычнага героя і нацыі дамінуюць у гэтым творы. Тут — паўстанне духу, а не ўзброенай сілы. Міцкевічавыя “Дзяды” бліжэй да “Фаўста” Гётэ, чым да традыцыйнага эпасу. Тут ёсць універсальны сінтэз паэтычных тэм і медытацый А. Міцкевіча, рэквіем па героях, усведамленне трагізму людской гісторыі, прадбачанне сусветных войн і прароцтва пра яднанне народаў у будучым царстве Духа.

У кантэксце нашай тэмы сістэма вобразаў, тэматыка, ідэйны змест і танальнасці лірыка-эпічных твораў А. Міцкевіча ёсць дыялектычнае трыадзінства: тэзіс (гарманічныя матывы і вобразы сельскага раю ў “Пане Тадэвушы”), антытэзіс (перажыванне ўнутранага і вонкавага пекла ў душах герояў “Дзядоў”) і сінтэз — санатна-сімфанічная, цыклічная кампазіцыя “Дзядоў”, палярызацыя, барацьба і ўзаемапераход райскіх і пякельных матываў. Рай і пекла ў супярэчлівым, па сутнасці язычніцкім грамадстве, райскія і пякельныя перажыванні лірычнага героя ў “Дзядах” названы па сваіх імёнах: у мастацкім свеце паэта яны — нябесныя санкцыі за здзейсненыя на зямлі дабро або зло, сувымерныя адпаведна подзвігам і злачынствам і выяўленыя ў вобразах мастацкай міфалогіі.

---

[5] У перакладзе на беларускую мову апублікаваны тры поўныя тэксты эпічнай паэмы “Пан Тадэвуш”: Міцкевіч А. Пан Тадэвуш / Пер. з пол. Б. Тарашкевіча. Мн., 1981; Міцкевіч А. Пан Тадэвуш / Пер., камент. Я. Сямяжона. Мн., 1985; Міцкевіч А. Пан Тадэуш, або Апошні наезд у Літве: Шляхецкая гісторыя з 1811 і 1812 гадоў у дванаццаці кнігах вершам / Агул. рэд., прад. Я. Янушкевіча; Уклад. У. Гілепа і інш.; Пер. на бел. мову П. Бітэля; Пер. на рус. мову С. Мар (Аксёнавай); Камент. В. Рагойшы, Я. Янушкевіча. Мн., 1998.

[6] Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Мн., 1986. Т. 3. С. 651.

Эпіграфам да райскіх матываў у паэзіі А. Міцкевіча маглі б паслужыць радкі аднаго з апошніх вершаў элегічнага складу “Паліліся мае слёзы…” (1844):

Polały się łzy me czyste, rzęsiste
Na me dzieciństwo sielskie, anielskie,
Na moją młodość górną i durną,
Na mój wiek męski, wiek klęski;
Polały się łzy me czyste, rzęsiste…

Век маленства, жыццё дзіцяці ў нераздзельнасці з прыродай паэт называе “сельскім, анёльскім”; гэтым самым пацвярджае маю думку аб тым, што вобразы і матывы зямнога раю ў мастацтве ёсць сублімацыя дзіцячых перажыванняў, замацаваных у маральнай і эстэтычнай памяці мастака-паэта. Анёльскае ўспрыманне свету — гэта райскае жыццё без граху, супярэчнасцей і пакут. У рускім перакладзе дзіцячыя ўспаміны паэта перададзены радкамі: “Полились мои слезы лучистые, чистые, // На далекое детство *безгрешное, вешнее*…” (пераклад В. Звягінцавай, курсіў мой. — *У. К.*). Век юначы паэт называе напышлівым, мітуслівым і неразумным; бо маладосці спадарожнічае эгаізм і грэх, адсюль — пакаяльныя радкі верша. Урэшце, “век сталы, няўдалы” сведчыць пра страту чалавекам ілюзій маладосці. У сталым веку духоўна багаты чалавек перажывае сваё ўласнае выгнанне з раю.

Але юнацтва і сталасць не ёсць поўнае адлучэнне ад нябесна-анёльскага жыцця. Райскую багадаць дораць нам любоў да быцця ў яго жывой разнастайнасці, да бацькаўшчыны і роднага краю; урэшце, чыстае каханне да жанчыны. Пра гэтае вяртанне да раю сваёй душы паэт сказаў у вершы “Do H***” (1830), прысвечаным Генрыеце Анквічоўне, разумнай і прыгожай дачцы графа Анквіча:

Znasz-li ten kraj?
Ach, tam, o moja miła!
Tam był mi raj,
Pókiś ty ze mną była! [7]

У свой час Гегель тыпалагічна вызначыў тры сусветна-гістарычныя формы мастацтва, дакладней, мастацкай культуры — сімвалічную (дамінацыя архітэктуры на старажытным Усходзе), класічную (акцэнтацыя пластычнасці, адзінства духу і цела ў антычнай культуры), урэшце, рамантычную (жывапіс, музыка, паэзія), у якой дамінуе ідэя, дух, ідэал [8]. Рамантычны тып культуры — гэта найперш класічнае мастацтва хрысціянскай цывілізацыі ад Сярэдневякоўя да нашага часу. Паэзія і, шырэй, характар светапогляду А. Міцкевіча — нацыянальна своеасаблівы этап развіцця гэтай

[7] Mickiewicz A. Pisma poetyczne. Nowogródek, 1931. S. 84.

[8] Гегель. Лекции по эстетике / Пер. Б. С. Столпнера, П. С. Попова // Соч. М., 1938–1958. Т. 12–14.

культуры, схільнай да адухаўлення быцця. Яна моцна паўплывала на творчасць пачынальнікаў (Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Францішак Багушэвіч) і класікаў (Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Максім Гарэцкі, Алесь Гарун і інш.) беларускай літаратуры. Эпічныя паэмы "Яна і я" Купалы, "Новая зямля" і "Сымон-музыка" Коласа, "Матчын дар" Гаруна, калі не прама, то ўскосна, "выраслі" з літаратурнай спадчыны А. Міцкевіча. Не ў сэнсе простага запазычання, а шляхам развіцця закладзеных у паэзіі аўтара "Пана Тадэвуша" магчымасцей адухоўленага, райскага бачання роднага краю, хрысціянскіх кляйнотаў, драматычнага сутыкнення дабра і зла, або ў знакавай сістэме паэтычнай міфалогіі — раю і пекла.

Богдан Цывіньскі *(Вільнюс)*

РАМАНТЫЧНЫ ПАДМУРАК КУЛЬТУРЫ XIX ст. ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Назва дадзенага выступлення заключае ў сабе адзін тэзіс, які можа нам паказацца сумніўным ці, па меншай меры, перабольшаным, і заключае тры фармуліроўкі, якія не зусім зразумелыя і патрабуюць каментарыяў. Лічу, што назва майго міні-даклада з'яўляецца своеасаблівым подзвігам, таму прашу зразумення прысутных.

Гэты тэзіс, здаецца, сведчыць аб тым, што рамантызм з'яўляецца асаблівай, выключна важнай і трывалай рысай культуры ВКЛ XIX ст. і больш позняга перыяду. Праз хвіліну я растлумачу сваю думку і паспрабую абараніць яе. Але спачатку на нейкі момант засяроджуся на іншых незразумелых месцах, спецыяльна тут прыведзеных.

1. Першае пытанне гучыць так: Да якога часу існавала Вялікае Княства Літоўскае? Чалавек, які займаецца палітычнай гісторыяй, адкажа, што яно перастала існаваць у канцы XVIII ст., а менавіта перад з'яўленнем у культуры рамантычных плыняў. Інакш, аднак, прагучыць адказ гісторыка, які вывучае грамадствы, народы, або гісторыка, які даследуе культуру. Яны звернуць увагу на тое, што прымусовая ліквідацыя дадзенай дзяржаўнай структуры аўтаматычна не абазначае канца супольнасці калектываў, якая з'яўляецца суб'ектам гэтай дзяржавы. Канец такой супольнасці наступіць пасля таго, як самі калектывы, што ўваходзяць у яе, вырашаць, што з пэўнага моманту яны хочуць жыць асобна, што яны адмаўляюцца ад супольнасці. Для Вялікага Княства Літоўскага такі момант наступіў у 1918 г.

Пытанне другое датычыць спрэчнай праблемы: ці трэба ў адносінах да Вялікага Княства Літоўскага XIX ст. гаварыць пра адну культуру ці пра

некалькі, а калі так, то пра колькі, беручы за крытэрый іх адрозненне этнічныя, сацыяльныя ці рэлігійныя погляды. Шматкультурнасць Вялікага Княства Літоўскага — з'ява бясспрэчная, і прэтэнцыёзнае акцэнтаванне гэтай шматлікасці з'яўляецца, напэўна, меншай памылкай, чым яе ігнараванне. З другога боку, гэтыя асобныя этнічныя і рэлігійныя варыянты злучаны паміж сабой такой колькасцю розных нітак, што ў многіх выпадках немагчыма паміж імі правесці разумныя межы ці дэмаркацыйныя лініі. Такім чынам, побач з унутранымі складанасцямі неабходна заўважаць і цэласнасць, адзінства гэтай гістарычнай з'явы.

Трэцяе пытанне, нарэшце, датычыць таго, як мы разумеем у сваіх разважаннях рамантызм: ці ў больш вузкім сэнсе, як, напрыклад, літаратурны накірунак, пазначаны пэўнай колькасцю напісаных твораў, ці ў больш шырокім, як агульнакультурную плынь, што ахоплівае пэўны від філасофіі, нейкую іерархію каштоўнасцей і аб'ядноўвае не толькі літаратараў ці мастакоў, але і больш шырокія колы грамадства. У сваім выступленні я рашуча схіляюся да той другой, больш сацыялагізаванай, а не літаратуразнаўчай, канцэпцыі.

2. Накрэсліваючы палітычныя рамкі, у якіх развівалася культура XIX ст. Вялікага Княства Літоўскага, неабходна ўлічваць спецыфіку палітычнай сітуацыі. Даследчыкі, якія разглядаюць яе з польскай перспектывы, а такіх было і ёсць сёння вельмі шмат, недаацэньваюць значэння адрозненасці гістарычнага вопыту Кароны і Вялікага Княства. Адлюстроўваецца гэта хаця б у "каронацэнтрычнай" перыядызацыі адрэзку часу з 1772 да 1918 гг. у гісторыі культуры ці ў памяці аб праходжанні межаў, якія змяняліся паміж падзеламі.

Мы забываем, напрыклад, пра тое, што ўсходняя частка Вялікага Княства ўжо не перажывала польскага Асветніцтва, што ўсё Вялікае Княства не зведала напалеонаўскай эпохі, а толькі марш вялікага войска на Маскву і яго вяртанне праз некалькі месяцаў. Вялікае Княства не ведала парламенцкай сістэмы Кангрэсаўкі (Царства Польскага), якая існавала да 1831 г., бо ўжо з 1795 г. з'яўлялася проста часткай Расіі. Значэнне асобных падзей і дат, такім чынам, было тут іншым. Інакш таксама тут фарміравалася палітычная сітуацыя і пазней, пасля 1832 г., калі тэарэтычна наступіла пэўная уніфікацыя структур палітычнай няволі, аднак практыка была рознай.

Такія адрозненні праілюструю толькі трыма прыкладамі з галіны асветніцкай палітыкі, у якой 1832 г. з'яўляецца для Вялікага Княства значнай цэзурай у сацыяльнай палітыцы, а менавіта — уся акцыя па знішчэнню засцянковай шляхты, што аказала велізарны ўплыў на жыццё краіны, ці, напрыклад, рэлігійнай палітыцы — прымусовая ліквідацыя грэка-каталіцтва ўжо ў 1839 г. Увогуле, трэба зазначыць, што ярмо расійскай няволі было на землях ВКЛ даўжэйшым і значна цяжэйшым, чым у Царстве Польскім. Аб гэтым з польскай перспектывы мы вельмі ўжо любім забываць.

3. Недастаткова мы таксама ўлічваем у сваім разуменні гісторыі культуры века няволі спецыфіку шматкультурнага грамадства Вялікага Княства ў параўнанні з менш разнастайным Кароны. Неабходна ў такім выпадку разважыць і даследаваць уплыў хоць бы такіх фактараў:

• спрадвечна трывалая разнастайнасць насельніцтва Вялікага Княства ў этнічным, рэлігійна-абрадавым і культурным плане;

• існаванне на той жа тэрыторыі і адначасова выразная сацыяльная іерархія польскай, татарскай, яўрэйскай, літоўскай і беларускай культур;

• меншая шчыльнасць насельніцтва і адсутнасць вялікіх гарадоў, якія ўплываюць на адчуванне правінцыялізму ў адных, і на духоўнае атаясамліванне з лакальнай, часам вельмі вузка пазначанай, айчынай, у другіх;

• значна слабейшы, чым у Кароне, і больш успрымаемы як экзатычны ўплыў заходне-еўрапейскай культуры;

• непараўнальна мацнейшая і больш жорсткая палітычна, а на значных тэрыторыях больш лёгкая ў моўным і рэлігійным сэнсе, русіфікацыя.

4. На ўказаныя і іншыя, не пералічаныя тут, умовы развіцця культуры XIX ст. Вялікага Княства Літоўскага накладваецца вельмі важны факт, што ў 1815–1832 гг., ці ў эпоху выбуху рамантызму, Вільня функцыянуе як культурная сталіца Польшчы. Аб гэтым выключным становішчы тагачаснай Вільні сведчаць асветніцкая сітуацыя і ранг Віленскага універсітэта, наяўнасць шматлікай і здольнай інтэлектуальнай эліты, хуткае развіццё прэсы і выдавецкай справы і, нарэшце, рамантычны міф філаматаў, які паўстаў дзякуючы Міцкевічу, у якім неабходна прызнаць вялікую парадаксальную заслугу Навасільцава для нацыянальнага атаясамлівання палякаў як у Кароне, так і ў Вялікім Княстве…

Разважаючы напаўсур'ёзна над геаграфіяй польскай рамантычнай літаратуры, можна сцвердзіць, што:

• польскі гераічны рамантызм, падобна Конраду, што "natus est" у келлі віленскіх базыльянаў, вырас у Вялікім Княстве, а потым перавандраваў у эміграцыю…;

• беларуская і ўкраінская прырода, а таксама гісторыя старажытнай Літвы дамінуюць у польскім рамантызме над адпаведнымі тэмамі, пачэрпнутымі ў Кароне;

• народ і яго культура таксама прадстаўлены паводле беларускіх, украінскіх і літоўскіх узораў больш часта, чым паводле мазавецкіх (не гаворачы ўжо пра Вялікапольшчу і Малапольшчу, якія ўвогуле адсутнічаюць у польскім рамантызме).

У выніку: польскі рамантызм, які вырас, перш за ўсё, з вопыту барацьбы з прымусам Расіі, найбольш ярка расквітнеў менавіта ў Вялікім Княстве.

5. Рамантычны светапогляд, які сур'ёзна не быў успрыняты ў Кароне і асабліва ў Варшаве такімі плынямі, як пазітывізм, навуковасць, спэнсерызм

у культуры, грамадскім жыцці і палітычнай свядомасці, замёр там самае малае на дваццаць пяць гадоў (1865–1890).

Паланісты апісалі названую з'яву па схеме: XIX ст. — гэта, перш за ўсё, рамантызм, а потым пазітывізм. Кожны з нас вывучаў у школе гэтыя стэрэатыпы і пісаў на такую тэму сачыненні. Бо мы прызвычаіліся думаць так. Неабходна ж больш уважліва прыгледзецца да польскай літаратуры, польскай філасофіі, польскай гісторыі філасофіі, польскай культуры ўвогуле і паўсюдна, дзе ў XIX ст. жылі і тварылі палякі, каб заўважыць, што мы, гаворачы пра рамантызм і пазітывізм, параўноўваем з'вы, несувымерныя па часе і па тэрыторыі. Карацей кажучы, рамантызму ў часе, прасторы і грамадстве было на шмат, шмат больш. Так было нават у Кароне. Але больш выразна гэта заўважаецца ў Вялікім Княстве.

У польскай культуры на тэрыторыі Вялікага Княства дамінуе Ажэшка, сувязі якой з пазітывісцкай арыентацыяй былі надзвычай слабыя і павярхоўныя. Рэалізм яе твораў сведчыць пра літаратурны стыль, а не пра філасофію твора, прапанаваную ў ім іерархію каштоўнасцей, якая ў аўтара "Над Нёманам" бясспрэчна блізкая да рамантызму, а ў наступных творах пісменніца наблізіцца да яго яшчэ больш. Іншыя польскія пісьменнікі Вялікага Княства з'яўляюцца ў тую эпоху не менш вернымі рамантычнаму ўспрыняццю свету.

У літоўскай культуры другой паловы стагоддзя маем справу з так званым запозненым рамантызмам, які праяўляецца ў абуджэнні літоўскай нацыянальнай самасвядомасці і ў моцнай зацікаўленасці гісторыяй язычніцкай Літвы. Уплыў пазітывізму павінен быў сфарміраваць тагачасную нацыянальную ідэалогію літоўцаў зусім інакш, а не так гістарычна і не так эмацыянальна.

У беларускай культуры, якая перажывала ў той жа перыяд вельмі моцна сваю народнасць і сувязь з прыродай, таксама праяўляецца натуральны, нібы падсвядомы рамантызм.

Спробы прыпісаць творцам, якія паходзяць з Вялікага Княства, пазітывісцкую арыентацыю, павінны былі абапірацца на прадпасылку, што гісторыю тутэйшай культуры можна разумець толькі паводле шаблонаў, прыдуманых у Цэнтральнай і Заходняй Еўропе. Аднак тут гэтыя шаблоны проста непрыдатныя.

7. Гісторыя культуры ўслед за гісторыяй літаратуры пры перыядызацыі выкарыстоўвае даты з'яўлення літаратурных твораў. Па-за ўвагай тады застаецца час успрыняцця грамадскасцю гэтых твораў і іх існаванне ў свядомасці людзей. Асаблівае значэнне мае гэта пры даследаванні грамадскага ўплыву палітычна забароненай літаратуры.

Грамадскае ўспрыняцце Міцкевіча або шырэй — эміграцыйных рамантыкаў у Вялікім Княстве да сённяшняга часу з'яўляецца слаба даследава-

ным пытаннем. У дадзеным выпадку неабходна ўлічваць тэмп, з якім тэксты твораў даходзілі на тэрыторыю краіны, і шукаць пацвярджэння таго, што яны прачытваліся. Пры тым нельга спасылацца на рэцэнзіі ў прэсе, бо яны не датычылі твораў палітычна “неблагонадежных”. Неабходным з’яўляецца вывучэнне неафіцыйнай, нелегальнай культуры. Гэта тое, што павінен добра метадалагічна апрацаваць гісторык, які вывучае XIX і XX стст. у нашым рэгіёне Еўропы. Бо без гэтага мы ніколі не высветлім праўду аб нашым мінулым.

Дазвольце, спадарства, падзяліцца ўласным вопытам. У старых сямейных паперах неяк я знайшоў два рукапісныя сшыткі, якія, можна меркаваць, паходзяць з 1878 і 1903 г. Яны належалі матцы і сыну, якія прадстаўлялі асяроддзе надзвычай правінцыяльнай і досыць беднай польскай шляхты паўночнай часткі Ковеншчыны. Больш стары сшытак — гэта зборнік паэзіі, а больш позні — спеўнік. Яны добра інфармавалі, што хацела занатаваць для сябе дзяўчына канца 70-х гг., а што яе сын дваццацю пяццю гадамі пазней. Першы сшытак — выключна вялікія рамантыкі, з асаблівай слабасцю да Красінскага, другі сшытак — гэта, перш за ўсё, польскі рамантызм і пострамантызм, моцна спалітызаваны, ад “Не дбаю, якая сыдзе кара…” да “Чырвонага штандару”, а таксама расійскія рэвалюцыйныя песні. Безумоўна, мая знаходка ні для кога, акрамя маёй сям’і, і ні аб чым не сведчыць. Успомніў аб гэтым, каб заахвоціць часамі пакапацца ў старых паперах.

Аднак у сувязі з гэтым можна вылучыць часткова навуковую гіпотэзу, якая сцвярджае факт значнага — часовага і грамадскага — пашырэння радыуса дзеяння рамантызму ў культуры Вялікага Княства Літоўскага. Факт гэты тлумачыцца з’явай існавання палітычнай няволі чарговых пакаленняў і натуральнай шматкультурнасцю Вялікага Княства Літоўскага, якая з кожным разам выяўлялася ўсё больш пераканаўча таксама ў пісьмовай форме. Было б вельмі цікавым даследаваць таксама, у якой ступені гэты адбітак рамантызму пакінуў след у культуры драматычнага XX ст. на тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага.

Пераклад з польскай мовы Ганны Цішук

Панайот Карагьозов *(София)*

ЛЕКЦИИ АДАМА МИЦКЕВИЧА В КОЛЛЕЖ ДЕ ФРАНС

Из всех синтезов славянских литератур курс Адама Мицкевича в Коллеж де Франс [1] (1840–1844) стал поводом для самых противоположных оценок. Историческая, литературная, языковедческая, философская, археоло-

[1] Mickiewicz A. Literatura Słowiańska // Dzieła. Warszawa, 1955. T. 8. S. 240; T. 9. S. 270.

гическая и пр. широта лекций, а также их яркая политическая направленность вызывали у слушателей и исследователей весьма разноречивые мнения. Откровенные субъективные оценки, не встречавшиеся до тех пор (как и позже), а также неожиданный подход к рассматриваемым явлениям, заставили слушателей Мицкевича одновременно боготворить и хулить его: “Ilekroć zyskam prawo obywatelstwa w jednej części audytoryum, tracę sympatię części pozostałych” [2], — сообщает в начале второго курса лектор, а его сверстник Ян Коллар в поэме “Дочь Славы” даже помещает “z Paříže ten nevzájemník polský” [3] в славянский “ад”.

Если современники упрекали Мицкевича за его слишком большую политичность, мессианизм и национализм, то более поздние исследователи годами снисходительно недооценивали лекции из-за их “несистемности” и “ненаучности”. И сегодня высказываются мнения, “že vlastně ani nebyl pro svěřený úkol dostatečně odborně připraven. Proto také nemohly jeho přednášky stát ani na úrovni soudobých slavistických znalostí” [4]. Долго повторяемый миф о “научной некомпетентности” первого профессора по славянским литературам начал рассеиваться благодаря наиболее правильному компаративистическому подходу к лекциям. В своих монографиях и статьях И. Горский [5], М. Якубец [6], И. Кицимия [7], В. Смоховска-Петрова [8] привели убедительные факты, свидетельствующие о широкой научной информированности и эрудиции лектора в области общественной и литературной истории, а Х. Янашек-Иваничкова указывает, что Мицкевич не чужд “ówczesnym tendencjom w romantycznej komparatystyce europejskiej, z której pracami miał możność zaznajomić się bardzo wcześnie: dzieła Sismondiego i Mme de Stael poznał jeszcze w latach wileńskich; w okresie późniejszym czytał również prace Willemaine’a i Ampere’a” [9]. И все же самая лучшая защита — это содержание лекций, начало которых подготавливает слушателей и исследователей к чему-то новому: “W kursie takim nie można iść drogą, jaką wskazuje znana z góry przyjęta metoda naukowa…” [10]

В рамках четырехлетнего курса огромный материал превратился в “весьма сложную проблему” [11], разнонаправленность которой делает со-

---

[2] Mickiewicz A. Dzieła. T. 10. S. 8.

[3] Kollár J. Slávy dcera. [Praha], 1852.

[4] Mikulka J. Slovanství a polská společnost w XIX století. Praha, 1984. S. 51.

[5] Горский И. К. Адам Мицкевич. М., 1955. С. 231–268.

[6] Jakóbiec M. Literatura rosyjska w wykładach paryskich A. Mickiewicza. Warszawa, 1956.

[7] Chitimia J. C. Studii de Literatura universala şi comparaţ. Bukureşti, 1970.

[8] Смоховска-Петрова В. Славянските литератури на Мицкевич и основните въпроси на славянското сравнително литературознание // Проблеми на сравнителното литературознание. София, 1978.

[9] Janaszek-Ivaničkova H. O współczesnej komparatystyce literackiej. Warszawa, 1980. S. 177.

[10] Mickiewicz A. Dzieła. T. 8. S. 14.

[11] Jakóbiec M. Literatura rosyjska… S. 17.

здание единой комплексной оценки почти невозможной. Отдельные исследователи — Шийковский, Гурский, Кжижановский, Микулка, Смоховска и др. — отнеслись к объемному материалу избирательно. Областью, в которой пересекаются все специализированные исследования и в которой вклад Мицкевича не подлежит сомнению, является сравнительное литературоведение. Сам Мицкевич ясно подчеркивает компаративный характер своего курса. Целью лектора было не перечисление отдельных фактов и явлений в культурной истории славянских народов, а поиск только тех фактов и явлений, которые имеют общее значение, так как "my zaś kreślimy tutaj nie osobną historię jednego ludu, ale historię wielu ludów, wielu literatur" [12].

Общественно-историческую и политическую ситуацию в Европе, в которой Мицкевич читает свои лекции в Париже, описывает в своей монографии "Адам Мицкевич" И. Горский [13]. Углубляющиеся в середине XIX в. социальные и национальные противоречия предвещают революционные ситуации. В 40-х гг. во Франции вспыхнули забастовки; Германия и Италия начали борьбу за национально-государственную независимость; Восточный вопрос на Балканах вступил в свою последнюю фазу; национальные противоречия в Габсбургской империи крайне обострились.

После подавления польского Ноябрьского восстания (1830) и временного отказа от освободительной интервенции на славянский юг авторитет русского царизма среди западных славян резко упал. Идеализированный возрожденческий славизм, который достиг своей вершины в призыве Я. Коллара к взаимности [14], не выдержал проверки реальными событиями. Национальное дифференцирование и быстрое культурное развитие славянских народов обусловили перенос доминанты славянского единства с прошлого на настоящее и прежде всего на будущие.

В середине века польские эмигрантские организации стали все больше отрываться от (и так слабой) народной основы освободительного движения и оказались в состоянии риторической идейности и действенной бесперспективности. Результатом борьбы между мистическими утопиями и закономерным развитием народов явились полюсы идейно-политической направленности лекций А. Мицкевича. Мессианизм, сущность которого коротко можно охарактеризовать как поиск стимулирующей аналогии, является выражением стремлений эмигранта-романтика. Диахронно-синхронное прослеживание исторического и культурного развития славянских народов является результатом научных исследований демократа-реалиста. Таким образом, в период между отчаянием, порожденным подавлением

[12] Mickiewicz A. Dzieła. T. 8. S. 8.
[13] Горский И. К. Адам Мицкевич. С. 231–246.
[14] Kollar J. O literárnej vzájemnosti. [Praha], 1836.

восстания, и надеждами, связанными с “весной народов”, рождается самый противоречивый синтез славянских литератур.

“Историография” М. Орбини положила начало обобщенному толкованию психики славян. В первом научном обобщении славянской словесности П.-Й. Шафарик рассматривает литературу как функцию “характера народа”, а его последователь Ф.-Л. Челаковский связывает литературу с “уровнем просвещения”. А. Мицкевич в своих парижских лекциях идет еще дальше, “сознавая, что нельзя говорить об общих чертах славянских литератур, не доказав существования общей славянской психологии и общей славянской философии” [15].

При решениии этой задачи Мицкевич выступает в двух ипостасях: “jako świadomy rzecznik narodów słowiańskich w kulturze europejskiej i jako historyk starający się wyjaśnić prawidłowość rozwoju historycznego tych narodów” [16]. К этому польский профессор был подготовлен теоретически, а также имел непосредственные впечатления о жизни славянских народов: “Mój długi pobyt w różnych krajach słowiańskich […] wpoił mnie, mocniej niż to sprawiłaby jakakolwiek teoria, poczucie jedności naszego rodu; nigdy nie przestało mnie zajmować zagadnienie, co było początkiem naszych waśni, jaka może być podstawa naszej przyszłej jedności” [17]. На оси “прошлое – будущее” построена его концепция общей философии и литературы славянских народов.

Характерные психологические черты и мировоззренческие особенности славянских народов, представленные в курсе А. Мицкевича, описаны подробно В. Смоховской-Петровой [18]. Мы остановимся только на некоторых из них и еще раз отметим их неразрывную связь с рассмотренными славянскими литературами. Обращаем внимание на мнение Мицкевича об общем происхождении, мифологии, языке и об их связи с общими явлениями в славянских литературах.

Общее между славянскими народами и их литературами в прошлом Мицкевич сводит к языку, происхождению, мифологии и одинаковой исторической судьбе. Настоящее Мицкевич ищет главным образом в культуре и, в частности, в литературе, а будущее единство он прогнозирует в не совсем определенной “славянской идее”, которую он видит в одновременном ускоренном развитии славян, в их равенстве и братстве.

Язык представляет собой наиболее бесспорный интегрирующий элемент в прошлом славян. Словесность неразрывно связана с ним и поэтому еще в первой лекции профессор обращает внимание на язык (“język i literatura tworzą jedyny węzeł między naszymi ludami”), который находим еще в уст-

[15] Смоховска-Петрова В. Славянските литератури… С. 60.
[16] Jakóbiec M. Literatura rosyjska… S. 13.
[17] Mickiewicz A. Dzieła. T. 8. S. 16.
[18] Смоховска-Петрова. В. Славянските литератури… С. 60–70.

ном творчестве дописьменного периода. Славянский язык — общий язык для всех славян, и из него проистекает первоначальное единство: “Ludy słowiańskie przed utworzeniem się państw i cesarstw na ziemiach, które zamieszkiwały, mówiły wszystkie jednym językiem. Dialekty jeszcze się nie utworzyły […] powszechną tradycję ludu slowiańskiego będziemy szukać we wspólnym źródle, w języku, którego najstarszymi pomnikami są baśnie i pieśnie gminne” [19].

До создания государственных объединений, до оформления народностей как социальных общностей языки не называли по населению, которое на них говорило, а в зависимости от их пространственного местонахождения: “Skoro nazwy: języki rosyjskie i polskie, nie zostaly przyjęte, starano się ugrupować dialekty na zasadzie geograficznej” [20]. Позже, при создании государства, под влиянием политических, моральных и религиозных идей диалекты начали постепенно оформляться как самостоятельные языки: “Rozdział zaczyna się wraz z epoką historyczną, ale zasada tego rozdziału, później pogłębionego, tkwi już w samej naturze języka” [21]. Таким образом, Мицкевич правильно увязывает развитие языка как с общественно-государственными потребностями, так и со специфическими внутриязыковыми особенностями.

Отдельные славянские диалекты, по мнению Мицкевича, развиваются независимо друг от друга и не одновременно, но несмотря на это они сохраняют основу единства. Он даже считает, что все славяне говорят на одном общем языке, который в своем развитии проходит через разные стадии: “Jest to jeden język, ukazujący się we wszelkich kształtach i na wszystkich stopniach swego rozwoju. W starosłowiańskim ukazuje się jako język martwy, język religijny; jako język prawodawstwa i rozkazów — w rosyjskim, jako język literatury i rozmowy w Polsce, jako język naukowy w Czechach, podczas gdy w Ilirii, Czarnogórze i Bośni pozostał on w stanie języka pierwotnego, języka poezji i muzyki” [22]. Эту характеристику четырех самых распространенных славянских языков Мицкевич дополняет в пятой лекции первого курса, связывая развитие языка и литературы с общественным бытием и сознанием отдельных славянских народов.

Определяющее значение для развития языка и литературы имеет народная специфика в рамках государства, но некоторое влияние оказывают и контакты между языками и литературами: “Język czeski wpłynął raczej na formę niż na istotną treść literatury polskiej” [23]. Таким образом, можно сказать, что языковые влияния предшествуют литературным, так как язык — средство выражения народной психологии, в то время как литература бли-

[19] Mickiewicz A. Dzieła. T. 8. S. 85.
[20] Там же. С. 93.
[21] Там же. С. 92.
[22] Там же. С. 18.
[23] Там же. С. 56.

же к сущности этой психологии. Влияние языка, понимаемого в качестве формы литературных произведений, весьма интенсивно во времена Средневековья и барокко, когда содержание и сущность литератур христианского региона были в большой степени ограничены догмами религии, а полем творческого проявления писателей являлась прежде всего форма произведений.

В отличие от Шафарика, Мицкевич не видит возможности ввести общий для всех славян язык: "…zaden język słowiański nie posiadał nigdy nad innymi dość stanowczej przewagi, aby go można było uważać za język panujący, za podstawę, za ośrodek" [24].

Пры знікненні мітраполіі ў Навагрудку святыня трапляе ва Уладзімірскае княства. Як родавую князь Канстанцін Канстанцінавіч Астрожскі выкупляе ікону ў 1571 г. у братоў Козелаў для Чарнігаўскага Ялецкага манастыра. Копію святыні Замкавай добрапамысны князь змяшчае ў адбудаванай ім на пачатку XVI ст. навагрудскай царкве Барыса і Глеба. У XVII ст. храм пераходзіць у унію. Арыгінал іконы ў часы ваеннага ліхалецця перапраўляецца праваслаўнымі ў Масковію. У 1611 г. палякі і беларусы ў час польска-маскоўскай вайны забіраюць святыню дамоў, і яна вяртаецца ў Чарнігаў. З гэтай іконы, якая змяшчаецца ў той час у Троіца-Ільінскім Чарнігаўскім манастыры пры Болдзінай гары, у 1658 г. манах Грыгорый Канстанцінавіч Дубенскі піша копію — Ільіна-чарнігаўскую ікону Багародзіцы.

Пры архіепіскапе Лазары Барановічы і ігумене Ільінскага манастыра Засіме з 16 па 24 красавіка па ст. ст. 1662 г. з іконы цяклі слёзы. У тым жа годзе татары абрабавалі горад і царкву, але не кранулі святыні. Пра 24 цуды яе піша ў "Руне арашэнным" старабеларускі пісьменнік Дзімітрый Растоўскі. Святыня Замкавая ўслаўлялася ў шматлікіх лірніцкіх і багамольскіх песнях, зборніках хваласпеваў "Новая абарона бядотнай Айчыны, з неба дадзеная ў вобразе цудадзейнай Багародзіцы Дзевы Марыі з храма Навагрудскага" (Вільня, 1673) і "Effigies miraculosae imaginis Deiparae Virginis, quae apud Patres Societatis lesu religiose colitur Novogrodeci" (Вільня, 1684).

Вацлаў Баровы ў "Навагрудчыне міцкевічаўскай" палемізуе з ксяндзом Вацлавам Капуцынам ("Аб цудадзейным абразе Маці Божай у Навагрудку" ў зборніку "Мемарыяльная кніга на ўшанаванне сотых угодкаў ад дня нараджэння Адама Міцкевіча". Варшава, 1899) і сцвярджае, што 12 лютага 1799 г. А. Міцкевіч быў ахрышчаны перад Замкавай іконай, хаця яшчэ ў 1710 г. замак спалілі шведы, але і потым смяротна хворы Адам ачуняў ля святыні.

У 1839 г. Замкавая ікона Божай Маці пераносіцца ў праваслаўную Барысаглебскую царкву. Арыгінал іконы ў 1842 г. з Чарнігава трапляе ў Гефсіманскі скіт паблізу Троіца-Сергіевай лаўры. З 1860 г. святыня праславілася ацаленнямі. Замкавая святыня ў XIX ст. выкарыстоўвалася праваслаўнымі воінамі як паходная. У час бежанства ў 1915 г. ікона была перавезена ў Расію, дзе і згубілася.

28 лістапада 1855 г. паэт памірае ў Канстанцінопалі, дзе праславілася такімі цудамі яшчэ з часоў евангеліста Лукі (напісана ў ліку 70), падараваная ў 326 г. святой роўнаапостальнай царыцы Алене ва ўзнагароду за знаходжанне і ўздзвіжанне Крыжа Гасподняга ўдзячнымі вернікамі (знаходзілася ў дамавой імператарскай царкве), пазней каранаваная духоўнай Уладычыцай Польшчы і ВКЛ Чанстахоўская Адзігітрыя. Менавіта перад цудадзейнай копіяй гэтай іконы 12-гадовая Ефрасіння Полацкая, будучая ігумення зямлі Беларускай была заклікана да ўнявешчання Госпаду. І калі

ў 1395 г. князь мазавецкі Уладзіслаў Апольчык нёс святыню праз беларуска-ўкраінскія землі, здарыўся цуд — Чанстахоўская Адзігітрыя пакінула ў гаі ля Турковічаў свой цудадзейны правобраз, Яблачынска-Турковіцкую Адзігітрыю.

Гісторыя цудадзейных ікон у лёсе Беларусі і, у прыватнасці, у лёсе А. Міцкевіча тлумачыць той факт у духоўным развіцці песняра, калі ён пачынае апантана служыць славянскай ідэі, славе ліцвінскай Беларусі (згадаем славутыя лекцыі на кафедры славістыкі ў Калеж дэ Франс): "З усіх славянскіх народаў русіны, гэта значыць сяляне Пінскай, часткова Мінскай і Гродзенскай губерняў, захавалі найбольшую колькасць агульнаславянскіх рысаў, іх мова самая гарманічная і з усіх славянскіх моваў найменш зменена" [4].

Як дзейнасць пісьменнікаў, носьбітаў другога паўднёва-славянскага ўплыву, дапамагае зразумець высокую духоўна-культурную традыцыю, на якую абапіраўся Ф. Скарына, так і разгляд творчасці А. Міцкевіча ў рэчышчы магутнага руху будзіцеляў славянства, еўрапейскіх рамантыкаў "буры і націску", вытлумачвае феномен яго паэзіі — адной з недасягальных вяршыняў славянскіх літаратур XIX ст.

Лёс А. Міцкевіча шмат у чым роднасны лёсу Яна Колара (славуты навагрудчанін, як і Колар, выгнаннік з Айчыны; як чэхі лічаць Колара сваім, так і палякі прыпісваюць толькі сабе Міцкевіча; як венгры ў Колары, так і рускія ў Міцкевічу бачаць рэвалюцыянера, вальнадумца; як палякі не чытаюць твораў Колара, так многіх з паўднёвых славян насцярожвае міцкевічаўскі таямнічы містыцызм). Таму аўтар "Пана Тадэвуша", відаць, так захапляецца творчасцю славака Яна Колара: "Славянства — вось яго каханая, вось Лаура, якую ён паўсюль шукае, па якой плача і якую ўсхваляе… Ён падарожнічае з мэтай адшукання гістарычных помнікаў — шукае знаёмства з сербскімі і славацкімі літаратарамі і вучонымі, каб абудзіць у іх пачуццё любові да агульнай Айчыны, ён імкнецца ўзняць дух, абудзіць мужнасць у народах, прыгнечаных туркамі, венграмі, немцамі" [5] (лекцыя ад 27 снежня 1842 г.).

У айчыннай і славянскай медыявістыцы двух апошніх дзесяцігоддзяў пашыраецца думка пра функцыянальную спецыфіку старабеларускай мовы, якая праз феномен беларуска-ўкраінскай, беларуска-малдаўскай, беларуска-польскай, беларуска-літоўскай, беларуска-рускай этнічных еднасцей, іх моўных кангламератаў стала падмуркам суседніх літаратурных моваў і культур.

На наследаванне А. Міцкевічам асаблівасцей мовы і архетыпа беларуска-польскай этнічнай еднасці, кангламерата гэтых моваў, які пачаў склад-

[4] Міцкевіч А. Пра Беларусь і беларускую мову // Філаматы і філарэты. Мн., 1998. С. 122.
[5] Мицкевич А. Собр. соч.: В 5 т. М., 1954. Т. 4. С. 393–395.

вацца з часоў узнікнення Шарашоўскай бібліі Софіі Гальшанскай, а ў XVII ст. меў за вяршыні “Вобраз цноты і славы” І. Ужэвіча і “Фрынас” М. Сматрыцкага, неаднойчы наракалі польскія міцкевічазнаўцы, пагардліва называючы такую з’яву “смаргоншчынай усходніх крэсаў”. З гэтай палемічнай нагоды С. Брага ў артыкуле “Міцкевіч і беларуская плынь у польскай літаратуры” (Нью-Йорк, 1957. С. 12) згадвае апублікаваны ліст варшаўскіх літаратараў у віленскую газету “Wiadomości Brokówe”: “Вы для Літвы, а не для Кароны пішаце, менш дбаеце пра тое, ці вас у Варшаве будуць разумець, абы ў Вільні ды ў Літве вас разумелі”. На што паэт у артыкуле “Пра варшаўскіх крытыкаў і рэцэнзентаў” заўважаў: “Прызнаюся, што я не толькі не асцерагаюся правінцыялізмаў, але, можа, свядома іх ужываю”. Як зазначае К. Цвірка, “уся творчасць Адама Міцкевіча — гэта “велічны гімн Беларусі, роднай Літве” (згадаем Пушкінскае: “Там пел Мицкевич вдохновенный, … среди прибрежных скал свою Литву он вспоминал”)”. Адсюль, паводле артыкула А. Ельскага (Адам Міцкевіч на Беларусі // Пачынальнікі. Мн., 1977. С. 343), (сучасныя літаратуразнаўцы склалі нават цэлую карту Міцкевічавай Музы) і рэальныя назвы паселішчаў у радках яго твораў: Навагрудак, Вільня, Мінск, Свіцязь, Нёман, Вілія, Вілейка, Літоўка, Сталавічы, Рута, Шчорсы, Мір, Ліда, Туганавічы, Плужыны, Цырын, Асташын, Ашмяны, Ляхавічы, Варонча, Завоссе, Мыш, Налібокі, Дзятлава, Грачыхі, Ятра, Медзвядка, Сапліцова і інш.

З гэтай думкай пагаджаюцца і польскія літаратуразнаўцы, А. Віткоўская імкнецца выправіць памылкі папярэднікаў, праліваючы святло на факт знішчэння архіва беларускамоўных твораў паэта: “Як вядома, быў ў міцкевічазнаўстве час, калі дапускаліся замоўчванні, утойванні і перайначванні фактаў, калі знішчаліся нявыгадныя дакументы. Каб Міцкевіч у вачах свету заставаўся нацыянальным сімвалам, каб быў ён ва ўсім прыкладам у выхаванні людзей, не кажучы пра іншыя прычыны, яго асобу хацелі бачыць стэрыльна чыстай, маральна бездакорнай, ва ўсіх адносінах пазітыўнай. Таму ў імя гэтак вузка зразуметай неабходнасці і рабілася прыхарошванне творчасці паэта і знішчэнне дакументаў” (Вялікія польскія рамантыкі. Варшава, 1980).

Напрыканцы XX ст. сярод даследчыкаў беларуска-польскіх сувязей пашыраецца ўяўленне аб А. Міцкевічы як духоўным прадцечы, пачынальніку ў беларускай і польскай літаратурах XIX ст., якія знаходзіліся ва ўлонні адыходзячага класіцызму, эстэтычных крытэрыяў і творчай практыкі краёвага рамантызму, а таксама ўяўленне аб ім як фактычным пачынальніку ў беларуска-польскім рэгіёне паэзіі (і ўвогуле літаратуры) Новага часу. Гэта здарылася, калі ў 1822 г. у Вільні выходзяць асобнай кнігай “Балады і рамансы”. “У сталай славеснасці, — сцвярджаў А. Пушкін, — настае час, калі розум, стомлены аднастайнасцю твораў мастацтва, абмежаваным колам

мовы вычварнай, выбранай, звяртаецца да свежых прыдумак народных і да нязвыклага прастамоўя, раней пагарджанага” [6]. Менавіта так была ўспрынята кніга балад А. Міцкевіча літаратурнай грамадскасцю. Пра поспех першага паэтычнага зборніка паэта крытык Ю. Каленбах пазней напіша наступныя словы: “У задухлую атмасферу ўмоўных, будуарных сентыментаў, прапахлых мускусам Талімены, упалі “Балады”, быццам букет апырсканых расою вясновых кветак з сельскіх палёў. Ад гэтых майскіх кветак, ад гэтых вясновых пралесак з берагоў Свіцязі, ад водару чаромхі з курганка Марылі павеяла свежасцю па ўсёй Польшчы” [7].

Апроч таго, на маю думку, паэзія А. Міцкевіча цесна лучыцца з традыцыямі старабеларускага асветніцкага барока, таму і пачынаў пісаць славуты навагрудчанін з жанру балады.

Новыя метадалагічныя падыходы не толькі вяртаюць беларускай літаратуры творчасць А. Міцкевіча і яго паплечнікаў, але і дазваляюць убачыць развіццё літаратурнага працэсу XIX ст. ва ўсёй глыбіні і полілінгвістычнай масштабнасці, наблізіцца да сутнасці паэтыкі пачатковага перыяду, зразумець спецыфіку твораў беларуска-польскіх пісьменнікаў, так званых прадстаўнікоў краёвага рамантызму, вытлумачыць феномен гэтай з’явы, запоўніць адну з белых плям новай беларускай літаратуры айчыннага нацыянальнага Адраджэння XIX ст.

Уладзімір Мархель *(Мінск)*

МАТЫВЫ РАДЗІМЫ Ў ТВОРЧАСЦІ АДАМА МІЦКЕВІЧА І ЯГО ПАСЛЯДОЎНІКАЎ НА БЕЛАРУСІ

Творчасць А. Міцкевіча з часу выдання яго праграмна-рамантычнага зборніка “Балады і рамансы” атрымала шырокую вядомасць на яго радзіме, асабліва ў літаратурных колах. Пільная ўвага ўраджэнцаў Беларусі да творчага здабытку земляка, які з мая 1829 г. знаходзіўся ў эміграцыі, не магла не выклікаць у мясцовых польскамоўных паэтаў пэўнай арыентацыі на сферу яго мастацкіх інтарэсаў і дасягненняў. Аднак уплыў Міцкевіча на той літаратурны працэс, які працякаў на яго радзіме, больш выяўляўся не ў прыватна-версіфікатарскіх наследаваннях, а ў адраджэнцкім стымуляванні адкрыцця радзімы паэтамі наступнага пакалення.

На шляхі вялікага навагрудчаніна жыццёвы лёс вывеў Уладзіслава Сыракомлю ў 1835 г., калі пасля закрыцця царскімі ўладамі дамініканскай школы ў Нясвіжы ён пераехаў на вучобу ў Навагрудак, у тую самую школу,

[6] Пушкин А. С. Полн. собр. соч. М.; Л., 1949. Т. 11. С. 73.

[7] Mickiewicz A. Poezie. Kraków, 1926. T. 1. 3 wyd. S. 3.

якую за дваццаць гадоў да таго паспяхова скончыў А. Міцкевіч. Творчасць жа Міцкевіча ў чытацкую свядомасць вясковага лірніка паўнапраўна ўвайшла на самым пачатку 40-х гг., у час яго службы ў нясвіжскай канцылярыі кіраўніцтва парадзівілаўскімі маёнткамі, і назаўсёды засталася дарадчай спадарожніцай у мастацкім развіцці яго літаратурных пачынанняў. Працуючы над паэмай "Дабрародны Ян Дэмбарог", Сыракомля, як заўважылі яго сучаснікі, у прыватнасці Юзаф Ігнацы Крашэўскі, арыентаваўся на Міцкевічавага "Пана Тадэвуша", перш за ўсё ў разгортванні сюжэта паводле, так бы мовіць, шэкспіраўскай мадэлі стасункаў пасвараных сем'яў і тыпова шлюбнага вырашэння зацяжнога канфлікту, а таксама ў стварэнні атмасферы даверлівага аповеду і ўзнаўленню парадыгмы ўспрымання радзімы. Аднак за Міцкевічавым настальгічным уяўленнем родных мясцін, пазначаным у пачатковых радках "Пана Тадэвуша" паглыбленнем вобраза Яна Каханоўскага пра час усведамлення каштоўнасці здароўя, Сыракомля пайсці не мог, таму што не знаходзіўся, як Міцкевіч, у эміграцыі, і да таго ж семантыка міцкевічаўскага параўнання радзімы і здароўя была выяўлена ў паэме з мастацкай вычарпальнасцю.

Муза вясковага лірніка, не навярэджаная настальгічным пачуццём, выбрала супастаўленне радзімы (гістарычнай Літвы) з чужынай:

Святая Літва мая, краю мой родны,
Пустэчаў пяскоў, дзірванамі ты плодны!
Не кінецца ў вока глухмень твая надта,
Не тое ў табе, што на поўдні прынадным,
Дзе, кажуць, палі, нібы райскае дзіва,
Дзе міртамі лес зарастае, алівай,
Дзе горы — не тое, што нашы Панары,
Такія навокал раскіданы чары,
Такія там рэкі, азёры, мясціны, —
Змалёўваюць з іх італьянцы карціны,
Якія пасля да нас возяць на продаж.
Ці ж ты гэту славу, мой край, пераможаш.

Параўнанне яўна не на карысць родных мясцін. Аднак зроблена яно не паводле ўласных назіранняў аўтара, а паводле ўяўленняў з чужых слоў, што так ці інакш закладвае долю сумнення ў адпаведнасці сказанага рэчаіснаму. Далейшы аповед ва ўступнай частцы "Дабрароднага Яна Дэмбарога" засяроджаны на шэрых малюнках беларуска-ліцвінскіх краявідаў, падкрэслена кантрастных паўднёваму пейзажу, сціплых і непрэтэнцыёзных, асуджаных на эстэтычна-утылітарную паразу:

Твой выгляд панурай акраскай напоўнен,
Ў малюнку цябе не пакажаш на поўдні.
На рэках тваіх не шумяць вадаспады,
І шэрань паўсюды ў тваіх даляглядах.

З адных круглякоў твае злеплены хаты,
І мох зелянее на стрэхах гарбатых,
А люд пад страхою тут просты зазвычай,
Што многім здаецца: да трох ён не злічыць. [1]

(Пераклад У. Мархеля)

Між тым, някідкая, на першы погляд, радзіма паэта — "святая Літва", адухоўлена яго любасцю, і ў гэтым яе перавага над прэзентабельнымі краямі. Уяўная для Сыракомлі чужына — гэта, па сутнасці, асвоеная Міцкевічам прастора, прывабнасць якой не засланіла сабой вобраз далёкай бацькаўшчыны, а, хутчэй, наадварот — выяскравіла яго, абвастрыўшы боль ад страты роднага ўлоння і ўзмацніўшы тугу па навагрудскіх мясцінах. Міцкевіч, як зазначыў Ян Парандоўскі, "у самых нечаканых месцах умудраўся адшукаць пейзажы, якія нагадвалі яму Літву, і не заўважаў усіх астатніх пейзажаў і выдатнасцей, якія натхнялі іншых паэтаў" [2].

У краявідах на чужыне аўтар "Пана Тадэвуша" імкнуўся знайсці прыкметы роднай Навагрудчыны, распазнаваў яе рысы ў еўрапейскіх пейзажах. Зразумела, гэта адбывалася не без параўнання радзімы і чужыны, але параўнання на ўзроўні пераносу і ўласцівасцей, выяўленых у спалучэнні фарбаў. Чужына для Міцкевіча можа быць і цікавай і прывабнай, але не лепшай і прыгажэйшай за родны край. У вершы "Бульба" паэт недвухсэнсоўна сцвярджаў:

О Навагрудскі край — мой родны дом,
Праслаўлены Трамбецкага пяром,
Куды б мяне не кінуў лёс жыццёвы,
Забыць я не магу твае палі, дубровы.
Нас вабіць невядомы край чужы, —
Цікава паглядзець. Але нязручна жыць… [3]

(Пераклад Х. Жычкі)

У Сыракомлі ж параўнанне выведзена на ўзровень супрацьпастаўлення радзімы з чужынай, у якім яскравыя іншаземныя фарбы падаюцца як фон для вылучэння стрымана-сціплых фарбаў айчыны.

Пафас любові да бацькаўшчыны праз супастаўленне свайго краю з "заморскім" праводзіць і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч у вершаваным творы "Быліцы. Расказы Навума", толькі супастаўленне гэтае ён пераносіць у сферу сацыяльную:

Прыгож край заморскі, — дзівы там страшэнны!
Народ, кажуць людзі, разумны, пісьменны;
Мужычок багаты — у чобатах ходзіць,
А божая ніўка беленькі хлеб родзіць;

[1] Далягляды. Мн., 1983. С. 213.
[2] Парандовский Я. Алхимия слова. М., 1990. С. 177.
[3] Міцкевіч А. Свіцязянка. Мн., 1996. С. 302–303.

Усяк сабе панам — шчасліў быт дамовы!
Ды не шукай сэрца — то ж народ тарговы!
Ой, нямаш зямелькі, як Беларусь радзона!
На лугах дыванам сцелецца зялёна,
Травіцца па пояс, кветкамі мігае!
А лес, вось тычынка, неба падпірае!
Мужык хоць убогі, — як вол працавіты!
Гаруючы цяжка, рэдка калі сыты.

Дунін-Марцінкевіч, як і Сыракомля, не прамінуў сказаць, што яго зямлю насяляе бедны, але працавіты люд. Праўда, ракурс паказу роднага краю ў вясковага лірніка стрымана-сціплы, і не таму толькі, што гэта ўласцівасць яго беларускай ментальнасці, а найперш дзеля таго, каб звярнуць увагу на ўнутраную, непаказную змястоўнасць радзімы і яе насельнікаў. У Сыракомлевай гутарцы-паэме "Дабрародны Ян Дэмбарог" краявід і чалавек суадпаведныя ў сваёй непрэтэнцыёзнасці. У "Быліцы" Дунін-Марцінкевіч, які блізкі да Міцкевіча яўным захапленнем прыгажосцю роднага ўлоння, яны знаходзяцца ў пейзажна-сацыяльным кантрасце — селянін-пакутнік на фоне квітнеючай прыроды. Міцкевіч жа, узнёсла паэтызуючы прынавагрудскія краявіды і адкрываючы тым самым эстэтычныя магчымасці іх бачання, імкнуўся да гармоніі пры ўзнаўленні вобразаў роднага краю. Пазначыўшы ў вершы "Бульба" элементарныя нязручнасці чалавечага быцця ў замежжы, паэт заўважае:

Ты ж не такая, Русь, — адкрыта воку:
Ні прорваў, ні вяршынь — прастор шырокі,
Раздолле, пекната і харство,
Смарагд вясною, золата ў жніво,
І нездарма ў такім прыгожым краі
Жывуць спрадвеку добрыя звычаі. [4]

"Запрашэнне глянуць на звыклы як быццам краявід, але ўжо і нязвыклы, бо ён непазнавальна змяніўся пад поглядам паэта, — слушна падкрэслівае Віктар Каваленка, — было па сутнасці запрашэннем глянуць у сваю душу, адкрыць яе для роднага краю. Свае "дамашнія", правінцыяльныя, нічым як быццам не знакамітыя лес і возера заслугоўвалі, аказваецца, самай натхнёнай паэтычнай увагі…" [5] Не проста ўспрынятае, а душой адчутае харство радзімы лучаць паэта з астатнім светам. Без гэтай лучнасці наўрад ці магчымы кантакт з сусветам. Менавіта радзіма адкрывае шлях у вышэйшыя сферы. Менавіта радзіма, як спазнаная і любая частка сусвету, дае магчымасць улавіць адзінства ўсеагульнасці і вышэйшасць злітнасці зямлі з небам. Да гэтага рамантычная творчасць падвяла Міцкевіча задоўга да "Пана Тадэвуша" і нават да выгнання ў глыбіню Расіі — у часе стварэння балад, звязаных з возерам Свіцязь.

[4] Міцкевіч А. Свіцязянка. С. 303.
[5] Каваленка В. А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Мн., 1975. С. 69.

Калі пад'язджаеш начною парою
І станеш да возера тварам, —
Мігцяць зоркі ў небе, мігцяць пад табою,
Мігціць там і месяцаў пара.
Не знаеш, — з-пад ног, можа, гэта шкляная
Ідзе аж да неба дарога
Ці неба шкляное скляпенне схіляе
Табе аж пад самыя ногі!
І той, другі, бераг убачыць не ў сілах —
З вышынямі возера зліта.
Нібыта вісіш ты на птахавых крылах
У нейкім бяздонні блакіту! [6]

(Пераклад А. Бялевіча)

Прыведзеныя радкі — гэта не толькі візуальнае ўспрыманне возера Свіцязь і рамантычнае ўяўленне яго лучнасці з нябеснай сферай (зрэшты, дастаткова рэальнага), а адчуванне паэтам сябе ў нябесна-азёрна-зямным зліцці, у пераходнасці двух светаў. Яўленае Міцкевічу бачанне Свіцязі пазначыла магчымасць адкрыцця вышэйшай гармоніі сусвету менавіта ў сувязі з родным краем і найперш праз любасць да яго.

Апынуўшыся ў эміграцыі, Міцкевіч імкнуўся запаўняць свой быт такімі атрыбутамі, якія нагадвалі б яму край маленства і маладосці. Старэйшая дачка паэта Марыя пісала ва ўспамінах: "У нашым садку было і дрэўца рабіны, якое сам бацька пасадзіў, і дзе б мы калі не мелі сад, ён заўсёды клапаціўся, каб у ім было дрэва, якое яму напамінала б Літву і горкія ягады якога дзеля памяці ён таксама любіў" [7]. У адным з лістоў яна адзначала, што дзяцінства яе ўбірала ў сябе не толькі дом, дзе яны жылі, "але і далёкую айчыну", якую "вучылі больш за ўсё любіць, адрываючы думкі і пачуцці ад прыёмнай зямлі, заўсёды ўспрыманай як часовае жытло" [8].

Уносячы ліцвінскі стыль у сваё эмігранцкае жыццё і напаўняючы яго прыкметамі і дэталямі родных мясцін, Міцкевіч спрабаваў прыглушыць сум па мінулым, але не мог перанесці ў эміграцыю пакінутую радзіму. Паэт няўхільна набліжаўся да таго, каб скарыстаць самы надзейны і даступны для яго — мастацкі спосаб вяртання дамоў. Зварот "Літва, мая айчына…", пастаўлены ў пачатак "Пана Тадэвуша", мае для паэта амаль рытуальнае значэнне. Гэта канкрэтны накірунак і канкрэтная сфера яго ўяўнага вяртання. Яны неадменныя і незаменныя.

Вось чаму, калі Ю.-У. Нямцэвіч прапанаваў А. Міцкевічу замяніць у першым радку "Пана Тадэвуша" слова "Літва" на "Польшча", то ён абурыўся гэтай прапановаю… [9] Ускоснае непрыняцце пазіцыі вялікага наваг-

[6] Міцкевіч А. Свіцязянка. С. 338–339.

[7] Gorecka M. Wspomnienia o Adame Mickiewiczu. Kraków. 1897. 3-e wyd. S 39.

[8] Maślanka J. Nieznany rękopis córki Adama Mickiewicza // Pamiętnik Literacki. 1956. R. XLXII. Zesz. specjalny. S. 419.

[9] Pelczyński S. Proroctwo Mickiewicza. Warszawa, 1930. S. 244.

рудчаніна ў дачыненні да родных мясцін і гістарычнай Літвы выявілася нават у стылізаваным працягу яго паэмы, напісаным Ю. Славацкім таксама пад назвай “Пан Тадэвуш”. Як зазначае З. Стэфаноўская, “для Міцкевіча Літва, як Сапліцова, ёсць сфера свойскасці. У той час як Славацкі свядома і настойліва экспануе чужасць Літвы і ліцвінскасці” [10]. У выніку польскія літаратуразнаўцы вымушаны канстатаваць, што “цяпер не хапае нам гістарычнага ўяўлення, каб зразумець штось такое, як ліцвінскі партыкулярызм Міцкевіча” [11].

Між тым міцкевічазнаўства, незалежна ад шматбаковасці і рознаўзроўневасці даследавання спадчыны паэта, не звярнула ўвагі на тое, што творчасць яго рэалізоўвалася не толькі ў лучнасці з радзімаю, Навагрудчынай, праз фальклор беларусаў, іх вераванні і мову, але і ў разрыве з родным краем дзеля польскай мовы. Менавіта ва ўзаемадзеянні гэтых двух пачаткаў — лучнасці і разрыву з бацькаўшчынай узнікла асабліва высокая напружанасць светаадчування паэта. З часам лучнасць яго з радзімаю ўскладнілася, перайшла, так бы мовіць, у якасна іншую фазу. Эміграцыя паглыбіла разрыў фізічна-прасторавы, але ўзмацніла, абвастрыла сувязь духоўнага парадку, прытым на фоне ўяўляльнай палітычнай радзімы, радзімы страчанай дзяржаўнасці.

У стане душэўнага дыскамфорту скіроўваў Міцкевіч сваю думку ў бок радзімы, і толькі засяроджанасць на ўзнаўленні вобразаў роднага краю ўносіла нейкі лад у яго светаадчуванне. Удзячны за вернутае ў дзяцінстве жыццё, паэт у надзеі на новы цуд звяртаўся да святой Дзевы Марыі са стрыманым маленнем:

Ты вернеш нас дзівосна ў край каханы.
Ты часам перанось мой дух засумаваны
У лес зялёны, на пагоркі і паляны,
Што над блакітным Нёмнам скрозь парассціланы,
Да маляваных ніў, дзе жыта серабрыцца.
І залачоная калышацца пшаніца,
Дзе грэчка, быццам снег, свірэпа, як бурштыны,
І дзяцельнік гарыць румянцамі дзяўчыны. [12]

(Пераклад П. Бітэля)

Матывы тугі па радзіме і вяртання на родную зямлю становяцца, бадай, ці не вядучымі ў творчасці многіх землякоў Міцкевіча, якія адносяцца да наступнага за ім пакалення. З асабістым замілаваннем узнаўляў малюнкі роднага ўлоння Геранім Марцінкевіч, калі знаходзіўся ўдалечыні ад яго. Краявіды радзімы, пакліканыя ў верш настальгічнай памяццю паэта, ажывалі ў яго творах без аніякага супастаўлення з чужынай, бо яны, так бы

[10] Stefanowska Z. Pan Tadeusz — i co dalej? // Teksty Drugie. Nr. 1/2. S. 11.
[11] Stefanowska Z. Geniusz poety, geniusz narodu // Teksty Drugie. 1995. Nr. 6. S. 26.
[12] Міцкевіч А. Свіцязянка. С. 475.

мовіць, па-за канкурэнцыяй. У вершы “Пілігрым”, напісаным у Разані, Г. Марцінкевіч канстатаваў, што ён апынуўся далёка ў чужым краі і не ведае, калі вернецца дахаты, калі надыдзе яго спатканне з любай у тым краі, дзе дрэвы ўпіраюцца ў неба, дзе свята прыроды, дзе “спявае надзея”, дзе “пеніцца Дзвіна ад лебядзіных крылаў”. Вяртанню загадкавага героя ў родны горад над Дзвіной прысвечана і ненадрукаваная драма Г. Марцінкевіча “Падарожны”.

Вяртаннем апавядальніка ў мясціны маладосці, у прынёманскі край пачынаецца паэма “Таміла” Вінцэся Каратынскага, ураджэнца Навагрудчыны, які прысвяціў вялікаму земляку некалькі змястоўных біяграфічных матэрыялаў і праз усё жыццё пранёс паважлівую, неаднойчы зафіксаваную ў друку ўвагу да творчасці аўтара “Пана Тадэвуша”.

Аўтарскае вяртанне ў паэме “Таміла” адрозніваецца ад Міцкевічавага відавочнай рэальнасцю, хоць па настрою вельмі блізкае да тых эмоцый, якімі суправаджаюцца ўспаміны аўтара “Пана Тадэвуша”:

Дзякаваць Богу! Хоць клопат вярэдзіць,
Ды я ўсё ж вярнуўся да ніў прадзядоўскіх.
Вітай мяне, Нёман, стары мой суседзе!
Вітай жа мяне, прынямонская вёска!
Чужынай апёкшыся, зведаўшы беды,
Іду я спачыць пад страхою з саломы.
Нівы дабра! Ці ж мяне вам не ведаць?
Я прыяцель ваш, я ваш даўні знаёмы…
І толькі у сэрцы, як з плоднага жніва
Ашчадна пакінуты колас па вёсны,
Застаўся ўспамін, што малюе мне жыва
І час маладосці, і родную вёску. [13]

(Пераклад У. Мархеля)

Вяртанне Міцкевіча ў думках, ва ўяўленнях пра радзіму, рэалізаванае шчодрым узнаўленнем жыццяносных малюнкаў і эпізодаў ў паэме “Пан Тадэвуш”, не выключала рэальнага, фізічнага вяртання ў край маленства, дамоў, захоўвала надзею на сустрэчу паэта з успетымі ім мясцінамі. У лазанскай жа лірыцы паэта гэтай надзеі ўжо не стала. У вершах “Над воднай прасторай чыстай…”, “Калі мой труп…”, “Паліліся мае слёзы…” Міцкевіч заглядвае ў такія глыбіні свае душы, якія адкрываюць яму сэнс страты радзімы і выпрабавання лёсу.

Трагічным асэнсаваннем немагчымасці вярнуцца ў край маленства блізкі да лазанскага цыкла Міцкевіча элегічны верш В. Каратынскага “Туга на чужой старане”, напісаны па-беларуску ў час паражэння паўстання 1863 г. і рэальнай пагрозы расстання з родным краем, калі пачуццё страты радзімы асабліва абвастрылася, набыло рысы жыццёвай катастрофы.

[13] Каратынскі В. Творы. 2 выд., дап. Мн., 1994. С. 115.

Працягваючы міцкевічаўскія традыцыі ў выказванні любасці да радзімы і пачуцця страты краіны маленства — свае Аркадыі, В. Каратынскі выйшаў праз вобразнасць беларускага меласу на высокі ўзровень натуральнага мастакоўскага самавыяўлення ў нацыянальна-беларускіх формах і тым самым засведчыў плённасць для беларускай літаратуры адраджэнцкіх тэндэнцый, закладзеных у творчасці вялікага Адама Міцкевіча.

Ірына Багдановіч *(Мінск)*

ТВОРЧАСЦЬ АДАМА МІЦКЕВІЧА І СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ РАМАНТЫЧНАЙ ТРАДЫЦЫІ

У беларускім літаратуразнаўстве склалася агульная канцэпцыя недавыяўленасці рамантызму як паўнавартаснага ідэйна-мастацкага напрамку XIX ст., калі развіццё літаратуры на роднай мове было толькі эпізадычным (першая палова стагоддзя) і набывала рысы прафесійнай творчасці не раней 40–50-х гг., калі ў еўрапейскіх літаратурах рамантызм вычарпаў свае магчымасці. Сярод беларускіх рамантыкаў сярэдзіны XIX ст. даследчыкі слушна называлі Я. Чачота і Я. Баршчэўскага, часткова У. Сыракомлю і В. Дуніна-Марцінкевіча. У далейшым гаворка пераводзілася на пачатак XX ст., дзе трывала заняла сваё месца ў рэчышчы рамантычных традыцый ("неарамантызму") творчасць Я. Купалы. У навуковай літаратуры рабілася слушная агаворка, што "з тэрыторыяй Беларусі звязана зараджэнне так званай беларускай школы польскага рамантызму", заснавальнікам якой лічыцца А. Міцкевіч, ураджэнец Навагрудчыны [1].

Агульнапрынятая і доўгі час існуючая канцэпцыя рэпрэзентацыі Міцкевічам беларускай плыні польскай літаратуры (або польскага рамантызму) [2], бясспрэчна, мела сваё рацыянальнае зерне, але адсякала вялікага паэта ад кантэксту нацыянальнай культуры як нешта дастаткова чужароднае. У сярэдзіне 90-х гг. у беларускім літаратуразнаўстве ўсё больш настойліва абгрунтоўваецца думка аб тым, што ў XIX ст. "творы, якія былі напісаны па-польску аўтарамі, этна-генетычна звязанымі з Беларуссю, уваходзяць у гісторыю беларускай літаратуры як яе польскамоўная плынь" [3]. Канцэпцыя "польскамоўнай плыні" ў беларускай літаратуры XIX ст. пашырае далягляды апошняй, засноўваецца на інтэграванасці кантэкстаў беларускай і польскай культур у перыяд сумеснай дзяржаўнасці і гісторыі, — інтэграва-

[1] Казбярук У. М. Рамантычны пошук. Мн., 1983. С. 22.

[2] Брага С. Міцкевіч і беларуская плынь польскае літаратуры // З гісторыяй на "вы". Мн., 1994. Вып. 3. С. 287–313.

[3] Мархель У. І. Прысутнасць былога. Мн., 1997. С. 14.

насці, якая яшчэ не згубіла сваю актуальнасць у XIX ст., нягледзячы на тое, а часам і насуперак таму, што інтэграцыйны вектар змяніўся.

Абгрунтоўваючы канцэпцыю "польскамоўнай плыні" слушнымі даводамі, аўтар яе тым не менш лічыць, што "беларуская літаратура праз творчасць Міцкевіча не атрымала рамантызм у завершаным, нацыянальна афармленым выглядзе" [4]. І ўсё ж, на нашу думку, менавіта азначаны вышэй падыход да польскамоўнай спадчыны вяртае сёння творчасць А. Міцкевіча ў кантэкст нацыянальнай літаратуры, што робіць паўнавартасным і беларускі рамантызм. Развіццё літаратурных плыняў уяўляецца пры гэтым працэсам натуральным, цесна ўвязаным з асаблівасцямі грамадска-палітычнага жыцця тагачаснай Беларусі.

Такім чынам, калі мы сёння будзем гаварыць пра генезіс і традыцыі беларускага рамантызму, то значыць мы будзем гаварыць пра традыцыю, ля вытокаў якой стаіць А. Міцкевіч, якую ён сцвердзіў уласнай творчасцю, увасобіўшы ў рытуальнай польскамоўнасці сутнасную мадэль нацыянальнага (беларуска-"ліцвінскага" і польскага як "рэчпаспалітаўскага") духоўнага, культурна-гістарычнага і этна-генетычнага космасу. У яго творах адбіліся харство і дасканаласць беларускай міфапаэтыкі, фальклору, абраднасці, асаблівасці менталітэту, бытавой культуры, гістарычных каранёў. "Гісторыя польскага рамантызму распачынаецца на Літве" [5], — невыпадкова з такой фразы пачала сваю манаграфію аб рамантызме польская даследчыца Дарота Сівіцка, маючы на ўвазе зямлю, якая нарадзіла А. Міцкевіча. З гэтых жа пазіцый мы можам таксама сцвярджаць, што гісторыя рамантызму беларускага пачынаецца з польскамоўнай творчасці аўтара "Гражыны" і "Свіцязянкі".

Творчасць Міцкевіча, перадусім яе рамантычны накірунак і патрыятычны пафас, вызначылі шлях развіцця беларускай літаратуры ў XIX ст. Адбітак уплыву ляжыць і на літаратуры новага беларускага адраджэння пачатку XX ст. Невыпадкова сярод першых беларускіх выдавецкіх акцый, здзейсненых суполкай "Загляне сонца і ў наша аконца", было выданне серыі кніг "Беларускія песняры". XIX ст. у гэтай серыі прадстаўлялі творы А. Міцкевіча, В. Дуніна-Марцінкевіча і Ф. Багушэвіча. Варта звярнуць увагу на тое, што Міцкевіча (яго "Пана Тадэвуша" ў перакладзе В. Дуніна-Марцінкевіча) выдавалі як беларускага песняра, і ні ў кога не ўзнікла нават сумнення, што гэта замежная літаратура. Гэта была айчынная літаратура, айчынная класіка, падмурак нацыянальнай традыцыі, надзвычай актуальны ў перыяд стварэння навейшай літаратуры. Міцкевіч вызначыў сам дух і накірунак беларускай літаратуры, што выявілася ў XIX ст. як у польскамоўнай, так і ў беларускамоўнай творчасці. Яго называлі духоўным айцом, пастырам

[4] Мархель У. І. Прысутнасць былога. С. 17.

[5] Siwicka D. Romantyzm. 1822–1863. Warszawa, 1997. S. 7.

наступных пакаленняў, і гэта зафіксавана ў сведчаннях пісьменнікаў. Такую ролю адвёў яму паплечнік па філамацкаму асяроддзю А. Адынец у адным з вершаў, які ён у 1858 г. упісаў у вядомы беларускі "Альбом" А. Вярыгі-Дарэўскага. Верш меў красамоўную назву "Дзецям Адама". Менавіта такімі ён уяўляў наступных творцаў, назваўшы іх "душамі і сэрцамі шляхетнымі ў Айчыне":

Co serc, co dusz szlachetnych i wzniosłych w Ojczyznie,
Tylu życzliwych macie po Ojcu w spuściznie.
W każdym żyje duch jego — i On sam jak wierzą. [6]

Другі аўтар вершаванага тэксту ў "Альбом" Вярыгі-Дарэўскага, А. Рыпінскі, пачынае свой твор з уражання, якое зрабілі на яго ўсе папярэднія запісы (а гэта творы Сыракомлі, Дуніна-Марцінкевіча і іншых): "Калі я ўзяў твой пекны альбом, пачаў перагортваць старонкі, убачыў столькі вялікіх імёнаў, то заўважыў, што ўсе яны спяваюць табе тонам Адама" [7]. Міцкевіч стварыў магутнае духоўна-эстэтычнае поле, і ў ім знаходзіліся, адчуваючы яго ўплыў, шматлікія творцы. Адны з іх адчувалі неабходнасць перастварэння Міцкевіча па-беларуску, каб яго творы прыйшлі "пад кожную сялянскую страху", як пісаў А. Ельскі, перафразуючы радкі міцкевічаўскага раманса "Дудар". Перакладамі актыўна займаліся Дунін-Марцінкевіч, Ельскі, Вярыга-Дарэўскі (аб яго перакладзе "Конрада Валенрода" згадваў А. Кіркор). Іншы раз уплыў "тона Адама" адчуваўся на ўзроўні алюзій і рэмінісцэнцый, як ва "Успамінах" Франца Савіча, які, апісваючы ўцёкі з Кізляра, фактычна выказаў тыя ж пачуцці і выкарыстаў тую ж вобразную мадэль, што была ўжо ў міцкевічаўскім санеце "Акерманскія стэпы".

У творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча міцкевічаўскі рамантычны ўплыў адлюстраваўся найбольш паслядоўна, інтэнсіўна, закрануў найперш яго польскамоўную вершаваную творчасць, асноўны пафас якой можна вызначыць як шляхецкі патрыятызм. Міцкевіч акрэсліў ідэйна-мастацкае бачанне і рамантычнае ўзвышэнне Айчыны ў святле гістарычных, маральных, і этна-культурных каштоўнасцей. Ён замацаваў у свядомасці пакаленняў літвінска-беларускую канцэпцыю айчыны, упершыню назваўшы яе і абвясціўшы такім чынам будучы шлях яе адраджэння. Ідэйна-стылёвай асновай гэтай патрыятычнай дамінанты міцкевічаўскага рамантызму быў "сармацка-рыцарскі" комплекс, якім вызначаецца вобраз міцкевічаўскага героя, змагара і абаронцы. Такі вобраз увасабляў ідэал годнага рыцара-шляхціца, гатовага да змагання за айчыну, якая ў яго свядомасці ёсць найдаражэйшай каханай. Ён у розных інварыянтах прасочваецца ва ўсёй творчасці Міцкевіча — ад ранняй паэмы з уплывам класіцысцкай школы "Мешка, князь

[6] Пачынальнікі: З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. Мн., 1977. С. 247.
[7] Тамсама. С. 272.

Навагрудка", ад рамантычнай балады "Свіцязь" да "Пана Тадэвуша". Нездарма ў яго герояў, якія часта рэпрэзентуюць такі вобраз, імёны выбраны па геральдычнаму прынцыпу, які адлюстроўваў і ўласны міцкевічаўскі шляхецкі радавод (Порай, Рымвід).

Такую традыцыю працягваў Дунін-Марцінкевіч, стварыўшы, да прыкладу, у паэме "Люцынка, альбо Шведы на Літве" вобраз годнага шляхціца Далівы (В. Дунін-Марцінкевіч, як вядома, належаў да шляхецкага роду, які карыстаўся гербам Ляліва) і яго сына Уладзіслава, які ўвасабляў ідэал старашляхецкага рыцарскага служэння айчыне. Страту і разбурэнне такога комплексу паводзін назіраў Дунін-Марцінкевіч, на вачах якога праходзіла далейшае знішчэнне і дэградацыя традыцый былой шляхецкай дзяржавы Рэчы Паспалітай. Гэтую дэградацыю і распад з вялікім душэўным болем, а не з іроніяй, што стала агульным месцам у нашым літаратуразнаўстве, адлюструе пісьменнік пазней у славутай камедыі "Пінская шляхта". Такім чынам, выступаючы як наватар у беларускамоўнай творчасці, Дунін-Марцінкевіч традыцыйна працягваў пісаць ў польскамоўным рэчышчы, жадаючы быць даступным і зразуметым сваім народам у яго саслоўнай, шляхецкай і сялянскай, цэласнасці. Аблічча дзяржавы некалькі стагоддзяў вызначала шляхецка-рыцарскае саслоўе, і менавіта ў польскамоўных творах Дуніна-Марцінкевіча патрыятычны ідэал і топас айчыны рэалізоўваліся праз сармацка-рыцарскі комплекс, што выразна паказвала на міцкевічаўскую рамантычную традыцыю. У беларускамоўных творах Дуніна-Марцінкевіча такога няма: ні ў "Шчаўроўскіх дажынках", ні ў "Вечарніцах", ні ў "Купале". Можа быць, часткова толькі ў "Гапоне" адлюстраваўся шляхецка-рыцарскі ідэал як маральнае і сацыяльнае ўзвышэнне чалавека з простанароддзя, якое даецца яму за асабістыя доблесныя заслугі (зрэшты, гэтак быў адбіты гістарычны вопыт фарміравання былога шляхецкага саслоўя). У беларускамоўных творах Дуніна-Марцінкевіча праявілася іншая галіна рамантычнага ўплыву: зварот да народнай творчасці, звычаяў і абрадаў з мэтаю адцяніць народную аснову сваіх твораў, узвысіць нацыянальнае і рэгіянальнае да узроўню мастацкай значнасці і абагульнення. Гэта быў наватарскі, але не выпадковы крок пісьменніка ў развіцці айчыннага беларускамоўнага рамантызму. Побач з ім набіраў моц і развіваўся талент У. Сыракомлі, які абраў для свайго паэтычнага самасцвярджэння жанр народнай вершаванай гутаркі (гавэнды). Генезіс і кампазіцыйная структура гутаркі нагадвае баладу і выглядае часам як яе стылёвы інварыянт.

На пачатку XX ст. рамантызм найбольш захапіў такую творчую натуру, як Я. Купала, але з улікам адлегласці часу і змены мастацкіх стыляў, уплыву сімвалізму і мадэрнізму той рамантычны комплекс, якім характарызуюцца героі і ідэі купалаўскіх твораў, вызначаецца як "неарамантызм". Уплыў Міцкевіча на Купалу быў таксама значным і шматгранным. Што датычыць

сармацка-рыцарскага комплексу, то ён звязаны ў Купалы з прыёмам гістарычнай інверсіі, уласцівым рамантызму. Для Купалы зварот да такога прыёму быў патрэбен у сувязі са сцвярджэннем на новым гістарычным павароце ідэі нацыянальнай незалежнасці Беларусі. Каб узвялічыць і абгрунтаваць гэтую ідэю, Купала паэтызаваў гістарычнае мінулае, у якім бачыў духоўную апору на новым этапе барацьбы. Для гэтага неабходна была яго гераізацыя і ідэалізацыя. Аднак не паэма "Курган", у якой вобраз князя ёсць увасобленае зло тыраніі, самадурства, жорсткасці і распусты, рэпрэзентуе гэтую рамантычную мадэль. Яе рэпрэзентуе створаная на адзін год пазней, у 1911 г., паэма "На куццю", дзе Купала ўзнаўляў старажытны княжацкі ідэал, адлюстраваны ў летапісах. Амаль у стылі манументальнага гістарызму, характэрным для літаратуры ранняга сярэдневякоўя, Купала стварае геральдычны вобраз мудрага і мужнага князя, які дбаў аб росквіце, дабрабыце і незалежнасці сваёй дзяржавы. Вобраз сярэдневяковага князя ў паэме "На куццю" прадстаўлены, як і належыць стылю манументальнага гістарызму, у яго найбольш значных учынках (сустрэча ганцоў у святліцы і прыняцце найважнейшых рашэнняў аб лёсе народа), ён таксама "увекавечаны ў сваім як бы ідэальным панадчасовым стане" [8]. Рамантычны каларыт твора дасягаўся ўвядзеннем таямнічага старадаўняга абраду куцці, што скіроўвае ізноў нас непасрэдна да міцкевічаўскай традыцыі. Родная зямля — краіна, якой служаць у глыбінях вякоў князь і ганцы, сімвалічна называецца Купалам "скаванай мучаніцай княжнай". Яна чакае свайго разнявольвання, як чакала яго абагаўлёная Міцкевічам айчына ў вобразе "найдаражэйшай каханай", любоў да якой трэба даказваць "не як Дон-Кіхот, спыняючыся на бітым шляху і кідаючы выклік усім сустрэчным…, але так, як Карл Вялікі загадваў сваім рыцарам дамагацца прыхільнасці Анжэлікі" [9]. Узнаўляючы геральдычны і сармацка-рыцарскі архетып уларада ў паэме "На куццю", Купала на працягу далейшай творчасці будзе звяртацца да розных мадыфікацый гэтага архетыпу.

З міцкевічаўскай рамантычнай традыцыяй звязана паэтызацыя і адухаўленне Нёмана — ракі, вобраз якой нёс таксама высокі патрыятычны настрой і ўзмацняў вольналюбівы змагарны дух. Нёман быў жыццядайнай артэрыяй старажытнай летапіснай Літвы-Беларусі, і Міцкевіч апеў яго, як вядома, у шматлікіх творах. Патрыятычны ліцвінскі пафас, блізкі міцкевічаўскаму, уласцівы і фальклорна-рамантычнай паэме "Мачаха" Адэлі з Устроні, дзе Нёман называецца шляхетным "літоўчыкам".

Купала ў 1911–1912 гг. стварае свой патрыятычны верш "Над Нёманам". Хоць ён не быў сваім паходжаннем гэтак моцна звязаны з прынёманскім беларускім ландшафтам, як Міцкевіч ці Адэля з Устроні, усё ж

[8] Лихачев Д. С. Избранные работы: В 3 т. Л., 1987. Т. 3. С. 33.

[9] Цыт. па кн.: Мицкевич А. Собр. соч.: В 5 т. М., 1954. Т. 5. С. 372.

абраў менавіта гэтую раку ў якасці сармацка-рыцарскага сімвала старажытнай магутнасці і самавітасці беларускай дзяржавы і яе народа.

Міцкевічаўская традыцыя, адбітая праз сармацка-рыцарскі ідэал, які дэфармаваў аблічча еўрапейскага "байранічнага" героя, надаваў яму рысы патрыёта айчыны і змагара за яе вызваленне, выразна прасочваецца і ў творчасці У. Караткевіча, перадусім у вобразе князя Алеся Загорскага — героя рамана "Каласы пад сярпом тваім" і аповесці "Зброя".

Міцкевічаўская рамантычная традыцыя з яе культам айчыны дае сябе адчуць на ўсім абсягу развіцця беларускай літаратуры. Яна стварала асаблівае духоўна-эстэтычнае поле, пад уплывам якога нараджалася новая мадэль адраджэнцкага светаадчування: усё яшчэ не вызначаная ў сэнсе дзяржаўнасці айчына патрабавала праз паэтаў новага прароцтва аб сваім лёсе ў літаратуры.

Арнольд Барат Мак-Мілін *(Лондан)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ І БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА Ў XIX ст. РОДНАСЦЬ І ЎПЛЫЎ [1]

Месіянізм не меў пэўнага ўплыву на адносіны Адама Міцкевіча да беларускай літаратуры. Хутчэй, мы сутыкаемся з рознымі формамі роднасці і значнага ўплыву, хаця польскі месіянізм зрабіў, напрыклад, першапачатковы ўплыў, прынамсі, на аднаго беларускага пісьменніка пачатку XIX ст. з арыентацыяй на польскую культуру, Яна Чачота [2]. Захапленне Міцкевіча беларускім фальклорам і мовай не было доўгім, але элементы папулярных традыцый і надзей і, вядома, мовы яго родных мясцін знаходзяць сваё адлюстраванне ў яго шматлікіх позніх творах. Сваім прыкладам ён значна паўплываў на ранняе развіццё сучаснай беларускай літаратуры.

Месца нараджэнне Міцкевіча, Навагрудчына, у этнічнай Беларусі лічыцца не толькі вытокам яго моцнага пачуцця да таго краю, які ён называў Літвой, але дапамагае растлумачыць тую асаблівую любоў да яго шматлікіх беларускіх пісьменнікаў на працягу апошніх 150 гадоў, якія, хто ў большай, хто ў меншай ступені, лічылі Міцкевіча сваім земляком і на-

[1] Гэты тэкст упершыню быў прадстаўлены на канферэнцыі "Міцкевіч і месіянізм" на Славянскім і ўсходнееўрапейскім аддзяленні Лонданскага універсітэта ў верасні 1998 г.

[2] У артыкуле імёны ўсіх польска-беларускіх пісьменнікаў пададзены па-беларуску (гэта пісьменнікі польскай культурнай арыентацыі, якія прымалі ўдзел у развіцці сучаснай беларускай літаратуры). Тое ж датычыцца і назваў мясцін на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Vilnius, які мае шмат формаў напісання, пададзены тут пад беларускай назвай Вільня. Вытрымкі з тэкстаў XIX ст., якія не мелі аднолькавай арфаграфіі і дзе ўжывалася як кірыліца, так і лацінскі шрыфт, пададзены тут у агульнапрынятай форме.

стаўнікам. Лексічныя правінцыялізмы і шмат тэм з беларускага жыцця і фальклору, якія займаюць значнае месца ў ранніх вершах Міцкевіча, былі паўтораны не толькі такімі пагарджанымі польскімі пісьменнікамі беларускай школы, вядомымі пад назвай “смаргоншчыны” і “пінскіх галоў”, але і такімі асобамі, як Аляксандр Гроза, Вінцэнт Рэут і Геранім Марцінкевіч [3]. Іншыя пісьменнікі ў першыя дзесяцігоддзі XIX ст. былі натхнёныя на стварэнне першых узораў сучаснай беларускай літаратуры, пачыналі свае літаратурныя спробы пад прамым уплывам Міцкевіча, з якім шмат хто з іх сябраваў. Сярод іх — этнограф Ян Баршчэўскі, які ведаў Міцкевіча па Санкт-Пецярбургу. Ян Баршчэўскі быў менш папулярны як паэт. Больш вядомы яго польскі твор “Шляхціц Завальня…” (1844–1846); з яго беларускіх твораў захаваліся толькі тры. Найбольш значным з іх з’яўляецца жыццёвая апавядальная паэма “Рабункі мужыкоў” (1812), якая адлюстроўвае паводзіны сялян пасля таго, як іх гаспадары збеглі ад арміі Напалеона на ўсход.

Другой добра вядомай фігурай першай паловы XIX ст. з’яўляўся Аляксандр Радван Рыпінскі, пісьменнік і фальклярыст, які стаў эмігрантам як удзельнік паўстання 1831 г. Ён правёў шмат гадоў у Парыжы, дзе пазнаёміўся з Міцкевічам перад тым, як пераехаў у Лондан у 1846 г. і заснаваў там друкарню у Тотэнхеме. Больш вядомы як аўтар этнаграфічнай працы “Беларусь”, выдадзенай у Парыжы у 1840 г. Ён таксама напісаў папулярную камічную баладу пад назвай “Нячысцік” (Лондан, 1852) і гумарыстычны верш, часта цытаваны (гл. спасылку 27).

Другі польска-беларускі пісьменнік сярэдзіны XIX ст., на якога меў пэўны ўплыў Міцкевіч, гэта Уладзіслаў Сыракомля (псеўданім Людвіка Кандратовіча), член гуртка інтэлектуалаў, якія групаваліся вакол газеты “Kurier Wileński”. Толькі два з яго беларускіх твораў ацалелі: гэта верш “Добрыя весці” (1848) і кароткая алегорыя “Ужо птушкі пяюць усюды…” (1861) — абодва на рэвалюцыйную тэму [4].

Але больш значным, чым любы з вышэй названых аўтараў, з пункту гледжання сувязей быў Ян Чачот, адзін з першых беларускамоўных пісьменнікаў. Ён знаходзіўся ў выключнай пазіцыі як сябра Міцкевіча аж

---

[3] Большасць з шэрагаў пісьменнікаў “смаргоншчыны” ці “пінскіх галоў” забыты ў наш час. Рэут і Марцінкевіч, напр., нават не ўспамінаюцца ў Юліяна Кржыжаноўскага. Гл.: Literatura polska / Przewodnik encyklopedyczny. 2 vols. Warszawa, 1984–1985; Czachowska J. (ed.). Słownik współczesnych pisarzy polskich. 3 vol. Warszawa, 1977–1978. Далей дэталёва аб гэтых і іншых пісьменніках гл.: Лойка А. Адам Міцкевіч і беларуская літаратура. Мн., 1959. С. 85–86. Тут і далей — Лойка.

[4] Больш поўныя звесткі аб гэтым польска-беларускім пісьменніку гл.: Zdiechowski M. Władysław Syrokomla. Wilno, 1924; Муліма У. Прафесар Здзяхоўскі аб беларускай душы Сыракомлі. Вільня, 1925; Dąbrowski J. P. O proczesnem mijsce na Parnasie // Wiadomości. 1956. N. 5 (513). S. 1.

з універсітэцкіх дзён [5], а таксама член тайнага Таварыства філаматаў. Гэта было адлюстравана ў вершы Антона Адынца на надмагільным камені Чачота:

Imię jego w narodzie jest ciągle związanym
Z Adamem Mickiewiczem i Tomaszem Zanem.

Чачот і Зан (разам з Аляксандрам Ходзькам, Антонам Адынцом і Ануфрыем Петрашкевічам) абуджалі найлепшыя пачуцці да беларускай мовы і фальклору і сваім прыкладам нібы раілі адысці ад неакласіцызму Кракава і Варшавы, які, як вядома, Міцкевіч ніколі не наведваў. Чачот і Зан, былі аб'яднаны з Міцкевічам таксама выпрабаваннямі палітычнай ссылкі "за выказванне небяспечных ідэй у вершах і прамовах" [6]. Яны абодва падзялялі турэмныя пакуты ў Арэнбургу; потым Ян Чачот жыў у іншых месцах Расіі да таго, як атрымаў дазвол вярнуцца ў родныя мясціны. Няма сумненняў у тым, што вобраз Міцкевіча як палітычнага пакутніка выяўна адбіўся на пачуццях да яго з боку беларускіх пісьменнікаў і іншых інтэлектуалаў, якія самі шмат пакутавалі ад рэпрэсіўнага расійскага рэжыму як у XIX, так і ў XX стст.

Сіла захаплення Міцкевіча беларускай культурай выразна выяўляецца ў яго шматлікіх зваротах да яе, пачынаючы з азначэння беларускай мовы як найбагацейшай і найчысцейшай з усіх усходнеславянскіх "дыялектаў" і найбольш гарманічнай з усіх славянскіх моваў [7], працягваецца ў яго каментарыях і апісаннях пакут народа [8] і багацця народных традыцый [9]. Натуральна, что наймацнейшы беларускі элемент у творчасці Міцкевіча праявіўся ў яго ранніх творах, калі ён жыў у Навагрудку і Вільні [10]. Сярод такіх твораў трэба адзначыць: "Мешка, князь навагрудскі" (1819) і "Бульба" (1819–1821), а таксама "Балады і рамансы" (1822). Шмат чаго з беларуска-

[5] Наконт вучобы Чачота ў Віленскім універсітэце існуюць розныя погляды. Яго хуткі ад'езд з універсітэта пасля года навучання, як раней сцвярджалася, з-за фінансавых праблем, цяпер аспрэчваецца ў "Новым Карбуце", дзе выказваецца думка аб тым, што Чачот не вытрымаў уступных экзаменаў і быў залічаны ва універсітэт памылкова, дзякуючы сваім сувязям, і праз год быў вымушаны пакінуць універсітэт. Гл.: Sliwinska I., Stupkiewicz S. (і інш.) // Nowy Korbut. Warszawa, 1968. T. 7. S. 246.

[6] Pigoń S. Jan Czeczot // Polski słownik biograficzny. Kraków, 1938. T. 4. S. 317.

[7] Mickiewicz A. Literatura Słowiańska // Mickiewicz A. Dzieła. Warszawa, 1955. T. 10. S. 106.

[8] У якасці аднаго са шматлікіх прыкладаў апісання Мацкевічам пакут простых людзей гл. маналогі Грусана і Савы ў другой ч. "Дзядоў". Warszawa, 1955. T. 3. S. 23–24.

[9] Такія апісанні творчасці Міцкевіча сустракаюцць часцей у "Пане Тадэвушу" і "Дзядах".

[10] Некаторыя лексічныя беларусізмы захоўваліся ў Міцкевіча на працягу ўсяго жыцця. Напр., poruczyć, czereda, rozhowory, kułak, szurpaty, kaban і многія інш. У "Пане Тадэвушы" мы зноў сустракаем такія словы, як kupla замест польскага zakup, nadto ў сэнсе bardzo, wszystko як польскае ciągle. Дэталёва гл. у арт.: Станкевіч С. Адам Міцкевіч — вялікі сын зямлі Беларускай // Бацькаўшчына. 1955. № 47–48 (277–278). С. 4.

га жыцця і мясцовага патрыятызму адбілася ў 2 і 3 частках “ Дзядоў” [11], у “Свіцязі” (1820) і “Свіцязянцы” (1821) [12]. У “Бульбе”, напрыклад, мы знаходзім:

O nowogródzka ziemio, kraju mój rodzimy,
O, Trębeckimi godzien uwielbienia rymy!
Humańskich bracie sadów i okolic Wisły,
Gardzą tobą gminniejsze podróżnika zmysły. [13]

Яшчэ больш адметны зварот да роднай бацькаўшчыны — калдычэўскага Завосся — заключаны ў баладзе “Тукай, або Спробы прыязні”:

Idą ponad trzęskie kępy,
Mijają bagną, głębinie,
Hnilicy ciemnej ostępy,
Kołdyczewa nurty sinie.
Gdzie puszcza zarosła wkoło,
Spodem czarną, z wierchu płowa,
Źwirami nasute czoło
Wynosi góra Żarnowa,
Tam szli…[14]

Сярод паэм Міцкевіча, якія датычацца гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, трэба адзначыць “Гражыну” (1823) і “Конрада Валенрода” (1828). Што датычыцца “Пана Тадэвуша”, то, вядома ж, паэма змяшчае ў сабе разнастайныя яскравыя замалёўкі жыцця і навакольнага асяроддзя не толькі шляхты, але і простага люду Навагрудчыны і Налібоцкай пушчы. Тэма беларускіх матываў у польскай літаратуры і ў творах Міцкевіча, разам і па-асобку, прыцягвала значную ўвагу крытыкі [15]. Трэба таксама адзначыць, што захапленне Міцкевіча беларускімі фальклорнымі сюжэтамі і тэмамі хутка прайшло і па-сапраўднаму засталося толькі ў такіх пісьменнікаў, як Чачот, што натхняў Міцкевіча і, як сцвярджаюць, меў уплыў на яго. Але ўспаміны пра родны кут, навагрудскую старонку, засталіся з Міцкевічам на ўсё

[11] Ва уступе да паэмы паэт звяртае ўвагу на беларускае традыцыйнае святкаванне дзядоў. Болей дэталёва гл.: Брага С. Міцкевіч і беларуская плынь польскае літаратуры. Ню-Ёрк, 1957. С. 8–9. (Далей — Брага).

[12] Апошняя частка у перакладзе Льва Мея, была пакладзена на музыку у 1867 г. дымакратычна настроеным Рымскім-Корсакавым як адна з адносна нешматлікіх песень не на рускай мове, і толькі адна з дзвюх на польскай мове; яшчэ адным прыкладам стала у 1897 г. “Мая пяшчотка” (1825) Міцкевіча, таксама у перакладзе Мея.

[13] Mickiewicz A. Dzieła. Warszawa, 1955. T. 1. S. 57.

[14] Тамсама. С. 148–149.

[15] Больш дэталёва, у дапаўненне да Брагі і Лойкі, гл.: Stankiewicz S. Pierwiastki bialoruskie w polskiej poezji romantycznej: (Do roku 1830). Wilno, 1936 (далей — Stankiewicz. Pierwiastki…); Olechnowicz M. Polskie zainteresowania jezykiem białoruskim: (od połowy wieku XVI do roku 1863) // Zeszyty naukowe Uniwersytetu Łodzkiego. I. Nauki humanistyczno — społęczne. 36. Filologia. Łodź, 1964. S. 94.

жыццё [16]. Увогуле ж фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і асабліва лексічныя беларусізмы, якія існавалі ў польскай паэзіі філаматаў, былі свядомымі і шматсэнсоўнымі элементамі ў іх адносінах да рамантызму [17].

Ян Чачот вызначаўся сярод філаматаў як найбольш лірычны паэт. Ён, безумоўна, адыгрываў адметную ролю ў польскай рамантычнай плыні ў літаратуры і абыякава ставіўся да крытыкі. Яго асноўнымі дасягненнямі ўсё ж лічацца этнаграфічныя і літаратурныя працы, якія маюць дачыненне да Беларусі. Ён збіраў народныя песні, цікавіўся лінгвістыкай і пакінуў бясцэнную спадчыну для наступных этнографаў — такіх, як Еўдакім Раманаў і Павел Шэйн. Яго ж уласныя песні і паэмы адыгралі адметную ролю ў развіцці яшчэ не зусім трывалага, але ва ўсякім выпадку плённага адраджэння беларускай літаратуры пачатку XIX ст. Яго бацька быў аканомам у маёнтку Тызенгаўза, а мясцовае жыццё было адлюстравана Чачотам у двух польскіх баладах, “Мышанка” і “Узногі”. Фізічна, калі не культурна, ён апынуўся побач з сялянамі, аб чым сведчыць яго беларускі верш “Да мілых мужычкоў…” [18]. Выпраўлены ў Навагрудскую школу, Чачот упершыню сустрэў там Міцкевіча, і, калі яны потым разам паехалі ў Віленскі універсітэт у 1816 г., іх сяброўства ўзмацнела. Чачот быў разважлівы і памяркоўны, тады як яго сябра — рухавы і парывісты. Першага з іх хвалявала тое, што розніца іх талентаў можа іх аддаліць [19], але Міцкевіч умеў пераканаць сябра ў адваротным [20]. Чачот пакінуў універсітэт раней, аднак перапісваўся з сябрамі і хутка сцвердзіўся ў галоўнай ролі сярод філаматаў [21], напісаў некалькі лепшых польскіх і беларускіх вершаў таго перыяду [22], далёка не ўсе яны ацалелі [23].

---

[16] Гл.: Pigoń S. Pan Tadeusz: Wzrost, Wiełokość i Sława. Warszawa, 1934. S. 224.

[17] Гл.: Lehr-Spławiński. Jęnzyk Polski. Warszawa, 1947. S. 351.

[18] Czeczot J. Piosenki wieśniacze znad Niemna i Dźwiny, niektóre przysłowia i idiotyzmy, w mowie sławiano-krewickiej, s potrzeżeniami nad nią uczynionemi. Wilno, 1846. S. 62–63.

[19] Гл., напр., лісты Чачота да Міцкевіча ад 6 кастр. 1819 г.: Czubek J. Archiwum, filomatow. T. 1. Korespondencya 1815–1823. Kraków, 1913. T. 1. S. 154. (Далей — Czubek. Korespondencya…)

[20] Гл., напр., лісты Чачота да Міцкевіча ад 1 студз. 1819 г.: Czubek. Korespondencya… T. 3. S. 266–268. Аднак пазней гучаць цвярозыя ноткі, калі Міцкевіч, усхваляючы няпэўнасць і моц анакрэатычных вершаў Чачота, адзначае, што ім “не хапае агульнага інтэлектуальнага сэнсу” (“На жаль, вы не чытаеце Гётэ”). Czubek. Korespondencya… S. 266–268.

[21] 16 чэрв. 1818 г. Чачот стаў карэспандэнтам Таварыства філаматаў, а яшчэ праз шэсць месяцаў, 12 студз. 1819 г., сапраўдным членам.

[22] Цудоўная прывітальная песня Чачота, прысвечаная прыезду Міцкевіча з Коўна ў Вільню: “Едзе міленькі Адам…”, паходзіць з: “Adamowe i Tomaszowe” (Archiwum filomatów. T. 3. Poezja filomatów. Kraków, 1922).

[23] Творы Чачота фальклорнага тыпу, напр., “Купала”, гучна віталіся філаматамі 12 снежня 1818 г., але цяпер яны страчаны. Гл.: Stankiewicz S. Pierwiastki… S. 57. Для большай інфармацыі гл.: Prusinowski J. Jan Czeczot // Tygodnik Illustrowany. 1. 23. Warszawa, 1860. S. 193–195; Rychter J. H. Jan Czeczot i jego nieznane poezje. Ognisko domowe: Raptularz Jana Czeczota // Bluszcz. 1889. N. 14, 15, 17; Беларускія філамацкія вершы Яна Чачота // Калоссе. Вільна, 1935. Т. 3. С. 162–163.

Першая з шасці кніг “Сялянскіх песенек” Я. Чачота была надрукавана ў 1837 г., апошняя — у 1846 г. Чацвёрты том [24] змяшчае большасць з яго вершаў, якія раяць сялянам захоўваць чысціню, цвярозасць і быць добрымі гаспадарамі. У прадмове да гэтага тома (с. X) Чачот разважае над тым, ці знойдуць яго ўласныя песні шлях да вёскі, адкуль ён і чэрпаў натхненне. І сапраўды, некаторыя найбольш лірычныя з іх былі прыняты за сапраўдныя народныя песні менавіта такімі этнографамі, як Крачкоўскі [25]. Шосты том змяшчае дзевяноста дзевяць народных песень і адзін арыгінальны верш — “Да мілых мужычкоў” (гл. спасылку 17). Да таго часу, як ён быў напісаны, лекцыя Міцкевіча у Калеж дэ Франс “Чачот і яго сябры”, была добра вядома і, здаецца, мела пэўны водгук у вершы Чачота; недзе ўсярэдзіне яго бацька звяртаецца да Міцкевіча:

Treba tolko słuchać nam
Rady taho tatka;
Śto to kazań harawać,
Kab adžyła chatka.

У дачыненні да твораў такіх сяброў Міцкевіча, як Чачот, Баршчэўскі і Рыпінскі, якія шмат зрабілі для адраджэння беларускай літаратуры, такая распаўсюджаная паэма-пародыя невядомага аўтара расійскага напрамку, як “Тарас на Парнасе”, павінна быць дапаўненнем. Яна змяшчае сцэну пра тое, як селянін Тарас сочыць за пісьменнікамі, што ўзыходзяць на Парнас. Гэта Пушкін, Лермантаў, Жукоўскі і Гогаль, або, паводле іншага варыянта паэмы, Міцкевіч, Пушкін і Каханоўскі [26].

Але больш значным, чым раннія пісьменнікі і аўтар ананімнай паэмы, быў Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, другі беларускі аўтар, які паходзіў з дробнай апалячанай шляхты [27] і на якога аказаў шматбаковы ўплыў Міцкевіч. Ён змагаўся за стварэнне літаратуры на беларускай мове, нягледзячы на супрацьдзеянне заўсёды насцярожанага царскага урада, неафіцыйнай польскай прэсы і нават варожасць сям’і і большасці сяброў, што, як кампа-

[24] Гл.: Pionski wieśniacze znad Niemna i Dźwiny, z dołączeniem pierwotwornych w mowie sławiano-krewickiej. Wilno, 1844.

[25] Крачковский И.Б. Быт западно-русского селянина. М., 1874. Вядомы філолаг Я. Ф. Карскі падкрэсліваў, што некаторыя пазнейшыя этнографы, уключаючы Кіркора, Карэву, Шпілеўскага, Дзмітрыева, Крачкоўскага і Шэйна, карысталіся работамі Чачота, не спасылаючыся на крыніцы (за выключэннем двух апошніх). Гл.: Беларусы. Варшава, 1903. Т. 1. С. 213–215. А. Н. Пыпін у гэтай сувязі таксама згадваў этнографа і лексікографа І. Насовіча: История русской этнографии. СПб., 1892. Т. 4. С. 153.

[26] Гл., напр., Доўнар-Запольскі М. Дунін-Марцінкевіч і яго паэма “Тарас на Парнасе”. Віцебск, 1896.

[27] Доўнар-Запольскі памыліўся, прыпісваючы паэму “Тарас на Парнасе” Дуніну-Марцінкевічу (гл. спасылку 25). Гл. таксама: Gołąbek J. Wincenty Dunin-Marcinkiewicz — pisarz polsko-białoruski. Wilno, 1932.

зітар Станіслаў Манюшка, напрыклад, лічылі беларускую мову не вартай адукаваных асоб [28].

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, Дунін-Марцінкевіч паспяхова ствараў якасныя творы, апавядальныя акалічнасныя паэмы. Асобныя рысы звязваюць творы гэтага пісьменніка з Міцкевічам: магчыма, гэтыя рысы, а не ўплывы аб'ядналі, хутчэй за ўсё, гістарычную, у ружовых адценнях, этнаграфічную апавядальную паэму "Вечарніцы" (1855) з паэмай "Дзяды" ці грамадскі ідэалістычны твор " Купала"(1855) з такімі баладамі Міцкевіча, як " Рыбка" і " Дудар"; у нечым таксама падобныя апошнія часткі твораў "Гапон" (1855), "Вечарніцы" і "Шчароўскія дажынкі" (1857) з паэмай "Пан Тадэвуш" [29].

Дзеля больш значных прыёмаў, такіх, як паралелі і параўнанні, трэба разгледзець пераклад В. Дуніна-Марцінкевіча на беларускую мову "Пана Тадэвуша", які ў 1859 г. стаў першым, калі гаварыць пра ўсе славянскія мовы. У тыя часы творы Міцкевіча не лепш ацэньваліся царскай цэнзурай, як і спробы Марцінкевіча пісаць на адроджанай роднай мове (творы Міцкевіча і беларуская мова былі забаронены і ў другой палове стагоддзя). Што датычыцца нацыянальнага аспекту, то Дунін-Марцінкевіч, як і шэраг іншых, названых вышэй пісьменнікаў, перш за ўсё адчуваў сябе палякам і прымаў удзел у паўстанні 1863 г. Таму не дзіўна, што пасля змены цэнзара перакладзеныя Дуніным-Марцінкевічам першыя дзве часткі "Пана Тадэвуша" былі канфіскаваны і знішчаны непасрэдна ў друкарні [30]. Яшчэ вельмі пашанцавала, што захавалася некалькі экземпляраў двух першых раздзелаў яго асноўнай працы [31].

---

[28] Сам Чачот называў беларускую мову як "mowa sławiano-krewicka" і "krewicki dialekt" (гл.: McMillin A. B. Jan Cacot in Byelorussian and Polish Literature // Journal of Byelorussian Studies. 1969. T. II. № 1. P. [67], а Рыпінскі, вядома, называў мову "кашай":

Tyż sam, susiedźka, chacieu,
Štob i ja tabie zapieu.
Nu ja tabie i piaju —
Prymi piesieńku maju.
Moža heta nie piesń? Kaša?
Dy usio ž taki svaja, naša!

(Дапаўненне да польскага верша "Dla Artemiusza Weryhi. W imionniku", у альбоме Арцёма Вярыгі-Дарэўскага. Цыт. па кн.: Беларуская літаратура XIX ст.: Хрэстаматыя / Склад. С. Александровіч і інш. Мн., 1971. С. 133).

[29] Больш дэталёва гл.: Лойка. С.96–97.

[30] Больш падрабязна пра тое, як Дунін-Марцінкевіч спрабаваў надрукаваць свае пераклады, гл.: Шлюбскі А. Канфіскацыя "Пана Тадэвуша" Д.-Марцінкевіча // Узвышша. 1927. № 2. С. 303–337.

[31] А. Ельскі двойчы, у 1882 і 1884 гг., спрабаваў надрукаваць пераклады Дуніна-Марцінкевіча, але не змог (урэшце яны з'явіліся ў Пецярбургу ў 1907 г., спачатку надрукаваныя кірыліцай, потым — лацінкай). У той жа час ён надрукаваў свой уласны пераклад першай часткі "Пана Тадэвуша" (Львоў, 1892). Другі беларускі пераклад гэтага твора быў зроб-

Мэтай перакладчыка было дэмакратычнае “перааранання “Пана Тадэвуша” ў простую сялянскую сярмягу […] дзеля асветы […] простага народа” [32], — гэтыя словы нагадваюць іншыя, напісаныя яго знакамітым папярэднікам часоў Адраджэння Францыскам Скарынам у эпіграфе да яго перакладу “Кнігі Іова”, зробленага “дзеля дабра простых людзей” [33]. Нягледзячы на тое, што ўласныя чалавечыя амбіцыі перашкаджалі Дуніну-Марцінкевічу, праца над перакладам “Пана Тадэвуша”, безумоўна, аказала пэўны ўплыў на яго творчасць. Напрыклад, у 1861 г. ён напісаў гістарычную паэму на польскай мове “Люцынка”, якая можа быць успрынята як (бледная, вядома) імітацыя шэдэўра Міцкевіча. Некаторыя з яго пазнейшых твораў безумоўна маюць сляды таго ж уплыву; працэс перакладу спрыяў развіццю большага псіхалагічнага рэалізму і з’яўленню саркастычнага гумару ў яго сатырычнай камедыі “Пінская шляхта”.

Нягледзячы на тое, што гэты твор меў шмат пастановак, усе яны рабіліся патаемна, і было немагчыма афіцыйна паставіць ці надрукаваць п’есу да 1918 г. Гэтыя дэталі нагадваюць нам, між іншым, што царскія улады імкнуліся звесці да мінімуму як уплыў Міцкевіча на Беларусь, так і яго ўздзеянне менавіта на саму літаратуру [34].

І хоць Дунін-Марцінкевіч ставіў перад сабой асветніцкія і філантрапічныя задачы, але плённая праца над перакладам шмат дала яму ў лінгвістычным плане. Ён даказваў таксама сваімі перакладамі, што беларуская мова, не горшая за ўрадавую мову Вялікага Княства Літоўскага, здольна быць багатым і плённым сродкам для стварэння літаратурных шэдэўраў. У гэтым сэнсе “Пан Тадэвуш” у перакладзе Дуніна-Марцінкевіча быў краеугольным каменем развіцця беларускай літаратурнай мовы XIX ст. — у часы, калі на ёй пісалі фрагментарна і калі творы распаўсюджваліся ў большасці ў рукапісах, даючы невялікую магчымасць для стварэння традыцый. Калі не улічваць ананімныя творы і шэраг п’ес, то пераклад Дуніна-Марцінкевіча з’яўляецца першай грунтоўнай працай на беларускай мове

лены ў 1920-х гг. Браніславам Тарашкевічам у польскай турме і надрукаваны ў Мінску ў 1981 г. і ў Ольштыне ў 1984 г. Самы апошні пераклад паэмы належыць Язэпу Семяжону (Мн., 1985). Параўнальнае даследаванне гэтых перакладаў яшчэ не зроблена, але сучаснаму чытачу здаецца, што пераклад Тарашкевіча найбольш дакладна перадае дух арыгінала.

[32] Дунін-Марцінкевіч В. Зб. тв. Мн., 1958. С. 370 (тут і далей Дунін-Марцінкевіч. Зб. тв.).

[33] Факсімільнае ўзнаўленне Бібліі, выдадзенай Францыскам Скарынам у 1517–1519 гадах. Мн., 1990–1991. С. 705. Па некаторых прычынах гэты эпіграф быў прапушчаны ў дзвюх асобных публікацыях скарынаўскіх арыгінальных твораў: Скарына Ф. Прадмовы і пасляслоўі / Пад рэд. А. Коршунава. Мн., 1969; Скарына Ф. Творы: Прадмовы, казанні, акафісты, пасхалія. Мн., 1990.

[34] Сярод мноства рэпрэсіўных мер можна ўзгадаць забарону ставіць п’есы на мове простага люду, якая супала з прэм’ерай Дуніна-Марцінкевіча — макаранічнай музычнай камедыі “Ідылія” ў 1852 г.

з XVI ст. [35] Ужо першыя радкі адлюстроўваюць тое, як выглядяе паэма, апранутая ў шырокую “сялянскую сярмягу”.

Litva! — rodna ziamielka! Ty, maŭlaŭ zdaroŭje,
Toj ciabie ašancuje, kamu biezhałouje,
Chto žyŭ kaliś na niŭcy tvajoj, jak u rai,
I voś kryvavy ronić slozki ŭ čužom krai! —
Ciapier to, jak ty krasna, ja čuju, ja baču,
I apišu, bo horka ŭściaž pa tabie płaču! [36]

Што ж датычыцца развіцця запасаў беларускай мовы як літаратурнага сродка грамадскіх зносін, то трэба дадаць: нягледзячы на тое, што “Пан Тадэвуш” быў перакладзены Дуніным-Марцінкевічам толькі на чвэрць, гэты опус заключае ў сабе амаль што палову паланізмаў з сумарнага слоўніка яго працы ўвогуле [37]. Шмат паланізмаў ёсць таксама ў творах Аляксандра Ельскага, не кажучы ўжо пра яго пераклад “Пана Тадэвуша” [38]. Яго пераклад не такі вольны, як у Дуніна-Марцінкевіча (Ельскі сам адзначаў, што пераклад “ амаль літаральны” [39]), але, на мой погляд, ён і не такі гнуткі і ўзнёслы. Вось адпаведныя радкі:

Litva! Maja Ajčyna! Ty zdaroŭju roŭna,
Takviele toj ciabie acenić, chto, pažyŭšy poŭna,
Ciabie utraciŭ! Ciapier krasu tvaju ja lepiej znaju
I apišu, bo ciažka pa tabie skučaju. [40]

Ельскі звяртае увагу на важнасць свайго перакладу для развіцця і статусу бяспраўнай беларускай мовы і падкрэслівае агульнасць культурных і гістарычных інтарэсаў Польшчы і Беларусі [41].

Дунін-Марцінкевіч быў далёка не адзіным пісьменнікам сярэдзіны XIX ст., хто імкнуўся перакладаць паэзію Міцкевіча на беларускую мову. Другі значны пераклад таго часу, на жаль, згублены, — гэта пераклад “Конрада Валенрода” Арцёма Вярыгі-Дарэўскага, які быў зроблены каля 1840 г. Прыблізна ў гэты ж час быў распаўсюджаны рукапісны пераклад балады Міцкевіча “Пані Твардоўская” (1820), які прыпісваецца (як, здаецца, і сама паэма) Г.-Арцімоўскаму (гады жыцця невядомыя). Пазней яна была надрукавана ў “Нашай ніве” Властам (Вацлавам Ластоўскім) [42].

---

[35] Ён не адзіны перакладчык, які змяніў тут колькасць радкоў. Уотсан Кірканел, напр., пашырае чатыры радкі Міцкевіча да пяці: Mickiewicz A. Pan Tadeusz or The Last Foray in Lithuania. Toronto, 1962. P. 7.

[36] Дунін-Марцінкевіч В. Зб. тв. С. 271.

[37] Гл.: McMillin A. B. The Vocabulary of the Byelorussian Literary Language in the Nineteenth Century. London, 1973. P. 73.

[38] Тамсама. С. 280.

[39] Беларуская літаратура XIX стагоддзя. С. 324.

[40] Тамсама.

[41] Тамсама.

Але толькі ў канцы стагоддзя поспех пачаў спрыяць беларускім пісьменнікам, адрадзілася таксама і цікавасць да твораў Міцкевіча, якая цалкам ніколі і не знікала, хаця спадчына яго доўгі час была забаронена. Тым не менш, як і раней, асноўныя сувязі паміж беларусамі і Міцкевічам адносяцца, хутчэй, да катэгорый уплыву і роднасці, а таксама звычайных перакладаў, а не сферы ўздзеяння яго месіянісцкіх ідэй.

Асноўны пісьменнік таго часу Францішак Багушэвіч, чалавек, які імкнуўся адрадзіць беларускую нацыянальную свядомасць праз, паміж іншым, палымяныя прадмовы да сваіх зборнікаў вершаў, якія нават у 90-х гг. XIX ст. друкаваліся пад псеўданімамі і з прыдуманымі звесткамі пра месца друку. З забароны твораў Міцкевіча вынікае, што ў нас няма ўпэўненасці ў тым, што напрыканцы XIX ст. паэты добра ведалі творчасць Міцкевіча. У беларускім фальклоры існуе, прынамсі, вялікая колькасць блізкіх матываў; У Багушэвіча ў "Быў у чысцы" выкарыстана, напрыклад, беларуская народная казка, якая таксама паўплывала на другую частку "Дзядоў". Больш таго, я ўпэўнены ў тым, што існуе тыпалагічная роднаснасць паміж некаторымі больш значнымі па аб'ёму вершамі Багушэвіча і творамі Міцкевіча, асабліва яго раннімі баладамі. Напрыклад, бачна тэматычная сувязь паміж "Хціўцам і скарбам на святога Яна" з вядомай баладай Міцкевіча "Пані Твардоўская". Іншы верш Багушэвіча, хоць і напісаны ён на польскай мове, выяўляе цікавыя і аднолькавыя адносіны Багушэвіча і Міцкевіча да беларускай нацыянальнай годнасці. Гаворка ідзе пра "Найсапраўднейшую гісторыю аб замучаным дукаце" (1898), скіраваную супраць графа Тышкевіча, былога ад'ютанта графа Мураўёва, які жорстка падавіў нацыянальнае паўстанне 1863 г. Сваім пратэстам Багушэвіч дабіўся вываду Тышкевіча з Камітэта па святкаванню стагоддзя з дня нараджэння Міцкевіча. Здаецца — дробязь, але яна сведчыць пра важнасць Міцкевіча як вядучага беларускага нацыянальнага дзеяча напрыканцы стагоддзя. Другім прыкладам асабістага клопату пра тое, каб спадчына Міцкевіча захавалася і не была зняслаўлена, можа з'яўляцца цікавы польскамоўны памфлет Антона Луцкевіча (зараз бібліяграфічны рарытэт) "Турма Адама Міцкевіча" (Вільня, 1923).

Вучнем Багушэвіча быў Адам Гурыновіч, які тварыў таксама ў канцы стагоддзя. Гурыновіч быў рэвалюцыйным паэтам, які пісаў на беларускай, рускай і польскай мовах; ён таксама пераклаў урывак з "Конрада Валенрода". Але пераклад пры яго жыцці не быў надрукаваны.

Пераклады Міцкевіча не былі рэдкасцю ў пачатку XX ст., асабліва на старонках "Нашай нівы", але на працягу наступных дзесяцігоддзяў яны з'яў-

[42] Наша ніва. № 19–20. С. 3. Беларускі нацыянальны паэт Янка Купала павінен быў уключыць сваю ўласную версію "Пані Твардоўскай" у зборнік "Шляхам жыцця" (1913) разам з двума ўрыўкамі з "Конрада Валенрода" і перакладаў "Трох Бадрысаў". Існуе таксама тыпалагічная агульнасць паміж баладамі Міцкевіча і некаторымі творамі Купалы.

ляліся яшчэ часцей. Многія паэты імкнуліся перакладаць Міцкевіча, часта з прыкметнай вынаходлівасцю і дасціпнасцю [43]. Пытанне тыпалагічнай падобнасці паміж уласнымі творамі паэтаў XX ст. і творамі Міцкевіча, натуральна, становіцца менш актуальным, аднак сярод асноўных беларускіх паэтаў, у якіх захаваўся рамантычны пафас, можа быць названы Уладзімір Дубоўка, Язэп Пушча, Максім Танк, адзін з нямногіх пісьменнікаў другой паловы XX ст., надзеленых добрай фантазіяй.

У вершы 1966 г. "Раманс Марылі" У. Караткевіч стварае карціну парка з ценем Міцкевіча і водамі фантана, што спявае сваю лебядзіную песню ("Цень Міцкевіча нада мной / Лебядзіную песню вядзе" [44]). Больш нязвычным, але добрым прыкладам таго, што Міцкевіч займаў істотнае месца ў думках беларускай інтэлігенцыі, з'яўляецца ранні верш У. Караткевіча ў прозе "Слова Міцкевіча" (1955?). У сваім высокалірычным творы беларускі паэт ўяўляе, як Міцкевіч вяртаецца кожны год у дзень сваёй смерці, 26 лістапада, у родныя мясціны, каб падтрымліваць і натхняць сваіх польскіх і беларускіх нашчадкаў. Тыповы для тагачаснага Караткевіча двухстаронкавы верш у прозе з'яўляецца моцна панславянскім па духу і спецыфічным па гістарычных звестках (напрыклад, аўтар звяртаецца да такіх прыкметных вобразаў, як Патабня, Каліноўскі і Траўгут ці да адной з гераінь Міцкевіча — Гражыны).

Такім чынам, відаць, што, месіянізм Міцкевіча быў не асноўным фактарам для беларусаў, узаемасувязі з яго роднасцю, яго ўплыў моцныя вось ужо амаль два стагоддзі. Праз сваіх сяброў-суайчыннікаў, такіх, як Чачот, ён дапамагаў беларускай літаратуры зрабіць свае першыя крокі, адначасова чэрпаючы натхненне ў беларускім фальклоры, ужываючы беларускія лінгвістычныя элементы ў сваіх творах. Напрыклад, праз пераклады сваіх асноўных твораў Міцкевіч спрыяў, нягледзячы на моцную афіцыйную апазіцыю, развіццю беларускай мовы, літаратуры і нават нацыянальнай свядомасці народа ў сярэдзіне XIX ст. Безумоўна, Міцкевіч не згубіў свайго ўздзеяння на беларусаў і ў XX ст., па-ранейшаму абуджаючы ўзнёслыя пачуцці і натхняючы такіх пісьменнікаў, як — самы яскравы прыклад — Уладзімір Караткевіч, чалавек, які, мабыць, больш усіх у савецкія часы змагаўся за захаванне спадчыны роднай краіны ў працяглых неспрыяльных умовах русіфікацыі ва ўсіх сферах беларускага жыцця.

Пераклад з англійскай мовы Алы Анісенка

---

[43] Наталля Арсеннева, адна з вядучых паэтаў эміграцыі, выдала пераклад на беларускую мову ўрыўкаў з ч. 2. "Дзядоў". Гл.: Бацькаўшчына, 1955. № 47–48 (277–278), С. 5–6. Некалькі яе іншых перакладаў з Міцкевіча з'явіліся ў "Конаднях". 1955. № 4. С. 51–52. У тым жа самым годзе Максім танк і Янка Брыль выдалі найбольш прадстаўнічы збор твораў паэта: Міцкевіч А. Зб. тв. Мн., 1955.

[44] Караткевіч У. Зб. тв.: У 8 т. Мн., 1987–1991. Т. 1. С. 187.

Аляксей Пяткевіч *(Гродна)*

АСВЕТНІЦКАЯ ІДЭЯ Ў БЕЛАРУСІ XIX ст. АД АДАМА МІЦКЕВІЧА ДА ЭЛІЗЫ АЖЭШКА

Беларускі асветніцкі рух быў цесна звязаны з вызваленчым рухам народа, з працэсамі яго этнічнага самапазнання і самасцвярджэння. І калі класічнае заходнееўрапейскае Асветніцтва рэалізавала сябе ў XVII – пачатку XIX ст., ва ўмовах станаўлення нацыянальных дзяржаў, то ў Беларусі, уключанай у склад Расійскай імперыі, асветніцкай ідэі наканавана было доўгае жыццё. Прынамсі, на працягу XIX ст. востра надзённым заставалася развіццё духоўнага патэнцыялу гэтага краю дзеля яго лепшай долі. На пачатку стагоддзя мясцовая шляхецкая інтэлігенцыя праз гурткі, таварыствы, літаратурныя салоны, краёвы друк імкнулася сцвердзіць самакаштоўнасць роднай Літвы як этнічнай адзінкі. Развіццё краязнаўства, калекцыяніраванне, збіранне археалагічных і фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, нават мемуарная творчасць падказваліся імкненнем да патрыятычнага самавыяўлення. Шмат у гэтым кірунку рабілі філаматы, вывучаючы і папулярызуючы веды пра свой край і народ. Найперш — Я. Чачот, паэт, які пісаў і на роднай мове, аўтар “Спеваў пра даўніх ліцвінаў”, беларускі фальклярыст, мовазнавец-лексікограф. Менавіта ён найлепш сярод філаматаў усведамляў неабходнасць адраджэння краю праз выхаванне пашаны да ўсяго роднага, а таксама маральнага ўдасканалення шляхты па ўзорах народнай культуры. Думка пра ўзаемнае збліжэнне саслоўяў (яднаюцца кніжны інтэлект шляхты і чулая душа сялянства) становіцца стрыжнявой ідэяй асветніцкага руху ў Беларусі ў XIX ст. Дыдактычна выяўленая Чачотам, падхопленая філаматамі, яна была арганічна даведзена ў літаратуры Міцкавічам. Выдатны паэт узбагаціў яе краёвым, ліцвінскім патрыятызмам, паказаў яе гуманістычны змест.

Паэма А. Міцкевіча “Пан Тадэвуш”, вынашаная ў сэрцы аўтара ў нялёгкую для яго пару пошукаў дарогі на радзіму, волі для радзімы, нясе як лейтматыў паэтызацыю народных асноў шляхецкага жыцця. Сядзіба Сапліцаў у творы — асяродак шчырай дабрыні і годнасці. Тут шануюць патрыярхальныя традыцыі краю, памяць продкаў. Тут умеюць урачыста-прыгожа бавіць час і выконваць будзённа-практычную работу. Тут у самім ладзе жыцця сумяшчаюцца шляхетнасць і прастата, інтэлектуальна-кніжная культура і матэрыяльна-земляробчы інтарэс. Тут пад вокнамі дыхтоўнай шляхецкай сядзібы — звычайныя градy з агароднінай, зробленыя на сялянскі манер. Дэманстрацыя сумяшчэння гэтых двух розных стыляў жыцця бясспрэчна выконвае ў творы асветніцка-дыдактычную задачу. У тым жа павучальным кантэксце раскрываюцца і асноўныя героі паэмы А. Міцкевіча Зося і Тадэвуш — носьбіты сялянскіх і шляхецкіх маральна-этычных, эс-

тэтычных нормаў жыцця. Праўда, паводле саслоўнага становішча Зося, як і Тадэвуш, належыць да шляхты. Але яе прыхільнасці, заняткі характарызуюць яе як чалавека сялянскага асяроддзя. Не за раялем ці з кніжкай бачыць чытач Зосю, а часцей за ўсё ў двары ці на агародзе — з дзецьмі, курамі, гусямі. На вяселле яна апранае не парадны шыкоўны ўбор, а звычайны народны строй — гарсэцік, светлую блузку, перавязаную па каўняры каляровай стужкай, на галаве — вяночак з палявых кветак. З такой менавіта Зосяй жэніцца тыповы шляхецкі сын Тадэвуш, і шлюб гэтай пары — красамоўны асветніцкі ўрок, адрасаваны грамадству. Зося і Тадэвуш намерваюцца клапаціцца пра сялян, вызваліць іх ад прыгону. І заключным ідэйным акордам гучыць у канцы твора голас грамады: "Злюбімося!" Заклік да маральна-патрыятычнага яднання розных саслоўяў быў актуальным перад абліччам адзінага працiўніка — царызму. І пэўная дыдактычная адкрытасць асветніцкай думкі аўтара, які яўна захапляецца сваімі героямі, блізкімі яму духоўна ("Я на тым вяселлі быў…"), зразумелая. Тут маем справу ужо не толькі з мастацтвам: ідэя нацыянальнага самасцвярджэння, адраджэння самастойнасці Літвы, што знаходзілася ў аснове беларускага асветніцкага руху XIX ст., праходзіла праз усё духоўнае жыццё таго часу. Нават К. Каліноўскі, тэарэтык і практык вызваленчай вайны з царскім рэжымам, прадугледжваў адзінства дзеянняў патрыятычнай шляхты і сялян. А ў "Лісце з-пад шыбеніцы'" наказваў сялянам набываць веды, бо менавіта разумны чалавек здольны шанаваць бацькаўшчыну і цаніць волю.

Ідэі нацыянальна-духоўнага абнаўлення праз сацыяльнае паразуменне саслоўяў і развіццё ведаў дзейнічаюць у краі з пэўнай доляй гістарычнай трансфармацыі да канца XIX ст. Яны адчувальныя ў беларусазнаўчых справах А. Кіркора і Я. Тышкевіча, пазней — М. Доўнар-Запольскага, Я. Карскага, А. Ельскага, у літаратурнай і краязнаўчай творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі, А. Плуга, Г. Пузына, Ю. Крашэўскага, П. Янкоўскага, Э. Ажэшка, Я. Лучыны. Не абышлі яны сацыяльна заангажаванага Ф. Багушэвіча, герой якога, селянін, патрабуе: "Не цурайся мяне, панічок" — і чакае ад таго духоўнай сяўбы на мужыцкай ніве. Паказальная ў гэтым шэрагу творчасць кампазітараў С. Манюшкі і М. Ельскага, мастакоў Я. Дамеля і К. Альхімовіча.

Характэрна, што напрыканцы XIX ст. выразна перагукнулася з А. Міцкевічам Э. Ажэшка: павучальна-асветніцкая лінія яго "Пана Тадэвуша", звязаная з галоўнымі героямі, па сутнасці, змадэлявалася і развілася ў рамане Э. Ажэшка "Над Нёманам". Дакладней сказаць, сітуацыя, распрацаваная А. Міцкевічам у паэме, захавала сваю асветніцкую актуальнасць у часы Э. Ажэшка, і пісьменніца не магла не выкарыстаць яе. Юстына Ажэльская і Ян Багатыровіч у рамане "Над Нёманам" — спадкаемцы герояў А. Міцкевіча, бо таксама дэманструюць няроўны шлюб з яго дыдактычнай звышза-

дачай. Няроўны не столькі паводле матэрыяльных магчымасцей кожнага, а найперш з прычыны афіцыйнага саслоўнага статуса. Ян Багатыровіч хоць з багацейшых у вёсцы, але селянін. Юстына хоць і бедная сваячка Карчынскіх, але шляхцянка. Іх збліжаюць пачуцці справядлівасці, пошук глыбокага зместу жыцця, любоў да родных мясцін, памяць пра ахвяры паўстання 1863 г. Павучальна-сімвалічным выглядае іх неаднаразовае наведванне мясціны над Нёманам, дзе ў адной магіле спяць вечным сном палеглыя паўстанцы — шляхта і сяляне. Асветніцкая лінія адносін герояў ідэйна мацуецца ў творы гісторыяй легендарных Яна і Цэцыліі, закаханых уцекачоў, якім калісьці давялося парадніцца з самымі рознымі па грамадскай іерархіі людзьмі гэтых мясцін. Думка Э. Ажэшка пра яднанне розных саслоўяў і этнасаў дзеля барацьбы за волю свайго "сумнага краю" праходзіць і праз іншыя творы пісьменніцы, застаючыся скразным матывам духоўнага жыцця шляхецкай інтэлігенцыі таго часу.

А. Мальдзіс у даследаванні "Традыцыі польскага Асветніцтва ў беларускай літаратуры XIX ст. " (1972), дзе, дарэчы, упершыню асветніцкі рух бачыцца як з'ява беларускага жыцця ўсяго XIX ст., падкрэслівае залежнасць беларускай асветніцкай ідэалогіі ад польскай (прынамсі, у літаратуры). Безумоўна, уздзеянне польскай літаратуры на беларускую, тым больш у рэчышчы Асветніцтва, было моцным і дыктавала пэўныя маральна-грамадскія і эстэтычныя яе арыенціры. І ўсё ж сёння трэба зрабіць акцэнт на тым, што сама беларуская рэчаіснасць, увесь спектр яе грамадскага жыцця нараджалі і мацавалі асветніцкія ідэі. Ля іх вытокаў стаялі ў XIX ст. філаматы, у прыватнасці, Адам Міцкевіч.

Анатоль Верабей *(Мінск)*

ТРАДЫЦЫІ РАМАНТЫЗМУ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў ТВОРЧАСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Адам Міцкевіч быў адным з любімых пісьменнікаў У. Караткевіча. Беларускаму паэту імпанавалі майстэрства А. Міцкевіча, яго повязь з Беларуссю, патрыятычны змест і рамантызм яго твораў.

Думаецца, што да 100-годдзя з дня смерці славутага паэта ўзнік верш у прозе У. Караткевіча "Слова Міцкевічу". У ім аўтар, абапіраючыся на народнае ўяўленне, апавядае пра тое, што ў ноч на 26 лістапада А. Міцкевіч з'яўляецца на зямлю, якая яго нарадзіла, ходзіць па ёй і глядзіць "у вочы новаму чалавеку, які нарадзіўся ў той дзень, калі ты памёр" [1], і дае будучы-

[1] Караткевіч У. Зб. тв.: У 8 т. Т. 1. Мн., 1987. С. 322. Далей творы У. Караткевіча цытуюцца па гэтым выданні з указаннем у тэксце тома і старонкі.

ню кожнаму немаўляці. 26 лістапада 1855 г. памёр А. Міцкевіч. У той жа дзень у 1930 г. нарадзіўся У. Караткевіч. У гэтым творы ён думае пра сябе як пра пераемніка А. Міцкевіча, захапляецца яго паэзіяй.

У. Караткевіч хораша сказаў пра сваю блізкасць да паэзіі А. Міцкевіча і ў пранікнёным вершы "Раманс Марылі", які заканчваецца красамоўнымі радкамі:

Цень Міцкевіча нада мною
Лебядзіную песню вядзе. (1, 187)

Сапраўды, У. Караткевіч зведаў жыватворны ўплыў А. Міцкевіча. Творчасць абодвух пісьменнікаў прасякнута патрыятычным пафасам. Ужо ў ранняй лірыцы А. Міцкевіча, з яе ўслаўленнем дружбы, жыцця, з яе грамадзянскасцю ("Песня філарэтаў", "Ода да маладосці"), вызначальнай была любоў да айчыны. Тое ж самае можна сказаць і пра У. Караткевіча, аб чым сведчаць многія яго вершы ("Паўлюк Багрым", "Гусі-лебедзі ў лугах зялёных", "Беларуская песня", "На Беларусі Бог жыве" і інш.).

А. Міцкевіч у "Одзе да маладосці" пісаў:

Witaj jutrzeńko swobody,
Zbawienia za tobą słońce! [2]

Нібы працягваючы думку свайго папярэдніка, У. Караткевіч у вершы "Паўлюк Багрым" прамаўляў:

Беларусь, прачынайся!
Я цябе абуджаю!
Ты павінна прачнуцца,
Не праспі сваё шчасце ўначы. (1, 30)

Невыпадковым быў і пераклад У. Караткевіча ранняй паэмы А. Міцкевіча "Мешка, князь Навагрудка", дзе паэт, спасылаючыся на Гарацыя, словы якога прыводзяць як эпіграф да гэтага твора, хацеў "успяваць справы сваёй Айчыны" [3]. Зацікавіла У. Караткевіча гэта паэма і тым, што ў ёй А. Міцкевіч звярнуўся да падзей гістарычнай мінуўшчыны, калі нашы продкі змагаліся супраць крыжакоў.

Агульнавядомая цікавасць рамантыкаў да фальклору і гісторыі. І таму для У. Караткевіча быў каштоўны вопыт А. Міцкевіча ў выкарыстанні вусна-паэтычнай народнай творчасці. Яго не маглі не прывабіць рамантычныя балады "Свіцязь" і "Свіцязянка", заснаваныя на беларускіх народных паданнях. У. Караткевіч пры асэнсаванні падзей далёкай мінуўшчыны і абмалёўцы персанажаў выяўляў асаблівую прыхільнасць да паданняў і легенд

[2] Mickiewicz A. Dzieła. T. 1. Warszawa, 1955. S. 75. Далей творы А. Міцкевіча цытуюцца па гэтым выданні з указаннем у тэксце тома і старонкі.

[3] Цыт. па кн.: Караткевіч У. Галасы маіх сяброў. Мн., 1993. С. 52.

(вершы “Машэка”, “Балада пра паўстанца Ваўкалаку”, аповесць “Сівая легенда”, раман “Каласы пад сярпом тваім”). Народная творчасць заўсёды была крыніцай натхнення для пісьменніка.

У баладзе “Свіцязь” А. Міцкевіч піша пра горад, які знік пад вадой. І ў творчасці У. Караткевіча нямала аналагічных вобразаў, узятых непасрэдна з фальклору ці створаных на яго аснове (званы і гарады, што зніклі пад вадой, крыніцы, карані). Праз гэтыя і многія іншыя адраджэнцкія вобразы-сімвалы пісьменнік змог дасягнуць значных мастацкіх абагульненняў. У. Караткевіч выкарыстоўваў таксама народныя песні, казкі, галашэнні, абапіраўся на народны светапогляд.

У. Караткевіч, як і яго славуты папярэднік, часта звяртаўся да ўлюбёных рамантыкамі жанраў балады і раманса. Яго творчасць вызначаецца ўзнёсласцю, павышанай экспрэсіўнасцю, увагай да выключнага, напружанасцю дзеяння, што так уласціва для рамантычнай паэтыкі. Абапіраючыся на народную памяць, творца выяўляў прыхільнасць пераважна да гераіка-рамантычнага, фальклорна-легендарнага асэнсавання мінуўшчыны.

Не маглі не імпанаваць У. Караткевічу II і IV часткі “Дзядоў”, дзе А. Міцкевіч звярнуўся да старажытнабеларускага абраду памінання продкаў, выкарыстаў здабыткі беларускага фальклору і мовы, паказаў сцэну замагільнай помсты пану, стварыў цікавы вобраз рамантычнага героя Густава, які пакутуе ад няшчаснага кахання.

Плённа выкарыстаў У. Караткевіч традыцыі беларускіх народных казак і вопыт сваіх папярэднікаў (Дантэ, Бакачыо, Міцкевіча) пры абмалёўцы апраметнай у легендзе “Ладдзя Роспачы”. Для У. Караткевіча, як і для В. Скота, А. Міцкевіча, А. Пушкіна, пры ўзнаўленні мінуўшчыны разам з гістарычнымі дакументамі, вялікае значэнне мела памяць продкаў.

У. Караткевіч паказаў таксама, што за зло, злачынства ці здраду будзе абавязковая кара (“Дзікае паляванне караля Стаха”, “Ладдзя Роспачы”, “Чорны замак Альшанскі”).

Паэмы “Гражына” і “Конрад Валенрод” для У. Караткевіча, думаецца, былі цікавымі перш за ўсё як творы, дзе на матэрыяле сюжэтаў з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ўзняты праблемы нацыянальна-вызваленчай барацьбы, услаўлены выключныя і гераічныя асобы, якія ахвяравалі сабой у імя патрыятычнага абавязку. Гражына і Конрад Валенрод тыпалагічна блізкія Раману Ракутовічу з “Сівой легенды”, Алесю Загорскаму з рамана “Каласы пад сярпом тваім”, Кастусю Каліноўскаму з аднайменнай драмы і іншым героям твораў беларускага пісьменніка. Іх збліжае самаахвярнасць і мужнасць дзеля волі радзімы. Для іх немагчыма асабістае шчасце, калі яго няма ў айчыне. Многае яднае караткевічаўскіх рамантычных герояў і Яцака Сапліцу з “Пана Тадэвуша”. А. Міцкевіч і У. Караткевіч плённа развівалі традыцыі В. Скота.

Ідэі “Конрада Валенрода” па-свойму ўвасобіў У. Караткевіч у вершы “Разведчык”, калі пісаў пра значнасць і веліч здзейсненага адным, асобным чалавекам:

Але долі няма вышэйшай —
Аднаму на тысячы йсці!
…Аднаму загінуць, зрабіўшы
Ўсё адзінаю парай рук. (1, 244)

І вобраз вайдэлота быў блізкі беларускаму пісьменніку, які ў артыкуле “Родная мова” згадаў апошняга пруского спевака і паэта, старога вайдэлота, з мовы якога (а мова яго народа ўжо знікла, і ніхто яго не разумеў) пасмяяліся на турніры майстарзінгераў тэўтонцы, што паняволілі яго край.

Думаецца, у нечым тыпалагічна блізкімі з’яўляюцца вобразы Альманзора з “Конрада Валенрода” А. Міцкевіча і Агны Вецер з драмы “Маці ўрагану” У. Караткевіча, якія чумой і праказай заразілі сваіх ворагаў.

Можна правесці паралелі паміж нізкамі “Крымскія санеты” А. Міцкевіча і “Таўрыда” У. Караткевіча. Там, на поўдні, абодва паэты з трывогай і болем (А. Міцкевіч у санеце “Акерманскія стэпы”, У. Караткевіч у вершы “Таўры”) думалі пра сваю далёкую радзіму, напаўнялі паэзію, як І.-В. Гётэ, Дж. Байран, А. Пушкін, вобразамі і матывамі Усходу.

Не магла не паўплываць на У. Караткевіча і III частка “Дзядоў” А. Міцкевіча. Беларускі пісьменнік, як і яго папярэднік, славіў моцныя, гордыя, высакародныя і непакорныя характары, супрацьпастаўляў сілы дабра і зла, свабоды і дэспатызму, думаў пра ўласны лёс, пра лёс свайго народа і лёс чалавецтва. Конрад у “вялікай” імправізацыі адчувае бязмежную сілу творчасці, пакутуе за свой і за ўсе народы. Абураны несправядлівасцю, якая пануе ў свеце, патрабуе ў Бога ўлады над людскімі душамі, каб зрабіць чалавецтва шчаслівым:

Ja i ojczyzna to jedno.
Nazywam się Milijon — bo za milijony
Kocham i cierpię katusze.
Patrzę na ojczyznę biedną,
Jak syn na ojca wplecionego w koło;
Czuję całego cierpienie narodu,
Jak matka czuje w łonie bole swego płodu. (III, 166)

У. Караткевіч падобна любіў кожнага чалавека, родную зямлю і ўсё чалавецтва. Сцвярджэннем уласнай велічы, магутнасці і несмяротнасці, далучанасці да лёсу людскога, тыранаборствам і праметэізмам прасякнуты яго верш “Быў. Ёсць. Буду”:

Быў. Ёсць. Буду.
Таму, што заўжды, як праклятыя,
Жыву бяздоннай трывогай,

Таму, што сэрца маё распята
За ўсе мільярды двухногіх.
…За ўсіх, хто крывёю піша
Ў нязгодзе
З рабства подлай дарогай,
Хто за Край Свой Родны, за ўсе Народы
Паўстане нават на Бога. (1, 239)

Патрыятычным зместам, мастацкай дасканаласцю і эпічнасцю ў адлюстраванні жыцця, безумоўна, чаравала У. Караткевіча і паэма А. Міцкевіча "Пан Тадэвуш". Можна гаварыць пра тыпалагічнае падабенства "Пана Тадэвуша" і рамана "Каласы пад сярпом тваім".

А. Міцкевіч пачынаў свой твор пранікнёнымі радкамі: "Litwo! Ojczyzno moja! Ty jesteś jak zdrowie" (IV, 9). Ён сумаваў "на парыжскім бруку" па далёкай радзіме.

У. Караткевіч жа ў вершы "Маленне аб чашы" пісаў:

Беларусь мая, ты адзіная,
Перад кім на каленях стаю. (1, 232)

А. Міцкевіч у "Пане Тадэвушы" пісаў пра "апошні наезд на Літве", расказваў пра "шляхецкую гісторыю" пачатку XIX ст. Зазначым, што У. Караткевіч у другой палове 50-х гг. таксама выношваў задуму напісаць "Сямейныя паданні роду Яноўскіх", "цыкл невялікіх аповесцей, памеру "Станцыйнага наглядчыка"… пра гісторыю беларускай шляхты" [4]. Ён стварыў змястоўныя вобразы беларускіх шляхціцаў XVI ст. Гервасія Вылівахі ў легендзе "Ладдзя Роспачы" і Багдана Роскаша ў рамане "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", разнастайную галерэю беларускіх дваран сярэдзіны XIX ст. даў у рамане "Каласы пад сярпом тваім". У "Сівой легендзе" паказаў пачатак рэнегацтва беларускай шляхты ў пачатку XVI ст., асудзіў у "Цыганскім каралі" вуснамі медыкуса гэта рэнегацтва ў канцы XVIII ст., раскрыў у "Дзікім паляванні караля Стаха" звыродлівы стан беларускай шляхты ў канцы XIX ст., абумоўлены гэтым рэнегацтвам.

Калі А. Міцкевіч у "Пане Тадэвушы" паказаў навагрудскую шляхту ў 1811–1812 гг., напярэдадні прыходу Напалеона, то У. Караткевіч у "Цыганскім каралі" звярнуўся да яе гісторыі 80-х гг. XVIII ст., напярэдадні чарговых падзелаў Рэчы Паспалітай, паўстання Тадэвуша Касцюшкі і Французскай рэвалюцыі 1789–1794 гг. Абодва пісьменнікі звярнулі ўвагу на адзін з цікавых момантаў жыцця гэтай шляхты — на наезд. І паказалі яго ў іроікамічным плане.

М. Рыльскі слушна заўважыў, што "патрыятызмам, гарачай любоўю да радзімы прадыктаваны ўсе вядомыя апісанні прыроды ў "Пане Тадэвушы" [5]. Тое ж уласціва пейзажным апісанням у "Каласах пад сярпом тваім".

[4] Хатні архіў У. Караткевіча. Ліст пісьменніка да М. А. Садавога ад 8 снежня 1957 г.
[5] Рыльский М. Поэзия Адама Мицкевича. М., 1956. С. 75.

Блізкія абодва пісьменнікі і ў думках пра ідэальнае, гарманічнае грамадства, пра шчаслівы і вольны край (А. Міцкевіч пры апісанні ў “Пане Тадэвушы” “матачніка”, У. Караткевіч пры перадачы ў рамане “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” сну Братчыка, дзе ён трапляе на неба, у рай, і сустракаецца там з Богам Саваофам; ці ў перадачы думак Васіля Ветру з драмы “Маці ўрагану”, калі ён глядзіць на бясконцае зорнае неба). Заўважым, што вядомае апавяданне У. Караткевіча “Блакіт і золата дня” ў пачатковым варыянце мела назву “Каўчэг”.

Цікава і з любоўю расказваў У. Караткевіч пра міцкевічаўскія мясціны на Навагрудчыне, пра асобу і творчасць паэта ў нарысе “Зямля пад белымі крыламі”.

З глыбокага ўсведамлення велічнага і трагічнага лёсу беларускага народа нарадзілася ў У. Караткевіча думка, выказаная ў рамане “Чорны замак Альшанскі”: “Добры ўклад унеслі браткі-беларусы ў культуру свайго і братняга, польскага, народаў… І потым, не будзь гэтых людзей, не выраслі б на гэтай глебе ні Баршчэўскі, ні паэт-тытан, ад уласнай беднасці падораны намі Польшчы” (7, 222). Паэт-тытан — гэта, безумоўна, А. Міцкевіч.

У. Караткевіч плённа выкарыстаў вопыт А. Міцкевіча. Аднак пры гэтым сцвердзіў сябе як арыгінальны і непаўторны творца, што таленавіта апісаў родную зямлю, закрануў многія істотныя праблемы людскога быцця.

Аляксандр Баршчэўскі *(Варшава)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ У АЦЭНКАХ БЕЛАРУСКІХ ЭМІГРАНЦКІХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ

Ужо ў першыя месяцы пасля вайны ў лагерах для ўцекачоў, якія ўзніклі ў так званай Трызоніі, г. зн. на нямецкіх тэрыторыях, занятых амерыканцамі, англічанамі і французамі, пачалі гуртавацца выхадцы з Беларусі. Арганізацыі іх мелі розныя формы, між іншым паўсталі сярод беларускіх выгнаннікаў літаратурныя структуры.

Адным з першых беларускіх арганізацый было аб’яднанне “Шыпшына”, якое ўзнікла 9 красавіка 1946 г. у Рэгенсбургу. Яго заснавальнікамі былі Н. Арсеннева, Ф. Ільяшэвіч, М. Сяднёў і 13 іншых беларускіх празаікаў і паэтаў. У дэкларацыі “Шыпшыны” гаварылася аб тым, што творчасць яе членаў будзе фарміравацца ў атмасферы свабоды і ўзаемнай пашаны і што члены аб’яднання будуць старацца стварыць літаратуру, годную беларускага народа. Адначасна з узнікненнем аб’яднання пачаў выходзіць і яго орган, часопіс “Шыпшына”. Друкаваўся ён спачатку шапірографным спосабам на

добрым мастацкім узроўні. Аб'ём яго паасобных нумароў сягаў 100 і болей старонак. Сем першых нумароў "Шыпшыны" выйшлі ў Германіі.

У 1950 г. ЗША адкрылі межы для эмігрантаў. Большасць беларускіх уцекачоў накіравалася ў Амерыку. Паехалі туды амаль усе члены аб'яднання "Шыпшына". У сувязі з гэтым два апошнія нумары часопіса выйшлі ў ЗША. У 1950 г. па невядомых прычынах друкаванне "Шыпшыны" было спынена. На працягу чатырох гадоў існавання часопіса ў ім было змешчана больш за 200 літаратурных твораў. Галоўным чынам друкаваліся вершы і апавяданні эмігранцкіх беларускіх пісьменнікаў. Аднак з'яўляліся ў "Шыпшыне" таксама творы беларускіх савецкіх аўтараў, якія праследаваліся сталінскімі ўладамі: "Шыпшына" апублікавала шматлікія вершы і апавяданні Язэпа Пушчы, Уладзіміра Дубоўкі, Міхася Зарэцкага і іншых праследаваных беларускіх творцаў.

У канцы 50-х і ў 60-я гг. узніклі новыя эмігранцкія часопісы. Найважнейшыя з іх — "Сакавік", "Конадні" і славутая "Бацькаўшчына", якая на працягу дзевятнаццаці гадоў (1947–1966) папулярызавала беларускую літаратуру розных перыядаў і спрыяла развіццю беларускай эмігранцкай пісьменнасці. У пазнейшы час беларускую эмігранцкую перыёдыку ўзбагаціла газета "Беларус", якая выходзіць у Амерыцы да сёння. Дзякуючы эмігранцкім часопісам выраслі як пісьменнікі такія выдатныя творцы, як Н. Арсеннева, М. Сяднёў, Р. Крушына, А. Салавей, М. Кавыль і многія іншыя. Найбольшы росквіт беларускай эмігранцкай літаратуры прыпадае на 60–70-я гг.

Звяртаючыся да згаданых эмігранцкіх часопісаў, трэба сказаць, што на іх старонках з'яўляліся не толькі творы беларускай літаратуры і артыкулы, ёй прысвечаныя, але таксама творы пісьменнікаў іншых народаў і крытычныя артыкулы, звязаныя з праблемамі чужых, асабліва сумежных літаратур. Зразумела, што найчасцейшымі гасцямі ў беларускай эмігранцкай перыёдыцы былі польскія пісьменнікі, а сярод іх з'яўлялася велічная постаць Адама Міцкевіча. Былі гэта, як правіла, кароткія публікацыі, звязаныя з гадавінамі нараджэння або смерці А. Міцкевіча, а таксама пераклады яго твораў, зробленыя беларускімі аўтарамі. Найбольш салідныя эмігранцкія публікацыі, прысвечаныя польскаму паэту, з'явіліся ў 1955 г. у сувязі з сотай гадавінай з дня смерці Міцкевіча.

У гэты час жыў на Захадзе беларускі эмігрант Станіслаў Станкевіч, аўтар выдатнага даследавання "Беларускія элементы ў польскай рамантычнай паэзіі", выдадзенага ў Вільні ў 1936 г. У гэтай фундаментальнай працы Станкевіч грунтоўна даследаваў сувязі з Беларуссю такіх выдатных польскіх рамантыкаў, як Тамаш Зан, Ян Чачот, Антон Адынец, Аляксандр Ходзька. Аднак галоўнае месца ў разважаннях беларускага даследчыка заняла постаць А. Міцкевіча. Прысвяціў яму Станкевіч амаль 130 старонак сваёй

знакамітай кнігі. Заняўся ён глыбокім аналізам зборніка “Балады і раманcы”, драмы “Дзяды” і іншых твораў польскага паэта; грунтоўна аналізаваў таксама мову і стылістыку, звяртаючы ўвагу галоўным чынам на сувязі міцкевічаўскага стылю са стылем беларускай народнай мовы.

С. Станкевіч быў, несумненна, найвыдатнейшым беларускім эмігранцкім міцкевічазнаўцам, і таму на працягу юбілейнага 1955 г., які быў абвешчаны Польшчай Міцкевічаўскім годам, ён актыўна ўключыўся ў папулярызацыю спадчыны польскага паэта. Станкевіч у № 47–48 “Бацькаўшчыны” за 1955 г. надрукаваў вялікі артыкул “Адам Міцкевіч — вялікі сын зямлі Беларускай (Да сотай гадавіны з дня смерці паэта)”. Артыкул гэты, мабыць, заінтрыгаваў многіх палякаў, якія былі схільныя ўбачыць у публікацыі беларускага крытыка спробу “адабраць у палякаў Міцкевіча”.

Аднак трэба сказаць, што наогул эмігранцкія публікацыі С. Станкевіча пра А. Міцкевіча мала, а найчасцей увогуле заставаліся і застаюцца невядомыя ў Польшчы.

Поўнасцю пазбаўлены грунту сцвярджэнні беларускіх савецкіх публіцыстаў, нібы беларускія эмігранты стараюцца пасварыць беларусаў з усімі сваімі суседзямі, што яны імкнуцца да развязвання Трэцяй сусветнай вайны. Ані творчасць беларускіх эмігранцкіх пісьменнікаў, ані характар беларускай палітычнай публіцыстыкі ў эміграцыі не пацвярджаюць такіх інсінуацый.

Афіцыйнаму савецкаму тэзісу аб тым, што беларуская эміграцыя імкнецца пасварыць народы, пярэчыў, між іншым, ужо згаданы артыкул “Адам Міцкевіч — вялікі сын зямлі Беларускай”. Калі ўважліва прыгледзецца да яго загалоўка і зместу, то прыйдзем да высновы, што няма ў ім якіх-колечы экспансіўных тэндэнцый. Аўтар гаворыць не аб належнасці польскага паэта да беларускага народа, а толькі аб яго арганічнай сувязі з беларускай зямлёй, а гэта ж факт бясспрэчны. Вядома, што часта загалоўкі бываюць зманлівыя, а змест публікацыі запярэчвае яе назве. Ці з такой тэндэнцыяй мы маем дачыненне ў артыкуле Станкевіча? Несумненна, некаторыя яго сцвярджэнні маглі выклікаць у паляка, прынамсі, супярэчлівае ўспрыняцце.

Да прыкладу, выраз “беларускі дробнашляхецкі род” у дачыненні да сям’і Міцкевічаў быў для многіх палякаў той лыжкай дзёгцю, якая псуе бочку мёду. І прыведзенае сцвярджэнне не было ў дадзенай публікацыі адзіным выказваннем, якое выклікала супраціў з польскага боку. Так далёка не ўсе выхадцы з Польшчы маглі згадзіцца з наступнай тэзай, вельмі характэрнай для С. Станкевіча: “Геніяльны талент Міцкевіча паявіўся ў той чорны для нас час, калі беларускі народ знаходзіўся на дне свайго нацыянальнага ўпадку, а Беларусь была прасторай і аб’ектам расейскай і польскай культурнай экспансыі. Ёсць зусім праўдападобным, што калі б Міцкевіч жыў і тварыў у час беларускага нацыянальнага адраджэння, ён быў бы беларускім паэтам, а ягоныя творчыя дасягненні й сусветная слава была б запісаны на конто

беларускага народу. Праўдападобнасць такой гіпотэзы павялічваецца яшчэ ў сувязі з тым, што, як вядома, пачынальнікамі і стваральнікамі беларускай адраджэнчаскай й нацыянальнай літаратуры ў першую чаргу былі дробная і буйнейшая беларуская шляхта, раней у большай ці меншай меры спаланізаваная, якая аднак у канцы XIX й пачатку XX стагоддзя ў вялікай колькасці сваёй вярнулася да беларускай нацыянальнай свядомасці" [1].

Несумненна, такое сцвярджэнне беларускага эмігранцкага крытыка не магло не казытаць польскую нацыянальную гордасць. І хаця С. Станкевіч адназначна акрэсліваў нацыянальную прыналежнасць Адама да польскага народа, калі заяўляў: "Паводле сваёй культуры і нацыянальнае свядомасці быў Міцкевіч вялікім польскім патрыётам і самаахвярным змагаром за справу польскую", — то ўсё ж крытык нібы правакаваў палякаў наступнай думкай: "У глыбокай падсвядомасці паэта цякла беларуская плынь, адзывалася ягоная беларуская душа, што пры раўначасным ягоным самаадчуванні й свядомасці як польскага патрыёта вырознівала яго паміж палякаў этнаграфічнае Польшчы" [2].

Зразумела, што такія сцвярджэнні, як "у глыбокай падсвядомасці паэта цякла беларускай плынь, адзывалася ягоная беларуская душа", маглі выклікаць у палякаў самаабарончыя інстынкты. Трэба, аднак, сказаць, што беларускі крытык умела застрахаваўся цытатай са Станіслава Піганя, які ў 1934 г. у кнізе "Пан Тадэвуш: Рост, веліч і слава" выказаў думку, падобную да тэзіса Станкевіча. "Трэба, аднак, выразна сказаць, — пісаў польскі літаратуразнавец, — што Міцкевіч пры ўсёй сваёй гарачыні і ёмістасці польскага патрыятызму меў заўсёды і нават сумысна культываваў у сабе пэўную свядомасць індывідуальнай племянной апрычанасці. Быў пайцясней звязаны пачуццёва з родным краем, быў палякам літоўскім, "ліцвінам" і ніколі не чуўся заадно з палякамі з Кароны" [3].

Абапёршыся, як на моцную калону, на тэзіс Піганя, беларускі эмігранцкі крытык перайшоў да сфармулявання вывадаў, якія, па сутнасці, не маглі выклікаць адмоўных адносін як з боку польскай, так і з боку беларускай грамадскасці. Станкевіч напісаў: "Вось гэтае пачуццё племянной і пачуццёвай сувязі з беларушчынай, традыцыйна тады называнай "літоўшчынай", і гэтая ягоная свядомасць сваёй апрычонасці моцна заважыла на паэтычным кірунку Міцкевіча і знайшла сваё найпэўнейшае выражэнне ў двух аспектах: у паэтычным выкарыстанні ў сваіх творах беларускае народнае творчасці і бязмежнай любові да беларускага краю […]" [4].

---

[1] Станкевіч С. Адам Міцкевіч — вялікі сын зямлі Беларускай: (Да сотай гадавіны з дня сьмерці паэта) // Бацькаўшчына. 1955. № 47–48. С. 2.

[2] Тамсама.

[3] Pigoń S. Pan Tadeusz: Wzrost, Wielkość і Sława. Warszawa, 1934. S. 224.

[4] Станкевіч С. Адам Міцкевіч — вялікі сын зямлі Беларускай. С. 2.

С. Станкевіч звярнуў увагу на значэнне філаматаў і філарэтаў, якія ўзвялі падмурак для дзейнасці шматлікай плеяды польска-беларускіх пісьменнікаў тыпу Яна Чачота і Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Крытык падкрэсліў значэнне беларускай песні ў дзіцячыя гады польскага паэта, якая прынесла плённыя вынікі ў першы перыяд яго творчасці, ролю беларускіх песенных і казачных матываў у стварэнні такіх вершаў, як: “Люблю я”, “Свіцязь”, “Рыбка” і многіх інш. Беларускі крытык даказваў, што арганічная сувязь Міцкевіча-паэта з народнай рэчаіснасцю Навагрудчыны праявілася, між іншым, і ў тым, што ў творы “Тукай, або Спробы прыязні” Міцкевіч выкарыстаў аўтэнтычнае прозвішча, якое часта сустракаецца ў навагрудскай ваколіцы. Станкевіч гаворыць, што ўдалося яму гэта пацвердзіць у час даследаванняў, якія ён праводзіў каля Навагрудка ў 1934 г. Аўтар артыкула канстатуе, што галоўныя матывы для “Балад і рамансаў” былі пачэрпнуты Міцкевічам з тэрытарыяльнага трохкутніка Навагрудак — Калдычаўскае возера — берагі Нёмана. У цэнтры гэтага трохкутніка знаходзіцца возера Свіцязь, якое, як вядом, у творчасці Міцкевіча займае цэнтральную пазіцыю. Станкевіч даказвае, што Міцкевіч у сваёй ранняй паэзіі адлюстраваў не толькі тыповыя для Навагрудчыны матывы, але таксама дакладна паказаў характэрныя рысы мясцовага краявіду і пейзажу.

У далейшых фрагментах сваёй публікацыі крытык заняўся “Дзядамі”, даказваючы, што яны заснаваны на беларускім фальклорным і абрадавым матэрыяле. Даследчык падкрэслівае, што свята дзяды, якое было памінальным абрадам, заснаваным на веры ў еднасць з памерлымі, захаваліся амаль поўнасцю ў Беларусі аж да пачатку XX ст.

Станкевіч аднак адзначае, што “Дзяды” не з’яўляюцца творам, заснаваным выключна на памінальным абрадзе: Міцкевіч выкарыстаў у сваёй драме шэраг іншых беларускіх народных абрадаў і матываў для таго, каб стварыць яваю дзівосную драматычную містэрыю.

Беларускі крытык даходзіць да вельмі істотнага і арыгінальнага вываду. Ён даказвае, што А. Міцкевіч не быў спрошчаным “нявольнікам” таго ці іншага беларускага абраду ці матыву, а толькі іх творчым інтэрпрэтатарам і літаратурным алхімікам: “Метад выкарыстання Міцкевічам народнай творчасці сведчыць аб высокай мастацкай якасці ягонага таленту. Ён, не ў прыклад многім іншым паэтам, не ставаўся нявольнікам прымітыўных і сырых узораў народнае творчасці, але ўмеў яе прыгожа ператапіць у высокамастацкія перлы пры адначасным захаванні іхняга народнага характару, свядомасці і непасрэднасці. Дзеля гэтага “Балады” і перадусім “Дзяды” Міцкевіча былі найдасканалейшым выражэннем народнасці ў польскай рамантычнай паэзіі, а сваім этнічна-нацыянальным уплывам сталіся паказнікамі для многіх іншых польскіх рамантычных паэтаў, што творчасць гэтых апошніх развівалася таксама на беларускай народнай аснове, ды нават і пісьменнікі наступнай літа-

ратурнай эпохі — пазытывізму, што выйшлі з Беларусі, ахвотна выкарыстоўвалі ў сваіх творах, як, прыкладам, Эліза Ажэшка, беларускія народныя матывы і надавалі сваім творам шырокі беларускі каларыт” [5]. Здаецца нам, што незалежна ад нацыянальнай арыентацыі нельга не згадзіцца з галоўнымі меркаваннямі, што выступаюць у гэтым фрагменце артыкула Станкевіча.

У наступнай частцы сваёй публікацыі С. Станкевіч правёў аналогію паміж прыродаапісальнай стыхіяй у творчасці А. Міцкевіча і пейзажнымі матывамі ў творчасці беларускага Міцкевіча — Якуба Коласа, які адлюстраваў у сваіх паэмах прыроднае харство таго ж самага наднёманскага краю.

Станкевіч адзначаў, што ні фальклорныя матывы, ні абраднасць, ні прырода не вычэрпваюць беларускай стыхіі ў творчасці А. Міцкевіча. Крытык даказваў, што стыхія гэтая праявілася таксама ў міцкевічаўскай мове і стылістыцы. Станкевіч прывёў цэлы шэраг беларускіх слоў, якія выкарыстаў у сваёй творчасці Міцкевіч і якія не выступалі ў польскім слоўнікавым фондзе. Заканчваючы свае разважанні на тэму моўнага беларускага ўздзеяння на Міцкевіча, Станкевіч падводзіць вынік: “Гэтае свядомае ўводжванне Міцкевічам вялікай колькасці беларускіх моўных асаблівасцей у сваю польскую мову з выразнай шкодаю для ейнае чысціні выразна паказвае, наколькі глыбока ён знаходзіўся пад уплывам беларускай народнай стыхіі, перад гэтым уплывам ён не бараніўся, але свядома яму падлягаў” [6].

Мы ўжо падкрэслівалі, што асабліва пачатковыя фрагменты артыкула “Адам Міцкевіч — вялікі сын зямлі Беларускай” С. Станкевіча могуць выклікаць супярэчлівыя ацэнкі і адчуванні. Сказанае адносіцца таксама да заканчэння дадзенай публікацыі: “Польскія шавіністыя груба выкарыстоўвалі й выкарыстоўваюць сяннія светлае імя Міцкевіча й ягоную несмяротную спадчыну як доказ польскай культурнай экспансіі, для абаснавання й абгрунтавання сваіх імперыялістычных прэтэнсіяў на беларускія землі і, што йдзе ў пары з гэтым, для адмаўлення беларускаму народу права на ягонае вольнае й незалежнае жыццё. У нашым жа беларускім разуменні Міцкевіч — гэта бясцэнны дар беларускае зямлі й беларускага народу палякам, дар, яшчэ дагэтуль не адплачаны” [7].

Такім чынам, Станкевіч у канцы артыкула нібы зноў раздьмухвае палемічнае вогнішча, якое распаліў на пачатку і пагасіў у сярэдзіне свайго эсэ. Ставіць ён тэзіс амаль што аб беларускім нацыянальным аўтэнтызме Міцкевіча, што, зразумела, не можа не выклікаць супраціву з польскага ды і з беларускага боку.

На заканчэнне мушу падкрэсліць, што ў цэлым публікацыя С. Станкевіча вызначаецца небанальнасцю, адвагай, палемічнасцю. Знаходзім у ёй такса-

[5] Станкевіч С. Адам Міцкевіч — вялікі сын зямлі Беларускай.

[6] Тамсама.

[7] Тамсама.

ма значныя супярэчнасці і рызыкоўнасць, якая праявілася ў тэзісе аб двух нацыянальнасцях А. Міцкевіча.

Найбольш незразумелай для мяне з'яўяецца думка Станкевіча аб тым, што палякі павінны адплаціць беларусам за той дар, якім стаў А. Міцкевіч. Цяжка сабе ўявіць рэалізацыю такога пастулата, тым больш калі ведаем, што за падарункі людзі не плацяць.

Нягледзячы на пэўныя хібы, публікацыю С. Станкевіча трэба лічыць прыкметнай з'явай у беларускім міцкевічазнаўстве.

Гаворачы пра зацікаўленні постаццю А. Міцкевіча з боку беларускіх эмігранцкіх даследчыкаў, нельга абысці маўчаннем вельмі цікавую публікацыю ў форме брашуры пад загалоўкам "Міцкевіч і беларуская плынь польскае літаратуры" Сымона Брагі (Вітаўта Тумаша), якая выйшла ў 1957 г. [8] Сувязі Міцкевіча з Беларуссю даследчык разгледзеў у наступных аспектах:

- Беларускія крыніцы творчасці Адама Міцкевіча;
- Беларушчына ў міцкевічаўскай мове;
- Ключ да належнага разумення Міцкевіча;
- Існасць беларускага і польскага ў Міцкевіча;
- Міцкевіч і беларуская літаратура;
- Беларуская плынь польскай літаратуры XVIII–XX стст.;
- Апошні этап гістарычнага працэсу.

Ужо хаця б на прыкладзе прыведзеных падзагалоўкаў бачым, што эмігранцкі публіцыст усебакова разгледзеў розныя праявы сувязей Міцкевіча з Беларуссю.

Названая брашура вызначаецца вялікай дозай паглыбленага аб'ектывізму.

Трэба ўсё ж адзначыць, што ў беларускіх эмігранцкіх публікацыях наогул у большай або меншай ступені праяўлялася дзіўная тэндэнцыя. Сэнс яе зводзіўся да празмернага падкрэслівання беларускасці А. Міцкевіча, тады калі ў сапраўднасці паэт быў з крыві і косці палякам і, мабыць, ніколі не дапускаў думкі аб сваёй прыналежнасці да нейкай іншай нацыі, у тым ліку і да нацыі беларускай.

Шырокае выкарыстанне А. Міцкевічам беларускіх легенд і паданняў у "Баладах і рамансах", беларускай абраднасці ў "Дзядах" і беларускай прыроды ў "Пану Тадэвушы", а таксама ўвядзенне паэтам у сваю стылістыку значнай колькасці беларускіх слоў або беларускага сінтаксісу ні ў якой ступені не змяншае яго польскасці. Міцкевіч быў і ёсць польскай уласнасцю, што не перашкаджае беларусам насіць яго імя і творчасць ва ўдзячных сэрцах і пачуццях.

---

[8] Брага С. Міцкевіч і беларуская плынь польскае літаратуры. New York, 1957.

Мірдза Абала *(Рыга)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ У ЛАТВІІ

У Латвіі жывая цікавасць да Адама Міцкевіча, да польскай літаратуры наогул, пачыналася ў другой палове мінулага стагоддзя, асабліва ў 90-х гг., калі ўзнік рух прагрэсіўнай інтэлігенцыі "Новая плынь" і літаратурнае жыццё ажывілася. Што імя А. Міцкевіча ў той час не было чужым, сведчыць артыкул Ф. Бергманіса ў часопісе "Рота" ("Убор"). У 1886 г. выйшаў кнігай эпас Ю. Крашэўскага "Вярба, герой старажытных літоўцаў". У рэцэнзіі Ф. Бергманіс піша, што ў жанры рамана няма роўных аўтару, але ў паэзіі ён не можа мерацца з такімі свяціламі, як А. Міцкевіч і Ю. Славацкі. Значыцца, імя А. Міцкевіча на той час ужо было вядома. Гэта засведчылі і матэрыялы Музея літаратуры і мастацтва Я. Райніса. Там захаваўся сшытак сясцёр Я. Райніса — сшытак "Паэзія" Лоры і Лізы. Між вершамі рускіх і нямецкіх паэтаў там і вершы А. Міцкевіча, фрагменты з паэмы "Дзяды". Аўтар упамянуты як блізкая асоба — "А. М." і "Адам". Гэта сведчыць, што ў сям'і Я. Райніса сутыкненне з польскай мовай, з польскай паэзіяй, асабліва з Міцкевічам, было ўжо ў яго дзяцінстве. У 1895 г. у "Маяс Віеса Менешракстс" ("Часопіс дамашняга госця") быў надрукаваны ўсебаковы агляд жыцця і творчасці А. Міцкевіча, напісаны літаратурным крытыкам Теадорам Зейфертам. Ён прызнае, што А. Міцкевіч — выдатная з'ява літаратуры, геній, які цесна звязаны задачамі свайго часу, што ён не толькі выдатная асоба польскай літаратуры, але і вялікі паэт славян.

Першым актыўнейшым папулярызатарам паэзіі А. Міцкевіча ў Латвіі на пераломе XIX і XX ст. з'яўляецца паэт Судрабу Эджус. У 1896 г. у "Часопісе дамашнага госця" надрукаваны яго пераклад верша "Błogo temu, kto w twojej pamięci utonie", а ў літаратурным дадатку газеты "Маяс Віесіс" ("Дамашні госць") верш "Аркі-майстар", фрагменты паэмы "Конрад Валенрод" і баладная паэма "Мне падабаецца". У 1897 г. у чатырох нумарах "Часопіса дамашняга госця" надрукаваны шырокі агляд жыцця і творчасці А. Міцкевіча, напісаны Судрабу Эджусам і некаторыя вершы польскага паэта ў яго перакладзе. У канцы агляду Судрабу Эджус піша: "Як чалавек ён быў знаёмы з несапсаванай, высокай і загартаванай натурай, як грамадзянін горача любіў зямлю бацькоў, але агульную карысць ставіў вышэй сваёй, як паэт найлепш апяваў уласцівасці, погляды, адчуванні і пакуты польскага народа, […] ён заснаваў палякам пісьменнасць навейшага часу, рабіў іх вядомымі ва ўсім цывілізаваным свеце, і таму мільёны сэрцаў акружаюць яго не толькі з праслаўленнем, але яшчэ і з любоўю".

У 1898 г., у стагоддзе з дня нараджэння А. Міцкевіча, у гэтым жа часопісе ў перакладзе Судрабу Эджуса надрукаваны верш "Вячэрні час", цераз год у трох прадаўжэннях — чацвёртая частка паэмы "Дзяды", а ў часопісе

“Ауструмі” (“Усход”) — фрагменты з чацвёртай часткі паэмы “Пан Тадэвуш” і адзін з вершаў. Польскі літаратуразнавец Ксаверый Свяркоўскі ў 1932 г. прызнаў, што пераклады Судрабу Эджуса дакладныя, па форме майстэрскія, што ён добра ведае мову арыгінала.

Рэвалюцыя 1905 г., Першая сусветная вайна прыпынілі распачатае фарміраванне літаратур “маладых” народаў. З’яўляюцца пераважна выпадковыя пераклады. У 1905 г. часопіс “Апскатс” (“Агляд”) друкуе пераклад паэмы “Конрад Валенрод” у прозе і невялікі, не вельмі ўдалы яе пераклад у вершах. У 1908 г. у вольнай вершаванай форме надрукаваны яшчэ адзін пераклад “Конрада Валенрода”, годам пазней — пераклад верша “Рускім сябрам”, а ў 1916 г. у перакладзе пісьменніка Яна Эзерыня — балады “Тры Будрысы” і “Ваявода”. Паэт і перакладчык Язэп Османіс ацэньвае яго пераклады як удалыя, піша, што яны дакладна перадаюць змест і старажытны каларыт.

У 20-х і 30-х гг. Латвія арыентавалася на Захад. З славянскіх моваў у гэты час перакладаў было мала. У 1924 г. у газеце “Брыва земе” (“Свабодная зямля”) з’яўляюцца пяць “Крымскіх санетаў”, а годам пазней газета “Латвіетыс” (“Латыш”) паўторна друкуе баладу “Ваявода” ў перакладзе Я. Эзерыня. Польскі літаратуразнавец К. Свяркоўскі ў артыкуле “Міцкевіч па-латышску” піша: “Цяпер ніхто творы Міцкевіча не перакладае, бо няма ведаючых польскую мову” [1]. Сітуацыя мяняецца ў канцы 30-х гг. У 1937 г. у перакладзе паэта Карла Круза выходзіць анталогія “Полю дзея” (“Польская паэзія”), у якой сярод ста пяці паэтаў найбольш шырока прадстаўлены А. Міцкевіч — сарака двума вершамі. Некаторыя з іх на латышскай мове надрукаваны тут у першыню. Я. Османіс пісаў пра анталогію: “І грамадскія, і глыбока патрыятычныя вершы (“Ода да маладосці”, “Маці-полька”, “Песня падарожнікаў” і інш.), лірыка філасофская, лірыка кахання і прыроды, “Крымскія санеты” ў гэтым выданні дазваляюць адчуць подых паэзіі Міцкевіча вельмі пераканаўча, таму што паэтычныя пераклады амаль усе былі зроблены з вялікай павагай і на высокім мастацкім узроўні, нягледзячы на тое, што над імі працавалі адно лета” [2]. У ўступным слове С. Кальбушэўскага значнае месца было адведзена А. Міцкевічу. Ён пісаў: “Найпрыгэжейшую эпоху развіцця польскай паэзіі адкрыў вялікі польскі геній Адам Міцкевіч. Важаты плыні рамантызму, ён становіцца народным важатым” [3].

Моцна прагучала імя А. Міцкевіча ў Латвіі ў 1940 г., у час 85-х угодкаў з дня яго смерці. У Рызе адбыўся вечар яго памяць. Усе перыядычныя выданні надрукавалі публікацыі пра А. Міцкевіча. Таксама ў наступныя гады

[1] Pamietnik Literacki. T. 29. 1932. S. 122.

[2] Adam Mickievičs Latvijā // Karogs. 1974. Nr. 1. 155. lpp.

[3] Poļu dzeja. Kārļa Krūzas tulkojumā. Rīgā, 1937. 8. lpp.

дзейнасць польскага паэта была ў полі зроку ў Латвіі. Так, у 1945 г. у газеце “Літаратура ун макcла” (“Літаратура і мастацтва”) быў надрукаваны сардэчны нарыс Яна Судрабкална ў сувязі з 90-годдзем з дня смерці А. Міцкевіча, агляд Карліса Эгле пра пераклады вершаў А. Міцкевіча на латышскую мову.

У 1947 г. выходзіць пераклад паэмы “Конрад Валенрод”, які зрабіў Канстантынс Айзпурс. Я. Османіс пра яго піша: “Пераклад лексічна багаты, і адлюстраванне барацьбы старажытных прусаў вельмі дынамічнае, паказ характараў вытрыманы з манументальнай цвёрдасцю арыгінала, паспяхова адлюстравана, адначасова з графічнымы малюнкамі дадзена ўзнаўленне гістарычнага каларыта, з перадачай маляўнічага ліра-эпічнага гучання старажытнасці” [4].

Вельмі шырока адзначалася 148 гадавіна з дня нараджэння А. Міцкевіча. У перыёдыцы з’явіліся артыкулы перакладчыкаў з польскай мовы, артыкулы іншых аўтараў, яны істотна наблізілі вялікага паэта да чытачоў.

У 1957 г., перад 160-годдзем А. Міцкевіча, выйшла “Выбранае” яго паэзіі з пасляслоўем В. Мельніса — перакладчыка з польскай мовы і крытыка. У пасляслоў’і дадзены шырокі агляд жыцця паэта і аналіз яго твораў. У перакладах К. Круза, Ю. Бірзвалка, К. Аізпура, А. Веяна, Я. Османіса сюды ўключаны самыя значныя вершы, санеты, балады і рамансы.

У 1964 г., чакаючы 110 гадавіны з дня смерці А. Міцкевіча, у перакладзе Я. Османіса ў дзесяці тысячах экземплярах выходзіць самы выдатны твор Міцкевіча — паэма “Пан Тадэвуш”. Перакладчык пра гэта расказвае: “У гады студэнцкія, на пачатку пяцідзеятых гадоў, дзякуючы Алісе Элсіняй, якая ўклала анталогію “Лірыка народаў свету”, у мяне ўзнікла магчымасць перакладаць паэзію польскіх аўтараў. Большую частку раздзела польскай лірыкі перакладаў я, прытым паралельна пачаліся ўжо спробы перакладаць “Пана Тадэвуша”. Калі я скончыў універсітэт, ад калег, рэдактараў рэдакцыі мастацкай літаратуры Латвійскага дзяржаўнага выдавецтва атрымаў цудоўны падарунак — мініяцюрнае выданне “Пана Тадэвуша” ў скураным пераплёце. Я ўсюды насіў яго з сабой, як малітоўнік. У мяне ўвесь час спела жаданне перакласці што-небудзь вялікае, значнае. Гэта мог быць “Пан Тадэвуш”. Так думаў і рэдактар рэдакцыі, паэт Бруно Саўліціс, калі даверыў мне гэтую працу. Ужо ва універсітэцкія гады я пераклаў уступ і некалькі фрагментаў. Тады, працуючы рэдактарам ў выдавецтве, я працягваў пачатую работу далей. У 1959 г. пайшоў з рэдакцыі, каб па-сапраўднаму мог працаваць над “Панам Тадэвушам”. У 1962 годзе я працу скончыў і аддаў ў выдавецтва. Вельмі ўдалая была мая першая паездка ў Польшу ў 1961 годзе, паездка, якую ўзбудзіў “Пан Тадэвуш”. У Кракаўскім анты-

[4] Ādams Mickievičs Latvijā // Karogs. 1974. Nr. 1. 155. lpp.

кварным магазіне я купіў грунтоўнае выданне “Пана Тадэвуша”, вялікага фармата, з гравюрнымы ілюстрацыямі Эльвіра Андрыёлі. Мне паказалася, што яны падыходзяць для рэпрадукцый… З імі ў 1964 годзе выйшла латышскае выданне.

Каб перакладаць “Пана Тадэвуша”, мне трэба было вельмі многа чытаць, выявіць, шукаць у мастацкай літаратуры, на старонках навуковых кніг, у музеях. Я спецыяльна пабываў у роднай старонцы Адама Міцкевіча, у наваколлі Навагрудка, пабываў ў літаратурным музеі Варшавы. Каб перакласці дваццаць вершаваных радкоў, у якіх трыццаць назваў грыбоў, прыйшлося шукаць іх назвы, выявы гэтых грыбоў. Вельмі дапамаглі каментарыі С. Піганя — польскага літаратуразнаўца — да “Пана Тадэвуша”.

Рэцэнзент Ж. Ігнатовіч ацаніў пераклад як вельмі ўдалы, адзначаўшы, што перакладчык захаваў рытм і форму арыгінала, што яму добра ўдалося перадаць партрэты людзей, паказаць Міцкевіча як цудоўнага пейзажыста, палітра якога мае шмат свежых фарбаў, якімі ён адлюстроўвае раскошу роднай прыроды. Я. Османіс добра ведаў польскую мову, бо яго маці была полькай.

За ўдалую, самаадданую працу Я. Османіс у 1965 г. атрымаў ў Варшаве прэмію, а ў 1982 г., за пераклады з польскай мовы, яму прысуджаюць прэмію Еўрапейскага Саюза пісьменнікаў.

І ў дальнейшых гадах цікавасць да А. Міцкевіча не знікла. Ізноў і ізноў з’яўляліся артыкулы пра яго, дзе сцвярджалася, што яго літаратурная спадчына доўга-доўга будзе цікавіць чалавецтва. Ад прыроды А. Міцкевіч атрымаў два падарункі: незвычайную паэтычную сілу і магчымасць ахвяраваць увесь свой талент радзіме. Неўміруючы як паэт і як патрыёт, ён увайшоў не толькі ў польскую, але таксама ў сусветную гісторыю.

Джым Дынглі *(Лондан)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ І ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ

Тое, як успрымаюць паэта ў іншай краіне, часцей адлюстроўвае саму краіну, чымся таго ці іншага паэта. Хаця маё выступленне мае назву “Міцкевіч і Вялікабрытанія”, яно хутчэй пра Вялікабрытанію, чымся пра Міцкевіча. Мэта гэтага выступлення — даць агульную карціну таго, як чытацкая публіка ў Вялікабрытаніі стала знаёміцца з паэзіяй Адама Міцкевіча, і запрапанаваць некаторыя тлумачэнні, чаму яго паэзія мела тут такі малы водгалас у час яго жыцця.

Найбольш задакументаванай крыніцай для гісторыі ўспрымання Міцкевіча ў Брытаніі, без усялякіх сумневаў, можа лічыцца артыкул прафесара

Уільяма Роуза ў зборніку пад рэдакцыяй Вацлава Лядніцкага, які быў надрукаваны ў 1956 г. [1] Прафесар Роуз быў адначасова прафесарам паланістыкі і дырэктарам Інстытута славяназнаўства Лонданскага універсітэта (School of Slavonic and East European Studies of the University of London). Я ўсведамляю той факт, што гэты даклад ўзнік у большай ступені дзякуючы згаданай вышэй працы прафесара Роуза.

Напэўна вельмі цяжка або абсалютна немагчыма вызначыць праз столькі гадоў, як чытацкая публіка рэагавала на першыя згадванні імя Міцкевіча і яго паэзіі. Але некаторы аналіз таго, што пісалася ў той час, высветліць брытанскі пункт гледжання на паэтычную творчасць увогуле і на паэзію Міцкевіча ў прыватнасці. Мы павінны таксама памятаць, што шмат таго, што пісалася і друкавалася пра Міцкевіча ў Брытаніі, — гэта фактычна працы чужаземцаў (можа быць, землякоў Міцкевіча, але чужаземцаў для брытанцаў). Аднак трэба зважаць на сам факт публікацыі незалежна ад таго, хто напісаў — брытанец або небрытанец. Таксама трэба ўлічваць, гаворачы пра Міцкевіча ў Вялікабрытаніі, яго ўспрыманне паўсюль у англамоўным асяроддзі. У гэтым паведамленні я абмяжую сябе Вялікабрытаніяй, акрамя тых выпадкаў, дзе нацыянальнасць перакладчыка будзе патрабаваць удакладнення [2].

Перыяд паміж 1815–1837 гг. вельмі істотны ў брытанскай гісторыі. 1815 г. адзначаецца паражэннем Напалеона ў бітве пад Ватерлоо — што сталася канцом вайны, якая доўжылася з рэдкімі перапынкамі з 1793 г.; 1837 г. стаўся годам узыходжання на трон каралевы Вікторыі. Паражэнне Напалеона і далейшыя дамоўленасці на Венскім кангрэсе зрабілі Брытанію найбольш магутнай дзяржавай у Еўропе. Яе імперыя распасціралася па ўсім свеце. Падлічана, што кожны пяты чалавек з усіх жыхароў Зямлі ў той час пражываў у Брытанскай імперыі. Такім чынам зразумела, чаму Брытанія шукала паразумення з яшчэ адной вялізнай імперыяй у Еўропе — Расійскай, замест таго каб запрапанаваць падтрымку, напрыклад, палякам, якія імкнуліся разбурыць адзінства імперыі і яе ўяўную моц.

З ростам эканамічнай магутнасці Брытаніі ўсё гучней раздаваліся заклікі да парламенцкіх рэформаў. Тыя, хто вынес на сабе асноўны цяжар вайны — вайскоўцы і падаткаплацельшчыкі — не лічыліся грамадзянамі, бо не мелі прадстаўніцтва ў парламенце. Яны сталі патрабаваць роўных з дваранствам правоў. Іншымі словамі, яны хацелі, каб іх прызнавалі сапраўднымі грамадзянамі. Дзякуючы радыкальным тэндэнцыям, якія яшчэ засталіся пасля Французскай рэвалюцыі 1789 г. і апублікавання вядомай кніжкі Тома Пэй-

[1] Rose W. J. Mickiewicz and Britain // Lednicki W. A. Mickiewicz in World Literature. Berkeley; Los Angeles, 1956. P. 295–318.

[2] Whitfield F. J. Mickiewicz and American Literature // Lednicki W. Назв. тв. P. 340–352. Артыкул прысвечаны ролі А. Міцкевіча ў амерыканскай літаратуры.

на “The Rights of Man” (“Правы чалавека”), палітыкі сталі асэнсоўваць, што нешта трэба рабіць у Імперыі для рабоў і рыма-католікаў. А колькасьць іх расла вельмі хутка.

Вядома, што гаспадарка Брытанскай імперыі на пачатку XIX ст. залежала ў вялікай ступені ад рабскай працы — як і ў тых частках Імперыі, што былі страчаны ў выніку Амерыканскай вайны за незалежнасць. У метраполіі добрапрыстойны росквіт, якім карысталіся тыя, хто меў маёнткі і каго так выдатна апісвае Джэйн Остэн у рамане “Мэнсфілд парк”, — гэты росквіт стаўся мажлівым толькі дзякуючы працы рабоў на цукровых плантацыях на астравах Вест-Індыі. Гэта пераканаўча паказвае Эдвард Сэйд [3]. У 1807 г. парламент забараніў гандляваць рабамі, а ў 1833 г. пачалося, так бы мовіць, урачыстае шэсце эмансіпацыі па ўсёй Імперыі.

У выніку Акта 1800 г. пра далучэнне Ірландыі да Брытаніі ў Імперыю ўвайшлі тэрыторыі з амаль што выключна каталіцкім насельніцтвам. Шмат жаўнераў-католікаў з Ірландыі і Шатландыі ўдзельнічалі ў вайне з Напалеонам. Тым не менш, ёсць фактам тое, што грамадзяне-католікі ў выніку законаў, прынятых парламентам у XVII ст., былі жорстка абмежаваныя ў сваіх грамадзянскіх і рэлігійных правах. Ранейшая спроба парламента вырашыць гэтую праблему, так званы закон the Catholic Relief Act 1778 г., прывяла да самых сур’ёзных і працяглых вулічных беспарадкаў, якіх Брытанія не бачыла ні дагэтуль, ні пасля.

Напрыканцы 20-х гг. парламент пачаў рухацца ў накірунку да прыняцця закона, які даў бы католікам поўную свабоду. Гэтыя зрухі суправаджаліся тысячамі петыцый і абурэннем з усіх куткоў краіны і ўсіх слаёў насельніцтва.

Няцяжка знайсці тлумачэнне гэтым моцным антыкаталіцкім пачуццям. Вялікабрытанія ўзнікла ў 1707 г. пасля аб’яднання дзвюх дзяржаваў — Шатландыі і Англіі з Уэльсам і ў выніку заклапочанасці англійскага ўрада ў адносінах да моцы Францыі. У XVIII ст. дзяржаўная прапаганда імкнулася да стварэння менавіта брытанскай нацыянальнай самасвядомасці тым, што падкрэслівала Боскую сутнасць бітвы пратэстантызму супраць каталіцтва. У той час гэта прапаганда дасягнула месіянскіх узроўняў, але не натхніла аніякае вялікае паэзіі. Апошняе паражэнне Францыі ў 1815 г., здавалася, стварыла ў брытанцаў нешта накшталт крызіса самавызначэння, які быў пераадолены з цягам часу прадпрымальніцкай дзейнасцю і пашырэннем Імперыі.

У культурным жыцці краіны панавалі абедзве сталіцы — Лондан і Эдынбург і старыя універсітэты Оксфард і Кембрыдж. Цікавасць да культур іншых краін абмяжоўвалася галоўным чынам літаратурай і гісторыяй Грэ-

[3] Said E. W. Culture and Imperialism. London, 1994. P. 69.

цыі ды Рыма класічных часоў. Амаль усе пісьменнікі Брытаніі, прынамсі тыя, хто прайшоў праверку часам і каго яшчэ чытаюць, мелі радыкальныя погляды і не ладзілі з істэблішментам. Паэтычны светапогляд Уільяма Вордсварта, напрыклад, фарміраваўся пад уплывам Французскай рэвалюцыі. Байран, творы якога добра ведаў Міцкевіч, рэзка выступаў супраць тыраніі каралёў і імператараў. Безумоўна, мае значэнне той факт, што тры найвыдатнейшыя паэты таго часу — Кітс, Шэлі і Байран — памерлі на чужыне: Кітс і Шэлі — у Італіі, Байран — у Грэцыі, дзе ён актыўна ўдзельнічаў у змаганні грэкаў за незалежнасць ад туркаў.

Вось агульнымі штрыхамі перад вамі краіна, палітычна моцная і самаўпэўненая, у якую ў канцы 20-х гг. пачалі прасочвацца звесткі пра выдатнага польскага паэта. Краіна, якая, нягледзячы на новыя законы, была настроена супраць каталікаў, але ў выніку класічнай адукацыйнай традыцыі амаль што няздольная да ўспрымання культур іншых народаў. Гэта краіна гадамі ваявала супраць Напалеона, якога падтрымлівалі палякі. І, так бы мовіць, апошняя кропля: брытанцы не мелі звычкі бачыць ў сваіх паэтах прарокаў. Вось чаму цяжка было чакаць ад іх, каб яны ўспрынялі паэта з прароцкімі тэндэнцыямі без натуральнага ў падобнай сітуацыі недаверу. Літаратурны часопіс “Athenaeum” адкінуў “Кнігі народа польскога” Міцкевіча (пераклад іх на англійскую мову зрабіў польскі выгнанец-пратэстант, родам з Беларусі, Крыстын Лях Шырма) з наступным тлумачэннем: “Гэта звычайная пародыя на Свяшчэннае Пісанне, і наўрад ці яна задаволіць густы брытанскай публікі”.

А вось што было надрукавана ў 1839 г. у “Foreign Quarterly Review”: “Дзіўнасць польскага характару — больш азіяцкага, чым еўрапейскага — палягае ў спалучэнні легкадумнасці сучасных персаў з панурай рашучасцю старадаўніх скіфаў. Спалучэнне гэтых рысаў робіць палякаў схільнымі да ўзвышаных настрояў і думак, якія ёсць нестабільнымі па сваёй натуры — дакладна як і іх гісторыя, адзначаная пячаткай экстравагантнасці і панурасці адначасова. Фактам ёсць тое, што нацыі, схільныя да вагання настрояў, маюць вельмі малую здольнасць да стварэння нечага істотнага ў паэзіі”.

Роуз піша рэзка: “Англійскія крытыкі неяк раптоўна спалохаліся. Калі яны ўвогуле ведалі пра Міцкевіча, то або ганьбілі, або, прынамсі, ставіліся абыякава да таго, што паэта літаральна паглыналі ўласная асоба і лёс яго нацыі” [4].

Міцкевіч упершыню згадваецца ва ўступе да кніжкі сэра Джона Баўрынга “Specimens of the Polish Poets” (1827), хаця там не прыводзяцца пераклады. У 30-я і 40-я гг. нястомны Джордж Бороу, які зрабіў шмат дзеля таго, каб пазнаёміць англійскіх чытачоў з культурамі Уэльса, Іспаніі і цыган, а такса-

[4] Rose W. I. Mickiewicz and Britain. P. 296.

ма з іх мовамі, надрукаваў уласныя пераклады чатырох вершаў Міцкевіча. У лістападзе 1838 г. з'явілася больш падрабязная інфармацыя пра паэта ў другім нумары часопіса "The Polish Magazine". Артыкул ананімны, але вядома, што яго напісаў Джузепе Мазіні, герой італьянскага "Рысаджымента". У канцы артыкула ёсць пераклады ў прозе некалькіх вершаў. Артыкул змяшчае шмат цікавага, але наўрад ці яго чыталі ў шырокіх колах.

Паэтычная дзейнасць Міцкевіча абмяркоўваецца досыць падрабязна ў трохтомнай кнізе вельмі дзіўнага чалавека, Шарля Фрэдэрыка Генігсена (1815–1877), амерыканца скандынаўскага паходжання, які потым прыняў англійскае падданства. Кніга мае назву "Усходняя Еўропа і імператар Мікалай", і з'явілася яна ў 1846 г.

Роуз апісвае Генінгсена як змагара за свабоду — на Каўказе ён браў удзел у паўстанні Шаміля, у 1848 г. ён стаў асабістым сакратаром Лайоша Кошута ў час змагання венграў за незалежнасць. Сапраўдная байранаўская фігура, але… Ён вярнуўся з Кошутам у ЗША, дзе ўзяў шлюб з багатай плямменніцай сенатара-рабаўладальніка з паўднёвага штата Джорджыя і … стаў заўзятым прыхільнікам рабства.

Аднак у сваім аналізе твораў Міцкевіча Генінгсен выказвае значную дасведчанасць. Ён параўноўвае трэцюю частку "Дзядоў" з "Інферно" Дантэ і "Фаустам" Гётэ. Ён глыбока вывучае "Конрада Валенрода" і прапануе чытачам міцкевічаўскія каментарыі да твора Красіньскага "Нябоская камедыя" [5].

У 1841 г. з'явіліся два пераклады "Конрада Валенрода", адзін празаічны, які зрабіў Леон Яблонскі, а другі паэтычны, аўтарам якога быў Генры Кетлі. Ва ўступе Кетлі піша: "Славянскія мовы — гэта нешта для нас дзіўнае. Аднак апошнім часам публіка ўсё больш і больш выказвае цікавасць да Польшчы, усё мацней расце яе жаданне пакапацца ў гэтых, так бы мовіць, свежых засеках сучаснай літаратуры". З гэтых слоў можна зрабіць вывад, што, безумоўна, зацікаўленасць расла, але расла яна вельмі паволі. Ні смерць Міцкевіча ў 1855 г., ні паўстанне 1863 г. не прыцягнулі да сябе шмат увагі.

Выбух цікавасці да Міцкевіча адбыўся ў 1875 г., у выніку дзейнасці прафесара Оксфардскага універсітэта Мофіл. Ён быў сапраўдным першаадкрывальнікам у галіне славянскіх даследванняў у Брытаніі. Абсяг яго інтарэсаў і ведаў быў сапраўды вельмі шырокі. Ён не толькі дасканала ведаў рускую мову і літаратуру, але ў сваіх запісах сведчыў таксама асэнсаванне і разуменне паважнасці ўкраінскай мовы. Потым Мофіл зацікавіўся польскай мовай. У 1879 г. ён надрукаваў артыкул пра польскую літаратуру ва ўплывовым часопісе "The Westminster Review", а ў 80 гг. напісаў граматыку польскай мовы, якая ўвайшла ў новую серыю, прысвечаную славянскім

[5] Сябра З. Красіньскага, Генры Рыў, надрукаваў артыкул пра А.Міцкевіча ў часопісе "The Metropolitan" за снежань 1831 г., дзе пісаў, што "…гэты выдатны чалавек … цяпер знаходзіцца ў выгнанні ў Англіі". Зразумела, энтузіязм і дакладнасць не заўжды ідуць у пары!

мовам. Бібліятэкар Кракаўскага універсітэта пачаў падаваць штогадовыя справаздачы пра польскую літаратуру ў часопіс “Athenaeum”. У 1882 і 1883 гг. у Лондане з’явіліся два новыя паэтычныя пераклады “Конрада Валенрода”. Перакладчыца першага з іх, Мод Ашэст Бігс, зрабіла ў 1885 г. (праз 50 гадоў пасля з’яўлення арыгінала) паэтычны пераклад “Пана Тадэвуша” пад назвай “Master Thaddeus; or, the Last Foray in Lithuania — an Historical Epic in Twelve Books” (гэта літаральны пераклад назвы паэмы з польскай мовы на англійскую) [6]. Сама Бігс, ацэньваючы “Пана Тадэвуша”, змясціла гэты твор у адзін шэраг з “Іліядай”, “Энеідай”, “Страчаным раем”, “Інферно”. На жаль, выглядае на тое, што яе дасягненні засталіся невядомымі для шырокай публікі.

У 1904—1905 гг. філосаф Вінцэнт Лютаслаўскі прыехаў у Лондан чытаць лекцыі пра Міцкевіча. Тое, як Роуз каментуе гэтыя лекцыі, варта працытаваць: “Мажлівасць для паразумення, навядзення, так бы мовіць, мастоў, была адкінута ў выніку наіўнасці (хтосьці можа адзначыць гэта словам “пагарда”), з якой ён чакаў, што яго слухачы будуць вітаць яго як аракула, што вяшчае праўду і толькі праўду, і нічога, акрамя праўды. Яго не прынялі ні як настаўніка, ні як прарока; яго адкінулі як зануду”.

“Усё гэта тлумачыцца тым, — працягвае Роуз, — што брытанцы жадалі, каб падзеі ішлі спакваля ў сваім звычным рэчышчы і каб жыццё не рухалася ні ў выніку нейкіх феерверкаў, ні нейкага фанатызму” [7].

1911 г. стаў пераломным ва ўспрыманні Міцкевіча ў Брытаніі. У гэтым годзе была надрукавана кніга Монікі Гардынер пад назвай “Адам Міцкевіч, нацыянальны паэт Польшчы”. На сённяшні дзень зразумела, што гэтая кніга з моманту яе з’яўлення прынесла шмат карысці. Мы ведаем, што там ёсць і шмат недакладнасцей, але гэта не так важна. Без гэтай кнігі ніколі не магло б здзейсніцца сур’ёзнае даследаванне Міцкевіча. М. Гардынер была адной з аматараў-энтузіястаў замежных краін, што нястомна ўзбагачалі брытанскую культуру сваімі даследаваннямі і перакладамі з літаратур, якія іначай засталіся б па-за ўвагай. Яе зацікаўленасць Польшчай з’явілася ў даволі раннім ўзросце, вельмі спецыфічным, на маю думку, англійскім чынам. Цытую з ліста М. Гардынер: “Я прачытала ўсё, што можна было знайсці пра Польшчу па-французску і па-англійску. То нямногае, што я была ў стане знайсці па-англійску, было пераважна вельмі варожым па сваім характары, што не толькі не перашкодзіла маёй закаханасці, а толькі ўзмацніла яе” [8].

Да самай гібелі ў час паветранага налёту ў 1941 г. міс Гардынер узбагачала брытанскую паланістыку сваімі даследаваннямі.

---

[6] На жаль, я не здолеў знайсці тэкст гэтага перакладу і больш нічога не ведаю пра перакладчыцу. Мяркую, што праца М. Бігс заслугоўвае сур’ёзнага вывучэння.

[7] Rose W. I. Mickiewicz and Britain. P. 307.

[8] Тамсама. С. 308.

У 1917 г. лонданская фірма “Dent and Sons” надрукавала празаічны пераклад “Пана Тадэвуша”, які зрабіў Джоржд Рэпал Нойз, як я мяркую, прафесар славістыкі Каліфарнійскага універсітэта. Кніга была перадрукавана трыма гадамі пазней. Выдаўцы, напэўна, былі задаволены продажам, таму што ў 1930 г. гэты пераклад зноў з’явіўся ў знакамітай серыі “Everyman’s Library” (“Бібліятэка для кожнага”). Кніга была перадрукавана ў 1943 і 1949 гг.

Роуз цытуе заўвагі двух вядомых у свой час англійскіх пісьменнікаў, якія пазнаёміліся з творам у гэтым перакладзе. Першая заўвага Лэсэлза Абэкромбы: “Гэтая кніга [Пан Тадэвуш. — *Д. Д.*] ёсць незвычайнае стварэнне, якім можна ласавацца, нібы смачным кавалкам каляднага пудынга з дадаткам рому”. Сапраўды, вельмі “хатняе” англійскае параўнанне! Другая заўвага — Сачеверэла Сітвела: “Пан Тадэвуш” — гэта адзін з найвялікшых твораў літаратуры ва ўсім свеце, у якім старадаўняе польскае жыццё такое дзіўнае і аддаленае ад нас, як класіка японскай літаратуры *“*Аповед пра Генджы”. І зноў — як гэта па-англійску: паставіць на адну дошку Польшчу і Японію, нібы дзве экзатычныя краіны!

Усё гэта ўзятае разам выглядае вельмі станоўча, але варта прыгадаць, што на лекцыях пра польскую літаратуру прафесара англістыкі Кракаўскага універсытэта Рамана Дыбоскага, якія ён чытаў у Оксфардзе ў 1922 і 1923 гг., прысутнічала ў сярэднім шэсць, паўтараю, шэсць асоб!

Напэўна, трэба лічыць крокам наперад прызначэнне доктара Юльяна Кржыжаноўскага на пасаду лектара польскай культуры на аддзяленні славянскіх даследванняў Каралеўскага каледжа Лонданскага універсітэта (пазней ён ператварыўся ў Інстытут славяназнаўства — School of Slavonic and East European Studies). У 1930 г. Ю. Кржыжаноўскі надрукаваў па-англійску кнігу пад назвай “Польская рамантычная літаратура” (“Polish Romantic Literature”). У 1935 г. на пасаду лектара польскай культуры быў прызначаны сам У. І. Роуз. На працягу 30-х гг. на старонках часопіса гэтай навучальнай установы, “The Slavonic and East European Review”, шмат увагі ўдзялялася польскай культуры ўвогуле і Міцкевічу ў прыватнасці.

Але ж зноў мы маем справу не з тым, як шырокая брытанская публіка ўспрымала Міцкевіча, а з, так бы мовіць, “міжсабойчыкамі” ў акадэмічным навуковым асяродку.

Выбух Другой сусветнай вайны быў прычынай вялікага прытоку палякаў у Брытанію. З сабой яны прынеслі захапленне Міцкевічам як нацыянальным паэтам. І з гэтага выспеў свой плён. 16 снежня 1949 г. на першай старонцы часопіса “The Times Literary Supplement” быў надрукаваны матэрыял, поўнасцю прысвечаны Міцкевічу, што дае яснае ўяўленне, наколькі паважнае значэнне цяпер меў паэт. Прычынай для публікацыі артыкула было з’яўленне ў Варшаве біяграфіі паэта, якую напісаў М. Яструн. Пазней най-

больш значнымі публікацыямі з'явіліся кніга Вацлава Лядніцкага "Расія, Польшча і Захад" ("Russia, Poland and the West"), надрукаваная ў 1954 г., дзе шмат ўвагі аддаецца Міцкевічу, і ў 1956 г. — зборнік артыкулаў пад рэдакцыяй Лядніцкага, які змяшчае вышэйзгаданы артыкул Роуза.

Мабыць, найбольш значным укладам у азнаямленне шырокай публікі з Міцкевічам у Брытаніі пасля 1956 г. стаў пераклад асобных частак "Дзядоў", які зрабіў граф Патоцкі з Мантальку. Пераклад быў надрукаваны Польскай культурнай фундацыяй у 1968 г. (трэба зазначыць, што раней пераклады былі надрукаваны прыватным чынам у 1944 і 1945 гг.). Перакладчык — вельмі каларытная фігура — часам ён называў сябе каралём Польшчы Уладзіславам Пятым.

Ну і апошняе: хачу прыцягнуць вашу ўвагу да таго факта, што ў гэтыя самыя дні ў Лондане, у Інстытуце славяназнаўства Лонданскага універсітэта, адбываецца трохдзённая канферэнцыя, прысвечаная Міцкевічу, хаця, на жаль, на ёй няма ніводнага прадстаўніка з Беларусі. Напэўна, мае значэнне той факт, што Лонданская канферэнцыя зрабілася мажлівай дзякуючы высілкам шчырага энтузіяста, якая працуе ў бібліятэцы інстытута, а не намаганнямі дацэнта польскай літаратуры.

Падсумоўваючы, можна сказаць, што Міцкевіч вядомы ў Вялікабрытаніі, але толькі ў даволі малым асяроддзі людзей — або спецыялістаў у некаторых галінах славістыкі, або літаратараў. Артыкул Дональна Дэві ў зборніку пад рэдакцыяй Лядніцкага [9] варты ўвагі як сведчанне таго, як прафесіянальны выкладчык акадэмічнага ўзроўню (ён быў прафесарам англійскае літаратуры ў Trinity College, у Дубліне) і неблагі паэт ставіўся да Міцкевіча.

Тое, што было зроблена, каб распаўсюдзіць веды пра Міцкевіча сярод шырокай чытацкай публікі, было дасягнута, галоўным чынам, — і я паўтараю гэта яшчэ раз, — дзякуючы аматарам-энтузіястам, такім, як Мод Бігс і Моніка Гардынер. У гэты шэраг мы павінны таксама ўключыць і Веру Рыч. І ўсяго толькі двух універсітэцкіх выкладчыкаў: прафесараў Мофіл і Нойз.

Ну, а што ж у будучым? Брытанцы, у прыватнасці англічане, не вызначаюцца як аматары паэзіі, асабліва паэзіі замежнай. Не выклікае сумнення, што будзе існаваць толькі малая колькасць аматараў Польшчы і польскай літаратуры (я свядома не разглядаю тут польскую дыяспару ў Брытаніі). А вось будучыня акадэмічных даследаванняў Міцкевіча абсалютна няпэўная. Цяперашняе пакаленне студэнтаў, якія займаюцца замежнымі мовамі і культурамі, больш не разглядаюць літаратуру як істотную частку сваёй адукацыі. Гэта, напэўна, ёсць вынік рынкавых патрабаванняў да вышэйшай адукацыі.

[9] Davie D. Pan Tadeusz in English Verse // Lednicki. Op. cit., P. 319–329. За гэтым ідуць два неапублікаваныя ўрыўкі з перакладу "Пана Тадэвуша" Кенета Макензі і Уотсана Кірканела. P. 330–337.

Алесь Баркоўскі *(Якуцк, Расійская Федэрацыя)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ І ЯКУЦІЯ

Творы Адама Міцкевіча, слыннага паэта з Навагрудчыны, траплялі ў Якуцію як з выгнанцамі з краю — удзельнікамі паўстанняў і рэвалюцыйнага руху, так і з чыноўнікамі — прыхільнікамі яго творчасці, што прызначаліся на службу ў далёкую Якуцію. Фелікс Кон, былы ссыльны Якуцкага краю (у 1920 г. быў сябрам Часовага рэвалюцыйнага камітэта Польшчы: у ліпені–жніўні працаваў у Беластоку, у жніўні–верасні ўзначальваў у Мінску літаратурна-выдавецкую камісію, а потым на беларускай мове выйшла яго кніга "На пасяленні ў якуцкім краі". Мн., 1932), выхадзец з варшаўскай яўрэйскай сям'і, так пісаў пра сустрэчу з былым паўстанцам 1863–1864 гг.:

"— Вы русский? — запытаў мяне лекар.

— Нет, поляк!

З паспешлівых рухаў доктара, па ўзрушэнню на яго твары я адразу пазнаў, што гэтая вестка не была яму абыякавай. А калі ён наблізіўся да мяне і калі я глянуў на яго твар, то з доўгага, пышнага, par excellence, польскага вуса, з вачэй, з усёй паставы я пазнаў у ім земляка.

— А няхай пана! Не марыў я, што тут [...] знайду земляка!

Гаворачы тое, ён падаў мне руку і пайшоў за мной да юрты, дзе ўжо весела патрэсквалі дровы ў камінку.

— Але ж тут у пана няблага, пане дабрадзею! — прамовіў ён, аглядваючы юрту, а ўбачыўшы над ложкам партрэт Касцюшкі, фамільярна дадаў:

— Не спадзяваўся, мабыць, наш герой, што дзесьці, па столькіх гадах, на якуцкай зямлі, у юрце, выява яго будзе прадметам цікаўных поглядаў якутаў...

Пасля некалькіх хвілін, паставіўшы ежу на стол, я перапыніў той прагляд. Трымаў ён менавіта ў тую хвіліну "Пана Тадэвуша".

— Як жа гэта пекна, а як праўдзіва, — звярнуўся ён да мяне, адкладваючы кніжку, і задэкламаваў:

Літва! Бацькоўскі край, ты як здароўе тое!
Не цэнім, маючы, а страцім залатое...

Ён трохі насупіўся. Вясёлы яго твар набыў выраз невыказнага смутку. Было зразумела, што ён сумаваў, сумаваў моцна, калі, можа, не па людзях, дык па мясцінах, "дзе прозеленню жыта ў полі серабрыцца, і залаціцца поўным коласам пшаніца", а можа...па магілах" [1].

Імя Адама Міцкевіча асабліва стала вядома ў Якуціі ў сувязі са стагоддзем яго смерці (1955). Рэспубліканская газета "Кыым" адвяла тады паэту цэлую старонку, дзе апрача яго кароткай біяграфіі пабачылі свет яго творы ў перакладзе на якуцкую мову С. Данілава, М. Ярымава, А. Берыяка, С. Дзяканава.

[1] W jakuckiej jurcie // Tydzień (Lwów). 1893. Nr 12.

А часопіс “Хотугу Сулус” (1955. № 6) змясціў два міцкевічаўскіх творы: “Россиятаабы доботторбор” і “Воевода” ў перакладзе Сямёна Данілава з яго ж уступным артыкулам пра жыццё і творчасць паэта. У тым жа нумары быў змешчаны верш Уладзімежа Слабодніка, польскага паэта, народжанага на Украіне, “Пушкин уонна Мицкевич”.

Да сотых угодкаў у Якуцку была таксама наладжана выстаўка яго твораў у рэспубліканскай бібліятэцы імя Аляксандра Пушкіна. Такія ж выстаўкі адбыліся і ў раённых бібліятэках Якуціі.

А ў 1956 г. у якуцкім рэспубліканскім выдавецтве асобным выданнем выйшлі выбраныя творы Адама Міцкевіча [2] з прадмовай Сафрона Данілава (укладальнік І. Федасееў), куды ўвайшлі балады, рамансы, санеты, вершы, байкі і паэма “Конрад Валенрод” у перакладах вядомых майстроў якуцкага прыгожага пісьменства І. Гогалева, М. Яфімава, С. Данілава, І. Федасеева, Л. Габышава, Д. Апросімава, Я. Парнікава, С. Дадасканава, А. Бэрыяка, С. Савіна. Пра тое, як перакладаўся Адам Міцкевіч на якуцкую мову, Сямён Данілаў потым расказаў Анджэю Банарскаму [3]. У маскоўскім часопісе “Literatura Radziecka” (1978. № 2) быў змешчаны верш таго ж Сямёна Данілава “Mickiewicz” у перакладзе А. Шыманскага.

Марына Загідуліна *(Гродна, Беларусь)*

МІЦКЕВІЧ У ІЛЮСТРАЦЫЯХ
РАМАНТЫЧНАЯ ТРАКТОЎКА МАСТАКОЎ БЕЛАРУСІ XIX ст.

Выключнасць творчай асобы Адама Міцкевіча была адзначана ўжо яго сучаснікамі. Прадстаўнік інтэлектуальнай расійскай эліты П. Вяземскі пісаў у 1825 г. у “Московском телеграфе”: “Пан Міцкевіч належыць да вузкага кола выбраных, якіх лёс ашчаслівіў правам прадстаўніцтва літаратурнай славы сваіх народаў” [1].

Польскамоўны ліцвін А. Міцкевіч прынёс славу не толькі польскаму, але і беларускаму народу. Ад першых рамантычных балад і да эпахальнага “Пана Тадэвуша” ён аддана служыў роднай Навагрудчыне:

У свеце, дзе нам доля быць судзіла,
Застаўся родны кут, свая радзіма —
Дзяцінства край!
(“Пан Тадэвуш”. Эпілог. Пер. Я. Семяжона)

[2] Мицкевич А. Тылыллабыт айымньылар. Якутскай, 1956.
[3] Daniłow S. “Czasem tłumaczę Mickiewicza...” // Kultura (Warszawa). 1976. Nr 28.
[1] У кн.: Łukasiewicz I. Mickiewicz. Wrocław, 1996. S. 57.

Пад гэтымі прасякнутымі тугой радкамі маглі б падпісацца шматлікія землякі паэта, якія не мелі магчымасці жыць у родным краі, але былі духоўна цесна звязаны з бацькаўшчынай. Сярод іх вылучаюцца мастакі, светапогляд якіх фарміраваўся храналагічна хоць і ў больш позні час, але амаль у аднолькавым грамадскім асяроддзі і быў вельмі блізкі грамадзянскай пазіцыі паэта. Некаторыя з іх сталі яркімі ілюстратарамі твораў А. Міцкевіча, змаглі пераканаўча перадаць узвышана-напружаны лад лірычнага пачуцця паэта.

Буйнай асобай сярод іх з'яўляецца Міхал Эльвіра Андрыёлі. Выхадзец з сям'і мастака-італьянца і мясцовай шляхцянкі, ён першыя 19 гадоў пражыў у Вільні. Як А. Міцкевіч і яго сябры, вучыўся тут. Старажытны асяродак беларускасці, гэты горад у 40–60-я гг. XIX ст. жыў ідэямі незалежнасці краю, а творчая моладзь услед за філаматамі ўсё больш усведамляла сябе ліцвінамі, нашчадкамі Вялікага Княства Літоўскага. І настолькі моцнай была адданасць радзіме, што М.-Э. Андрыёлі, які з'ехаў на вучобу ў Расію, Італію, вяртаецца ў 1863 г. і прымае актыўны ўдзел у паўстанні, змагаючыся ў атрадзе Л. Нарбута. Успомнім, што А. Міцкевіч таксама рваўся на радзіму ў 1831 г., у час паўстання.

М.-Э. Андрыёлі быў адным з першых, хто даў мастацка-выяўленчую інтэрпрэтацыю літаратурных вобразаў А. Міцкевіча. Творчая спадчына М.-Э. Андрыёлі дастаткова падрабязна даследавалася польскімі навукоўцамі. Сёння ж хочацца паглядзець на яе ў кантэксце духоўна-маральных сувязяў мастака і паэта, тых сувязей, якія маглі дзейнічаць толькі пры ўмове агульнасці светапогляду і асаблівага, ліцвінскага менталітэта.

Самай важнай працай сталі ілюстрацыі мастака да "Пана Тадэвуша". З 1879 па 1882 г. па заказу львоўскага кнігавыдаўца Г. Альтэнберга было выканана 18 ілюстрацый у тэхніцы дрэварыта для альбомнага выдання паэмы. Да гэтага трэба дадаць 34 застаўкі, віньеткі і ініцыялы. Ілюстрацыі з'явіліся настолькі дасканалымі, што ў 1882 г. кніга была выдадзена двойчы, пасля тэкст паэмы з малюнкамі М.-Э. Андрыёлі перавыдаваўся не раз у Польшчы, а ў 1959 г. быў надрукаваны ў Маскве.

Мастак выбраў для ілюстрацыі найбольш характэрныя, на яго думку, эпізоды літаратурнага твора. Рамантычная эстэтыка, з'яўляючыся неад'емнай рысай светаадчування інтэлігента-ліцвіна таго часу, які імкнуўся ўзвысіць і апаэтызаваць усе прявы жыцця народа, беларускай шляхты, выразна выявілася і ў паэмах, асабліва ранніх, А. Міцкевіча, і ў дрэварытах Андрыёлі.

Рамантызм мастака раскрываецца і ў ярка экспрэсіўных вобразах герояў, і ў выразным дынамізме кампазіцыі, і ў рэзкіх святлоценевых эфектах, нават у такой, здавалася б, спакойна-лірычнай сцэне, як "Канцэрт Янкеля", дзе галоўныя героі прадстаўлены ў момант, калі яны слухаюць чароўную

мелодыю. Аўтар змог паказаць уздым пачуццяў, рухаў душы кожнага з персанажаў, а таксама іх разнастайнасць. Майстэрства мастака праявілася ў тым, што вялікая група людзей (каля 30) не выглядае ні манатонна-аднастайнай, ні разрознена-раскіданай. Вылучыўшы кампазіцыйны і сэнсавы цэнтр яркім святлом, аўтар аб'ядноўвае герояў у адзіным патрыятычным парыве, які выклікае музыка цымбаліста. Варта адзначыць, што мастак вельмі ўважліва вывучаў усе рэаліі, дэталі быту, адзення, архітэктуры, якія павінны быць увасоблены ў малюнку.

У ілюстрацыях Андрыёлі да альбомнага выдання паэмы можна прыкмеціць след старажытнай традыцыі афармлення беларускай кнігі. У стылі мастака XIX ст. адчуваюцца рэмінісцэнцыі распаўсюджанага ў беларускай кніжнай мініяцюры XIII–XIVстст. так званага тэраталагічнага стылю, калі асобныя ініцыялы фантазіяй мастака ператвараліся ў жанравую кампазіцыю. А віньеткі Андрыёлі шмат чым нагадваюць застаўкі-тытулы са скарынаўскіх выданняў, дзе першадрукар шырока выкарыстоўваў сюжэтна-тэматычныя выявы. Андрыёлі ў сваіх застаўках і канцоўках таксама адлюстроўвае сцэны з жыцця насельнікаў Сапліцова ва ўзнёсла-рамантычным стылі.

М.-Э. Андрыёлі быў спачатку задаволены мастацкім узроўнем сваіх дрэварытаў да "Пана Тадэвуша". Але тагачасная публіка, якая была выхавана на традыцыях класіцызму, не магла адразу прыняць прынцыпы рамантызму ў выяўленчым мастацтве, ацаніць імклівага тэмпераменту Андрыёлі, які сваімі ілюстрацыямі падкрэсліваў і светлую лірычнасць, і драматызм дзеяння паэмы. "Пан Андрыёлі не ўмее маляваць фігуру ў спакоі, якая б стаяла, сядзела, ішла, не ўмее стварыць сцэны, якая не была б вобразам шпіталя для кранутых канвульсіямі," — піша са здзекам А. Сугетынскі [2]. Ю.-І. Крашэўскаму таксама не імпануе "неўтаймаваная энергія, недахоп класіцыстычнага спакою" [3]. Апанентам Андрыёлі больш падабаліся, напрыклад, малюнкі да "Пана Тадэвуша" выхаванца Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, прыхільніка класічных стэрэатыпаў Е. Герсана, героі якога маглі б быць з такім самым поспехам і персанажамі старажытнагрэчаскага міфа, калі б ім толькі змяніць адзенне. Тагачасныя крытыкі не змаглі ў поўная ступені адчуць, наколькі арганічна паэтычныя вобразы А. Міцкевіча былі ўвасоблены мастаком у выяўленчыя формы, ацаніць тую жывасць, паўнату пачуццяў, што захапляе сёння нас у творах М.-Э. Андрыёлі.

Так з цягам часу мастака здолелі ўпэўніць у тым, што ілюстрацыі да "Пана Тадэвуша" сталі яго творчай няўдачай — гэта было пастаянным болем яго жыцця. Ён выканаў малюнкі да пецярбургскага выдання 1883 г. "Конрада Валенрода", выбраўшы найбольш драматычныя моманты твора

[2] Prawda. 1883. N 18.
[3] Kłosy. 1882. N 60. S. 396.

— у тым ліку смерць галоўнага героя. У 1893 г. па заказу Альтэнберга ён зрабіў шэраг узвышана-рамантычных ілюстрацый да “Балад і рамансаў”, любімага паэта. Неажыццёўленай марай яго жыцця быў заказ на ілюстраванне “Дзядоў” А. Міцкевіча, паэмы, якая стала ідэйна найбольш блізкай мастаку-ліцвіну. Надзеі на гэты конт не ажыццявіліся, але да апошніх сваіх дзён ён усё ж спадзяваўся, што яны збудуцца. Захаваліся толькі асобныя ілюстрацыі да гэтай паэмы, надрукаваныя ў перыядычных выданнях. Некаторыя з іх былі сабраны ў вялікім альбоме “Гераіні польскай паэзіі”. Увагу чытача прыцягвалі драматычныя і чароўныя постаці Зосі і Марылі з “Дзядоў”, а таксама трагічная і верная Альдона з “Конрада Валенрода”. Немагчыма не ўспомніць і яркія вобразы малюнка Андрыёлі да балады “Голена-стрыжана”, пазначаныя неўласцівай для аўтара знішчальнай іроніяй.

Сёння мастацкая спадчына М.-Э. Андрыёлі высока ацэнена даследчыкамі. Пачэснае месца займаюць у ёй ілюстрацыі да твораў А. Міцкевіча.

Землякамі паэта, што нарадзіліся, хоць з адлегласцю ў некалькі дзесяцігоддзяў, таксама ў Прынёманскім краі, былі мастакі Вікенцій Дмахоўскі і Казімір Альхімовіч. Выраслі яны ў аднолькавым сацыяльным і этнаграфічным асяроддзі, а прагрэсіўная грамадкасць Вільні ў час вучобы аказала рашаючы ўплыў на фарміраванне іх светапогляду. В. Дмахоўскі прымаў удзел у паўстанні 1831 г., а К. Альхімовіч — у паўстанні 1863 г.

Як і А. Міцкевіч, выхадцы з сем’яў “краёвай” дробнай шляхты, яны ўсё жыццё заставаліся вернымі ўспамінам дзяцінства, ідэалам юнацтва, вызначаючыся адметным “ліцвінскім” светаўспрыманнем. Эстэтычная канцэпцыя паэта не магла не быць вельмі блізкай гэтым мастакам, таму кожны з іх зрабіў шэраг ілюстрацый да лірыкі А. Міцкевіча.

В. Дмахоўскі, які быў здольны тонка адчуць прыгажосць звычайнага кутка роднага наваколля, напісаў некалькі жанравых пейзажаў да “Пана Тадэвуша”, а таксама стварыў шматлікія выявы тых мясцін, што былі звязаны з жыццём і сюжэтамі твораў паэта.

Больш вядомымі сучаснікам сталі работы К. Альхімовіча. На выстаўцы 1898 г., прысвечанай стагоддзю з дня нараджэння А. Міцкевіча, у Таварыстве сяброў прыгожых мастацтваў у Варшаве вялікі поспех мелі 12 ілюстрацый да “Пана Тадэвуша”. У сваёй серыі аўтар узнёсла апавядае пра дарагія сэрцу мясціны, пераканаўча перадае атмасферу ўтульнай шляхецкай сядзібы, уважліва ўглядаецца ў твары родных па духу герояў са складанымі ці шчаслівымі лёсамі, якія шчыра жадаюць бачыць вольнай сваю радзіму.

К. Альхімовіч захапляецца адной з самых слаўных постацей — ксяндзом Робакам і прысвячае яму некалькі сюжэтных твораў. Адзін з іх — “Над магілай Робака (Яцка Сапліцы)”. Ксёндз — любімы персанаж А. Міцкевіча, носьбіт разваг і думак пра свет і грамадства, да якіх прыйшоў паэт у

пэўны перыяд свайго жыцця. Гэты вобраз быў цікавы і К. Альхімовічу сваёй менавіта не польскай, а ліцвінскай, мясцовай, тутэйшай арыентацыяй. Каб падкрэсліць складанасць і неадназначнасць вобраза Яцка Сапліцы, мастак знаходзіць своеасаблівы прыём: не паказвае нам самога ксяндза, а толькі тых людзей, што ведалі яго пры жыцці і прыйшлі аддаць яму апошнюю даніну. У цэнтры кампазіцыі выдзяляецца сваёй экспрэсіяй фігура маршалка павета, які гаворыць над магілай палымяную прамову і ў знак заслуг ксяндза Робака вешае на помнік узнагароду — Ганаровы крыж легіёна.

У параўнанні з выразна дынамічнымі малюнкамі М.-Э. Андрыёлі ілюстрацыі К. Альхімовіча выглядаюць больш спакойна і эпічна, але па-свойму дакладна перадаюць характэрны мясцовы каларыт паэмы.

Рамантычныя раннія балады А. Міцкевіча былі заснаваны на народных песнях і паданнях Навагрудчыны, іх міфалагічны пачатак, дапоўнены вытанчана-інтэлектуальнай гульнёй фантазіі пісьменніка, надзвычай імпанаваў мастакоўскаму ўяўленню К. Альхімовіча. Ён зрабіў адну з самых лірычных работ — "Свіцязянку", якая не проста ілюструе аднайменную баладу А. Міцкевіча, а з высокім эмацыянальным напружаннем перадае самую кульмінацыю ў развіцці паэтычнага сюжэта. Тут паказаны пераломны момант у лёсе хлопца-паляўнічага, які, заварожаны прыгажуняй-свіцязянкай, ідзе ўсё далей у хвалі возера. Успеньваюцца звычайна спакойныя воды Свіцязі, шуміць і хвалюецца прыбярэжны лес. Прырода як быццам хоча папярэдзіць маладога хлопца, што не знойдзе ён тут шчасця і спакою. Рамантычным дысанансам успрымаецца дасканалае цела свіцязянкі з рухомым, бурлівым светам навокал.

Звыклае народнае паданне пра прыгажуню-русалку ўзнята талентам А. Міцкевіча на ступень высокай паэзіі, а талентам мастака прадстаўлена ў рамантычна-запамінальных вобразах. У 1898 г. на штогадовым ананімным конкурсе часопіса "Tygodnik Ilustrowany" на лепшы сучасны мастацкі твор першую ўзнагароду атрымаў К. Альхімовіч за сваю працу "Свіцязянка" [4].

Сярод шматлікіх ілюстратараў твораў А. Міцкевіча можна вылучыць шэраг беларускіх мастакоў XIX ст., якія сваімі працамі ўнеслі ўклад у выяўленчую трактоўку лірыкі паэта. Але творы гэтых мастакоў па розных прычынах не з'явіліся значнымі здабыткамі ў гісторыі мастацтва.

Ілюстратарам першага выдання (1828) паэмы "Конрад Валенрод" стаў выхаванец кафедры жывапісу Віленскага універсітэта Вінцэнт Смакоўскі. Вучань Я. Рустэма, ён не змог выйсці за рамкі традыйных акадэмічных шаблонаў. Таму яго графічныя аркушы, добра прапрацаваныя, выглядаюць усё ж сухавата-статычнымі, падпарадкаванымі класіцыстычнай схеме, што ўнутрана не адпавядае стылістыцы гераічных вобразаў паэмы.

[4] Tygodnik Ilustrowany.1898 (I). S. 65.

Да творчасці А. Міцкевіча звяртаўся і ўраджэнец Гродна, удзельнік паўстання 1831 г. і руска-персідскіх войнаў Януарый Сухадольскі. На жаль, няшмат звестак захавалася пра яго ілюстрацыі да вершаў паэта-земляка. Майстар вялікіх тэматычных палотнаў, вядомы як мастацкі хранолаг ваенных дзеянняў рускай арміі на Усходзе, ён выбірае з паэзіі А. Міцкевіча блізкі яму па духу вобраз баладнага Фарыса — адважнага конніка-бедуіна, які ляціць ўдалячынь праз бязмежжа пустыні. Мастак, добра знаёмы з характарам і побытам людзей Усходу, захапляецца разам з паэтам і імклівым рухам каня, і экзатычнай фігурай воіна.

Творчасць А. Міцкевіча, цесна звязаная з беларускай зямлёй, бытам, культурай, гістарычнымі традыцыямі, знайшла яркае ўвасабленне ў графічных аркушах і жывапісных палотнах мастакоў беларускага паходжання са своеасаблівым "ліцвінскім" менталітэтам. У іх светапоглядзе, ідэалах было шмат агульнага. З рамантычным уздымам кожны з творцаў уласцівымі толькі яму мастацкімі сродкамі паэтызаваў гісторыю і міфы старажытнай Літвы, высакародную ахвярнасць удзельнікаў вызваленчага руху, непаўторную прывабнасць народнага тыпажу. Таму кожны па-рознаму, але арганічна і непасрэдна ўваходзіць у паэтычную канву літаратурных твораў, даючы магчымасць і чытачу, і гледачу ўзбагаціцца духоўна.

Кацярына Шасцілоўская *(Мінск)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ І СТАНІСЛАЎ МАНЮШКА ЯК ПРАДСТАЎНІКІ СЛАВЯНСКАГА РАМАНТЫЗМУ

Сёння агульнавядомай з'яўляецца асноватворчая роля Адама Міцкевіча ў развіцці польскага літаратурнага рамантызму і беларускай плыні ў ім. У выніку ж пашырэння і паглыблення сучасных ведаў аб культурна-мастацкай мінуўшчыне беларускага краю можна таксама рабіць вывады аб тым, што эстэтыка і мастацкі метад творчасці Адама Міцкевіча спрыялі нараджэнню і станаўленню мясцовага музычнага рамантызму, які ў існуючых тады ўмовах, на жаль, не змог расквітнець, дасягнуць вяршынь. Як без паэзіі Міцкевіча немагчыма ўявіць сабе музыку Шапэна, так без міцкевічаўскіх балад, санетаў, "Дзядоў", "Пана Тадэвуша" не набрала б моцы і нацыянальнай самабытнасці творчасць другога польскага класіка, кампазітара, ураджэнца беларускай зямлі — Станіслава Манюшкі.

Жыццёвыя шляхі Міцкевіча і Манюшкі ніколі не перасякаліся. Нават невядома, ці чуў Міцкевіч калі-небудзь музыку Манюшкі і, наогул, ці ведаў пра яго існаванне. Нарадзіўшыся ў 1819 г., Манюшка належаў да больш маладога пакалення творцаў, выхаваных на паэзіі Міцкевіча, хоць у час, калі

паэт скончыў свой жыццёвы шлях, кампазітар дасягнуў ужо творчай сталасці. Сярод яго наймацнейшых юнацкіх уражанняў — знаёмства з вершамі маладога Міцкевіча і асабліва з яго “Панам Тадэвушам”. Невыпадкова першыя песні, выдадзеныя ў часы вучобы Манюшкі ў Берліне, былі напісаны на вершы вялікага польскага паэта. Да яго тэкстаў кампазітар звяртаўся на працягу ўсяго жыцця, часам адыходзячы ў пошуках іншых крыніц, але заўсёды вяртаючыся. Больш за 20 песень, якія ўвайшлі ў “Хатнія спеўнікі”, кантаты “Прывіды” і “Крымскія санеты”, балада для хору, салістаў і аркестра “Пані Твардоўская” — вось няпоўны пералік твораў Манюшкі на міцкевічаўскія тэксты. Існуе таксама думка аб тым, што адна з лепшых опер кампазітара “Страшны двор” прасякнута вобразнасцю і эстэтыкай “Пана Тадэвуша” (І. Бэлза).

Але не толькі такія, відавочныя факты сведчаць аб уплыве творчасці Міцкевіча на кампазітарскую індывідуальнасць Манюшкі. Уздзеянне закранула самыя глыбіні мастацкай натуры кампазітара ў час яе фарміравання і праяўлялася на працягу ўсёй творчасці шматузроўнева і рознабакова.

Пільны погляд на шляхі кожнага з творцаў дае магчымасць заўважыць у іх шмат агульнага. Іх абодвух узгадавала беларуская зямля. Прыгажосць яе краявідаў і старадаўняя самабытная культура адыгралі вельмі важную ролю ў станаўленні паэта і кампазітара.

Чытаючы ў парыжскім Калеж дэ Франс курс лекцый пра славянскія літаратуры, Міцкевіч вельмі высока ацэньваў беларускую культуру і мову. Ён адзначаў, што “з усіх славянскіх народаў беларусы, гэта значыць сяляне Пінскай, часткова Мінскай і Гродзенскай губерняў, захавалі найбольш агульнаславянскіх рысаў… У іх казках і песнях ёсць усё… Іх мова адна з найбольш мілагучных…” Выдзяляючы ў славянскай мове дзяржавы Пятра Вялікага тры гутаркі — маскоўска-рускую (паўночную), маларускую (паўдзённую) і беларускую (заходнюю), — Міцкевіч падкрэсліваў, што “заходняя, найбагацейшая, найчысцейшая, што была некалі моваю двара і канцылярыі вялікіх князей Літвы, выяўляла першараднае ўдасканаленне…”. І ён у сваёй творчасці не раз прынікаў да чыстай крыніцы гэтай мовы і культуры, чэрпаючы з яе складаючыя элементы сваёй непаўторнай паэтыкі. Міцкевічаўская польская мова настолькі самабытная, напоўненая беларусізмамі, што нават у свой час стала пэўнай перашкодай для ўспрыяцця яго паэзіі этнічнымі палякамі і выклікала вялікае незадавальненне варшаўскай літаратурнай крытыкі.

Беларускі светапогляд і вера ў сувязі зямнога жыцця з замагільным светам яскрава праявіліся ў схільнасці Міцкевіча да містыцызму. Паэт быў ўсё жыццё глыбока захоплены беларускай народнай фантастыкай, якая складалася з вераванняў пра тапельніц, русалак-свіцязянак, нячысцікаў, духаў. Менавіта з гэтага мастацкага матэрыялу выросла міцкевічаўская рамантыч-

ная балада. На гэтым падмурку мацуецца вобразны змест драматычнай паэмы “Дзяды”.

Што тычыцца паэтычных пейзажаў у творах Міцкевіча, то большасць з іх маюць правобразамі краявіды роднай для паэта Навагрудчыны. А ў паэме “Пан Тадэвуш” знайшлі месца і элементы беларускай бытавой культуры.

З ранніх дзіцячых гадоў пранікся харaством беларускай зямлі і Станіслаў Манюшка. Ён нарадзіўся ў фальварку Убель пад Мінскам і ў дзяцінстве з задавальненнем слухаў мясцовыя сялянскія песні, а часам і сам прымаў удзел у вясковых святах, вячорках, прысутнічаў на вяселлях і хаўтурах. Цяжка пераацаніць значэнне ранніх стасункаў будучага кампазітара з беларускім фальклорам. Гэта крыніца разам з польскімі песнямі, якія часта спявала маці, спарадзіла непаўторную самабытнасць творчасці Манюшкі. У юнацкія гады на гэту аснову наклаліся ўражанні ад еўрапейскага прафесійнага музыкальнага мастацтва. Вывучэнне яго прынцыпаў і заканамернасцей пад кіраўніцтвам прафесара Рунгенхагена ў Берліне дадало творчасці маладога кампазітара майстэрства і дасканаласці, але не здолела змяніць нацыянальнай сутнасці яго мастацкай індывідуальнасці.

Знаёмства з паэзіяй А. Міцкевіча яшчэ ў дзіцячыя гады адыграла вызначальную ролю ў станаўленні Манюшкі-кампазітара. Праз прызму творчасці вялікага майстра слова ён працягваў засвойваць фальклорную вобразнасць. Творы Міцкевіча сталі для яго высокімі ўзорамі мастацкай працы з гэтым найбагацейшым матэрыялам, будавання на яго аснове рамантычных твораў.

Праз паэзію Міцкевіча прыйшлі ў творчасць Манюшкі вобразы народных паданняў і казак. Яны леглі ў аснову музычных балад кампазітара: фантастычных “Свіцязянкі” і “Рыбкі”, драматычных “Засады”, “Вяртання бацькі”, “Песні з вежы”, лірычнай “Вілії” і самай буйной з усіх — “Пані Твардоўскай”.

Старажытная народная абраднасць музычна ўвасоблена кампазітарам у кантаце “Прывіды” па міцкевічаўскіх “Дзядах”. Народнай вобразнасцю прасякнуты і самыя значныя з оперных твораў Манюшкі — “Галька”, у якой распрацоўваецца сюжэтна-вобразны строй усё тых жа “Свіцязянкі”, “Рыбкі”, “Страшнага двара”.

Фальклорная першааснова тэкстаў Міцкевіча, якія прывабілі кампазітара, праяўляецца таксама ў выкарыстанні тыповых паэтычных прыёмаў, самы яскравы з якіх — прыём псіхалагічнага паралелізму, найхарактэрнейшы для беларускай народнай песнятворчасці. Параўноўванне чалавека, падзей яго жыцця са з’явамі акаляючай прыроды сустракаецца ў беларускіх народных песнях самых старажытных пластоў. Гэты прыём па-майстэрску выкарыстаны ў міцкевічаўскай “Вілії”, дзе прыгожая беларуская рака параўноўваецца з “пекнай ліцвінкай”, а Нёману надаецца роля каханага ёю малайца.

Рознабаковае ўздзеянне беларускага музычнага фальклору яскрава адбілася на песеннай творчасці Манюшкі. Ці не ў першую чаргу гэта тычыцца агульнага вобразна-эмацыянальнага строю яго твораў, які, пры ўсім багацці складаючых адценняў, насычаны мяккай стрыманай лірычнасцю, што так выдзяляе менавіта беларускую народную музыку ў сям'і славянскіх музычных культур. Лірычнасць такога кшталту непарыўна звязана з нетаропкай апавядальнасцю, карані якой ляжаць яшчэ ў імправізацыйнай творчасці вясковых лірнікаў. Так, крок за крокам, разгортваюцца перад слухачом трагічныя гісторыі "Свіцязянкі" і "Рыбкі", драматычныя сцэны "Вяртання бацькі" і "Засады".

Сувязі з беларускім фальклорам выразна адчуваюцца і ў лада-меладыйнай структуры песень Манюшкі. Найбольш яркімі ў гэтых адносінах з'яўляюцца песні, звязаныя з тэмай трагічнага лёсу дзявочага кахання ("Рыбка", "Песня з вежы"), а таксама з адушаўлёнымі вобразамі беларускай прыроды ("Да Нёмана", "Вілія").

Параўнанне эстэтычных поглядаў, стылістыкі, творчых метадаў Міцкевіча і Манюшкі прыводзіць да высновы, што яны, прадстаўнікі розных па сутнасці сфер мастацтва, былі вельмі блізкія па прыродзе свайго мастацкага мыслення. Асноўнае, што збліжае іх творчасць — гэта разуменне мастацтва як сінтэзу розных яго відаў. Як Міцкевіч не ўяўляў свайго паэтычнага слова без музыкі, так Манюшка ў кампазітарскай творчасці ўвесь час абапіраўся на літаратуру і паэзію.

У згаданых вышэй лекцыях аб славянскіх літаратурах Міцкевіч недвухсэнсоўна выказаўся аб музычнай прыродзе лірычнай паэзіі: "Што ж ёсць паэзія лірычная без музыкі? Чаго вартыя тыя паэты, якія, нібы спяваючы, не толькі не складаюць музыкі да сваіх песень, але ўвогуле не чуюць яе ў сабе? Музыка ў творах лірычных, гэта … галоўная, істотная частка паэзіі, яна з'яўляецца яе душой, жыццём, светам". Як сапраўдны прадстаўнік рамантычнага мастацтва Міцкевіч бачыць крыніцу гэтай музыкі ў фальклоры, асабліва славянскім. "Люд славянскі валодае вялікім скарбам гэтых матываў, яшчэ не вядомых кампазітарам і не ўжытых імі…"

Прынцып непарыўнасці музыкі і паэзіі быў адным з вядучых і ў творчасці Міцкевіча. Больш таго, ён неаднойчы выказваў намер напісаць музыку да сваіх вершаў і да твораў іншых паэтаў. У лісце да Ю.-Б. Залескага ад 7 студзеня 1840 г. Міцкевіч, высока ацэньваючы яго песню "Nuze", піша: "Я часта напяваю яе і маю намер калі-небудзь напісаць да яе музыку. Зразумела, калі ў мяне будуць грошы і я кіну літаратуру і кнігі, асяду ў вёсцы і буду ствараць музыку. Намер даўнейшы".

З маладых гадоў Міцкевіч меў даволі грунтоўныя веды аб розных музычных жанрах і формах, асабліва вакальных і сцэнічных. Яшчэ ў 1819 г. ім была дадзена рэцэнзія на тэкст камічнай оперы "Малгажата з Зэмбаці-

на”, напісаны Я. Чачотам, дзе былі названыя жанры італьянскіх opera-seria і opera-buffa, дадзена характарыстыка розных оперных форм (рэчытатыва, арыі, ансамбля).

Шматлікія паэтычныя мініяцюры Міцкевіча напісаны ў жанры песні: “Песня з вежы”, “Песня аб Віліі”, “Песня Адама”, “Песня пустэльніка” і інш. Той жа жанр пакладзены ў аснову драматургіі паэмы “Конрад Валенрод”.

Вядома, што паэт марыў аб стварэнні польскай нацыянальнай оперы. Рысы опернай драматургіі характэрны для некаторых яго вялікіх паэтычных палотнаў. Асаблівае месца ў гэтым сэнсе, як і ў многіх іншых, займае драматычная паэма “Дзяды”, якая з’яўляецца высокім узорам рамантычнага сінтэзу мастацтваў. Таму натуральным было неаднаразовае звяртанне да паэмы кампазітараў розных часоў і нацыянальнасцей. І ў першую чаргу — С. Манюшкі, які напісаў шэраг вакальных мініяцюр на тэксты ўрыўкаў з “Дзядоў” (Дуэціна, “Зося”, “Песня пустэльніка”). На аснове паэмы пабудаваны вобразна-эмацыянальны строй кантаты “Прывіды”.

Для Манюшкі таксама была характэрна сінтэтычнасць творчага мыслення. Ён належаў да тых кампазітараў, сутнасць метаду якіх ляжыць ва ўзаемадапаўняльным спалучэнні паэзіі, драмы і музыкі. Нават яго інструментальныя творы носяць праграмны характар, літаратурны падтэкст. Асабліва гэта тычыцца аднаго з самых значных сімфанічных твораў кампазітара — уверцюры “Байка”, прысвечанай яго рускаму сябру А. Даргамыжскаму. Існуе думка, што літаратурнай першаасновай твора стаў “Шляхціц Завальня…” Я. Баршчэўскага.

Што да вакальнай мініяцюры і музычна-драматычных жанраў, то іх перавага ў творчай спадчыне Манюшкі шырокавядомая. Тэатральнасць яго мыслення праяўлялася з першых крокаў творчага шляху. З юнацкіх гадоў кампазітар выношваў думку аб стварэнні оперы. Ажыццяўленне яе адбылося, калі Манюшка ўжо дасягнуў сталасці. Але ўзнікненне партытуры “Галькі” стала заканамерным вынікам папярэдняй кампазітарскай дзейнасці. Невялікія музычна-драматычныя творы (“аперэты”) і вакальныя мініяцюры сталі тым матэрыялам, на якім Манюшка спасцігаў і адшліфоўваў майстэрства будавання опернай драматургіі і формы.

Значную ролю ў гэтым працэсе адыгралі музычныя балады кампазітара на міцкевічаўскія тэксты. Кожная з іх уяўляе сабой сапраўдную разгорнутую оперную сцэну з характэрнымі для яе свабоднай формай, скразным развіццём, чаргаваннем эпізодаў арыёзнага і рэчытатыўнага складаў. Асабліва гэта тычыцца балады “Рыбка”, у якой кампазітар, следам за паэтам, у сканцэнтраваным выглядзе перадае цэлую драму, якая пазней ляжа ў аснову вялікіх оперных палотнаў — “Галькі” самога Манюшкі і “Русалкі” Даргамыжскага.

Адзначаючы невычарпальнасць тэмы сувязей паміж эстэтыкай і творчасцю двух вялікіх прадстаўнікоў рамантычнага мастацтва, неабходна падкрэсліць галоўнае: Міцкевіч стаўся пачынальнікам і вяршыняй славянскага рамантызму, спарадзіўшы вялікую хвалю новай літаратуры, якая чэрпала сваю моц у крыніцы славянскага фальклору, у тым ліку і беларускага. Сваёй творчасцю ён выхаваў цэлую плеяду паслядоўнікаў у польскай літаратуры і маладым беларускім прыгожым пісьменстве. Манюшка ж, таксама ўзросшы на эстэтыцы Міцкевіча і на фальклоры беларускай зямлі, сілай свайго таленту адкрыў новы напрамак у іншай мастацкай сферы, такой блізкай паэту, у прафесійнай музыцы беларускага краю. Уся яго музыкальная спадчына, створаная ў тым ліку і ў апошні, варшаўскі перыяд жыцця, сваім узнікненнем у вельмі значнай ступені абавязана жыватворчай глебе найбагацейшай беларускай фальклорнай культуры, так жа, як і паэтычная спадчына Адама Міцкевіча.

Эльжбета Смулкова *(Варшава – Беласток)*

БЕЛАРУСКІЯ ЭЛЕМЕНТЫ Ў ТВОРЧАСЦІ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Назва канферэнцыі “Адам Міцкевіч і нацыянальныя культуры” стварае магчымасць дваякага падыходу да тэмы. Па-першае, з пункту гледжання сучаснасці і таго, як успрымаецца творчасць паэта рознымі нацыянальнымі культурамі. Па-другое, з пункту гледжання гістарычных умоў, у якіх жыў і тварыў паэт, і патрэбы роздуму над тым, як уплывалі на Міцкевіча, на яго паэзію і светапогляд тыя культуры, з якімі ён сутыкаўся непасрэдна, сярод якіх ён жыў: польская, беларуская, літоўская, руская, французская, а таксама яго эдукацыя ў класічнай філалогіі.

Калі выберам другі падыход, то трэба падумаць над пытаннем: тэрмін “нацыянальныя культуры” ці адэкватны ў адносінах да часу і месца нараджэння і ранняй маладосці Міцкевіча, гэта значыць, да ўсіх тых фактараў, якія сфарміравалі яго тоеснасць: з аднаго боку, пачуццё моцнай сувязі з “малой радзімай” — Літвой, але і самавыяўленая польская нацыянальная свядомасць, сувязь з ідэалагічнай і палітычнай айчынай, у той час у значнай ступені страчанай (раздзел Рэчы Паспалітай); польская мова, каталіцызм і ўся шматэтнічная атмасфера, у якой ён узрастаў.

Даследуючы феномен А. Міцкевіча, нельга без агаворак выкарыстоўваць сённяшнія паняцці, звязаныя з дзяржаўнасцю і нацыянальнай прыналежнасцю. Неабходна памятаць, што 200 гадоў назад словы “беларус”, “ліцвін”, “паляк” мелі крыху іншае значэнне, чым сёння. Адным словам, трэба вярнуцца да ведаў пра Вялікае Княства Літоўскае і Рэч Паспалітую

многіх народаў і змясціць паэта ў грамадска-палітычную і культурную атмасферу таго часу.

Прызнаюся, што на канферэнцыі, якая праходзіць у Беларусі і прадастаўляе магчымасць наведаць родныя мясціны паэта, другі з названых аспектаў даследавання цікавіць мяне найбольш. Такім чынам, нагадаю хоць некаторыя прыклады ўздзеяння беларускай народнай культуры на А. Міцкевіча і яго творчасць у двух аспектах: а) фальклорнай, сюжэтнай і б) чыста моўнай. І тут на самым пачатку ўзнікаюць цяжкасці, якія мы не заўсёды ўсведамляем.

Адносна лёгка назваць беларускія элементы ў мове Міцкевіча, і гэта ў нейкай меры ўжо зроблена [1]. Ці разглядаць беларускасць народных матываў у баладах і рамансах або абраднасць у II частцы "Дзядоў", што таксама ўжо мае сваю багатую літаратуру [2]. Значна цяжэй даказаць, ці чэрпаў аўтар і тое, і другое непасрэдна з мясцовых беларускіх і літоўскіх дыялектаў, ці гэта так моцна была прасякнута беларускімі элементамі тагачасная польская мова і ўсё дробнашляхецкае асяроддзе Навагрудчыны, у якім знаходзіўся малады паэт, у тым ліку будучы ўжо студэнтам Віленскага універсітэта.

Гістарычныя веды пра Вялікае Княства Літоўскае і Рэч Паспалітую многіх народаў, знаёмства з польскай мовай той эпохі, а таксама з развіццём беларускай мовы, са старой і навейшай мемуарнай літаратурай, а таксама, не ўтойваю, пэўная рэтраспекцыя актуальных вынікаў этналінгвістычных даследаванняў, якія праводзіліся на беларуска-літоўска-польскім этнічна-культурным памежжы, садзейнічалі майму перакананню аб узнікненні, ва ўмовах узаемаўплываў, дастаткова аднароднай спецыфічнай польскай рэгіянальнай культуры, якая адрознівалася больш па сацыяльных (саслоўных), чым па нацыянальных прыкметах і якая была ўзбагачана беларускай і літоўскай культурамі.

Адначасова на той жа падставе не патрабуе доказаў, што вясковае насельніцтва, з якім польскамоўная шляхта сутыкалася кожны дзень, размаўляла па-беларуску, і што Міцкевіч павінен быў самае меншае разумець гэтую мову, калі не размаўляць на ёй. Гэта пацвярджаюць архіўныя матэрыялы Таварыства філаматаў, якія сведчаць аб тым, што "філаматы ў многіх выпадках актыўна валодалі беларускай мовай" [3]. Гэта вынікала як са штодзённых зносін на беларускай мове, напрыклад, у Чачота і Зана, так і з сацыяльнай праграмы філаматаў, згодна з якой існавала неабходнасць праграмнага знаёмства з народнымі звычаямі і мовай, а таксама дзейнасць на

[1] Stankiewicz S. Pierwiastki białoruskie w polskiej poezji romantycznej. Wilno, 1936; Turska H. Prowincjonalizmy językowe w "Panu Tadeuszu" // Wybór pism (1945–1962). Toruń, 1984. S. 21-37.

[2] Напр.: Pigoń S. Formowanie "Dziadów" części drugiej: Rekonstrukcja genetyczna. Warszawa, 1967.

[3] Kawyn-Kurzowa Z. Język Filomatów i Filaretów // Słowotwórstwo i słownictwo. Wrocław; Warszawa; Kraków, 1963. S. 14.

карысць развіцця асветы, вынікам чаго павінна было стаць развіццё сельскай гаспадаркі. Варта прыгадаць тут творы Яна Чачота на беларускай мове, пісаныя з нагоды розных святкаванняў, якія папярэднічалі яго вядомаму выданню "Сялянскіх песенек з-над Нёмна і Дзвіны" (цыт. па: Kawyn-Kurzowa Z. Język Filomatów i Filaretów. S. 15): песенька на імяніны Хлявінскага "Да пакіньце ж горла драць…" ці Яжоўскага "Лісічка жоўты грыбок…" (А. Лойка ў артыкуле "Адам Міцкевіч і беларускі фальклор" [4] цытуе страфу гэтай песні як прысвечаную Міцкевічу), а што асабліва важна для нашай тэмы, песня на прыезд А. Міцкевіча, якая пачынаецца словамі "Едзе міленькі Адам…" [5].

Не падлягае сумненню, што Міцкевіч выхоўваўся пад уплывам беларускай культуры. Давайце паспрабуем вельмі коратка, не вычэрпваючы тэмы, адказаць на пытанне, як гэта адлюстравалася ў яго творчасці і ў мове паасобных твораў.

Калі разглядаць мову, то неабходна засяродзіць нашу ўвагу на трох момантах.

Па-першае, на значным адрозненні паміж размоўнай мовай паэта, насычанай рэгіяналізмамі да канца яго жыцця, і мастацкай, афіцыйнай, мовай, над якой Міцкевіч свядома шмат працаваў і якую давёў да мастацкай дасканаласці.

Па-другое, на тое, што, гаворачы пра беларусізмы і іх крыніцы ў мове Міцкевіча, неабходна ўлічваць іх ранейшае пранікненне ў паўночна-ўсходнюю польскую мову. Мову, у якой захавалася шмат архаізмаў згодна з прынцыпам перыферыйнасці, але і пад уплывам беларускіх мясцовых дыялектаў, дзе захаваліся некаторыя вядомыя старапольскай мове выразы да сённяшняга дня (напр., труна). У сувязі з гэтым нельга даследаваць мову Міцкевіча, калі абстрагавацца ад агульнапольскай мовы, эпохі і мовы іншых творцаў таго рэгіёна. Нялішнім будзе паўтарыць услед за Галінай Турскай [6] і іншымі даследчыкамі мовы Міцкевіча, што нягледзячы на свядомую працу па ўдасканаленню і уніфікацыі польскай мовы перад пагрозай яе распаду ў перыяд падзелаў Рэчы Паспалітай польская мова родных мясцін паэта была своеасаблівай у сувязі з яе генетычнай і эвалюцыйнай адрознасцю. Польская мова была тут прышчэплена як гатовае ўтварэнне сярод іншамоўнага насельніцтва, а гэта значыць сярод людзей, якія маюць іншыя, не польскія, моўныя навыкі. У выніку гэтага "літоўская" польская мова ўспрыняла цэлы шэраг рускіх (беларускіх) і літоўскіх элементаў.

Па-трэцяе, трэба паспрабаваць акрэсліць мастацкія (стылістычныя) функцыі міцкевічаўскіх рэгіяналізмаў і аддзяліць іх ад таго, што незаўважальна трапляла ў яго творы як натуральны кампанент мовы.

---

[4] Гл.: Адам Міцкевіч і Беларусь. Мн., 1997. С. 120.

[5] Тэкст песні "Едзе міленькі Адам…" гл.: Адам Міцкевіч і Беларусь. С. 212.

[6] Język Adama Mickiewicza. Skrypt. Maszynopis Instytutu Języka Polskiego UW. S. 43.

Добрым матэрыялам для дэманстрацыі адрозненняў паміж прыватнай і афіцыйнай мовай паэта з'яўляецца яго карэспандэнцыя [7]. У прагледжаных афіцыйных тэкстах і лістах, напісаных да вышэйстаячых асоб, рэгіяналізмаў, якія з'явіліся пад беларускім ці літоўскім уплывам, я не заўважыла. У лістах да сяброў іх вельмі шмат, у тым ліку рускіх канцылярызмаў, і то на розных узроўнях мовы.

Прыклады з лістоў да Чачота (1818–1819 г.). Сам зварот да яго: Janko! (бел. Янка! польск. Janku!); шматлікія прыклады ўжывання неэнклітычных форм займенніка: …a zwłaszcza, że najmilsze *mnie* osoby nie tylko powątpiewają o przyjacielu; Przyślij *mnie* Świteź i inne Twoje nowe rymy; Zrób *mnie* uwagi szczere nad tym szpargalikiem. Шмат падобных прыкладаў таксама ў лістах да іншых, напрыклад, да Юзафа Яжоўскага, дзе, напрыклад: Wierz *mnie*, Józefie, як выключэнне — скарочаная форма *mi*, …bo *mi* czas został do pisania krótki.

Адсутнасць пачатковага *n-* у злучэннях асабовых займенніка з прыназоўнікамі накшталт *z im* і сінтаксічная спецыфіка іх ужывання, напрыклад: Zacząłem płakać… upewniać, że mnie to kosztuje więcej niżeli *jej samej*; …czy *zdrów ty* i czy nie ma dotąd żadnej nadziei, żebyś… (с. 563).

Словаўтваральныя і лексічныя: Odpowiedziała, że nie ma czym *przeparć* mojej niewierności; Nie *winuję* go o to (с. 199); …*szkoduję*, żem temu zacnemu poecie nie posłał moich dziełek (да Адынца. С. 285*);* Zostałem *jeden* (бел. адзін, польск. sam) — у пісьме да Петрашкевіча ад 8(18) лютага 1821 г.; …аż дотąд jeden tylko od ciebie był *listek*, spodziewam się, że wkrótce *listek* otrzymam (да Т. Зана. С. 290–291); Pytają za com *nudny*? (аб чым нуджуся? Да Чачота); Dziwno mi, że nie odebrałeś prośby mojej o *przewłokę odpusku*, którą Franciszek, nie wiem po co, nie wprost do kancelarii, ale na Twoje ręce posłał (да Данкевіча. С. 419*);* Odebrałem *ukaz*, abym książki odesłał… *Ukaz* ten mocno mnie dotknął (да Малевіча*);* Historia u mnie *zawalana* (бел. завалена, польск. zarzucona), …czeka okazji, wkrótce mu ją poślę (да Яжоўскага); часта паўтараюцца выразы pasport, podorożne, odkrycie (у значэнні адкрыццё, пол. *otwarcie*) і г. д.

Асаблівай увагі заслугоўваюць яшчэ два прыклады з прыватнай карэспандэнцыі. Wszystkim *busi* замест *buzi* ў лісце да Яжоўскага (с. 71) і рэдкае ў Міцкевіча, выразна ўжо звязанае з літоўскім уплывам, змешванне родавых канчаткаў у 2 асобе мінулага часу ў карэспандэнцыі з Марыляй Путкамер, напрыклад: "Jak brzydki i krzywdzący dałeś słowom moim wykład*",* — піша Адам да Марылі (с. 200–201).

Занатаваныя ў Міцкевіча правінцыялізмы ў пераважнай большасці выступаюць у польскай мове, якую ўжывае мясцовае насельніцтва Паўднёва-Усходняй Літвы і Паўночна-Заходняй Беларусі. Глухое вымаўленне *z* у слове

[7] Прыклады ўзяты па выд.: Czytelnik. Warszawa, 1955. Cz. I. 1817–1831.

busi, якое ў дадзены момант нават не магу інтэрпрэтаваць, мае надзвычай шырокую тэрыторыю, напрыклад, на Беласточчыне *daj pani busi* (да дзіцяці). Змешванне родавых канчаткаў, вядомае па літаратуры [8], я асабіста натавала ў 1997 г. у паўднёвай частцы Свянцянскага раёна.

Пераходзячы ад прыватнай карэспандэнцыі з сябрамі да літаратурных тэкстаў А. Міцкевіча, трэба сказаць, што яны ў аспекце правінцыялізмаў надзвычай розныя, а кампетэнтнае вызначэнне дыяпазону рэгіяналізмаў, што трывала выступаюць у мове паэта, патрабавала б уважлівага аналізу яго рукапісаў. У працэсе выдання твораў, нават яшчэ пры жыцці паэта [9], некаторыя характэрныя элементы нівеліраваліся. Напрыклад, у рукапісе верша "Nad wodą wielką i czystą…" 15 радок гучыць, згодна з распаўсюджаным да сённяшняга дня "літоўскім" вымаўленнем "Ta woda widzę dokoła…", што было выпраўлена ў адпаведнасці з агульнапольскай нормай "Tę wodę…"[10].

Выкарыстоўваючы мясцовыя народныя матывы ў баладах і рамансах, Міцкевіч свядома [11] насычае іх мову рэгіяналізмамі, якія паходзяць з беларускіх крыніц, напрыклад, у "Тукаі", дзе багата прадстаўлена анамастыка (напрыклад, рака Гніліца, возера Калдычава, гара Жарнова і г. д.), мы сустракаем распаўсюджаную ў Паўночна-Усходняй Польшчы сінтаксічную канструкцыю тыпу jemu boli (бел. яму баліць, польск. jego boli); *Coś mu zabolało w łokciu*.

Падобнае адбываецца і ў "Пане Тадэвушу", які пісаўся з настальгіяй, далёка ад радзімы, дзе, як мяркую, творчае паглыбленне ў краіну дзяцінства, неабходнасць апісання рэалій, невядомых паэту з іншых крыніц, выклікаваліся ў Міцкевіча, прыхаваныя пры напісанні іншых твораў, залежы рэгіянальных рысаў, якія паходзяць, як вядома, у значнай ступені з беларушчыны. І не ўсё хіба тут вынікае з запланаванай стылізацыі.

Правінцыялізмамі ў "Пане Тадэвушу" займалася Г. Турска [12], засяроджваючы ўвагу, перш за ўсё, на стылізацыі і індывідуалізацыі дыялогаў — не толькі з пункту гледжання наяўных у польскай мове беларусізмаў. Яшчэ раней — Станіслаў Дабжыцкі [13] і Станіслаў Станкевіч [14], які да беларусізмаў залічваў таксама чыста польскія з'явы, а такія, як, напрыклад, mogilnik ці siewba і шмат іншых, абышоў увагай.

---

[8] Zdaniukiewicz, Sawaniewska-Mochowa.

[9] Гл.: Sudolski Z. Adam Mickiewicz. Warszawa, 1995.

[10] Górski K. Przedmowa do wyd.: Mickiewicz A. Dzieła Wszystkie. T. I. Wiersze. 1817–1824.

[11] Параўн. адказ А.Міцкевіча варшаўскім крытыкам.

[12] Prowincjonalizmy językowe w "Panu Tadeuszu"// Materiały dyskusyjne Komisji Naukowej Obchodu Roku Mickiewicza PAN. Warszawa, 1955 (na prawach rękopisu) / Przedruk Turska H. Wybór pism (1945–1962). S. 21–37.

[13] Dobrzycki S. Kilka spostrzeżeń nad językiem Mickiewicza // Prace Filologiczne. 1911. T. 7. S. 300–393.

[14] Stankiewicz S. Pierwiastki białoruskie…

Уважлівае чытанне “Пана Тадэвуша” прыводзіць да вываду, што гэты твор па-ранейшаму чакае сваёй мовазнаўчай манаграфіі. Для заахвочвання будучых даследчыкаў яшчэ некалькі менш заўважальных раней прыкладаў:

Ogiński sto włók lasu raz przegrał o wilka,
Niesiołowskiemu borsuk kosztował wsi kilka! (кн. II);

Głupi, tobieć to lepiej, tyś, chłopie, przywyknął (кн. IV).

Nie śmiał iść w ogród; tylko wsparł się na parkanie (кн. IV).

Dalej w grzyby! [15] (кн. II)

Mężczyźni palą lulki, kobiety przy prątkach (кн. VI).

Jestem Polak, dla kraju rad bym coś dokazać (кн. VI).

Tymczasem, bracie, z Hrabią trzeba przyjść do zgody (кн. VI).

Biegę do niego zaraz; zboże zarzynać; przynieść dwie skrzypiec (кн. VII).

Dziś dość miałem kłopotów! Aż mi głowa boli! (кн. VIII).

kotuch, kury szurpate (кн. VIII).

Mówiłeś, że wiesz domek, gdzie się masz przechować (кн. X)

Patrz stoi cymbalista, skrzypak i kozice;
Lud przy innej muzyce nie potrafi skakać (кн. X)

Абмежаваны час канферэнцыі не дазваляе даць больш шырокую інтэрпрэтацыю гэтых прыкладаў. Таму пераходжу да апошняй праблемы, дакладней — кароткага абазначэння дзвюх розных праблем, звязаных з адлюстраваннем матываў беларускага фальклору ў творчасці А. Міцкевіча.

Напрыклад, балада “Люблю я” абапіраецца на шырока распаўсюджаным у беларускім фальклоры [16] перакананні аб немінучасці пакут пасля смерці за зямныя грахі, асабліва калі хто быў кім-небудзь праклятый. Спынімся менавіта на гэтай баладзе, паколькі адна з магчымых формаў яе народнага прататыпу была занатавана на мясцовай польскай мове Ганнай Энгелькінг у 1995 г. у вёсцы Паперня Лідскага раёна Гродзенскай вобласці ў маналогу двухмоўнай жанчыны (нар. у 1917 г.). Прыводжу гэты запіс дослоўна:

“Tam, w Radziwoniszkach, mówili. Wszystko, jaki strach podawał się, jak drogą szli, jak ludzi idą. No, ale jemu było trzeba, mówi, powiedzieć “lubia”. No, a u jego było takie, przysłowie takie on mówił, coś takiego: “aj, lubia, lubia. Jidzie, mówi, tam wszystko — panienka taka ładna, wyjdzie mówi, takie trzy polana ten mościk, taki malutki rowuszek tam przetaczał się taki, woda ta… Stru-

[15] Bagrowska A. Białoruskie wyrażenia typu “pajści u hryby” // Slavia Orientalis. R. XII. 1963. Nr 2. S. 271–277.

[16] Гл.: Federowski M. Lud Białoruski. Kraków, 1892. T.1. S. 58–59 i in.

myk taki. Jidzie, i, mówi, wyszła do jego, w białej sukni, mówi, kosy takie ładne u jej, ona ubrana taka panienka.

— Jakaś młoda umarła pewnie…

— No. I mówi, wyszła i stoi, a on mówi takie przysłowie było, u jego: "A lubień cień". To ona mówi: "Dzienkuja". I znikła potem, teraz nikomu nie wychodziła, mówi. O!

— A przedtem, jak się pokazywała, to nikt jej nie powiedział "lubię", i ona się stale musiała pokazywać?

— Tak, i ona musiała wychodzić… A tak ona podziękowała jemu.

— To co, on ją wybawił jakby?

— Jakby wybawił, a nie wiem, co tam takiego było, mówi…

— A wiadomo dlaczego ona się pokazywała?

— A Pan Bóg jej wie! Czy ona tam gdzie zamordowana coś była, czy co, kto jej wie…"

Прыведзены прыклад сведчыць пра вялікую жывучасць як фальклорных матываў, так і моўных рысаў, уласцівых творчасці Міцкевіча.

Пра тое, што абрадавасць II часткі "Дзядоў" мае беларускае паходжанне, пісалася ўжо не адзін раз [17]. Дзякуючы добразычлівасці рэдактара Ежага Гедройца я атрымала нядаўна машынапіс працы Алімпіі Свяневічавай, які яшчэ не друкаваўся, пад назвай "Інтэрпрэтацыя "Дзядоў" на падставе скарбніцы беларускай культуры". Другі экземпляр гэтай працы, што захоўваецца ў архіве Інстытута і музея В. Сікорскага ў Лондане, разглядае Ніна Тэйлар у артыкуле "Даследаванне Алімпіі Свяневічавай пра беларускія дзяды і "Дзяды" Міцкевіча" [18].

На жаль, я не мела яшчэ магчымасці бліжэй пазнаёміцца з працай. Але ўжо на першы погляд заўважаецца, што яна мае нязвыкла важны для беларускай культуры матэрыял; не толькі аўтэнтычны пераказ вераванняў і народных тэкстаў з Цэнтральнай Беларусі, але і гісторыю касацыі уніяцкай царквы ў Беларусі, убачаную вачыма вяскоўцаў, і сведчанні доўгатэрміновай прывязанасці да яе вернікаў — нягледзячы на жорсткія праследаванні з боку царызму і маніпуляцыі праваслаўнай царквы.

Галоўным элементам працы з'яўляецца палеміка са Станіславам Піганем, які абрад дзядоў звязвае з вясенніім святам памерлых — Радаўніцай у сувязі з тым, што яно святкавалася грамадствам супольна на могілках. Свяневічава даказвае, што абрад восеньскіх дзядоў у беларускай традыцыі ўзыходзіць да дахрысціянскага перыяду, а Радаўніца была ўведзена ў яе род-

[17] Wantowska M. Dziady kowieńsko-wileńskie // Ludowość u Mickiewicza / Pod red. J.-K. Krzyżanowskiego i R. Wojciechowskiego. Warszawa, 1958; Pigoń S. Formowanie "Dziadów" części drugiej: Rekonstrukcja genetyczna; Swianiewiczowa O. Dziady Białoruskie // Rocznik Polskiego Towarzystwa Naukowego na Obczyźnie. Londyn, 1960–1961. T. 11.

[18] Машынапіс 1991 г.

ныя мясціны (маёнтак Вязынка, вёска Сяледчыкі і Крыніца непадалёку ад Радашковічаў) толькі ў XIX ст. праваслаўнай царквой як супрацьяддзе на дзяды, звязаныя тады з уніяцкай царквой. Баючыся праследаванняў, дзяды — як зносіны з памерлымі, святкаваліся ўнутры хат пры адчыненых дзвярах, каб духі памерлых маглі лёгка туды ўвайсці. На Віцебшчыне, дзе, дзякуючы пакутніцтву св. Іасафата, традыцыі уніяцкай царквы былі вельмі трывалымі на працягу досыць працяглага часу, дзяды святкавалі патаемна, але на могілках. Аўтар прыкладвае тэкст запрашэння духаў, які быў запісаны ў Лепельскім раёне, а ўбачаны ў вёсцы Бабінічы Юліяй Лісоўскай (у дзявоцтве Тамашэвіч) з маёнтка Дзмітроўшчына:

Starzec: W hości my k'wam przyszli.
Chór: Dziady, dziady.
Starzec: Małaczko pryniaśli.
Chór: Dziady, dziady.
Starzec: Kaszu, miodu niaśli.
Chór: Dziady, dziady.
Starzec: Nia bojciaś, duszy, ni ksiandzou, ni papou, sami swai przyszli.
Chór: Dziady, dziady.
Starzec: Jeszcie, pijcie, duszy.
Chór: Dziady, dziady.
Starzec: Jeszcie, pijcie usie.
Chór: Dziady, dziady…

Праца Свяневічавай заключае ў сабе многа фактычнага матэрыялу і цікавую гістарычную інтэрпрэтацыю. Яна павінна стаць аб'ектам даследавання фальклярыстаў і даследчыкаў уніяцкай царквы і падрыхтавана да друку. Гэта публікацыя ўнясе новыя элементы ў інтэрпрэтацыю "Дзядоў" А. Міцкевіча і ўзбагаціць нашы веды пра беларускую культуру.

Трэба таксама з радасцю і ўдзячнасцю назваць аўтара першага поўнага перакладу "Дзядоў" на беларускую мову — Сержа Мінскевіча. Тэкст перакладу, з якім я мела магчымасць пазнаёміцца, з'яўляецца доказам дасканалай сугучнасці беларускага тэксту з польскім і выдатнага таленту перакладчыка.

Дарэчы будзе закончыць рэферат меркаваннем, што такая сугучнасць арыгінала і перакладу стала магчымай, дзякуючы суіснаванню беларускіх і польскіх культурных элементаў у самім творы.

Пераклад з польскай мовы Івана Лучыц-Федарца

Генадзь Цыхун *(Мінск)*

МОВА АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў РЭГІЯНАЛЬНЫМ АСПЕКЦЕ

Вядома, што мова твораў Адама Міцкевіча як мова класіка польскай літаратуры сваёй асновай належыць да польскай літаратурнай мовы. Пры гэтым ёсць шмат выпадкаў, калі можна сцвярджаць, што пэўныя словы, формы ці выразы замацаваліся ў літаратурнай мове дзякуючы таму, што яны былі ўжыты ў творах Адама Міцкевіча (пра гэта сведчыць, напрыклад, т. зв. "Варшаўскі слоўнік", дзе да пэўных слоў даюцца цытаты-ілюстрацыі толькі з Міцкевіча). Несумненна, што значная частка гэтых слоў, формаў і выразаў была ўласціва польскаму т. зв. *усходняму культурнаму дыялекту*, які сфарміраваўся яшчэ ў сярэднія вякі ў выніку паланізацыі верхніх слаёў Вялікага Княства Літоўскага пры пэўным удзеле (звычайна колькасна нязначным, але ўплывовым) выхадцаў з карэннай Польшчы. Гэтым "dialektem kulturalnym", паводле Галіны Турскай, карысталіся жыхары гарадоў, двароў, засценкаў і плябаній. Несумненна таксама, што яны, як правіла, валодалі асноўнай мовай карэннага насельніцтва, пра што сведчаць шматлікія ўстаўкі і цытаты ў розных творах, у тым ліку і з тэрыторыі пагранічча. Параўнаем, напрыклад, пасаж з працы Марыяна Юркоўскага пра мову твора Лукаша Гурніцкага "Dworzanin polski" (1565): "Warto przytoczyć ten cały fragment z *Dworzanina polskiego*: "Tatarzyn upity odpowiedział: "Ten słuch — prawi — u nas jest w hordzie o tobie, jakobyś dwie głowie nosił na swych ramionach, a dla tego mój pan o tym ledajakim poselstwem mnie posłał, abym sie przypatrzył temu! Ja pak wiżu u ciebie nie dwie hołowie, ale odnu da dobru" (Dw., 212)… Górnicki cytuje ten zwrot z ruska. Tak Tatarzy jak i Polacy we wzajemnych negocjacjach posługiwali się zwyczajnie ruszczyzną" [1].

З такой моўнай сітуацыі вынікае, што тыя, хто валодалі абедзвюма моўнымі сістэмамі, інтуітыўна ці свядома адрозніваліадзінкі розных сістэм і звычайна іх не змешвалі. Разам з тым, на працягу значнага перыяду паступовай паланізацыі выпрацаваліся правілы міжмоўнай субстытуцыі, пры дапамозе якіх рабілася перакадзіроўка адзінак адной сістэмы ў адзінкі другой сістэмы. Гэтыя правілы нярэдка дзейнічаюць і цяпер, спараджаючы, дзякуючы свайму аўтаматызму, шматлікія т. зв. крэсавыя інавацыі накшталт *smrodzina* 'czarna porzeczka', *tłoka* 'gromadna praca' і пад., якія зафіксавала Барбара Двілевіч у польскамоўнай вёсцы Буйвідзы на Віленшчыне [2]. Частка такіх інавацый зафіксавана ў т. зв. "Віленскім слоўніку" Ольгебранта, з якога магла трапіць і ў польскую літаратурную мову. Асабліва часта інава-

[1] Jurkowski M. Rutenizmy i orientalizmy w języku starosty tykocińskiego Łukasza Górnickiego // Studia językowe z Białostoczczyny: Onomastyka i historia języka. Warszawa, 1989. S. 158.

[2] Dwilewicz B. Język mieszkanców wsi Bujwidzie na Wileńszczyźnie. Warszawa, 1997. S.122.

цыі такога тыпу з'яўляліся, калі ўзнікала неабходнасць перадаць па-польску рэаліі і паняцці, звязаныя з жыццём, гісторыяй, побытам і прыродай таго краю, які А. Міцкевіч называў сваёй айчынай. Сам характар фарміравання польскага "dialektu kulturalnego" (трэба асабліва падкрэсліць другі элемент гэтага тэрміна) сведчыць пра тое, што засваенне пальшчызны ішло зверху не толькі ў сацыяльным, але і ў лінгвістычным плане, г. зн., што розныя ўзроўні моўнай сістэмы засвойваліся ў рознай ступені, у тым ліку, напрыклад, і розныя пласты лексікі ў межах лексічнага ўзроўню "ўцягваліся" ў гэты працэс паступова. Трэба мець на ўвазе, што гэта быў дынамічны працэс, які ішоў увесь час, пакуль дзейнічала культурная экспансія з боку Польшчы. Ступень багацця "dialektu kulturalnego" і яго прыбліжэння да "polszczyzny literackiej" вызначаўся шмат у чым і індывідуальнымі схільнасцямі, і здольнасцямі яго носьбітаў.

Несумненна, што мова А. Міцкевіча ў перыяд уздыму яго творчасці ўключала ў сябе як дасягненні тагачаснай "polszczyzny literackiej", так і вельмі багаты "dialekt kulturalny". Пры гэтым, відаць, ён добра адчуваў у шмат якіх выпадках спецыфічныя асаблівасці апошняга, уводзячы іх у тэкст сваіх твораў пры дапамозе слоў тыпу "zwany", "nazywają" і г. д., параўн.:

Wisiała jak baldakim jasna mgła motylów
Zwanych babkami… (PT, 3, 66–67) [3]

або

Dziś miejsce Gerwazego, najdalsze od progu,
Między dwiema ławami, w samym karczmy rogu,
Zwane *pokuciem*… (PT, 4, 277–279).

Такім чынам, большасць т. зв. беларусізмаў трапіла ў мову А. Міцкевіча хутчэй за ўсё праз фільтр "dialektu kulturalnego", дзе яны ўжо прайшлі першую адаптацыю, напрыклад, замену поўнагалосся няпоўнагалоссем, перанос націску, ліквідацыю акання і г. д. Асобныя адступленні ад гэтага правіла тлумачацца, відаць, жаданнем падкрэсліць "мясцовы каларыт", як гэта было ў выпадку з вядомай стравай:

I chołodziec litewski milcząc żwawo jedli (PT, 1 307);

I chołodziec litewski milczkiem żwawo jedli (PT, 3, 94);

побач з

I chłodnik zabielany milcząc żwawo jedli (PT, 5, 314).

У іншых выпадках гэта звязана, магчыма, з старым характарам запазычання ў польскую літаратурную мову і ў сувязі з гэтым семантычным ада-

[3] Тут і далей скарачэнне PT — "Pan Tadeusz" з указаннем быліцы ("księgi") і радка ("wiersza").

сабленнем усходнеславянскага запазычання і польскага слова, параўн. *czereda* і *trzoda*:

Przymawiali śród gwaru i wrzasku czeredy (PT, 4, 861),

або *ożyna* і *jeżyna*:

Ożyna czarne usta tuląca do malin (PT, 3, 555) і пад.

Трэба адзначыць таксама такую з'яву, як уяўная архаізацыя ў тэкстах А. Міцкевіча, выкліканая тым, што ў тагачасную польскую літаратурную мову ўводзілася інавацыя з "dialektu kulturalnego", якая ўзнікла ў выніку "перастварэння" беларускай лексемы, што па форме супадала з архаізмам, вядомым у гісторыі польскай мовы. Такі характар, відаць, носіць форма *młódź*, што шырока ўжываецца, напрыклад, у "Пане Тадэвушы" побач з *młodzież* (суадносіцца з беларускім *моладзь*): "młódź lubi zagadki" (PT, 1, 320), або *zawżdy* побач з *zawsze* (параўн. бел. *заўжды́*) і г. д. Ужытая Міцкевічам форма *ociec* ("Tadeusza ociec", PT, 3, 362), выцеснена з сучаснай польскай мовы словам *ojciec*, магла падтрымлівацца беларускім *аџец*, што таксама на фоне паланізма *айцец* успрымаецца як архаізм. Магчыма, такі ж характар мае міцкевічаўскае *wyraj*, якое Аляксандр Брукнер суадносіць з *raj*, з чым не пагаджаюцца іншыя этымолагі, лічачы яго запазычаннем з усходу; параўн.:

Wszyscy na północ: rzekłbyś, iż wonczas *z wyraju*
Za ptastwem i lud ruszył do naszego kraju (PT, 11, 43).

Такой этымалогіяй, а не адсутнасцю адаптацыі і захаваннем акання хутчэй за ўсё тлумачыцца гук *а* ў гэтым слове. Нярэдка тут назіраецца т. зв. зварот да вытокаў, калі архаізацыя збліжае роднасныя мовы, якія ў далейшым усё больш разыходзяцца, асабліва ў іх літаратурных варыянтах. У тым жа "Пане Тадэвушы" такая архаізацыя да таго ж магла служыць і мастацкім мэтам у якасці фактуры пры апісанні малюнкаў старога побыту.

Зразумела, што найбольш рэгіяналізмаў у мове А. Міцкевіча павінна быць тады, калі ён звяртаецца да любай яму прыроды роднага краю.

Вядома, якую багатую палеміку і шырокі розгалас у колах польскіх міцкевічазнаўцаў і мовазнаўцаў выклікаў славуты "*bursztynowy świerzop*", за якім крыецца звычайная беларуская *свірэпка*. Вядомы польскі этымолаг Францішак Слаўскі прысвяціў гэтаму слову спецыяльны артыкул у зборніку, прысвечаным Кандрату Крапіве, перадрукаваны ў зборніку яго прац [4]. Зусім натуральнае, без слоў тыпу "zwany" і да таго падобных, ужыванне названай лексемы ў "Пане Тадэвушы" сведчыць аб яго ўстойлівым месцы

[4] Слаўскі Ф. Аб некаторых словах, уведзеных А. Міцкевічам у польскую літаратурную мову // Беларускае і славянскае мовазнаўства: Да 75-годдзя акад. Кандрата Крапівы. Мн., 1972. С. 250–251.

ў мове паэта. З нечым падобным мы сустракаліся ў час дыялекталагічных экспедыцый па вывучэнні т. зв. польскага перыферыйнага дыялекту (“polszczyzny kresowej”) на тэрыторыі беларуска-літоўскага пагранічча: пакуль ішло апытанне больш-менш шырока вядомых рэалій і паняццяў — адказы даваліся на польскай мове, але чым больш мы паглыбляліся ў дэталі ці пераходзілі да сфер, якія маюць спецыфічны, звязаны з народным побытам ці даўнімі вераваннямі, характар, як інфармант незаўважальна для сябе пераходзіў на мясцовую беларускую гаворку. Гэта яшчэ раз сведчыць аб тым, што засваенне польскай мовы ішло “зверху”, праз т. зв. “dialekt kulturalny”. Зразумела, што ў сваіх творах А. Міцкевіч заставаўся ў рамках польскай мовы нават тады, калі ён звяртаўся да падобных рэалій. Зусім магчыма, што славуты *świerzop* з’яўляецца яго аўтарскай інавацыяй (імправізацыяй?), створанай у час натхнення і настальгіі, а не ўсталяваным элементам “dialektu kulturalnego”. Відочны элемент “апрацоўкі” слова шляхам субстытуцыі беларускага *р* цвёрдага польскім змякчаным *rz* і пераводам яго ў мужчынскі род. Справа ў тым, што як паказвае карта № 264 першага тома “Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак” [5], на тэрыторыі Навагрудчыны, як і на іншых тэрыторыях, вядомы формы *свірэ́па*, *свірэ́пка* і пад., толькі жаночага роду. Адзіная зафіксаваная форма м. р. (*свірапе́нь*) лакалізуецца далёка за межамі гістарычнай Літвы — на Сожы. Гэта значыць, што А. Міцкевіч творча пашыраў межы як “dialektu kulturalnego”, так і польскай літаратурнай мовы за кошт мясцовай (рэгіянальнай) лексікі.

Другі вядомы выпадак — славуты *matecznik* з чацвёртай быліцы “Пана Тадэвуша”:

> Te puszcz stołeczne, ludziom nie znane tajniki
> W języku swoim strzelcy zowią: *mateczniki* (PT, 4,118).

Шматфарбнае апісанне, якое грунтуецца на прыгожай беларускай легендзе, выклікала ў міцкевічазнаўстве вялікую літаратуру, у якой разглядаецца і паходжанне названага рэгіяналізма [6]. Яшчэ Юзаф Растафінскі заўважыў, што “w Polsce wyraz matecznik w znaczeniu jakiegoś lasu nie jest znany”, і лічыў “tę zwierzęcą białoruską baśń za arcypierwotną, pochodzącą z czasów, kiedy człowiek przypisywał zwierzętom swoje własne uczucia” [7]. Адзіная

[5] Лексічны атлас беларускіх народных гаворак. Мн., 1993. Т. 1.

[6] Rostafiński J. Las, bór, puszcza, matecznik jako natura i baśń w poezji Mickiewicza // Rozprawy Akademii Umiejętności w Krakowie: Wydział Filologiczny. T. LX. Nr. 1. S. 27–28; Hryniewicki B. Adam Mickiewicz a flora Litwy. Warszawa, 1956. S. 31–33; Bednarczuk L. Matecznik // Zeszyty Naukowe Wydziału Humanistycznego Uniwersytetu Gdańskiego: Slawistyka. 1988. Nr. 6. S. 43–48, перадрук у кн.: Bednarczuk L. Języki Wielkiego Księstwa Litewskiego na tle porównawczym. Wilno, 1993. S. 41–46.

[7] Тамсама. С. 29.

фіксацыя беларускага слова і легенды пра *матачнік* вядомы з працы Адама Багдановіча “Пережитки древнего миросозерцания у белорусов” [8]. Апісваючы месца жыхарства лесуна, ён лакалізуе яго ў матачніку — “это средина пущи, совершенно недоступная для обыкновенного смертного. *Маточник* окружен непроходимым лесом, запружен массою валежника и сверх того — его облегают засасывающие болота, которые не замерзают и в самые суровые зимы… Все крупные звери туда идут умирать: они только знают таинственные тропы, которыми можно пробраться в маточник”. Найбольш цікавым з’яўляецца факт, на які звярнуў увагу Лешак Беднарчук у вышэй указанай працы, фіксацыі слова *matecznik* у польскай частцы т. зв. “Słownika pogańskich gwar z Narewu” для перакладу “яцвяжскага” (?) слова *gyr* (параўн. літ. girià ‘лес, бор, пушча’). Ён жа лічыць, што “dobrze udokumentowany na gruncie wschodniosłowiańskim wyraz *matočnik* ‘miejsce, gdzie mnożą sie zwierzęta’ w języku białoruskim […] zmienił znaczenie na ‘niedostępne miejsce w puszczy, gdzie są legowiska dzikiej zwierzyny’, skąd wtórnie ‘ostęp leśny, puszcza’ i te dwa ostatnie znaczenia przez polszczyznę kresową dostały się dzięki Mickiewiczowi do języka ogólnopolskiego” [9].

І яшчэ адзін выпадак, калі Міцкевіч фактычна захаваў для нас мясцовую назву расліны ў польскай агаласоўцы — “cary” са слыннай балады “Свіцязь”. Польскія батанікі высветлілі, што за гэтым рэгіяналізмам хаваецца рэдкая расліна лабелія (Lobelia dortmanna L.), для якой у “Латино-русско-белорусском ботаническом словаре” Анатоля Кісялеўскага [10] не прыводзіцца ніводнай народнай назвы. Можна меркаваць, што на беларускай глебе адбыўся перанос назвы з іншых раслін тыпу *цар-трава* ’белакапытнік, таемнік’.

Яшчэ больш рэгіяналізмаў можна выявіць у мове А. Міцкевіча на ўзроўні сінтаксісу і фразеалогіі. На адзін з такіх выпадкаў звярталі ўвагу даследчыкі, канстатуючы ўжыванне сінанімічных канструкцый (*iść*) *w grzyby, po grzyby, na grzyby*, з якіх першая зусім невядома польскай мове. Цікава, што адпаведная карта “Дыялекталагічнага атласу беларускай мовы” (ДАБМ, к. 215) паказвае, што Навагрудчына якраз знаходзіцца на стыку арэальных масіваў з канструкцыямі *па грыбы* (захад) і *ў грыбы* (усход і цэнтр), так што мова Міцкевіча адлюстравала і гэты арэальны малюнак. З фразеалагічных рэгіяналізмаў можна адзначыць *czegoś mu nie dostaje, świat mu zawiążesz* і пад.

Такім чынам, мова А. Міцкевіча адлюстравала складаную моўную сітуацыю, што існавала ў той час на Беларусі ў сферы літаратурнай творчасці. Выяўляюцца тры моўныя ўзроўні, у межах якіх функцыянавалі розныя іды-

[8] Богданович А. Е. Пережитки древняго миросозерцанія у Белоруссовъ: Этнографический очеркъ. Гродна, 1895. С. 78 (Факсімільнае перавыданне: Мн., 1995).

[9] Bednarczuk L. Języki Wielkiego Księstwa Litewskiego… S. 45.

[10] Киселевский А. Латино-русско-белорусский ботанический словарь. Мн., 1967.

ёмы — т. зв. polszczyzna literacka, polski dialekt kulturalny і беларускае фальклорна-моўнае кайнэ. Іх ужыванне размяжоўвалася стылёва і сітуацыйна. З іх першыя два функцыянавалі ў форме дыгласіі, для якой, паводле Барыса Успенскага, характэрна “1) недопустимость применения книжного (литературного) языка как средства разговорного общения; 2) отсутствие кодификации разговорного языка, отсутствие специального обучения этому языку; 3) отсутствие параллельных текстов с одним и тем же содержанием” [11]. Што датычыць трэцяга, то яго адносіны да першых двух былі падобныя да папярэдніх, аднак несумненна, як Міцкевіч, так і іншыя творцы яго акружэння лічылі яго асобнай мовай. Яе ўжыванне ў якасці літаратурнай абмяжоўвалася сяброўскім колам (“філаматы”). Такім чынам, беларускія элементы, што адлюстраваліся ў творах Міцкевіча, трапілі туды, прайшоўшы праз фільтр польскага культурнага дыялекта. Крыніцай іх было фальклорна-моўнае кайнэ і непасрэдна беларускія гаворкі.

Вікторыя Ляшук *(Мінск)*

СЛОВЫ-ВОБРАЗЫ РАДЗІМЫ Ў ТВОРЧАСЦІ А. МІЦКЕВІЧА

Паэт-класік Адам Міцкевіч, узгадаваны на беларускай этнакультурнай глебе, паўстае ў літаратурнай і культурнай прасторы волатам рамантычнага запалу і гуманістычнай актыўнай чыннасці, для якой была характэрна пастаянная, непарыўная сувязь з той зямлёй, што дала аўтару натхненне і ўласцівую яму грунтоўнасць у творчасці, знітаванай з лёсам яго радзімы. Нездарма да “Крымскіх санетаў” паэт выбірае эпіграфам радкі І.-В. Гётэ: “Хто хоча зразумець паэта, у край яго пайсці павінен” (“Wer den Dichter will verstehen, Muss in Dichter’s Lande gehen”). І гэта заўвага, безумоўна, не абмяжоўваецца толькі вонкавым, ландшафтным выглядам, але ўключае ўвесь комплекс адзнак, што акрэсліваюць генетычную, духоўную прыналежнасць асобы сваёй радзіме. Сведчаннем такой арганічнай сувязі паўстае і факт уздзеяння творчасці славутага рамантыка на беларускую літаратуру, дзякуючы чаму яна выспеліла ідэю адраджэння ці, па словах іншых навукоўцаў, змагла выйсці з анабіятычнага сну. І ў першым, і ў другім меркаваннях вытокі развіцця літаратуры XIX ст. на беларускай мове звязваюць з уплывам на пісьменнікаў генія А. Міцкевіча. У гэтым немалаважную ролю адыграў яго патрыятызм, парадаксальнасць якога ўвасоблена ў паэтычнай творчасці, дзе выразна выяўлены яго моўныя вобразы, асаблівасці вобразнага напаўнення мастацкага тэксту.

[11] Успенский Б.А. История русского литературного языка (XI–XVII вв.). München, 1987. С. 17.

Як адзначае А. Мальдзіс, “патрыятызм Міцкевіча — з’ява складаная, “шматслойная”. Бо найперш ён прызнаваўся ў любові да той зямлі, дзе нарадзіўся і ўзрос, дзе адчуў прыгажосць навакольнага свету, дзе далучыўся да народных песень і казак, творча выкарыстаных потым…” [1].

У паэтычных тэкстах рамантыка вобраз радзімы складаецца з яе розных іпастасяў, рэпрэзентуецца фактычна ўся яе культарна-гістарычная прастора ў розных часавых ракурсах, найперш у паралелі *сучаснае — мінулае*, у разнастайнасці візуальных ды інтэлектуальных планаў — у паралелях *неба — зямля, рэальнасць — думка, успаміны — надзея*, злучаных у суцэльны тэкст асацыятыўнымі, вобразнымі, сімвалічнымі, гісторыка-рэальнымі сувязямі.

Аснову вобразнай сістэмы А. Міцкевіча складае этнагенетычная і гістарычная глеба, на якой вырастае паэзія розуму і пачуццяў. У падыходзе да мовы выяўляецца індывідуальнае і эстэтычнае асэнсаванне вобразна-выяўленчых патэнцый лексікі, яе тэматычная дыферэнцыяцыя, а таксама суаднесеная з вобразнай цэнтралізацыяй, падкрэсленая паэтычным кантэкстам каштоўнасная градацыя адпаведных лексемам дэнататаў. Вобраз радзімы ў паэзіі класіка належыць да найбольш канцэптуальна значных і частотных. І гэта натуральна, бо рамантык вызначаўся сацыяльна актыўнай пазіцыяй, свядомым, асэнсаваным своеасаблівым патрыятызмам, што паўплывала і на яго лёс, і на яго творчасць.

Аснову слоўных вобразаў радзімы, апетай А. Міцкевічам, складае адпаведная тэматычная лексіка: *ojczyzna, kraj, kraina, ziemia*. У параўнанні з ёй у беларускай паэзіі ўжываюцца і эмацыянальна-экспрэсіўныя найменні — у рэчышчы народна-паэтычнай традыцыі: *край, зямля / зямелька, кут / куточак, старана / старонка, айчына, бацькаўшчына, краіна, радзіма*. Пры гэтым ідэю бацькаўшчыны актуалізуе самае частотнае слова *ojczyzna* — з празрыстай матывацыяй, рэалізацыяй прамога значэння. Астатнія з прыведзеных лексем семантыкай звязаны з прасторавай характарыстыкай, вызначаюцца тэндэнцыяй да семантычнага канэнсавання і полісемічнага сінтэзу, у найбольшай ступені прысутных у полісеме *ziemia*, якая ў паэтычным ужыванні вызначаецца асаблівым асацыятыўна-вобразным узаемадзеяннем асобных сем, што паглыбляюць вобразнасць і значна ўзбагачаюць слоўны вобраз.

Вельмі часта аўтар узмацняе вобразнасць праз спалучэнне названых найменняў радзімы з адноснымі характарыстычнымі прыметнікамі, з тэматычна тоеснымі назоўнікамі: *kraj rodzinny, kraj lat dziecinnych, Ojczysty kraj*. Азначэннямі-эпітэтамі паэт ўвасабляе сваё ўспрыняцце радзімы ў кантрастах, якія акцэнтуе чэпкая думка неабыякавага, усхваляванага лёсам сваёй зямлі чалавека: “*Ten kraj szczęśliwy, ubogi i ciasny!”* (“Pan Tadeusz”).

[1] Мальдзіс А. Зямля навагрудская, краю мой родны… // Адам Міцкевіч і Беларусь. Мн., 1997. С. 5.

Канцэнтрацыя вобразаў у словах розных лексіка-граматычных класаў не толькі падкрэслівае іх значнасць і частотнасць, але перадае тонкія рухі думкі аўтара, месца Радзімы ў іерархіі іншых рэалій яго жыцця. Напрыклад, А. Міцкевіч падкрэслівае першаснасць бацькаўшчыны ў інтэлектуальным свеце, у плыні мыслення (выдзелена тут і далей мною):

Jest u mnie *kraj, ojczyzna* myśli mojej,
I liczne mam serca mego rodzeństwo;
Piękniejszy *kraj* niż ten, co w oczach stoi,
Rodzina milsza niż całe pokrewieństwo…
("Gdy tu mój trup...")

Такія лексемы мадэлююць і шырэйшы аспект абагульненняў, што маюць грамадска-гістарычную значнасць, пераносяць паняцце радзіма ў агульначалавечы кантэкст, робяць асновай супастаўлення сацыяльнага вопыту чалавецтва, выяўленага ў разуменні праўды, якая ў паэзіі ўвасабляецца ў сімвале сонца:

A słońce Prawdy wschodu nie zna i zachodu,
Równie chętne każdego plemionom narodu
I dzień lubiące każdej rozszerzać *ojczyźnie*,
Wsze *ziemie* i ludy poczyta za bliźnie.
("Do Joachima Lelewela")

Тыпалагічнае падабенства ў складзе і функцыянальным ўжыванні слоў-вобразаў радзімы заўважаецца ў славянскіх і неславянскіх літаратурах як сведчанне культурнай блізкасці (слоўніка і слоўна-вобразнага выяўлення славян) і літаратурнай (вобразна-тэматычных і стылістычных асаблівасцей рамантызму як літаратурнага кірунку). Своеасаблівай апазіцыяй да названых апелятываў выступаюць онімы (уласныя імёны). Гэты пласт лексікі ў кожнага паэта вызначаецца найбольшымі якасна-колькаснымі адрозненнямі, што звязана найперш з канкрэтнымі культурна-гістарычнымі рэаліямі, якія пераносяцца ў паэтычную сістэму як складнікі мастацкай анамастычнай прасторы і сведчанні непарыўнай залежнасці аўтарскага мастацкага свету ад рэчаіснасці (былой ці існай). Сваю радзіму А. Міцкевіч называе *Літвой* (гістарычнае найменне часткі тэрыторыі сучаснай Беларусі). Па частаце ўжывання гэта лексема пераважае ўсе іншыя, звычайна ставіцца ў аб'ектныя адносіны (*w Litwie, do Litwy, na Litwie, z Litwy*): "W takiej ciszy! — tak ucho natężam ciekawie, / Że słyszałbym głos z *Litwy*…" ("Stepy akermańskie"); "Na *Litwie*, chwała Bogu, stare obyczaje…" ("Pan Tadeusz") ці функцыянуе як зваротак у форме рытарычнага воклічу: "Litwo! Ojczyzno moja! ty jesteś jak zdrowie…" ("Pan Tadeusz").

Літва ў паэзіі А. Міцкевіча паўстае жаданай зямлёй, роўнай па далечыні і прыгажосці зорцы:

Szukam północnej gwiazdy na zamglonym niebie,
Szukam *Litwy* i domku twojego, i ciebie…

(“Do ˣˣˣ” Na Alpach w Splügen…)

Разам з тым, у якасці вобраза радзімы паэт ужывае найменні *Korona, Litewskie Księstwo, Wielko-Polszcza, Rzeczpospolita,* перыфразу *Matko Polska*, што адлюстроўвае гістарычна-палітычныя прыярытэты тагачаснай шляхты, адпаведныя погляды самога А. Міцкевіча, які выступаў за незалежнасць і самастойнасць Рэчы Паспалітай, у якую б уваходзіла і Літоўскае Княства: “I jak zakwitnie szczęście i Rzeczpospolita”. Пры гэтым Польшча і Літва размяжоўваюцца як дзяржаўныя ўтварэнні, што падкрэслівае паэтычная аналогія Літвы і Кароны з раўназначнымі зоркамі:

Kastor z bratem Polluksem jaśnieli na czele,
Zwani niegdyś u Sławian Lele i Polele;
Teraz ich w zodyjaku gminnym znów przechrzczono,
Jeden zowie się *Litwą* a drugi *Koroną.*

(“Pan Tadeusz”)

Выкарыстаны паэтам лексічны, сінтаксічны і сімвалічны паралелізм суадносіцца з вобразным напаўненнем найменняў радзімы касмічнасцю, з дыферэнцыяцыяй і паэтычным аб’яднаннем двух дзяржаўных утварэнняў. Бацькаўшчыну ўвасабляюць таксама найменні гарадоў, мястэчак, засценкаў — рэальныя і змадэляваныя. У іх ліку названы буйныя культурныя цэнтры Беларусі Вільня (Wilno), Нясвіж (Nieśwież), Гродна (Grodno), Слонім (Słonim), Навагрудак (Nowogródĺk), Мінск (Mińsk), Слуцк (Słuck), якія ў тэкстах часта ўключаюцца ў пералік разам з польскімі гарадамі, тапонімамі іншых груп, акрэсліваючы адзіную сацыякультурную прастору:

Bo od Ponarskich gór i bliźnich Kowna wód
Szerzę się sława ma aż za Prypeci bród;
Mnie w *Nowogródku*, mnie w *Mińsku* czytuje młodź
I nie leniwa jest przepisać wielekroć.

(“Wizyta pana Franciszka Grzymały”)

Такія лексемы выконваюць часцей функцыю фонавую, тапанімічную. Яны захоўваюць культурна-гістарычны каларыт мастацкага свету. Аналагічную функцыю рэалізуюць і вытворныя ад тапонімаў адносныя прыметнікі, сярод якіх найчасцейшы — *litewski,* ён спалучаецца з шырокім колам назоўнікаў розных тэматычных груп і безумоўна скіроўвае на рэалістычныя адзнакі радзімы: *lasy litewskie, na żyznej litewskiej równinie, szlachta litewska, puszcz litewskich łoże, stroj litewski.*

Асаблівую вобразна-зместавую нагрузку нясе ўласнае найменне *Нёман / Niemen* — назва ракі, з якой звязана дзяцінства А. Міцкевіча. У найбольш поўнай рэалізацыі вобразна-стылістычных і мастацка-экспрэсіўных патэнцый гэты онім выступае ў санеце, у якім ён вынесены ў назву — “Do Niem-

na”. Аўтар канцэнтруе ў вобразе канкрэтнай ракі свае незабыўныя ўражанні дзяцінства і часоў рамантычнай закаханасці, пазначаныя пачуццём захаплення і светлай тугі; звяртаецца да традыцыйнага ўвасаблення незваротнай плыні часу і вечнага руху рэчаў; перадае бег чалавечай думкі і хваляванне пачуцця; сімвалізуе свой “бурлівы век” і прагне той свежасці, якую дае прахалода ракі. Наданне гідроніму значнасці і сутнасці радзімы адбываецца не толькі ў змесце вершаванага тэксту, але і пры моўнай спалучальнасці зачыну, паўторанага з пэўнай варыянтнасцю ў сярэдзіне верша:

Niemnie, domowa rzeko moja! gdzie są wody,
Które niegdyś czerpałem w niemowlęce dłonie,
Na których potem w dzikie pływałem ustronie,
Sercu niespokojnemu szukając ochłody?..
Niemnie, domowa rzeko moja! gdzież są tamte zdroje,
A z niemi tyle szczęścia, nadziei tak wiele?..

Да фальклорнага асэнсавання вобразнасці оніма *Niemen* паэт звяртаецца ў баладзе “Dudarz”, цытуючы народную песню з яркім кампаратывам, з апісаннем-каментарыем змен прынёманскіх краявідаў:

Idę ja *Niemnem, jak Niemen* długi,
Od wioseczki do wioseczki,
Z borku do borku, z smugów na smugi,
Śpiewając moje piosneczki.

Паэт сплятае ланцужок сувязей-залежнасцей, у якім вытокам выступае Нёман, а дапаўняе яго найменне грамадзяніна краіны, затым перафрастычная характарыстыка прыналежнасці шырэйшаму за сваю краіну культурнаму кантэксту, суаднесенаму з яе геапалітычным становішчам. Прычым вылучаючы онім *Polak*, аўтар характарызуе ім свайго аднадумца-філамата і тым самым імпліцытна ўлічвае бінарнасць этнонімаў *Polak–Litwin*, актуалізаваных як вобразы Радзімы:

Nieraz myślisz, że zdanie urodziłeś z siebie,
A ono jest wyssane w macierzystym chlebie;
Albo nim nauczyciel poił ucho twoje,
Zawżdy część własnéj duszy mięszając w napoje;
A tak gdzie się obrócisz, z każdej wydasz stopy,
Żeś *znad Niemna*, żeś *Polak*, mieszkaniec *Europy*.
(“Do Joachima Lelewela”)

Паказальна, што ў польскай мове ўсе тры аналізаваныя назоўнікі (найменне ракі, абазначэнне нацыянальнасці і часткі свету) кваліфікуюцца як уласныя, ствараючы трыадзінасць вобразу радзімы.

Аналіз паэтычных тэкстаў сведчыць пра тое, што онімы *Polak* і *Litwin* у кантэксце не сутыкаюцца, маюць аўтаномнае ўзаемадапаўняльнае размеркаванне, што выразна выяўляецца ў “Пане Тадэвушы”: A ktoż wojsko opłaci? czy nie wy, *Litwini*?; Powiedz *Litwinom*, niech mnie czekają z tabaką…; Ogarnęło

Litwinów serca z wiosny słoncem…; Miał także sławę dobrego *Polaka*…; Jedna już tylko jest kraina taka, W której jest trochę szczęścia dla *Polaka.*

Для тэксту характэрна “перакрыжаванне” назваў *Litwa* і *Polska* з суадноснымі ім найменнямі грамадзян, як, напрыклад, пры нагадванні гістарычных рэалій: Co mówię! wszak *Polacy* miewali zamieszki Z Litwą…

Абагульнены вобраз бацькаўшчыны канкрэтызуецца ў яе прыродных адзнаках, увасабляючыся ў паралель *Радзіма — краявід (дэталь ландшафту)*: *lasy, drzewa, zboże, toń wód*, куды ўключаецца ўвесь багаты лінгвапрагматычны вопыт:

Litwo! piały mi wdzięczniej twe szumiące lasy
Niż słowiki Bajdaru, Salhiry dziewice…
(“Pielgrzym”)

У такім выпадку *las* выступае апазіцыяй *stepu* (“Stepy Akermacskie”) або паўстае аб’яднаўчым стрыжнем зямлі і неба:

Drzewa moje ojczyste! jeśli Niebo zdarzy,
Bym wrócił was oglądać, przyjaciele starzy…
(“Pan Tadeusz”)

Для стварэння вобразаў радзімы паэт актыўна выкарыстоўвае прыналежныя займеннікі *mój, nasz, twój*, прыметнікі *kochany, domowy*, прыметнікі, утвораныя ад аналізаваных тэматычных назоўнікаў: *ojczysta (rola), (drzewy) naszy*.

Wszyscy na północ: rzekłbyś, że w onczas z w y r a j u
Za ptastwem i lud ruszył do *naszego kraju*…;
O roku ów! kto ciebie widział *w naszym kraju!*
(“Pan Tadeusz”)

Удакладняе аўтарскае ўяўленне радзімы ўключэннем у кантэкст (са спалучальнымі сувязямі) онімаў *Litwa* і *Korona*, развітых прыналежным прыметнікам *nasz,* і падкрэсленне вобразнымі сродкамі іх еднасці (яе прадвызначае Бог) і раздзеленасці (чаму віною чорт):

Dziwneć to były losy tej *naszej Korony*
I naszej Litwy! wszak to jak małżonków dwoje!
Bóg złączył, a czart dzieli, Bóg swoje, czart swoje!
(“Pan Tadeusz”)

Адзначаныя слоўныя вобразы з’яўляюцца ў тэкстах ключавымі словамі ці выступаюць як сродкі дэталізацыі глабальнага вобраза-сімвала радзімы, рэпрэзентаванага творчай сістэмай паэта.

Гаворачы пра А. Міцкевіча і яго “сціплае роднае гняздо”, А. Ельскі ўспамінае шматлікіх выдатных паэтавых землякоў, робіць вывад пра ўрадлівасць глебы, што нараджае такі плён. Ён акрэслівае тыя падставы, што вызначаюць такі важны культурны здабытак — “гняздо старадаўняй славяншчы-

ны, краіна герояў і гусляроў, патрыярхальных адносін і ахвяр у імя ўзнёслых ідэалаў" [2]. Гэтыя характарыстыкі з'яўляюцца арганічнай асновай Міцкевічавых вобразаў бацькаўшчыны, пра што сведчыць паэтычнае функцыянаванне слоў-найменняў радзімы.

Павел Вонгрэй, характарызуючы рамантыкаў і, у першую чаргу, А. Міцкевіча, выказваецца вельмі ёмістa і змястоўна пра вытокі іх творчасці: "Скрыжаванне жыццёвага і паэтычнага лёсу ў прыгнёце рэчаіснасці" [3].

З такой акалічнасцю звязаны яшчэ адзін надзвычай характэрны вобраз радзімы, увасоблены ў абстрактных лексемах, уласцівых беларускай паэтычнай, а раней — фальклорнай традыцыі: *душа (dusza), думка (myśl)* і характэрнай для аўтарскай творчасці лексеме, якая з'яўляецца выражэннем асноўнай настраёвасці лірычнага героя А. Міцкевіча, — *samotność*:

Samotności! do ciebie biegę jak do wody
Z codziennych życia upałów;
Z jakąż rozkoszą padam w jasne, czyste chłody
Twych niezgłębionych kryształów!

("Do samotności")

Ідэя самотнасці лагічна падаецца ў вобразе падарожніка-пілігрыма і таксама ўключаецца ў паняцце радзімы. Такая акалічнасць ярка выяўляецца ў вершы "Pieśń pielgrzyma", дзе асноўную эмацыянальна-сэнсавую нагрузку нясуць лексемы *samotny, smutno, dusza, żal, wdowa / wdowica, sierota*:

Założywszy ręce siadam,
Na *samotną* patrząc świecę;
Czasem piosnkę w myśli składam,
Czasem pióro *smutne* chwycę.

Piękne myśli, piękne słowa,
Czuję wiele, piszę wiele;
Ale dusza moja *wdowa*:
Z kimże piosnki te podzielę?

Гармоніяй кантрастаў можна акрэсліць сутнасць радзімы ў творчасці Адама Міцкевіча, паэта, які быў адначасова выдатным філолагам і адукаваным гісторыкам, ведаў, любіў Беларусь і верыў у яе. Нездарма ён называў беларускую мову самай багатай і чыстай, бачыў у ёй цудоўную прастату і гарманічнасць [4]. Гэтыя якасці нясе і вобраз радзімы паэта — плён мастацкай думкі, творчага генія і жыццядайнай роднай глебы.

[2] Ельскі А. Адам Міцкевіч на Беларусі // Адам Міцкевіч і Беларусь. С. 71.
[3] Vongrej P. Poézia slovenských romantikov // Literika. 1998. N. 2. S. 31.
[4] Міцкевіч А. [Пра Беларусь і беларускую мову] // Філаматы і філарэты. Мн., 1998. С. 122.

Чэслаў Сэнюх *(Варшава)*

БЕЛАРУСЬ ДВУХ МІЦКЕВІЧАЎ

Адам Міцкевіч — шляхціц герба Порай. Ён і аўтар "шляхецкай гісторыі" — паэмы "Пан Тадэвуш". Апісвае ў ёй — па словах Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча — "характар, звычаі і абычаі нашых беларускіх паноў часу Напалеона". Гэты час пазначаны ў загалоўку твора: 1811–1812 гг., пачатак XIX ст.

Канстанцін Міцкевіч — сялянскі сын, пад літаратурным прозвішчам Якуб Колас аўтар паэмы "Новая зямля", сялянскага "Пана Тадэвуша", як кажуць прыхільнікі абодвух Міцкевічаў. Толькі ў гэтага "пана" шмат імён: Міхась, Ганна, Кастусь, Уладзя, Алесь, Юзік, Міхаліна, Юзя, Лена, Маня… "Дзяцей было восьмера, значыць, з дарослымі, а з намі ўвесь час жыў дзядзька Антось, за стол садзілася нішто сабе дружына", — успамінаў Колас свайго зборнага "Тадэвуша".

А. Міцкевіч-эмігрант кліча родную Навагрудчыну да сябе, "на парыжскі брук", з далечыні тысячы міляў і пары дзесяткаў год. Ды піша пра падзеі, у якіх удзелу ён не прымаў: для Зосі кампаніяй не быў, у Янкелевай карчме не канспіраваў, на заручынах Тадэвуша паланеза не танцаваў. Гэта ўсё створана тут, на ягонай "малой айчыне", у былым Вялікім Княстве Літоўскім. Таму ад першай да апошняй кнігі ўсё ў творы хатняе, роднае, усё цёпла, прыгожа, чароўна. Паэт моліцца да Маці Божай:

З'яві свой цуд, каб зноў сустрэцца з родным краем,
Дазволь душы маёй, ахопленай адчаем,
Пераляцець туды, дзе поясам блакіту
Над Нёманам лясныя ўзгоркі апавіты,
Дзе прозеленню жыта ў полі серабрыцца
І залаціцца поўным коласам пшаніца,
Дзе ў ярыне свірэпа — россыпам бурштыну,
На ўзмежках дзяцельнік — румянамі дзяўчыны,
А ўпрокідку ў палетках, быццам вартаўнічкі,
Стаяць і ціха шэпчуцца ігрушы-дзічкі.

(Пераклад Я. Семяжона)

Але ж і ў Міцкевіча-Коласа "родны кут" беларускі, убачаны на тры чвэрці стагоддзя пазней за Беларусь Адамаву, ззяе красой:

…Ды я душою ажываю,
Як вокам мыслі азіраю
Цябе, мой луг і бераг родны,
Дзе льецца Нёман срэбраводны,
Дубы дзе дружнай чарадою
Стаяць, як вежы, над вадою
Даўнейшых спраў вартаўнікамі
І ззяюць грозна жараламі.

Значыць, калі Міцкевічы ў паэтычным парыве натхнення клічуць радзімую беларускую старонку — яна ў іх адна, агульная, хаця і ўбачаная там шляхецкім, тут — сялянскім вокам. У Адама:

Дзяцінства край,
З надзеямі і снамі,
Як першая любоў,
Ты вечна з намі!
(Пераклад М. Танка)

Туды ж, у свой "дзяцінства край", марыць вярнуцца і Міцкевіч-селянін. Хаця ў ягоным вяртанні чуваць крытычная рэфлексія:

О, як бы я хацеў спачатку
Дарогу жыцця па парадку
Прайсці яшчэ раз, азірнуцца,
Сабраць з дарог каменні тыя,
Што губяць сілы маладыя, —
К вясне б маёй хацеў вярнуцца.

Прыходзім, такім чынам, да высновы, што абодвум Міцкевічам сняцца сны аб адным і тым самым родным наднёманскім краі — аб Беларусі.

Але Міцкевіч-Колас — не толькі літаратурны сведка рэчаіснасці канца XIX ст. у Беларусі. Ён жа і актыўны яе ўдзельнік і стваральнік адлюстраваных у паэме падзей. Мабыць, таму Беларусь Міцкевічаў, убачаная імі ў аспекце хатняга, сямейнага ці грамадскага ўкладу жыцця, выглядае парознаму.

Вось, скажам, узаемаадносіны паміж сялянамі і "нашымі беларускімі панамі". Міцкевіч з Парыжа бачыць іх амаль у патрыярхальна-евангелічным увасабленні. Вось пераканаўчы прыклад такога бачання ўзаемадачыненняў паноў-шляхты і падданых сялян, яшчэ ў прыгоне. У замку Гарэшкаў адбываецца шумная старапольская бяседа. Гаспадар, суддзя Сапліца.

Пайшоў зірнуць, што робіцца ў двары ў застоллі,
Дзе гоман быў — прыйшлі ж сяляне з навакольля.
Засланы стол на два канцы па ўсім прагоне,
Застаўлен закуссю, як мэндлікамі гоні.
Ён сеў з канца стала, якраз насупраць пана,
Там, на другім канцы, па вопратцы — плябана.
Тадэвуш з Зосяю гасцінна запрашалі
Ўсіх выпіць, закусіць. Здаўна тут паважалі
Прапрадзедаўскі звычай: госці — за сталамі,
А спадкаемцы ўпоравень з гаспадарамі
Ўвіхаюцца каля сталоў. Там іх занятак —
Быць пры гасцях застолля ў ролі прыганятых.
(Пераклад Я. Семяжона)

Апошнія два радкі па-польску яшчэ больш вобразна адлюстроўваюць тую патрыярхальнасць суадносін:

Starożytny był zwyczaj, iż dziedzice nowi
Na pierwszej uczcie sami służyli ludowi.

Тут, здаецца, выдатны перакладчык не знайшоў больш трапнага моўнага эквіваленту міцкевічаўскага “ służyli ludowi ”, г. зн. “прыслужвалі, дагаджалі сялянам”, чым, як у перакладзе атрымалася, заганяць іх “ў ролі прыганятых”.

Вернемся аднак у замак. Там пан Тадэвуш выкладвае сваёй нарачонай Зосі свой жыццёвы план:

Жаўнер я, абое смяротныя мы; прызнаюся,
Бо я ж чалавек, што і собскіх капрызаў баюся:
Дык лепш ад улады адмовіцца ўжо чалавеку
Й аддаці сялян нашых лёсы пад права апеку.
Як вольны мы самі, то хай будуць вольны й сяляне;
Аддайма ім тую зямлю на веквечна ўладанне,
На ёй што зрадзілісь, якую крываваю працай
Здабылі, з каторай і жывяць усіх і багацяць.

(Пераклад Б. Тарашкевіча)

Гэта ўжо амаль што сучасны план поўнай “рэпрыватызацыі і дэмакратызацыі ўласнасных адносін”! Праўда, пакуль што, у адным Сапліцове, але ўсё ж на добры пачатак!

Тым часам прайшло гадоў восемдзесят, па дарозе было вызваленне царскім указам сялян ад прыгону, але адносіны паміж панамі і сялянамі чамусь не сталі больш справядлівымі і дэмакратычнымі. Міцкевіч-селянін так выказваецца пра паноў:

Яны без сэрца і сляпыя,
І ўсе заходы іх пустыя,
І пусты іх усе імкненні
Назад ход часаў павярнуць,
І дзіркі палкамі заткнуць,
І перарваць жывыя звенні,
Якіх вякі не перарвалі
У гістарычным перавале.
Ім цёмна, нема кніга лёсу,
Яны не бачаць далей носу
І рубяжоў свае пасады…
А ну іх к ліху! ну іх к ляду!

Перакладаючы гэты ўрывак, ніяк не мог я знайсці адказ на пытанне: адкуль такая татальная крытыка паноў, балазе ў ранейшых песнях ёсць станоўчыя доказы сімбіёза Міхала, скажам, хаця б з ляснічым, які заўчасна памёр. Міхал нагадвае:

— Не кепскі быў: і распытае
(Хай са святымі спачывае),
Як ты жывеш, ці ты галодны,

Ці ты спачыў, — як бацька родны,
Але, сказаць, яшчэ й не ўсякі!
А прынясеш што — без падзякі
Ужо не выпусціць, заплаціць,
А на дарэмшчыну не квапіць.
— Быў чалавек ён справядлівы,
Не фанабэрысты, праўдзівы, —
Ксавэры так жа пацвярджае.

А калі раней аўтар ахарактарызоўвае Міхала Міцкевіча, дык не цураецца падкрэсліць:

Яго ўся воласць наша знала,
Ён быў вядомы між панамі!
Ды што паны?! сам князь Антоні,
Я памятаю, як сягоння,
Не раз з Міхалам меў размову.
І знаў жа службу леснікову!..

З песні слова не выкінеш… Але не нам вырашаць тайну непаслядоўнасці Міцкевіча-Коласа ў дачыненні да пытання пра адносіны беларускіх паноў і сялян. У рэшце рэшт, паэма пісалася і ў сталінскі час…

Гляньма яшчэ на Беларусь вачыма Міцкевічаў-гурманаў. Вернемся да сталоў у Сапліцове:

А там пайшлі закускі і па ўсім застоллі
Такая пахла смаката, якой нікому
Цяпер не паспытаць і ні ў гасцях, ні дома.
Кунтузы ў соўсе, пінэлі і брунэлі
З гарнірам зборным, бламанжэ і фігатэлі […]
Дунайскай сцерлядзі, ружовай асятрыны,
Турэцкіх балыкоў у скрыліках цытрыны; […]
А весь кухарскі цуд — нярэзаная рыба
Ад галавы засмажана, а да хваста па хібу
Запечана і хвост — у соўсе. Здаецца,
Вось плясне ім — і соўс разальецца.

(Пераклад Я. Семяжона)

Гэта ў паноў. А як у сялянскай хаце банкетуе “ніштo сабе дружына” Міцкевічаў?

А на стале тым рай — ды годзе,
Што рэдка трапіцца ў народзе,
Ляжала шынка, як кадушка,
Румяна-белая пампушка,
Чырвона зверху, сакаўная,
Як бы агонь у ёй палае,
А ніз бялюткі, паркалёвы;
Кілбасы-скруткі, як падковы,
Між сцёган, сала і грудзінак
Красуе ўсмажаны падсвінак,

Чысцюткі, свежы і румяны,
Як бы паніч той надзіманы […]
Са смакам елі і багата —
На тое ж даў Бог людзям свята.

Чаго “нашыя паны беларускія” не ўмеюць — дык спяваць. А. Міцкевіч, сам жа ўкладальнік песень з юнацкіх год, не прыгадаў за ўсю паэму ніводнай песні. А ў Канстанціна Міцкевіча — сялянская Беларусь спявае. Ці то вяртаючыся з пахавання ды заліўшы чарвяка:

Ой, пайду дадому,
Не скажу нікому.
Ды зарэжу ката,
Бо наш кот — сірата!

Ці пасіліўшыся пасля падгляду пчол:

Без музыкі, без дуды
Ходзяць ногі не туды.
Грай жа, дудка мая!
Куды дудка, туды я!

А дзяўчына ці горшая за юнака:

Зайграйце, музыкі,
Каб я паскакала.
Купіў бацька чаравікі,
Каб я патаптала!

Беларускую фальклорную творчасць ведаў таксама дасканала і Адам. Яна натхняла ягоныя “Балады і рамансы” і трывожныя “Дзяды”; песня лунала і над “Панам Тадэвушам”. У эпілогу векапомнага твора паэт заклікаў і заклінаў будучыню, выяўляў найвялікшую мару свайго жыцця:

О, мне дажыць бы да гэткай уцехі,
Каб мае трапілі кнігі пад стрэхі,
Каб за кудзеляй сялянкі прысеўшы,
Песні любімыя даўнія спеўшы […]
Каб і мае ўзялі кнігі сялянкі,
Простыя кнігі, як іх калыханкі.
(Пераклад М. Танка)

Нашая прысутнасць тут, на зямлі беларускай, на радзіме двух Міцкевічаў — тытанаў дзвюх нацыянальных культур, хай будзе доказам таго, што споўніліся Адамавыя мары. Ягоныя кнігі, як і песні ягонага крэўнага праз агульнага беларускага продка, Міцьку, зажылі пад беларускімі стрэхамі. Ды яшчэ на гістарычнай мове іхніх дзядоў-прадзедаў, на якую Адамавы кнігі перакладаюцца выдатнымі мастакамі беларускага слова.

Будзем спадзявацца, што і Міцкевіч-Колас дачакаецца перакладу свайго сялянскага “Пана Тадэвуша” на польскую мову, над чым, дарэчы, працую і

ўжо пераступіў за палову. Такім чынам, можа, яшчэ перад канцом нашага стагоддзя мае суайчыннікі атрымаюць магчымасць прасачыць на сваёй мове культурную супастаўляльнасць польскага і беларускага паноў Тадэвушаў.

Мікалай Воінаў *(Гомель, Беларусь)*

“ПАН ТАДЭВУШ” АДАМА МІЦКЕВІЧА ВА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ ПЕРАКЛАДАХ

Эпапея “Пан Тадэвуш” сведчыла пра станаўленне ў А. Міцкевіча рэалістычных тэндэнцый, гісторыка-аб’ектыўнага падыходу да рэчаіснасці. Яна шырока ўпісалася ў агульнаеўрапейскі культурны кантэкст, стаўшы шэдэўрам славеснага жывапісу, пейзажна-выяўленчага майстэрства, тыпізацыі і індывідуалізацыі персанажаў.

М. Рыльскі назваў паэму найвялікшым творам сусветнай літаратуры, найбольш гарманічным у спадчыне польскага пісьменніка і адзначыў, “што “Пан Тадэвуш” з’яўляецца ў такой жа ступені энцыклапедыяй старога жыцця на Літве, як “Яўгеній Анегін” — сучаснага Пушкіну рускага жыцця” [1]. Не будзе перабольшаннем ці пераменшаннем, калі мы параўнаем славуты твор польскага песняра з нашай найвялікшай энцыклапедыяй жыцця беларускага народа — “Новай зямлёй” Якуба Коласа. У абодвух Міцкевічаў — глыбокая даніна ўдзячнасці роднай зямлі-карміцелькі, якая ўзгадавала сваіх слынных сыноў.

Захапленне чароўнымі краявідамі, любоў да бацькаўшчыны, бязмежная туга па ёй натхнілі вялікага Адама Міцкевіча на стварэнне геніяльных старонак славутай паэмы “Пан Тадэвуш”.

Велічна і ўрачыста гучаць пачатковыя радкі паэмы, якія потым стануць цяжкім выпрабаваннем для беларускіх перакладчыкаў, каб узнавіць іх сродкамі роднай мовы:

Litwo! Ojczyzno moja! Ty jesteś jak zdrowie.
Ile cię trzeba cenić, ten tylko się dowie,
Kto cię stracił. Dziś piękność twą w całej ozdobie
Widzę i opisuję, bo tęsknie po tobie. [2]

Гэты неўміручы твор перакладзены на шматлікія мовы народаў свету.

Доўгі час “Пан Тадэвуш”, як і іншыя паэмы, санеты, вершы польскага рамантыка, былі недаступнымі беларускамоўнаму чытачу. Тлумачылася гэта

[1] Рыльский М. Национальная эпопея // Мицкевич А. Пан Тадеуш, или Последний наезд на Литве: Шляхетская история 1811–1812 годов в двенадцати книгах стихами / Пер. с пол. С. Мар (Аксеневой). М., 1956. С. 7.

[2] Mickiewicz A. Pan Tadeusz. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk. С. 3–4.

многімі прычынымі: неўнармаванасцю беларускай мовы, болей таго, яе забаронай, адсутнасцю традыцый мастацкага перакладу, нераспрацаванасцю яго як у тэарэтычных, так і ў практычных адносінах.

Украінскі паэт і перакладчык неаднойчы ў сваіх працах называў А. Міцкевіча проста аўтарам паэмы "Пан Тадэвуш", тым самым засведчыўшы яе значнасць і каштоўнасць.

Засваенне творчай спадчыны А. Міцкевіча ў Беларусі пачалося ў змрочныя для беларускасці часы. Указам ад 18 ліпеня 1840 г. цар Мікалай I увогуле забараніў ужываць слова "Беларусь". У некаторых працах рускіх вялікадзяржаўных шавіністаў і польскіх кансерватараў ставілася пад сумненне само існаванне беларускай мовы.

Цыркуляр ад 1867 г. забараніў выдаваць беларускія кнігі лацінкай, не дазвалялася друкаваць іх і кірыліцай. Цэнзурныя ўмовы былі надзвычай жорсткімі, і таму тыя нешматлікія беларускія кнігі, якім пашанцавала ўбачыць свет, друкаваліся за межамі Беларусі — у Лондане, Жэневе, Кракаве.

Вось у такіх складаных умовах і ўзяўся В. Дунін-Марцінкевіч за пераклад "Пана Тадэвуша". У "Прадмове перакладца" пісьменнік сцвярджае, што хацеў, каб пазнаёміўся з выдатным творам польскай літаратуры "народ той просты, што з маткай-прыродай блізка жывець", і "дробная акалічная шляхта, што жывучы ў лясным зацішшы, у хаце, між сабою, сваёй роднай ужывае мовы" [3].

З жалем адзначае паэт, што праца яго не знайшла "прыяцеляў сярод тых багатых людзей нашай старонкі, што павэдлуг Бога і сумлення павінны б памагчы адкрыць цёмнаму народу вочы".

Але не суджана было кнізе дайсці да чытача. У 1858 г. Дунін-Марцінкевіч падаў у Віленскі цэнзурны камітэт рукапіс перакладу першых трох песень паэмы. Цэнзар Кукальнік адобрыў яго, і праз некаторы час у друкарні А. Сыркіна былі надрукаваны дзве часткі. Друкар звярнуўся ў камітэт за дазволам выпусціць кнігу ў свет. У гэты час якраз Кукальніка замяніў Мухін, які і забараніў распаўсюджванне кнігі. У лістападзе 1859 г. увесь тыраж (1000 экз.) быў здадзены ў Віленскі цэнзурны камітэт і спалены. Засталося, па сведчаннях даследчыкаў, тры экземпляры: у Расійскай нацыянальнай бібліятэцы імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу, бібліятэках АН Літвы і Кракаўскага універсітэта. З кракаўскага экземпляра, рукапісную копію з якога зрабіў Б. Эпімах-Шыпіла, і быў выдадзены пераклад у 1908 г. пецярбургскім выдавецтвам "Загляне сонца і ў наша аконца". У сувязі з гэтым выдаўцы пісалі: "Няхай жа ідзе гэта кніга праміж людзёў, няхай пакажа, што і ў нашай мове можна выгаварыць вялікія думкі, даці прыгожыя і слаўныя абразы" [4].

[3] Дунін-Марцінкевіч В. Зб. тв. Мн., 1958. С. 370.

[4] Тамсама. С. 369.

Такім чынам, мы бачым, што асноўная барацьба ў сувязі з перакладам разгарнулася наконт мовы: быць беларускай мове ці не, зможа яна стаць літаратурнай ці застанецца толькі гутарковай.

В. Дунін-Марцінкевіч сваёй працай даказаў: беларуская мова настолькі багатая і выразная, што можа ў паэтычнай форме перадаваць самыя тонкія адценні з'яў і пачуццяў чалавека, што на ёй можна пісаць творы не горшыя, чым на мовах іншых народаў. Гэта заўважылі і многія даследчыкі. Так, А. Кіркор пісаў: "Перакладчык пераадолеў нязведаныя цяжкасці. Пераклад не толькі правільны, але і мова ўсюды гарманічная, зразумелая і асабліва мяккая" [5]. Вось як у яго гучыць пачатак першай часткі:

Літва — родна зямелька! Ты, маўляў здароўе,
Той цябе ашанцуе, каму безгалоўе,
Хто жыў калісь на ніўцы тваёй, як у раі,
І вось крывавы роніць слёзкі ў чужом краі! [6]

Праца Дуніна-Марцінкевіча — гэта адна з першых спроб беларускіх пісьменнікаў XIX ст. перайсці ад мовы гутарковай да мовы літаратурнай. У той час наша мова не мела ў сваім лексіконе многіх слоў, у прыватнасці, абазначэнняў абстрактных паняццяў, і паэт смела ўводзіў іх у свой пераклад, чым узбагачаў мову.

Пераклад "Пана Тадэвуша", як ужо адзначалася, быў спалены. Але зерні, кінутыя руплівай рукой патрыёта, далі ўсходы. Адным з прадаўжальнікаў высакароднай справы В. Дуніна-Марцінкевіча стаў Арцём Вярыга-Дарэўскі. У ягоным "Альбоме", куды запісвалі свае творы пісьменнікі, з якімі Вярыга-Дарэўскі сустракаўся, ёсць запіс ад 3 лістапада 1858 г. В. Дунін-Марцінкевіч сваёй рукой запісаў туды тры ўрыўкі з перакладу "Пана Тадэвуша". Прачытаўшы ўвесь беларускі пераклад, А. Вярыга-Дарэўскі заахвоціўся і пераклаў вядомую паэму А. Міцкевіча "Конрад Валенрод".

Больш шчаслівы лёс напаткаў наступнага беларускага перакладчыка — Аляксандра Ельскага, які, па сведчанню Я. Карскага, быў знаёмы з В. Дуніным-Марцінкевічам. У 1892 г. у Львове выйшаў яго пераклад першай часткі паэмы А. Міцкевіча "Пан Тадэвуш". У "Слоўцы ад перакладчыка" А. Ельскі піша, што многія народы пераклалі гэту паэму на свае мовы, а "беларускі братні народ Міцкевіча, каторы быў яму найбліжчым к сэрцу", не мае свайго перакладу. Успамінае ён і аб працы В. Дуніна-Марцінкевіча, якая "марна прапала". "Чытаючы "Пана Тадэвуша", дарагія беларусы, — піша А. Ельскі, — палюбіце ўсім сэрцам родную, занядбаную, святую беларускую мову, каторая спрадвеку не толькі была вашай у сёлах, но яе ўжывалі самыя даўнейшыя манархі краю і іх вяльможы. Ваша старадаўная беларуская мова

[5] Живописная Россия: Литовское и Белорусское Полесье / Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. Минск, 1993. С. 327.

[6] Дунін-Марцінкевіч В. Зб. тв. С. 371.

мусіць варта чагось, калі можна на яе склад пераглумачыць найцальнейшыя паэтычныя творы вялікіх пісацеляў” [7].

На думку акадэміка Карскага, пераклад Ельскага “безумоўна складнейшы і лягчэйшы, чым пераклад Дуніна-Марцінкевіча”, “адразу кідаецца ў вочы правільны рытм, што ўласціва толькі танічнаму памеру, складаючаму прыналежнасць моў з рознамесным націскам”. Нагадаем пачатак гэтага перакладу:

Літва! Мая Айчына! Ты здароўю роўна,
Так веле той цябе ацэніць, хто пажыўшы поўна,
Цябе ўтраціў! Цяпер красу тваю я лепей знаю
І апішу, бо цяжка па табе скучаю”. [8]

З Карскім цяжка пагадзіцца. Пераклад А. Ельскага значна горшы, чым В. Дуніна-Марцінкевіча. У ім многа русізмаў. В. Дунін-Марцінкевіч, праявіўшы выключнае майстэрства і веданне беларускай мовы, здолеў дакладна ўзнавіць фармальныя асаблівасці арыгінала: кожны радок па 13 складоў, у вершах — парная рыфмоўка, строга вытрыманая жаночая рыфма, цэзура, якая дзеліць радок на дзве часткі. У перакладзе ж Ельскага не захоўваецца строгая роўнасць складоў, радкі маюць ад 10 да 16 складоў. Тлумачыцца гэта тым, што перакладчык свядома хацеў дабіцца літаральнасці. Ды і сам ён гэтага не адмаўляе: “Пералажыў я “Пана Тадэвуша” амаль даслоўна. Гэта даслоўнасць перакладу з тэксту польскага няхай будзе довадам брацтва дзвюх моў і двух народаў…”

У сусветнай літаратуры не так шмат прыкладаў, каб адзін і той жа твор перакладалі на адну мову некалькі разоў. У беларускай жа літаратуры гэтага ўвогуле не адзінкавыя прыклады. І сярод іх бессмяротны “Пан Тадэвуш”.

У страшных умовах турмы сапраўдны подзвіг здзейсніў Браніслаў Тарашкевіч, поўнасцю пераклаўшы славутую паэму на беларускую мову. Доўгія гады яго рукапіс быў у забыцці. Друк яго стаў дзякуючы вялікай працы беларускіх даследчыкаў, пісьменнікаў, рупліўцаў нацыянальнай культуры: удавы перакладчыка Ніны Аляксандраўны, якая захавала рукапіс перакладу ў Маскве, Зоські Верас, што паведаміла аб месцы знаходжання рукапісу; навукоўца А. Баршчэўскага, праз якога Варшаўскі універсітэт атрымаў копію рукапісу беларускага варыянта славутай паэмы. У 1971 г. польскі літаратурны альманах “Белавежа” апублікаваў чацвёрты раздзел паэмы А. Міцкевіча. Спрыяў выяўленню рукапіса А. Ліс, а выхаду яго ў свет — А. Мальдзіс, які напісаў прадмову, падрыхтаваў тэкст і каментарыі да выдання 1981 г. “Каментарыі да перакладу здзіўляюць сваёй энцыклапедычнасцю, а сам пераклад — багаццем мовы, творчым выкарыстаннем дыялектызмаў, дакладнасцю ў перадачы зместу і формы міцкевічаўскага пера-

[7] Беларуская літаратура XIX стагоддзя. Мн., 1988. С. 421.
[8] Тамсама. С. 422.

кладу” [9], — слушна сцвярджае ў прадмове да беларускага выдання А. Мальдзіс.

Вось як гучыць славуты пачатак паэмы:

Радзіма Літва! Як здароўе, так ты, дарагая;
як шмат цябе трэба цаніць, толькі той і спазнае,
хто страціў цябе. Усю красу тваю бачу дзіўную
й сягоння апісваю, бо па табе я сумую. [10]

Адзначаючы вартасці перакладу Б. Тарашкевіча, А. Ліс зазначае, што гэта не толькі здабытак нашай культуры, а і прыгожая старонка ў летапісе братэрства, якую пішуць лепшыя прадстаўнікі нашых народаў, самі народы вось ужо колькі стагоддзяў [11].

Аналагічны лёс у перакладчыка і яго працы Пятра Бітэля. Асуджаны ў 1950 г. да зняволення ў лагерах таталітарнага рэжыму, ён пераклаў на беларускую мову славутыя творы А. Міцкевіча і ў тым ліку паэму “Пан Тадэвуш”. Урывак з першай кнігі паэмы быў апублікаваны ў “Дні паэзіі” ў 1965 г. Поўны ж пераклад амаль праз паўстагоддзе нарэшце пабачыў свет. “Так знакаміты твор, перакладзены на нашу мову, увайшоў у кроў і плоць, зніта-ваўся з імем перакладчыка, які праробленую працу лічыў сваім найгалоў-ным творчым здабыткам, — узнёсла піша Язэп Янушкевіч. П. Бітэль пра-дэманстраваў бліскучае веданне беларускай і польскай моваў, здзяйсняю-чы свой пераклад без адпаведных слоўнікаў пад рукой. Толькі пакутны пе-раклад дзесяцігоддзі не мог пабачыць свету, і, нарэшце, гэты “лагерны помнік” выходзіць да 200-гадовага юбілею Адама Міцкевіча” [12].

Сёння ж мы ганарымся поўным і найбольш дасканалым перакладам, здзейсненым Язэпам Семяжонам. Дарэчы, кніга ў выдатным афармленні мастака Васіля Шаранговіча і лепшым па сённяшніх мерках перакладзе Я. Семяжона пабачыла свет у 1985 г. у выдавецтве “Мастацкая літаратура”. Па-сучаснаму гучаць неўміручыя радкі пачатку паэмы А. Міцкевіча:

Літва! Бацькоўскі край, ты як здароўе тое:
Не цэнім, маючы, а страцім залатое —
Шкада, як і красы твае, мой родны краю.
Тугою па табе тут вобраз твой ствараю. [13]

Традыцыя перакладаў польскага паэта на рускую мову ўзыходзіць да А. Пушкіна, які пераклаў балады “Будрыс и его сыновья”, “Воевода”. Як вядома, пасля паўстання 1830–1831 гг. творы А. Міцкевіча ў Расіі былі забаронены амаль да канца 50-х гг. мінулага стагоддзя. Аднак былі асобныя

[9] Міцкевіч А. Пан Тадэвуш / Пер. з пол. Б. Тарашкевіча. Мн., 1981. С. 3.
[10] Тамсама. С. 8.
[11] Ліс А. “Пан Тадэвуш” у турэмнай камеры / Далягляды: Літ. зб. Мн., 1976. С. 258.
[12] Янушкевіч Я. Ліцвінская Іліяда / Літ. і мастацтва. 1998. 4 верас.
[13] Міцкевіч А. Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве. Мн., 1985. С. 7.

спробы ўзнаўлення яго твораў на рускую мову М. Лермантава, М. Берга, невядомых перакладчыкаў. У канцы 50-х гг. рускія пераклады пачалі з'яўляцца часцей. Асобныя санеты пераклалі М. Лугаўскі, М. Сямёнаў, В. Пятроў, Л. Мядзведзеў, пазней А. Фет, А. Майкаў, І. Бунін. "Удивительнейшею вещью" назваў паэму "Пан Тадэвуш" М. Гогаль. Ва ўрыўках яна была вядома рускаму чытачу. Існаваў у XIX ст. і поўны пераклад, выкананы М. Бергам. Аб гэтым ведаў В. Дунін-Марцінкевіч, які зазначаў, што "Аповесць Адама Міцкевіча пад назвай "Пан Тадэвуш", якая так выдатна малюе характар, норавы і звычаі нашых літоўскіх гаспадароў у напалеонаўскія часы, ужо цяпер перакладаецца на рускую мову […] Уласна гэтая заўвага натхніла мяне думкай перакласці "Пана Тадэвуша" на беларускую мову".

Беларускі пісьменнік меў на ўвазе працу рускага перакладчыка М. Берга, які ў 50-я гг. XIX ст. друкаваў у "Отечественных записках" асобныя ўрыўкі знакамітай паэмы. Поўнасцю ж яго ўзнаўленне "Пана Тадевуша" было апублікавана ў 1875 г. [14] Поўны і найбольш дасканалы пераклад гэтага твора належыць С. Мар (Аксёнавай) — ён выйшаў асобнымі выданнямі, а таксама надрукаваны ў пяцітомным "Собрании сочинений".

Рэдакцыю перакладу зрабіў і прадмову да яго напісаў М. Рыльскі. Перакладчыцы ў цэлым ўдалося перадаць выключную прастату, жывапіс і музычнасць радкоў паэмы. Вось як велічна гучыць апісанне ігры на цымбалах:

Ударил вновь маэстро,
И звуки разрослись в могучий гром оркестра,
Литавров медный звон напомнил Третье мая,
И полонез гремит, гремит, не умолкая,
Все дышат радостью, пьют эту радость слухом,
Все рвутся танцевать, воспрянувшие духом,
А старцам грезятся излюбленные даты:
Счастливый день, в котором депутаты
С сенатом в ратуше, не ведая печали,
Народа с королем согласие венчали.
"Виват! — кричали все с восторгом и с любовью, —
Народу, королю и каждому сословью!" [15]

На Украіне з творчасцю А. Міцкевіча чытача пазнаёмілі П. Гулак-Арцямоўскі, Л. Баравікоўскі, П. Куліш, А. Наўроцкі, І. Рудчанка, М. Старыцкі, І. Франко. Асабліва плённа перакладалі творы А. Міцкевіча ўкраінскія паэты ў 20-я гг. нашага стагоддзя. Дзякуючы ім, некалькі разоў выходзілі яго "Выбраныя творы", асобнымі выданнямі — паэмы "Гражына" і "Пан Тадэвуш".

Лірыку, балады, паэмы польскага паэта перакладалі П. Тычына, М. Бажан, А. Малышка, М. Стэльмах, Л. Первамайскі, М. Цярэшчанка, Т. Масэн-

[14] Дунін-Марцінкевіч В. Творы. Мн., 1984. С. 428.
[15] Мицкевич А. Пан Тадеуш. М., 1956. С. 301.

ка, В. Швец. Адным з буйнейшых дасягненняў украінскай школы мастацкага перакладу з'яўляецца "Пан Тадэвуш", пераўвасоблены М. Рыльскім. Ён — выдатнейшы майстра, які ўзбагаціў украінскую літаратуру перакладамі твораў А. Пушкіна, М. Лермантава, А. Міцкевіча, Ю. Славацкага, французскіх класікаў, шматлікіх пісьменнікаў славянскіх народаў. Яго пераклад "Пана Тадэвуша" быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй (1950).

Першае выданне паэмы з'явілася ў 1927 г. і было высока ацэнена чытачамі і крытыкай. У 1948 г. М. Рыльскі перагледзеў стары пераклад і зрабіў новы, больш дасканалы варыянт. Ён здолеў узнавіць асаблівасці арыгіналу, багацце думак польскага пісьменніка, самабытнасць яго стылю. Цікава, да прыкладу, яднае паэт смешнае і гераічнае пры ўзнаўленні рамантычнага "палёту" графа:

Граф полюбляв чудні видовища й пригоди,
Звав романтичністю. Казав, що э з природи
Романтик він і сам. Та й справді був дивак:
Не раз, полюючи, забуде про собак,
Що гонять звірину, коня зненацька спинить
І в небо дивиться, і смутно погляд мінить,
Як кіт, побачивши на сосні горобців. [16]

"Пан Тадэвуш" — паэма сапраўды народнага гучання. Яна напісана на фальклорным матэрыяле, мае ярка выяўлены нацыянальны каларыт. Гэтыя асаблівасці тонка адчуў М. Рыльскі і па-мастацку ўзнавіў іх на украінскай мове:

Росте гармонія, зміцняється і плине —
І раптом піснею прорвалася вона
Про вояка того, що дальня чужина
Його з могилою у полі обвінчала,
Що мурава його китайкою вкривала,
Що коник копитом для нього землю рив…[17]

Пераклады "Пана Тадэвуша" на ўсходнеславянскія мовы — даніна бессмяротнай музе вялікага польскага песняра.

У дні святкавання 200-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча значна ўзрасла цікавасць да творчасці вялікага польскага паэта. Думаецца, што гэта дасць плён у садружнасці, літаратурным пабрацімстве нашых народаў. Будуць новыя адкрыцці, новыя пераклады, новыя прачытанні бессмяротных радкоў нашага слыннага земляка.

[16] Міцкевич А. Пан Тадеуш / Пер. і вступня стаття М. Рильского. Київ, 1949. С. 65.
[17] Тамсама. С. 364.

Алеся Літвіноўская *(Мінск)*

ПАЛАНІЗМЫ І РУСІЗМЫ Ў ПЕРАКЛАДЗЕ “ПАНА ТАДЭВУША” АЛЯКСАНДРА ЕЛЬСКАГА

Сярод пяці вядомых беларускіх перакладаў “Пана Тадэвуша” адным з найменш даследаваных у лінгвістычным аспекце з’яўляецца пераклад Аляксандра Ельскага, апублікаваны ў 1892 г. у Львове. Малую ўвагу навукоўцаў да гэтай працы можна растлумачыць у першую чаргу тым, што Ельскі пераклаў “Пана Тадэвуша” не цалкам, а толькі першую кнігу, ці быліцу, а таксама, як зазначаў Уладзімір Казбярук [1], не вельмі высокім мастацкім узроўнем перакладу (у параўнанні, напрыклад, з вядомым тэкстам В. Дуніна-Марцінкевіча). Тым не менш, пераклад Ельскага выклікае бясспрэчную навуковую цікавасць, бо, нават пры ўсіх сваіх недахопах, ён не толькі адлюстроўвае моўныя прыхільнасці самога перакладчыка, але і дае ўяўленне пра стан беларускай мовы ў канцы XIX ст., паколькі, як і ўсе тагачасныя беларускамоўныя паэты і пісьменнікі, Ельскі ў сваёй творчасці абапіраўся на найбольш блізкую яму гаворку (сярэднебеларускую).

Перакладчык быў даволі высокай думкі пра сваю працу, таму што лічыў яе адзіным перакладам вядомага твора А. Міцкевіча на беларускую мову. Ён быў упэўнены, што ранейшы пераклад Дуніна-Марцінкевіча не дайшоў да суайчыннікаў, бо быў “арыштаваны” і знішчаны. Таму Ельскі адчуваў сваю адказнасць за тое, як зразумеюць паэму на Беларусі. Ён спадзяваўся, што “чытаючы “Пана Тадэвуша”, дарагія беларусы палюбяць усім сэрцам сваю родную, занядбаную, святую беларускую мову […] якая, мусіць, варта чагось, калі можна на яе склад ператлумачыць найцальнейшыя паэтычныя творы вялікіх пісьменнікаў” [2]. У сваёй прадмове Ельскі падкрэсліваў, што імкнуўся перакласці тэкст паэмы амаль даслоўна і лічыў гэта апраўданым. Такое стаўленне, безумоўна, не магло не паўплываць на мастацкую якасць тэксту, дзе, напрыклад, сустракаюцца радкі, якія перакладчык палічыў за лепшае ўзяць жыўцом з арыгінала або ўвесці ў іх нязначныя змены (так бы мовіць, “абеларусіць” іх).

Такім чынам, у тэксце перакладу побач з агульнаўжывальнымі беларускімі словамі і вузкімі дыялектызмамі сустракаецца вялікая колькасць паланізмаў і нават паасобныя русізмы.

Пад паланізмамі мы разумеем словы, якія прыйшлі з польскай мовы або праз польскую з нямецкай, французскай, лацінскай, грэчаскай і г. д. Іншыя “старыя” запазычанні з польскай мовы, шырока распаўсюджаныя

[1] Казбярук У. На досвітку адраджэння // Полымя. 1998. № 4. С. 218–219.

[2] Jelski A. Słaŭco ad tłumacza // Mickiewicz A. Pan Tadeusz. Kn. 1. Lwoŭ, 1892. S. 4.

ў беларускіх гаворках (кшталту лексем *чаравікі, кабета* і пад.), у дадзеным выпадку не разглядаюцца.

Пад русізмамі разумеюцца запазычанні з рускай або царкоўнаславянскай моваў, хутчэй за ўсё невядомыя беларускім гаворкам сярэдняй паласы.

Паланізмаў у тэксце налічваецца больш за 300 адзінак (332), прычым большую частку лексем перакладчык прывёў у адпаведнасць з фанетычнымі законамі беларускай мовы (80%), астатнія ж захаваў у польскім фанетычным афармленні.

Фанетычныя з'явы аканне і яканне абсалютна паслядоўна перадаюцца ва ўсіх польскіх запазычаннях (86 і 30 выпадкаў). Прычым яканне ў Ельскага звычайна распаўсюджваецца на ўсе ненаціскныя склады: *radzina* – пол. *rodzina* 'сям'я', *abajentna* – пол. *obojętnie* 'абыякава', *wiela* – пол. *wiele* 'шмат', *dziadzictwa* – пол. *dziedzictwo* 'спадчына'.

Таксама паслядоўна перадаецца характэрнае для беларускай мовы фанетычнае падаўжэнне, якое адпавядае польскаму мяккаму зычнаму ў інтэрвакальнай пазіцыі (11): *milczenńie* – пол. *milczenie* 'маўчанне', *wantpieńnie* – пол. *wątpienie* 'сумненне', *pażyćcie* – пол. *pożycie* 'сумеснае жыццё'.

Амаль ва ўсіх выпадках (21) польскаму спалучэнню *rz* адпавядае характэрны для беларускай мовы цвёрды гук *r*: *precia* – пол. *przecież* 'аднак', *brask* – пол. *brzask* 'світанне', *muryn* – пол. *murzyn* 'негр'. Выключэнне складаюць дзве лексемы *krzywiŭsia* і *przyjdzia*, у якіх спалучэнне *rz* захоўваецца.

Трэба зазначыць непаслядоўную перадачу выбухнога *g*, які перадаецца праз *h* фрыкатыўны ў 11 выпадках і захоўваецца ў 9-ці: *hrecznaść* – пол. *grzeczność* 'ветлівасць', *hracz* – пол. *gracz* 'ігрок', *papuha* – пол. *popuga* 'папугай', але *uzglond* – пол. *wzgląd* 'погляд', *gors* – пол. *gors* 'карсет', *granatowy* – пол. *granatowy* 'цёмна-сіні'.

На месцы польскага *w* у пазіцыі перад зычным перакладчык ужывае u або ŭ (14): *ucala* – пол. *wcale* 'увогуле', *zaŭsza* – пол. *zawsze* 'заўсёды', *uspaniały* – пол. *wspaniały* 'прыгожы'. Але ўжо, напрыклад, слова са значэннем 'позірк' мае ў тэксце два варыянты: *uzrok* і *wzrok*.

Насавыя гукі ў большасці выпадкаў захоўваюцца (16) і перадаюцца праз спалучэнне *en* і *an*, напрыклад,: *nencić* – пол. *nęcić* 'прывабліваць', *cienżar* – пол. *ciężar* 'цяжар', *nandzar* – пол. *nędzaz* 'жабрак', *wantpieńnie* – пол. *wątpienie* 'сумненне'. Але ёсць шэраг слоў (7), у якіх адбываецца страта назальнасці: *sprat* – пол. *sprzęt* 'рэчы', *jakacca* – пол. *jąkać się* 'заікацца'.

Польскай фанетычнай з'явай можна лічыць і ўжыванне няпоўнагалосных канструкцый (5): *błonia* – пол. *błonie* 'луг, выган', *krulować* – пол. *królować* 'цараваць', *kłutnia* – пол. *kłótnia* 'сварка', *mładzieniec* – пол. *młuodzieniec* 'маладзён'.

У тэксце перакладу сустракаюцца таксама паасобныя выпадкі ўжывання цвёрдага *dz* (6): *uradzeńnia* – пол. *urodzenie* 'нараджэнне', *dzwanok* – пол.

dzwonek ‘званок’, *uładza* – пол. *władza* ‘улада’, *wodz* – пол. *wódz* ‘правадыр’, і групы *dl* (3): *spudłować* – пол. *spudłować* ‘даць маху’, *pasiadłaść* – пол. *posiadłość* ‘уладанне’.

Запазычанні з рускай мовы ў тэксце сустракаюцца рэдка (12 выпадкаў), прычым, у адрозненне ад паланізмаў, усе яны, за выключэннем двух выпадкаў, аформлены ў адпаведнасці з фанетычнымі законамі беларускай мовы: паслядоўна перадаецца аканне і яканне (7) (*żudka, abjaśnić, panimaju, źwiazda*), дзеканне (*dzieła*, *maładzioż*), цвёрды *r* (*prykaz*, *sporyć*), фрыкатыўны *h* (*hłasiaszczyja*), цеканне (*razjaśniajuć*). Неадаптаванымі з’яўляюцца дзве лексемы царкоўнаславянскага паходжання: *hłasiaszczyja* і *złaty*, у якіх захоўваецца няпоўнагалоссе.

Аналіз вывучанага матэрыялу дае магчымасць меркаваць пра пошукі А. Ельскага ў галіне нармавання беларускай мовы. Сам перакладчык быў упэўнены, што “Беларусь выпрацуе сваю “гаворку” да ступені мовы” (ліст да Яна Карловіча ад 16–28 лютага 1890 г.), і актыўна дзейнічаў у гэтым накірунку, не толькі тэарэтычна асэнсоўваючы асаблівасці беларускай мовы, але і выкарыстоўваючы веды на практыцы ва ўласных творах і перакладах.

У свае тэксты пісьменнік шырока ўводзіў запазычанні, калі лічыў, што яны больш дакладна перадаюць змест твора. Прычым, гэта часцей за ўсё былі запазычанні з польскай мовы, якія ў большасці выпадкаў падаваліся перакладчыкам у адпаведнасці з фанетычнымі законамі беларускай мовы. Як мы маглі бачыць вышэй, у іх назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя паслядоўнай перадачы з’яў акання і якання, падаўжэння зычных, ужывання цвёрдага *r* на месцы спалучэння *rz*. У той час як для перадачы насавых галосных, выбухнога *g*, спалучэння *dz*, *w* перад зычнымі, няпоўнагалосся характэрна непаслядоўнасць, наяўнасць дублетаў.

Калі параўнаць адносіны да запазычанняў А. Ельскага і Б. Тарашкевіча ў “Беларускай граматыцы для школ”, якая фактычна была першай удалай спробай кадыфікацыі беларускай мовы, можна зазначыць, што Ельскі вылучыў і адлюстраваў у першую чаргу тэндэнцыю да пашырэння акання (і якання) на запазычанні, якая была акрэслена і Тарашкевічам.

Такім чынам, для спробы Ельскага нармалізаваць беларускую мову характэрна значная непаслядоўнасць, што цалкам зразумела ў перыяд адсутнасці замацаваных літаратурных нормаў. Але яго пошукі, безумоўна, мелі мэтанакіраваны творчы характар, паколькі яны засноўваліся на веданні асноўных моўных заканамернасцей і былі накіраваны на стварэнне паўнавартаснай літаратурнай мовы.

Можна зазначыць, што выбар паэмы Адама Міцкевіча для перакладу быў невыпадковым, таму што менавіта на творы такога высокага мастацкага ўзроўню можна было з найбольшым эфектам прадэманстраваць магчымасці маладой беларускай літаратурнай мовы.

Яўгенія Волкава *(Мінск)*

АСАБЛІВАСЦІ ЎЗНАЎЛЕННЯ ВОБРАЗНЫХ ПАРАЎНАННЯЎ У БЕЛАРУСКІХ ПЕРАКЛАДАХ ПАЭМЫ АДАМА МІЦКЕВІЧА “ПАН ТАДЭВУШ”

Паэтычны вобраз — адзін з важнейшых кампанентаў мастацкай сістэмы вершаванага твора. Таму і галоўная задача перакладчыка паэзіі — адпаведнае ўзнаўленне вобразнай сістэмы арыгінала.

Значнае месца сярод стылістычных сродкаў, якія выкарыстоўвае аўтар любога мастацкага твора, займаюць такія вобразныя сродкі, як метафара, метанімія, сінекдаха, вобразнае параўнанне і інш. Перакладчык павінен перадаць сістэму вобразных сродкаў, выкарыстаных у тэксце, такім чынам, каб у сваёй сукупнасці вобразныя сродкі перакладу рабілі такое ж самае эмацыянальнае ўздзеянне на чытача, як і адпаведныя сродкі арыгінала [1]. Існуюць розныя погляды на спосабы дасягнення гэтай мэты. Мы далучаемся да думкі А. Таркоўскага, які лічыў, што перакладчык не павінен “навязваць аўтару арыгінала ўласны погляд на паэзію, уласнае разуменне яе існасці, з усімі праявамі, якія адгэтуль вынікаюць, са сваімі метафарамі, са сваімі мастацкімі прыёмамі” [2]. Але характэрная рыса паэтычнай мовы — гэта яе жорсткія абмежаванні ў плане выяўлення (метр, рыфма, гукапіс і інш.). Таму пры перакладзе ўзнікае неабходнасць пэўных трансфармацый. Супастаўленне вершаванага перакладу з арыгіналам дапамагае ўявіць глыбіню і разнастайнасць змен, якія спазнаюць вобразы арыгінала, высветліць ступень іх непазбежнасці, дапусчальныя маштабы.

Паэтычная мова А. Міцкевіча ў эпапеі “Пан Тадэвуш” надзвычай багатая на вобразныя сродкі. Тут і разнастайныя эпітэты, параўнанні, нечаканыя метафары, маляўнічыя перыфразы, афарызмы. Аднак спынім увагу выключна на параўнаннях, паколькі яны займаюць найбольш значнае месца ў паэме сярод іншых вобразных сродкаў.

Перакладчыкі карыстаюцца шматлікімі прыёмамі для перадачы вобразных параўнанняў. Даволі вялікая колькасць параўнанняў застаецца амаль без змен:

Jaskółka… *spada jak kula…* [3]

Ластаўка… *упала як куля.* [4]

(С. Дзяргай)

---

[1] Комиссаров В. Н., Рецкер Я. И., Тархов В. И. Пособие по переводу с английского языка на русский. М., 1965. Ч. 2. С. 152.

[2] Цыт. па: Садоўскі П. Культурна-моўныя пытанні беларускага перакладу // Полымя. 1981. № 7. С. 178.

[3] Арыгінал цыт. па: Poezye Adama Mickiewicza. Mikołów, 1898.

[4] Пераклады П. Бітэля, С. Дзяргая, М. Танка цыт. па: Міцкевіч А. “Зямля Навагрудская, краю мой родны…” Мн., 1969.

… poczwórne skrzydełka
Lekkie jak pajęczyna, *przejrzyste jak szkiełka.*

… чатыры крылечкі
Так *лёгенькі, як павучынне*, *празрысты, як шклечкі.* [5]
(Б. Тарашкевіч)

і *tuląc główki jak pisklęta…*

і *тулячысь, як курчаняты*.
(Б. Тарашкевіч)

А тыя невялікія трансфармацыі, што ўсё ж адбываюцца ў перакладах, не парушаюць і не скажаюць вобразны малюнак, створаны А. Міцкевічам.

Але часам здараецца так, што нават нязначныя, на першы погляд, змены разбураюць аўтарскі вобраз:

Nieraz *nowina,* niby *kamień* z nieba, spadała…

Не раз *навіны,* як *каменне* з неба, валіліся… [6]
(Я. Семяжон)

Тут перакладчык толькі змяняе лік суб'екта параўнання: *nowina – навіны,* а адзінкавы назоўнік (прадмет параўнання) замяняе зборным *kamień – каменне.* У выніку вобраз, які перадае адзінкавасць і нечаканасць, трансфармуецца ў сваю супрацьлегласць: пры мноства навінаў элемент нечаканасці страчваецца.

Ёсць выпадкі замены параўнальнага звароту са злучнікам на параўнанні, выражаныя склонавымі формамі назоўнікаў. Замена можа адбывацца на так званы творны параўнання:

Jaskółka, czarny obłok *przeszywa jak strzała*.
ластаўка, чорную тучу *прашыўшы* ***стралою***.
(Б. Тарашкевіч)

Ryknęły jak niedźwiedzie
Зарыкала ***мядзведзем***.
(С. Дзяргай)

Равуць ***ведзмядзямі***.
(Б. Тарашкевіч)

Раве параненым ***мядзведзем***.
(Я. Семяжон)

spada jak ***kula***.
куляй *ляціць* к зямлі.
(Я. Семяжон)

[5] Пераклад Б. Тарашкевіча цыт. па: Міцкевіч А. Пан Тадэуш. Ольштын, 1984.
[6] Пераклад Я. Семяжона цыт. па: Міцкевіч А. Пан Тадэвуш. Мн., 1985.

Зафіксаваны выпадкі перакладу параўнальнага звароту азначэннем-прыдаткам:

Lejki, jako szampańskie kieliszki wysmukłe.

Як смуклыя *шампанскія* ***кілішкі-лейкі***.

(П. Бітэль)

...gruby zegarek jak gruszka.

вялізны гадзіннік, ***таўшчэразную дулю***.

(Б. Тарашкевіч)

...promyki słoneczne.
Wpadły przez szyby, *jako strzały brylantowe.*

Праменне, ***дыяментавыя стрэлы***,
Пранікшы праз акно…

(Я. Семяжон)

Як бачна з прыведзеных прыкладаў, семантычныя і сэнсава-стылістычныя змены пры такіх спосабах перакладу параўнальных зваротаў не адбываюцца.

Часам структура параўнальнага зварота парушаецца, напрыклад, можа быць прапушчана аснова параўнання:

…miał jedyne dziecię,
Córkę ***piękną*** *jak anioł.*

Меў толькі адну *дочку,*[прыгожую] *маўляў анялочак.* [7]

(В. Дунін-Марцінкевіч)

...gryka jak śnieg ***biała***.

...грэчка [белая]*, быццам снег*.

(П. Бітэль)

...usta ***kraśne*** *jak wiśnie bliźnięta.*

А вусны — нібы вішанькі-блізняткі.

(Я. Семяжон)

Маўляў, вішанькі — губкі.

(В. Дунін-Марцінкевіч)

Але нягледзячы на пропуск асновы параўнання, вобраз тут не страчвае мастацкай цэласнасці, бо аснова лёгка аднаўляецца па асацыяцыі — аб'ект і прадмет параўнання абавязкова маюць тыя ці іншыя агульныя рысы, якія замацаваліся ў свядомасці носьбітаў беларускай і польскай моваў.

[7] Пераклад В. Дуніна-Марцінкевіча цыт. па: Дунін-Марцінкевіч В. Творы. Мн., 1984.

А вось у наступным прыкладзе пропуск асновы параўнання (*gruby — тоўсты*) прывёў да зацямнення сэнсу параўнання: у перакладзе незразумела, на падставе чаго параўноўваюцца *гадзіннік* і *груша* — формы ці велічыні:

…***gruby*** zegarek *jak gruszka*.

Гадзіннік свой шукаў, *падобны да ігрушы*.

(Я. Семяжон)

Назіраецца і адваротная з'ява — аднаўленне асновы параўнання ў перакладзе пры адсутнасці яе лексічнага выражэння ў арыгінале:

Litwo! Ojczyzno moja! ty jesteś *jak zdrowie.*

Літва! Радзіма, *як здароўе,* ***дарагая***.

(П. Бітэль)

Радзіма Літва! *Як здароўе*, так ты ***дарагая***.

(Б. Тарашкевіч)

Аднаўленне асновы (*дарагая*) тут, відаць, залішняе, тым больш што далей паэт тлумачыць сваё параўнанне:

Litwo! Ojczyzno moja! ty jesteś jak zdrowie:
Ile cię trzeba cenić, ten tylko się dowie,
Kto cię stracił.

Як шмат цябе трэба цаніць, толькі той і спазнае,
Хто страціў цябе.

(Б. Тарашкевіч)

Гэтае тлумачэнне можна лічыць своеасаблівай разгорнутай асновай параўнання, якая мае афарыстычную форму і таму не патрабуе ўдакладнення (як вядома, адна з асаблівасцей афарызма — яго лаканічнасць).

Абцяжарванне параўнальных зваротаў лішнімі словамі адбываецца і тады, калі няўскладненае параўнанне перакладаецца ўскладненым:

Ociera bagnet z rury, *jako knot* ze świecy

Штык з дула *сатрэ*, *моў,* са свечкі той *кнот* ***закапцелы***.

(Б. Тарашкевіч)

...gęstość miodowego płynu.

...гушчыня, як мёд ***пчаліны***.

(Я. Семяжон)

У дадзеным кантэксце прадметы гэтых параўнанняў (*кнот*, *мёд*) не патрабуюць дадатковых тлумачэнняў, паколькі названыя ўласцівасці (*закапцелы*, *пчаліны*) закладзены ў семантыцы азначаемых слоў, якія характарызуюцца і не маюць асаблівага значэння пры стварэнні вобраза. Магчыма, такія змены былі выкліканы пэўнымі патрабаваннямі рытмікі верша.

Замены аўтарскай асновы параўнання пры захаванні прадмета параўнання — вельмі рызыкоўны прыём. Ён можа суправаджацца і ўдачай:

Słońce nad nim *czerwone jak pożar* na dachu.

...захад… палае, *нібы пажар* на даху.
(Я. Семяжон)

...гарэла сонца, *як пажар* на даху.
(П. Бітэль)

Агульнае значэнне *"вогненнасці"* слоў *сонца* і *пажар* дазваляе перакладчыкам замяніць прыметнік *czerwone* (чырвонае) на дзеясловы, якія абазначаюць дзеянні, уласцівыя агню: *гарэць*, *палаць*.

А недакладная перадача асновы параўнання зніжае якасць перакладу:

…sposoby gotowania trunku,
który ma *czarność węgla*, *przejrzystość bursztynu.*

…сапраўдны трунак:
…колер, быццам пацеркі з бурштыну.
(Я. Семяжон)

Назоўнікі *przejrzystość* (празрыстасць) і *колер* маюць розную семантыку. Такая замена асновы параўнання прывяла да скажэння не толькі вобразнасці, але і рэальнага факта: сапраўдная кава мае чорны колер (што і паказвае А. Міцкевіч — *czarność węgla*), а не колер бурштыну. Да таго ж перакладчык дадае дэталь, якая толькі замінае разуменню вобраза — *пацеркі з бурштыну*, паколькі тут уступаюць у супярэчнасць паняцці "*колер*" і "*форма*".

Зрэдку, захоўваючы аснову параўнання, перакладчыкі замяняюць прадмет параўнання на кантэкстуальна блізкі:

Jezdni *migają jak duchy*.

...мігаліся езныя, *быцта бы цені*.
(Б. Тарашкевіч)

...leżą jak barany Dżokeje w pętach.

...ляжаць як цяляты Джакеі ў путах.
(Б. Тарашкевіч)

Такія замены, хоць і не з'яўляюцца адпаведнымі паводле слоўнікавых значэнняў слоў, у гэтым кантэксце добра перадаюць характар вобразаў: у першым выпадку — бесцялеснасць (*duchy — цені*), у другім — жывёльную пакору (*barany — цяляты*).

Недакладны падбор азначэння, пры захаванні астатніх структурных адзінак параўнальнага звароту, робіць недакладным усё параўнанне:

…gnieździ się ryś bystry,
I żarłoczny rosomak, ***jak czujne ministry***...

…**як *нейкія* міністры**,
гняздзяцца шэры воўк з драпежнай рыссю.

(М. Танк)

З “дапамогай” такіх замен аўтарскі вобраз страчвае сваю дакладнасць.

Даволі часта параўнанне ў перакладах не захоўваецца, а замяняецца азначэннем ці словам з адпаведнай семантыкай. Гэта, у асноўным, датычыць

а) устойлівых параўнанняў:

…gryka jak *śnieg biała*…

…грэчка *бяленька.*

(В. Дунін-Марцінкевіч)

…w… *szatach jak śnieg jasnych*...

…у *белых* уборах.

(Б. Тарашкевіч)

Włosy ...*jak len białe*...

Бялела некалькі галоў дзяціных.

(Я. Семяжон)

б) параўнанняў, што не маюць вялікай сэнсавай нагрузкі:

…*siedzi jak mnich* na swym dworze.

...*сядзіць адзінокі* дома.

(В. Дунін-Марцінкевіч)

...*szal*…, *czerwony jak krwawnik*

...*пурпурны палантын.*

(Я. Семяжон)

А наступнае параўнанне мае вялікае значэнне для характарыстыкі эмацыянальнага стану героя:

We dworze, gdzie przed chwilą tyle było krzyku,
Teraz *pusto i głucho, jak na mogilniku*…

Параўноўваючы пусты двор з могілкамі, аўтар нібыта глядзіць на яго вачыма маладога чалавека, які толькі што перажыў першае ў жыцці страшэннае расчараванне. Вобраз могілак з’явіўся тут невыпадкова — пазней у героя ўзнікне думка аб самагубстве. А перакладчык перадае гэты эмацыянальна афарбаваны вобраз нейтральным:

А на дварэ, дзе скрозь было ад коней збойна
І вэрхал — шум стаяў, *цяпер ужо спакойна*.

(Я. Семяжон)

На жаль, некаторыя параўнанні арыгінала зусім не трапляюць у пераклады. Але перакладчыкі, у якасці “кампенсацыі”, часам ужываюць свае вобразныя параўнанні там, дзе іх няма ў арыгінале:

…u nas towarzystwo *liczne.*

…гасцей, *баш снапоў у гарудзе.*

(В. Дунін-Марцінкевіч)

Szybko wpadając gajowy…

Ляснік, *уляцеўшы, як куля.*

(Б. Тарашкевіч)

…okiem *czerwonem.*

…а вока, *нібы крывёй налітае.*

(Я. Семяжон)

Перакладчыкі даволі асцярожна ставяцца да ўжывання ўласных параўнанняў. Аднак здараюцца і грубыя парушэнні стылістычнай афарбоўкі і аўтарскай трактоўкі вобраза:

Od której choć w zalotach *został pogardzony.*

І хоць *яна была* з ім *злоснаю тыгрыцай.*

(Я. Семяжон)

І гэта словы пра Зосю, якой А. Міцкевіч прысвяціў ледзь не самыя пяшчотныя і ўзнёслыя радкі ў паэме!

Ужываюць перакладчыкі і параўнанні, у аснове якіх ляжаць агульнавядомыя назіранні і факты і якія замацаваліся ў народна-гутарковай мове як устойлівыя выразы:

Choć sam *nic nie posiadał.*

Хоць *гол быў, маўляў бізун.*

(В. Дунін-Марцінкевіч)

Biała twarz…

…баш *малако — шчочкі.*

(В. Дунін-Марцінкевіч)

Wre szlachta.

А шляхта *кіпіць бы ў катле.*

(Б. Тарашкевіч)

Człowiek stary, lecz *krępy i bardzo pleczysty.*

Ён, стараваты
З аблічча, станам *быў, як дуб, камлюкаваты.*

(Я. Семяжон)

Такія параўнанні арганічна ўпісваюцца ў структуру вобразаў паэмы А. Міцкевіча “Пан Тадэвуш”, паколькі і сам паэт даволі часта ўжывае параўнанні падобнага тыпу.

Сустракаюцца і іншыя спосабы ўзнаўлення ў перакладзе аўтарскай вобразнасці. Напрыклад, параўнанне перадаецца рытарычным пытаннем:

I Klucznik był *podobny rysiowi rannemu*.

Ну чым не рысь, параненая стрэлам?
(Я. Семяжон)

Пры ўсім захаванні вобразных кампанентаў параўнання тут змянілася стылістычная афарбоўка выказвання.

Параўнанне, насычанае вобразамі і ў той жа час вельмі лаканічнае, перакладчык палічыў магчымым раскласці на два параўнанні рознай структуры:

I *ząbki*, co *jak perły śród koralów świecą*.

...і бальзамінам
палаюць вусны (1), *зубкі* роўным радам
Бялеюць нібы жэмчуг (2).
(Я. Семяжон)

Пры гэтым вобразнасць захоўваецца, але страчваецца лаканічнасць.

Праведзенае даследаванне перадачы вобразных параўнанняў у перакладах яшчэ раз пацвярждае: у працы перакладчыка няма дробязей. Пераклад кожнага без выключэння слова патрабуе пранікнення ў кантэкст твора, у аўтарскую канцэпцыю вобраза, патрабуе карпатлівых пошукаў лексічных і граматычных эквівалентаў.

Кацярына Хазанава *(Гомель, Беларусь)*

МОЎНЫЯ ЗДАБЫТКІ ЯНКІ КУПАЛЫ Ў ПЕРАКЛАДНЫХ ТВОРАХ АДАМА МІЦКЕВІЧА

У творчай спадчыне Купалы-перакладчыка яскрава вылучаюцца пераклады твораў Адама Міцкевіча. Класік польскай літаратуры XIX ст. з поўным правам належыць і да беларускай літаратуры. Сёння, калі адзначаецца 200-годдзе з дня нараджэння вялікага паэта славяншчыны, існуюць шматлікія выдатныя пераклады яго твораў на беларускую мову. Але, па сутнасці, распачаў гэтую пачэсную справу Янка Купала, які яшчэ ў пачатку XX ст. адкрыў творчасць Міцкевіча беларускаму чытачу. Купала не толькі перакладаў, але і вучыўся ў Міцкевіча паэтычнаму майстэрству, выхоўваўся на ўзорах ягонай паэзіі, якую ведаў з маленства.

Украінскі паэт, перакладчык твораў Міцкевіча на сваю мову Максім Рыльскі пісаў: “Якая цяжкая праца — перакладаць Міцкевіча! Як гэты вялікі паэт можа спалучаць розныя таны і не апынацца ў дысгармоніі! З якой яркасцю ён бачыць ўсё багацце фарбаў свету!” [1] Купала здолеў перадаць гэтыя яркасць і багацце міцкевічаўскіх твораў беларускай мовай.

Зварот Купалы да творчасці Міцкевіча быў своеасаблівай паэтычнай школай, бо яго творчасць — няспынны рух на вышыні чалавечага розуму і разам з тым выпрабаванне беларускага духу польскай мовай.

Цікавымі ўяўляюцца моўныя здабыткі купалаўскіх перакладаў. Яны сталі асаблівым прыкладам міжмоўнай польска-беларускай камунікацыі. У творчай лабараторыі перакладчыка пераўтварэнне польскамоўных твораў у беларускамоўныя пры абавязковым захаванні зместу здзяйснялася на розных іерархічных моўных узроўнях.

Шматлікія словы мовы арыгінала (МА) Купала ўжываў і ў мове перакладу (МП), што тлумачыцца блізкасцю дзвюх славянскіх моваў, шматгадовым культурным узаемаўплывам, абумоўленым геаграфічным суседствам беларусаў і палякаў, і знаходжаннем на працягу стагоддзяў у складзе адной дзяржавы (Вялікім Княстве Літоўскім, пазней Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі).

Роднаснасць славянскіх моў праявілася ў лексіка-семантычных групах:

назвах роднасці і свяцтва: brat [2] – брат [3]; kum (В, 61) – кум (Ш, 334);

частак цела чалавека: paznokcie [4] – пазногці (Ш, 334); łeb (В, 61) – лоб (Ш, 333);

прадметаў: miecz (Р, 16) – меч (V, 230); beczka (В, 61) – бочка (Ш, 334); wieża (Р, 16) – вежа (V, 231);

жывёл і раслін: koń (В, 63) – конь (Ш, 335); las (Р, 63) – лес (Ш, 335); mak (В, 64) – мак (Ш, 335); zając (Р, 60) – заяц (Ш, 333);

дзеянняў: świsnąć (В, 60) – свіснуць (Ш, 333); wytoczyć (В, 61) – вытачыць (Ш, 333); słuchać (В, 62) – слухаць (Ш, 334); mieć (В, 63) – мець (Ш, 335);

якасцей: siwy (Р, 18) – сівы (V, 231); nieczuły (Р, 18) – нячулы (V, 231); północny (Р, 13) – паўночны (V, 233).

Некаторыя падобныя лексемы ў МП зазналі выразныя адметнасці беларускай фанетыкі. Так, польскамоўнае спалучэнне rz (*ж* ці *ш*) у перакладзе

---

[1] Рыльский М. Искусство перевода. М., 1986. С. 287.

[2] Mickiewicz A. Ballady i romanse. Ogłoszne w I tomie “Poezyj” (1822). Warszawa, 1977. С. 60. (У далейшым спасылкі падаюцца па гэтым выданні (В) з указаннем у дужках старонкі).

[3] Купала Я. Зб. тв.: У 7 т. Мн., 1972–1976. Т. 5. С. 231. (У далейшым спасылкі падаюцца па гэтым выданні з указаннем у дужках тома і старонкі).

[4] Mickiewicz A. Powieści poetyckie. Warszawa, 1973. С. 17. (У далейшым спасылкі падаюцца па гэтым выданні (Р) з указаннем у дужках старонкі).

перададзена зацвярдзелым *р*: krzyż (P, 13) – крыж (V, 231). Змякчаныя і мяккія зычныя польскай мовы на беларускай глебе асімілявалі наступны *j* і падаўжаліся: nasienie (B, 63) – насенне (Ш, 336).

Тыповай рысай польскай мовы з'явілася праславянскае спалучэнне *kw*: Jeszcze jedno, będzie *kwita* (B, 65). У беларускім перакладзе паланізм *kwita* 'ўсё скончана' выконваў эмацыянальна-экспресіўную функцыю, захоўваючы гумарыстычнасць народнага жарту: Раз яшчэ, і *квіта* будзе! (Ш, 337).

Своеасаблівасцю беларускай мовы як усходнеславянскай з'яўляецца поўнагалоссе ў адрозненне ад няпоўнагалосся, характэрнага для заходнеславянскай польскай мовы: podróża (B, 62) – падарожжа (Ш, 334); wróg (P, 13) – вораг (V, 233); słowik (P, 14) – салавей (V, 234).

Тыповай рысай польскай мовы з'яўляецца канцавы цвёрды гук *с*: моц, які ўтварыўся шляхам пераходу *tj* – *с*. У такім выглядзе дадзеная лексема стала здабыткам купалаўскага перакладу і захавалася ў беларускай мове: Teraz jużeś w naszej mocy (B, 65) – Але ты [Твардоўскі] ў моцы нашай (Ш, 336).

Акрамя слоў, агульных для дзвюх моваў, якія тут разглядаюцца, Купала ў сваіх перакладах часта ўжываў паланізмы, асабліва ў перакладзе ўрыўкаў з паэмы Міцкевіча "Конрад Валенрод", прысвечанай праслаўленню гераічнага подзвігу і асабістай ахвяры ў імя радзімы, што асабліва імпанавала беларускаму паэту ў пачатку XX ст. Купала пачаў перакладаць паэму ў 1908 г. з першага раздзела "Выбар", а ўступ да яе пераклаў у 1911–1913 гг. Тады закладваўся падмурак развіцця сучаснай беларускай мовы. Лексічнай абмежаванасцю тагачаснай беларускай літаратурнай мовы можна растлумачыць вялікую колькасць паланізмаў, ужытых Купалам у перакладзе.

Перакладчык паспяхова ўвёў у МП польскую лексему *cnota* ў значэнні "дабрачыннасць, дабрадзейнасць": Zdobią go wielkie chrześcijańskie *cnoty* (P, 17) – Красяць яго [Конрада] хрысціянскія *цноты* (V, 231). Купала надаў беларускае гучанне і польскаму слову *ziele* (трава): [gałążka] Pnąc się po wierzbach i po wodnym *zielu* (P, 14) – [галінка] Пнецца па вербах і цінавым *зеллі* (V, 234).

Перакладчык карыстаўся словамі беларускай мовы, найбольш суадноснымі са словамі арыгінала ў іх узаемасувязі і суаднесенасці сэнсу цэлага сказа і больш шырокага кантэксту. У асноўным ён ужываў існуючыя ў беларускай мове словы. Пры неабходнасці стварыць новае слова, Купала ажыццяўляў гэта на аснове лексічных элементаў польскай мовы па аналогіі з іншымі словамі беларускай мовы пры дапамозе існуючых лексічных і словаўтваральных элементаў. Для захавання суразмеранасці радкоў ён на аснове польскага *zbroja* (латы) утварыў *збраенне*: Po drugiej stronie, w szyszaku i *zbroi*, Niemiec na koniu nieruchomy stoi (P, 14) – А там няскратна, у *збраенні* каваным Немец сядзіць на кані асядланым (V, 233).

Захоўваў польскія словы Купала для назваў абстрактных паняццяў: Dawna Prusaków i Litwy *zażyłość* Poszła w *niepamięć*, tylko czasem *miłość* i ludzi zbliża (P, 15). Пры перакладзе сэнс польскай лексемы *zażyłość* ‘блізкія, сяброўскія адносіны’ сэнс выражаны ў складзе словазлучэння, што немагчыма без страты паэтычнай рыфмоўкі. Адсутнасць беларускага слова з неабходнымі сэнсавымі суадносінамі абумовіла ўжыванне паланізма: Даўная Прусаў з Літвою *зажыласць* Пайшла ў *няпамяць*; падчас толькі *міласць* і людзей годзіць (V, 234). Паланізм *niepamięć* ‘забыццё, непрытомнасць’ захаваўся з-за імкнення суаднесці эмацыянальную афарбоўку МА і МП. А слова *зажыласць* вымагала рыфмоўкі са словам *міласць*, якое Купала ўжыў у нетрадыцыйным для беларускай мовы значэнні: *міласць – каханне*.

Польскія вытокі мае ў перакладзе дзеяслоў *лучыцца* ‘аб’ядноўвацца’: Na obcym brzegu *łaczy się* z kochankiem (P, 14) – І на чужыне ўжо *лучыцца* з мілым (V, 234). Беларускай мове вядомы вытворныя ад гэтага дзеяслова *злучацца*, *далучацца*.

У тагачаснай беларускай мове не было дакладнага лексічнага адпаведніка польскаму дзеяслову ważyć się ‘асмельвацца’. Таму перакладчык ужыў яго ў беларускім тэксце: Nikt *się* nie *ważył* na ostre z nim gonić (P, 16) – Ніхто не *важыцца* з ім мацавацца [з Конрадам] (V, 231).

Беларускі паэт пашыраў лексічны склад беларускай мовы за кошт некаторых паланізмаў. З гэтай мэтай ён увёў у свой пераклад польскае *zysk* ‘карысць’: Ani swej broni dla podłego *zysku* Nie przedał (P, 17) – А так жа меча для подлага *зыску* Не запрадаў (V, 231).

У тэксце паэмы Міцкевіча ўжываліся словы для абазначэння спецыфічных рэалій. У такіх выпадках перакладчык карыстаўся транслітэрацыяй – непасрэдным ужываннем польскага слова ў беларускім напісанні, калі паведамлялася пра спецыфічныя прадметы матэрыяльнага побыту: *różaniec* ‘чоткі’: [Niemiec] liczy różaniec (P, 14) – [Немец] *ружанцам* ляскоча (V, 233). Транслітэрацыя тут была неабходна, бо перакладчык імкнуўся прытрымлівацца лексічнай сцісласці абазначэння, суадноснай арыгіналу, адметнасці названай рэчы.

Нацыянальная афарбоўка была канкрэтнай асаблівасцю твораў Міцкевіча. Выявілася яна перш за ўсё ў вобразах, якія выразна адлюстроўвалі матэрыяльныя абставіны і сацыяльныя ўмовы народнага жыцця. Такі каларыт закрануў сукупнасць рыс і асаблівасцей. Але пачынаўся ён, безумоўна, з моўнай спецыфікі твора, якую Купала, па магчымасці, імкнуўся захаваць.

Пэўнай колькасцю паланізмаў карыстаўся беларускі паэт і ў перакладзе балады Міцкевіча “Пані Твардоўская”. Сярод іх былі назвы вайсковых асоб: *Żołnierzowy*… Świsnął szablą koło ucha (B, 60) – Ён [Твардоўскі] жаўнеру… Свіснуў шабляй каля вуха (Ш, 333). Характэрна, што спачатку Ку-

пала замяніў слова *жаўнер* беларускім адпаведнікам *салдат* (Ш, 406). Захаванне паланізма ў больш познім перакладзе тлумачыцца імкненнем беларускага паэта перадаць каларыт балады.

У асобную тэматычную групу можна выдзеліць у МП запазычанні з польскай мовы, якія называюць бытавыя прадметы: [Twardowski] wódkę pił z *kielicha* (В, 61), дзе *kielich* – чарка. У такім значэнні з іншай агаласоўкай у перакладзе ўжыта лексема *кяліх*: [Твардоўскі] водку піу з *кяліха* (Ш, 334). Полькую лексему *klamka* ‘ручка ад дзвярэй’ Купала захаваў у МП: Diabeł już bliśko *klamki* (В, 66) – Чорт… збліжаецца пад *клямку* (Ш, 337).

З польскай мовы ў беларускую перайшлі назвы некаторых прадметаў працы і памераў: *ćwieczek – цвічок*, *cal – цаль* (памер 2, 5 см.): … oto na miarę *ćwieczek*, *Cal* gruby, długi trzy *cale* (В, 63) – … *цвічок* такі прымерне: У *цаль* – таўсты, даўгі ў тры *цалі*.

Перакладчык выкарыстаў сінанімічныя сувязі паміж словамі, якія называлі блізкія паняцці, з рознымі лексічнымі варыянтамі для разнастайнасці мовы твора і дакладнай перадачы зместу: *Gmach* będzie z ziarnek orzecha (В, 63) – *Гмах* з арэхавых зярняткаў Выстрай… (Ш, 336). У беларускай мове *гмах* – велізарны будынак. Таму Купала ўжыў варыянт *gmach – хорам*: I wymuruj *gmach* w tym lasku (В, 63) – *Хорам* вымуруй у лесе (Ш, 335). Такія разнастайныя моўныя сродкі, што перадавалі аднолькавы змест і сталі блізкімі з-за суаднесенасці з аднымі і тымі ж з’явамі рэчаіснасці, сталі важнай лінгвістычнай характарыстыкай купалаўскіх перакладаў: Patrzy, aż i *gmach* już gotów (В, 64) – Аж тут, глянь, палац гатовы (Ш, 336). Кожнае з гэтых слоў (*гмах, палац, хорам*) у нейкай ступені сінанімічнае ў адносінах адно да аднаго, выконвае стылістычную функцыю, выяўляючы адносіны перакладчыка да “другаснай рэчаіснасці” — тэксту арыгінала.

Балада “Пані Твардоўская” ў стылістычных адносінах блізкая да фальклору, таму задача перакладчыка была лягчэйшай з-за нацыянальнай афарбоўкі тэксту. Беларуская народная паэзія ўвайшла ў польскамоўную творчасць Міцкевіча арганічна і не была для яго чужароднай. Менавіта таму дарэчы выглядаюць у беларускім перакладзе трапныя народныя выслоўі, якія Купала захаваў амаль у арыгінальным выглядзе: Lecz pan każe, sługa musi (В, 64) – Што пан кажа, слуга мусіць (Ш, 336). Несумненныя народныя карані наступнага параўнання сталі прычынай ужывання ў беларускім тэксце яшчэ аднаго паланізма: Nos [diablika] *jak haczyk* (В, 61) – Нос [чорта], *як гачык* (Ш, 334), дзе *гачык – кручок*.

Стылістычныя кампаненты зместу твора ўказвалі на становішча слоў у лексічным складзе мовы. Гэтыя кампаненты характарызавалі выразы па адносінах да пэўнай сферы чалавечых зносін. Таму часам Купала карыстаўся польскімі словамі, ужытымі на размоўны лад: [diablik] Zdjął *kapelusz* і дał susa (В, 61) – [чорцік] *Капялюх* зняў, б’е паклоны (Ш, 334).

У іншых выпадках перакладчык захаваў польскія словы як гутарковыя: [Diabeł] Czmychnawszy *dziurk*ą od klucza (В, 66) – Скочыў *дзюркай* чорт ад ключа (Ш, 337).

Своеасабліва Купала пераклаў ветлівую польскую форму: Kładę areszt na *waszeci* (В, 62) – Кладу арышт на *васпана* (Ш, 335). Польскае *waszeć* – гэта ўстарэлае *waszmość*, *wasza miłość*. Пры паважлівым звароце да мужчыны выраз ужываўся ў выглядзе: *wasza miłość pan*, з якога Купала ўтварыў *васпана*. Агульны тып эмацыянальнасці пры перакладзе перададзены поўна. Перакладчык дасягнуў эквівалентнасці дзякуючы таму, што стылістычны кампанент значэння і яго эмацыянальная характарыстыка адносіліся да ўсяго выказвання.

Па-іншаму Купала перадаў уласнае імя: Ja na rok u Belzebuban Przyjmę za ciebie mieszkanie (В, 65) – Я на год у Бельзабуба За цябе жыць застануся (Ш, 337). Перакладчык адмовіуся ад больш распаўсюджанага, традыцыйнага ў беларускай літаратуры Вельзевула (імя д'ябла).

Для перакладу Купалы ўласціва спалучэнне нацыянальнай характэрнасці, перададзенай шляхам захавання сэнсу выражаных слоў з яскравасцю беларускай ідыёматыкі і фразеалогіі, а таксама з адценнямі беларускага прастамоўя. Найбольшая ступень эквівалентнасці дасягалася тым, што выраз у МА і суадносны яму ў МП мелі аднолькавую стылістычную характарыстыку. Напрыклад, *kwapieć się* 'спяшацца' Купала ўдала замяніў беларускім фразеалагізмам *даць цягу* 'збегчы': Twardowski ku drzwiom *się kwapił* (В, 62) – *Даць* хацеў Твардоўскі *цягу* (Ш, 335).

Адначасова з дасягненнем інтэлектуальнай рэакцыі неабходнай умовай перакладу была рэакцыя эмацыянальная. У купалаўскім перакладзе дасягнута дакладная перадача эмацыянальнай афарбоўкі арыгінала менавіта дзякуючы выкарыстанню беларускай народнай вобразнасці: Patrzaj, oto jest kobieta, Moja żoneczka Twardowska (В, 65) – Глянь, вунь баба, *як печ грудзі*, Гэта, чорце, мая жонка (Ш, 337).

Параўнанне двух варыянтаў перакладу балады (1911–1912 і 1940 гг.) сведчыць пра вялікую працу паэта над словам, пошукі жывых народных выразаў. Гэта дазволіла ў другім варыянце беларускага тэксту, перапрацаваным Купалам у сувязі з 85-годдзем з дня смерці Міцкевіча, наблізіць твор да чытача за кошт фальклорна-беларускіх элементаў: Miały słuchac twego rymu (В, 62) – Тэкст першадруку: Надало ж цябе [Твардоўскага] забыцца (Ш, 407) – МП: Чэрцям добра ў *знакі ўеўся* (Ш, 334). Перакладчык не выкарыстаў стылістычны сродак арыгінала. Для яго неабходным было захаваць эмацыянальную рэакцыю беларускага тэксту, як і тэксту арыгінала. Беларускі фразеалагізм *уесца ў знакі* 'надакучыць' надаў сітуацыі больш моцны экспрэсіўна-стылістычны эфект.

Народная фразеалогія прыдала перакладному тэксту большую выразнасць. Беларуская ідыёматыка паўплывала на стыль твора, яго дакладнасць і народнасць: МА – Dotąd [diabeł] jak czmycha, tak czmycha (B, 66) – Першадрук: [чорт] дагэтуль недзе скача (Ш, 410) – МП: [чорт] і дагэтуль *скача гіцаль* (Ш, 337).

Перакладчыцкі метад Купалы дазволіў пазбегнуць некаторай экзотыкі пры перадачы балады. Міцкевіч у сваім творы карыстаўся звычайнымі ў яго час лацінскімі выразамі: Twardowski ku drzwiom się kwapił Na takie *dictum acerbum*; Diabel za kuntusz ułapił: "A gdzie jest *nobile verbum*?" (B, 62). Купала лацінскія фразы пераклаў па-свойму, зрабіў іх больш зразумелымі для чытача: Даць хацеў Твардоўскі цягу На *сказ гэтакі* чартовы, Але той злавіў за дзягу: — А дзе, кажа, *гонар слова*? (Ш, 335).

Важным крытэрыем якасці купалаўскага перакладу стала высокая ступень эквівалентнасці перакладу арыгіналу, дасягнутай у беларускіх перакладах твораў Міцкевіча на ўсіх узроўнях. У большасці выпадкаў Купала пры перакладзе зыходзіў не ад літары, а ад ўнутранага сэнсу арыгінала. Так, польскі выраз: Wyleciał potem *jak z procy* (B, 65) літаральна перакладзены: потым выляцеў, *як з рагаткі*. На гэтай аснове ў МП няма вобраза. Эквівалентнае ўзнаўленне значэння было магчымым толькі ў межах усяго выказвання, шляхам іншага асацыятыўна-вобразнага спалучэння: [чорт] Потым выскачыў, *як з жару* (Ш, 336).

І ў іншых выпадках Купала захаваў сюжэтную лінію: [Nieman] już teraz dla nich był progiem wieczności; I nikt, bez straty życia lub swobody Nie mógł przestąpić zakazanej wody (P, 14) – [Нёман] Стаўся граніцай для ўсіх недаступнай, І той мог толькі прайсці яе смела, Каму на волі жыццё надаела (V, 234). Агульнасць паняційнай асновы тут сведчыць, што сітуацыя апісвалася шляхам указання на аднолькавыя яе прыкметы, але з розных бакоў. Спосаб апісання сітуацыі у МП захаваны, але вар'іраванне семантычнай арганізацыі выказвання стварыла антанімічныя структуры. Калі ў МА: nikt… nie mógł 'ніхто не мог', то ў МП: той … мог…, каму… Эквівалентнасць дасягнута антанімічнасцю разнамоўных выразаў.

Часам перакладчык замяняў радкі арыгінала роўнымі па сэнсе, кіруючыся імкненнем стварыць мастацкае апісанне: O Niemnie! Wkrótce runą do twych brodów Śmierć i pożoge niosące szeregi (P, 15) – Гэй, Нёман! Хутка к тваім сумным водам Рынуць навалы нясці зніштажэнне (V, 234). Адхіленні ад сэнсавай дакладнасці забяспечвалі мастацкасць перакладу і паўнату беларускага выражэння.

Часта ў МА і МП паведамленні апісвалі адну і тую ж сітуацыю праз розныя моўныя камбінацыі. Такія паведамленні адрозніваліся характарам і колькасцю прыкмет і асаблівасцямі сувязей паміж асобнымі часткамі выказванняў: [słowiki] Wiodą, jak dawniej, litewskie rozmowy Lub, swobodnymi

wymknąwszy się pióry, Latają w gości na spólne ostrowy (P, 14) – [салавейкі] Свае літоўскія баюць размовы, Дзеляцца спольна і дружбай, і ласкай, Як бы граніцы не знаючы новай (V, 234). У прыведзеных радках немагчыма супаставіць лексічны склад, спалучыць лексіку і структуру арыгінала і перакладу адносінамі семантычнай ці сінтаксічнай трансфармацыі. Эквівалентнасцю на ўзроўні паведамленняў Купала дасягаў захаванння ў перакладзе дамінантнай функцыі выказвання — перадаваў асноўны сэнс сітуацыі.

Часам захоўвалася найменшая агульнасць зместу купалаўскага перакладу з арыгіналам: [Konrad] Pierwszy zahaczał pohańców okręty; I na turniejach, skoro wstąpił w szranki, …Pierwsze mu zgodnie ustępując wianki (P, 17) – [Конрад] Першы ў крэпасці ломіць запоры. Дзе ж сілай можна ў гульні паказацца… Яму пяршынства даецца ўсімі (V, 231) – перадаў не "прамы" змест лексічных і граматычных адзінак, якія складаюць тэкст, а "вытворны", што прысутнічаў у МА нібы ў схаваным выглядзе, успрымаецца толькі з усяго выказвання як сэнсавага цэлага.

Падобны тып эквівалентнасці захаваўся ў перакладзе апавядання аб прыгодах чорта ў карчме, якое гучыць па-польску наступным чынам: Na patrona z trybunału, Co milczkiem wyprózniał rondeł, Zadzwonił kieska pomału, Z patrona robi się kondeł (B, 60). Даслоўны змест арыгінала: над адвакатам з трыбунала, які ўпотай апустошваў каструлю, пазваніў кашальком, і з адваката зрабіўся сабака, параўнаем з МП: Адвакату з трыбуналу, Абгрызаў што костку ўпарта, Пазваніў машной памалу, Адвакат зрабіўся хартам (Ш, 333). Ад даслоўнасці Купала адступіў, але мэта камунікацыі захавана — характар жарту перададзены ў стылі беларускай народнай творчасці.

Прааналізаваўшы моўныя асаблівасці купалаўскіх перакладаў твораў Міцкевіча, неабходна заўважыць, што перакладчык зразумеў высокае майстэрства слова і паэтычную дасканаласць твораў аўтара. Купала нібы пераўвасобіўся ў Міцкевіча, засвоіў яго тэмпераментнае паэтычнае адчуванне, але разам з тым застаўся Купалам. Перакладзеныя польскія творы сталі беларускімі, бо перакладчык унес у іх штосьці новае, нацыянальна-беларускае. Ён пераклаў мастацкі скарб Міцкевіча ў вобразы сваёй мовы. У перакладзе захаваўся Міцкевіч, і ўзнік Купала.

Беларускі паэт не толькі данёс змест, але і захаваў жанравастылістычныя адметнасці твораў — ад гераіка-рамантычнай паэмы "Конрад Валенрод" да народнага жарту "Пані Твардоўская". Паэт імкнуўся пашырыць слоўнік роднай мовы, дзеля чаго не толькі запазычваў словы польскай мовы, але і ўдала эксперыментаваў у стварэнні новых беларускіх слоў.

Міцкевіч калісьці сказаў, што "літаратура славянства — гэта вузел, якім звязаны народы, тая адзіная галіна, якая складала для ўсіх славян агульную

ўласнасць” [5]. Купала сваімі перакладамі твораў Міцкевіча звязаў гэты вузел больш моцна. Дзякуючы гэтым перакладам беларускі чытач і сення мае магчымасць атрымліваць асалоду ад бессмяротных твораў вялікага навагрудчаніна, далучацца да скарбонкі сусветнай культуры.

Тэрэса Голуб *(Мінск)*

ПАРЫЖСКІЯ РЭЛІКВІІ АДАМА МІЦКЕВІЧА ВАЧЫМА БЕЛАРУСКАГА ДАСЛЕДЧЫКА

Калі гаварыць аб парыжскіх рэліквіях, то перш за ўсё неабходна сказаць, што сам Парыж — гэта каштоўнейшая рэліквія, якая захоўвае памяць пра шматлікіх сусветна вядомых асоб, у тым ліку і сыноў беларускай зямлі.

Адам Міцкевіч у Парыжы пражыў амаль палову свайго жыцця. Тут ён стварыў сям’ю, узяўшы шлюб з дачкой вядомай польскай піяністкі Марыі Шыманоўскай — Цэлінай. У гэтым горадзе нарадзіліся і выраслі іх дзеці. Сын Уладзіслаў стаў даследчыкам творчасці бацькі, самым зацікаўленым і актыўным збіральнікам і захавальнікам яго літаратурнай спадчыны, ініцыятарам і арганізатарам шматлікіх акцый па ўшанаванню светлага імя Адама Міцкевіча. Парыж для Адама Міцкевіча быў месцам многіх памятных для яго сустрэч і знаёмстваў, пунктам, адкуль і куды адпраўлялася і сцякалася вялікая колькасць карэспандэнцыі. Менавіта ў гэтым еўрапеўскім горадзе найбольш ярка і цэласна, на маю думку, праявілася шматграннасць таленту Адама Міцкевіча, пра што сведчыць яго навукова-асветніцкая, рэдактарска-выдавецкая, грамадска-палітычная дзейнасць, літаратурна-крытычная і публіцыстычная праца… Вышыню яго паэтычнага майстэрства вызначае напісаная ім у Парыжы паэма “Пан Тадэвуш”.

Парыжскі перыяд жыцця і творчасці Адама Міцкевіча даволі грунтоўна і рознабакова вывучаны польскімі літаратуразнаўцамі. У іх ёсць большыя магчывасці для працы ў архівах і бібліятэках гэтага горада, чаго нельга сказаць пра беларускіх даследчыкаў. Аднак у апошні час Таварыства польскай культуры ў Парыжы вельмі актыўна садзейнічае таму, каб вучоныя і іншых краін, у прыватнасці, былога Савецкага Саюза, маглі наведваць мясціны пражывання суайчыннікаў-эмігрантаў XIX ст. і праз дакументальныя матэрыялы пазнаёміцца з іх дзейнасцю. Такая дабрачынная акцыя мае станоўчы вынік: наладжваюцца культурныя і навуковыя ўзаемасувязі, звязваюцца ў адно цэлае канцы абарваных ніцей жыццяпісу таго ці іншага дзеяча, выпраўляюцца многія недакладнасці, памылкі ў трактоўцы гіста-

[5] Міцкевіч А. Собр. соч.: В 5 т. М., 1952. Т. 3. С. 2.

рычных, палітычных, сацыяльна-бытавых з'яў. Выйграе, у цэлым, сусветная гісторыя, навука, культура, бо робіцца агульная справа.

Гётэ ў свой час сказаў, што каб лепш зразумець паэта, патрэбна пабываць на яго радзіме. Відаць, гэтай акалічнасцю тлумачацца жаданні многіх, хто імкнецца наведаць тыя мясціны, дзе нарадзіўся і ўзрос Адам Міцкевіч. Цалкам пагадзіўшыся з думкай класіка нямецкай літаратуры, хочацца дадаць, што для найбольш поўнага і правільнага разумення любога пісьменніка вельмі карысна прайсці ўсімі яго жыццёвымі сцежкамі. Асабліва калі яны маюць такую шырокую геаграфію, як у А. Міцкевіча: Завоссе, Навагрудак, Вільня, Пецярбург, Масква, Адэса, Берлін, Прага, Веймар, Рым, Жэнева, Неапаль, Дрэздэн, Парыж, Канстанцінопаль. Як бачна з пераліку толькі асноўных месц знаходжання паэта, зрабіць падарожжа па такому складанаму маршруту не кожнаму пад сілу.

У мінулым годзе стыпендыяльным фондам Станіслава Ляма мне на конкурснай аснове была выдзелена стыпендыя, дзякуючы якой з'явілася магчымасць наведаць Парыж. Постаць А. Міцкевіча ў праграме маёй навуковай "пілігрымкі" займала цэнтральнае месца. Па той прычыне, што даследаванне жыцця і творчасці паэта парыжскага перыяду можа мець вельмі шырокі дыяпазон і патрабавала звужэння, поле маіх навуковых інтарэсаў акрэсліла галоўным чынам музейна-літаратуразнаўчымі праблемамі.

Асноўным месцам працы была Польская бібліятэка, якая з'яўляецца адным са структурных падраздзяленняў Польскага гісторыка-літаратурнага цэнтра ў Парыжы. Пры бібліятэцы ў 1903 г. па ініцыятыве сына А. Міцкевіча Уладзіслава быў створаны музей паэта. З экспазіцыяй музея мяне пазнаёміла Эва Якубоўская. Яна расказала пра гісторыю стварэння музея, звярнула ўвагу на асобныя экспанаты, падаравала паштоўкі з выявамі вітрын экспазіцыі, спрыяльна і з разуменнем аднеслася да ўзнятага мной пытання пра мажлівасць вырабу муляжоў, ксеракопій, перадачы Дзяржаўнаму музею гісторыі беларускай літаратуры ў Мінску дублетных выданняў. Як былога музейнага работніка мяне цікавіла ступень выкарыстання ў экспазіцыі арыгіналаў, копій, мастацкае вырашэнне, а таксама, як далёка ад радзімы А. Міцкевіча прадстаўлены дарагі яго сэрцу куточак. Трэба адзначыць, што зроблена там усё гэта на належным навуковым узроўні, з павагай і тонкім адчуваннем пачуццяў, якія праз усё жыццё пранёс вялікі паэт да роднай зямлі. Агляд мастацкіх палотнаў, такіх, як "Руіны замка ў Навагрудку" (Францішка Міцкевіча), "Капліца ў Туганавічах", "Двор у Туганавічах" (невядомага аўтара), "Партрэт Анэлі Узлоўскай, хрышчонай маці Адама Міцкевіча" (з XVIII ст., невядомага аўтара), відаць, у кожнага, хто адрываецца на нейкі час ад радзімы, выклікае адпаведны настальгічны настрой. І тады яшчэ больш зразумелымі і такімі дарагімі становяцца радкі паэта з яго верша "Калі я труп жывы…":

Ёсць у мяне зямля, край светлых мрояў,
Мілейшага — мне не знайсці другога.
Мне ўсе радня там — болей, чым крывёю,
Там сэрцу гэтак многа дарагога!

Туды што міг — хай праца ці забавы —
Ўцякаю я. Сяджу там пад дубамі,
Як некалі, кладуся ў звонь, у травы,
Ганяюся ізноў за матылямі.

Там бачу ў белым зноў яе скрозь далі.
Бяжыць у лес яна да нас ад ганка,
Ляціць праз поле — тоне ў жытняй хвалі,
З-за гор далёкай свеціць мне заранкай.

(*Пераклад К. Цвіркі*)

Фонд Музея Адама Міцкевіча ўваходзіць у склад фондаў бібліятэкі, дзе захоўваецца вялікая колькасць аўтографаў твораў А. Міцкевіча, яго друкаваныя выданні, кнігі з дарчымі надпісамі, багатая калекцыя партрэтаў, фотаздымкаў, асабістых рэчаў, дакументаў. Сярод апошніх маю ўвагу перш за ўсё прыцягнулі тыя, што тычацца праблемы Завосся (МАМ, 878), якая на той час была ўзнята супрацоўнікамі Музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку, у прыватнасці, Ліліяй Усенка. Паколькі гэтым пытаннем да мяне ў Парыжы займаліся дырэктар Літаратурнага музея імя Адама Міцкевіча ў Варшаве Януш Адравонж-Пянёнжак і навуковы супрацоўнік Весяя Кардачук, то лічу правамерным спаслацца на вынікі іх працы, якія на дадзены момант з'яўляюцца найбольш пераканаўчымі і з майго боку не выклікаюць пярэчанняў. Я. Адравонж-Пянёнжак, напрыклад, прыйшоў да поўнага пераканання, што калдычаўскае Завоссе Баранавіцкага раёна з'яўляецца менавіта тым Завоссем, дзе нарадзіўся А. Міцкевіч, і што сведчаць аб гэтым не толькі "тапаграфічныя апісанні (Жарновая гара!) і малюнкі (да прыкладу, Эдварда Паўловіча 1843 г. ці нават зменены ужо сядзібы, намаляванай Напалеонам Ордам 40 год пазней), але і сабраныя Уладзіславам Міцкевічам і захаваныя ў Польскай бібліятэцы ў Парыжы копіі архіўных дакументаў, галоўным чынам гродзенскіх (а назбіралася іх каля 150), што датычацца менавіта гэтага, а не іншага Завосся…", "а таксама карты генерала Хшаноўскага (яны служылі паўстанцам 1863 г.) і рускія "штабаўкі" [1]. Акрамя дакументальных крыніц даследчыкам у сваёй працы выкарыстаны многія ўспаміны, пакінутыя роднымі А. Міцкевіча, а таксама тымі, хто ведаў яго асабіста. На іх падставе Я. Адравонж-Пянёнжак піша: "Менавіта калдычаўскае Завоссе наведаў Уладзіслаў Міцкевіч праз шэсць гадоў пасля смерці бацькі, у красавіку 1862 г., калі яшчэ жыў брат паэта, Аляксандр, які, дарэ-

[1] Адравонж-Пянёнжак Я. Яшчэ раз пра Міцкевічава Завоссе // Кантакты і дыялогі. 1998. № 7–8. С. 53.

чы, імкнуўся вярнуць Завоссе. Да таго ж, жылі яшчэ многія сябры і равеснікі Адама, якім тады было каля шасцідзесяці, а таму добра ўсё памяталі, былі добра інфармаваныя. У Навагрудку сына паэта вітаў не хто іншы, як менавіта Эдвард Паўловіч, пра што згадвае Уладзіслаў у 2 томе сваіх "Успамінаў" (Варшава, 1927. С. 59)" [2].

Улічваючы складанасць праблемы, а таксама тое, што для беларускага даследчыка было б вельмі каштоўным мець пад рукамі згаданы вышэй дакументальны матэрыял, тым болей што ён тычыцца і некаторых іншых фальваркаў, я звярнулася з просьбай да прэзідэнта Польскага гісторыка-літаратурнага таварыства Яцэка Талькі і загадчыцы рукапіснага фонду бібліятэкі Эвы Рудкоўскай, каб яны пасадзейнічалі ў вырабе мікрафільма. Яны паабяцалі задаволіць маю просьбу пасля таго, як адной з навуковых устаноў Мінска будзе напісаны ім адпаведны ліст, бо неабходная адзінка захавання мае 500 старонак. Інстытутам літаратуры НАН Беларусі такі ліст быў пасланы ў Парыж, але, на жаль, адказу пакуль няма. Калі не лічыць вось гэтай адзінай няўвязкі, якая ўзнікла пасля майго ад'езду дадому і якая, хутчэй за ўсё, тлумачыцца хібамі паштовай сувязі, супрацоўнікамі Польскага гісторыка-літаратурнага таварыства ў Парыжы для мяне былі створаны самыя спрыяльныя ўмовы працы.

Мне ўдалося пазнаёміцца з вялікай колькасцю рарытэтных выданняў А. Міцкевіча, яго аўтографамі, патрымаць у руках некаторыя асабістыя рэчы, якія захоўваюцца ў фондах бібліятэкі. Усе яны маюць вялікую музеязнаўчую і літаратуразнаўчую каштоўнасць. Сярод гэтага багацця матэрыялаў варта згадаць рукапісныя фрагменты паэмы "Дзяды", "Пана Тадэвуша". Адзін з апошніх мае цікавую гісторыю і звязаны з Ігнатам Дамейкам (МАМ. 22).

Пра Адама Міцкевіча — паэта, сябра, чалавека, пра яго адрасатаў, геаграфію перапіскі сведчыць таксама шырокае кола эпісталярная яго спадчына. Пры вывучэнні ліставання Міцкевіча я аддавала перавагу яго сувязям з землякамі, у выніку чаго прыйшла да высновы, што гэты матэрыял можа знайсці новае шырокае асвятленне літаратуразнаўцамі, а таксама быць выкарыстаным для адлюстравання шматгранных старонак жыцця паэта музейнымі сродкамі. У падмацаванне выказанай думкі назаву такія сусветна вядомыя імёны, як Ян Чачот, Тамаш Зан, Ігнат Дамейка, Аляксандр Ходзька, Антон Адынец і інш.

Постаць А. Міцкевіча належыць да зорак першай велічыні, якая прыцягвае ўвагу не толькі да сябе, але і да свайго акружэння. У гэтай сувязі вялікую навуковую, культурна-гістарычную і эстэтычную значнасць уяўляюць рэліквіі родных паэта. Для прыкладу прыгадаем "Музычны альбом"

[2] Адравонж-Пянёнжак Я. Яшчэ раз пра Міцкевічава Завоссе.

Марыі Шыманоўскай (МАМ, 973), у якім занатаваны аўтографы многіх тагачасных кампазітараў і прысвячэнні. Дзякуючы добразычлівым і ўважлівым адносінам Эвы Рудкоўскай, мне ўдалося пазнаёміцца нават з некаторымі рэліквіямі, што пакуль не выдаюцца для карыстання з-за неабходнасці іх рэстаўрацыі. Перш за ўсё тут мне хочацца назваць "Альбом" Гелены Шыманоўскай (МАМ, 962), дзе сярод вершаваных, празаічных, музычных і жывапісных памятак, зробленых рознымі знакамітымі асобамі, ёсць тры малюнкі Тамаша Зана.

Беларускага даследчыка, які прыязджае ў Парыж, першапачаткова ахоплівае жаданне "необъятное объять". Абмежаванні спачатку часавыя, а затым ужо і фінансавыя прымушаюць цвяроза паглядзець на справы, супакоіцца і зрабіць усё мажлівае. Але нягледзячы на неймаверную "стомленасць Парыжам", калі казаць словамі беларускага паэта Л. Дранько-Майсюка, такую "стомленасць" кожны хацеў бы зведаць яшчэ не адзін раз. А "стамляцца" ёсць чым, ёсць і дзеля каго — светлай памяці тых, хто ўжо стаў гісторыяй, і тых, хто са сваіх першых навуковых крокаў будзе яе вывучаць і працягваць.

Парыжскія рэліквіі Адама Міцкевіча — гэта скарбніца натхнення, пазнання і духоўна-эстэтычнага наталення.

Алесь Сімакоў *(Гомель, Беларусь)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ І ІНДЗЕЙСКАЯ АМЕРЫКА
АМБІВАЛЕНТНАСЦЬ І ГУМАНІЗМ

У час гутаркі польскай актрысы Гелены Маджаеўскай і амерыканскага паэта Генры Лангфела (1807–1882) апошні перапыніў субяседніцу словамі: "… і прашу не ўспамінаць аб "Гаяваце", бо ў адваротным выпадку буду пані называць "Мэджыкіевіс" [Mudjikiewis, скажонае Міцкевіч (Mickiewicz)], што, між іншым, гучыць крыху падобна да прозвішча пані" [1]. Гэта гумарыстычные сведчанне сусветнай вядомасці Адама Міцкевіча — толькі адзін з прыкладаў распаўсюджання яго імя і твораў па розных кантынентах. Польскамоўны "Пан Тадэвуш" набыў сапраўдную "краіназнаўчую" вартасць для Беларусі, але яго з'яўленне на амерыканскай глебе ў арыгінале (да прыкладу, у рукзаку польскага кругасветнага падарожніка Г. Запаловіча) або ў перакладах на еўрапейскія мовы не значыла, што адбудзецца духоўны кантакт паміж карэннымі Беларуссю і Амерыкай. Падзагаловак "шляхецкай гісторыі" па-англійску (The last foray in Lithuania) гучыць як назва апавя-

[1] Modrzejewska H. Wspomnienia i wrażenia. Kraków 1957. S.373.

дання з жыцця на Дзікім Захадзе. Сама асоба Міцкевіча як чалавека, што адчуваў, але не меў магчымасці рэалізаваць сваю беларускасць, спрыяла таму, што вобразы з яго паэзіі маглі ўспрымаюцца амбівалентна, як голас "метыса" з "крэсаў" ("frontier"), які пісаў не на мове карэннага насельніцтва, адлюстроўваючы этнаідэалагічную няпэўнасць, размытасць культуры "зачараванага краю".

Праблема вывучэння ўспрыняцця А. Міцкевіча ў нацыянальных культурах індзейцаў складае задачу будучага: фіксацыя прыкладаў чытання і цытавання, асабліва ў племянным друку, аналіз выкарыстання творчай спадчыны польскага паэта ў беларуска-індзейскім культурным дыялогу патрабуе сур'ёзных намаганняў.

Найбольш важнымі крыніцамі звестак пра індзейцаў для А. Міцкевіча як паэта, крытыка, публіцыста, гісторыка і карэспандэнта былі творы аўтараў мінулага стагоддзя — такіх, як Жан Франсуа Мармантэль (1723–1799) (у ранняй маладосці Міцкевіч з захапленнем чытаў і добра запомніў змест яго аповесці "Інкі, або Знішчэнне дзяржавы Перу" (1777; выдавалася папольску ў 1781, 1794, 1801 і г. д.; пераклад ураджэнца і жыхара Беларусі С. Клакоцкага) [2]. Э. Жадкоўская ў спецыяльным даследаванні "Інкаў" як крыніцы юнацкага натхнення Міцкевіча даводзіла нават, што гэты твор, прачытаны на дзевятым годзе жыцця, меў "далёкае эха" ў марскіх вобразах "Крымскіх санетаў" [3], сюды ж адносяцца і творы Франсуа-Анры-Маруа Вальтэра (1694–1778) — (у першую чаргу "Альзіра, або Амерыканцы" (1736), таксама прысвечаная жорсткасцям іспанцаў і гераізму індзейцаў у Перу (польскі пераклад І. Ляхніцкага "для слонімскага тэатра па загаду… пана Міхала графа Агінскага" быў выдадзены ў Варшаве ў 1780 г.). Урэшце, тут трэба назваць і сучаснікаў паэта І. Дамейку, Ю. Нямцэвіча, Дж.-Ф. Купера, Ф.-Р. дэ Шатабрыяна, з якімі ён быў асабіста знаёмы.

Ігнат Дамейка (1802–1889) інфарматарам паэта пра паўднёваамерыканскіх індзейцаў становіцца з 1838 г., калі пераязджае, фактычна дзякуючы Міцкевічу, у Чылі. 8 студзеня 1839 г. у лісце з Парыжа аўтар "Пана Тадэвуша", дарэчы, падрыхтаванага да друку з дапамогай Дамейкі, раіць сябру "сядзець у Какімба, пакуль не надакучыць. Тым часам, можа, выблісне якая надзея. Апішы сваё падарожжа, ты першы з Польшчы пусціўся ў такое далёкае вандраванне, а чалавек ты пісьменны. Апісанне твайго падарожжа будзе цікавае". І. Дамейка выканаў гэтае пажаданне і пераслаў яму падрабязны "Дзённік … чатырохмесячнага падарожжа з Парыжа ў Чылі", у якім знайшлося месца і для звестак пра становішча тубыльцаў (твор быў

[2] Frydrychowicz G. Stanisław Kłokocki w kręgu Puław // Pamiętnik Literacki. 1959. R. 50. Z. 3–4.

[3] Rzadkowska E. Aux sources de l'inspiration juvénile de Mickiewicz: "Les Incas" de Marmontel // Mélanges de littérature comparée et de philologie offerts a Mieczyslaw Brahmer. Warszawa, 1967.

апублікаваны ў “Бібліотэцы Варшавскей” і “Часе” ў 1857 г.). Міцкевіч таксама параіў пісаць “коратка гісторыю Паўднёвай Амерыкі перад іспанцамі (наколькі вядома), за іспанцамі і цяпер”. Пішы так, каб на радзіме можна было друкаваць. І дадасі ў канцы тваё падарожжа”.

Міцкевіч не дачакаўся віленскага выдання Дамейкі “Араўканія і яе жыхары” (1860), але да канца жыцця вёў перапіску з чылійскім сябрам (яна практычна перапыняецца ў 1843–1848 гг. не толькі ў сувязі з араўканскай і іншымі паездкамі, але і ў выніку сур’ёзных непаразуменняў, звязаных з “тавянізмам”), атрымліваючы па драбніцах і звесткі пра індзейцаў. Карэспандэнцыя паміж імі друкавалася ў перыёдыцы і Зборах твораў [4].

Другой па значэнню пасля І. Дамейкі польскай крыніцай інфармацыі пра індзейцаў быў для паэта Юльян Урсын Нямцэвіч (1758–1841), хаця яго найбольш насычанае індзеянісцкімі назіраннямі “падарожжа” па паўночнаму ўсходу ЗША [5] таксама стала даступным толькі пасля смерці Міцкевіча. Іх гутаркі адбываліся ў 30-я гг. у Парыжы, дзе абодва жылі (карэспандэнцыя — 1827 г., знаёмства — 1833 г.).

Джэймс Фенімор Купер (1789–1851) у часы Міцкевіча быў ўжо вядомым аўтарам такіх індзеянісцкіх твораў, як “Піянеры” (1823), “Апошні з магікан” (1826), “Прэрыя” (1827) — яны пачалі з’яўляцца ў польскім перакладзе ўжо ў тым жа дзесяцігоддзі. У 1841 г. ён закончыў сваю знакамітую пенталогію і напісаў шэраг іншых кніг пра індзейцаў. Знаёмства Купера і Міцкевіча адбылося ў Рыме ў сакавіку 1830 г. Уплыў Купера на “маладога” Міцкевіча, пра які пішуць асобныя аўтары [6], не ўдакладняецца. В. Кубацкі шукаў тэкстава-лексічныя паралелі з “Прэрыяй” і “Апошнім з магікан” [7], але ў любым выпадку вынікам гэтых непасрэдных зносін сталі спасылкі на “дзікіх герояў” Купера ў літаратуразнаўчых працах Міцкевіча і, верагодна, яго намер ажыццявіць паездку ў Амерыку. Адзіная няпэўная згадка (“здагадка”) пра такі намер ёсць у лісце рускага знаёмага паэта С. Шавырова да С. Сабалеўскага ад 15 ліпеня 1830 г. Можна дапусціць, што карэннае насельніцтва Амерыкі ў немалой ступені цікавіла яго ў сувязі з куперaўскім “акцэнтам”.

Францыа Рэнэ дэ Шатабрыян (1768–1848) на момант знаёмства з Міцкевічам быў славутым апалагетам рэлігійна-маралістычных ідэй, якія адлюстраваны і ў яго творах пра племя начаў “Атала”(1801), “Рэнэ” (1802), “Натчэзы” (1826). З Шатабрыянам Міцкевіч “не зблізіўся”, крытыкаваў яго

[4] Listy Domeyki do Mickiewicza // Kronika Rodzinna. 1885. T. 13.; Korespondencja Adama Mickiewicza. Paryż. 1875–1876. T. 3–4. (40 лістоў І. Дамейкі 1830–1855 гг.); Wyjątki z listów I. Domejki do D. Mickiewicza // Czas. Dodatek Miesięczny. 1857. T. 6 (фрагменты 16 лістоў 1838–1855 гг.).

[5] Niemcewicz J. U. Podróże po Ameryce 1797–1807. Wrocław; Warszawa, 1959.

[6] Tazbir J. Rzeczpospolita szlachecka wobec wielkich odkryć. Warszawa, 1973. S. 202.

[7] Kubacki W. Z Mickiewiczem na Krymie. Warszawa, 1977. S. 176, 233, 362, 366.

за “толькі паэтычны бок хрысціянства”, “фальшывую ноту”, але, верагодна, яго “індзейская” серыя спрычынілася да эвалюцыі поглядаў паэта ў бок містыцызму. Характэрнае выказванне В. Брухнальскага адносна знойдзеных ім аналогій паміж “Рэнэ”, “Аталай” і віленскімі “Дзядамі” (асабліва іх IV часткай): яны “несумненныя”, але застаецца пытанне, да якой ступені роднаснасць (pokrewieństwo) гэтая не “перакрыжоўваецца” з іншымі ўплывамі, напрыклад, Сэрвантэса або Русо [8].

Спачуванні і сімпатыі да індзейцаў, найперш “ перуанцаў” і “мексіканцаў”, выказваюцца ў Адама Міцкевіча і ў іншых яго калег, філаматаў і філарэтаў, у Вільні. Так муза Каліёпа гаворыць у “паэме для сцэны” Яна Чачота (1796–1847) “Apollo po kolędzie (1819): “Я ўжо абміну крыжовыя паходы, да якіх намаўлялі манахі, наварочванне бяздольных інкаў цаной праліцця крыві… Шмат вякоў пражыў свет, пакуль даведаўся аб мэце рэлігіі”. Гэтая фраза бачыцца Л. Цвяткову ў кантэксце барацьбы філаматаў з “клерыкалізмам ды з рэлігійным фанатызмам” [9]. “Малады вальтэр’янец” Міцкевіч піша ў гэты час першыя рэцэнзіі са згадкамі індзейцаў і паэму-”калумбіяду” “Бульба”.

Ужо ў першым апублікаваным крытычным артыкуле-рэцэнзіі “Нататкі аб “Ягеланідзе” Дызмы Боньчы-Тамашэўскага (1791–1835), якая чыталася на пасяджэннях Таварыства філаматаў 15 красавіка і 5 мая 1818 г., а надрукавана ў “Варшаўскім дзенніку” ў студзені 1819 г., робіць дастаткова спрэчную заўвагу: “Яму не варта было б згадваць аб Картэсах, Катэмазынах [маецца на ўвазе Куаўтэмак, кіраўнік барацьбы ацтэкаў супраць іспанскіх заваёўнікаў, імя якога скажалася па-рознаму, у т. л. як Гуацімацін, Гватэлюцын, у Тамашэўскага — Гвантацын. — *А. С.*], аб малабарскіх звычаях і аб многіх іншых рэчах, зусім чужых паганскай Літве”.

У 1819 г. А. Міцкевіч напісаў першую з задуманых чатырох “песень” гераікамічнай паэмы “Бульба” (філаматы слухалі яе 4 лютага 1819 г., яна засталася незакончанай і малавядомай, поўная публікацыя здзейснена ў 1948 г.). Дзеянне яе адбываецца на небе і на моры. Сярод перыпетый абмеркавання “даплыве–недаплыве”, якое вядуць антычныя багі, каталіцкія святыя і самі ўдзельнікі падарожжа, ёсць і спасылка на “аддзеленых ад Еўропы людзей”. Нягледзячы на жартаўлівы характар паэмы, у ёй зусім сур’ёзна ўздымаецца традыцыйнае пытанне вынікаў адкрыцця і заваявання Амерыкі. У той час як св. Дамінік ухваляе адкрыццё, атрымліваючы ў выніку перамогу ў спрэчцы, св. Станіслаў Костка “асуджае” пралітую

[8] Bruchnalski W. Mickiewicza “Dziady” wileńskie wobec Chateaubrianda powieści “Atala” i “Réné” // Księga pamiątkowa ku czci Oswalda Balzera. Lwów, 1925. T. 1. S. 89–104.

[9] Цвяткоў Л. Таварыства філёматаў: (Некаторыя цікавыя рысы аб’яднання маладых пісьменнікаў у Вільні, больш чымся за сталецце перад нашаю эпохаю) // Маладняк. 1927. № 1. С. 64.

“кроў дзікіх нявінную”: “Кроў і слёзы даражэйшыя за залаты грабеж”. Гэтая фраза магла даць падставу савецкаму даследчыку С. Саветаву для сцвярджэння, што ў “Бульбе” Міцкевіч упершыню выказаў сваё “спачуванне да прыгнечаных народаў”. Супярэчлівасць поглядаў паэта выяўляецца тут як дыскусія “некалькіх” Міцкевічаў. Паэма аб’ядноўвае беларускую і “атлантычную” тэматыку — шмат месца аўтар адводзіць рамантызацыі і гераізацыі Хрыстафора Калумба, яго спадарожнікаў і патэнцыяльных паслядоўнікаў у пераадольванні акіянскіх прастораў. Міцкевіч або не ведае, або не разумее, або, найменш верагодна, не хоча публічна прызнаць, што Калумб быў меркантыльным чалавекам і, з пункту гледжання індзейцаў, якія фактычна не прысутнічаюць у паэме (толькі, паводле А.-Э. Адынца (1804–1885), першую частку завяршаў “вобраз Амерыкі і яе жыхароў”), злачынцам, адказным за генацыд. Калумба як носьбіта ідэі свабоды не трактаваў практычна ніхто з тых, хто пазней звяртаўся да “калумбіяды”. У доўгім шэрагу “Новых Светаў” і “Хрыстафораў Калумбаў” паэма “Бульба” лічыцца “апошняй і некалькі анахранічнай (demodée)” [10]. Але станоўчы вобраз Калумба праходзіць праз мноства твораў на дзесятках моваў, уключаючы “Сон над Нёманам” Максіма Танка.

Здаецца, Міцкевіч так да канца і не зразумеў трагедыі, якая здарылася з індзейцамі ў выніку “адкрыцця”, бо ў “Кнігах польскага народа і польскага пілігрымства” пісаў пра Калумба як пра чалавека, што “адкрыў Амерыку, якая сталася зямлёй свабоды, святой зямлёй” і “быў апошнім крыжовым рыцарам ў Еўропе, апошнім, хто распачаў экспедыцыю ў імя Бога, а не для сябе”.

Тым не менш, як адзін з важнейшых вынікаў адкрыцця падаецца з’яўленне ў Еўропе бульбы — выратавальніцы ад голаду:

Муж, што дваццацю быкамі арэ украіну
І якога аддзяліла Атлантычнае мора [г. зн. індзеец],
Араб, які не шукае пад дахам начлегу,
І рускі, у вечным закапаны снезе,
Азіяты, якія цягнуцца праз блукаючыя пяскі, —
Ад Бога і бульбы роўныя бяруць ласкі.

Наступныя звароты да індзейскай тэмы вынікаюць з кола чытання Міцкевіча. У прыватнасці, яго зацікавіла кніга К.-Г.-Л. Пёліца (1772–1838) “Папулярная антрапалогія” (Лейпцыг, 1800). У 1822 г. у каментарыях да апісальнай паэмы С. Трамбецкага (1739(?)–1812) “Заф’юўка” ён характарызуе патагонцаў: “…уласна кажучы, народ дзікі амерыканскі, вялізнай будовы цела”. Стаўшы выгнаннікам, Міцкевіч пісаў 5 студзеня 1827 г. Я. Чачоту і Т. Зану (1796–1855) у Арэнбург, ужываючы слова “каханая” ў значэнні “Радзіма”: “Дзікія амерыканцы асуджанаму на пакуты нявольніку

[10] Гл., напр.: Fabre J. Lumiéres et Romantisme. Paris, 1963. P. 151–166.

пасылаюць у апошнюю ноч дзяўчыну для пацехі; а ты [Ян], горшы за амерыканца, не дазваляеш мовіць і марыць аб ёй!.. ”

Выехаўшы на Захад, Міцкевіч абмяркоўвае з І.-В. Гётэ (1749–1832) “падабенства амерыканскіх і егіпецкіх пірамід” (у прысутнасці аўтара “Лістоў з падарожжа” А. Адынца, 24 жніўня 1829 г. — Ю. Корсаку з Веймара).

Найбольш індзеянісцкіх згадак у парыжскіх славістычных лекцыях паэта, асабліва ў “Першым курсе…”, пра якія пісаў Дамейку ў Какімба, што кожная — “як падарожжа праз пампасы, скрозь тыграў і індзейцаў”. Гаворачы ў лекцыі 26 лютага 1841 г. пра “сур’ёзнасць і спакой” славянскай паэзіі, выводзіць іх з “народнага характару”, параўноўваючы бясстраснасць сербскіх племянных веча з тым, чым вызначаюцца “дзікія героі Купера”. Тым не менш, “славянскія героі”, паводле Міцкевіча, хоць і “больш за ўсё шануюць вайну” і “бываюць часам неўтаймаваныя, але гэта зусім не дзікуны. Вайна для іх — не паляванне на людзей, як для амерыканскіх плямён”. Паэт збліжае з карыбамі фінаў і саамі (лапландцаў), “жоўтае племя”, песні якіх, у адрозненне ад пяшчотных і прывабных сербскіх, уяўляюць сабой часам “людажэрную”, “жудасную паэзію”.

Польскі лектар такім чынам абараняе перад французскімі студэнтамі славян ад несправядлівых абвінавачанняў: “Замежныя пісьменнікі, асабліва нямецкія, часта хацелі апраўдаць гвалты, якія ўчыняліся родам нямецкім славянам, абвінавачваючы іх у варварстве і параўноўваючы іх з дзікімі плямёнамі Амерыкі”. Міцкевіч параўноўвае з індзейцамі заходніх славян, якія апынуліся паміж Германіяй і Польшчай: “Бедныя плямёны Ваўкоў, Валоў, Мышей, Сокалаў паміж нямецкім кап’ём і польскай шабляй, блукаючы, гінулі, падобна як сёння гінуць ў Амерыцы пакаленні Магіканаў, Баброў і Лісаў” (“Першыя стагоддзі польскай гісторыі”. Кніга другая). Апошнія з’яўляюцца ў гэтым даследаванні Міцкевіча, закончаным перад 1837 г., але апублікаваным толькі праз тры дзесяцігоддзі, верагодна, як водгук на вайну Чорнага Ястраба 1832 г. у Ілінойсе.

У празаічных уводзінах і “ўстаўках”, а таксама “тлумачэннях” да паэм “Дзяды”, “Конрад Валенрод”, “касыды” “Фарыс” — творах 1826–1832 гг. Міцкевіч робіць этнаграфічныя паралелі і лінгвістычныя заўвагі, што адносяцца да неакрэсленых месцаў у Новым Свеце.

“Просты народ у Літве ўяўляе сабе маравую пошасць у абліччы дзевы, з’яўленне якой, апісанае тут [у “Конрадзе Валенродзе”. — *А. С.*] на падставе народных паданняў, папярэднічае страшнай хваробе. […] Здаецца, што народнае ўяўленне ў падобных вобразах прадставіць хацела тое таемнае прадчуванне і тую дзіўную трывогу, якія звычайна папярэднічаюць вялікім няшчасцям або смерці і якія не толькі адзінкавыя асобы, але цэлыя народы часта падзяляюць”. Так прадчувалі і “ў Амерыцы прыбыццё іспанцаў”.

У “Дзядах” канстатуецца наяўнасць звычаю, падобнага да распаўсюджанага “ў многіх паветах Літвы, Прусіі і Курляндыі” і ў Амерыцы: “Варта ўвагі, што звычай частаваць памерлых, відаць, існаваў ва ўсіх паганскіх народаў — у Старажытнай Грэцыі ў часы Гамера, у Скандынавіі, у краінах Усходу і дагэтуль на астравах Новага Свету”.

Такім чынам, у творчасці паэта выразна прасочваецца кампаратывістычная лінія. Пра тое, што Міцкевіч уключае індзейцаў у досыць шырокае кола цікавых для яго народаў, сведчыць і артыкул “Аб крытыках і рэцэнзентах варшаўскіх” (1828), дзе ён піша, аналізуючы ролю Ю. Нямцэвіча ў стварэнні новых літаратурных формаў, пра “звычайныя прамовы, максімы і сентэнцыі, што дэкламуюцца на французскай сцэне з аднолькавым пафасам грэкамі, рымлянамі, туркамі і амерыканцамі”. Міцкевіча клапоціць лёс польскага і суседніх з ім народаў, хаця большая частка параўнанняў тычацца “эканомікі” (бульба) або духоўнай культуры. Толькі ў “Першых стагодзях польскай гісторыі” кампаратывістыка па-сапраўднаму (у т. л. і “самакрытычна”) “палітызуецца”. У рэшце рэшт, паводле Міцкевіча, славяне-непалякі ў параўнанні з індзейцамі “менш здзічэлыя, менш выраджаныя” і “ацалелі ў большай лічбе” спачатку “пад панам немцам”, а потым ва “ўзмоцненай Польшчы”.

Невыпадковай была паралель паміж прусамі і араўканскім народам, “які да сённяшняга дня захаваў свабоду і падобную даўнім прусам арганізацыю разам з ідалапаклонствам”, у прадмове да першага выдання “Першых вякоў польскай гісторыі” (1868) Леанарда Рэтля [11], які пераклаў і напісаў прадмову (пад псеўданімам Ян Замастоўскі) да віленскай “Араўканіі” і стаў, такім чынам, “сувязной” асобай для А. Міцкевіча і І. Дамейкі, “карэнных беларусаў”, грунтоўны эпісталярны дыялог якіх на “індзейскую тэму”, аднак, не адбыўся. Абодвум, хаця і ў рознай ступені, перашкаджала амбівалентнасць, якая вынікала ў першую чаргу з прыналежнасці да каталіцызму: павага да ацтэкаў, інкаў і араўканаў значна змяншалася, калі гаворка заходзіла пра іх рэлігію і ахвярапрынашэнні.

Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча прыпадаюць на перыяд, калі ў Амерыцы ў выніку войнаў утварыліся незалежныя ад метраполій дзяржавы, якія, аднак, вялі пераважна антыіндзейскую палітыку. Антыбеларуская палітыка гіпатэтычна “незалежнай” Польшчы не ўспрымалася ім на працягу ўсяго жыцця. Гісторыя папугая як апошняга носьбіта мовы калісьці магутнага племені індзейцаў магла і не нагадваць яму пра перспектывы беларускай гаворкі.

Як высокаадукаваны чалавек Міцкевіч не мог не звяртаць увагі на асноўныя бягучыя падзеі ў амерыканскіх краінах, але яго цікавасць вынікала

[11] L. R. Przedmowa do pierwszego wydania: Mickiewicz A. Pierwsze wieki historyi polskiej // Dzieła Adama Mickiewicza. Wydanie zupełnie przez dzieci autora dokanane. Paryż; Lwów. 1880. T. 4. S. 172.

з натуральных паралеляў паміж імі і Польшчай, прычым яго літаратурная спадчына не нясе прыкмет вылучэння карэннага насельніцтва (у эміграцыйных беларускіх крыніцах былі спробы паказаць, што Міцкевіч вылучаў беларусаў сярод польскіх імігрантаў у Амерыцы). "Аднак, — паводле В. Кіпеля, — галасы гэтыя былі марным лямантам у пустэльні" [12], якімі яны з'яўляюцца і ў выпадку з сусветна вядомым араўканолагам І. Дамейкам. "Паланізаванасць" стала, на маю думку, яшчэ адным стрымліваючым фактарам пры ўсведамленні "глыбінных" праблем карэннага насельніцтва Амерыкі.

Агульная тэндэнцыя недаацэнкі культурных дасягненняў "прымітыўных" народаў (хаця Міцкевіч прызнае ў "Кнігах польскага пілігрымства", што ў галіне мастацтваў і рамёстваў "не толькі ў еўрапейцаў, але і ў […] дзікіх можна навучыцца многім патрэбным рэчам") і недастатковая інфармаванасць (кукуруза і маіс падаюцца ў "ранняй" "Бульбе" як асобныя расліны, але і пазней, нягледзячы на кантакт з І. Дамейкам, які дасягнуў узроўню тагачаснага "этнографа" і добрага папулярызатара-амерыканіста, паглыблення ў заакіянскія рэаліі не адбылося) тлумачаць пэўнае "адставанне" і адносную беднасць "індзеяністыкі" (у параўнанні з індыяністыкай — індалогіяй) Міцкевіча. Менавіта таму ён прама і не адзначае заслугі індзейцаў у вывядзенні бульбы, а падае яе як дар Новага Свету, што выкарыстоўваецца як яго карэннымі жыхарамі, так і астатнімі насельнікамі свету. Для Міцкевіча і славяне як ахвяры аваараў, і індзейцы, і негры як нявольнікі еўрапейцаў аднолькава дазваляюць выкарыстоўваць сябе як цяглавая жывёла, хаця вядома, што карэнныя жыхары Амерыкі гінулі, але практычна не ператвараліся ў рабоў.

Сама індзейская "этнанімія" ў Міцкевіча яшчэ нераспрацавана. Ён схільны ўжываць, у адпаведнасці з нормамі мінулых стагоддзяў, выразы "дзікія", "амерыканскія плямёны", "амерыканцы" або "(людзі), якіх аддзяліла "Атлантычнае мора" і толькі адзін раз піша пра "індыянаў" (Indyanów) — ў лісце "дарагому антыподу" Ігнату Дамейку ад 23 або 24 снежня 1840 г. Ён паланізуе тое, што рэальна існуе як англійскія этнонімы "бівер" і "фокс", для стварэння больш яскравых індзейска-славянскіх паралеляў. У тэкстах Міцкевіча сустракаюцца тры з найбольш гучных імёнаў на этнаграфічнай карце Амерыкі: магікане, караібы і патагонцы.

Адам Міцкевіч закранаў пытанні каланізацыі (шматразова адзначаў гістарычную ролю Калумба, а зямлю ў Амерыцы лічыў "не занятай яшчэ" і прызнаваў права "ўжываць лясы і раўніны як сваю ўласнасць"), прагрэсу ("Як смееце, магіканскія эканамісты, сваім сацыялістычным тамагаўкам пагражаць вялікім тузам — эканамістам XIX стагоддзя" — парафраза з

[12] Кіпель В. Беларусы ў ЗША. Мн., 1993. С. 48.

Р.-У. Эмерсана (1803–1882) “Чалавек рэлігійны — рэфарматар”) і “філасофскага канібалізму” (міждзяржаўнай палітыкі ўзаемных захопаў). Але найперш ён выступаў як носьбіт месіянскай ідэі асаблівай гістарычнай ролі польскага народа і не мог перанесці яе на індзейцаў, лёс якіх быў яшчэ больш пакутлівы, чым палякаў, бо збавіцельную ахвяру за “гістарычныя” грахі чалавецтва мусіў несці “гістарычны” ж народ. Аднак яго несумненныя дэмакратызм і народнасць не ставяцца пад сумненне ніводнай “свядома антыіндзейскай” цытатай, што адрозніваe яго ад І. Дамейкі. Тым не менш, з вуснаў А. Міцкевіча прагучала: “Дрэнныя часы славян, падобна як жыхароў Сан-Дамінга, скончыліся з хвілінай, калі на іх землі ўступіла цывілізацыя; бо да таго часу іх грамадскі стан не дазваляў ніякага прагрэсу і забяспечваў ім ужыванне шчаслівасці крыху звярынай”. Трагічнае непаразуменне гэтага сцвярджэння з парыжскай лекцыі 19 студзеня 1841 г. вынікае з факта, што карэннае насельніцтва Гаіці хутка пасля адкрыцця вострава Калумбам было цалкам вынішчана і таму не “выкарыстала перавагі” еўрапейскай цывілізацыі.

ДЫСКУСІЯ

Алесь Карлюкевіч *(Мінск)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ ПА ДАРОЗЕ ДА РУСКАГА ЧЫТАЧА

Калі зазірнуць у гісторыю польска-рускіх літаратурных сувязей XIX–XX стст., то стане відавочным, што наш славуты суродзіч Адам Міцкевіч з’яўляецца адным з самых прызнаных на прасторах былога СССР польскім пісьменнікам. Маскоўская даследчыца Алена Цыбенка сцвярджала: “Найболей папулярнымі класікамі польскай літаратуры з’яўляюцца ў нас Генрык Сянкевіч (выдадзена пасля 1917 г. 100 кніг тыражом 4812 тыс. экземпляраў на 29 мовах), Адам Міцкевіч (78 кніг тыражом 1905 тыс. экземпляраў на 13 мовах)…” [1]

Уваходжанне творчасці А. Міцкевіча ў кантэкст рускай культуры, рускай літаратуры пачалося нашмат раней, чым у 1917 г. І калі вызначальны пласт зносін Адама Міцкевіча і Аляксандра Пушкіна ў значнай ступені вывучаны, то ўваходжанне творчасці ўраджэнца Навагрудчыны ў рускую

[1] Цыбенко Е. З. Из истории польско-русских литературных связей XIX–XX вв. М., 1978. С. 269.

літаратуру XIX ст. даследавана недастаткова. Прынамсі ў нас, у Беларусі. Ды і ў Расіі таксама.

А, між іншым, фактаў для доследаў міцкевічазнаўцаў там, у рускім XIX ст., дастаткова. Варта прыгадаць хаця б пра некаторыя з іх. І што асабліва для нас цікава, міцкевічаўскую прысутнасць у Расіі шырылі і множылі таксама, і гэта натуральна, ураджэнцы Беларусі, праўда, адукацыяй і іншымі ўплывамі зарыентаваныя на рускую культуру.

Вось некалькі прыкладаў. "Грынеўская Ізабела Аркадзьеўна… З яе перакладаў найболей вядомыя "Сябры" Дж. Раветы, "Мёртвы горад" Г. Д'Анунцыя, перакладала В. Гюго, А. Міцкевіча" [2]. Ізабела Грынеўская нарадзілася 3(15).05.1864 г. у Гродзенскай губерні. Драматург, празаік, крытык, паэтэса, перакладчык, літаратуразнаўца. Валодала многімі еўрапейскімі мовамі. Што датычыць Міцкевіча, то яго перакладала з арыгінала.

У 1856 г. у Магілёве нарадзіўся Аляксей Аляксеевіч Дробыш-Драбышэўскі (памёр у 1920 г. у Ніжнім Ноўгарадзе), журналіст, літаратурны крытык, перакладчык. Журналісцкая, літаратурна-крытычная работа нашага земляка звязана з многімі выданнямі. Як крытык Дробыш-Драбышэўскі быў досыць уважлівы да польскай літаратуры. У прыватнасці, у 1895 г. у часопісе "Русское богатство" змясціў артыкул "Адам Міцкевіч". Публікацыя цікавая тым, што аўтар спрабуе прадставіць А. Міцкевіча папярэднікам Ф. Дастаеўскага і Л. Талстога, падкрэсліваючы іх містычнае падабенства. Увогуле захапленне Дробыш-Драбышэўскага польскай літаратурай выявілася і ў іншых яго публікацыях. У тым жа "Русском богатстве" наш суродзіч друкуе артыкул "Юлій Славацкі", перакладае драму З. Красіньскага "Ірыдыён" (асобнае выданне — СПб., 1904). У. Караленка даў такую адзнаку гэтаму перакладу: "Перевод слишком дословен и не свободен от полонизмов" [3].

Варта, відаць, нагадаць, што першая ў рускім літаратуразнаўстве манаграфія пра Міцкевіча — "Адам Міцкевіч" — пабачыла свет у Санкт-Пецярбургу ў 1858 г. Аўтар яе — Пётр Паўлавіч Дуброўскі. Да 1835 г. адносіцца яго артыкул "Новейшая поэзия у поляков" у часопісе "Московский наблюдатель".

Выразны след у рускай літаратуры і культуры пакінуў паэт і перакладчык Уладзімір Бенядзіктаў (1807–1873). З Польшчай і Беларуссю гэтага рускага літаратара звязвае ўдзел у кампаніі 1830–1831 гг. За ўдзел у штурме Варшавы прапаршчык Бенядзіктаў тады атрымаў ордэн св. Ганны 4 ступені. У 1832 г. паэт пакінуў вайсковую службу. Валодаючы некалькімі еўрапейскімі мовамі, Бенядзіктаў перакладаў І.-В. Гётэ, Ф. Шылера, В. Гюго і

[2] Русские писатели. 1800–1917: Биогр. словарь. / Гл. ред. П. А. Николаев. М., 1992. Т. 2. С. 44–45.

[3] Короленко В. Г. О литературе. М., 1957. С. 391.

іншых паэтаў. У 1863 г. пабачылі свет перакладзеныя Бенядзіктавым паэмы А. Міцкевіча “Конрад Валенрод” і “Гражына”. Крытыка даволі прыхільна прыняла гэтыя работы. Дарэчы, у выдадзеных у 1902 г. (СПб.; М.) творах Міцкевіча пераклад многіх вершаў належыць якраз Бенядзіктаву.

Узіраючыся ў XIX ст., шукаючы “рускі след” Міцкевіча, нельга абмінуць увагай жыццё і творчасць паэта, перакладчыка, гісторыка, журналіста Мікалая Васільевіча Берга (1823–1884). На пачатку 1863 г. ён едзе ў Польшчу, ужо ахопленую паўстаннем. Едзе як карэспандэнт газеты “Санкт-Петербургские ведомости”. Ажаніўшыся з полькай, Берг селіцца ў Варшаве. У 1864–1867 гг. па заданню расійскіх улад складае гісторыю паўстання 1863–1864 гг. Але, атрымаўшы доступ да сакрэтнай інфармацыі, Берг стварае сур’ёзнае даследаванне, у якім выяўляецца і спроба аналізу не толькі ходу, але і прычын паўстання. Што да перакладчыцкай дзейнасці, то ёю Берг заняўся яшчэ ў 1840 гг. Менавіта ён упершыню прадставіў рускаму чытачу паэзію балгар, лужыцкіх сербаў, славакаў. Шмат што пераклаў Берг і з вершаў А. Міцкевіча. Цалкам пераклаў “Пана Тадэвуша” (у розныя гады — 1870, 1873, 1874 — пераклад друкаваўся ў “Отечественных записках”). Асобным выданнем (без цэнзарскіх купюр, з двума артыкуламі М. Берга пра Міцкевіча) “Пан Тадэвуш” у перакладзе на рускую мову пабачыў свет у Варшаве ў 1875 г.

Вось толькі некаторыя штрыхі да даследавання ўваходжання Адама Міцкевіча, яго паэзіі ў кантэкст рускай літаратуры, рускай культуры XIX ст.

Надзея Рэут *(Мінск)*

ПАД ЭГІДАЮ ЮНЕСКО

Той, хто хоча зразумець паэта,
павінен ісці ў яго край.

І.-В. Гётэ

Такім краем для Адама Міцкевіча стала беларуская зямля: ён нарадзіўся на хутары Завоссе бліз Навагрудка. Навагрудская зямля з яе жывапіснымі мясцінамі — зялёнымі палямі, узвышшамі і лясамі, з вечным шумам Налібоцкай пушчы, непаўторнай прыгажосцю возера Свіцязь, авеянага легендамі і казкамі, велічным срабрастым Нёманам — выклікала ў хлопчыка пачуцці глыбокага хвалявання прыгажосці прыроды, любові да яе.

А як хвалявала падлетка багатае гістарычнае мінулае, дзе кожны камень, курган увасабляў гераічную гісторыю народа. Разам з сябрамі бегаў Адась да старога замка, любаваўся яго магутнымі вежамі, слухаў расказы дзядоў аб мужных земляках, якія абаранялі навагрудскія сцены ад нашэсця татар.

Усё гэта нарадзіла ў душы паэта ўлюбёнасць у свой свабодалюбівы народ, і імя паэта ўвайшло ў гісторыю не толькі як імя вялікага паэта, але і змагара за шчасце, свабоду народа.

Праблемы культуры цесна звязаны з глабальнымі праблемамі чалавецтва. У цэнтры ўвагі ЮНЕСКО знаходзіцца адна з такіх глабальных праблем — праблема захавання культурнай спадчыны чалавецтва.

Абапіраючыся на свой Статут, ЮНЕСКО зорка сочыць за абаронай сусветнай культурнай спадчыны, у якую ўваходзяць творы мастацтва і помнікі, якія маюць гістарычны і навуковы інтарэс.

XXIII сесія Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКО (Сафія, 1985) абвясціла, пачынаючы з 1988 г., Сусветнае дзесяцігоддзе развіцця культуры. З гэтай падзеяй звязана і сённяшняе свята — 200-годдзе з дня нараджэння Адама Міцкевіча.

Тэма маёй будучай кандыдацкай дысертацыі звязана з дзейнасцю арганізацыі ЮНЕСКО і сувяззю яе з культурнымі дасягненнямі і поспехамі ў гэтай галіне нашай роднай Беларусі. Пажадана, каб чалавек з любой краіны, аднойчы пабываўшы ў Беларусі, ніколі не забываў гасціннасці яе людзей, прыгажосці краявідаў, водару лясоў і палёў, імкнуўся яшчэ раз пабываць на цуда-возеры Свіцязь, мясцінах, дзе “льецца Нёман срэбраводны, дубы дзе дружнай чарадою стаяць, як вежы над вадою…”.

А мы, жыхары нашай рэспублікі, жыхары планеты, захаваем нашу спадчыну, збяром яе ў прыгожы букет і данясём праз гады да дзяцей нашых і выхаваем у іх улюбёнасць і захапленне родным краем і яго мовай, традыцыямі.



ПЯТЫЯ КАРЭЛІЦКІЯ КРАЯЗНАЎЧЫЯ ЧЫТАННІ

«КАРЭЛІЦКАЯ ЗЯМЛЯ Ў ЧАСЫ АДАМА МІЦКЕВІЧА»

Завоссе. З малюнка Э. Паўловіча

Янка Брыль *(Мінск)*

З МІЦКЕВІЧАМ ПРАЗ УСЁ ЖЫЦЦЁ

Нядаўна адзін з маіх маладых сяброў, пішучы пра маё станаўленне як пісьменніка, трапна сказаў, што апроч роднага слова, навакольна жывога і літаратурнага, на мяне вялікі ўплыў аказала польская высокая паэзія і руская глыбокая проза. Калі пра глыбокае, дык тут сімвалам узвышаецца Талстой, а калі пра высокае — гэта найперш ды найбольш Міцкевіч. Зрэшты, у вялікіх літаратурах, у яе самых яркіх прадстаўнікоў высокае і глыбокае натуральна спалучаюцца, утвараюць адно.

Гісторыя маёй сардэчнай повязі з паэзіяй геніяльнага земляка, як на жыццё аднаго чалавека, дык даволі-такі працяглая, і пачалася яна вельмі рана. У 1927 г., закончыўшы пачатковую, тады трохкласную, школу ў сваім Загоры (гэта каля гасцінца паміж мястэчкамі Турэц і Мір), на выпускным ранішніку я, ужо амаль дзесяцігадовы пастушок, захоплена дэкламаваў Яго баладу “Powrót taty”, на ўцеху найперш маёй маці, загараванай, запрацаванай удавы з трыма недарослымі сынамі, з якіх найменшы быў я. Такі вось законна сентыментальны ўспамін.

Праз два гады, на школьнай экскурсіі, ужо з Турца, я ўпершыню пабачыў Свіцязь. Значна пазней, у сталасці, летуючы з сям’ёй у ляснічоўцы, гэты цуд нашай прыроды я часта ранняй раніцай абходзіў укругаля — для мацыёну душы. Нямала акунёў было вывуджана з лодкі ў сябрыне добрых рыбакоў, пісьменнікаў Янкоўскага і Калесніка. Свіцязянскімі ўпасвенымі лінямі я рады быў пачаставаць выдатнага знаўцу і перакладчыка Міцкевіча — Максіма Рыльскага. Па службоваму абавязку сакратара праўлення Саюза пісьменнікаў часта бываў я над святым возерам з рознымі міжнароднымі, а найчасцей польскімі пісьменніцкімі групамі. Аднак мне ўсё-такі як найжывей прыгадваецца ўражанне першае, дзіцячае, у зорны вечар, непаўторна хвалюючa спалучанае з чароўна, як сама Свіцязь, простымі радкамі:

Gwiazdy nad tobą i gwiazdy pod tobą,
I dwa zobaczysz księżyce.

Калі яшчэ пра найраннейшае, дык помніцца, як я, даволі жулікаваты выдатнік, распешчаны поспехам “вялікі” школьны паэт, які і Міцкевіча без асаблівай рызыкі пераймаў, забыўся дома вывучыць баладу “Alpuhara” і, балазе ішоў у той дзень у школу адзін, уголас авалодаў ёю за чатыры кіламетры дарогі. І не дзіва, — яго неразгадана магутнай прастаце ўласціва замацоўвацца ў памяці, тым больш дзіцячай, даволі лёгка і надоўга. Дагэ-

туль помніцца і паўтараецца са смакам многае, асабліва з “Пана Тадэвуша”, і не са школьнага завучвання, а з чытання сам-насам з паэзіяй.

Наваградак — з замчышчам, курганам, фарай і музеем — пабачыў я вясною 1931-га. Музей быў толькі што адкрыты, і мне чамусьці асабліва ў ім спадабалася мноства вялікафарматных фотаздымкаў Яна Булгака, пейзажы міцкевічаўскіх мясцін. Вось і цяпер яснее ў вачах пагодлівы летні адвячорак, рэдкія белыя аблокі, на першым плане ладная капіца канюшыны і стараваты дзядзька з добрай прасцяцкай усмешкай, які толькі што ўзвёў салодка-духмяную піраміду і свой трохзубы сахор трымае на “вольна”, зубамі крыху ў зямлю.

Юнацтва маё таксама праходзіла ў цяжкай сялянскай працы, у духоўным саюзе з кнігай. Роднай, польскай, рускай, а цераз іх, дзякуючы перакладу, і з сусветнай, вядома ж, у пэўнай меры. Уласных кніг было няшмат, па іншыя даводзілася хадзіць і ў бліжэйшыя, і ў далёкія вёскі. Потым наогул быў перапынак, — служба ў польскім войску, пачатак Другой сусветнай вайны, баі ў балтыйскім Памор’і, нямецкі палон, уцёкі, падполле, партызанка. І — нарэшце! — мой літаратурны Мінск. Раскоша кніг — бібліятэчных і ўласных. У тым ліку і польскіх, з Міцкевічам у цэнтры. Спачатку паасобнае, а потым і поўны збор, шаснаццаць салідных тамоў.

Для ўшанавання Яго я зрабіў няшмат. У 1955 г. разам з Максімам Танкам падрыхтавалі прыстойны том Выбраных твораў, першы такі ў Беларусі. Пазней, з Уладзімірам Калеснікам, які не толькі педагог і літаратуразнавец, але і добры фатограф, зрабілі альбом “Між тых палёў” (ягонае — “Sród takich pól”), і не наша віна, што паліграфічна ён не надта дасканалы. Пісаў я пра Міцкевіча, пра ўплыў яго паэзіі на мяне — паэзіі высокай, паўтараю, і глыбокай,— таксама мала і не лепш, чым хацелася б. А ён жа з тых вялікіх, якія нам на ўсё жыццё, якіх мы бясконца перачытваем з непрытворным здзіўленнем ад зноў новай і зноў шчасліва першаснай свежасці слова, думкі, пачуцця, якія цудадзейна ўздымаюць нас над марнотнай мітуснёй ды пошласцю нізкага, недастойнага існавання.

Уліку тут ніякага не павядзеш — колькі разоў што перачытвалася. Час ад часу паглыбляўся то ў паэзію, то ў драматургію, то ў публіцыстыку, то ў перапіску. Тут ужо, у першую чаргу, — у ліставанне з землякамі, сябрамі Чачотам і Дамейкам, якіх і мы палюбілі, можна сказаць і так: разам з ім, дзякуючы яму.

У гэтай сувязі мне прыемна згадаць дзве капітальныя працы, і мною прачытаныя з нагоды нашых тутэйшых, карэліцкіх культурных святкаванняў, разам са Скарынаўскім цэнтрам. Гэта кнігі Станіслава Свіркі пра Яна Чачота і прысутнага тут пана Збігнева Вуйціка — пра Ігната Дамейку. Рады падзякаваць вам, наш дарагі, шаноўны госць!

Тут трэба далучыць яшчэ адно імя — таленавітага паэта, талковага навукоўца, ініцыятара стварэння і кіраўніка “Беларускага кнігазбору” Кастуся

Цвіркі, з сяброўскай шчырай удзячнасцю назваць яго кнігу “Філаматы і філарэты”, прэзентацыя якой заслужана ўваходзіць у праграму нашага свята.

Перачытванне… “Пана Тадэвуша” поўнасцю я перачытваў апошні раз у гістарычных, так сказаць, абставінах. У адной з санаторных палат Нясвіжскага замка, дзе мне і добра працавалася, і хораша адпачывалася пад яго, Міцкевічава, слова. Сёлета я зноў быў на працягу некалькіх дзён з “Панам Тадэвушам”. Але ўжо трохі па-дзіўнаму. У томе акадэмічнага (гэта ж “Ossolineum”!), пятага выдання эпапеі, падараванага мне паэтам і даследчыкам творчасці Міцкевіча Юльянам Пшыбасям, чытаў я гэтым разам не тэкст паэта, а каментар даследчыка, даўно заслужанага Станіслава Піганя. Каментара таго было ў аб’ёмным томе, бадай, больш, чым самога вершаванага тексту. А ўсё грунтоўна ды цікава! Добра было зноў ужывацца ў далёкі міцкевічаўскі час, разам з паэтам адчуваць сябе ў яго і ў нашых родных ваколіцах, адчуваць яго роднасць з нашым народам, з нашым словам, якое ён і славіў з міжнародных высокіх кафедраў, якому ён і бязгучна, шэптам падпяваў услед за любай Марыляй. Так я ўбачыў яго, з тым песенным шэптам, так уявіў пад даўнія гукі фартэпіяна, дзявочага голасу і паэтычнапросценькіх ды глыбока трагічных слоў беларускай народная песні:

Да не даў мне Бог,
Не судзіў мне Бог,
Каго я хацела…

Кастусю Цвірку я ўдзячны за яго кнігу пра эпахальна-рэвалюцыйнае юнацтва прамяністых яшчэ і таму, што ад яе старонак мяне зноў павяло да “Дзядоў”, якія я неўзабаве тут, у родных карэліцкіх мясцінах, у наднёманскай прылясной цішыні перачытаў, зноў жа як штосьці новае, з новым хваляваннем.

Я ўжо пра гэта пісаў, але тут хачу паўтарыцца, як у снежні 1955 г., на святкаванні стагоддзя з дня адыходу Адама Міцкевіча ў вечнасць, у Навагрудку, у складзе польскай дэлегацыі быў і Уладзіслаў Бранеўскі. Пасля наведання толькі што адноўленага музея вялікі паэт з ганку прамаўляў да людзей, якіх тым часам падышло туды многа. Вылучыўшы паўзу ў госцевай прамове, з натоўпу пачуўся жаночы беларускі голас:

— Казалі, што ўнук Міцкевічаў тут! Дык каторы ж гэта? Пакажыцеся!

Адказ з вуснаў паэта прагучаў на мове таксама для ўсіх зразумелай:

— Wszyscy jesteśmy jego wnukami!

Многа ўжо, многа за дзвесце гадоў прайшло, адышло яго ўнукаў ды праўнукаў. Многа іх будзе і пасля нас… Пакаленні.

Хай жа святіцца яго імя — у вяках, на ўсёй зямлі, яднаючы людзей у мірным братэрстве, пра якое ён марыў, для якога працаваў і сёння працуе сваім несмяротным словам, сваёй чалавечнай, высакароднай душой!

Ірына Багдановіч *(Мінск)*

ТОПІКА АЙЧЫНЫ Ў ФІЛАМАЦКІХ ВЕРШАХ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Правамернасць абрання такой тэмы, яе асноўная ідэя і сэнс, якія дазваляюць агучыць яе на сёлетніх Карэліцкіх чытаннях, заключаецца ў тым асаблівым, надзвычайным разуменні айчыны — свайго родавага гнязда, яго канкрэтных зямных жыццёвых рэалій, — у эстэтыцы славянскага рамантызму першай трэці XIX ст. Менавіта Адам Міцкевіч прынёс у еўрапейскую літаратуру такое новае, узнёслае, узвялічанае апяванне айчыны, абагаўленне яе, надаў новае дыханне рамантычнаму культу свабоды, увязаўшы яго не толькі з разняволваннем духу мяцежнай, не падлеглай ніякаму ўціску асобы, але з вызваленнем разабранай на часткі, страціўшай свабоду пасля трох раздзелаў Рэчы Паспалітай радзімы. Айчына бачылася і апявалася Міцкевічам у розных іпастасях: у дзяржаўнай, як Рэч Паспалітая, і тут ён выступаў у шырокім сэнсе як польскі (рэчпаспалітаўскі) патрыёт; у этнічнай, краёвай, тэрытарыяльнай, якая акрэсліваецца і замыкаецца межамі Літвы-Беларусі, прынёманскага навагрудскага краю. Рамантычны культ айчыны як краю звязаны ў Міцкевіча не толькі з рэальнай гістарычнай сітуацыяй, у якой ён пачынаў свой творчы шлях, але і з нацыянальнай сармацка-рыцарскай традыцыяй, калі айчына і каханая былі прадметамі рыцарскага служэння і абагаўлення. Для Міцкевіча часта гэтыя два ідэалы зліваюцца ў адзіны вобраз, што потым асабліва паслядоўна адаб'ецца ў творчасці перыяду расійскай ссылкі ("Крымскія санеты") і эміграцыі ("Пан Тадэвуш").

Станаўленне асобы Міцкевіча з дзяцінства праходзіла ў атмасферы традыцыйнага шляхецкага дома з культам інтэлектуальных заняткаў, свабодалюбства і спадзяванняў на аднаўленне былой шляхецкай дэмакратыі і незалежнасці. Патрыятызм, што быў уласцівы сармацкаму светаадчуванню эпохі росквіту барока ў Рэчы Паспалітай, апошнімі апалагетамі якога былі барскія канфедэраты і легіянеры Касцюшкі, узнавіўся як прынцып светаадчування, як важная маральна-этычная катэгорыя, адсунутая ў ідэалогіі Асветніцтва на другарадныя пазіцыі менавіта на хвалі рамантызму. Арганічна і натуральна прыходзяць да ўзняцця гэтага прынцыпу ў якасці фундаментальнага студэнты-філаматы, спазнаючы вытокі свайго патрыятызму не толькі праз уласцівае прыродзе чалавека пачуццё адданасці роднаму кутку, але і праз творы літаратуры, перадусім "Спевы гістарычныя" Юльяна Урсына Нямцэвіча, старэйшага іх сучасніка, пісьменніка, удзельніка гераічных змагарных падзей канца XVIII ст. Філаматы, як слушна заўважана даследчыкамі, былі злучаны не толькі супольнасцю літаратурных і навуковых заняткаў, але "ўсе яны належалі да першага пакалення, народжанага ў ня-

волі” [1]. Адчуванне сваёй пакліканасці як прадстаўнікоў новага светаадчування новай эпохі было звязана ў філаматаў з імкненнем выправіць “віну бацькоў”, і гэта нараджала як патрыятычны ўздым, так і непрыняцце папярэдняга пакалення за тое, што яно дапусціла знявагу, разбор і паняволенне іх дзяржавы. Так у эстэтыцы рамантызму, рэпрэзентаванай Міцкевічам і філаматамі, выспяваў культ Айчыны, які набываў свае канкрэтныя вобразна-семантычныя абрысы. Такім сімвалічным вобразам стала “залатая чара” (“czara złota”) з “Песні філаматаў”, якая перадаецца ад вуснаў да вуснаў у коле сяброў-аднадумцаў і азначае асаблівае прычасце “мёдам айчыны”, што яднае іх усіх у любові, братэрстве і патрыятычным служэнні. У важны рамантычны вобраз-топас вырастаў культ юнацтва, увасоблены ў міцкевічаўскай “Одзе да маладосці”, якая стала “першым у Польшчы маніфестам пакалення” [2].

Палеміка са “старымі” ў названым вершы вялася Міцкевічам як у сэнсе адмаўлення прайграўшага пакалення, так і ў сэнсе крытыкі асветніцкага эстэтычнага кірунку, неадпаведнага сучасным задачам. Стаўка паэтам рабілася на энтузіязм і прагу перамен, што ўласціва маладосці, якая ў супольнасці сяброў (“Razem, młodzi przyjaciele”) сцвердзіць і замацуе новыя каштоўнасці жыцця. Апорай жа для апошніх абвяшчаўся даўні сармацка-рыцарскі патрыятычны ідэал, згодна з якім шчаслівы той, хто загінуў у змаганні за славу айчыны. Менавіта маладыя, поўныя адчування “нектару жыцця” сілы, здольныя перамяніць лёс краіны і абвясціць сонечную раніцу вызвалення (“jutrzenko swobody”), сцвярджаліся ў міцкевічаўскім вершы. Такім чынам, айчына ўяўлялася аб’ектам асаблівай увагі і асаблівага клопату філаматаў. Міцкевіч і яго сябры чулі сябе пакліканымі на высокае служэнне ёй, а рамантызм адкрываў новыя эстэтычныя магчымасці для адлюстравання гэтага ідэалу ў літаратуры.

Такое разуменне айчыны абумовіла і асаблівую сімволіку, адбор вобразных выяўленчых сродкаў, што пры паслядоўнасці выкарыстання, паўтаральнасці адных і тых жа матываў складала своеасаблівую топіку айчыны ў творчасці Міцкевіча. Многія вобразы, аднойчы ўзнікшы, нарадзіўшыся ў філамацкай лірыцы, пачынаюць паўтарацца, вяртаюцца ў новым абліччы ў творы іншых перыядаў, адгукаюцца ў “Санетах”, у “Пане Тадэвушы”, у лазанскім цыкле.

Філамацкая лірыка Міцкевіча яшчэ мала зручная менавіта для выяўлення вобразаў-топасаў айчыны, але ўжо ў ёй завязваюцца іх будучыя ніці. Гэта быў яшчэ той перыяд лёсу і творчасці паэта, калі не прадбачылася ні высылка, ні эміграцыя, якая стане пажыццёвай. Менавіта ў эміграцыі і высылцы ў творах Міцкевіча малая, “краёвая” радзіма засімвалізуецца ў воб-

[1] Siwicka D. Romantyzm, 1822–1863. Warzsawa. 1997. S. 10.
[2] Тамсама. С. 12.

разы-топасы, якія як “навязлівыя ідэі” будуць вяртаць да сябе паэтавы дух. Адным з такіх топасаў стане супастаўленне квітнеючай і пышнай чужыны (крымскай раскошы ў “Санетах”, італьянскай пышнасці ў “Пане Тадэвушы”) і пакінутай, занядбанай, зняслаўленай айчыны, якая, тым не менш, найдаражэйшая і найлепшая для сэрца паэта.

Першапачатковая вобразная мадэль гэтага топасу з’явілася ў філамацкі перыяд у фрагменце нясканчанай паэмы “Бульба”:

О навагрудскі край — мой родны дом,
Праслаўлены Трамбецкага пяром,
Куды б мяне ні кінуў лёс жыццёвы,
Забыць я не змагу твае палі, дубровы.
Нас вабіць невядомы край чужы, —
Цікава паглядзець. Але нязручна жыць,
Дзе свет зацiснуты між гор высокіх,
Змяшаліся святло і цень, мароз і спёка… [3]

(Пераклад Х. Жычкі)

“Крымскія санеты” ў перыяд рассійскай ссылкі замацуюць гэтую вобразную мадэль, зробяць пастаянным выяўленне патрыятычнага матыву праз супастаўляльны топас, які пазней наогул праявіцца як традыцыя ў беларускай літаратуры XIX ст. (напр., у творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча).

Каб наглядна паказаць, як утвараюцца вобразы-топасы, заснаваныя на матыве супастаўлення багатай чужыны і сціплай, але найдаражэйшай айчыны, прывядзём адпаведны ўзор з санета “Пілігрым” крымскага цыкла:

Зямля дастаткаў і красотаў пад нагамі,
Дзе неба яснае, без ценю аблачыны.
Чаму ж адсюль імкнецца сэрца ў далячыні,
Дзе мілы край, што кліча даўнімі часамі?
Літва! Твае лясы больш вабяць галасамі,
Чым салаўі Байдар, Сальгірыі дзяўчыны,
Там весялейшы я хадзіў дрыгвой айчыны,
Чым тут цытрынавымі райскімі садамі. [4]

(Пераклад І. Багдановіч)

Праз кантрастнае параўнанне выдатна выяўляецца настрой паэта, яго настальгічнае пачуццё, афарбаванае смуткам, якое будзе заўсёды накладваць адбітак на яго ўспаміны, узбуйняючы да сімвала ўсе дэталі ранейшага быту і ўкладу жыцця.

Шырока раскрытым вобразам-топасам у Міцкевіча стане Нёман і ўвесь прынёманскі край, як сімвал вялікай, а потым страчанай радзімы. Вяртанне мінуламу яго былой велічы, ідэалізацыя і рамантызацыя ўкладу жыцця старашляхецкага дома, што так поўна адлюстравалася ў “Пане Тадэвушы”, так-

[3] Ажэшка Э. Зімовым вечарам. Міцкевіч А. Свіцязянка. Мн., 1996. С. 302–303.
[4] Mickiewicz A. Sonety = Міцкевіч А. Санеты. Мн., 1998. С. 97.

сама можа разглядацца як характэрны міцкевічаўскі топас, заснаваны на адным з вызначальных рамантычных прынцыпаў. У філамацкі перыяд, калі Міцкевіч яшчэ жыў тут, на роднай зямлі, і рыхтаваў сябе ў коле філаматаў для паважнай службы на дабро айчыны, апошняя пазнаецца ў яго творах не толькі па абстрактных рамантычных сімвалах, але па канкрэтных рэаліях і знаках. Айчына — гэта найперш яго сябры-філаматы, для якіх ён склаў крэда ў вершы "Hej, radośćia oczy błysną", абвясціўшы асноўныя філамацкія ідэалы: айчына, навука, цнота. У яго вершах усе сябры названы пайменна: Ян Чачот, Тамаш Зан, Ігнат Дамейка, Францішак Малеўскі, любімы выкладчык гісторык Іаахім Лялевель, каханыя дзяўчыны і сяброўкі Марыля і Зося. Шматгалосае людское асяроддзе, у якім ён жыў, станавілася жывой вобразнай фактурай яго твораў. Шырока і канкрэтна адбіваецца менавіта ў ранні філамацкі перыяд у міцкевічаўскіх творах і мясцовая "геаграфія". Асабліва такой вобразнай канкрэтыкай вылучаецца рамантычная балада "Свіцязь", што ўвогуле не было характэрным для паэтыкі баладнага жанру, скіраванага ў свет фантазіі, выдумкі, містыкі. Але ж містычная дзея міцкевічаўскай балады адбываецца на беразе маляўнічага рэальнага возера, які стаў цяпер адным з прыродных сімвалаў самога паэта і месцам паломніцтва яго прыхільнікаў. Апрача гэтага, твор насычаны рэаліямі, звязанымі з Марыляй Верашчака: па-першае, ён прысвечаны яе брату, Міхалу Верашчаку, у знак успаміну пра сумесна праведзены з ім час у радзінным фальварку Плужыны каля Свіцязі. Па-другое, згадваецца ў творы і легендарны князь Туган, імя якога ёсць відавочная алюзія да Туганавічаў — знакаміты маёнтак Верашчакаў. Па-трэцяе, каб разабрацца з дзівосамі, якія чыняцца на беразе возера, у баладзе, як мы помнім, было "дано на імшу ў кожным касцёле" і "ksiądz przyjechał z Cyryna" ("з Цырына пробашч прыехаў"). "Свіцязь" — адзіная сярод міцкевічаўскіх балад, у якой легендарны фантазійны сюжэт так цесна пераплецены з канкрэтнымі геаграфічнымі і асабістымі рэаліямі.

Насычаным канкрэтна-вобразным апісаннем рэалій айчыны вылучаецца і ўжо згаданы фрагмент няскончанай паэмы 1819 г. "Бульба", які пачынаецца паэтычным зваротам: "O nowogródzka ziemio, kraju moj rodzimy…". Фрагмент ідэалізавана адлюстроўвае міцкевічаўскае захапленне былым шляхецка-рыцарскім укладам жыцця сваёй радзімы, асновы якога яшчэ не былі страчаны за два дзесяцігоддзі пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай і абнавіліся ў грамадстве ў сувязі з напалеонаўскай кампаніяй 1812 г. Гонарам сваёй "niemeńskiej ziemicy" ў фрагменце паэт лічыць тое, што яна "w bohatyry wielmoźna", г. зн. слаўная сваімі героямі, сярод якіх ён называе "Sejmowych Wereszczaków rodzie znamienity, i szczorsowski nad inne podniesiony hrabia uczoną ręką dziwy ziemiańskie wyrabia" [5]. Можна сказаць,

[5] Mickiewicz A.Wybór poezyi. Wrocław, 1974. S. 59.

у гэтым творы адбылася першая мастацкая рамантызацыя роднага краю — “нёманскай зямліцы”: “Twój lud sławny z dostatków, slawniejszy z wolności” [6].

Пазней матыў ідэалізацыі старашляхецкага укладу жыцця, усіх яго падрабязнасцей і рэалій, абумоўленых побытам і ў той жа час узнесеных над побытам, стане паўнагучным у “Пане Тадэвушы”, дзе ўспрыняцце і вобразнае ўвасабленне айчыны будзе абвострана хранічнай эміграцыяй. Твор пачынаецца з малітвы, у якой паэт спадзяецца на хрысціянскі цуд вяртання ў айчыну:

Do tych pagórków leśnych, do tych łak zielonych,
Szeroko nad błękitnym Niemnem rozciągnionych. [7]

Нёман быў найбольш паслядоўна адбітым сімвалам-топасам айчыны ў творчасці Міцкевіча яшчэ з філамацкіх часоў. У знакамітых Шчорсах, маёнтку, які тады належаў Адаму Храптовічу, а філаматы і Міцкевіч заўжды гасцінна прымаліся там гаспадаром, быў напісаны санет Міцкевіча “Да Нёмана” (нядаўна выдадзены асобна ў 11-ці беларускіх перакладах), у датаванні якога даследчыкі вагаюцца ад 1819 да 1822 г.

“Niemnie, domowo rzeko moja!” — так непасрэдна выяўляў патрыятычнае пачуццё аўтар, выклікаючы сваім эпітэтам “domowa” асацыяцыі хатняй утульнасці і абароненасці — таго, што заўсёды даваў чалавеку Дом. Але ж гучыць тут і іншая філасофская думка аб незваротнасці шчаслівых юнацкіх год:

Дзе век бурлівы, леты нашы маладыя?
Лаура дзе? Сяброў не бачу, любых твараў,
Усё прайшло, а слёзы памяці жывыя. [8]

(Пераклад У. Мархеля)

Такім пытаннем заканчвае свой санет Міцкевіч, а яго вобразная палітра праявіцца яшчэ раз у крымскім санеце “Бахчысарай”, дзе паўторыцца матыў слёз і незваротнай хуткаплыннасці жыцця:

Фантан гарэма ў цэнтры залы мармуровы
Адзіны пражыў распад і вымірання,
Сцякаюць перлы слёз, нібы нямыя словы:
Дык дзе ж вы, слава, і магутнасць, і каханне,
Што меліся свае тут вечна ткаць пакровы?
Знябыліся! Вада ж крынічыць не прыстане. [9]

(Пераклад І. Багдановіч)

Вобраз чыстай слязы як знак ранімасці і высокіх пачуццяў, развіваючыся ў далейшым у творчасці Міцкевіча (верш “Паліліся мае слёзы…”

[6] Mickiewicz A. Wybór poezyi. S. 60.
[7] Mickiewicz A. Pan Tadeusz. Warszawa, 1988. S. 9.
[8] Mickiewicz A. Sonety = Міцкевіч А. Санеты. С. 35.
[9] Тамсама. С. 79.

з цыклу лазанскай лірыкі), набывае зноў жа статус вобраза-топаса. І гэты топас звязаны таксама з айчынай, бо праяўляе і крышталізуе паэтавы пачуцці да яе, успрынятыя праз асэнсаванне свайго асабістага лёсу:

Паліліся мае слёзы, як дождж чысты і краплісты,
На маленства, што было анельскім, сельскім,
На юнацтва час мой шумны, неразумны,
А таксама на век сталы, век няўдалы:
Паліліся мае слёзы, як дождж чысты і краплісты. [10]

(Пераклад М. Танка)

Не толькі вершы сведчаць аб тым, але і лісты блізкіх да паэта ў эміграцыі суайчыннікаў. Так, Ф. Шапэн у лісце да Д. Патоцкай з Парыжа ў 1846 г. апісвае візіты Міцкевіча да яго, гранне на фартэп'яна і ўспрыняцце гэтага грання паэтам, які нязменна пераносіўся ў час такіх хвілін на далёкую і незабыўную айчыну: "У апошні раз я досыць доўга яму граў, баючыся падняць на яго вочы, бо я чуў, як ён плача. А потым, калі ён развітваўся, я сам дапамог яму апрануцца, таму што не хацеў, каб лакей бачыў яго заплаканым. Міцкевіч вельмі расчуліўся, абняў мяне за галаву і моцна пацалаваў у лоб, вымавіўшы за ўвесь вечар першыя словы: "Няхай Бог узнагародзіць цябе, ты перанёс мяне…" І не скончыў, бо слёзы зноў сціснулі яму горла, і так, змагаючыся з гэтым плачам, ён пайшоў…" [11]

Вобразная топіка айчыны ў філамацкай паэзіі А. Міцкевіча цесна злучана з рэаліямі яго паўсядзённага быту, адлюстроўвае сяброўскае кола і геаграфію рэгіёна, мае прыродна-ландшафтнае і гісторыка-культурнае напаўненне. Яна канкрэтная і сімвалічная адначасова. Яна адбіваецца і развіваецца ў яго далейшай творчасці.

Адам Мальдзіс *(Мінск)*

"МАЛАЯ", "СЯРЭДНЯЯ" І "ВЯЛІКАЯ" РАДЗІМЫ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Барацьба паміж палякамі, беларусамі і літоўцамі за тое, каб цалкам і непадзельна валодаць імем і спадчынай генія сусветнай літаратуры Адама Міцкевіча адбываецца — яўна або затоена, па-партызанску — бадай, на працягу ўсяго XX ст. Прытым кожны ў гэтым змаганні, як правіла, не чуе суседзяў, не арыентуецца і на іх чуццё. Кожны імкнецца да ўласнага самазадавальнення. Звычайна так бывае, калі ёсць *што* дзяліць, калі спадчына багатая і прывабная.

[10] Ажэшка Э. Зімовым вечарам; Міцкевіч А. Свіцязянка. С. 334.
[11] Цыт. па кн.: Мицкевич А.Собр. соч.: В 5 т. М., 1954. Т. 5. С. 686.

Найбольш рацыі ў супрацьстаянні вакол імя і творчасці паэта, безумоўна, маюць палякі. Ці не самым галоўным крытэрыем нацыянальнай належнасці таго ці іншага аўтара з'яўляецца яго мова. А мова ў Міцкевіча польская, хаця і з прыкметным дамешкам беларусізмаў, што аніяк не маглі ўспрыняць першыя варшаўскія рэцэнзенты паэта, якія вызнавалі кансерватыўны тады класіцызм. Аднак цяжэй польскім даследчыкам даказаць польскі патрыятызм Вешчуна, бо ён усклікаў не "Зямля Варшаўская, краю мой родны!" і не "Польшча! Мая Айчына, ты як здароўе", а называў родным краем Навагрудчыну, абвяшчаў сваёй айчынай Літву. Адчуваючы тут нелагічнасць, хісткасць сваіх пазіцый, польскія дыскутанты спрабуюць абвясціць Навагрудчыну не толькі "крэсамі ўсходнімі" першай, другой і нават трэцяй Рэчы Паспалітай, што можна яшчэ неяк вытлумачыць гістарычнай традыцыяй, але і… арганічнай часткай этнічнай Польшчы. Нават у годзе мінулым польскія аўтары дарожнага даведніка "Шляхам Адама Міцкевіча па Беларусі" Зянон Скуза і Крыстына Войда безапеляцыйна сцвярджалі пра часы А. Міцкевіча, што "…тагачасная Навагрудчына… з'яўлялася як эканамічна, так і цывілізацыйна адсталым рэгіёнам Польшчы" [1]. І далей: "ТАМ была частка Польшчы, больш таго — усюды ТАМ па-ранейшаму прысутнічае Польшча" [2]. Абвяргаць такое сцвярджэнне сэнсу не мае. Зазначу толькі, што ў часы І Рэчы Паспалітай Навагрудчына ў склад Кароны, г. зн. Польшчы, у адрозненне, скажам, ад Кіева ці Львова, ніколі не ўваходзіла. Адсталым рэгіёнам ці крэсамі Вялікага Княства Літоўскага Навагрудчыну таксама не назавеш, бо гэта былі яе сярэдзінныя, дзяржавазаснавальныя і ці не найбольш эканамічна развітыя землі (прыгадаем маёнткі Іаахіма Храптовіча). А ў часы А. Міцкевіча Навагрудчыну сапраўды пачыналі адносіць да крэсаў, ускраін. Але гэта былі "ўскраіны" ўжо зусім іншай дзяржавы — Расійскай імперыі.

Аднак пяройдзем да іншых апанентаў затоенага, але зацятага супрацьстаяння. Здавалася б, што сённяшняя Літва, паколькі Міцкевіч нібыта *яе* называў сваёй айчынай, мае ледзь не найбольшае права лічыць яго сваім. Тым больш што "літоўскі" патрыятызм выразна выпраменьваюць не толькі "Пан Тадэвуш", але і "Конрад Валенрод", і "Гражына". Тым больш што як грамадзянін і як паэт Міцкевіч фарміраваўся ў сённяшняй літоўскай сталіцы, у Віленскім універсітэце, што настаўнічаў ён у Каўнасе, першай дзяржаўнай сталіцы Летувы. І сёлетняя галоўная навуковая канферэнцыя ў Вільнюсе так і будзе называцца: "Літва — малая радзіма Міцкевіча". Але ж, запярэчым, сваёй "малой радзімай", "родным" краем Адам Міцкевіч слушна лічыў Навагрудчыну, а гэта, прабачце, этнічна беларуская зямля.

[1] Skuza Z., Wojda K. Szlakiem Adama Mickiewicza na Białorusi. Warszawa, 1997. S.47.
[2] Тамсама. С.50.

Этнічных жа літоўцаў паэт называў жмудзінамі. Літоўскай мовы не ведаў. Праўда, пастараўся на слых запісаць тры літоўскія народныя песні, але зрабіў гэта механічна, з памылкамі. Літоўскага фальклору ён, па сутнасці, не ведаў і не выкарыстоўваў.

Свае казырныя аргументы ёсць у перманентнай барацьбе і ў беларусаў. Найперш — паходжанне. Род Міцкевічаў, быў, як кажуць, тутэйшым, а не прышлым і, відаць, — тым больш, што тое даказваюць і польскія даследчыкі, — вёў сваё паходжанне ад селяніна Міцькі, з паўночна-ўсходняй Беларусі. Зрэшты, ускосным доказам служыць тут сялянскасць другога Міцкевіча — Якуба Коласа. Потым, Адам Міцкевіч нарадзіўся на этнічна беларускай, хоць і значна апалячанай (у сацыяльных вярхах) тэрыторыі. Як сведчыў польскі даследчык Анджэй Кэмпфі [3], гэтую тэрыторыю — найперш Віцебшчыну і Магілёўшчыну, але часам і Навагрудчыну — у рэальным, а не метафарычным сэнсе ён называў Беларуссю. Так, у артыкуле для "Pielgrzyma Polskiego" Вяшчун падкрэсліваў: "Аднак мы забываем, што нашы дзяды аддалі Беларусь, не праліўшы ні кроплі крыві" [4]. Або: "Ускладаем надзеі на паўстанне ў Літве, на Украіне, Падолі, Беларусі" [5]. Ці яшчэ, у лісце да ўраджэнца зямлі Навагрудскай Ігната Дамейкі: "Янак апублікаваў у Вільні "Вясковыя песенкі", прыгожа перакладзеныя, і, кажуць, вярнуўся на Беларусь" [6]. Урэшце, Адам Міцкевіч добра ведаў беларускую народную творчасць, што засведчыў сваімі баладамі і другой часткай "Дзядоў", высока цаніў беларускую мову, што знайшло сваё выражэнне ў лекцыях, прачытаных слухачам Калеж дэ Франс. І гэтая мова, і фальклор, і народны побыт былі яму з дзяцінства *сваімі*. Ніякага бар'еру, штучнага падзелу тут не адчувалася. Дастаткова прыгадаць, як арганічна ўвайшлі беларусізмы ў лексіку "Пана Тадэвуша". Таму можна паверыць легендзе, што Міцкевіч пісаў вершы і па-беларуску, прынамсі ў філамацкі перыяд. Мог жа ён адказаць беларускім экспромтам на беларускі ж верш-прывітанне Яна Чачота "Едзе міленькі Адам", як змог запісаць ужо дакументальна засведчанае беларускае двухрадкоўе пра "страшны суд" на старонцы французскай энцыклапедыі, знаходзячыся ў Коўне.

Зыходзячы з пералічаных аргументаў, многія беларускія аўтары абвяшчалі А. Міцкевіча толькі беларускай "уласнасцю". У прыватнасці, калі выйшаў шасцітомны бібліяграфічны слоўнік "Беларускія пісьменнікі" і вусна і ў друку (артыкулы Кастуся Цвіркі) у адрас вашага пакорнага слугі выказваліся прэтэнзіі, чаму побач з Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам і Фран-

[3] Kempfi A. W kręgu Mickiewiczowskich wypowiedzi: O Białorusi i Litwie // Magazyn Wileński. 1997. Nr 1. S. 32–33.

[4] Тамсама. С.32.

[5] Тамсама.

[6] Тамсама.

цішкам Багушэвічам там не аказалася Адама Міцкевіча і Элізы Ажэшка. Маўляў, Дунін-Марцінкевіч і Багушэвіч таксама пісалі па-польску. На гэта я адказваў, што ў адрозненне нават ад Уладзіслава Сыракомлі назваць Адама Міцкевіча ні беларуска-польскім, ні нават польска-беларускім паэтам нельга, бо для гэтага не стае "дробязі" — беларускіх вершаў паэта, якія ёсць у таго ж Сыракомлі. У крайнім выпадку яго можна назваць, як і Нямцэвіча, Нарушэвіча, Князьніна, многіх іншых, польскім (ці, як прапанаваў Уладзімір Мархель, польскамоўным) паэтам Беларусі, узятай як тэрыторыі сённяшняй дзяржавы. Аднак такая слоўная эквілібрыстыка мала што дае.

Дык хто ж тады мае рацыю сярод трох апанентаў, якія спрабуюць падзяліць Міцкевіча, засунуць яго ў сваю шуфляду паводле ўласнага бачання. А творчасць А. Міцкевіча не дзеліцца, не дапасоўваецца да гэтых нацыянальных шуфлядаў, бо яны сканструяваны паводле сённяшняга светабачання. І таму — анахранічныя, агістарычныя. Каб зразумець Міцкевіча, мы павінны падыходзіць да яго паводле крытэрыяў і катэгорый *яго* часу. І тады зразумеем, што ўсё і прасцей, і складаней.

Дык чыім жа патрыётам быў Адам Міцкевіч? Якая дзяржава была яго ідэалам?

Такой дзяржавай, зразумела, не магла быць тагачасная Расійская імперыя, да якой тады належала радзіма паэта. Вядома, ён ніколі не ставіў знак роўнасці паміж царскай уладай, салдатам-"маскалём" і рускім народам, рускай культурай, якая дала яму Пушкіна і Рылеева. Але Расійская імперыя была для яго адным з захопнікаў, якія падзялілі яго "вялікую" радзіму. З царскім дэспатызмам паэт змагаўся — яўна або па-валенродаўску — усё свядомае жыццё.

Найперш Міцкевіч быў патрыётам сваёй калыскі — Навагрудчыны. Гэта была яго "малая радзіма", на алтар якой ён усклаў яшчэ не нацыянальны, а "краёвы", рэгіянальны, "тутэйшы" характар, як і ў многіх іншых польскіх пісьменнікаў, напрыклад, Генрыка Жавускага, Лукаша Галамбёўскага, што нарадзіліся на беларускай зямлі ці жылі тут у канцы XVIII ст. [7]. Калі б Міцкевіч нарадзіўся прыкладна на стагоддзе пазней, можа быць, ён знайшоў бы ўласнае імя сваёй "малой радзімы", зрабіў бы рашучы крок ад "тутэйшасці" да нацыянальнасці, прытым беларускай. Аднак што тут мадэрнізаваць мінулае. Міцкевіч быў сынам эпохі Асветніцтва, якая агульначалавечае, разумовае ставіла вышэй нацыянальнага, пачуццёвага. "Вясна народаў", якая зноў абудзіла паэта да дзеяння ў сярэдзіне XIX ст., была яшчэ наперадзе. І Міцкевіча не дужа хвалявала, сярод якога канкрэтна народа ён жыве. Для яго важна было, што гэты народ свой, што ён надзелены высокімі агульначалавечымі якасцямі, маральнасцю — рысамі, якія

[7] Падрабязней пра гэта гл.: Мальдзіс А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя. Мн., 1982. С. 86–100.

знайшлі сваё выяўленне ў звычаёвым праве і ў фальклоры і таму варты лепшай долі, змагання за яе.

Навагрудчына з'яўлялася для Міцкевіча складовай часткай, ядром яго ідэальнай дзяржавы — Літвы, разуметай не ў этнічным, а ў гістарычным сэнсе, як былое Вялікае Княства Літоўскае, поліэтнічнае і поліканфесійнае. Той жа А. Кэмпфі пераканаўча паказаў, што вялікі сын зямлі Навагрудскай добра адрозніваў Літву-Русь і Літву-Жмудзь, мову руска-літоўскую і жмудска-літоўскую [8]. Памяць пра гэтую дзяржаву, адносна самастойную ў Рэчы Паспалітай, яшчэ жыла ў народзе, асабліва сярод шляхты, яе ідэалізавалі, яе спрабавалі адрадзіць — ці то спадзеючыся на добрую волю Аляксандра I, як гэта меркаваў Міхал Клеафас Агінскі, ці то робячы стаўку на чужаземцаў-французаў, на Напалеона. На пачатку XIX ст. адражэнне ВКЛ выглядала яшчэ вельмі рэальна. Яно ўкладвалася ў асветніцкую канцэпцыю, дзе многае залежала ад адукаванага манарха. Для такога адраджэння, няхай і ў складзе Расійскай імперыі, а таму частковага, ілюзорнага, не трэба было перамагаць усіх трох захопнікаў, што падзялялі Рэч Паспалітую (паражэнне паўстання пад кіраўніцтвам Касцюшкі паказала, што гэта гераічна, але нерэальна). Выглядала, што дастаткова было пераканаць аднаго з іх — расійскага цара. Дазволіў жа ён стварыць Царства Польскае на чале з асобным намеснікам. То чаму не мог пагадзіцца на Княства Літоўскае з іншым намеснікам? І толькі пры Мікалаі I, пасля паражэння паўстання дзекабрыстаў і асабліва паўстання 1831 г., ілюзіі Міцкевіча канчаткова развеяліся — ён зразумеў, што дарогі назад няма. І ці не таму марудзіў у Вялікапольшчы, не дужа спяшаўся пад Варшаву і Вільню. Шляху ў будучыню ён яшчэ, да "вясны народаў", не бачыў. Літва ж, Вялікае Княства Літоўскае, для яго, апошняга вялікага патрыёта гэтага княства, памерла. І "Пан Тадэвуш" з'явіўся надмагільным каменем не столькі для ўсёй Рэчы Паспалітай, як пісаў Станіслаў Ворцаль, колькі для роднай і таму асабліва дарагой Літвы, грамадзянінам якой ён пачуваўся. Паўтаруся: Літвы не этнічнай, а гістарычнай.

Урэшце, "вялікай" радзімай Вешчуна з'яўлялася ўся колішняя Рэч Паспалітая двух, а фактычна чатырох народаў. Да паўстання 1831 г. Міцкевіч успрымаў яе даволі абстрактна. І толькі пасля яго паражэння, у "Кнігах польскага народа і польскага пілігрымства", у артыкулах для "Pielgrzyma Polskiego", Міцкевіч прыйшоў да ўсведамлення, што нельга адрадзіць частку, не адрадзіўшы цэлае, што Рэч Паспалітая была распята на крыжы дзеля адкуплення грахоў усёй Еўропы і таму ўся Еўропа павінна дапамагчы ёй уваскрэснуць. Месіянізм Міцкевіча 30–40-х гг. мае ўжо не "літоўскі", а польскі характар.

Такім чынам, Міцкевіч не аддзяляў Навагрудчыну ад Літвы, а Літву ад усёй былой Рэчы Паспалітай. Для яго гэта было адно ўзаемазвязанае цэ-

[8] Magazyn Wileński. 1997. Nr 1. S. 33.

лае. І таму нелагічна і негістарычна было б дзяліць Міцкевіча і яго спадчыну паводле пазнейшых нацыянальных крытэрыяў, паводле якога-небудзь аднаго этапа ў эвалюцыі яго нацыянальна-патрыятычных поглядаў — ад ранняга "краёвага" рэгіяналізму праз "літоўскасць" і польскасць да разумення (на хвалі рэвалюцыйнага 1848 г.) шматэтнічнасці і былой Рэчы Паспалітай, і ўсёй Еўропы, да прызнання ў газеце "Tribune de People" ("Трыбуна народаў") права кожнага народа на роўнасць і свабоду.

Таму А. Міцкевіч у большай або меншай ступені належыць усім народам былой Рэчы Паспалітай, усяго славянства і ўсёй Еўропы. Блізкія да такой думкі і польскія даследчыкі. Так, прафесар Вроцлаўскага універсітэта, дарэчы, ураджэнец Беларусі і беларусіст, Францішак Сяліцкі сцвярджае, што "з'ява, якой быў Міцкевіч, з'яўляецца красамоўным сімвалам шматвяковага палітычнага і культурнага жыцця польскага, літоўскага і беларускага народаў […]" [9]. А Юзаф Левандоўскі блізкі да прызнання "двухэтнічнасці" паэта. "Справа заключаецца ў тым, — пісаў ён на старонках парыжскай "Культуры", — што мы прызвычаіліся трактаваць нацыянальную належнасць як адназначны, выключны і нават супрацьпастаўны выбар. Адсюль неразумныя, па сутнасці, спрэчкі пра нацыянальнасць Каперніка, Міцкевіча, адсюль абурэнне літоўскасцю Мілаша і г. д. Тымчасам у гэтай [усходняй. — *А. М.*] частцы Еўропы мы маем справу з мільёнамі людзей, уцісканне якіх у адну перагародку падобна да калечання" [10].

Дык не будзем жа калечыць, дзелячы на часткі, геніяў. Няхай кожны знаходзіць у іх тое, што ім адпавядае. Няхай спадчына іх збліжае нас, а не падзяляе, як не падзялялі яны сябе самі.

Святлана Кошур *(Карэлічы, Беларусь)*

РУТА Ў ЖЫЦЦІ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Паміж Карэлічамі і Навагрудкам, прыкладна на аднолькавай адлегласці, знаходзіцца вёска Рута. З ёю, а дакладней, з маёнткам Рута, размешчаным некалі недалёка ад аднайменнай вёскі, звязаны імёны людзей, вядомых ва ўсім свеце. У 1574 г. тут нарадзіўся беларускі пісьменнік, уніяцкі мітрапаліт Іосіф Вельямін Руцкі.

А ў пачатку XIX ст. у Руце шмат разоў бываў Адам Міцкевіч. У 1812 г., калі памёр бацька паэта, Адаму ішоў 14 год. Ён быў вучнем Навагрудскай дамініканскай школы, а паколькі ў сям'і ў гэты час з'явіліся матэрыяльныя

[9] Sielicki F. Mickiewicz i Białoruś: Kilka szczegółów // Studia o Mickiewiczu. Wrocław, 1992. S. 126.

[10] Lewandowski J. Podróże krztałcą // Kultura. 1997. Nr 7–8. S. 74.

цяжкасці, Адам стаў рэпетытарам вучняў малодшых класаў. З гэтай пары шмат часу ён праводзіў у свайго апекуна, суддзі Медарда Растоцкага ў маёнтку Рута. Бывалі там і іншыя члены сям'і Міцкевічаў. Пазней паэт прыязджаў сюды ў час канікул і на святы.

Звернемся да перапіскі А. Міцкевіча, каб упэўніцца ў тым, што Рута неаднаразова ўпамінаецца ў лістах паэта і блізкіх да яго людзей. Пасля заканчэння Віленскага універсітэта А. Міцкевіч стаў выкладчыкам Ковенскай гімназіі і, адарваны ад сяброў-філаматаў, вёў з імі ажыўленую перапіску.

У кастрычніку 1819 г. паэт пісаў свайму сябру Ю. Яжоўскаму, што правёў пяць дзён у вёсцы, дзе сёе-тое напісаў. Даследчыкі творчасці А. Міцкевіча мяркуюць, што месцам яго знаходжання тады была менавіта Рута.

У наступным лісце да таго ж адрасата 19 лістапада (1 снежня) 1819 г. Адам Міцкевіч паведамляў, што атрымаў з дома вестку ад брата Францішка, які павінен быў на Раство прыехаць у Вільню разам з Растоцкім.

У лісце паэта да Яна Чачота ад 19 лютага (2 сакавіка) 1820 г. чытаем: "Розныя абставіны, справы філаматаў ледзь далі мне магчымасць адказаць на твой апошні ліст. А цяпер трэба яшчэ напісаць у Навагрудак і Руту".

Брат паэта, Аляксандр, у маі 1820 г. пісаў яму з Вільні аб тым, што Францішак прыехаў у Руту і там захварэў.

Зімой 1821 г. (каля 25 студзеня / 6 лютага) Ігнат Дамейка паведамляў паэту з Вільні: "Пазнаёміўся з тым, у каго ты праводзіш канікулы, здаецца, Растоцкім. Доўга гутарылі пра цябе, ён казаў табе кланяцца, а таксама кланяюцца яшчэ некалькі асоб".

Тут, у Руце, А. Міцкевіч бываў у самыя цяжкія для яго дні, пасля смерці маці, а пазней пасля таго, як развітаўся назаўсёды са сваёй каханай Марыляй Верашчака. Доўга не мог апамятацца паэт пасля апошняга наведвання Навагрудка летам 1821 г., бо ніхто не сустрэў яго, як раней, і не сказаў яму цёплых і пяшчотных слоў. Моцная туга ахапіла сэрца паэта. У лісце да Яна Чачота, напісаным у гэты час (каля 25 ліпеня / 6 жніўня 1821 г.) знаходзім радкі: "Збег у Руту, тут [у Навагрудку. — *С. К.*] не вытрымаць ні дня".

Тады ж, у канцы ліпеня 1821 г., А. Міцкевіч наведаў Туганавічы, аб чым паведаміў Яну Чачоту: "З Руты паехаў у Туганавічы, у варотах сустрэў экіпаж і адразу ж пазнаў, а хутчэй адчуў, што там была Марыля. Не ведаю, што са мною зрабілася".

Крыху пазней, 4 верасня, у лісце Францішка Малеўскага да Ю. Яжоўскага можна прачытаць наступнае: "Адам пісаў з Руты, запрашаючы мяне на абед, яшчэ ніяк не збяруся, але хутка паеду".

Частым госцем у Руце быў брат паэта Францішак. 11 кастрычніка 1822 г. ён звярнуўся ў сваім лісце да Я. Чачота з просьбай прыслаць ноты для дачок суддзі Медарда Растоцкага, у якога ён доўга жыве і якога лічыць амаль што сваім бацькам.

Захаваліся таксама ўспаміны Э. Хлапіцкага, у якіх ёсць звесткі пра тое, што Міцкевічы часта бывалі ў Руце: “З-за вугла дома [у Руце. — *С. К.*] выглянуў згорблены векам стары і пачаў нам расказваць пра свайго былога пана і чатырох панічоў Міцкевічаў, пра іх сялянскія забавы і пра Адама, які часта любіў хадзіць на вясковыя святы і гуляў на Купалле з людзьмі па суседніх вёсках.

У таго ж аўтара ёсць апісанне маёнтка Рута: “Руцянскі двор, абсаджаны ўздоўж дарогі прыгожымі таполямі, знаходзіўся на адным з лясных узгоркаў. Бор за ім, ручай унізе і сад з векавымі грушамі вакол яго рабілі гэты куточак надзвычай прывабным”.

Пазней, у Парыжы, за некалькі гадоў да смерці, любуючыся цудоўнымі лясамі Фантэнбло, Міцкевіч параўноўваў іх з прыродай Руты, прычым параўнанне гэта было на карысць вёскі на роднай Навагрудчыне. Калі нават у апошнія гады жыцця паэт так захапляўся прыродай Руты, то зразумела, што ў той час, калі ён пачаў работу над паэмай “Пан Тадэвуш” (1832), родныя краявіды паўставалі перад ім ва ўспамінах яшчэ больш яскрава, і гэта не магло не знайсці адлюстравання ў творы.

А. Міцкевіч не толькі шчыра захапляўся прыгажосць Руты і быў моцна прывязаны да М. Растоцкага, якога называў “сваім любімым апекуном”. Ён увекавечыў Руту ў сваёй першай баладзе “Люблю я”, напісанай у 1819 г., і ва ўступным да яе вершы пад назвай “Да сяброў”.

Напалоханы хваробай Яна Чачота, 20 снежня (1 студзеня) 1820 г. паэт пісаў яму з Коўна, што, убачыўшы дрэнны сон, доўга не мог заснуць і ў гэтую ноч напісаў дзве кароценькія балады, абяцаючы адну з іх дапрацаваць і прачытаць сябрам. Вядома, што ўпершыню А. Міцкевіч прачытаў баладу “Люблю я” ў Вільні 27 снежня 1819 г. (8 студзеня 1820 г.) на пасяджэнні “Саюза сяброў”.

Балада мае форму расказа, звернутага да каханай:

Бачыш, Марыля, ла самага гаю
Вербы ўзнялі свае шаты,
Рэчка віецца далінаю з краю,
Мосцік над рэчкай гарбаты.

Дзеянне адбываецца ў Руце, каля старой царквы на могілках, дзе ў паэта зламалася брычка.

Ехаў да Руты аднойчы я позна,
Коні спыніліся штосьці,
Фурман дарэмна крычыць на іх грозна,
Ляскае пугай на мосце.

(Пераклад А. Зарыцкага)

Засмучаны тым, што прыйдзецца начаваць у такім жахлівым месцы, паэт усклікнуў: “To lubię!” (“Люблю я!”), у сэнсе: вось гэта мне падабаец-

ца! Пасля гэтых слоў перад ім з'явілася здань і падзякавала за тое, што ён пазбавіў яе ад пакут пекла словамі "люблю я!". А прычынай пакут было тое, што некалі дзяўчына, абыякавая да слёз і адчаю чалавека, які яе моцна кахаў, загубіла яго жыццё. Ствараючы гэтую баладу, паэт, душа якога ўвесь час знаходзілася паміж надзеяй і адмовай ад яе, нібы прадбачыў тыя пакуты, якія прынясе яму каханне да Марылі Верашчака.

Вядома, што балада была спачатку напісана для Іагасі, шляхцянкі, якая была першым юнацкім каханнем Міцкевіча, але потым паэт зняў прысвячэнне Іагасі, і ў вершы "Да сяброў" з'явілася імя Марылі.

Цікава было б тут успомніць пра адзін выпадак з жыцця А. Міцкевіча, які мае дачыненне да гэтай балады. Аднойчы летам у Руце, не знайшоўшы раніцай свайго адзення, паэт апрануў белае адзенне пана Растоцкага і ў такім выглядзе рушыў ў поле. Калі ён быў на мосціку, што апісваецца ў баладзе, то ўбачыў сына мясцовага святара, які ішоў у гэты бок. Схаваўшыся пад мосцік, А. Міцкевіч так напалохаў хлопца, што той нават страціў прытомнасць, бо яму здалося, што перад ім з'явілася здань. Пазней гэты выпадак, а таксама народныя паданні далі штуршок для стварэння цудоўнай балады. Гэты эпізод прыгадаў у сваёй кнізе Л. Падгорскі-Аколаў.

Але не толькі ў баладзе "Люблю я" паэт успомніў Руту. Той жа даследчык лічыць, што апякун паэта М. Растоцкі паслужыў прататыпам Суддзі ў паэме "Пан Тадэвуш", а судовы працэс, які адбываўся з апекуном А. Міцкевіча, лёг у аснову працэса, пра які гаворыцца ў паэме. Справа ў тым, што М. Растоцкі валодаў маёнткам Рута незаконна і вымушаны быў на працягу многіх гадоў судзіцца за яго, бываць у сувязі з гэтай справай у Пецярбургу. Міцкевіч чуў расказы апекуна пра гэты горад, ведаў пра судовы працэс Растоцкага, і ўсё гэта настолькі глыбока адклалася ў яго памяці, што так ці інакш павінна было знайсці адлюстраванне ў яго творчасці.

У Гродзенскім гістарычным архіве мне ўдалося адшукаць дакументы, якія дазволілі прасачыць гісторыю судовага працэса М. Растоцкага. Як сведчаць дакументы, маёнтак гэты з 1789 г. належаў мітрапаліту Феадосію Растоцкаму, які купіў яго ў ліфляндскага скарбніка Іпаліта Дамейкі за 28 000 злотых. М. Растоцкі, пляменнік мітрапаліта, стаў гаспадаром Руты ў 1803 г. па падложнай даравальнай. У 1816 г. у маёнтку, які новы гаспадар назваў "Зялёнаю Рутаю", налічвалася 79 душ мужчынскага полу і 76 — жаночага.

Даведаўшыся пра ўчынак пляменніка, сапраўдны гаспадар Руты, які ўвесь час жыў у Санкт-Пецярбургу, падаў у суд скаргу і ў 1804 г. склаў завяшчанне, згодна з якім перадаваў Руту ў спадчыну свайму роднаму брату, маёру Раману Растоцкаму. Апошні ў той час знаходзіўся на ваеннай службе ў Саксоніі і не мог супрацьстаяць дзеянням М. Растоцкага, аднак перад смерцю завяшчаў маёнтак чацвярым сваім сёстрам.

Судовая справа пра валоданне маёнткам распачалася ў 1803 г. і цягнулася каля 30 гадоў. У 1829 г. было вынесена рашэнне адабраць маёнтак у М. Растоцкага, тым не менш справа працягвалася. У рэшце рэшт у 1834 г. Сенат прапанаваў перадаць чацвёртую частку маёнтка аднаму з сапраўдных спадчыннікаў — памешчыку Корчыцу ("Справа па спрэчцы паміж памешчыкам Корчыцам, Пшацлаўскім і Растоцкім аб м. Рута і Бабнева" ад 22 чэрвеня 1834 г. / 8 лютага 1835 г. — ф. 2, воп. 21, спр. 201).

Справа гэтая датуецца 1835 г., а з ліста А. Адынца да Ф. Міцкевіча ад 2 верасня 1836 г. даведваемся, што Растоцкі памёр. "Ведаю ад Адама, — пісаў Адынец, — наколькі Растоцкі быў дарагі для ўсіх вас".

Застаецца дадаць, што дом, у якім жыў М. Растоцкі і ў якім часта бываў А. Міцкевіч, не захаваўся. Апошнія яго ўладальнікі, паны Пашкоўскія, загінулі ў 1939 г., а ў 40–50-я гг., пасля вайны, будынак разабралі вяскоўцы. На месцы гэтага дома на ўзгорку расце цяпер адзінокі клён, метраў на дзесяць разраслася шыпшына. Сціплыя яе кветачкі цвітуць кожны год, ствараючы своеасаблівы прыродны помнік паэту, крылы якога раслі і мацнелі менавіта ў гэтых мясцінах. А ў вёсцы Рута адна пажылая жанчына, паказаўшы ў бок выгану, сказала мне: "Вось там некалі былі могілкі, каля якіх у Міцкевіча зламалася брычка". Слядоў гэтых могілак таксама не засталося. Але засталася цудоўная балада А. Міцкевіча, у якой ён увекавечыў Руту назаўсёды.

Уладзімір Навумовіч *(Мінск)*

АДАМ МІЦКЕВІЧ ЯК ЛЕКТАР
ВЫКЛАДАННЕ СЛАВЯНСКІХ ЛІТАРАТУР У КАЛЕЖ ДЭ ФРАНС

…Ад самай Божай раніцы каля Райцы і ў Туганавічах ляжыць густы і вільготны туман. Вераснёўскай бросняй ён спавівае дрэвы, павісае на прыдарожных кустах, слізкім смаўжом запаўзае ў лагчыны і ямы. У такую пару, на пачатку восені на зямлю Адама Міцкевіча прыходзіць слаўны юбілей паэта, наладжваюцца навукова-краязнаўчыя чытанні.

Што ж мы ведалі ў час вучобы ў школе і пасля яе пра А. Міцкевіча? Пра яго жыццё ў Навагрудку, частае наведванне Карэліцкіх мясцін? А ён жа хадзіў і ездзіў па той самай зямлі, па якой ходзім і ездзім сёння мы, бачыў тыя туманы ў нізінах, любаваўся краявідамі Райцы і Туганавіч, Варончы і Свіцязі. Адсюль ён адправіўся ў Вільню, у вялікі свет і з той пары толькі зрэдку бываў на сваёй "малой радзіме". А. Міцкевіч — паэт, які належыць усяму чалавецтву, ён моцна звязаны з Расіяй, Еўропай. Але паэтам зрабіла Міцкевіча родная зямля, беларускі край.

Тут нарадзілася вялікае каханне паэта, якое ён пранёс праз усё жыццё, захаваўшы любасць і шчырасць, цеплыню, пяшчоту і замілаванасць. Менавіта ў час летніх канікулаў 1818 г. А. Міцкевіч, тады студэнт фізіка-матэматычнага факультэта Віленскага універсітэта, пазнаёміўся з Марыляй Верашчака, наведаўшыся ў маёнтак Туганавічы, дзе жыла яна. Ён пакахаў яе без аніякай надзеі на ўзаемнасць, на асабістае шчасце. І было вяселле Марылі летам 1821 г., і былі новыя сустрэчы ў Бальценіках, пра якія наш універсітэцкі паэт-прафесар А. Лойка напісаў у сваім вершы як пра найвялікшую сусветную "тугу" паэта. Сапраўды, пакахаць — гэта крыху памерці… Пра сваю каханую геній польскай літаратуры будзе помніць заўсёды. Пачуццё жывіла душу паэта.

Гаворачы пра ролю творчага натхнення ў жыцці мастака, Я. Парандоўскі, польскі літаратуразнаўца, у кнізе "Алхімія слова" пісаў: "Міцкевіч быў паэтам усяго некалькі гадоў, і яны далі ўсё — ад балад да "Пана Тадэвуша". Пасля гэтага ён заўсёды заставаўся паэтам, таму што "паэтычная творчасць складаецца не з адных толькі вершаў: ёю з'яўляецца і ўсё жыццё сапраўднага паэта".

Яшчэ адна заўвага працытаванага аўтара цікавая для нас. Чытаем далей: "Аднак часцей за ўсё адбываецца так, што пісьменнік не ў стане ў час адмовіцца ад той справы, якую ён робіць…" Працавалі і працуюць дзе-небудзь усе паэты. Служылі і служаць таксама амаль усе. Рэдка хто з творцаў пражыў толькі са свайго паэтычнага занятку. А. Міцкевіч — выдатны лектар, прамоўца, імправізатар, суразмоўца. Талент лектара і літаратуразнаўцы ў паэта выявіўся з асабліва вялікай сілай у той час, калі ён выкладаў гісторыю славянскіх літаратур у французскай сталіцы, у Калеж дэ Франс.

Жыццё Міцкевіча ў Парыжы складвалася даволі цяжка. Міцкевіч не любіў гэты горад. "Парыж мне так надакучыў, — пісаў ён Адынцу, — што я з цяжкасцю магу яго вытрымаць". І ў другім лісце: "Я жыву тут амаль у поўнай адзіноце, з людзьмі мне ўсё цяжэй ужывацца, і чым я меней іх бачу, тым лепей для мяне".

У 1834 г. Міцкевіч ажаніўся з дачкой піяністкі Марыі Шыманоўскай, Цэлінай, якую ён яшчэ падлеткам ведаў у Расіі. Праз год у іх нарадзілася першае дзіця, а затым яшчэ пяцёра. Матэрыяльныя ўмовы жыцця тым часам сталі надзвычай складанымі. Трэба было зарабляць на хлеб. А заробкамі з пісьменніцкай працы тады яшчэ мала хто мог пахваліцца. Паэт нават спрабаваў пісаць п'есы на французскай мове, пастаноўка якіх магла прынесці дастатак у сям'ю, бо паэт ведаў, што тыя п'есы, якія ставіліся на французскіх сцэнах, добра аплочваліся. Але гэтым надзеям не суджана было спраўдзіцца. П'есы "Барскія канфедэраты" і "Якуб Ясінскі" нават не былі пастаўлены, бо не маглі зацікавіць французскага гледача.

У 1838 г. Міцкевіч атрымаў кафедру рымскай славеснасці ў Лазанскім універсітэце. Здавалася б, жыццё пачало наладжвацца. Ён працаваў у акружэнні сусветна вядомых прафесараў, яго любілі студэнты, лекцыі слухалі з цікавасцю. Праца выкладчыка яго задавальняла. Але душэўнага спакою не было.

“Я жыву ў прыгожым доме, — пісаў ён з Лазаны, — у мяне тут вялікая зала з велізарнымі люстэркамі і шырокімі вокнамі, з якіх адкрываецца агляд сада і возера. Па праўдзе кажучы, гэтая кватэра — амаль адзіная мая ўцеха. Часам на мяне находзіць туга па Літве, і ўвесь час бачу ў сне Навагрудак і Туганавічы”.

Вокны кватэры выходзілі на Жэнеўскае возера і Альпы. Менавіта там і нарадзілася ў той час паэтычная мініяцюра “Паліліся мае слёзы…”. Гэта былі слёзы па няспраўджаным каханні, якое не па віне закаханых не стала шчаслівым. А тут яшчэ да агульных згрызот далучылася псіхічнае захворванне жонкі. Заставацца ў Лазане было невыносна. Тады ж Міцкевіч даведаўся, што ў Калеж дэ Франс адкрываецца кафедра славянскіх літаратур. Ён зрабіў усё магчымае, каб заняць кафедру, бо баяўся, каб яе не ўзначаліў які-небудзь немец — чалавек, які мала знаёмы са славянскімі літаратурамі.

22 снежня 1840 г. А. Міцкевіч прачытаў сваю першую лекцыю з кафедры Калеж дэ Франс. Для паэта гэта была адзіная трыбуна, з якой ён гаварыў аб польскім народзе, аб ідэі славянскага адзінства, аб славянскім братэрстве. Галоўнай задачай і асноўным зместам усяго курса славянскіх літаратур, які чытаў А. Міцкевіч, стала ідэя магутнасці і сілы славянскіх народаў, іх ролі ў грамадскім прагрэсе ўсяго чалавецтва. Паэт-выкладчык заклікаў славян да яднання, каб здолець усім разам супрацьстаяць чужынцам і асіміляцыі, каб усяму славянскаму братэрству заняць свой “пачэсны пасад між народамі”. Гісторыя літаратур паказвалася ў сувязі з гістарычным развіццём краіны, з часам, з асяроддзем. Рух часу — рух грамадства — рух літаратуры — такі быў падыход пісьменніка да выкладання, такая была формула спасціжэння літаратуры.

У заходніх універсітэтах цяпер амаль паўсюдна ўведзены пасады паэта-прафесара. А. Міцкевіч — бадай што першы паэт-прафесар у заходнім вялікім свеце.

Першы курс лекцый Міцкевіча ахопліваў гісторыю літаратуры славянскіх народаў да XVII ст. Але паэт шмат распавядаў і пра свае асабістыя сустрэчы з Пушкіным, Вяземскім, Жукоўскім. На лекцыі прыходзілі Ж. Санд, гісторык Мішле, Ф. Шапэн. Імя А. Міцкевіча стала ў адным шэрагу з найбольш знанымі навукоўцамі-славістамі той эпохі. А дзекабрыст Мікалай Тургеневў і яго брат Аляксандр запісвалі пачутае слова ў слова і высылалі ў Расію з добрай надзеяй хоць калі-небудзь надрукаваць цыкл лекцый па славянскай славеснасці генія польскай літаратуры.

Другі курс лекцый намнога адрозніваўся ад першага. Шматлікія жыццёвыя перыпетыі паўплывалі на змест і характар лекцый. Гаворачы пра Пушкіна, А. Міцкевіч падкрэсліваў, што той адкрыў новую эру ў гісторыі рускай літаратуры. Ён называў Пушкіна вяршыняй усёй рускай літаратуры. Польскай паэзіі паэт надаваў асаблівае значэнне. Ён гаварыў пра славянскае прыгожае пісьменства, што ў яго ёсць "ідэя будучага". Гэтай ідэяй была для Міцкевіча ідэя славянскага супольніцтва.

А. Міцкевіч адзначыў у сваіх лекцыях, што зразумець і спасцігнуць славянскую душу немагчыма без таго, каб не паглыбіцца ў свет мастацтва, у духоўны нацыянальны космас. У 1841 г. уражлівы паэт пазнаёміўся з Андрэем Тавянскім, які выдаваў сябе за вялікага месію, прадказальніка, экстрасенса, як называлі б яго сёння. Пра А. Тавянскага гаварылі і як пра царскага шпіёна, бо хто б стаў дзеля звычайнага чалавека пасылаць афіцыйны запыт з рускага пасольства французскім уладам, калі Тавянскага раптам выслалі з Францыі. Але… душэўныя захапленні паэта ўжо да гэтага часу разгарэліся. Міцкевіч падпаў пад уплыў чалавека, які быў спецыяльна засланы, каб "разваліць" польскую эміграцыю, можа яшчэ і таму, што той распавядаў яму такія факты з яго жыцця, пра якія мала хто ведаў. Як потым высветлілася, пра тыя "таямніцы душы" прызнанага паэта Тавянскаму расказваў сябра Міцкевіча Адынец. Да ўсяго ж містык, псіхолаг, які валодаў несумненным гіпнатычным дарам, вылечыў ад псіхічнага захворвання жонку паэта.

"Вучэнне" клалася, як кажуць, на ўрадлівую і падрыхтаваную глебу. Як было не паддацца ўплывам А. Тавянскага, як было не захапіцца яго месіянізмам, ідэяй выключнасці, богаабранасці? Сябры моцна адгаворвалі паэта ад падобных захапленняў, не верылі, што чалавек, які валодае такім здаровым практыцызмам, светлым розумам, можа падпасці пад уплыў даволі сумніцельнага "вучэння". У адным з лістоў Шапэна чытаем: "Тое, што Тавянскі, як хітры махляр, чмурыў дурняў, цягне іх за сабой, можа выклікаць толькі смех, але Міцкевіч — узвышаная душа і мудрая галава — [геній ацэньвае генія! — *У. Н.*] як ён гэтага прайдзісвета не разгледзеў і не высмеяў…"

З таго часу лекцыі ў Калеж дэ Франс ператварыліся ў суцэльнае ўсхваленне містыцызму Тавянскага. Раней у нашым літаратуразнаўстве гэты перыяд падаваўся як цалкам адмоўны. Маўляў, Міцкевіч падпаў пад згубны ўплыў месіянства, стаў узвялічваць Напалеона, у чым урад Луі Філіпа бачыў пагрозу, накіраваную супраць яго. Але ці такім ужо бясспрэчным перыядам быў для А. Міцкевіча час захаплення містыцызмам? Пакорлівасць, паслушнасць — ці так ужо былі яны характэрны паэту?

…У курсе лекцый А. Міцкевіч падкрэсліваў, што вуснамі Пушкіна гаварылі ўсе прыніжаныя, незадаволеныя, пакрыўджаныя, падманутыя, адкі-

нутыя. Ён называў Пушкіна вяршыняй усёй рускай літаратуры, але і гаварыў, што нібыта руская літаратура “закончылася разам з Пушкіным”.

У літаратуразнаўстве сцвярджаецца, што Міцкевіч слаба ведаў літаратурны рух у Расіі пасля Пушкіна і дзекабрыстаў.

А пра чэшскую літаратуру паэт гаварыў, што тая здольна толькі аплакваць долю і нядолю свайго народа.

У трэцім і чацвёртым курсах ёсць шэраг суб’ектыўных ацэнак твораў польскай літаратуры. І ўсё ж “тавянізм” і “напалеанізм” Міцкевіча, думаецца, быў значна перабольшаны тагачаснымі крытыкамі.

У сярэдзіне мінулага стагоддзя А. Міцкевіч гаварыў, што “яшчэ не надышоў час перакаваць мячы “на арала” (“у плугі”) і наладжваць, як ён гаварыў, “фаланcцеры ў казармах”. Фаланcцерамі французскія сацыялістыутапісты называлі палацы, у якіх павінны жыць і працаваць члены ідэальнага сацыяльнага грамадства. Але сам паэт жадаў дзеяння.

Мы памятаем лёсы трох юнакоў, трох сяброў-студэнтаў з Навагрудскай і Карэліцкай зямлі — Адама Міцкевіча, Яна Чачота і Ігната Дамейкі. Адзін з іх — Чачот — добры адрэзак жыцця правёў у выгнанні на вялікіх прасторах Расіі, другі — Дамейка — ледзь не ўсё свядомае жыццё пражыў на чужыне, у Чылі. А трэці? Трэцяму было не лягчэй. “Бог не дазволіў мне быць якім бы то не было ўдзельнікам у справе такой вялікай, такой важнай па сваіх будучых выніках. Я жыву толькі надзеяй, што не складу бяздзейна рукі ў магіле…”, — пісаў ён з Дрэздэна. І жыццё паклікала яго на “перадавую”.

У час аднаго са сваіх публічных выступленняў у Калеж дэ Франс А. Міцкевіч дэманстраваў літаграфію “Беларускі нявольнік”. “Ці ведаеце вы літаграфію, некалі асэнсаваную Міцкевічам, “Беларускага нявольніка” — я на гэтую карціну ніколі не мог глядзець без біцця сэрца,” — пісаў А. Герцэн у адным са сваіх лістоў з Парыжа ў Расію вучонаму М. Боткіну. Вядомы рэвалюцыянер у брашуры “Перахрышчаная ўласнасць” даў падрабязнае апісанне таго малюнка на літаграфіі: “Беларускі мужык, без шапкі, які ашалеў ад сполаху, вечнай галечы і цяжкай працы, рукі за поясам, стаіць пасярод поля і неяк коса і безнадзейна глядзіць уніз. Дзесяць пакаленняў, замардаваных на паншчыне, утварылі такога парыю, яго чэрап звузіўся, яго рост знізіўся, яго твар з дзяцінства пакрыўся зморшчынамі, яго рот скрыўлены ў сутаргах, ён адвык ад слова”. Апошні сказ мы мусім асабліва вылучыць. “Нянавісць, якая змяшана са злосцю і сорамам, напаўняе маё сэрца, — пісаў вялікі рускі рэвалюцыянер-дэмакрат, — калі я гляжу на гэты жорсткі дакор, на гэтае “за сякеру, братцы”, выяўленае з паражальнай дакладнасцю”. А. Герцэн ужо тады загаварыў аб вялікіх пакутах сумлення за той стан і тое жыццё, у якім апынуўся беларускі народ, загаварыў, можа, упершыню, пра найвялікшую адказнасць перад усім светам “за гэтае злачынства, за гэтага беларуса”.

Так адзін толькі шэдэўр — літаграфія, выкарыстаная А. Міцкевічам на яго лекцыях у Калеж дэ Франс, выклікала душэўны пратэст вялікага сына рускага народа, абудзіла пачуццё гневу, разуменне цяжкага паднявольнага стану беларусаў, сваёй асабістай адказнасці за далейшыя лёсы рускага, беларуса, паляка, украінца. “Без племя, без роду, як камень у воду” — кажа беларуская народная прымаўка. Сваімі лекцыямі паэт сцвярджаў, што не могуць знікнуць бясследна цэлыя народы, магутнае адгалінаванне “племя зямлян” — славяне.

А. Міцкевіч даказваў маральную дасканаласць душы славян. Нам сёння асабліва блізкія тыя словы, якія паўтарыў на сваіх лекцыях А. Міцкевіч услед за чэшскім паэтам Коларам: “Усе народы прамовілі сваё апошняе слова. Цяпер, славяне, чарга за вамі”.

Дзіўна, але і цяпер, у канцы XX ст., усё тыя ж праблемы адзінства славян, яднання славянскіх зямель стаяць надзвычай востра. Ідэі, якія прапаведаваў у сваіх лекцыях А. Міцкевіч, не страцілі актуальнасці. Яны жывяць нашы сэрцы і душы і сёння.

Пазней, з артыкула Б. Бялаказовіча “Хто быў аўтарам літаграфіі “Беларускі нявольнік”, выдадзенай А. Міцкевічам і апісанай А. І. Герцэнам”, змешчанага ў выданні “Праметэй” (М., 1972), мне стала вядома, што гэтая літаграфія належала Ю. Азеблоўскаму.

Як бачым, А. Міцкевіч быў вельмі прафесійным і ад прыроды адораным лектарам. Ён умеў зацікавіць слухачоў, захапіць іх, абудзіць сэрца і душу, развярэдзіць думку. Дзеля гэтага ён выкарыстоўваў, як бы мы сёння сказалі, і наглядны матэрыял: малюнкі, рэпрадукцыі карцін, кнігі і інш.

Міцкевіч валодаў вялікім дарам імправізацыі. Кожны, хто ведаў Вешчуна, адзначаў імправізатарскі характар яго паэзіі, асабліва тых вершаў, якія ён чытаў у пецярбургскіх і маскоўскіх салонах. Прыгадаем, што ў літаратурныя колы Масквы Міцкевіча ўвёў Мікалай Палявой, які прадставіў паэта ў салоне княгіні Зінаіды Валконскай, дзе “ўсё насіла адбітак служэння мастацтву і думцы”. Сярод сяброў і слухачоў нашага суайчынніка тады былі Баратынскі, Вяземскі, Пагодзін і інш. “Імправізатарскі верш яго, — пісаў П. Вяземскі, — свабодна і імкліва вырываўся з вуснаў ягоных гучнай і бліскучай плынню. У імправізацыі яго былі думка, пачуццё, карціны і ў вышэйшай ступені паэтычныя выразы. Можна было падумаць, што ён натхнёна чытае на памяць паэму, якую сам тут жа і напісаў”. Гэта — выключная ацэнка і лектарскага майстэрства А. Міцкевіча. Той дар — “узвышаная душа і мудрая галава” (Шапэн), талент імправізатара вельмі спатрэбіліся А. Міцкевічу ў час чытання курса лекцый па славянскіх літаратурах.

У 1844 г. А. Міцкевічу давялося спыніць чытанне курса па распараджэнню французскіх улад. З аднаго боку, яны баяліся распаўсюджання месіянізму і містыцызму, “тавянізму”, а з другога — бачылі пагрозу ў прапа-

гандзе веры ў Напалеона. Але лекцыі адыгралі сваю станоўчую ролю — перш за ўсё ідэяй пра славянскае адзінства. Гэтым яны блізкія нам і сёння.

Мы не ведаем, хто былі тыя студэнты, што слухалі лекцыі прафесара. Але ўпэўнены, што ў іх душы запала тая святая любоў да славянскіх народаў і іх літаратур, якой былі прасякнуты лекцыі вялікага польскага паэта.

Набліжалася вялікае ўзрушэнне 1848 г., памятная "вясна народаў", калі абуджаліся цэлыя нацыі, калі адна за другой краіны скідалі са сваёй шыі ярмо нявольніцтва.

А лекцыі чыталіся напярэдадні…

"Курс славянскіх літаратур" заняў значнае месца ў літаратуразнаўчай навуцы. Ён не згубіў сваёй эстэтычнай вартасці і цяпер. Многія ацэнкі і думкі лектара застаюцца свежымі і арыгінальнымі.

Аляксандр Баршчэўскі *(Варшава)*

БЕЛАРУСКІ КРАЙ І БЕЛАРУСКІ ХАРАКТАР У ПУБЛІКАЦЫЯХ ЯНА ЧАЧОТА

Жыццё слаўнага фальклярыста і паэта Яна Чачота было напоўнена ў аднолькавай ступені шчасцем і болем. Яго дзяцінства, хаця яно і было праведзена ў беззямельнай дробнашляхецкай сям'і, характарызавалася радаснай атмасферай і побытам, у якім не было раскошы, але не было таксама тыповай для беларускіх сялянскіх дзяцей галечы, паўголаду, нядолі і цемры. Бацькі будучага фальклярыста перайшлі з уніяцтва ў каталіцтва, дзякуючы чаму наблізіліся да польскай мовы, польскай культуры і польскай свядомасці. Шануючы Польшчу і захапляючыся ёю, ніколі, аднак, не пагарджалі беларускай мовай, беларускай народнай творчасцю, беларускімі звычаямі і абрадамі. Ніколі не перашкаджалі таксама свайму сыну Яну кантактавацца з беларускім асяроддзем, цікавіцца беларускай мовай і фальклорам. З гэтай прычыны ўжо ў дзяцінстве ён быў добра знаёмы з усім беларускім, трактуючы яго як частку сваёй духоўнасці. І якраз гэтая арганічная сувязь з беларускай зямлёй і беларускім насельніцтвам павінны трактавацца як дамінанта шчасця Я. Чачота, які свае беларускія сувязі і зацікаўленні з часоў дзяцінства значна паглыбіў у перыяд знаходжання ў Навагрудскай гімназіі, а пасля ў Віленскім універсітэце. Будучы актыўным арганізатарам і сябрам філаматаў, што рвалі путы, якія звязвалі тагачасную моладзь і адукацыйную сістэму з класіцызмам, абыякавым да мясцовай народнасці і адданым рымскай ды грэчаскай культурам, ён убачыў харaство ва ўсім мясцовым і народным. Якраз народныя беларускія крыніцы сталіся для юнага Я. Чачота прычынай яго шчасця і надзеі. Малады юнак розумам і сэрцам

далучыўся да беларускіх казак, легенд, паданняў, прыказак і прымавак, а таксама беларускай абраднасці і этнаграфіі ў шырокім сэнсе слова.

Разгром царскімі ўладамі руху філаматаў быў прычынай душэўнай бяды для Чачота, тым болей што разгром гэты закончыўся судом, прысудам і ссылкай яго ў глыбіню Расіі.

Адрыў ад роднай зямлі і мясцовага люду быў для Я. Чачота праявай няшчасця і прычынай песімізму. Аднак, кіруючыся рамантычнымі прынцыпамі, не губляў ён веры, а надзея на зварот у Беларусь дадавала яму сілы для трывання на чужыне. Да 1831 г. Я. Чачот знаходзіўся ў Уфе. У гэтым жа годзе разам з філаматам Сузіным быў пераведзены ў Цвер, дзе спаткала яго, як і іншых ссыльных, нечаканасць. Яшчэ не паспелі яны абжыцца ў гэтым горадзе, як пачалася ў ім эпідэмія халеры. Нехта пусціў па горадзе чутку, што якраз пераселеныя палякі атруцілі ў студнях ваду, ад чаго пайшла па горадзе страшэнная зараза. Натоўп даў веры гэтай плётцы і рыхтаваўся да расправы. Разважны мясцовы губернатар Цюфаеў, стараючыся пазбегнуць пагромаў, загадаў, каб усе прыезджыя палякі былі арыштаваны і пасаджаны ў турму. Сярод арыштаваных быў і Ян Чачот. Калі толькі эпідэмія ў горадзе пагасла і натоўп супакоіўся ды страціў агрэсіўнасць, губернатар загадаў не толькі выпусціць усіх арыштантаў, але, імкнучыся да маральнай кампенсацыі, запрапанаваў ім усім добрыя пасады. Я. Чачот атрымаў пасаду сакратара Бярэзінскага канала з сядзібай у Лепелі, якім кіраваў сын губернатара. Такім чынам узнікла магчымасць вярнуцца на родную Беларусь. Польскі даследчык Чэслаў Янкоўскі, характарызуючы дзейнасць Я. Чачота на пасадзе сакратара Бярэзінскага канала, пісаў: “Новы сакратар пачаў салідна выконваць свае абавязкі. Галоўны кіраўнік інжынераў дарог і камунікацый граф Толь, прыехаўшы ў 1833 г. у Лепель, сутыкнуўся ва ўстанове з узорным парадкам. Пасля гэтага даручыў ён Я. Чачоту апрацоўку статута для ўсёй навігацыі па Бярэзінскім канале. Я. Чачот бліскуча выканаў даручанае заданне. Граф Толь падзякаваў яму афіцыйна і адудзячыў дазволам вярнуцца на родную Навагрудчыну, куды будучы пісьменнік пераехаў у 1841 або ў 1842 г.” [1].

Пасяліўшыся ў маёнтку Храптовічаў, Я. Чачот на працягу параўнальна кароткага часу ідэальна ўпарадкаваў бібліятэку, пры нагодзе значна паглыбляючы свае веды ў галіне народазнаўства і фальклярыстыкі.

На працягу свайго кароткага жыцця, бо пражыў ён усяго 47 гадоў, Я. Чачот клапаціўся заўсёды пра тое, каб яго погляды ды ідэі заставаліся ў поўнай згодзе з яго ўчынкамі. Такім чынам, ён паслядоўна рэалізаваў сваю ўласную думку аб адзінстве помыслаў і дзеянняў. Пра гэта пісьменнік выказаўся так: “Мала гаварыць пра станоўчыя якасці чалавека і вучыць яго;

[1] Jankowski Czesław. Czeczot i Zan w Leplu. Warszawa, 1899. S. 36–37.

трэба самому даваць ва ўсім прыклад у паводзінах. Бо нішто так не схіляе да ліхога людскія сэрцы і розум, як благія ўчынкі тых, хто воляй лёсу заклiканы вучыць просты люд і паляпшаць разбэшчаны свет, хто на словах прапаведвае дабрачыннасць, а ў жыцці загразе у распусце” [2].

На працягу ўсяго свайго жыцця Я. Чачот стараўся быць найперш грамадзянінам, карысным для людзей і для краіны. Свае погляды на гэтую справу арыгінальна і глыбока выклаў ён у згаданай праграме пад загалоўкам “Думкі для ніжэйшага класа”. Прывядзём тут 8, 9 і 10 пункты гэтага істотнага дакумента:

“8) Той, хто прысвячае сваю працу — фізічную ці разумовую свайму краю, усё робіць для яго дабра, з’яўляецца адначасова карысным грамадству чалавекам і паважаным грамадзянінам. Адсюль вынікае, шо гэтак жа, як да веравызнанняў, заўсёды павінна быць цярпімасць да працоўнага класа, рамеснікаў ці прадстаўнікоў любой іншай працы. Трэба быць неталерантным толькі да гультаёў, якіх мы павінны схіляць да працы.

9) Асвета краю — найважнейшая спружына яго шчасця. Асвета пашыраецца праз павялічэнне кола тых, хто ўмее чытаць: таму трэба засноўваць школы, падтрымліваць навуковыя ўстановы, заахвочваць тых, хто пасылае дзяцей і моладзь у школы і ва універсітэт, пашыраць чытанне карысных кніг, раздаваць іх у школе ў якасці прэміі, дапамагаць тым, хто хоча вучыцца, падтрымліваць мастацтва, рамёствы, засноўваць і развіваць фабрыкі, асабліва паперні, суконныя і ткацкія фабрыкі, што найлягчэй можна ажыццявіць у краі.

10) Ва універсітэце яшчэ вельмі многія без ніякіх вынікаў прысвячаюць сябе прыродазнаўчым і матэматычным навукам, у той час як так патрэбныя чыноўнікам і грамадзянам навукі права і адміністрацыі ляжаць у нас цаліной. Тых, што не маюць такіх здольнасцей, каб, працуючы над фізікай ці матэматыкай, маглі прынесці карысць навуцы і краю, і тых, што не прысвячаюць усё сваё жыццё гэтым навукам, а вывучаюць іх толькі для таго, каб набыць званне, трэба адгаварыць ад гэтага адзінага іх імкнення і схіліць да вывучэння права, палітычнай эканоміі, гісторыі, урэшце аграноміі, на якую, не пакідаючы ўпарта вывучаць свае прадметы, маюць найбольшае права і якой як жыхары аграрнага краю хутчэй за ўсё павінны сябе прысвячаць” [3].

З прыведзенай цытаты вынікае, што лепшую будучыню роднай краіны бачыў Я. Чачот перш за ўсё ў шырокай адукаванасці, якая агорне ўсе грамадскія класы, у тым ліку і клас сялянскі. Па сутнасці, выказаныя фалькларыстам ідэі маюць больш пазітывістычны, чым рамантычны, характар. Па-

[2] Цыт. па кн.: Цвірка К. Ян Чачот. Навагрудскі замак. Мн., 1987. С. 163.
[3] Тамсама. С. 162–163.

зітывістычная схільнасць праявілася тут у папулярызацыі прынцыпу асветы для ўсіх, у ідэі служэння чалавечай індывідуальнасці, чалавечай асобы грамадству, у ідэі прагматызму, у ідэі мадэрнізацыі апрацоўкі зямлі і адміністрацыйнай сістэмы.

Падобныя схільнасці акрэслілі таксама праграмны артыкул паэта пад загалоўкам "Думкі, якія павінен пашыраць вышэйшы клас". Многія з прынцыпаў, выказаных Я. Чачотам болей як сто гадоў назад, да сёння не страцілі сваёй актуальнасці і важнасці. Яшчэ раз прыгледзімся да павучанняў Чачота:

"1) Грамадскае шчасце залежыць як ад добрых грамадзян, такі ад добрага ўрада.

2) Не могуць быць добрымі грамадзяне там, дзе кепскі ўрад, і не можа быць кепскага ўрада там, дзе большасць — добрыя грамадзяне.

3) Найлепшы ўрад будзе там, дзе ўсё робіцца згодна з пажаданнямі народа, а не з волі, капрызу і сілы адзінкі" [4].

У многіх месцах сваіх публіцыстычных выказванняў і ў паэтычнай творчасці Я. Чачот закранаў рэлігійныя пытанні. З яго сцвярджэнняў адназначна вынікае, што быў ён чалавекам глыбока веруючым, аднак чужым быў яму ўсялякі дагматызм, а тым болей фанатызм. Я. Чачот выразна аддзяляў, а часта нават супрацьпастаўляў аўтарытэт веры ў Бога аўтарытэту святароў і духоўных асоб. Быў ён перад усім праціўнікам мяшання рэлігіі з палітыкай, а тым болей выкарыстоўвання яе ў канфліктах і войнах паміж рознымі народамі. У 8 пункце "Думак, якія павінен пашыраць вышэйшы клас", Я. Чачот напісаў наступнае;

"8) Рэлігія, якой так павольна паддаюцца простыя сэрцы, мае тое нящасце, што вельмі часта з'яўляецца страшнай зброяй фанатызму і ўціску, пад яе маскай поруч ідуць аслепленыя чаканымі прыбыткамі чалавеканенавіснікі, каб адурманьваць і знявольваць легкаверных і цёмных мужыкоў" [5].

Яшчэ больш рэзкае асуджэнне некаторых духоўнікаў выступае ў 8 пункце чачотаўскіх "Думак":

"8) Духоўніку, які лічыць, што, выйшаўшы за брамку, ён ужо аказваецца не на свеце, а выракшыся прыемнасці быць мужам і бацькам, думае, што ён ужо не грамадзянін зямлі, а жыхар нейкага паднябесся, адкуль можна кідаць кулі на разбэшчаны свет, на асвету, філасофію, трэба далікатна напомніць, што ён жыве на зямлі, што са светам сувязей не парваў, корміцца хлебам, які дае зямля і праца суайчыннікаў, і што задача яго не замахвацца на асвету і філасофію, не ведаючы, што яны такое, а пашыраць святло навук, каб не сляпых, а адукаваных схіляць хутчэй да чыстай маралі і рэлігіі, у той жа час трэба патроху выступаць супраць бясшлюбнасці духоўнікаў,

[4] Цыт. па кн.: Цвірка К. Ян Чачот. Навагрудскі замак. С. 164.

[5] Тамсама.

якая з'яўляецца найгалоўнейшай прычынай непрыстойнасці, эгаізму і варожасці да свету" [6].

Я. Чачот быў перакананы, што паншчынны прыгон скоўвае і знявольвае краіну, абмяжоўвае людзей, перашкаджае ініцыятыве, дзейнасці і мысленню. І хаця кіруючыся высакароднасцю, марыў ён аб тым, каб паміж панамі і прыгоннымі сялянамі выступалі такія адносіны, якія праяўляюцца ў добрых сем'ях паміж бацькамі і дзецьмі, то ўсё ж, мабыць, у глыбіні душы сам не верыў у рэальнасць такой ідылічнай рэчаіснасці. Згэтуль вынікала яго досыць катэгарычнае патрабаванне ліквідацыі прыгону, выяўленае ў 10 пункце "Думак, якія павінен пашыраць вышэйшы клас":

"10) Ні асвета краю ці земляробства не могуць больш хуткімі крокамі рухацца наперад, пакуль не будзе ліквідавана занядбаная, заімшэлая на працягу вякоў, аброслая забабонамі перашкода — няволя сялян, якая пярэчыць законам прыроды, цвярозаму розуму і нават чыстым эканамічным разлікам ды выклікае сорам у сэрцах людзей" [7].

У рэцэнзіі на твор А. Міцкевіча "Курганок Марылі" Я. Чачот заняўся пытаннем захавання народнай абраднасці і фальклору, у якіх убачыў праяву духоўнага багацця беларускага люду. Між іншым ён напісаў:

"Ёсць недзе ў "Tygodniku Wilienskiem" апісанне вясельных звычаяў на Міншчыне з песнямі, якія спяваліся на вяселлі. І само апісанне, і песні надзвычай цікавыя. Калі б усе такія ўрачыстасці не прайшлі міма вока цікаўнага, улюбёнага ў свой край, сваіх сялян назіральніка, быў бы гэта прыгожы помнік фантазіі і выдумкі мясцовых жыхароў, якія не настройваюцца на лацінскі ці на французскі тон. Спявалі і дзейнічалі, як ім самім марылася. Такіх урачыстасцей ёсць шмат, напр., Купала, свята, якое невядома чаму забараняецца сёння аканомамі, якія баяцца, каб яно не выклікала пажару ў вёсцы, у прыгожую пару і прыгожая рамантычная ўрачыстасць, Дзяды, Каляды, Вялікдзень, Шчодры вечар, Зажынкі, Дажынкі, Раса на святога Юлія. Усё гэта праходзіць з пэўнымі цырымоніямі і кантатамі. Мясцовыя песенькі ў Навагрудскай старане, прынамсі тыя, якія мне вядомыя, амаль заўсёды пачынаюцца з параўнання. Заўсёды іх ажыўляе пачуццё кахання, часта ёсць у іх і мараль. Так, напр., ляціць сокал за якойсьці птушачкай, здаецца, за чайкай, і кліча яе, а яна адказвае: "Я ўбога, я не твая, шукай ты багатай, як сам", а з гэтага параўнання пераход да дзяўчыны, якая свайму залётніку адказвае: "Я ўбога, я не твая, шукай ты багатай, як сам". Або прыклад з мараллю. Матка там і цётка выпраўляюць свайго сына ў залёты і кажуць: "Убачыш там тры дзяўчыны, адну ў золаце, другую ў аксаміце, трэцюю ў розуме: не бяры ні той у золаце, ні той у аксаміце, але тую, што

[6] Цыт. па кн.: Цвірка К. Ян Чачот. Навагрудскі замак. С. 164.
[7] Тамсама. С. 165.

ў розуме, бо золата і аксаміт могуць быць страчаны, розум жа самае трывалае багацце". Такія разумныя і прыгожыя думкі сустракаюцца ў песнях вельмі часта. Словам, вельмі варта, каб заняліся ў нас збіраннем гэтых помнікаў сапраўднай народнай літаратуры" [8].

Усё, што дагэтуль было сказана, адносілася да карціны беларускага краю. Зараз пяройдзем да тых публікацый, якія былі галоўным чынам звязаны з беларускім характарам.

Чачот быў шчыра захоплены псіхалогіяй і паводзінамі беларусаў. З гэтага аднак не вынікае, што не бачыў ён беларускіх заганаў, якія паказваў у адмоўным асвятленні, як у публіцыстыцы, так і ў паэзіі. Аднак у Чачотавых ацэнках беларускага характару рашуча дамінавала пазітыўнае над негатыўным.

Ва ўступе да першага тома "Сялянскіх песень з-над Нёмана" Я. Чачот сфармуляваў свой выключна прыхільны погляд на беларусаў. "Сяляне нашы, — пісаў ён, — люд добры, лагодны, працавіты, пачцівы. З імі мы можам быць шчаслівыя, узбагачаючы іх за высілак іх рук нашым розумам і асветай, мы можам памножыць усеагульнае дабро.

Не думайце, што мы не можам ад іх чаму-небудзь навучыцца. Мы многаму навучымся з пазнання, спазнаючыся з іх становішчам і характарам; знойдзем у іх паданні, казкі, былі, самае багатае будзе жніво песень, якія дадуць магчымасць пазнаць іх тонкія, прыгожыя, нават далікатныя, глыбокія пачуцці. Не думайце, што толькі кожны горад ці правінцыя маюць свайго вучонага ці спевака; мы ўбачым, што свайго не вучонага, але душэўнага і сардэчнага спевака мае амаль кожная вёска.

Шчыра палюбіўшы з гадоў маленства нашых мілых сялян, я прагну падкрэсліць доказ маёй да іх прывязанасці.

Доказ гэты — пераклад і перайманне сялянскіх песень, якія спяваюць над берагамі Нёмана ў аколіцах Беліцы.

Не ўсюды я вельмі трымаўся арыгінала, некаторыя ж аднак перакладзены даслоўна, іншыя больш-менш прыблізна пададзены ў перакладзе" [9].

Характарызуючы свае намеры ў адносінах да публікацыі збору беларускіх песень, Я. Чачот напісаў: "У будучым, калі збор песень павялічыцца, я выдам іх разам з тэкстам арыгінала. Як бы я быў шчаслівы, калі б гэтыя песні былі выкарыстаны ў нас на святкаванні Дажынак, Купалы, павялічылі тую ўзаемную прыхільнасць пана і селяніна, ад якой так многа залежыць" [10].

---

[8] Чачот Я. Рэцэнзія на твор Адама Міцкевіча "Курганок Марылі" // Цвірка К. Ян Чачот. Навагрудскі замак. С. 169–170.

[9] Czeczot J. Piosenki wieśniacze znad Niemna. Wilno, 1837. S. 1.

[10] Чачот Я. Сялянскія песні з-над Дзвіны. Вільня, 1840 // Цвірка К. Ян Чачот. Навагрудскі замак. С. 174.

Мы ўжо сказалі, што Я. Чачот бачыў у беларускім селяніне не толькі добрае, але і злое, і бадай першае месца сярод злых звычак займала, у разуменні фальклярыста, п'янства.

Якраз на гэтую адмоўную схільнасць беларуса звярнуў ён увагу ва ўступе да трэцяга тома "Сялянскіх песень", які выйшаў у Вільні ў 1840 г. "Гэтыя так мілыя і гожыя майму сэрцу вобразы, — напісаў Чачот, — я прымушаны прыцямніць тым, што звярну смутную ўвагу на становішча аўтараў і аўтарак вясковых песень. Як з наднёманскіх песень, гэтак і з наддзвінскіх я дазволіў сабе апусціць няшчасную гарэлку і замяніць яе на мёд і піва, якія сялянам сёння амаль невядомыя. Гарэлка гэта згуба для нашых сялян.

…Баліць сэрца, бачачы нешматлікі і самы працавіты клас грамадства, даведзены да такой вялікай бяды, да якой больш за ўсё прычынілася п'янства.

Адпрацаваўшы цэлы тыдзень, часта на адным хлебе з мякінай, ідзе ў нядзелю гаспадар, а бывае і гаспадыня, несучы туды рэшткі свайго набытку. Празмерна ўжыўшы гарэлкі, дзень і два хварэе, а потым зноў п'е да так званага пахмелля. Якое можа быць здароўе, які парадак у хаце? Усё гэта вельмі адмоўна адбіваецца на скуры твару, на працягласці жыцця і разумовых здольнасцей людзей. Гарэлку часта лічаць лякарствам ад усіх хвароб, а бацька і маці, якія звычайна дзеляцца з дзяцьмі ўсім найлепшым і найсмачнейшым, спойваюць малых дзяцей гарэлкай, перадаючы ім сваю хваробліву схільнасць да гэтага пітва" [11].

Схільнасць да п'янства ў сялян Я. Чачот трактаваў несумненна як галоўную загану ў беларускім характары, галоўную, але не адзіную. Апрача яе паэт асуджаў такія заганы, як лянота, абыякавыя адносіны да асветы, бязбожніцва, неахайнасць, схільнасць да сварак і нязгоды як у сям'і, так і ў суседскіх адносінах.

Нягледзячы на ўсё гэта, Я. Чачот быў, па сутнасці, чалавекам закаханым у беларускага селяніна і сваё шчырае захапленне праявіў перад усім у зборы і публікацыі каля тысячы беларускіх песень, якія лічыў праявай вялікага духоўнага багацця і непаўторнай арыгінальнай каштоўнасці.

Святлана Словік *(Гродна, Беларусь)*

З ГІСТОРЫІ СЯДЗІБ СЯМ'І ДАМЕЙКАЎ ПА МАТЭРЫЯЛАХ ГРОДЗЕНСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА АРХІВА

Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. па Беларусі, у тым ліку і па Навагрудчыне, хваляй пракаціліся масавыя арышты паўстанцаў і адзін за адным выдаваліся секвестры на іх маёмасць. Усе тыя, хто са зброяй у ру-

[11] Цыт. па кн.: Цвірка К. Ян Чачот. Навагрудскі замак. С. 169–170.

ках абараняў сваю айчыну і свой дом, сядзібу, фальварак, былі прызнаны “мятежниками”, а ўсю рухомасць і нерухомасць вымушаны былі аддаваць дзяржаўнай казне.

Секвестрам маёнткаў у Гродзенскай губерні займаліся: Дэпартамент дзяржаўнай маёмасці, Гродзенская казённая палата і Гродзенская Ліквідацыйная камісія. У Нацыянальным гістарычным архіве г. Гродна знаходзяцца дзесяткі спраў “О конфискации имений за участие в мятеже 1830/31 гг.” [1]. Гэтыя справы прыцягваюць да сябе ўвагу даследчыка не толькі тым, што там ёсць падрабязныя рэестры маёмасці, але тым, што на старонках гэтых матэрыялаў ідзе актыўная барацьба сваякоў паўстанцаў за ўратаванне дома. У жыцці таго часу, поўнага страху, небяспекі, дом стаў вялікай каштоўнасцю і выконваў шмат функцый у жыцці аднаго чалавека, цэлай сям’і і нават цэлага народа. Дом зберагаў этнічныя і сямейныя каштоўнасці, памяць аб продках, мову, традыцыі, рэлігію, выхоўваў дзяцей. У свядомасці чалавека таго часу дом быў непарыўна звязаны з сям’ёй, айчынай, народам. Сямейнае гняздо, дзе, можа быць, выхоўвалася не адно пакаленне, на вачах блізкіх і родных паўстанцаў гінула, адыходзіла назаўсёды. Таму сем’і барацьбітоў за волю нярэдка ішлі на розныя падманы, падробку дакументаў, каб толькі захаваць за сабой сядзібу, фальварак, дом.

Па Навагрудскаму павету сустракаюцца знаёмыя нам тапонімы: маёнтак Лоўчыцы Крычынскага [2], Санкаўшчына Тарасевіча [3], Зубкава і Чамброва Язерскіх [4].

Не абышоў гэты трагічны час і сям’ю аднаго з бліжэйшых сяброў Адама Міцкевіча — Ігнація Дамейку, вядомага ў будучым вучонага, асветніка. У Гродзенскім архіве захоўваецца справа “О конфискации им. Жибуртовщина Слонимского уезда, имения Сачивка Новогрудского уезда за участие помещиков Домейков Игнатия, Адама, Казимира в восстании 1830/31 гг.” [5]. І хоць у загалоўку справы ўзгадваюцца толькі два маёнткі, першапачаткова пагроза секвестра павісла яшчэ і над маёмасцю ў Малых і Вялікіх Медзвядках і над Заполлем.

На родныя для сям’і Дамейкаў М. і В. Медзвядкі, дзе нарадзілася і выхавалася пяцёра дзяцей Караліны з дому Анцутаў і Іпаліта Дамейкі, секвестр быў накладзены 17 чэрвеня 1831 г. [6]. Адказным за прыняцце ў казну маёмасці быў прадстаўнік Гродзенскай казённай палаты чыноўнік па асобых справах Рынг. І хоць, напэўна, родныя Ігнація рыхтаваліся да непры-

---

[1] Гродзенскі нацыянальны дзяржаўны архіў.
[2] ГрНГА, ф. 4, воп. 1, спр. 72.
[3] ГрНГА, ф. 31, воп. 2, спр. 87.
[4] ГрНГА, ф. 1, воп. 4, спр. 546.
[5] ГрНГА, ф. 31, воп. 2, спр. 59.
[6] Тамсама. С. 2.

емнасцей, але гэта вестка застае іх непадрыхтаванымі да супрацьстаяння бядзе. Будучы ў разгубленнасці, старэйшы сын Дамейкаў, Адам, дае чыноўніку Рынгу распіску ў тым, што "без малейшей утайки укажет для описания в казну всего вообще из принадлежащего в им. Недзвядки Игнатию" [7]. Трэба адзначыць, што ўвогуле канфіскацыя маёмасці праходзіла вельмі марудна, напрыклад, справа Дамейкаў цягнулася 8 гадоў. Але гэта было вельмі выгадна для пацярпелых, якія за гэты азначаны час маглі добра падрыхтавацца да вяртання свайго маёнтка. Хутчэй за усё, Адам добра прадумаў сітуацыю і пачаў праўдай і няпраўдай адстойваць маёмасць у М. і В. Медзвядках. Ён адмаўляецца ад раней напісанай распіскі і падае прашэнне на імя Рынга ад сябе і ад брата Казіміра [8]. Адам піша, што перад смерцю бацька падзяліў маёмасць паміж дзецьмі: Адаму — В. Медзвядка, Казіміру — М. Медзвядка. Ігнацій, які сам, адмовіўшыся ад сваёй часткі у Медзвядках, узяў сабе толькі прыгонных сялян: Лукаша Лісоўскага, Грышку Драздовіча, Вікенція Раманенку [9]. Да свайго прашэння Адам дадае яшчэ 2 дакументы, якія засведчаны у Навагрудскім павятовым судзе (першы — 19 сакавіка, другі — 14 красавіка 1827 г.) аб тым, што Ігнацій сапраўды адмаўляецца ад сваёй долі у м. М. і В. Медзвядках [10]. Але Рынг з недаверам ставіцца да прашэння Адама і звяртаецца ў Навагрудскі земскі суд.

Суд азнаёміў Рынга з двума спіскамі маёнткаў Навагрудскага павета. У першы спіс трапілі тыя маёнткі, якія падлягалі секвестру, а ў другі — якія не падлягалі. Якое было здзіўленне Рынга, калі насуперак пастанове Дэпартамента дзяржмаёмасці, М. і В. Медзвядкі траплі ў другі спіс. Рынг не звяртае ўвагі на пастанову, нават не дачакаўшыся прадстаўніка ад ніжняга земскага суда Навагрудскага павета, едзе ў Медзвядкі і пачынае сам рабіць вопіс маёмасці. У гэты час прыязджае Адам, і паміж імі разгараецца спрэчка. Дамейка-старэйшы амаль сілай забараняе рабіць вопіс чыноўніку. Свае паводзіны Адам аргументуе наяўнасцю дакументаў, якія падцвярджаюць, што Ігнацій не мае дачынення да маёнтка, на адсутнасць брата Казіміра, які таксама валодае сядзібай, а таксама на адсутнасць прадстаўнікоў земскага суда Навагрудскага павета, "которым только себя считает подчиненным, сомневается в праве обязательного удовлетворения требований Ринга" [11]. Абураны чыноўнік ад'язджае ў Гродна, у чарговы раз не зрабіўшы рэестра Медзвядак. Паміж Рынгам і Навагрудскім земскім судом цягнецца доўгая перапіска, дзе прадстаўнік Гродзенскай казённай палаты беспаспяхова спрабуе высветліць прыналежнасць Ігнація да Медзвядак. У студзені

[7] ГрНГА, ф. 31, воп. 2, спр. 59, с. 7.
[8] Тамсама. С. 9.
[9] Тамсама. С. 8.
[10] Тамсама. С. 10.
[11] Тамсама.

1833 г. суд Навагрудскага павета паведамляе аб тым, што секвестру падлягае фальварак Сачыўка. Толькі ў заключэнні пастановы, вельмі неканкрэтна і асцярожна гаворыцца: "…а по отношению к фольварку Недзвядки, по изложенным выше обстоятельствам, представить руководствоваться чиновнику изданных по сему предмету от казенной палаты наставлениям" [12]. Але канчатковага рашэння не было. Навагрудскі ніжні земскі суд усяляк стараўся ўхіліцца ад справы з Медзвядкамі. Чыноўнік праяўляў зайздросную ўпартасць. У снежні 1838 г. з маёнтка Дарава Навагрудскага павета у рапарце Рынг паведамляе Гродзенскай казённай палаце, што "окончив прием в казну им. Дарево … отправляюсь к приему им. Недзвядки" [13]. Па невядомых прычынах рэестр зноў не быў зроблены. А ўжо 7 красавіка 1839 г. Гродзенскае губернскае праўленне падае пісьмовую інфармацыю ў Гродзенскую казённую палату аб тым, што "необходимо принять в казну пятеро крестьян с им. Недзвядки и для описания им. Сачивка командировать Ринга" [14]. Працяглая барацьба сям'і Дамейкаў за Медзвядкі, у якой асаблівай актыўнасцю вызначыўся Адам, скончылася паспяхова.

Як жа выглядалі М. і В. Медзвядкі? Геаграфічны слоўнік Польскага Каралеўства за 1886 г. дае нам некаторыя звесткі. Медзвядкі складалі дзве вёскі і фальварак над ракой Ушай, у бязлеснай мясцовасці, узгорыстай і досыць маляўнічай. Вялікая Медзвядка мела 81 двор, напалову уніяцкую царкву фундацыі Яблонскіх, М. Медзвядка — 13 двароў [15].

Больш падрабязнае апісанне зроблена Гродзенскім губернскім прадвадзіцелем шляхты ў 1835 г. Па апісанню гаспадаркі бачна, што гэта была досыць багатая сядзіба. Гаспадарчыя пабудовы былі тыповымі для шляхецкага двара: 8 хлявоў, некалькі гумнаў, вінакурня, сушня, ветраны млын, дзве карчмы, якія прыносілі 100 р. серабром гадавога даходу. А ўвесь фальварак прыносіў даходу 5500 р. асігнацыямі [16]. У Вялікай Медзвядцы знаходзілася драўляная сядзіба на каменным фундаменце а дзевяці пакоях. А таксама яшчэ два дамы: для аканома з чатырох пакояў і ключніцы з пяці. Усе дамы былі крытыя гонтам [17]. У Малой Медзвядцы таксама быў дом на чатыры пакоі, крыты саломай і амаль у два равы меншы за першую сядзібу. І калі для Медзвядак барацьба з ліквідацыяй скончылася досыць паспяхова, то з фальваркам Сачыўка было горш.

Першапачаткова фальварак Сачыўка належаў роднаму брату Караліны — Станіславу Анцуту. Пасля яго смерці маёнтак і гаспадарку прыняла

[12] ГрНГА, ф. 31, воп. 2, спр. 59, с. 16.
[13] Тамсама. С. 34.
[14] Тамсама. С. 48.
[15] Słownik Geograficzny Królewstwa polskiego. Warszawa, 1886. T. 7. S. 66.
[16] ГрНГА, ф. 1, воп. 10, спр. 1591, с. 127.
[17] Тамсама. С. 128.

сястра. Разам з сваімі сынамі, Адамам, Ігнаціем і Казімірам, з'яўлялася ўладальніцай фальварка з 61 душой мужчынскага полу. Гэта было засведчана 19 сакавіка 1821 г. у Навагрудскім судзе (дакумент за нумарам 146) [18]. Па заключэнню Навагрудскага суда частка Сачыўкі павінна была быць забрана ў казну. Зноў у справу ўмешваецца Адам. Ён хадайнічае перад Гродзенскай казённай палатай аб тым, каб фальварак застаўся ў закладным валоданні сясцёр Ігнація Дамейкі. Маёнтак быў атрыманы ад дзядзькі з вялікімі даўгамі. Адам аддаў фальварак сёстрам Марыі (па мужу Урублеўскай) і Антаніне (па мужу Язерскай) у арэнду. 17 красавіка 1839 г. Рынг піша рапарт з фальварка Сачыўка, дзе паведамляе, што "по сие число уже успел привести в известность: число душ, угодий, строений, повинностей, крестьян. Однако делал это сам, без содействия заседателя нижнего земского суда Новогрудского уезда" [19]. Па рэестру гаспадарка Сачыўкі выглядала прыкладна, як і двор ў Медзвядках. Па колькасці гаспадарчых пабудоў яна адставала ад апошняй. Але было тут прыгожае возера і кузня. Дом быў аднапавярховы на каменным фундаменце, крыты гонтам, меў сем пакояў. У яшчэ трох драўляных пабудовах размяшчаліся кухня, пякарня і пральня. Належалі да фальварка яшчэ дзве вёскі і грэка-уніяцкая капліца [20]. Разам з хатняй жывёлай, якой было на той час у гаспадарцы 158 галоў, усё было ацэнена Рынгам у 575 р. серабром гадавога даходу. Ігнацію Дамейку належала выплаціць трэцюю частку даходу — 191 р. 89 к. серабром. Плаціць за брата абавязваюць Адама: "…то сонаследник Адам Домейко, в управлении коего оставлено имение, обязан подпискою вносить в казну третью часть означенного дохода" [21].

Як бачна, фальварак не быў секвестраваны. Чыноўнікі пайшлі на ўступкі Адаму, абавязаўшы яго плаціць трэцюю частку даходу.

Што датычыць маёнткаў Заполле і Жыбуртоўшчына, то належалі яны роднаму дзядзьку Ігнація, аб чым сведчаць купчыя за 1817 і 1819 гг. Ігнацій Казімір Дамейка меў агранамічную адукацыю і перадаў свайму пляменніку любоў да зямлі, уменне гаспадарыць на ёй. Ігнацій быў частым госцем старэйшага цёзкі. Пасля працэсу над філарэтамі і філаматамі Ігнацій быў асланы ў Заполле пад нагляд паліцыі. Там яго і застаюць лістападаўскія падзеі. Адразу пасля паўстання, у 1832 г., Гродзенская казённая палата прапанавала "изъять в казенное ведомство" Жыбуртоўшчыну з 186 душамі мужчынскага полу і Заполле з 44 д. м. п. [22] і прадставіць Дэпартаменту дзяржмаёмасці апісанне дадзеных маёнткаў. Тут ужо дзядзька Ігнація вя-

[18] ГрНГА, ф. 31, воп. 2, спр. 59, с. 35.
[19] Тамсама. С. 87.
[20] Тамсама. С. 60.
[21] Тамсама.
[22] Тамсама. С. 118.

дзе актыўную перапіску з чыноўнікамі і літаральна закідвае іх паперамі і дакументамі.

Чыноўнік Рынг уважліва правяраў усе дакументы, якія датычыліся маёнткаў Заполле і Жыбуртоўшчына і дачыненне да іх Ігнація Дамейкі. 25 лютага 1834 г. Рынг даносіць, што "вследствии предписания Департамента государственного имущества доношу, что им. Жирбуртовщина и Заполье не принадлежат Игнатию Дамейко" [23].

Сам дзядзька ў адным з дакументаў азначае, што "племянник мой Игнатий с 1828 г. три года жительствовал в фольварке Заполье и от моего имени управлял там. В имении Заполье по нем остались книги, гардероб и белье, которые командированный из Гродненской казенной палаты Задунайский переписал" [24].

У рэестры Задунайскага цікавасць выклікае біблятэка Ігнація. Усяго 178 кніг на лацінскай, французкай, нямецкай, англійскай і польскай мовах [25]. Больш за ўсё было кніг на французкай мове — 80 шт. Кнігі былі высланы ў Гродна, ацэнены на суму 41 р. 95 коп.

Асабістых рэчаў Ігнація у м. Заполле было няшмат: некалькі кашуль хатняга палатна і галандскай вытворчасці, мундзір, фракі, плашч, бараняе чорнае футра, пакрытае суконнай накідкай, капялюш, суконныя шапкі з брылём [26].

Другі маёнтак дзядзькі — Жыбуртоўшчына з 186 душ м. п. увогуле не пацярпеў ад секвестра. Гэта быў драўляны дом, а да фальварка належалі яшчэ 5 вёсак.

Такім чынам, сям'я Дамейкаў захавала за сабой права валодання ўсімі маёнткамі, шкада толькі, што сам Ігнацій ужо не мог прыехаць да свайго дома. Яшчэ адна "птушка" пакінула гняздо назаўсёды. Унутраны неспакой, туга і смутак па сваіх родных, блізкіх людзях, па сваёй зямлі не пакідалі нашага слаўнага земляка ўсё жыццё. У лісце, якое Ігнацій даслаў у 1834 г. Станіславу Лясковічу з Парыжа, ён піша: "О, як я быў бы рады кожнаму з вас сказаць хоць слоўца. Але скажу толькі адно, што не маю нічога на свеце даражэйшага за сваю радзіму" [27].

[23] ГрНГА, ф. 31, воп. 2, спр. 59, с. 95.
[24] Тамсама. С. 128.
[25] Тамсама. С. 110.
[26] Тамсама. С. 109.
[27] ГрНГА, ф. 1, воп. 27, спр. 523, с. 11.

Збігнеў Вуйцік *(Варшава)*

ІГНАТ ДАМЕЙКА — СЯБРА АДАМА МІЦКЕВІЧА, РОДАМ З МЕДЗВЯДКІ

1

Медзвядка ў цяперашнім Карэліцкім раёне была месцам, дзе на пачатку XIX ст. Ігнат Дамейка (1802–1889) правёў сваё дзяцінства [1]. Яго дзядзька Юзаф Дамейка, былы студэнт Саксонскай горнай акадэміі, прывабна расказваў яму пра замежныя вандроўкі і цікавую навуку, якая называлася геалогіяй. Ігнат быў надзвычай здольным хлопчыкам. Сям'я выбрала яму школу манахаў-піяраў у Шчучыне. Пасля чатырохгадовага навучання там, у 1816 г., ён паспяхова яе скончыў. Сярод вучняў выдзяляўся стараннасцю і праяўляў цікаваць да дакладных навук, асабліва хіміі. Таму сваю адукацыю працягваў на матэматычна-прыродазнаўчым факультэце ў Віленскім універсітэце. Меў тады няпоўных пятнаццаць гадоў. Пасля першага года навучання стаў кандыдатам філасофіі. У 1820 г. атрымаў ступень магістра. Але міністэрства не зацвярджала ступень па фармальных прычынах. У 1822 г., пасля напісання новай навуковай працы і здачы экзаменаў, нарэшце атрымаў ступень магістра. Але гэта нічога не дало. У 1823 г. у Вільні была выкрыта тайная арганізацыя філарэтаў, актыўным членам якой быў і Дамейка. Пасля крапатлівага следства Камісіі Навасільцава большасць членаў таварыства (Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Тамаш Зан) былі асуджаны і высланы ў глыб Расіі. У Дамейкі адабралі дыплом, адначасова выслалі яго пад нагляд паліцыі ў сямейныя ўладанні. Да 1827 г. ён знаходзіцца ў Жыбуртоўшчыне, у другога дзядзькі, а пазней гаспадарыць у маёнтку Юзафа Дамейкі ў Заполлі пад Лідай. Амністыя прыйшла ў 1829 г. Працягваў шукаць працу ў вёсцы паводле атрыманай спецыяльнасці. Дапамагаў у вучобе іншым, вырабляў розныя гаспадарчыя прыстасаванні. Разам з ксяндзом Дыянізіям Хлявінскім пераклаў Каран для навагрудскіх татараў, але яго рукапіс затрымала цэнзура. Пераклад гэты ўбачыць свет пазней у Царстве Польскім, але ўжо пад іншым прозвішчам [2].

Знаходзячыся ў Жыбуртоўшчыне, а затым у Заполлі, Ігнат часта наведваў сеймікі. Акрамя таго, ананімна друкаваўся ў віленскай прэсе. Аказваў дапамогу высланым у Расію філарэтам, асабліва Адаму Міцкевічу.

---

[1] Падрабязней пра Дамейку гл. у кн.: Chałubińska A. Ignacy Domeyko i jego wkład do geografii Polski. Warszawa, 1969; Szwejcerowa A. Ignacy Domeyko. Warszawa, 1975, Wojcik Z. Ignacy Domejko: Litwa – Francja – Chile. Warszawa; Wrocław, 1995; Ян Чачот, Ігнат Дамейка — сябры і паплечнікі Адама Міцкевіча. Беларусіка=Albaruthenika 10. Мн., 1998.

[2] Параўн. Wójcik Z. J. Filomacki przekład Alkoranu dla Tatarów nowogródzkich // Literatura Ludowa. 1995. Nr 3. S. 15–28. Выдаўцы прыпісалі пераклад Яну Бучацкаму.

А яго афіцыйна апублікаваныя творы прадаваў у Навагрудку на вясенніх кантрактах.

Калі І. Дамейка ад'язджаў з Заполля, каб прыняць удзел у паўстанні 1831 г., удзячныя жыхары сардэчна праводзілі яго. Ён пакінуў пасля сябе толькі добрую памяць [3]. Недзе ў сярэдзіне года знаходзіўся ўжо ў лагеры для інтэрніраваных паўстанцаў у Прусіі, непадалёку ад Кёнігсберга. Вясной 1832 г. у Дрэздэне сустрэўся з А. Міцкевічам, тады ўжо эмігрантам. З таго часу аж да самага ад'езду Дамейкі ў 1838 г. у Чылі яны былі разам — спачатку ў Германіі, затым у Францыі. Міцкевіч у час напісання ў Парыжы "Пана Тадэвуша" карыстаўся шырокімі ведамі свайго сябра. Яго студэнцкую мянушку Жэгота аўтар меў намер увесці нават у загаловак паэмы. Пазней Міцкевіч змяніў свае планы, але ў змесце твора мы знаходзім прозвішча Дамейкі і назву яго любімай Медзвядкі. Рукапіс таксама павінен быў атрымаць сябра.

Сяброўства Адама Міцкевіча і Ігната Дамейкі — гэта матэрыял для асобнай захапляючай кнігі. Пазнаёміліся яны, будучы студэнтамі, недзе ў 1816 г. Жэгота тады быў яшчэ амаль дзіцём. Праз два гады яны ўжо актыўныя члены Таварыства філаматаў. Не выключана, што на канікулах разам ездзілі ў Туганавічы да Марылі Верашчака, якой Дамейка даводзіўся дваюрадным братам. У 1823–1824 гг. яны былі адначасова асуджаны і знаходзіліся ў Вільні ў базыліянскіх мурах, аб чым паэт пісаў у трэцяй частцы "Дзядоў". Міцкевіч цаніў у сваім сябры жыццёвую мудрасць, яго веды і міралюбівы характар. Часта атрымліваў ад яго матэрыяльную дапамогу, якую Дамейка аказваў надзвычай далікатна. Міцкевіч перажываў, калі сябар не мог, як чужаземец, знайсці працу хіміка ў Парыжы, радаваўся, калі ў 1834 г. той распачаў навуку ў Парыжскім горным інстытуце, а ў 1837 г. атрымаў працу ў Эльзасе як горны інжынер. Міцкевіч выкарыстоўваў яго энцыклапедычныя веды ў час напісання "Польскай гісторыі". Гэтую працу дапаўняе складзены Дамейкам "Геаграфічны атлас зямель былой Рэчы Паспалітай". З пастаўленай задачай Дамейка справіўся, але карты і адпаведныя каментарыі да іх не былі апублікаваны.

З захаванай карэспандэнцыі сяброў 1837 г. вядома, што рэктар горнага інстытута паінфармаваў Міцкевіча аб магчымасці Дамейкі ўладкавацца на пасадзе выкладчыка ў Чылі. Жэгота прыняў прапанову. У студзені 1838 г. Дамейка развітаўся з Міцкевічам і парыжскімі сябрамі. Вярнуўся ён у гэты горад толькі ў 1884 г. Тады яго сустрэла сям'я раней памерлага Паэта. І тут няма нічога дзіўнага, бо Дамейка быў хросным бацькам Марыі Міцкевіч і сябрам Уладзіслава Міцкевіча.

[3] Падрабязней аб гэтым гл.: Вуйцік З. Ігнат Дамейка, або Памяць роднай Навагрудчыны // Ян Чачот, Ігнат Дамейка — сябры і паплечнікі Адама Міцкевіча. С. 70–80.

2

А. Міцкевіч ведаў, што Дамейка добра валодае пяром. Развітваючыся з сябрам у 1838 г., ён прасіў таго дасылаць свае ўражанні з Амерыкі. Надасланую інфармацыю ў бяспечнай для адрасата і яго сям'і, якая заставалася на радзіме, форме змяшчаў у эмігранцкай прэсе. Па дакладна невядомых прычынах Міцкевіч пакінуў у рукапісе выдатна напісаны твор — апісанне чатырохмесячнага падарожжа праз Атлантычны акіян і Аргентыну ў Чылі. Аднак вядома, што Паэт меў намер працягваць напісанне "Пана Тадэвуша". Можа, лёс сябра-выгнанніка павінен быў стаць зыходным матэрыялам для наступных частак шляхецкай паэмы?!

Менавіта пад уплывам Міцкевіча, а затым Антонія Эдварда Адынца Дамейка пачаў збіраць матэрыялы да апісання свайго жыцця, якое ўбачыла свет праз гады пад назвай "Мае падарожжы. Дзённік выгнанніка" [4]. Канчатковае афармленне працы адбылося ўжо ў Жыбуртоўшчыне ў 1884–1888 гг. Многія раздзелы яе напісаны ў літаратурных адносінах выдатна. А перш за ўсё гэта — важная крыніца па гісторыі Беларусі, Чылі, Францыі, Літвы, Германіі, Польшчы і Расіі.

Захавалася карэспандэнцыя сяброў за 1838–1855 гг., якая таксама мае вялікае пазнавальнае значэнне. Знаходзім там поўныя захаплення ацэнкі думак і дзейнасці Андрэя Тавянскага — містыка, які пераехаў з Ашмянскага павета ў Францыю. Раней Паэт меў намер нават пераехаць у Чылі разам з сям'ёй. Пазней стараўся атрымаць кафедру хіміі для Дамейкі ў Лазанскім універсітэце, дзе нейкі час працаваў сам. Аднак Дамейка не адгукнуўся на прапановы сябра вярнуцца ў Еўропу. Аддаў перавагу спакойнай, грамадска-карыснай працы перад сваркамі парыжскіх эмігрантаў. У прарочую місію Тавянскага не верыў, пра што і напісаў Міцкевічу. У выніку Паэт парывае з Дамейкам. Пазней, калі карэспандэнцыя была адноўлена, Міцкевіч вінаваціць сябра, што той у 1849 г. прыняў ахвяраванае яму чылійскае грамадзянства, а ў 1852 г. узяў шлюб з чылійкай. Інтуітыўна ён адчуваў, што Дамейка ў Еўропу вернецца не хутка. Зрэшты, ён нават дакладна не ўяўляў, кім быў яго сябра для маладой паўднёва-амерыканскай рэспублікі. Грамадзянства гэтай дзяржавы той заслугоўваў больш, чым хто-небудзь з чужаземцаў, якія аселі на ўзбярэжжы Ціхага акіяна.

3

Партрэт Адама Міцкевіча да сёняшняга дня вісіць на сцяне ў кабінеце ў доме Дамейкаў у чылійскім Сант'яга. Захоўваюцца там і іншыя памятныя рэчы з перыяду сумеснага знаходжання ў эміграцыі ў Дрэздэне і Парыжы. Гэтыя дарагія сэрцу Дамейкі рэчы дапамагалі яму перажыць псіха-

[4] Дзённіка Дамейка не скончыў. Ён быў выдадзены ў Вроцлаве ў 1962–1963 гг. пад рэдакцыяй Э.-Г. Няцёвай.

лагічна крызісныя моманты ў яго жыцці, як, напрыклад, у час працы ў Ля Сэрэне, дзе адзінай мовай, якой карыстаўся там, была іспанская.

Кантракт на настаўніцкую працу ў калегіуме ў Ля Сэрэне (правінцыя Какімба) Дамейка падпісаў на шэсць гадоў. У 1844 г., значыць, ён мог вярнуцца ў Еўропу з зароблены мі сродкамі, якія дазволілі б яму бязбедна пражыць у эміграцыі з сябрамі некалькі гадоў. Аднак Дамейка вырашыў застацца ў Амерыцы яшчэ на нейкі час, бо хацеў перадаць кафедру сваім вучням, калі яны вернуцца пасля навучання ў вышэйшых школах Францыі. Ён не марнаваў часу. У 1845 г. паехаў на поўдзень Чылі даследаваць вулканы, а таксама на тэрыторыі, дзе пражывалі індзейцы племені араўканаў (мапучэ), у той час яшчэ незалежнага. Пасля вяртання піша справаздачу "Araucania i sus habitantes" ("Араўканія і яе насельнікі"), у якой асуджае знішчэнне індзейцаў іспанцамі. Вядзе змаганне за далучэнне Араўканіі да Чылійскай Рэспублікі мірным шляхам і выігрывае сваю барацьбу. Яго справаздача аб прабыванні сярод індзейцаў была выдадзена ў перакладзе на польскую мову ў Вільні ў 1860 г. [5]. Новае выданне гэтай кнігі, якое з'явілася ў 1992 г., сёння мапучэ лічаць ледзь не бібліяй свайго племені, якое дзякуючы старанням Дамейкі не было знішчана, як іх суседзі ў Аргенціне [6].

Калі Дамейка прыехаў у Чылі ў 1838 г., мясцовая сістэма адукацыі грунтавалася на французскай методыцы. Галоўнай установай тут з'яўляўся Нацыянальны інстытут, якому падпарадкоўваліся універсітэт і іншыя навучальныя ўстановы. Універсітэт меў рэктара і дэканаў, а таксама членаў універсітэта, роля якіх заключалася ў прыёме дзяржаўных экзаменаў і прысванні адпаведных ступеняў. Такая сістэма была добрай у Францыі. У Чылі ж для падрыхтоўкі спецыялістаў-практыкаў у галіне геалогіі, горнай справы, металургіі яна давала мала карысці. Зыходзячы з практычнага вопыту ўжо ў першыя гады сваёй працы Дамейка прадстаўляе ўладам праект рэформы сістэмы навучання. За ўзор ён прапаноўвае Віленскую навуковую акругу з яе універсітэтам і іншымі школамі. Таму Чылійскі універсітэт у Сант'яга на стацыянарным аддзяленні павінен быў рыхтаваць спецыялістаў, якія пасля абароны навуковай працы атрымлівалі б адпаведную ступень. Улады прынялі праект, прызначыўшы адначасова Дамейку членам Чылійскага універсітэта. Ён аўтаматычна набываў права ўдзельнічаць у выбарах рэктара, а таксама ў спецыяльных дзяржаўных экзаменах, але не болей. Пасля наведвання розных куткоў Араўканіі, дзе яго прымалі амаль з энтузіязмам, Дамейка атрымаў прапанову ўзначаліць кафедру хіміі і фізікі ў Музеі натуральнай гісторыі ў сталіцы. Прапанову ён прыняў. І толькі ў час працы ў Сант'яга ён змог рэалізаваць сваю мару аб рэфармаванні школьнай сістэмы.

---

[5] Экземпляр гэтай кнігі, падараваны прафесарам А. Мальдзісам, знаходзіцца ў музеі Медзвядкаўскай школы.

[6] Інфармацыя прафесара Здзіслава Рына, былога Пасла Польшчы ў Чылі.

Славу ў Чылі Дамейка здабыў як дасканалы выкладчык геалогіі, горнай справы і металургіі, а таксама як прафесіянальны шахцёрскі суддзя. Яго вучні цаніліся больш, чым выпускнікі аўтарытэтных еўрапейскіх і амерыканскіх навучальных устаноў. Знаходзячыся на кіраўнічых пасадах прамысловых прадпрыемстваў, яны прыпынілі ашуканствы замежных гандляроў у дачыненні да мінеральных шахтаў, што мела важнае значэнне для эканомікі рэспублікі. Вучні таксама дасылалі свайму настаўніку новаадкрытыя мінералы, апісанні якіх Дамейка змяшчаў у спецыяльных часопісах у Францыі і Германіі, а таксама ў штогадовых зборніках Чылійскага універсітэта. Гэта быў таксама важны фактар папулярызацыі эканамічных магчымасцей маладой рэспублікі.

Дамейку ведалі ўладальнікі шахт яшчэ і як суддзю. Яго рашэнні заўсёды абапіраліся на грунтоўных памерах, якія праводзіліся пры дапамозе вучняў пад зямлёй. Ён атрымліваў за такую працу высокія ганарары. Частку атрыманых грошай ён высылаў у Еўропу (у тым ліку Міцкевічу), у эмігранцкія арганізацыі, якія займаліся самадапамогай.

Пра чылійскае грамадзянства Дамейка не клапаціўся. Але ганарыўся тым, што парламент гэтай краіны даў яму грамадзянства у 1849 г., ацаніўшы тым самым яго заслугі ў галіне навукі і эканомікі маладой рэспублікі. Ганарыўся таксама і тым, што ў 1852 г. яго прызначылі дарадцай урада па пытаннях рэфармавання універсітэта. Ён фактычна ўзначаліў навучальную ўстанову, якая ствараласа па ўзору Віленскага універсітэта. У 1867 г. яго абралі рэктарам гэтай установы. Пазней ён тры разы выбіраўся на тую ж пасаду, кожны раз на пяцігадовы тэрмін. Сярод выбаршчыкаў было шмат яго выхаванцаў, шчыра адданых свайму Майстру. Калі яго абралі ў трэці раз, ён адмовіўся ад выканання функцый кіраўніка універсітэта, маючы намер паехаць на радзіму да дачкі Аніты, якая пражывала там з мужам Лявонам Дамейкам ў Жыбуртоўшчыне. Чылійскі парламент і на гэты раз аднагалосна выказаў падзяку заслужанаму грамадзяніну. Дамейку была прызначана такая пенсія, якой не меў ніводны з ранейшых прэзідэнтаў. Да таго ж ён мог атрымліваць яе за межамі Чылі. Бо заслужыў на гэта. Краіна, якая на працягу доўгага перыяду абкрадвалася замежнымі суполкамі, была абаронена ад вялікіх страт. А выхаванцы Дамейкі з устаноў у Ля Сэрэне і Сант'яга ў 80-я гг. XIX ст. былі асноўным касцяком культурнай эліты Чылі, якую цанілі таксама за яе межамі.

Ігнат Дамейка для Чылі несумненна быў пасланы самім прадвызначэннем і меў шчасце ў тым сэнсе, што ўлады своечасова заўважылі станоўчыя рысы яго розуму і характару. Да сённяшняга дня ён лічыцца там бацькам горнай справы [7] і апосталам навукі. Гэта самыя высокія тытулы, нададзе-

[7] Гл. кн.: Urmenta J. T., Bruggen J. I. Domeyko. Santiago de Chile, 1993.

ныя яму, хоць і неафіцыйна. У чылійскай прэсе яны з'явіліся яшчэ пры жыцці філамата. Тым самым аддавалася належнае і дзейнасці віленскіх арганізацый філаматаў і філарэтаў, якія выхоўвалі сваіх членаў як прыкладных грамадзян краін, дзе яны займаліся грамадскай дзейнасцю.

Калі Дамейка распачынаў у 1838 г. у Ля Сэрэне — на іспанскай мове! — свае лекцыі ў мясцовым каледжы, Чылі ў геаграфічным плане была краінай амаль недаследаванай. Праўда, руду здабывалі, але не ўмелі нават вызначыць колькасць у ёй золата і серабра. Праз некалькі гадоў навучання яго вучні праводзілі па заказу прамыслоўцаў ужо адпаведныя аналізы. Заказы гэтыя Дамейка даручаў выконваць бяднейшым вучням. На канікулах запрашаў усіх з сабой у так званыя экспедыцыі, дзе збіраў матэрыял для манаграфіі аб натуральных багаццях Чылі. Ім было выдадзена некалькі манаграфій, некаторыя з прыгожа аформленнымі геалагічнымі картамі.

Дамейка быў, перш за ўсё, хімікам, якога цікавілі мінеральныя спалучэнні ў зямной кары. Большасць сваіх навуковых прац ён прысвяціў менавіта гэтай праблеме, змяшчаючы свае артыкулы пераважна ў спецыяльных выданнях Францыі, Германіі, Чылі і Польшчы. Акрамя гэтага, пісаў падручнікі па мінералогіі, хіміі, фізіцы і прабірнай справе. Апошні быў выдадзены ў многіх краінах, выдаваўся нават у XX ст. Закранаў таксама праблемы фізічнай геаграфіі, вулканалогіі і нават бальнеалогіі і гідрагеалогіі. Сант'яга яму ўдзячна за здаровую пітную воду.

Памяць пра Ігната Дамейку ў Чылі з'яўляецца адной з самых дарагіх. Яго імем названы шмат вуліц, два гарады, а таксама горы (Вялікія Кардыльеры Дамейкі). Чылійскі універсітэт у Сант'яга і Політэхнічны універсітэт у Ля Сэрэна маюць залы і аддзелы, якія носяць імя славутага геолага. Яго дом у сталіцы лічыцца гістарычным помнікам матэрыяльнай і духоўнай культуры паўднёва-амерыканскай рэспублікі.

Замежныя поспехі Дамейка атрымаў дзякуючы пэўным рысам свайго характару, якія выхаваліся ў Медзвядцы і Жыбуртоўшчыне, у сямейным і настаўніцкім асяроддзі, а затым у тайных арганізацыях Віленскага універсітэта. Ён не быў схільны да рамантычных захапленняў. Хутчэй цаніў арганічную працу. Разумеў, што мае незвычайныя здольнасці. Гэтым скарбам распараджаўся рацыянальна. Таму яго аднолькава любілі як на радзіме, так і ў эміграцыі. У Чылі яго цанілі кіраўнікі: прэзідэнты і міністры, любілі вучні, якія пазней склалі культурную эліту краіны. Толькі ўжо таму яго можна назваць чалавекам-легендай.

У Чылі наш суайчыннік адчуваў сябе добра. Але часамі сумаваў па роднай старонцы. Можа, таму так лёгка згадзіўся на выезд дачкі Аніты ў Гродзенскую губерню, калі яна рашыла звязаць свой лёс з кузенам Лявонам. Дамейка прыехаў да іх у 1884 г. Захапляўся прыгажосцю радзімай зямлі і інтэнсіўна працаваў (тут паўстаў яго дзённік, а таксама некаторыя працы

па геалогіі і філасофіі). Адсюль паехаў зноў у Чылі, каб упарадкаваць лёс сыноў: Казіміра — горнага інжынера і Гернана — ксяндза. Па дарозе на параходзе захварэў. Памёр 23 студзеня 1889 г. у Сант'яга і пахаваны на тутэйшых могілках. Сям'я перадала кракаўскай Акадэміі ўмельстваў некаторыя французска- і польскамоўныя рукапісы, у тым ліку "Мае падарожжы" і рукапісны "Атлас польскіх зямель". Апошні чакае свайго выдання як важная крыніца інфармацыі па гісторыі Цэнтральнай Еўропы ў першай палове XIX ст.

4

Сярод віленскіх філаматаў і філарэтаў, якія паходзілі з сённяшніх абшараў Беларусі, некаторыя ўзняліся вышэй сваіх сучаснікаў: Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Ігнат Дамейка, Юзаф Кавалеўскі і Тамаш Зан. Першы з іх увекавечыў сваё імя літаратурнымі творамі, асабліва "Дзядамі", ч. III, а таксама "Панам Тадэвушам" і лекцыямі пра славянскія літаратуры. Чачот стаў апосталам народнай беларускамоўнай літаратуры, якую так ахвотна сёння чытаюць. Тамаш Зан праславіўся як геолаг Паўднёвага Урала і тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага. Аднак пры жыцці сваіх прац не пабачыў у друку.

Ігнат Дамейка, які пражыў даўжэйшае, чым яго віленскія сябры, жыццё, меў магчымасць зрабіць больш. Асноўную частку свайго жыцця ён правёў у Чылі. У другой айчыне да апошняга дня жыцця рэалізоўваў задачы віленскіх філаматаў. Можа, менавіта таму і сёння ў розных краінах свету яго ведаюць, апавядаюць пра яго сваім нашчадкам такжа часта, як і пра Міцкевіча. Пацвярджаюць гэта артыкулы ў энцыклапедыях розных народаў і матэрыялы ў музеях (у тым ліку і на Беларусі — у Крупаве, Медзвядцы і Дзятлаве), а таксама мемарыяльныя дошкі [8].

Мар'юш Германовіч *(Аліўе, Францыя)*

ГІСТОРЫЯ СЯМ'І ДАМЕЙКАЎ — СПРОБА ЯЕ ЎЗНАЎЛЕННЯ

Гісторыяй даволі разгалінаванага беларуска-літоўскага роду Дамейкаў, да якога (па жаночай лініі) маю гонар належаць і я, займаюся ўжо больш дзесяці гадоў. За гэты час у архівах і бібліятэках Польшчы, Францыі, Літвы (а цяпер сюды дабаўляецца яшчэ і Беларусь) сабрана багата генеалагічнага матэрыялу. Зусім нядаўна ён папоўніўся трыма новымі інфармацыйнымі блокамі, на якія буду спасылацца далей. Гэта — лісты Казіміра Анупрэя

[8] На дошцы ў Заполлі пад Лідай напісана, што Дамейка жыў там з 1823 г., што не адпавядае сапраўднасці. Ён жыў там у 1827–1831 гг. Мар'юш Германовіч, патомак Дамейкі, устанавіў, што ў Заполлі знаходзіўся маёнтак дзядзькі Юзафа, а не Ігната, як лічылася раней.

Дамейкі, дзеда знакамітага вучонага і сябра Адама Міцкевіча Ігната Дамейкі, да Людвікі Карповіч, датаваныя 1756–1758 гг. [1], вопіс завяшчання таго ж К.-А. Дамейкі [2], а таксама лісты сваякоў Ігната Дамейкі [3].

Казімір Анупрэй Дамейка ў сваім завяшчанні, між іншым, развітваўся з "Міхалам Дамейкам, будаўнічым ковенскім і ўсімі панамі Дамейкамі, якія маюць сваю маёмасць у Ковенскім і Упіцкім паветах, просячы, каб сыноў маіх памяталі". Аб продках гэтага Міхала, якія мелі герб Далэнга (Далуга), вядома, што яны (у прыватнасці Канстанцін і яго жонка Ядвіга з Кудрэвічаў) з'явіліся ў 1659 г. у Коўне, заявіўшы, што ўцяклі ад "маскоўскага войска" з ваколіцы Жамайтканы-Дамейкі. Мяркую, што адзін з ковенскіх Дамейкаў даў пачатак новай лініі, ужо з гербам Дангель, якая пасялілася на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

У лістах Казіміра Анупрэя Дамейкі Людвіка Карповіч называецца "гараднічанкай", пазней — "дамай двара я. в. пані маршалковай вялікай" Вялікага Княства Літоўскага. Як вядома, такім маршалкам тады быў князь Юзаф Паўлін Сангушка, уладальнік Ракава, які быў жанаты з Ганнай Цэтнер. Вакол Ракава засяроджваліся гаспадарчыя інтарэсы дзеда Ігната Дамейкі. 7 красавіка 1758 г. ён пісаў Л. Карповіч: "Заўтра выязджаю да в. п. Міцкевіча, ад якога пераймаю фальварак на св. Ежага […]. Гэты фальварак называецца Задарожжа, ад Дораў чвэрць мілі, ад Пяршаеў палова мілі, ад Валожына міляў 2". 16 мая 1758 г. К.-А. Дамейка ўдакладняў: "У Задарожжы тым сялян 26, на Задарожжа тое арэнднае права ўзяў я на год ад в. п. Міцкевіча […]. У Задарожжы маю адміністратара п. Мечнікоўскага, старога, што быў у Пяршаях, добрага чалавека".

Каля 1760 г. 35-гадовы К.-А. Дамейка ўзяў сабе жонку — 17-гадовую Багумілу Адахоўскую, якая памерла 17 верасня 1775 г. У названым вышэй завяшчанні ён развітваецца з яе бацькамі — Казімірам і Цацыліяй Свентажэцкімі, лідскімі лоўчымі, а таксама з іх сынамі Янам і Ежым. Затым піша: "Развітваюся з вялікім родам в. п. Свентажэцкіх і Быкоўскіх, якія маюць прывілеі на вялікія пасады на Гродзеншчыне […], просячы іх мець на ўвазе дзяцей маіх, што маюць гонар быць блізкімі сваякамі". З гэтага можна зрабіць вывад, што маці Цацыліі Свентажэцкай, відаць, паходзіла з сям'і Быкоўскіх. Цікавай у завяшчанні з'яўляецца таксама запіс, з якога відаць, што К.-А. Дамейка доўга служыў "камісарам у я. в. п. Пшаздзецкага, судовага старосты Мінскага ваяводства. Таму перад смерцю ён просіць сваякоў: "Цела маё ў скляпеністай труне, нічым не абабітай, толькі на цёмна маляванай, пакладзіце, а абедзьве труны, маю і маёй жонкі, устаўце і замуруйце ў адну катакомбу ў новым фарным касцёле заслаўскім, у другой

[1] Бібліятэка ПАН у Кракаве , аддз. рук., адз.зах. 3600.

[2] Захоўваецца ў фондзе 727 Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

[3] Польская бібліятэка (сігн. 454, 962) і музей Міцкевіча (сігн. 1081) у Парыжы.

катакомбе аднолькавым чынам размясціце цела маці маёй і брата майго роднага".

Клапоцячыся пра дзяцей і не пакідаючы ім даўгоў, К.-А. Дамейка прызначае выканаўцамі завяшчання мінскага гарадскога суддзю Яна Бурбу і старадубскага суддзю Дамініка Заярскага. Усе дзеці яшчэ маладыя. А меў Казімір Анупрэй усяго дзевяць дзяцей:

Іанна, у 1779 г. жонка ротмістра Андрэя Алендскага. Мяркую, што ў іх быў прынамсі адзін сын, якога дачка, Аляксандра, выйшла замуж за Роха Брахоцкага.

Тадэвуш, нарадзіўся 16 кастрычніка 1762 г. У завяшчанні сказана, што фальварак Задарожжа застаецца ў "пажыццёвым уладанні" Казіміра Анупрэя і Тадэвуша.

У 1798 г. Тадэвуш Дамейка стаў уладальнікам вялікага маёнтка Сітцы, які знаходзіцца 115 кіламетраў на поўнач ад Мінска і раней належаў Бжастоўскім. Ад палаца ў Сітцах захаваліся чатыры вялікія калоны і прыгожая брама. Т. Дамейка, паводле "Геаграфічнага слоўніка", быў жанаты з удавой Ежага Адахоўскага, уладальніка Гервятаў. У 1831 г. ён паслаў сваіх людзей для ўдзелу ў паўстанні. Памёр 14 красавіка 1838 г. ва ўзросце 76 год. У Сітцах, на могілках, стаіць яму помнік.

Антон Іпаліт, бацька знакамітага Ігната. Нарадзіўся каля 1764 г., памёр ужо ў 1809 г. ва ўзросце 45 год. Метрыка яго была запоўнена ў Заслаўі.

Мацей. Нарадзіўся каля 1765 г. У 1801 г. ён, віленскі падкаморы, набыў маёнтак Гервяты на Віленшчыне (цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл.). Гэты маёнтак, у якім было 369 мужчынскіх душ, у 1831 г. М. Дамейка завяшчаў пажыццёва сваёй жонцы Мар'яне з Славінскіх. Памёр у чэрвені 1834 г. ва ўзросце 69 год. Пахаваны на Росе ў Вільні. Гервяцкі двор, пабудаваны ў канцы XVIII ст., часткова захаваўся. Пасля Другой сусветнай вайны ў ім размяшчаўся шпіталь. Цяпер, пасля ўзвядзення новага шпіталя, на жаль, разбіраецца на дровы.

Ігнат. Нарадзіўся ў лютым 1767 г. Дзядзька і цёзка славутага вучонага. Антон Вярбоўскі пісаў да апошняга: "У мінулыя два месяцы меў я гарачае жаданне адведаць Жыбуртоўшчыну. Там жыў твой дзядзька, с. п. Ігнат, павагу да якога я назаўжды захаваю. Колькі ж гэта прыемных хвілін правёў я там з дарагой Марылькай і красамоўных меркаванняў засталося ў нашай памяці! Калі ў маладзейшыя гады ў дзядзькі было крыху вальтэрыянства (хадзілі такія пагалоскі), дык пазнейшым жыццём ён усё гэта абвергнуў! Бо літасцівасць, чалавечнасць, учыннасць, сяброўская і грамадская цнатлівасць нікім так выразна не выяўляліся. Аднойчы ў гутарцы пераказаў ён два радкі з Вальтэра, здаецца, ім жа і перакладзеныя: "Шукаючы Тваёй праўды, зблудзіў я, можа, але маё сэрца поўна Табой, Божа".

Лявон, уладальнік Дзяркоўшчыны, якая знаходзіцца паўночней Сітцаў. У 1817 г. ён фундаваў там касцёл, знішчаны ў савецкія часы, а цяпер адбудаваны. У 1996 г., калі я быў там, на вонкавай сцяне празбітэрыя пабачыў гранітную дошку: “С. п. Лявон, сын Казіміра, Дамейка, фундатар гэтага касцёла 1845 г. ліпеня 29 на 78 г. жыцця”.

Марыянна. Нарадзілася каля 1769 г. У завяшчанні бацька запісаў ёй пасаг і вясельную выправу.

Юзаф. Нарадзіўся каля 1771 г. У 1792 г. паступіў у Горную акадэмію ў саксонскім Фрайбургу. Падзелы Рэчы Паспалітай не дазволілі яму працаваць паводле атрыманай там прафесіі. З’яўляўся ўладальнікам маёнткаў Азярыны (20 км на поўдзень ад Жыбуртоўшчыны) і Сукурчы (у Лідскім павеце, у склад маёнтка ўваходзілі вёскі Бялевічы, Бельск, Дамейкі, Заполле). Памёр у 1843 г.

Юзаф Дамейка перапісваўся з пляменнікам, які ў многім пайшоў па яго слядах, цікавіўся, па якіх падручніках ён вучыўся ў Горнай акадэміі ў Парыжы: “Напішы мне, атрымаўшы гэты ліст, пра сябе, пра тваю геалогію, якую настаўнікі выкладаюць: ці паводле Буфо, ці паводле Вернера. Калі ў Саксоніі, у Дрэздэне ці ў Фрайбургу будзеш, папрасіў бы цябе, каб ты дапытаўся да збораў неўміручага Вернера, слаўнай памяці майго прафесара […], бо хочацца хаця на старасць прыгадаць навуку, якая зрабіла такімі прыемнымі мае маладыя гады”.

Дыянізі. Нарадзіўся паміж 1772 і 1775 г. Звесткі пра яго невядомыя.

Пра ўнукаў Казіміра Анупрэя падам толькі ўрыўкавыя звесткі.

Звычайна лічыцца, што *Ігнат Дамейка* нарадзіўся ў Медзвядцы. Але ў “Гербоўніку” Банецкага паведамляецца, што метрыка яго хрышчэння была выпісана ў 1801 г. у Параф’янаве. Там жа ў 1803 г. хрысцілі яго брата Казіміра. Параф’янаў і Медзвядку дзеляць дзесьці 180 км. Цяжка сабе ўявіць, каб дзіця так далёка везлі хрысціць. А між тым, касцёл у Параф’янаве з’яўляецца парафіяльным для маёнтка Сітцы Тадэвуша Дамейкі. Таму мяркую, што там і нарадзіўся Ігнат Дамейка.

Казімір Францішак, сын Тадэвуша, нарадзіўся ў 1805 г. у Сітцах. Ажаніўся з Адэліяй Нарушэвіч, дачкой Юзафа Рамуальда, удзельніка напалеонаўскай вайны, уладальніка маёнтка Савічы, і Феліцыі Аўстутовіч, якая выхоўвалася пры двары Дамініка Радзівіла.

Адам, старэйшы сын Антона Іпаліта, быў ахрышчаны ў 1799 г. ва Уздзе. Арандаваў каля Узды маёнтак, ці фальварак Міхалка.

Да сказанага вышэй трэба дадаць некалькі слоў пра лёсы сям’і Дамейкаў. У іх маёнтках аж да 1939 г. захоўвалася нямала памятак, звязаных з Ігнатам Дамейкам. Найперш гэта былі яго лісты. Дзядзька вучонага і падарожніка Ігнат пісаў яму 12 ліпеня 1840 г. “Лісты твае, нібы перад курсорыяй (?) па сям’і кружаць, бо ўсе зацікаўленыя прагнуць ведаць пра каханага

родзіча і чытаць яго лісты. Вандруючы да паноў Юзафа Казіміра, да Альфонсаў і да Антоніх, яны да мяне не вяртаюцца". І далей: "Твой партрэт з разбітым шклом у нашай Зосі, выхаванкі тваёй. Ззаду партрэта я запісаў гісторыю Твайго жыцця з 9 год. У доме Зосі ён стаіць на камодзе пад люстэркам паміж двума лямпамі". Кніжкі вучонага засталіся ў сям'і: "Кнігі Твае, складзеныя ў скрыню, знаходзяцца ў Заполлі, у свірне на гарышчы"; "пакінутыя ў Заполлі кнігі захоўваюцца ў поўнай цэласці". Да вайны жылі яшчэ людзі, якія многа ведалі пра Дамейкаў. Так, у Жыбуртоўшчыне дажываў габрэй Хаім Лейзеравіч. Лявон Дамейка згадваў, што ён знаходзіўся на "ласкавым хлебе", бо меў вялікія заслугі перад сям'ёй. У час паўстання 1863 г. ён дастаўляў важныя звесткі і харчы іншаму Лявону Дамейку, потым мужу дачкі Ігнація Аніты, якая прыбыла з Чылі. Хаім Лейзеравіч быў "рухомай хронікай" сям'і Дамейкаў, бацька яго быў т. зв. пахтаром у Дамейкаў у маёнтку Сачыўкі, потым у Медзвядцы і Азяранах, а гэты Хаім быў пахтаром у Жыбуртоўшчыне. Памятаю, як яшчэ да вайны расказваў розныя гісторыі пра Адахоўскіх, Слізняў, Вярбоўскіх, Ромераў".

Некалькі слоў пра лёсы дамейкаўскіх маёнткаў да 1939 г. Медзвядка належала да сям'і Абух-Вашчатынскіх, Азяраны — да Міхала Ромера (памёр у 1938 г.) і яго жонкі Марыі з Дамейкаў. Заполле ў 1857 г. перайшло да ротмістра Антона Квяткоўскага, а ў 1886 г. — да яго дачкі Галены Шалевіч. Жыбуртоўшчына, Сітцы і Гервяты ўвесь час знаходзіліся ў руках Дамейкаў. А ў Сукурчах гаспадарылі Пілецкія. Апошнім іх уладальнікам быў Вітальд Пілецкі, вывезены фашыстамі ў Асвенцым, адкуль уцёк.

Урэшце пра сённяшні дзень. Цяпер у Польшчы жывуць толькі дзве асобы з прозвішчам Дамейка — Ева Дамейка, удава Лявона, апошняга ўладальніка Жыбуртоўшчыны, і іх дачка Барбара. І толькі ў Чылі засталося прозвішча Дамейка і нашчадкі па мужчынскай лініі Казіміра Анупрэя. Адначасова ніхто не ведае, колькі ёсць нашчадкаў па жаночых лініях — Абух-Вашчатынскіх, Бянькоўскіх, Вярбоўскіх, Габараў, Германовічаў, Лопатаў, Маркоўскіх, Мартонаў, Раманоўскіх, Севярынаў, Слізняў, Урбановічаў.

Зміцер Яцкевіч *(Мінск)*

ЦЫРЫНСКІ ГРЭКА-КАТАЛІЦКІ ДЭКАНАТ

І пан заказаў імшу ў вакольных касцёлах,
Прыехаў ксёндз з Цырына ўранні.

А. Міцкевіч. "Свіцязь".

Працытаваны эпіграф сапраўды паслужыў пачаткам для пошуку старажытнага беларускага горада, які сёння фактычна нікому невядомы і заняд-

баны. Зараз Цырын — вёска, цэнтр сельсавета ў Карэліцкім раёне Гродзенскай вобл. Але яшчэ ў другой палове мінулага стагоддзя памяталі пра тое, што Цырын раней быў горадам [1]. Неаднаразова бываў тут і славуты паэт, наш зямляк Адам Міцкевіч. Апошні, відаць, добра ведаў гэтыя мясціны і тутэйшых жыхароў. Гэта сцвярджаюць і біёграфы А. Міцкевіча, якія лічаць, што "праўзорам святара, які выступае ў IV частцы "Дзядоў", быў вуніяцкі святар з наваградскага Цырына, прыяцель Міцкевіча — айцец Іван Гарбацэвіч… За праўзор жа Гусляра, што кіруе ходам абрадаў, ці не паслужыў яму стары а. Цімахвей Гарбацэвіч, бацька Івана… Канкрэтны сюжэт для гэтай панурай драматычнай візіі даў Міцкевічу жыццёвы, навочны прыклад з таго ж Цырына. Усяго колькі гадоў перад напісаннем II часткі "Дзядоў" памёр собснік Цырына, пан з Варончы й наваградскі ваявода, Язэп Несялоўскі" [2].

Паводле "Малога гербоўніка наваградскай шляхты" [3], дзе надрукаваны артыкул па генеалогіі Несялоўскіх герба Кошбак, гэты род быў звязаны з Цырынам ужо з XVII ст. Першым цырынскім старостам быў Казімір Несялоўскі. Яго родны пляменнік Юзаф, сын Адама, — генерал-маёр войск літоўскіх, чашнік Вялікага Княства Літоўскага, падкаморы навагрудскі, каштэлян і ваявода навагрудскі, палкоўнік Навагрудскага ваяводства, спадчыны ўладальнік маёнткаў Варонча, Жухавічы, Бабынёўка, Адаляшчына ў Навагрудскім павеце. Таксама згодна з прывілеем караля Аўгуста III меў пасаду цырынскага старосты.

Такім чынам, Несялоўскія, у тым ліку і Язэп, не былі ўласнікамі Цырына, як сцвярджае Л. Падгорскі-Аколаў, а за ім і В. Тумаш. Яны толькі былі старостамі. Цырын жа з'яўляўся дзяржаўным горадам Вялікага Княства Літоўскага, цэнтрам староства.

На вялікі жаль, нам не пашанцавала знайсці гістарычную інфармацыю пра Цырын у энцыклапедычных выданнях, але цікавыя звесткі аб ім дае гісторык-геральдыст А. Цітоў [4] у сваіх кнігах пра гербы беларускіх гарадоў. Аўтар сцвярджае, што першыя звесткі аб Цырыне адносяцца да XVI ст., калі ён быў цэнтрам староства і належаў Несялоўскім. Як мы ўжо згадвалі вышэй, гэта памылковае сцверджанне — Цырын быў у пасэсіі Несялоўскіх з XVII ст. Далей А. Цітоў піша (без спасылак на крыніцы), што ў 1514 г. кароль Жыгімонт Стары сустракаў тут свае войскі. Па логіцы гэтая дата, якая прайшла праз два выданні шаноўнага аўтара, павінна лічыцца першай згадкай пра Цырын і адпаведна, як прынята, датай яго заснавання. Але нам

[1] Описание церквей и приходов Минской епархии. Минск, 1878. С. 183.

[2] Брага С. [Тумаш В.]. Міцкевіч і беларуская плынь польскае літаратуры // З гісторыяй на "Вы". Мн., 1994. С. 290–291.

[3] Малы гербоўнік Наваградскай шляхты. Мн., 1997. С. 84.

[4] Цітоў А. Геральдыка беларускіх местаў. Мн., 1998. С. 250.

пашанцавала знайсці ў актах Літоўскай метрыкі пад 10 верасня 1510 г. ліст караля Жыгімонта Сямёну Іванавічу, двараніну гаспадарскаму, на зямлю дворную цырынскую і сенажаці сяла яго Туганавічы [5]. У дадзеным лісце згадваюцца вёскі Цырынскай воласці: Туганавічы, Царковішча, рэчкі Сервеч і Петушоўка.

Землі ў Цырынскім павеце згадваюцца таксама ў Літоўскай метрыцы, у пацвярджэнні караля Жыгімонта Старога скарбнаму пану Андрэю Станьковічу, якое было напісана ў Вільні 23 кастрычніка 1529 г. [6]. Там, у прыватнасці, згадваецца, што "навагрудскія" баяры Богуш і Адам Багданавічы прадалі дзве свае спадчынныя землі ў Цырынскім павеце Удадавешчыну, Русаціна і Райцу за восемдзесят коп грошаў Плаксіным.

Наступны запіс у Літоўскай метрыцы датаваны 1540 г. Тады для памяці было зафіксавана пагадненне адносна Цырына паміж пані Ганнай, жонкай Яна Станіслававіча Глябовіча, ваяводы полацкага, і панам Шчасным Ільінічам, уладальнікам Мірскага замка [7].

Пад 1562 г. 3 мая ў Вільні былі напісаны і разасланы лісты паборныя, сярод якіх ёсць такі запіс, занатаваны ў актах Літоўскай метрыкі: "До мест Новгородского, Цырынского і Ляхавицкого" [8]. Як бачна з вытрымкі, ужо ў 1562 г. Цырын таксама, як і ваяводскі цэнтр Навагрудак і Ляхавічы, лічыўся горадам.

Паводле актаў Галоўнага трыбунала ў 1597–1604 гг. пасаду цырынскага старосты займаў Януш Скумін Тышкевіч [9].

У кнізе А. Цітова [10] гаворыцца пра "ўставу месца Цырын" 1639 г., якая была пацверджана 22 сакавіка 1669 г., і аб падатках, якія павінны былі плаціць мясцовыя жыхары. Прынамсі, там адзначаецца, што ў Цырыне быў замак. Мяшчане павінны былі адпрацаваць на яго карысць шэсць талок, акрамя гэтага, мусілі ўтрымліваць мост і грэблю.

"Слоўнік геаграфічны Каралеўства Польскага і іншых краін", які выйшаў у мінулым стагоддзі, паведамляе, што ў часы Паўночнай вайны, у 1718 г., у Цырыне было 62 дымы. У гэтым жа годзе 26 лістапада горад згодна з прывілеем караля атрымаў прывілей на штотыднёвыя торгі і шэсць кірмашоў: "…на тры каралі рускія, на звеставанне і Міколу рускага ў маі, на Спаса, на Ушэсце і Пакравы Багародзіцы". Паводле пацвярджальнага прывілею караля Станіслава Аўгуста ад 5 чэрвеня 1792 г. Цырын карыс-

[5] Литовская метрика. Кн. 8. Вильнюс, 1995. С. 388.
[6] Литовская метрика. Кн. 224. Вильнюс, 1997. С. 330.
[7] Литовская метрика. Кн. 225. Вильнюс, 1995. С. 171.
[8] Литовская метрика. Кн. 564. Вильнюс, 1996.С. 103.
[9] Решения Главного Литовского трибунала 1583–1655 гг. Вильнюс, 1988. С. 122–124, 144–147, 168–173.
[10] Цітоў А. Геральдыка беларускіх местаў. С. 250.

таўся гербам з выявай аленя з залатым крыжам паміж рагамі ў блакітным полі [11]. Верагодна, ён быў атрыманы яшчэ па вышэй згаданаму прывілею караля Аўгуста II. Заўважым, што гэта адзіны вядомы на сённяшні дзень населены пункт Карэліцкага раёна, які меў свой уласны герб.

Як бачна з вышэй прыгаданых дакументаў, з пачатку XVI ст. да трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 г. горад Цырын уваходзіў у Навагрудскі павет, з 1795 да 1797 г. у Слонімскую, пасля, у 1797–1801 г., у Літоўскую, з 1801 па 1843 г. у Гродзенскую губернію, з 1843 г. у Навагрудскі павет Мінскай губерні.

Паводле "Візіты Цырынскага грэка-каталіцкага дэканата" 1793 г. [12] старая Цырынская Праабражэнская драўляная царква была фундавана Багданам Фёдаравічам Сапегам, каралеўскім рэвізорам Навагрудскага ваяводства 25 сакавіка 1565 г. Гэты прывілей быў актыкаваны ў кнігах Навагрудскага земскага суда 9 сакавіка 1787 г. Багдан Фёдаравіч Сапега паходзіў са старажытнага беларускага шляхецкага роду. Прадзед яго Сямён, альбо Сунігайла, паводле падання быў сынам Нарымунта Гедымінавіча. Згодна звестак іншых даследчыкаў, Сямён Сапега паходзіў з бранскіх баяраў. Ягоны сын Багдан — заснавальнік чарэйскай галіны рода, якая затым пачала называцца ружанскай. Ягоны ўнук — Багдан Фёдаравіч Сапега (1525?–1610) і быў фундатарам Цырынскай царквы. Па дадзенаму фундушу царкве надаваліся дзве валокі ва ўрочышчах Ускае, Задняе, Доўгае, а таксама сенажаць, лес, млын і возера; мястэчку Цырын — два пляцы зямлі, на адным з якіх стаіць царква, другі — пад плябанію і іншыя забудовы.

Паводле Візіты Цырынскай пратапопіі 1680 г. [13] у Цырыне тады была драўляная царква з бабінцам, нядаўна збудаваная намаганнямі мясцовага святара Галіцкага. Верагодна, гэта было звязана з падзеямі вайны 1654–1667 гг., калі вельмі шмат населеных месцаў было знішчана. Цырынская Праабражэнская царква ўяўляла сабой брусаваны крыты гонтам будынак. Над галоўным алтаром узвышаўся вялікі драўляны купал з крыжам, над франтонам — малы купал, таксама з крыжам. Пры ўваходзе быў прыбудаваны бабінец з дзвярыма на завесах і ўнутраным замком. Збоку ад алтара знаходзілася закрысція з дзвярыма на завесах і ўнутраным замком. У царкве было сем прастакутных акон і адно круглае.

Унутры столь падтрымлівалі шэсць філяраў (слупкоў). Над уваходам знаходзіўся хор з балюстрадай. На адным з філяраў быў амбон. Каля сцяны знаходзіўся канфесіянал, а ў цэнтры царквы ішлі патроеныя лаўкі. У 1793 г. у царкве былі тры алтары: галоўны — разной работы, пакрыты белай фарбай у гонар Ісуса Хрыста, і два малых, таксама разной работы, —

[11] Цітоў А. Геральдыка беларускіх местаў.
[12] НГАБ. Ф. 136, воп. 1, спр. 41248, арк. 26–28.
[13] Тамсама. Спр. 41042, арк. 72–74.

у гонар Дзевы Марыі (абраз быў ў шаце сярэбранай) і ў гонар св. Антонія [14]. Пра абраз Дзевы Марыі ў візіце 1680 г. гаворыцца, што ён быў цудатворным і на ім ужо тады была сярэбраная шата [15]. Акрамя гэтага, у царкве меўся шэраг іншых абразоў: св. Мікалая, св. Тройцы. А ў 1793 г. былі яшчэ і два парталы: першы — з распяццем Ісуса Хрыста, другі — з абразом св. Іаана [16].

Як ужо згадвалася вышэй, плябанія ці, як у візіце 1680 г., капланскія будынкі, знаходзіліся на другім пляцы, які па фундушу належаў цырынскай царкве [17]. У 1793 г. плябанія ўяўляла сабой трохкамерную пабудову, якая складалася з хаты, каморы і сеняў. Хата мела чатыры акны, была атынкавана і пабелена. За ёю знаходзілася пякарня з печчу. У плябаніі была печ, абкладзеная белай кафляй, а таксама камін. У гаспадарчы комплекс плябаніі ўваходзілі таксама свіран, гумно, дзве адрыны, хлявы, стайня вялікая і меншая, сырніца на браме з нядаўна збудаванай лесвіцай. Усе будынкі былі крытыя саломай, акрамя сырніцы, крытай гонтам. Як адзначаецца ў візіце 1793 г., усё гэта было зроблена коштам тагачаснага пароха цырынскага Якуба Гаінскага, які быў прызначаны сюды ў 1761 г., а ў той час, калі складалася візіта, выконваў функцыі грэка-каталіцкага нясвіжскага дэкана [18].

Тады ж, у канцы XIX ст., пры цырынскай царкве існаваў шпіталь. У ім знаходзіліся тры ўбогія дзяды і тры бабы. Усе яны жылі з ахвяраванняў. На жаль, як адзначаецца, шпіталь не меў асобнага фундушу. Акрамя ўсяго вышэй згаданага, да царквы былі прыпісаны могілкі ў месце Цырын. Апошнія, відаць, знаходзіліся недалёка ад царквы, таму што, паводле візіты 1793 г., на іх была драўляная брусаваная званіца, крытая гонтавым дахам, з крыжам наверсе. На званіцы меліся два вялікія і тры маленькія званы [19].

У той жа час адзначаецца, што філіяльная капліца каляцыі падчашых навагрудскіх (Несялоўскіх) знаходзілася толькі ў Туганавічах. Таму можна выказаць сумненне, што месцам, дзе адбываліся падзеі “Дзядоў”, быў цырынскі могільнік, як гэта мяркуе Л. Падгорскі-Аколаў. Вось, у прыватнасці, што ён піша: “…месцам, у якім паэт развівае дзею II часткі сваіх “Дзядоў”, мусіла быць каплічка цырынскага могільніка” [20]. Гэтае і іншыя пытанні патрабуюць далейшых доследаў, таму што ў 70-х гг. XIX ст. у Цырыне на могілках сапраўды існавала капліца ў гонар св. Міхаіла [21].

---

[14] НГАБ, ф. 136, воп. 1, спр. 41248, арк. 27.

[15] Тамсама. Спр. 41042, арк. 72–74.

[16] Тамсама. Спр. 41248, арк. 27.

[17] Тамсама. Спр. 41042, арк. 72

[18] Тамсама. Спр. 41248, арк. 28.

[19] Тамсама.

[20] Брага С. [Тумаш В.]. Міцкевіч і беларуская плынь польскае літаратуры // З гісторыяй на “Вы”. С. 290–291.

[21] Описание церквей и приходов Минской епархии. С. 184.

У Цырынскую парафію ў розныя гады ўваходзіла розная колькасць вёсак. Гэта вельмі добра паказана ў табліцы № 1. У ёй у алфавітным парадку размешчаны вёскі, якія ўваходзілі ў парафію ў канцы XVII, канцы XVIII і другой палове XIX ст. На падставе гэтай табліцы, нам здаецца, можна зрабіць цікавыя супастаўленні і высновы пра колькасць парафіян, што дае магчымасць прааналізаваць дэмаграфічны стан насельніцтва парафіі на працягу двух стагоддзяў. Найбольш поўныя архіўныя дадзеныя на 1793 г. Гэта — і колькасць дымоў, і ўзроставы, і палавы склад насельніцтва. Акрамя гэтага, размяшчэнне супадаючых назваў мясцовасцей у адной графе дае добрую магчымасць убачыць змены як у саміх найменнях, так і ў складзе парафіі.

Табліца № 1

Цырынская парафія

1680 г.	1793 г.	дымы	1879 г.
	1. Аконавічы	24	1. Акопавічы
1. Ачкова (Ачкогі)	2. Ашкова	6	
	3. Альшаны	12	2. Альшаны
2. Быкевічы	4. Быкевічы	15	3. Быкевічы
3. Бацэвічы			
4. Бабонаўка	5. Бабонаўка	8	4. Бабонаўка
5. Варонча			
6. Ведрыховічы			
7. Высадавічы	6. Высадавічы	10	5. Высадавічы
8. Дарагова	7. Дарагова 1-е	26	6. Дарагова
	8. Дарагова 2-е	21	
	9. Дратышы	6	
			7. Застадолье
9. Карычыцы			
10. Краснае	10. Краснае	28	8. Краснае
11. Карчова			9. Карчова
	11. Літароўшчына	7	10. Латароўшчына
	12. Метрапольшчына	16	
12. Мехаўшчына			
13. Пенчын	13. Пенчын	18	11. Пенчын
14. Радашы	14. Рудашы	16	

	15. Ровішчына		14		
15. Скрабаў	16. Скрабова		52		
16. Стружэнікі					
17. Тарацэвічы	17. Трацэвічы		20	12. Трацэвічы	
18. Тугановічы	18. Тугановічы 1-я		42		
	19. Тугановічы 2-я		34		
19. Цырын	20. Цырын		77	13. Цырын	
Усяго:	Усяго:		Усяго:	Усяго:	
	мужчын да 15 гадоў	458	467		
	пасля 15 гадоў	676			
	усяго — мужчын	1134		Мужчын	1596
	жанчын да 15 гадоў	500			
	пасля 15 гадоў	676			
	усяго жанчын	1135		Жанчын	1679
парафіян 350	усяго парафіян	2269		Парафіян	3275

Цэнтрам пэўнай царкоўна-адміністратыўнай адзінкі Цырын, відаць, быў яшчэ і да Брэсцскай царкоўнай уніі 1596 г. Тады, як вядома, адбылося аб'яднанне царквы грэцкага і рымскага абрадаў у адказ на экспансіянізм Маскоўскай дзяржавы [22]. Пры гэтым уніяцтва, або грэка-каталіцызм, у XVIII ст. становіцца масавай рэлігіяй і ў канцы гэтага стагоддзя аб'ядноўвае больш за 80 працэнтаў насельніцтва ВКЛ [23]. Верагодна, неўзабаве пасля 1596 г. Цырынская пратапопія стала падпарадкоўвацца уніяцкаму мітрапаліту.

Уяўленне аб Цырынскім грэка-каталіцкім дэканаце ў XVII–XVIII стст. дае табліца № 2. Яна створана па таму ж прынцыпу, што і папярэдняя. Гледзячы на табліцу, добра бачны рост колькасці парафій з 15-ці ў 1680 г. да 28-мі ў 1793 г. Таксама, як і ў першай табліцы, відавочны рост насельніцтва ў населеных месцах, якія знаходзіліся на тэрыторыі сучаснага Карэліцкага раёна. Дарэчы, яны выдзелены іншым шрыфтам.

Варта адзначыць, што асобныя парафіі ў розныя гады ўваходзілі таксама ў іншыя дэканаты. Напрыклад, парафія Малыя Жухавічы ў 1680 г. уваходзіла ў Нясвіжскі грэка-каталіцкі дэканат. У гэты ж дэканат у XVII–XVIII стст. уваходзілі таксама наступныя царкоўныя парафіі на тэрыторыі Карэліччыны: св. Тройцы ў Міры, Успення ў Вялікіх Жухавічах. У гэты ж час у Навагрудскі дэканат уваходзілі наступныя уніяцкія парафіі: Нараджэн-

[22] Беларусь: Энцыкл. даведнік. Мн., 1995. С. 721.
[23] Тамсама. С. 721.

ня Дзевы Марыі ў Карэлічах, св. Тройцы ў Беразаўцы, Пакрава Багародзіцы ў Турцы, Крыжаўзвіжанская ў Лысіцы і св. арханёла Міхаіла ў Мірацічах [24].

Табліца № 2

Цырынская пратапопія 1680 г.		**Цырынскі грэка-каталіцкі дэканат 1793 г.**	
1. Адахоўшчына		1. Адахоўшчына	
		2. Астраўкі	
		3. Валеўка	
		4. Ведзьма	
2. Востраў		5. Востраў	
		6. Гарадзішча	
3. Голдавічы		7. Голдавічы	
		8. **Далматоўшчына**	1184 чал.
4. Дарэва			
		9. Калпеніца	
		10. Крошын	
5. Лаховічы		11. Ляхавічы	
6. Лукі		12. Лукі	
		13. Лысіца	
7. Малева		14. Малева	
		15. **Малыя Жухавічы**	1533 чал.
		16. **Мірацічы**	683 чал.
8. Мыш			
		17. Наруцэвічы	
		18. Новая Мыш	
		19. Паручаны	
9. **Райца**	405 чал.	20. **Райца**	1450 чал.
10. Сачэўка		21. Сачаўка	
11. **Сервеч**	400 чал.	22. **Сервеч**	740 чал.
		23. Сноў	
12. Стваловічы		24. Стваловічы	
13. **Цырын**	350 чал.	25. **Цырын**	2269 чал.
14. Чэрнехава		26. Чэрнехава	
		27. Ястрэмбель	
15. Ясянец		28. Ясянец	

[24] НГАБ, ф. 136, воп. 1, спр. 41042, арк. 58 адв., 60, 61, 70-84, 85 адв., 86 адв., 87 адв.; ф. 136, воп. 1, спр. 41248, арк. 1–73.

Зразумела, дадзены невялікі дослед не дае поўнай карціны рэлігійнага становішча на Карэліцкай зямлі ў XVII–XVIII стст. Для гэтага трэба было б дадаць звесткі па іншых канфесіях: каталіцкай (каля 12 працэнтаў), мусульманскай і іудзейскай, вернікі якіх у цэлым складалі менш за 20 працэнтаў насельніцтва ў тыя часы. Але нават тыя кароткія архіўныя звесткі, што прыведзены ў нашым матэрыяле, маюць каштоўнасць і патрабуюць далейшага асэнсавання.

КОРАТКА ПРА АЎТАРАЎ

Абала Мірдза — доктар філалогіі, перакладчыца, сябра Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (Рыга).

Адравонж-Пянёнжак Януш — прафесар, дырэктар Музея літаратуры імя А. Міцкевіча, старшыня Камітэта па святкаванню 200-годдзя з дня нараджэння А. Міцкевіча (Варшава).

Александровіч Станіслаў — доктар габілітаваны, прафесар Торуньскага і Беластоцкага універсітэтаў імя М. Каперніка (Торунь–Беласток, Польшча).

Багадзяж Мікалай — гісторык, пісьменнік, рэдактар аддзела часопіса "Бярозка" (Мінск).

Багдановіч Ірына — кандыдат філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы НАНБ, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (Мінск).

Баркоўскі Аляксандр — літаратар, краязнаўца (Якуцк, Расійская Федэрацыя).

Баршчэўскі Аляксандр — прафесар, доктар габілітаваны, загадчык кафедры Варшаўскага універсітэта, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (Варшава).

Бохан Юрый — кандыдат гістарычных навук, выконваючы абавязкі загадчыка аддзела Інстытута гісторыі НАНБ (Мінск).

Брыль Янка — народны пісьменнік Беларусі (Мінск).

Быліна Станіслаў — прафесар, доктар габілітаваны, дырэктар Інстытута гісторыі Польскай акадэміі навук (Варшава).

Бялаказовіч Базыль — прафесар, доктар габілітаваны, загадчык кафедры Вышэйшай педагагічнай школы (Варшава—Ольштын, Польшча).

Верабей Анатоль — кандыдат філалагічных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (Мінск).

Воінаў Мікалай — кандыдат філалагічных навук, прарэктар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны (Гомель, Беларусь).

Волкава Яўгенія — малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа НАНБ (Мінск).

Вуйцік Збігнеў — прафесар, доктар габілітаваны, супрацоўнік Музея Зямлі ПАН (Варшава).

Вяжбіцкі Анджэй — прафесар, доктар габілітаваны, супрацоўнік Інстытута гісторыі ПАН (Варшава).

Гайба Мікалай — старшы навуковы супрацоўнік Навагрудскага гісторыка-краязнаўчага музея (Навагрудак, Беларусь).

Германовіч Мар'юш — нашчадак Ігната Дамейкі (Аліўе, Францыя).

Голуб Тэрэса — навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы НАНБ (Мінск).

Дынглі Джым — прафесар Лонданскага універсітэта, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (Лондан).

Загідуліна Марына — мастацтвазнаўца ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама (Гродна, Беларусь).

Караг'ёзаў Панаёт — балгарскі літаратуразнаўца (Сафія).

Карлюкевіч Аляксандр — сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў і Саюза журналістаў, галоўны рэдактар газеты "Чырвоная змена" (Мінск).

Касманова Багуміла — доктар габілітаваны, прафесар Познаньскага універсітэта імя А. Міцкевіча (Познань, Польшча).

Касцюк Міхаіл — акадэмік НАНБ, доктар гістарычных навук, дырэктар Інстытута гісторыі НАНБ (Мінск).

Клачоўскі Ежы — прафесар, доктар габілітаваны, дырэктар Інстытута Цэнтральна-Усходняй Еўропы, старшыня Польскага камітэта па справах ЮНЕСКО (Люблін, Польшча).

Конан Уладзімір — доктар філасофскіх навук, загадчык аддзела Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (Мінск).

Корын Анджэй — супрацоўнік Інстытута гісторыі ПАН (Варшава).

Косман Марцэлі — доктар габілітаваны, прафесар Познаньскага універсітэта імя А. Міцкевіча (Познань, Польшча).

Кошур Святлана — навуковы супрацоўнік Карэліцкага краязнаўчага музея "Зямля і людзі" (Карэлічы, Беларусь).

Кухарска Эўгенія — доктар габілітаваны, прафесар Мазавецкай вышэйшай гуманітарна-педагагічнай школы (Ловіч, Польшча).

Ліпатаў Аляксандр — доктар філалагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута славяназнаўства і балканістыкі РАН (Масква).

Літвіноўская Алеся — выкладчыца Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта (Мінск).

Лойка Алег — член-карэспандэнт НАНБ, доктар філалагічных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (Мінск).

Лойка Павел — кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАНБ (Мінск).

Лыч Леанід — доктар гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАНБ (Мінск).

Ляшук Вікторыя — кандыдат філалагічных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (Мінск).

Мак-Мілін Арнольд Барат — прафесар Лонданскага універсітэта.

Мальдзіс Адам — прафесар, доктар філалагічных навук, дырэктар Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны, прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (Мінск).

Мархель Уладзімір — кандыдат філалагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы НАНБ, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (Мінск).

Мірачыцкі Леў — кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАНБ (Мінск).

Мусіенка Святлана — прафесар, доктар філалагічных навук, загадчыца кафедры польскай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы (Гродна, Беларусь).

Навумовіч Уладзімір — дацэнт, кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры беларусазнаўства Беларускага дзяржаўнага універсітэта, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (Мінск).

Нікалаеў Мікалай — доктар філалагічных навук, загадчык аддзела Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі, сябра Міжнароднага камітэта беларусістаў (Санкт-Пецярбург, Расія).

Новак Анджэй — доктар, гісторык, супрацоўнік Інстытута гісторыі ПАН (Варшава).

Пірачкінас Арнольдас — доктар габілітаваны, прафесар Вільнюскага універсітэта (Вільнюс).

Пяткевіч Аляксей — прафесар, загадчык кафедры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (Гродна, Беларусь).

Рыбчонак Сяргей — вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск).

Рыч Вера — паэтэса, перакладчыца (Лондан).

Рэут Надзея — юрыст Мінгарвыканкама, аспірант кафедры міжнароднага права Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (Мінск).

Салееў Вадзім — прафесар, доктар філасофскіх навук, загадчык аддзела культуралогіі Нацыянальнага інстытута адукацыі (Мінск).

Сімакоў Алесь — выканаўчы сакратар Беларуска-індзейскага таварыства (Гомель, Беларусь).

Слівоўска Вікторыя — прафесар, доктар гісторыі, супрацоўнік Інстытута гісторыі ПАН (Варшава).

Смулкова Эльжбета — прафесар, доктар габілітаваны, загадчыца кафедры беларускай культуры Беластоцкага універсітэта (Варшава—Беласток, Польшча).

Сосна Уладзімір — кандыдат гістарычных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (Мінск).

Сэнюх Чэслаў — сябра Саюза польскіх пісьменнікаў, перакладчык (Варшава).

Фалкоўскі Войцех — супрацоўнік Інстытута гісторыі Варшаўскага універсітэта, Генеральны сакратар Польскага камітэта па справах ЮНЕСКО (Варшава).

Хазанава Кацярына — аспірантка Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны (Гомель, Беларусь).

Цывіньскі Богдан — польскі літаратуразнаўца, жыве і працуе ў Вільнюсе.

Цыхун Генадзь — прафесар, доктар філалагічных навук, загадчык аддзела Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны (Мінск).

Шасцілоўская Кацярына — аспірантка Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАНБ (Мінск).

Швед Вячаслаў — кандыдат гістарычных навук, дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы (Гродна, Беларусь).

Шыбека Захар — кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны (Мінск).

Яскевіч Алена — кандыдат філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы НАНБ (Мінск).

Яцкевіч Зміцер — вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (Мінск).

ЗМЕСТ

Прывітанне ўдзельнікам канферэнцыі міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь
Васіля Стражава 5

ПЛЕНАРНЫЯ ДАКЛАДЫ

Лойка Алег (Мінск)
Адам Міцкевіч і Беларусь 9

Клачоўскі Ежы (Люблін, Польшча)
Адам Міцкевіч — нашчадак культуры Рэчы Паспалітай многіх народаў 14

ЛипатовАлександр (Москва)
Мицкевич и Пушкин: Образ на фоне историографии и историософии 26

Piročkinas Arnoldas (Vilnius)
Źródła romantyzmu Adama Mickiewicza 40

Адравонж-Пянёнжак Януш (Варшава)
Год Міцкевіча ў Польшчы і ў свеце 45

Лыч Леанід (Мінск)
Ідэя славянскага ўзаемаразумення ў парыжскіх лекцыях Адама Міцкевіча 53

АДАМ МІЦКЕВІЧ У ГІСТОРЫІ І СУЧАСНАСЦІ

Лойка Павел, Сосна Уладзімір (Мінск)
Эпоха Міцкевіча: Грамадска-палітычная сітуацыя ў Беларусі
ў першай палове XIX ст. 65

Быліна Станіслаў (Варшава)
“Дзяды” Адама Міцкевіча і балта-славянскія вераванні 71

Касцюк Міхаіл (Мінск)
Адам Міцкевіч як грамадска-палітычны дзеяч 78

Wierzbicki Andrzej (Warszawa)
Adama Mickiewicza koncepcja dziejów Polski 83

Бохан Юрый (Мінск)
Гістарычныя матывы ў творчасці Адама Міцкевіча 92

Фалкоўскі Войцех (Варшава)
Час, Свабода і Гісторыя ў Міцкевіча 96

Рыбчонак Сяргей (Мінск)
Радавод Стыпулкоўскіх герба Дзях 102

Кухарска Эугения (Лович, Польша)
Адам Мицкевич и цензура Николая I 107

Нікалаеў Мікалай (Санкт-Пецярбург, Расія)
Беларускі Пецярбург і Адам Міцкевіч 114

Nowak Andrzej (Kraków, Polska)
Adam Mickiewicz i Wielka Emigracja: spory o Rosję 119

Швед Вячаслаў (Гродна, Беларусь)
Гісторыя Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. на старонках
“Кніг народа польскага і пілігрымства польскага” Адама Міцкевіча 132

Wójcik Zbigniew (Warszawa)
Adam Mickiewicz — Ignacy Domeyko: Dzieje przyjaźni 137

Гайба Мікалай (Навагрудак, Беларусь)
Вобраз радзімы ў перапісцы Адама Міцкевіча 142

Косман Марцэлі (Познань, Польшча)
Праўда і легенда пра саперніка паэта: Ваўжынец Путкамер і Адам Міцкевіч . . 146

Мірачыцкі Леў (Мінск)
Адам Міцкевіч у свядомасці беларусаў 154

Слівоўска Вікторыя (Варшава)
Забароненыя чытанні 159

Салееў Вадзім (Мінск)
Адам Міцкевіч — глыбіня і вяршыня славянскага ўспрымання свету 165

Касманова Багуміла (Познань, Польшча)
Разам ці асобна?: Міцкевіч у Польшчы, Літве і Беларусі 171

Alexandrowicz Stanisław (Toruń, Polska)
Wanda Kukowicz. “Dziennik wycieczki pieszej z Wilna w strony
Mickiewiczowskie odbytej w dniach 14–22 lipca 1928 r.” 176

ДЫСКУСІЯ

Багадзяж Мікола (Мінск)
Адам Міцкевіч і Караліна Сабанская 183

Корын Анджэй (Варшава)
Спадчына паэта — вышэй палітыкі! 185

Шыбека Захар (Мінск)
Адам Міцкевіч і беларуская гісторыка-культурная традыцыя 187

СПАДЧЫНА АДАМА МІЦКЕВІЧА
філалагічны і культуралагічны аспекты

Бялаказовіч Базыль (Варшава – Ольштын)
Беларускія элементы, матывы і сюжэты ў творчасці Адама Міцкевіча 193

Мусиенко Светлана (Гродно, Беларусь)
Белорусский фольклор в творчестве Адама Мицкевича 199

Рыч Вера (Лондан)
Некалькі думак пра “Крымскія санеты” 217

Конан Уладзімір (Мінск)
Вобразы і матывы зямнога раю ў паэзіі Адама Міцкевіча 220

Цывіньскі Богдан (Вільнюс)
Рамантычны падмурак культуры XIX ст. Вялікага Княства Літоўскага 225

Карагьозов Панайот (София)
Лекции Адама Мицкевича в Коллеж де Франс 229

Яскевіч Алена (Мінск)
Адам Міцкевіч і старабеларуская духоўная культура 250

Мархель Уладзімір (Мінск)
Матывы радзімы ў творчасці Адама Міцкевіча
і яго паслядоўнікаў на Беларусі 256

Багдановіч Ірына (Мінск)
Творчасць Адама Міцкевіча і станаўленне
беларускай рамантычнай традыцыі 263

Мак-Мілін Арнольд Барат (Лондан)
Адам Міцкевіч і беларуская літаратура ў XIX ст.: Роднасць і ўплыў 268

Пяткевіч Аляксей (Гродна)
Асветніцкая ідэя ў Беларусі XIX ст.: Ад Адама Міцкевіча да Элізы Ажэшка . . 279

Верабей Анатоль (Мінск)
Традыцыі рамантызму Адама Міцкевіча ў творчасці Уладзіміра Караткевіча . . 281

Баршчэўскі Аляксандр (Варшава)
Адам Міцкевіч у ацэнках беларускіх эмігранцкіх даследчыкаў 286

Абала Мірдза (Рыга)
Адам Міцкевіч у Латвіі 293

Дынглі Джым (Лондан)
Адам Міцкевіч і Вялікабрытанія 296

Баркоўскі Алесь (Якуцк, Расійская Федэрацыя)
Адам Міцкевіч і Якуція 304

Загідуліна Марына (Гродна, Беларусь)
Міцкевіч у ілюстрацыях: Рамантычная трактоўка мастакоў Беларусі XIX ст. . . . 305

Шасцілоўская Кацярына (Мінск)
Адам Міцкевіч і Станіслаў Манюшка як прадстаўнікі
славянскага рамантызму 310

Смулкова Эльжбета (Варшава – Беласток)
Беларускія элементы ў творчасці Адама Міцкевіча 315

Цыхун Генадзь (Мінск)
Мова Адама Міцкевіча ў рэгіянальным аспекце 323

Ляшук Вікторыя (Мінск)
Словы-вобразы радзімы ў творчасці А. Міцкевіча 328

Сэнюх Чэслаў (Варшава)
Беларусь двух Міцкевічаў 335

Воінаў Мікалай (Гомель, Беларусь)
“Пан Тадэвуш” Адама Міцкевіча ва ўсходнеславянскіх перакладах 340

Літвіноўская Алеся (Мінск)
Паланізмы і русізмы ў перакладзе “Пана Тадэвуша” Аляксандра Ельскага 347

Волкава Яўгенія (Мінск)
Асаблівасці ўзнаўлення вобразных параўнанняў у беларускіх перакладах паэмы Адама Міцкевіча “Пан Тадэвуш” 350

Хазанава Кацярына (Гомель, Беларусь)
Моўныя здабыткі Янкі Купалы ў перакладных творах Адама Міцкевіча 357

Голуб Тэрэса (Мінск)
Парыжскія рэліквіі Адама Міцкевіча вачыма беларускага даследчыка 365

Сімакоў Алесь (Гомель, Беларусь)
Адам Міцкевіч і індзейская Амерыка: Амбівалентнасць і гуманізм 369

ДЫСКУСІЯ

Карлюкевіч Алесь (Мінск)
Адам Міцкевіч па дарозе да рускага чытача 377

Рэут Надзея (Мінск)
Пад эгідай ЮНЕСКО 379

ПЯТЫЯ КАРЭЛІЦКІЯ КРАЯЗНАЎЧЫЯ ЧЫТАННІ «КАРЭЛІЦКАЯ ЗЯМЛЯ Ў ЧАСЫ АДАМА МІЦКЕВІЧА»

Брыль Янка (Мінск)
З Міцкевічам праз усё жыццё 383

Багдановіч Ірына (Мінск)
Топіка айчыны ў філамацкіх вершах Адама Міцкевіча 386

Мальдзіс Адам (Мінск)
“Малая”, “сярэдняя” і “вялікая” радзімы Адама Міцкевіча 391

Кошур Святлана (Карэлічы, Беларусь)
Рута ў жыцці Адама Міцкевіча 396

Навумовіч Уладзімір (Мінск)
Адам Міцкевіч як лектар: Выкладанне славянскіх літаратур у Калеж дэ Франс 400

Баршчэўскі Аляксандр (Варшава)
Беларускі край і беларускі характар у публікацыях Яна Чачота 406

Словік Святлана (Гродна, Беларусь)
З гісторыі сядзіб сям'і Дамейкаў:
Па матэрыялах Гродзенскага нацыянальнага гістарычнага архіва 412

Вуйцік Збігнеў (Варшава)
Ігнат Дамейка — сябра Адама Міцкевіча, родам з Медзвядкі 418

Германовіч Мар'юш (Аліўе, Францыя)
Гісторыя сям'і Дамейкаў — спроба яе ўзнаўлення 424

Яцкевіч Зміцер (Мінск)
Цырынскі грэка-каталіцкі дэканат 428

КОРАТКА ПРА АЎТАРАЎ 437

Адам Міцкевіч і нацыянальныя культуры: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 7–11 верасня 1998 г.) / Рэд. Н. Давыдзенка, А. Мальдзіс (гал. рэд.). — Мн.: "Беларускі кнігазбор", 1998. — 448 с. — (Беларусіка=Albaruthenica; Кн. 11)

А 28

ISBN 985-6318-36-X.

У зборніку сабраны як навуковыя, так і навукова-папулярныя, публіцыстычныя матэрыялы Міжнароднай канферэнцыі "Адам Міцкевіч і нацыянальныя культуры" і Пятых Карэліцкіх чытанняў "Карэліцкая зямля ў часы Адама Міцкевіча". Яны сталі падсумаваннем Года Адама Міцкевіча ў Беларусі, асэнсаваннем значэння яго спадчыны для беларускага, польскага, літоўскага, рускага і іншых народаў Еўропы.

Прызначаны для навукоўцаў, настаўнікаў, краязнаўцаў, усіх аматараў класічнага мастацкага слова.

УДК [882.6.09+929 Міцкевіч] (043.2)

ISBN 985-6318-36-X ББК 83.3(4 Беи) 6

Навукова-папулярнае выданне

БЕЛАРУСІКА
ALBARUTHENICA
Кніга 11

Адам Міцкевіч і нацыянальныя культуры
Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі
(7–11 верасня 1998 г.)

Набор і вёрстка выкананы на камп'ютэрах Цэнтра імя Ф. Скарыны
Вёрстка, дызайн *Я. А. Мальдзіс.* Набор *Я. А. Мальдзіс, Т. П. Пятровіч*

Здадзена ў набор 11.10.1998. Падпісана ў друк 8.12.1998.
Фармат 60x90 1/16. Папера афсетная. Гарнітура Таймс.
Афсетны друк. Ум. друк. арк. 28. Ул.-выд. арк. 28.
Тыраж 500 экз. Заказ 92.

Выдавецтва "Беларускі кнігазбор"
Рэспубліка Беларусь, 220050, Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 15.
Ліцэнзія ЛВ № 105 ад 31.12.1997 г.

Надрукавана з дыяпазітываў рэдакцыі ТАА "Юніпол"
Рэспубліка Беларусь, 220039, Мінск, Караткевіча, 7а.
Ліцэнзія ЛП № 210 ад 5.01.1998 г.